Н.В. Гаўрош Н.М. Нямковіч

# АФАРЫСТЫЧНЫЯ ВЫСЛОЎІ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ



Н.В. Гаўрош Н.М. Нямковіч

# АФАРЫСТЫЧНЫЯ ВЫСЛОЎІ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Мінск
«Вышэйшая школа»

УДК 811.161.3'373.4
ББК 81.2Бел-3
Г24

*Усе правы на дадзенае выданне абаронены. Кожнае ўзнаўленне гэтай кнігі ці яе часткі не можа быць ажыццёўлена без дазволу выдавецтва*

ISBN 978-985-06-1956-3
© Гаўрош Н.В., Нямковіч Н.М., 2012
©Выдавецтва «Вышэйшая школа», 2012

*Незгасальнай памяці*
*заснавальніка беларускай фразеалогіі*
*прафесара Ф.М. Янкоўскага*

# Прадмова

Афарыстычныя выслоўі (афарызмы) выклікаюць цікавасць не толькі закладзеным у іх змесце вопытам пакаленняў, мудрасцю і сілай духу чалавека, яго маральнымі і эстэтычнымі ідэаламі, а і той дакладнай і своеасаблівай характарыстыкай людзей, іх схільнасцей, вызначэннем і ацэнкай разнастайных узаемаадносін у грамадстве, з'яў рэчаіснасці. Яны надзвычай лаканічныя і вобразныя, выразныя і зразумелыя. Змест афарызмаў універсальны і адначасова нацыянальна адметны.

Першая спроба навуковага асэнсавання афарыстычных выслоўяў у беларускай культуралогіі была зроблена Ф.М. Янкоўскім. У кнізе «Крылатыя словы і афарызмы» (Мінск, 1960) ён падаў 220 крылатых выслоўяў, разнастайных паводле структуры, сінтаксічна закончаных вобразных выразаў. Праблеме афарыстычнага слова прысвечаны і шэраг артыкулаў даследчыка, дзе аналізуюцца афарызмы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Ларысы Геніюш, Ядвігіна Ш., Цёткі, Анатоля Вярцінскага і інш. Неадкладнай і першасту-

пеннай задачай філолагаў Ф.М. Янкоўскі лічыў збіранне афарыстычных выслоўяў з беларускіх літаратурных крыніц, вытлумачэнне гэтых выслоўяў, адлюстраванне ўжывання іх у маўленні.

Асэнсаванню і сістэматызацыі афарыстычных выслоўяў Ніны Мацяш, Рыгора Барадуліна, Уладзіміра Караткевіча, Янкі Брыля прысвечаны артыкулы М.І. Новік, Т.М. Трыпуцінай, а таксама публікацыі тэматычных падборак афарызмаў беларускіх пісьменнікаў аўтараў гэтага выдання ў часопісе «Роднае слова» (Мінск, 2005–2011). Афарыстычныя выслоўі Якуба Коласа засведчаны ў кнізе А.Я. Міхневіча «Якуб Колас разважае, радзіць, смяецца...» (Мінск, 2002).

У кнізе «Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў» сабрана і тэматычна спарадкавана каля 3600 афарызмаў, выбраных з твораў 182 беларускіх пісьменнікаў – усяго 45 тэматычных груп. У якасці загалоўкаў гэтых груп выкарыстоўваюцца афарыстычныя выслоўі, якія, на думку аўтараў кнігі, найбольш поўна выражаюць змест тэмы. Выслоўі кожнай групы падаюцца ў алфавітным парадку, пасля кожнага афарызма (у дужках) называецца аўтар і крыніца. Паколькі змест афарызмаў, нягледзячы на лаканічнасць і адшліфаванасць формы, характарызуецца не толькі закончанасцю, але і абагульненасцю, то некаторыя выслоўі ўключаны ў некалькі тэматычных груп. У афарыстычных выслоўях, выбраных з паэтычных твораў, вершаваныя радкі аддзяляюцца значком /.

У пачатку выдання змяшчаецца артыкул «Афарызмы – гэта тэрміновыя тэлеграмы розуму», у якім падаецца тлумачэнне тэрмінаў *афарыстычнае выслоўе, афарызм*, акрэсліваецца змест і аб'ём паняццяў *нацыянальная афарыстыка, афарызацыя тэксту,* раскрываецца структурная адметнасць афарызмаў, іх тэматычная разнастайнасць, нацыянальная самабытнасць.

У канцы кнігі прыводзіцца алфавітны паказальнік афарыстычных выслоўяў (пасля кожнага падаецца старонка, дзе яно змяшчаецца ў тэксце), а таксама спіс аўтараў, з твораў якіх узяты афарызмы.

Афарызмы падаюцца ў аўтарскім напісанні.

Выбар фактычнага матэрыялу – афарызмаў – патрабаваў працяглай і настойлівай працы. З выключнай складанасцю давялося сутыкнуцца пры адборы, апрацоўцы, сістэматызацыі саміх моўных фактаў, бо «*слова – не рэальны прадмет, яго не возьмеш у рукі, не змераеш, не зважыш*» (Я. Колас); *у акіяне слова – / ані мяжы, ні донца. / Ёсць там адна аснова: / праца / і праца бясконца!..* (В. Жуковіч). Аўтары гэтага выдання, натуральна, не прэтэндуюць на поўнае выяўленне і апісанне беларускіх афарыстычных адзінак.

Задача далейшага вывучэння афарыстыкі беларускай мовы застаецца актуальнай і важнай. Гаварыць пра анталогію беларускіх афарызмаў і крылатых выслоўяў неабходна. Хочаш спасцігнуць, зразумець на-

род – станцуй яго танец, праспявай яго песню, паспытай яго стравы, удумайся ў яго ідыяматыку, афарыстыку. Вырашэнне задачы збору беларускіх афарызмаў, крылатых выразаў, іх класіфікацыя, аналіз цікавыя і карысныя не толькі філолагам, а і псіхолагам, этнографам, філосафам, гісторыкам, усім, хто цікавіцца нацыянальнай афарыстыкай.

Аўтары выдання выказваюць шчырую ўдзячнасць метадысту Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў В.М. Лапанік і настаўніцы беларускай мовы і літаратуры СШ № 32 г. Мінска Т.В. Корбан за дапамогу ў падборы фактычнага матэрыялу.

# «АФАРЫЗМЫ – ГЭТА ТЭРМІНОВЫЯ ТЭЛЕГРАМЫ РОЗУМУ»

## Афарызм як двухпланавая моўная адзінка. Афарыстычнасць выслоўяў. Афарызацыя. Нацыянальная афарыстыка

Існуюць паняцці *нацыянальная лексіка, нацыянальная фразеалогія.* Кажуць і пра *нацыянальную афарыстыку.* Ведаем (на слыху) шматлікія лацінскія, многія грэчаскія, колькасна значныя французскія *ходкія* фразы – афарызмы, крылатыя выслоўі. Можа, толькі вялікія, развітыя, класічныя мовы здольны нараджаць тое, што будзе цікава і карысна ўсім: там мудрасць, незвычайныя назіранні, павучанні і падобнае? Калі ўзяць пад увагу колькасць зафіксаваных афарыстычных выслоўяў, то так яно і акажацца: першыя пазіцыі займуць лацінская, грэчаская, французская, італьянская мовы. Аднак гэта толькі таму, што афарыстыка названых моў больш грунтоўна даследавана. Цікавасць да лацінскіх і грэчаскіх прыказак, крылатых выслоўяў і афарызмаў тлумачыцца не толькі тым, што яны прайшлі праз вякі, прынеслі нам святло мудрасці старажытных вучоных, філосафаў, паэтаў, але і тым, што сваёй лаканічнасцю, дакладнасцю і глыбінёй зместу сугучныя нашаму імкліваму часу. Менавіта ў антычных афарызмах адлюстраваліся душа, розум і

сіла слова мінулых пакаленняў; нам і сёння блізкія многія іх маральныя, этычныя і эстэтычныя ідэалы. Афарыстычныя выразы – гэта неацэнныя, як трапна заўважыў Сакрат, «сокровища древних мудрых мужей». Усё, што створана папярэднімі пакаленнямі, іх веды і вопыт дапамагаюць больш глыбока асэнсоўваць сучаснае, прадбачыць будучыню. Вялікі педагог Ян Каменскі адзначаў, што вывучэнне мудрасці ўзвышае і робіць нас больш моцнымі і велікадушнымі.

А што ж беларуская афарыстыка? Яшчэ і сёння няма не тое што поўнага збору беларускіх афарыстычных выслоўяў, але і больш-менш распрацаванай тэорыі і методыкі пошуку і даследавання такіх адзінак, не распрацавана методыка іх спарадкавання і лексікаграфічнага апісання. Больш увагі даследчыкі ўдзялялі вывучэнню прыказак, уласна фразем, перыфраз (працы Ф. Янкоўскага, Н. Буракі, Л. Жураўскай, Г. Малажай, Р. Шкрабы і інш). Уласна афарызмы застаюцца мала даследаванымі да гэтага часу. Маем толькі падыходы да крытэрыяў вызначэння і акрэслення такіх адзінак, падборкі крылатых выслоўяў і афарызмаў некаторых беларускіх пісьменнікаў (гл. працы Ф. Янкоўскага, А. Міхневіча, Я. Іванова).

Афарызмы ніколі не характарызуюць аднаго чалавека. Яны маюць дачыненне да многіх і многага, калі не да ўсіх і да ўсяго. Аднак нягледзячы на сваю ўніверсальнасць даволі часта афарыстычны выраз можа пад-

казаць, якому народу ён належыць. Прыгадаем: *Навошта каласы, калі няма васількоў?* (М.Багдановіч. Апокрыф); *Міхал лічыў Нясвіж Парыжам* (Я.Колас. Новая зямля); *Штосьці з намі не так, / калі нават буслы не вярнуліся гэтай вясной* (Н. Маеўская. Вось і дажылі мы да вясны...); *Беларусу і ў Парыжы сняцца / белізна бяроз і сосен медзь* (П. Панчанка. Недзе салавей пяе ў дуброве); *Калі за Беларусь аддаць жыццё / Святыя клічуць – буду не старонні* (Н. Гілевіч. «Паланэз» Агінскага); *Мне бацькаўшчынай цэлы свет, / Ад родных ніў я адвярнуўся.../ Адно... не збыў яшчэ ўсіх бед: / Мне сняцца сны аб Беларусі!* (Я. Купала. О так! Я – пралетар!); *Пакідайце і буслу і чайцы / больш вады і неба на душу* (П. Панчанка. Не люблю я слова «покоритель»...). Нацыянальныя рэаліі, сімвалы падказваюць, што гэта наша, роднае. Афарыстычныя выслоўі нашы – беларускія – па месцы нараджэння, мудрасць жа, заключаная ў іх, – сусветная.

Бывае, што ёсць непасрэднае ўказанне на геаграфію «нараджэння» афарыстычнага выслоўя: *Не адрокся **Бог ад Беларусі*** (В. Аколава. Мальер на мінскай Камароўцы); ***Беларусь** адродзіцца Вераю* (Р. Барадулін. Вераю); ***Белай Краіне** не згінуць парожняй– / абарані ад бяспамяцтва, Божа!* (А. Хатэнка. Дзедава субота); ***Беларусь** перад усім!* (М. Скобла. Зэльвенская каса ў музеі Максіма Багдановіча); *У выраі далёкім / Аднаго для птахаў не стае – / Тых дубоў, / **наднёманскіх,** высокіх, / Дзе ім трэба гнёзды віць свае* (М. Арочка. Недзе

на зялёнай пойме Ніла); *Больш за сябе я* ***Беларусь*** *люблю, / І ёю з нараджэння ганаруся. / Праб'е мой час, / як* ***Каліноўскі*** *праз пятлю, / Я нізка пакланюся* ***Беларусі*** (С. Грахоўскі. Больш за сябе я Беларусь люблю...); *Быць беларусам – / Гэта значыць, / За родны край згарэць на дым, /* ***Па-беларуску*** *чуць і бачыць / На гэтым свеце і на тым; Быць беларусам – / Гэта значыць, / Свайго ні гуку не забыць, / Усё чужое перайначыць, / Каб* ***Беларусі*** *вечнай быць* (Р. Барадулін. Быць!); *І хай з тысяч рэк чужых нап'юся – / Толькі для апошняга глытка / Я прыйду сюды, /* ***да Беларусі,*** */ Да свайго азёрнага кутка* (Г. Бураўкін. «Што ты так прыкуты да Радзімы?..»).

Даволі часта ў афарыстычных выслоўях прачытваецца нацыянальная прыналежнасць іх аўтараў: *Калі легчы – / Дык легчы брусам, / Тым, што ў хаты кладуць* ***беларусы!*** (М. Арочка. Калі легчы...); ***Беларускія*** *звеку паэты / Над хлуснёю і подласцю над!* (В. Аколава. Да Фёдара Янкоўскага ў госці); *Толькі праз родную мову чалавек можа стаць* ***беларусам,*** *бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

Нацыянальныя міфалагемы, нацыянальныя сімвалы таксама падкажуць, якому народу належыць афарыстычны выраз. Прыгадаем: *Не бывае* ***хлеба,*** */ Калі не зжаць у тэрмін збажыну* (А. Вольскі. Сяброўская

чарка); *Не хачу між* **калоссяў** */ быць* **коласам тым,** */ Што часамі ўзрастае* **без зерня** (М. Арочка. Пакуль маладыя); *Таму* **крыніца** *чыстая заўжды, / Што не стаіць яна на месцы* (Н. Тарас. Пад белым яварам); *У наіўнасць, / Што ўсім спавядацца рада;/ У шукальнікаў* **папараць-кветкі** */ І праўды; / У мару, / Што вечна жыве чаканнем, / – Не кіну ніколі / Насмешкі каменем, / Бо траплю ў сябе* (М. Арочка. Не кіну...); *У вёсцы не любяць гнацца* **за жураўлём у небе, калі сініца ў руцэ** (М. Стральцоў. Трывожна крычыць птушка).

Нацыянальныя афарызмы даюць магчымасць вывучаць менталітэт, культуру, педагогіку пэўнага народа. Якімі – з афарызмаў – бачацца беларусы? Гэта – найперш – людзі чулыя, спагадлівыя, з пачуццём уласнай годнасці: *А вось чуласць, чалавечнасць – / Ім дарога проста ў вечнасць – / Больш за ўсё нам даражэй* (Я. Колас. С.І. Ліаранцэвічу); *А душа наша – ўся са спагады* (Я. Сіпакоў. Ёсць жа людзі...); *Без дабрыні мы не людзі, а голыя дрэвы* (Г. Марчук. Голас і слова); *Без чалавечнасці не будзе вечнасці* (П. Панчанка. За вогненнымі вякамі); *І гонар свой – не трэба нам благога. / І звычай свой па-людску жыць з людзьмі. / Дабро сваё, не трэба нам чужога. / І будзе ўсё, / Бо з працавітых мы* (Л. Геніюш. Па-беларуску); *Ведаем, жывём занадта мала, / Каб напрыканцы не шкадаваць, / Што не ўсё, чым доля нас вітала, / З годнасцю мы ўмелі адвітаць* (Н. Мацяш. Ведаем, жывём занадта мала...); *Апынуся*

*калі сярод чорных варон, – / Я памру, ды не буду па-іхняму каркаць* (Я. Янішчыц. Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён...).

Беларусы – патрыёты, прычым патрыятызм іх адметны. Мы не прывучаны класці руку на сэрца, калі чуем гімн сваёй краіны, мы не клянёмся прылюдна ў адданасці і любові сваёй Радзіме. Для нас родны кут – гэта рай і пекла, гэта шчасце і гора, гэта жыццё і смерць: *А мне мой кут – навечна Мекка, / Ды і Галгофа разам з тым* (П. Броўка. Мой кут нічым не адмысловы...); *О Беларусь! Ты – сэрца і душа, / Нутра зямлі багаты клунак* (Я. Колас. Найдаражэйшы падарунак); *Падчас і па чужых краях журуся, / А хопіць і куточка Беларусі, / Каб цэлы век свой да яе ісці* (Н. Мацяш. Шчэ не журуся я па харастве...); *Скупая зямля маёй Беларусі / Не раджала рабоў і не мела рабоў* (У. Караткевіч. Буслы вучаць дзяцей); *Без радзімы народа няма, / Без народа няма Радзімы* (Р. Барадулін. Ураджай, недарод...); *Вечарамі на чужых узгорках, / Дзе чужыя кветкі між травы, / Як нам не хапае родных зорак / І салодкіх ветраў баравых* (Г. Бураўкін. Вечарамі на чужых узгорках...); *Відаць, / няма бальчэй пакут, / Чым шкадаваць да скону, / Што не вярнуцца ў матчын кут, / Хоць позна, / ды з паклонам...* (С. Законнікаў. Бацькаўшчына).

Беларусы – змагары, героі. Іх мужнасці, моцы духу, трывучасці трэба вучыцца: *Але Муж – не той, хто не знаў батагоў, / А той, хто пад імі маўчаў* (У. Карат-

кевіч. Песня колаў); *А нам стаяць, не гнуцца, як трысцё, / Бо лёс славян і лёс майго народа – / Нялёгкае і гордае жыццё* (У. Караткевіч. Зямля дзядоў); *Для смелых людзей няма бездарожжа* (Я. Колас. На ростанях); *Хто мужны, хто смелы, хто дужы, / Хто цэлем працят залатым, / Над тым неўладарныя сцюжы, / І лёс неўладарны над тым* (У. Жылка. Хто мужны, хто смелы, хто дужы... ); *І перамог няма без паражэння, / Без неспакою цішы не знайсці* (Н. Мацяш. Бабіна лета ў Белаазёрску); *Гасподзь схіляецца да ўсіх, / Ды духам ніцых ён не чуе* (Н. Мацяш. Не чуе).

Як вядома, праца для нашага народа – першааснова жыцця. На Беларусі спрадвеку шанавалі добрых работнікаў, умельцаў і неадабральна ставіліся да гультаёў, нядбайнікаў. Пра гэта многія беларускія прыказкі, пра гэта і шматлікія афарыстычныя выслоўі айчынных пісьменнікаў: *Без мазаля чалавека спрадвеку / Не лічаць у нас, не завуць чалавекам* (М. Рудкоўскі. Гасціну без чаркі...); *Ад дармаедства ўся распуста: / Нішто душу не губіць так, / Як незаробленая луста, / Якою сыціцца лайдак* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці); *Адзіна праца і каханне / Ў жыцці апірышча і шчыт* (Н. Мацяш. Паэма жніва); *Аддзячыць поле табе, аддзячыць, / Аддасць гарою калосны дар; / Яму вось толькі адчуць і ўбачыць, / Што ты не госць тут, а гаспадар!..* (А. Жамойцін. Аддзячыць поле табе...); *Дзень, што пражыты без працы ахвярнай, / Знікне таксама ў шумлівасці марнай*

(А. Зарыцкі. Дзень, што без дружбы й любові пражыты...).

Мудрыя, назіральныя, унікальныя знаўцы жыцця, беларусы перадаюць свету свае высновы – акрэсленні – парады праз афарызмы: *Ад здрадлівага – сэрцам адыдзі, / Ад цыніка – свой смутак уратоўвай, / Зайздрослівага шчодра не віні, – / Жыві праўдзіва – усяго і толькі...* (В. Аколава. Непадсуднасць грахоў); *Адны жабракі могуць праз усё жыццё толькі браць* (М. Багдановіч. Забыты шлях); *Але для ўсіх нязменны запавет – /Не толькі род цябе ў жыцці ўзвышае, / Найперш ты сам узвысіць род павінен* (С. Законнікаў. Кульмінацыя); *Але раз ты наважыў дзела, / Ідзі станоўча, роўна, смела, / Ідзі, назад не аглядайся / І на другіх не пакладайся* (Я. Колас. Новая зямля); *Багаты духам той, хто дорыць многа, / Убогі – хто не дорыць, а бярэ* (А. Звонак. Дзіва); *Балючай раны не дражні, / мудрым будзь, ды не мудруйся* (К. Кірэенка. Урок жыцця).

І, урэшце, у афарызмах акрэсліваецца крэда нашай нацыі: *Быць людзьмі. / Не толькі імі звацца* (Л. Геніюш. Мне патрэбны бор стары сасновы...).

Афарызм ствараецца ў пэўным часе, а сам ён пазачасавы, надчасавы: тое, што ў ім закладзена, прэтэндуе на вечнасць, бо ў афарызмах заключаны найвялікшыя агульначалавечыя каштоўнасці – філасофія і мудрасць жыцця цэлага народа і асобнага чалавека, яго этычныя і эстэтычныя прынцыпы, духоўнасць, культура, трады-

цыі, якія падаюцца як асноўныя жыццёвыя формулы, як дамінантныя вартасці. Так, духоўнасць народа, маральныя якасці чалавека – у наступных беларускіх афарызмах: *Духоўнасць – святая жывымі* (В. Аколава. Пракурор і казіно); *Душа – са споведзяў, а не з праклiццяў* (В. Аколава. Мальер на мінскай Камароўцы); *Душой злачынна немай быць, / Як свет турбот такі вялікі* (Н. Мацяш. Вясна восемдзесят сёмага); *Душою не крыві, / Бо чалавечы век усё ж кароткі, / І водгуллем у кожнага ў крыві / Азвацца могуць прашчуры і продкі* (С. Грахоўскі. Звяно); *І кожнага ў свеце дарога / Вядзе да апошняй вярсты, / Таму не шкадуй ні для кога / Сваёй дабраты* (С. Грахоўскі. Змяркаецца рана ўвосень); *Калі ты камусьці хоць трошкі патрэбен, / Дык хочацца шчодра і радасна жыць* (С. Грахоўскі. Прызнанне); *Калі ты ўсё спазнаў па поўнай меры / І не паспеў душою ачарсцвець, / Не бойся, што баліць часамі сэрца, – / Яно ж таму і сэрца, каб балець* (С. Грахоўскі. Сэрца); *Лепш быць сляпым або бязногім, / Чым мець халодную душу* (С. Грахоўскі. Хваляванне); *Найцяжэй судзіць сябе самога, / Чым у другога плямінку знайсці* (С. Грахоўскі. Няўцерпныя з сівымі валасамі); *О, боязь за другога чалавека!.. / Адна ты робіш чалавека з нас* (Н. Мацяш. За соснамі – мора); *Пакінь адну пасаду – / Быць Чалавекам на зямлі* (С. Грахоўскі. Хваляванне); *Патрабуе чыстае сумленне / Быць неабходным хоць малым звяном / Паміж сваім і новым пакаленнем*

(С. Грахоўскі. Звяно); *Чалавек павінен чалавеку / Радасці прыносіць кожны дзень* (С. Грахоўскі. Нельга ні забыцца, ні адкласці).

Жыццё чалавека, цэлага народа, нацыі – не пасіўнае існаванне, а актыўны працэс, творчае гарэнне. Жыццё – ужо само па сабе найвялікшы дар, які трэба берагчы, якім трэба даражыць. Менавіта гэтая думка – у наступных афарыстычных выслоўях: *Жыву, не трацячы надзей, / Бо веру у дабро людзей* (С. Грахоўскі. Колеры жыцця); *Жыццё заўжды – іспыт на мужнасць. / Яго ж не возьмеш напракат...* (Н. Мацяш. На лёс ці варта наракаць?); *Жыццё – неаплатны і спадчынны доўг* (М. Танк. Жыццё...); *Жыццё пражыць – / Не поле перайсці, / А трэба і жыццё / Прайсці, як поле, / І хоць адным зярняткам узысці, / А бур'яном не зарасці ніколі* (С. Грахоўскі. Жыццё пражыць); *Жыццё – то ўзвышша, то правал* (Р. Баравікова. Назіранне); *Чалавек памірае, калі страчвае здольнасць / Здзіўляцца і захапляцца / Жыццём* (М. Танк. Дрэвы паміраюць); *Гэта – мудрая тайна Жыцця – / Жыць аддана, / Да забыцця* (С. Грахоўскі. Тайна); *Асіліць не магу / На тройку з мінусам / Адзін прадмет – Жыццё* (М. Танк. Зайздрасць); *Даецца толькі тым жывучасць, / Хто годны ў муках сцвердзіць сваё «я»* (Н. Мацяш. Вярба).

Пачатак XX ст. – часы станаўлення беларускай літаратуры, новай літаратурнай мовы, часы рэвалюцыйныя, адраджэнскія: акрэслівалася, ацэньвалася

новае, пераацэньвалася – у кантэксце эпохі – знанае, учарашняе. Пісалася пра вечнае, пра тое, што хвалюе. Моўнае пытанне для беларусаў стала адным з самых важных. Таму нярэдкія ў нашай нацыянальнай афарыстыцы трапныя выслоўі пра родную мову: *Думаць **на сваёй роднай мове** народу не забароніш!* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце); *Павага **да роднай мовы** заўсёды нараджае павагу да ўсіх без выключэння – вялікіх і маленькіх – моў свету* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання); *Бацька, і маці, **і родная мова,** / узнятая к славе амаль з небыцця, / паэтаў натхнёным і велічным словам, / для беларусаў – пытанне жыцця* (Л. Геніюш. Як бацька чакае сыноў...).

Чытаем у Ядвігіна Ш.: «*Родная мова – гэта кроў народа, пакуль жыве яна – жыве народ*» (Ядвігін Ш. «Хто чым можа – хай дапаможа»). Прыгадалася вядомае, Багушэвічава: «*Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы: хто якую носе; ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы*» (прадмова да зборніка «Дудка беларуская»).

Два пісьменнікі – два ўразуменні значэння роднай мовы ў лёсе нацыі, два погляды на родную мову як сродак выяўлення духоўнага жыцця чалавека. У Ядвігіна Ш. мова – структура, цэласнасць, жывы арганізм; як нельга ўявіць абяскроўленае жывое, так нельга ўявіць і нацыю, народ без мовы. Багушэвіч раскрывае іншы бок мовы: яна – не толькі апазнавальны знак той ці іншай нацыі, яна – адзенне (адзежа) душы.

Працяг і развіццё думкі Ядвігіна Ш. – у яго радках з «Лістоў з дарогі»: «*... мова – гэта душа нацыянальная народа, калі ёсць такая душа, то ёсць і гаспадар яе – гэта сам народ, а як не гіне народ з нацыянальнай душой, так не загіне беларускі народ!*»

Бачанне ролі нацыянальнай мовы для беларусаў падкрэслівае і Алесь Гарун у вершы «Ты, мой брат, каго зваць беларусам»:

*Дык шануй, Беларус, сваю мову –*
*Гэты скарб нам на вечныя годы:*
*За пашану радзімаму слову*
*Ушануюць нас брацця-народы!*

Для Сяргея Палуяна «мова – форма нацыянальнай асобнасці».

Як бачым, кожны пісьменнік па-свойму акрэслівае ролю мовы як найважнейшай адзнакі нацыі, этнасу. Яны – пачынальнікі, стваральнікі – нібы пракокі, прадказвалі нялёгкі лёс нашай гаротніцы-мовы. Яны і сёння сваімі афарыстычнымі выслоўямі прасвятляюць вочы сляпым, падказваюць глухім, пераконваюць нявернікаў. У гэтым важнасць і вартасць афарыстычных выслоўяў пачынальнікаў нашай літаратуры.

*Родная мова* – паняцце вечнае. І натуральна, што яно знайшло своеасаблівае выражэнне, адлюстраванне ў афарыстычных выслоўях і ў творах беларускіх пісьменнікаў нашага складанага часу. Дарэчы, паняцце

*родная мова* асацыятыўна становіцца поруч з паняццямі *Радзіма, бацька і маці*: *Бацька, і маці, і родная мова, / узнятая к славе амаль з небыцця / паэтаў натхнёным і велічным словам, / для беларусаў – пытанне жыцця* (Л. Геніюш. Як бацька чакае сыноў...); *Долі інакшай не трэба зямной, / Сэрца лагоднее ад суцяшэння: / Родная мова ступала за мной / Ад калыханкі / Да галашэння* (Р. Барадулін. Долі інакшай не трэба зямной...); *Страціў слова, страціў спадчыннае слова – / Штосьці страціў у душы абавязкова* (Н. Гілевіч. Страціў слова, страціў спадчыннае слова...); *Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор – мова* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну); *Культура нацыі без культуры роднай мовы – нонсенс, бяссэнсіца* (Н. Гілевіч. Між былым і наступным); *Пакуль паэты будуць пець – / Не быць Радзіме безыменнай, / Зямлі бацькоў не анямець!* (Н. Гілевіч. Спявайце, юныя паэты!); *Душа становіцца безабароннай – / Душа без голасу зямлі сваёй* (А. Разанаў. Размова з планавіком); *Родны край і праз вякі пазна́ю / Па песні матчынай* (Н. Гілевіч. Я – за прагрэс).

*Радзіма, родная зямля, бацькаўшчына* – адзін з асноўных матываў творчасці кожнага пісьменніка. У афарызмах, прысвечаных роднаму краю, – асэнсаванне ролі Айчыны ў жыцці чалавека і месца чалавека ў ёй: *Жыві, шукай, усё рабі як след, / Каб на Радзіме твой свяціўся след* (С. Грахоўскі. Не здавайся, не ўпадзі ў адчай);

*Дзе пахавана твая маці, там і радзіма* (Г. Марчук. Голас і слова. Афарызмы); *Нам край належыць, пакуль ззяюць зоры* (А. Александровіч. Цені на сонцы); *Толькі страціўшы Радзіму, / Будзеш, як камень, / Сляпы і глухі* (М.Танк. Аслепшы); *Мы за цябе яшчэ не паміралі, / Мы для цябе, Радзіма, будзем жыць* (В. Вярба. Я не глытала па акопах дыму); *Зямля зялёная – бярыце / Для жыцця, і працы, і для мар* (П. Панчанка. Не люблю я...); *Хоць не забылі б сейбітавы дзеці, / Што сіла ў сіле роднае зямлі* (С. Грахоўскі. Зямля); *Карцінам трэба, як і людзям, / Жыць на сваёй святой зямлі* (П. Панчанка. Амерыканскія музеі).

Неаддзельная ад радзімы маці, якая дае жыццё, вучыць мудрасці яго пазнання. Яна – крыніца ўсяго святога, аснова духоўнага і маральнага існавання чалавека. Афарызмы пра маці ёмкія, лаканічныя, але глыбока філасофскія: *Голас незнаёмага можа здзівіць, / Голас друга – на хвіліну спыніць, / Голас любай – сагрэць сонцам лета, / Голас маці – вярнуць з таго свету* (М. Танк. Голас); *Мала маці мы любім, / Рэдка ласку ёй дорым* (П. Панчанка. Маці); *Маці – адзінае вышэйшае імя* (С. Грахоўскі. Высокае імя); *А доля ўсіх матак такая – / Дарогам сыноў аддаваць* (А. Пысін. Дарога); *Мне слова матчына не ў лішак... / Бязроднасць гневіць камяні* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь); *Калі б мы матак не хавалі, / Слёзы б не патрэбны нам былі* (А. Пысін. Не пялёсткі ганак усціпаюць); *Жаночае сэрца робіцца*

*вялікім, як свет, калі яно чуе боль знявечанага дзіцяці* (К. Чорны. Пошукі будучыні); *Бацькоўская хата без маці – / Што грудзі жывыя без сэрца* (М. Рудкоўскі. Дом без маці).

Афарызмы існавалі, існуюць і, бясспрэчна, будуць існаваць заўсёды. Гэта тлумачыцца філасафічнасцю, універсальнасцю, арыгінальнасцю такіх моўных формул. Што да колькаснага паказчыка, то можна адзначыць, што найбольшая колькасць афарызмаў прыпадае на пераломныя гістарычныя часы, – адсюль вынікае і іх тэматыка. Яны, нібы медыятары, звязваюць учарашняе і сённяшняе, высвечваюць заўтрашняе.

У навуковай літаратуры для абазначэнне афарыстычных адзінак паралельна выкарыстоўваюцца два тэрміны – афарызм і афарыстычнае выслоўе. Пад ***афарызмам*** разумеюць выказванне, якое перадае лагічна закончаную думку (суджэнне) – жыццёвае назіранне, заклік, разважанне, параду, выражаную ў яскравай, трапнай, лаканічнай форме. Да прыкладу: *Не можа звонкі салавей / свістаць па воўчых нотах*; *І гонар свой – не трэба нам благога. / І звычай свой – палюдску жыць з людзьмі*; *Каб з гнёздаў нам не пеўнікі на плот, / а горда арляняты вылятаці!* (Л. Геніюш); *Мэта жыцця – захаваць жыццё!* (Н. Арсеннева); *Што ёсць Суды – / Багі не вінаваты*; *Мы на Зямлі пазнаму святыя*; *Радзіма ж, ты сёння і потым, / на заўтрае і на святое!* (В. Аколава); *Быць шыпшынаю*

*шыпшыне, / Пакуль зямлі трымаецца карэннем; Гасподзь схіляецца да ўсіх, / Ды духам ніцых ён не чуе; Блізкай дзе няма душы, – / Пустыня* (Н. Мацяш); *Глядзіце зверху ўніз на травы / Ці на ваду, / Не на людзей* (П. Панчанка); *Для нас / стварыла нас прырода, / Каб цераз нас / спазнаць сябе* (У. Някляеў).

***Афарыстычнае выслоўе*** акрэсліваецца як глыбокая па змесце думка, выказаная невялікай колькасцю слоў, і фактычна выступае як агульная назва для ўсіх відаў трапных выказванняў, якія: па-першае, нясуць глыбокую, жыццёва важную, лагічна закончаную думку-суджэнне; па-другое, перадаюць яе лаканічна, выразна, трапна; па-трэцяе, уваходзяць у ідыяматыку мовы (разам з лексікай і фразеалогіяй) і таму без змен узнаўляюцца ў маўленні як гатовыя адзінкі. Сюды, такім чынам, адносяць афарызмы, крылатыя словы ў форме сказаў. Аўтары выдання ўжываюць тэрмін «афарыстычнае выслоўе» як выказванне з найбольш поўным і абагульненым афарыстычным зместам.

Афарызм уключае ў сябе нібы два планы: гэта *мудрае* выслоўе – план зместу, выказанае *ў трапнай, лаканічнай форме*, – план выражэння. Абодва планы знаходзяцца ў цесным адзінстве. Як правіла, афарызмы не перасыпаны вобразнымі сродкамі, небагатыя на эпітэты і метафары, яны не ўражваюць сваім моўным багаццем. Здавалася б, парадаксальная рэч: афарызмы кідаюцца ў вочы, пранікаюць у розум, западаюць у душу, а не з'яўляюцца ў моўным плане яркімі выслоўя-

мі. Значыць, іх «незвычайнасць» заснавана на своеасаблівым, надзвычай глыбокім змесце.

Даследчыкі класіфікуюць афарызмы на *моўныя* і *маўленчыя*. Да першых адносяць тыя, якія рэгулярна ўзнаўляюцца і зразумелыя без тэксту літаратурнага твора (і аўтара), адкуль яны ўзятыя. Маўленчыя афарызмы, як правіла, індывідуальна-аўтарскія, вобразнасць, афарыстычнасць іх выяўляецца непасрэдна з кантэксту, са зместу самога літаратурнага твора. Так, афарызм *Другі баран – ні «бэ», ні «мя», а любіць гучнае імя* з байкі К. Крапівы »Дыпламаваны баран» зразумелы і без зместу твора, бо афарыстычнасць яго вынікае са значэння яго кампанентаў: фразеалагізма *ні «бэ», ні «мя»* –'неадукаваны, непісьменны', лексем *другі* – 'нейкі, невядомы', *баран* – перан. 'неразумны, дурны'. Змест афарыстычных Купалавых радкоў *Не шукай ты шчасця, долі / На чужым, далёкім полі... / Не шукай сабе, мой братку, з ветрам Бацькаўшчыну-матку* ў поўнай меры зразумелы толькі пасля прачытання верша «Не шукай...», у якім паэт выказвае любоў, вернасць і адданасць роднай Беларусі – адзінай і непаўторнай сваёй Радзіме.

Важныя ў гэтым кантэксце і структура, і кампазіцыя афарызмаў. Як вядома, афарызмы падобныя да такіх выслоўяў, як прыказкі, прымаўкі. Калі параўнаць структуру і кампазіцыю гэтых дзвюх груп выслоўяў, то прыйдзем да наступнага вываду: большасць

прыказак і прымавак укладваецца ў пэўныя мадэлі – гэта, як правіла, розныя тыпы складаных сказаў, простыя сказы (аднасастаўныя і двухсастаўныя, поўныя і няпоўныя, ускладненыя і няўскладненыя, развітыя і неразвітыя), але гэта заўсёды сказы. Прыказкі (прымаўкі) – адзінкі мовы, яны ўзнаўляльныя і зразумелыя без кантэксту. Не заўсёды так у афарызмах. Большасць з іх таксама аднасказавыя адзінкі:

◊ простыя сказы: *А верш адпачынку не просіць* (П. Панчанка. З нас многія прагнуць...); *Без крылаў песні не ўзляцець высока* (А. Звонак. Без крылаў песні не ўзляцець высока...); *Воля сонейку раўня* (Я. Купала. Песні вольнага чалавека); *Да дрэў не вярнуцца лісткам адарваным* (Р. Баравікова. Пасля вяртання на радзіму); *Даравáць – не для кожнага гонар...* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь); *У кожным зерні новы колас / Вясны чакае* (С. Грахоўскі. Зерне);

◊ складаназлучаныя сказы: *Зару нельга спыніць, а за шчасце можна змагацца* (І. Дуброўскі. Скасаваны агрэх); *Беражы і ахоўвай / Залатыя правы / Нашай роднае мовы, – / І ты вечна жывы...* (М. Лужанін. Праводзіны); *Ад шчасця можна адкупіцца, / А смерць ніхто не падмануў* (В. Вярба. Даўгі); *Дабро мы можам ацаніць самі, а зло часцей за ўсё ацэньваюць на нашым горкім вопыце другія* (Г. Марчук. Голас і слова. Афарызмы);

◊ складаназалежныя сказы: *Каб расказалі ўсё магілы, / Слёз не хапіла б на зямлі* (С. Грахоўскі. Каб рас-

казалі...); *Што чакае за крутой гарой – / Высветліцца толькі на вяршыні* (Н. Мацяш. Паэма жніва); *Відаць, там шчасце не канчаецца, / Дзе ёсць прычыны для трывог* (А. Пысін. Балота патушыла аганькі); *Высокі сэнс жыцця і шчасця, / Калі жывеш ты для людзей* (А. Бялевіч. Аддам я радасць...);

◊ складаныя бяззлучнікавыя сказы: *Веру мусім прымаць напавер, / Вера трымаецца на даверы* (С. Багданкевіч. Вера); *Ісціна нагадвае яшчарку: яна хаваецца ад даследчыка, пакідаючы яму свае аўтографы – хвасты* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну); *Вер часу: глупства мудрых не скасіла, / Са сцежкі яснай зайздрасць не звяла...* (А. Звонак. Без крылаў песні не ўзляцець высока...);

◊ складаныя камбінаваныя канструкцыі: *Жывём наіўнасцю святой, / Наступным днём, а светлы той, / Калі табе прысніцца мама* (Р. Барадулін. Трыпутнік); *Гонар – як горан: ён асвятляе, і грэе чалавека, і дапамагае яму захаваць яго сапраўднае аблічча, яго чалавечы ранг... але тады, калі чалавек, як Богу, дазваляе гонару ўгрунтавацца ў нораў і розум і, як Бога, слухаецца яго, гонар «іграе» на чалавеку і «прайграе» яго* (А. Разанаў. Гонар); *Грамадства, якое кідае каменне ў сваіх паэтаў, – хворае, яго трэба неадкладна лячыць* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання); *Дарэмна ловіце вы ў сетку матылька, / Каб лепей крылы разглядзець; / Ударыўшы,*

*памне іх сецъ,/ І яркі пыл сатрэ няспрытная рука* (М. Багдановіч. Крытыку).

Аднак нярэдка можна сустрэць сярод афарызмаў і даволі разгорнутыя структуры – звышфразавыя адзінствы, перыяды і нават цэлыя тэксты: *Дарма пра песню пытацца ў глухога, / Дарма пра сонца пытацца ў сляпога, / Пра слодыч жыцця на зямлі – ў нежывога / І праўды шукаць у таго, хто нічога – / Ані сцяблінкі, ні дрэўца малога – / Не пасадзіў за свой век* (М. Танк. Дарма пра песню пытацца ў глухога...); *І радасць – ніякая радасць, а горыч, / І песня – ніякая песня, а скарга, / І страва – ніякая страва, а камень, / І брага– ніякая брага, а слёзы, / І сонца – ніякае сонца, а крыга, – / Калі ты на свеце ўсім гэтым / Не маеш з кім падзяліцца* (М. Танк. І радасць – ніякая радасць, а горыч...); *Народ – не зборышча, не гурт... / Калі ён сам сябе ўсвядоміў, / Сваю гісторыю, свой лёс, / Свае правы ва ўласным доме, –/ Тады – народ, тады – ён ёсць* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

У навуковай літаратуры акрэслена: *афарызмы* – кароткія вобразныя выслоўі. А дзе мяжа гэтай кароткасці? І што трэба паставіць на першае месца пры вызначэнні афарыстычнасці / неафарыстычнасці выказанага – думку ці колькасць слоў? Відаць, варта гаварыць пра малыя і вялікія афарыстычныя формы. Як пацвярджэнне сказанага прывядзём афарыстычны верш у прозе Ядвігіна Ш. «Раны»:

*Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя – гояцца, і па іх знаку няма. Большыя гояцца, але па іх застаюцца рубцы.*

*Гэтак на целе.*

*Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя – гояцца, па іх застаюцца рубцы. Большыя – заўсёды крывавяцца.*

*Гэтак на сэрцы.*

*Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя – заўсёды крывавяцца. Большыя – залечвае толькі ... смерць.*

*Гэтак на душы.*

Кожная з трох частак верша ўспрымаецца як цэласная. У іх аднолькавая колькасць сказаў – чатыры, прычым чацвёрты – *Гэтак на целе, Гэтак на сэрцы, Гэтак на душы* – своеасаблівы рэфрэн, які падводзіць вынік, ставячы кропку пасля трох папярэдніх. Адметную форму, своеасаблівы рытм надае твору паўтор першага і апошняга сказаў. Гэтыя кальцавыя паўторы нібы адбіваюць такт, падкрэсліваючы асобую, сталую рытміка-меладычнасць, інтанацыйную напружанасць. З кожнай часткай нарастае дынамізм аўтарскай думкі, што, у прыватнасці, праяўляецца і ў сінтаксічнай арганізацыі «Ран»: у першай частцы – два простыя і два складаназлучаныя сказы, у другой – тры простыя і адзін бяззлучнікавы складаны, у трэцяй – усе простыя.

І яшчэ адна дэталь: колькасць слоў у кожнай з частак адпаведна памяншаецца – 22, 17, 15; чым больш чалавеку баліць, чым больш ён узрушаны, тым менш слоў.

Тры часткі, з якіх складаюцца «Раны», – закончаныя празаічныя перыяды, што нагадваюць строфы вершаванага твора. Тэкст – без параўнанняў, метафар, эпітэтаў (таго, што называюць вобразнымі сродкамі), аднак *гаваркі*, мудры, багаты на думкі і пачуцці.

Змест «Ран» глыбока філасофскі. Каб напісаць так пра сваё, асабістае, трэба было зачэрпнуць з усеагульнага, з *чужога*, знайсці адпаведныя сродкі і спосабы, каб зпітаваць у адно цэлае эмоцыю і глыбіню думкі. І хоць твор напісаны з канкрэтнай нагоды, ён успрымаецца як пэўнае абагульненне. У такім выпадку, думаецца, можна з поўным правам гаварыць пра нацыянальны афарыстычны тэкст.

Паняцце ***афарыстычны тэкст*** у лінгвістычнай літаратуры акрэсліваецца неадназначна: як уласна афарызм – кароткае, дасціпнае, арыгінальнае выслоўе, якое мае закончаны змест і дасканалую форму, і як тэкст, які ўключае афарызм ці з якога можна лёгка *вылушчыць* афарызм (афарызмы). Аднак такое разуменне афарыстычнасці не заўсёды дакладнае і поўнае, бо ёсць цэлы шэраг мастацкіх тэкстаў, дзе на першы погляд няма ніводнага афарыстычнага выслоўя, хоць у творы і выражаецца глыбокая, па-філасофску абагульненая думка. Афарыстычнасць такога тэксту – у самім

яго змесце, у сутнасці і грамадскай значнасці яго асноўнай думкі.

Якія ж тэксты трэба лічыць афарыстычнымі? І што забяспечвае іх афарыстычнасць? Афарыстычны тэкст – гэта, найперш, сам афарызм як спецыфічны від тэксту (мікракантэкст, мікратэкст), у якім з надзвычайнай трапнасцю, вобразнасцю і лаканічнасцю акрэсліваецца сутнасць даволі складаных з'яў, падзей. Сярод іх афарыстычныя выслоўі шырока вядомыя, зразумелыя, аўтарства якіх ужо не звязваецца з канкрэтнымі творамі: *Быць ці не быць*; *Быццё вызначае свядомасць*; *Усяму свой час*; *Пераможцаў не судзяць*.

Гэта і аказіянальныя, індывідуальна-аўтарскія афарызмы, крыніца якіх – мастацкія і публіцыстычныя творы: *Кожны чалавек – гэта цэлы свет* (К. Чорны. Пошукі будучыні); *Бо мы толькі тады дачакаемся дня, / Калі нас не здалее змаганне злякаць* (М. Багдановіч. Нашых дзедаў душылі абшары лясоў); *Ад сябе самога не схавацца,/ Ад сябе самога не ўцячэш* (П. Панчанка. Вецер грукнуў форткаю); *Дабрата – гэта не толькі ад шчырасці, але і ад усведамлення сілы, ад дзейнай веры, якая не прымае маны, спекуляцыі на дарагім паняцці ці слове* (М. Стральцоў. Пры святле трывожнай памяці); *Думка ходзіць, дзе захоча: / Ад зямлі да зор і сонца / Няма думкам забароны* (Я. Колас. Сымон-музыка); *Капцы жадаюць вечнага спакою, / Жывыя – працаваць, кахаць і пець* (У. Караткевіч. Зямля дзя-

доў); *Ад шчасця можна адкупіцца, / А смерць ніхто не падмануў* (В. Вярба. Даўгі); *Мне для роднае маці не грэшна / Падарыць салаўіны мой гай, / На далоні падсмажыць яечню, / На далоні спячы каравай* (А. Бялевіч. На далоні спяку каравай); *Лашчыць і лечыць чалавечую душу часіна згоды ў прыродзе, але найлепшая згода для чалавека – згода з самім сабою, са сваім сумленнем* (М. Стральцоў. Разам з людзьмі); *Не помсці за крыўды, плаці лепш / дабром, – / Не з кожнай маланкай сябруе / і гром* (В. Аколава. Случарыны).

Гэта і асобныя афарыстычныя творы – афарызмы-макракантэксты (макратэксты): *Ты яшчэ толькі намёк на чалавека, / Калі ва ўсім спаздзяешся на маці; / Ты яшчэ – чвэрць чалавека, / Калі ва ўсім спадзяешся на дружбу; / Ты толькі – паўчалавека, / Калі ва ўсім спадзяешся на любоў, – / І толькі тады становішся Чалавекам, / Калі ўсе могуць спадзявацца / На цябе* (М. Танк. Ты яшчэ толькі намёк на чалавека...). *І радасць – ніякая радасць, а горыч, / І песня – ніякая песня, а скарга, / І страва – ніякая страва, а камень, / І брага – ніякая брага, а слёзы, / І сонца – ніякае сонца, а крыга, – / Калі ты на свеце ўсім гэтым / Не маеш з кім падзяліцца.* (М. Танк. І радасць – ніякая радасць, а горыч...).

Прыкладам такога афарыстычнага твора можа служыць верш П. Панчанкі «Той дзень прапаў...», дзе цэлыя страфы – афарыстычныя: *Той дзень прапаў і страчаны навекі, / Калі ты не зрабіў таго, што мог, / Калі не паспрыяў ты чалавеку, / Няшчыры быў, зманіў,*

*не дапамог; Той дзень, лічы, завянуў пустацветам, / Калі ты пяць хвілін пашкадаваў, / Каб дзецям паказаць куточак свету, / І хараство людзей, і дрэў, і траў; Той дзень збяднеў, зліняў на сотню радуг / І, попелам пасыпаны, сканаў, / Калі не падзяліў з суседам радасць / І больш за дзень узяў ты, чым аддаў.*

Тэкст (ці ўрывак) набывае афарыстычнасць, г. зн. становіцца афарыстычным, у выніку яго афарызацыі. Пад ***афарызацыяй*** канкрэтнага тэксту варта разумець працэс напаўнення яго надпадзейным, абагульненым, афарыстычным зместам з дапамогай адпаведных сродкаў мовы.

Можна вылучыць два асноўныя спосабы афарызацыі:

◊ ужыванне афарызмаў, аўтарства якіх не належыць таму, хто піша (гаворыць), а характар узнаўлення можа быць як масавы (афарыстычныя прыказкі, крылатыя выразы і іншыя ўстойлівыя выслоўі афарыстычнага тыпу), так і індывідуальны: ***Жыццё пражыць – Не поле перайсці,*** */ А трэба і жыццё / прайсці, як поле, / І хоць адным / Зярняткам узысці, / А бур'яном не зарасці ніколі* (С. Грахоўскі. Жыццё пражыць); ***Быццё вызначае свядомасць*** *кожнаму, а ён, гэты «кожны» з тубыльцаў нашай планеты, жыве ці жыў на свеце, а значыцца, мае справу з такой вялікай штукай, як само жыццё* (К. Чорны. Люба Лук'янская); ***Вольнаму – воля. Шалёнаму – поле. Святому – рай.*** *Шчасліваму – доля. Пчолцы – кветка.*

*Салаўю – май. Рыбе – вада. А што падкідышу?* (У. Ліпскі. Дай, божа, дзецям долю); ***Маўчанне*** */ Ніколі не было / І не будзе* ***золатам:*** */ Яно – або / У шмат разоў даражэйшае, / Або – нічога не вартае* (М. Танк. Маўчанне); ***Жыццё пражыць – не поле перайсці...*** */Ды ўсе і поле, і жыццё праходзяць* (М. Рудкоўскі. Прызнанні);

◊ выкарыстанне ў якасці аднаго з моўных сродкаў выражэння думкі таго, хто піша (гаворыць), выказванняў вядомых вучоных, грамадскіх дзеячаў абагульненай (генералізуючай) семантыкі, або так званых *універсальных* афарыстычных выказванняў, але не ўзноўленых, а створаных у маўленні, г. зн. казіянальных: *Як толькі Наталя пакахала Казіміра, яна не сказала яму пра сваю сям'ю. Не сказала, па-першае, таму, што не хацела расказваць пра свой боль і абразу, пра тое, што нехта так злосна пакрыўдзіў яе. Ёй было брыдка гаварыць пра гэта.* ***Гордасць – таксама,*** *мабыць,* ***жаночае хараство.*** *На тым жыцці яна паставіла крыж і не захацела ўспамінаць пра яго. Няхай лепш Казімір думае, што так, як і ўсе, яна была шчаслівая і што гэта шчасце забрала вайна* (Я. Скрыган. Наталя); *Надломы – не яму надломы, / пярун – і гэта ж не яму... / І захаваць не проста звесткі, / а запавет на ўсе часы: /* ***тады выстойваюць падлескі, / калі выстойваюць лясы!*** (А. Разанаў. Запавет); *Даўно з бяссмерцем / людзі ў добрай згодзе. / Яно заўжды трымаецца на тым – /* ***мы каласамі ў гэты свет прыходзім,*** */ Каб сілу даць*

***зярнятам маладым*** (С. Законнікаў. Даўно з бяссмерцем людзі ў добрай згодзе); ***Мы ўжо не просім міласці ў прыроды,*** */ Прырода моліць літасці у нас* (С. Грахоўскі. Літасць). Як бачым, вядомае выказванне *Мы не можам чакаць міласцей ад прыроды, узяць іх у яе – наша задача* лягло ў аснову афарыстычнага тэксту верша С. Грахоўскага «Літасць».

Часам афарызацыю паэтычнага тэксту забяспечваюць апошнія, падагульняльныя радкі вершаванага твора ці асобнай яго страфы. У іх – вынік асэнсаванага жыццёвага факта, з'явы, падзеі. Афарыстычным становіцца верш А. Разанава «Запавет» дзякуючы індывідуальна-аўтарскаму афарызму *...тады выстойваюць падлескі, калі выстойваюць лясы,* афарыстычнасць якога ставарае змест папярэдняга выказвання; назіраецца ўзаемаўплыў: тэкст нараджае афарызм – афарызм садзейнічае афарызацыі тэксту: *Надломы – не яму надломы, / пярун – і гэта не яму... / Уздымацца дрэву маладому, / мацнець / праз лета і зіму. / І захаваць не проста звесткі, / а запавет на ўсе часы: /* ***тады выстойваюць падлескі, / калі выстойваюць лясы.***

Такое ўзнікненне афарызма адбываецца ў творах са скрытай афарыстычнасцю: нараджаецца афарызм, які без кантэксту не ўспрымаецца, у сваю чаргу «легалізуецца» афарыстычнасць тэксту: ***Патрэбен чалавеку чалавек,*** */ Што прыйдзе у бядзе на дапамогу, / Што пракладзе надзейную дарогу / Над стромамі і над вірамі*

*рэк, / Што стане часткай сэрца і сумлення, / Што прыйдзе, як высокае натхненне, / І цеплыню і ласку прынясе* (С. Грахоўскі. Патрэбен чалавеку чалавек); *Але пакуль жывецца, – будзем жыць, / Задумваць не на дзень, а на стагоддзі; / Каханнем, хоць і познім, даражыць / Пры ветранай і сонечнай пагодзе, / І ўсё, што набалела, расказаць, / Нічога не забыцца, не адкласці, / Сустрэчнаму дарогу паказаць, / А час надыдзе –* ***на хаду упасці*** (С. Грахоўскі. Ты, мабыць, добра ведаеш сама...); *У кроплі крыві – акіяны няшчасця, / У кроплі віна радасць песні бруіцца, / У кроплі дажджу ўсе вясёлкі мігцяцца, /* ***У кожнай дзіцячай слязе – вобраз маці*** (М. Танк. У кроплі).

У некаторых выпадках кантэкст нагадвае аксюмаран, алагічнасць якога становіцца лагічнай у афарызме. Так у творы М. Багдановіча «Апокрыф»: *Добра быць коласам; але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком* (колас – хлеб, жыта, жыццё; васілёк – пустазелле ў жыце). ***Бо нашто каласы, калі няма васількоў?*** (Навошта матэрыяльнае, будзённае, калі няма духоўнага, высокага, – значыць, няма чалавека.)

Аднак ёсць тэксты, афарызацыя якіх ідзе іншым шляхам. Яна *скрытая, схаваная*. Як ілюстрацыю прыгадаем верш у прозе «Васількі» аднаго з пачынальнікаў беларускай літаратуры Ядвігіна Ш.:

*Васількі закрасавалі... Не, не закрасавалі.*

*Дзе ім цяпер красаваць? Холад. Зіма. Снег.*

*Не закрасавалі васількі; гэта толькі перад вачамі маімі міганулі яны. Нават не перад вачамі, а так недзе не то ў думках, не то ў душы ці сэрцы? Не ведаю дзе. Міганулі васількі: васількі ў жыце... неба, як васількі... як васількі, вочкі ... міганулі васількі і... счэзлі!..*

*У красе нашага жыцця мы любім, як красуюць васількі...*

*А калі паблекнуць васількі, паблекне неба, паблекне на душы, а на сэрцы ляжа холад; калі зямлю пакрые снег, а на тваю галаву быццам сыпне́ шоран; калі маеш штодзённы цёмны, горкі хлеб, – тады толькі ўспомніш, што гэта – ад васількоў, ад іх красы, бо... адкрасавалі васількі...*

Паспрабуем праанілізаваць гэты тэкст, каб зразумець, чаму ён успрымаецца як афарыстычны, адчуць і ўсвядоміць яго глыбокі, абагульняльны змест, «прачытаць» яго падтэкст. Ядвігін Ш. разважае пра сутнасць і значэнне прыгожага ў жыцці чалавека. Пісьменнік-філосаф увесь час нібы сумняваецца ў праўдзівасці сказанага, нібы спрачаецца з невядомым субяседнікам. Адсюль у пісьменніцкіх развагах пытальная інтанацыя, недаказанасць.

Сімвалам прыгажосці Ядвігін Ш. аб'яўляе васілёк, што так натуральна для беларуса і, у рэшце рэшт, для сапраўднага беларускага пісьменніка (нагадаем афарыстычныя радкі з верша М. Багдановіча «Слуцкія ткачыхі»: *І тчэ, забыўшыся, рука, / Заміж персідскага узору, / Цвяток радзімы васілька*, дзе *васілёк* – сімвал

роднага краю, Беларусі). У разуменні пісьменніка сапраўдная прыгажосць не заўсёды хаваецца за кідкай знешнасцю. Таму яе цяжка ўбачыць, яна амаль няўлоўная (*Мігануці васількі... Мігануці недзе: не то ў думках, не то ў душы ці сэрцы?*).

Але прыгажосць – усюды: на зямлі (*васількі ў жыце*), у яе насельнікаў (*як васількі, вочкі*), на небе (*неба, як васількі*). Параўнанне *як васількі* – нешта значна большае, чым звычайнае параўнанне. Супастаўленне, параўнанне тут якраз адыходзіць на дальні план, растварaецца ў глыбіні аўтарскай думкі і адначасова становіцца яе выразнікам, яе матэрыяльным сімвалам. Пра значнае, вялікае, абстрактнае разважаць складаней, чым пра нешта канкрэтнае. Больш эмоцый, чым логікі. Аўтар не навязвае свайго пункту погляду, не лічыць свае знаходкі-адкрыцці ісцінай у апошняй інстанцыі. Ён сам шукае, разважае, нібы просячы парады ў чытачоў. Гэта ў першай страфе верша.

У другой частцы «Васількоў» пісьменнік спрабуе апавядаць пра значэнне прыгожага ў жыцці кожнага чалавека, пра тое, што такое ўразуменне і асэнсаванне прыходзіць амаль у самым канцы жыцця (*А калі паблекнуць васількі, паблекне неба, паблекне на душы, а на сэрцы ляжа холад... бо ... адкрасавалі васількі*).

Што ж такое, паводле Ядвігіна Ш., прыгожае для чалавека? Гэта – духоўнасць, яго духоўны хлеб, які ро-

біць чалавека Чалавекам. І зусім не выпадковым бачыцца, што васількі ў творы пісьменніка не цвітуць, а *красуюць* (параўн. *красуе* жыта; жыта – хлеб; хлеб – жыццё).

Што ж пасадзейнічала афарызацыі «Васількоў» Ядвігіна Ш.? Гэта, як бачым, і тэма, і моўная арганізацыя тэксту, і форма, і стыль аўтара, які без перабольшання можна назваць *афарыстычным.*

Гэта, аднак, не ўніверсальныя сродкі і спосабы, прычыны і аргументы афарызацыі тэкстаў. У кожным канкрэтным выпадку яны свае, адметныя, непаўторныя.

У беларускай літаратуры ёсць пісьменнікі, стылю якіх уласціва афарыстычнасць, якія валодаюць *афарыстычным стылем* пісьма. Гэты аспект патрабуе і ўвагі, і спецыяльнага даследавання.

Арганічна ўліваючыся ў сусветную афарыстыку, беларускія афарыстычныя выслоўі даюць магчымасць убачыць асаблівасці менталітэту, культуры нацыі. І ў той жа час яны – выслоўі – з'яўляюцца ўніверсальнымі, прыдатнымі, прыгоднымі для ўсіх, хто мае душу, хто шануе думку і слова, хто верыць у мудрасць людзей.

## «КОЖНЫ ЧАЛАВЕК – ГЭТА ЦЭЛЫ СВЕТ»

### Чалавек, яго існасць, вартасць, значнасць; месца на зямлі

**А***дным ляцець высока, ходам крэсным – / Паўзці другім, хто розумам аглух* (А. Звонак. Фэст).

*Адны трымаюць нос высока, / Другія ў дол спускаюць вока* (Я. Колас. Новая зямля).

*Адных прывозілі таксісты, / Другіх прыносілі буслы* (А. Пісьмянкоў. Амаль жарт).

*Ад сябе самога не схавацца, / Ад сябе самога не ўцячэш* (П. Панчанка. Вецер грукнуў форткаю).

*А ў кандыдатах ніколі нястачы не бывае на свеце* (Я. Колас. Дрыгва).

**Б***алюча ведаць, які ты багаты, калі ўсе толькі і пераконваюць цябе, што ты самы бедны на зямлі!* (Я. Сіпакоў. Яма).

*Баюся тых, / што прытаіліся, / Баюся тых, / якіх не распазнаць* (А. Сербантовіч. Як існавала...).

*Без мазаля чалавека спрадвеку / Не лічаць у нас, не завуць чалавекам* (М. Рудкоўскі. Гасціну без чаркі...).

*Біяграфія – гісторыя чалавека* (М. Танк. Лісткі календара).

*Бо трэба ведаць, хто і дзе ты* (Я. Колас. Новая зямля).

*Бо чалавек – высокая пасада* (Я. Крупенька. Вянок братэрства).

*Бываюць жа такія людзі, што, сустрэўшыся нечакана, надоўга ў душы пакідаюць свой след* (Я. Скрыган. Слепата).

*Была б свіння, а лужа будзе* (У. Корбан. Марак).

*Быць чалавекам свайго часу трэба, дакладней кажучы, – нельга не быць. Але ж як гэта важна быць яшчэ і над часам, быць тым, хто бачыць далей наперад, вышэй – у агульначалавечае* (Я. Брыль. Вячэрняе).

*Быць чалавекам – цяжкае прызванне, / не ўсім, не кожнаму ўтрымаць яго* (Т. Бондар. Быць чалавекам – цяжкае прызванне...).

*Бязбожна блытаюць дзве розныя рэчы: вартасць з папулярнасцю, забываючы пра тое, што апошняя складаецца з элементаў ужо ўцэненых, страціўшых сваю арыгінальнасць* (М. Танк. Лісткі календара).

**В***ада і агонь, якія пярэчаць адно аднаму, міраццa на чалавеку: і вада ачышчае яго, і агонь таксама* (А. Разанаў. Паляванне ў райскай даліне).

*Вечназялёнага дрэва жыцця /Плод самы спелы і мудры садоўнік – / Ты, чалавек!* (С. Законнікаў. Дрэва жыцця).

*Вялікаму ўласціва не спяшацца* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Вялікая гэта справа – чалавечая адкрытасць, праўдзівая споведзь без грама разліку, жадання падаць сябе лепшым, чым ёсць на самай справе* (В. Быкаў. Кар'ер).

*Гадуе лічбы бег матораў, шын... /Мы – іх рабы, палоннікі, прыслуга... / Каб нас сейсмограф вартасці праслухаў – / У нашых душах нешта ад машын* (А. Камароўскі. Жалезны век).

*Геній адрозніваецца ад простага смяротнага тым, што ў яго няма геніяльных запатрабаванняў і прэтэнзій* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Геній не толькі стварае, умее ствараць, – геній умее ўбачыць, умее пачуць тое, што ёсць на свеце, у прыродзе, у людзях, на людзях* (Ф. Янкоўскі. З нялёгкіх дарог).

*Глыбакадумныя на фота, / Пустапарожнія ў жыцці* (П. Броўка. За вас мы рады, маладыя...).

*Голы, босы, адны косці, а бутэлькі гне* (Я. Колас. Пісаравы імяніны).

*Гэта вялікая справа – паставіць чалавека на сваё месца* (К. Крапіва. Што мне рупіць).

*Гэта страшна – адчуць сябе сярод мноства людзей чужым, адзінокім* (Я. Брыль. Свае старонкі).

*Гэта страшна – / Застацца патухлым вулканам, / Бачыць усё з вышыні / І маўчаць* (М. Арочка. Карадаг).

*Даецца толькі тым жывучасць,/ Хто годны ў муках сцвердзіць сваё «я»* (Н. Мацяш. Вярба).

*Дарэмная спроба – у культ вазвядзенне пасрэднай асобы* (В. Жуковіч. Яскравыя штрыхі).

*Да таго, хто забівае ў палёце ластаўку, з асцярогай падыходзяць і просты чалавек, і прэзідэнт* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Дбаючы разам з векам / Аб электронным цудзе, / Памятай – / чалавекам / Ніхто за цябе не будзе* (П. Макаль. На спадарожнікаў побыту...).

*Думай самастойна, чалавек!* (В. Жуковіч. На жалобным мітынгу).

*Думаць, што ён самы разумны, можа толькі самы дурны чалавек* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Дурань дурнем, але нават ён не кажа пра свае заганы* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Дурань таму і бліщчыць здалёк, што знаходзіцца не на сваім месцы* (К. Крапіва. Што мне рупіць).

*Ды ён жа двойчы хамелеон! / Там, дзе авечкі, – у шкуры авечай. / Там, дзе чалавекі, – у чалавечай* (А. Вярцінскі. Пра воўка памоўка...).

*Ды на зямлі ўсё ж ёсць адна істота, / Ад якой усе непамыслоты: / Сам на сябе палюе чалавек...* (Я. Сіпакоў. Што з табой, свеце мой любы...).

*Ды рыбакі не ўсе аднакі – / Свае ў іх густы і адзнакі* (Я. Колас. Новая зямля).

*Ды ўжо гэтакі род чалавечы, / Што, не хочучы боль свой забыць, / Ён чамусьці усё, што не вечна, / Будзе вечнай любоўю любіць* (А. Сербантовіч. Не за год, не за дзень – за імгненне...).

З*абыты гаспадар – нязваны госць* (Л. Рублеўская. Мяне шпурляюць хвалі...).

*Запалілі свечку, а вакол сляпыя* (Н. Гальпяровіч. Запалілі свечку, а вакол сляпыя...).

*Заўжды дурань лічыць дурнем / Іншых, толькі не сябе...* (П. Панчанка. Паэма майго лесу).

*Здараецца, што раптам адчуеш сябе пагарэльцам і ў жыцці, і ў літаратуры: маўляў, нічога ў цябе няма – ні хаты, ні двара, і ўсё, выключна ўсё трэба пачынаць спачатку...* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*З нас кожны ўсё жыццё паэму піша / На скрыжаваннях сцежак і дарог.* (С. Грахоўскі. Дарогі).

*Значная чалавечая асоба звычайна не крычыць пра сябе на ўсіх скрыжаваннях. Сціпласць для яе – часта неўсвядомлены спосаб абароны сваёй значнасці, боязь раўнадушнай людской цікавасці, помслівай зайздрасці і непавагі* (М. Стральцоў. І песняй).

***І** носам, і зрокам – каршун* (Я. Колас. Адплата).

*І светла нам, калі мы свецім, / І горка ад заган сваіх* (З. Дудзюк Як мы жывём...).

*І толькі той, хто будзе многа любіць і многа ведаць, зможа зрабіць нямала* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*І ў чалавека раны зарастуць, / Але рубцы навечна застануцца* (Ю. Свірка. У партызанскім лагеры).

*І я – як дрэва ў маладой абнове: / Глыбей карэнне – я вышэй расту* (Я. Крупенька. Вянок братэрства).

***К**аб не ерэтык Галілей, Зямля наша да гэтага часу стаяла б на трох кітах. Не было б Магелана – не было б і Амерыкі* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Калі багі раздавалі ўсім людзям талент, апошняму дастаўся толькі смех, на які ніхто не звярнуў увагі. Толькі потым з жахам схамянуліся багі, што чалавек, узброены смехам, можа аказацца дужэйшым за іх* (М. Танк. Лісткі календара).

*Калі нават на чале войска на чужую тэрыторыю ўвойдзе разумны і мудры генерал, ён усё роўна застанецца ў гісторыі як дзікі акупант* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Калі чакання невады з вады / Выцягваюць сушыць твае гады, – / Час пазнаёміцца з самім сабою* (Р. Барадулін. Трыпутнік).

*Калі чалавек атаясамліваецца са званнем, пасадай, заняткам, функцыяй, тады ён самаабмяжоўваецца, застойваецца, бо ні званне, ні занятак не здольныя эвалюцыяніраваць* (А. Разанаў. Зномы).

*Калі чалавек змагаецца, ён змагаецца і супраць сябе* (А. Разанаў. Зномы).

*Каму ж верыць, як не чалавеку ?* (К. Чорны. Вялікі дзень).

*Кароль на месцы пешкі надта смешны, / Ды ў дзесяць раз пацешней пешка / У каралёвай шапцы й сабалях* (М. Рудкоўскі. Верагоднае).

*Кожнага чалавека на зямлі трэба хваліць, але пры гэтым не перабольшваць* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Кожнай жывой істоце трэба мець штосьці СВАЁ* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Кожнаму свая слава ў родным кутку* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Кожны любіць цешыцца уладай, нават уладар малой пасады* (П. Панчанка. Думаю, думаю...).

*Кожны мае сваю арбіту, бліжэй да сонца імкнецца* (П. Панчанка. Думаю, думаю...).

*Кожны сам сваю капае студню* (Н. Мацяш. Студня).

*Кожны хацеў бы апошнім / стаць перад бядой* (Д. Бічэль-Загнетава. Каб не разбіцца...).

*Кожны чалавек – ад прыроды чалавек. Жыццё робіць з яго генія або злыдня* (В. Быкаў. Трэцяя ракета).

*Кожны чалавек – гэта свет, адна істота – неабдымны прастор, і разглядай яго, калі ўмееш* (К. Чорны. Вечар).

*Кожны чалавек – гэта цэлы свет* (К. Чорны. Пошукі будучыні).

*Кожны чалавек імкнецца да шчасця. Шукае, як шукальнік залатую жылу* (І. Грамовіч. Чужога поля).

*Кожны чалавек мае права любіць нешта асабліва моцна* (М. Стральцоў. Заўтра футбол).

*Кожны чалавек носіць у сабе храм. Штодзень, з году ў год. Толькі ў адных ён маўчыць, а ў другіх звоніць на ўсе свае званы. Але ёсць яшчэ і трэція: званы раздзіраюць такому душу, аднак ніхто гэтага звону не чуе – чалавек не выпускае яго з сябе. Апошнія паміраюць першымі – раней за ўсіх. Ад карозіі храма, які яны носяць у сабе. А раўнадушныя сцвярджаюць – ад разрыву сэрца* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

*Кожны чалавек павінен добра ведаць сваё месца на зямлі* (М. Стральцоў. Заўтра футбол).

*Кожны чалавек хоча быць хоць каму патрэбны* (Л. Галубовіч. Зацемкі з левай кішэні).

***Л****юбіце тут. / Любіць дарэмна там. / Бо чалавек жа бачыцца здалёк. / Бо чалавек жа бачыцца па справах* (А. Салтук. Не трэба спачувальных тэлеграм...).

***М****не людзі бачацца багамі / Часінай першай баразны* (С. Законнікаў. Наскрозь прасвечаныя сонцам).

***Н****а зямлі – адзіная удача: / Ў вечным слове чалавекам быць* (А. Пысін. Цёзкі, сваякі, аднафамільцы...).

*Нашто ва ўсю трубу трубіць / Аб тым, як іншых судзіш строга. / Ты хочаш свет перарабіць? / Дык пачынай з сябе самога!* (П. Макаль. Нашто ва ўсю трубу трубіць...).

*Не будзем, крый Бог, параўноўвацца, аднак, дзеля патрэбнага часам супакаення ад залішняга самаедства, успомнім чалавечую складанасць і вялікіх, у каго мы вучымся* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Не гаспадар злы – кажа ўсякі, – / А гаспадарскія сабакі* (Я. Колас. Новая зямля).

*Не, не здаволіш чалавека, / І будзе вечна ён калека: / Чаго-нібудзь, а будзе брак* (Я. Колас. Новая зямля).

*Не па адзенні чалавека цэнім, / Разумным лічым не за горы кніг* (У. Дзюба. Споведзь).

*Не спадзявайся на пракрокаў – / Будзь сам пракрокам, чалавек* (А. Бачыла. Не спадзявайся на прарокаў).

*Не шукай на свеце нейкую падкову, /Што прыносіць шчасце і знішчае злосць. / Не чакай ад неба цудаў і спакою, / Ведай: / На Зямлі ты – гаспадар, не госць* (П. Пруднікаў. Падкова).

*Ніколі не страціць для нас цікавасці чалавек, бо праяўленне яго розуму бязмежна, бо дарогі яго не вызначаны, бо формы яго жыцця і яго адносіны да другіх людзей бясконца разнастайныя, канчаткова не выяўлены* (Я. Колас. У палескай глушы).

*Ніхто чалавека не тыраніць больш, чым ён сам сябе* (В. Быкаў. Трэцяя ракета).

*Нішто – кароль без каваля, / І ўсё – каваль без караля* (А. Вольскі. Пра кавалёў і каралёў).

*Ніякіх скідак на імклівы век! / Душа не знойдзе аніякіх лекаў, / Калі ў жалезным веку чалавек / Не будзе заставацца Чалавекам* (А. Камароўскі. Жалезны век).

*Няма на свеце такога невясёлага становішча, дзе б вясёлыя людзі не знайшлі сабе весялосці* (Я. Колас. На ростанях).

**О**, *боязь за другога чалавека!.. /Адна ты робіш чалавека з нас* ( Н. Мацяш. За соснамі – мора).

*О, ты Сальмон у нас вялікі, / Як на чытанне, так на лікі...* (Я. Колас. Новая зямля).

*О, як трэба шукаць на шляхах чалавека, / Як любіць, берагчы, не крыўдзіць яго, / Каб пабачыць славу наступнага века / Ў сэрцы сціплага сына суседа свайго!*

(У. Караткевіч. На паўстанках, засыпаных лісцем бярозавым...).

***П****азнаць не трудна чалавека / Па ўсіх паводзінах яго, – / Ці ён гультай, ці недарэка, / Ці не стае яму чаго* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Пакінь адну пасаду – / Быць Чалавекам на зямлі* (С. Грахоўскі. Хваляванне).

*Пакуты робяць чалавека чалавекам. / Чалавек без пакут – трава* (В. Быкаў. Трэцяя ракета).

*Палі ты яго і расстрэльвай, / А ён, славянін, будзе жыць* (Я. Колас. Адплата).

*Палюбі чалавека, зразумей чалавека, / памажы чалавеку, калі ты чалавек* (Р. Тармола-Мірскі. Палюбі чалавека).

*Пара быць Чалавекам чалавеку* (С. Грахоўскі. Пакрыўдзіў, кажуць, чалавека лёс).

*Па-рознаму страчаюць чалавека – / Шавец глядзіць, якія ў цябе боты, / Кравец глядзіць, як твой касцюм пашыты, / Як ты падстрыжаны, глядзіць цырульнік, / А я, паэт, гляджу, якія ў каго вочы...* (А. Лойка. Па-рознаму страчаюць чалавека...).

*Перашкоды – брускі, якія альбо вострацъ лязо чалавечай існасці, альбо – у залежнасці ад таго, як яно ставіцца да іх, – шчарбацяць яго і тупяць* (А. Разанаў. Зномы).

*Покі Юрка не меў чына, / Быў нішто сабе дзяціна* (Я. Купала. Чары).

***Р**азумны чалавек заўсёды ратуе свой народ, / а дурны яго забівае* (Я. Сіпакоў. Одзіум).

*Рацыяналіст забірае сваё і для сябе ад кожнага дня* (Г. Марчук. Голас і слова).

***С**абе сам пан, сабе сам служка* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Самы дасканалы чалавек – гэта чалавек з памылкамі* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Складана чалавекам быць. / Астатняе ўсё – / проста!* (М. Арочка. Складанасці жыцця...).

*Сумна тваё адцвітанне, / Квеце зямлі, чалавек!* (У. Жылка. Virelai).

*Сутнасць: не я лепшы за ўсіх, а я – такі ж, як і ўсе* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Сябе мы часам выстаўляем, / А добрага ў другіх не прыкмячаем* (Э. Валасевіч. Мёд і Рэдзька).

*Сябе не зразумець – / Не зразумець нікога* (В. Шніп. Адзінота).

***Т**ак бывае цяжка паверыць у прарока ў Айчыне сваёй!* (М. Стральцоў. Чалавек з Малой Багацькаўкі).

*Толькі асоба, якая да самазабыцця любіць сваю зямлю, якая шырока і глыбока глядзіць на свет і жыццё, можа спадзявацца на сапраўднае прызнанне і на такую вялікую радасць – павагу свайго – і не толькі свайго! – народа* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Трэба верыць сабе, / слухаць сэрцам зямлю, / Спасцігаць дабраты таямніцы...* (С. Законнікаў. Зарыпіць сініх зорак у небе жарства...).

*Ты– човен, браце, без вясла* (Я. Колас. У бяссонне).

**У** *абозе нас не шукай* (П. Панчанка. Афіцэры запаса).

*Удалы чалавек і чорта запражэ ў воз* (Г. Марчук. Голас і слова. Афарызмы).

*У істоце той, якою быць не выпала, / Сябе адчуй хоць зрэдку, чалавек!* (А. Пысін. Мяркуй, што робіш для душы сваёй...).

*У кожнага зара сваіх надзей, / радасці свае, свае турботы. / Таму не можа звонкі салавей, / пяюн вясны, свістаць па воўчых нотах* (Л. Геніюш. У кожнага зара сваіх надзей...).

*У кожнага з людзей свае даліны і ўзгоркі, свая хада па іх, а неба, зорнае неба – адно...* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*У кожным цудзе не без чалавека. А ў кожным чалавеку не без цуда* (У. Ліпскі. Шукай сябе).

*У кожным чалавеку льга знайсці частачку душы паэта* (К. Чорны. Скіп'еўскі лес).

*У ласых да сну – ўкарачаецца век./ Адольвае іх дрымота і сала, / Жывёлай становіцца чалавек* (Я. Янішчыц. Галалёд).

*Усе ведаюць, што вакол нас – бязмежжа, але ніхто не ведае, што ў нас саміх – яшчэ большае бязмежжа* (Я. Сіпакоў. Адзін з нас).

*Усё патрэбнае чалавеку – у ім самім, ён можа змясціць у сабе ўвесь свет, які ніхто не адбярэ* (В. Іпатава. 20 хвілін з Немезідай).

*Усіх пачаткаў я – працяг, / Усіх працягаў я – пачатак* (В. Зуёнак. Мільёны год...).

*У халёнага, хамелеоннага, / Прыстасаванага і не ўлюбёнага / У нашу зямлю – не ўздрыгне душа* (Я. Янішчыц. Зорная паэма).

*У Чырвоную кнігу занесены рэдкія прадстаўнікі фаўны і флоры. Толькі чалавека там няма* (А. Вялюгін. Паслоўе).

**Ц***аніце чалавека / Заўсёды пры жыцці* (П. Панчанка. Залатое зерне).

**Ч***алавек, аказваецца, як і дрэва, пускае карані, а то і парасткі, дзе б ні апынуўся, на якую б зямлю яго ні пасадзілі* (Б. Сачанка. Сцяпан Сцяпанавіч Замошка).

*Чалавек без бацькоўскага краю, / Як без песні ў гаі салавей* (А. Бялевіч. Бацькоўскі край).

*Чалавек без вачэй – яшчэ чалавек... Чалавек без слыху – яшчэ чалавек... І без рук ды без ног чалавек – чалавек... Чалавека няма без душы!* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Чалавек – бездань і неба адначасова* (С. Алексіевіч. Зачараваныя смерцю).

*Чалавек – гэта два чалавекі, як дзве / далоні, што лепяць суладна снежку ці / перакідваюць, каб утрымаць, жарыну: / адзін з іх – пачатак, другі – завяршэнне, / адзін з іх – выток, другі – сутох, / адзін з іх – прычына, другі з іх – вынік, / адзін з іх – пытанне, другі – адказ, /*

*а паміж імі цякуць, вынікаючы з іх / і ўпадаючы ў іх, сусветы... Калі чалавек сустрэнецца з чалавекам* (А. Разанаў. Вастрыё стралы).

*Чалавек жа, нават і акамянелы, не бывае без сэрца* (К. Чорны. Пошукі будучыні).

*Чалавек жыве дзеля дабра, дзеля служэння праўдзе, каб стварыць нейкія вартасці жыцця і каб быць карысным іншым* (Я. Колас. У палескай глушы).

*Чалавек жыве, жыве, а потым памірае, як быццам і не падумаўшы, што гэта ж –* ***назаўсёды*** (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Чалавек жыве ілюзіямі. Незадаволены тым, што мае, ён стварае казку пра лепшае і пачынае жыць у ёй, як за сценамі пабудаванага самім шклянога палаца* (А. Кудравец. Успамін пра шэршня).

*Чалавек жыве ў звязку з усім і толькі таму зусім не памірае* (Л. Галубовіч. Зацемкі з левай кішэні).

*Чалавек заўжды мае патрэбу ў суцяшэнні* (В. Быкаў. Кар'ер).

*Чалавек – заўсёды бог. Але тады, калі ён падобны толькі на самога сябе* (Я. Скрыган. Дзядзька Цішка).

*Чалавекі як ліхтары – / У кожнага / Свечка душы ўнутры* (Р. Барадулін. Ксты).

*Чалавек мае найвялікшую здольнасць – смяяцца з самога сябе* (Я. Скрыган. Смага).

*Чалавек, мяркую, дзеля таго і прыходзіць на свет, каб жыць, а жыць – значыць працай сваёй рабіць добрае* (А. Марціновіч. Цень крумкачовага крыла).

*Чалавек моцнай волі... Чалавек, які можа памерці, калі захоча, і які не памрэ, як бы да гэтага ні прымушалі абставіны* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Чалавек не знікае так, / Бы ў кішэні вякоў пятак* (Р. Барадулін. Вечалле).

*Чалавек не толькі часовы, але і пазачасавы, і з гэтай пазачасавасцю, як са сваёй жабрацкай перспектывай, сустракаецца не толькі ў канцы свайго шляху, але і ў кожным яго пункце, калі адважваецца паглядзець над сабой, калі ўскрыльвае духам* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

*Чалавек павінен умець не толькі стрымліваць свае пачуцці. Ён павінен умець і абурацца, пратэставаць, калі гэта трэба* (І. Шамякін. У добры час).

*Чалавек памірае, калі страчвае здольнасць / Здзіўляцца і захапляцца / Жыццём* (М. Танк. Дрэвы паміраюць).

*Чалавек спакайнейшы і шчаслівейшы, калі ён кіруецца характарыстыкамі жыцця, а не яго фактамі* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Чалавек спрабуе сябе / ад пачатку дзён да канца. / Чалавек спрабуе сябе – /і сумненням няма канца!* (Е. Лось. Чалавек спрабуе сябе...).

*Чалавек – сусвету цар* (А. Бялевіч. Чалавек сусвету цар).

*Чалавек таму і чалавек, / Што Учора ў ім жыве заўсёды* (К. Цвірка. Зноў – сівец, і хвойка, і дымок...).

*Чалавек – трэска на вяршыні хвалі, і хваля круціць гэтую трэску так, як захоча* (В. Іпатава. За морам Хвалынскім).

*Чалавеку дадзена не ўсё ведаць, але вельмі шмат памятаць* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Чалавек усё ж павінен / Баяцца нечага ў жыцці* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Чалавеку ўсё ў радасць, а каб ён асэнсаваў цану гэтай радасці, часам засылаецца і гора* (Г. Марчук. Голас і слова. Афарызмы).

*Чалавеку цяжка перарабіцца адразу. Можна думаць і гаварыць іначай, а сам чалавек доўга будзе ранейшым* (К. Чорны. Лявон Бушмар).

*Чалавеку юнацтва даюць толькі раз – / Хай жа будзе яно хоць шчаслівым* (А. Бачыла. Шмат чаго перажыць было суджана мне...).

*Чалавеку, які не зразумее сябе ў цяжкім мінулым, нялёгка будзе і ў светлай будучыні* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Чалавек, што лунае высока, / з вышыні не даказвае гарт* (Е. Лось. У жыцці з яго днямі крутымі...).

*Чалавецтва, стань жа ўрэшце / Чалавекам* (В. Зуёнак. Гэта памяць – праз вякі...).

*Чый лік / я на зямлі памножу – / Гаспадароў або гасцей?* (С. Законнікаў. Спрадвечны круг жыцця і смерці...).

*Чым больш з людзей хто выдатнейшы, / Таго і зоркі блеск яснейшы* (Я. Колас. Новая зямля).

*Чым большы начальнік, чым вышэй сядзіць, тым цяжэй яго дастаць* (Б. Сачанка. Родны кут).

***Што** ні асоба – свой узор, / Свая пасада і свой двор* (Я. Колас. Новая зямля).

***Як** бы я тады глядзеў, каб я твае акуляры надзеў...* (Я. Колас. Адукацыя).

*Як добра, што ва ўсе вякі / Жывуць на свеце дзівакі* (С. Грахоўскі. Дзівакі).

*Які ён гога! Які дока! / Як ён сябе нясе высока!* (Я. Колас. Новая зямля).

*Як паглядзіш – божа мілы! / Што з людзямі робіць чын!* (Я. Колас. Кірыла).

*Я не адзінокі, / я адпаведны* (А. Разанаў. Першая паэма шляху).

*Я – чалавек. / Я не ў гасцях. / Я – дома. / Пакуль жыву – не ведаю мяжы* (Л. Галубовіч. За трыццаць мне. Жыццё маё ўставала...).

*Яшчэ графой: разумны або дурань? / Хацелася б анкету надтачыць...* (С. Законнікаў. Народны выраз).

## *«НЯПРОСТАЯ, ЯК СВЕТ, ЛЮДСКАЯ ГОДНАСЦЬ»*

Гонар, годнасць чалавека, народа;
павага, пашана

***А** буду – прысутным! – / памру, ды не вымру* (С. Панізнік. Прысутны знак).

*А буслы белы гонар маюць...* (Э. Акулін. А буслы белы гонар маюць...).

*Адны жабракі могуць праз усё жыццё толькі браць* (М. Багдановіч. Забыты шлях).

*Адны сцягі нідзе не плачуць, / Хоць і схіляюцца сцягі* (К. Кірэенка. Сябе не стану перайначваць...).

*Адольваючы моцную даўно, / Спакуслівую сэрцу іншароднасць, / Няпростая, як свет, / людская годнасць / Па рысачцы складаецца адной* (Л. Тарасюк. Цвіла рака).

*Але ў святла – святая тайна: / Разліцца ў колерах усіх* (Л. Тарасюк. Яшчэ пад зоркай чысціні...).

*А можа, першы воўк ёсць той сабака, / Які лізнуць адмовіўся руку?* (А. Сербантовіч. Ваўчыца).

*Апынуся калі сярод чорных варон, – / Я памру, ды не буду па-іхняму каркаць* (Я. Янішчыц. Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён...).

*Арол застаецца арлом / І з адным крылом* (Р. Барадулін. Ксты).

*Асёл, нагружаны цюкамі кніг, / Яшчэ не мае годнасці вучонай!* (А. Звонак. Асёл і конь).

*А хто не паважае сябе, таго і другія не паважаюць* (Я. Колас. Дуб і чароціна).

**Б***аляваў, зухаваў, / Ды свой гонар пахаваў* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Браток, Ямелю не зваляй! / Сястра, не зблоць Жанчыны!* (Я. Янішчыц. Спрабую ўласны боль забіць...).

*Быць людзьмі. / Не толькі імі звацца* (Л. Геніюш. Мне патрэбны бор стары сасновы...).

*Быць пігмеем ці лепей –/ Са стромы?* (М. Арочка. Камарыная алегорыя).

*Быць сабою самім / І не лёгка й не проста* (М. Рудкоўскі. Яшчэ раз пра моду).

***В****едаем, жывём занадта мала, / Каб напрыканцы не шкадаваць, / Што не ўсё, чым доля нас вітала, / З годнасцю мы ўмелі адвітаць* (Н. Мацяш. Ведаем, жывём занадта мала...).

*Вянкоў мы славы не насілі* (Я. Купала. Наша мінуўшчына).

***Г****аршчок агорнуты пашанай, / Хоць ён фаміліі глінянай* (Я. Колас. Новая зямля).

*Глядзіце зверху ўніз на травы / Ці на ваду, / Не на людзей* (П. Панчанка. Глядзіце...).

*Гонар – як горан: ён асвятляе і грэе чалавека і дапамагае яму захаваць яго сапраўднае аблічча, яго чалавечы ранг... але тады, калі чалавек, як Богу, дазваляе гонару ўгрунтавацца ў нораў і розум і, як Бога, слухаецца яго, гонар «іграе» на чалавеку і «прайграе» яго* (А. Разанаў. Гонар).

***Д****араваць – не для кожнага гонар...* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

*Дрэннаму – не пакарыцца. / Добрае не празяваць. / З дробнай хлуснёй не мірыцца, / З буйнай хлуснёй ваяваць* (П. Панчанка. Мала сказаць ненавіджу...).

*Дрэнна, непрыемна і крыўдна хваліцца тым, што над табою зліталіся, цябе пашкадавалі* (Я. Брыль. Свае старонкі).

*Ды наш народ – асілак-дуб / І сцяг высока ўмее несці* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Ды сатварыцца з нас нашчадкаў час, / Народ – не раб, не скот, не кат – / ды сатварыцца* (І. Багдановіч. Сымон Канарскі).

**Ё***сць подзвіг прывычны – ісці... А ёсць і такі – застацца!* (Е. Лось. Я думаю, гэта няпроста...).

**З***вацца героеў нашчадкамі проста, / Але не так проста быць роўнымі ім!* (К. Кірэенка. Помнік герою рэвалюцыі).

*Знявага і павага / Заўсёды побач крочаць* (А. Пысін. Знявага і павага...).

**І** *гонар свой – не трэба нам благога. / І звычай свой па-людску жыць з людзьмі. / Дабро сваё, не трэба нам чужога. / І будзе ўсё. Бо з працавітых мы* (Л. Геніюш. Па-беларуску).

*І там, дзе сустракаюць па адзенні,– / Наіўныя, не ўбачыце мяне* (Я. Янішчыц. Жыццё маё – узлёты і падзенні).

*І ў тым, каб доляй роднай даражыць, / Не выглядаючы выгодаў лепшых... / Перад няўмольнасцю зямлёю легчы – / Ёсць толькі права / чалавекам быць* (Л. Тарасюк. Цвіла рака).

***К****алі пакідае каханая, / Навекі табе жаданая, – / Не пакажыся чэзлым, / Зацюканым і балесным, / Не апускайся на дно* (А. Грачанікаў. Нават ценю свайго...).

*Калі рака ты – быць ракой павінна, / Не паступацца чысцінёй нідзе...* (Л. Тарасюк. Цвіла рака).

*Калі ты выпіў з крывадушнікам на брудэршафт, ты таксама крывадушнік* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Кінь сваркі і звадкі, адной дзеці маткі – /Мы злучаны думкай аднэй; /Пры згодзе і ладзе ў нас доля засядзе, /Палічаць і нас за людзей* (Я. Купала. За праўду).

***Л****епей зламацца зусім, чым гнуцца ўсякай сіле* (Я. Колас. Дуб і чароціна).

*Лябедзіку, застанься недасяжным, / высока шыю белую нясі, / не распускайся птахам нехлямяжным / і мяккай булкі з рук ты не прасі!* (Е. Лось. Лебедзь).

***М****іласць – горды знак* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

***Н****а гонары далёка не заедзеш* (І. Шамякін. Непаўторная вясна).

*Найсаладзей быць чалавекам унізе, чым варонай на вышыні* (У. Ліпскі. Дай, божа, дзецям долю).

*Нам, як пачатак буквара, – / Святло, Любоў і Годнасць* (Я. Янішчыц. Спрабую ўласны боль забіць...).

*Нацыя, / Якая пакорна маўчыць, / Якая забыла пра годнасць, /Якая не ўмее / Нічым даражыць: / Ні краем, / Ні словам родным, / Якая памерці згодна, – / Ці мае*

*права / Нацыяй быць?!* (М. Башлакоў. Адзінокай свечкай стыне).

*Не выклікай / да сябе шкадавання, / Лепш выклікай / на сябе агонь!..* (К. Кірэенка. Палымянкам).

*Не, мы – не лісце на вятрах* (К. Цвірка. Лісце).

*Не хавайце ў магілу мовы, / Сваіх звычаяў і імя, / Крывічы мы, род ганаровы, / І не зроджаны да ярма* (Л. Геніюш. Крывічы мы...).

*Няма гордасці за самога сябе, ёсць гордасць за другіх, каб, гледзячы на іх, ніколі не таміцца жыць* (Я. Скрыган. Гордасць).

**П***авага – самае святое, / Бо людзей з нас лепіць на зямлі* (Н. Мацяш. Паэма жніва).

*Павага толькі з тым гатова знацца, / Хто ўмее плённай працай / Дабівацца / Узлёту, дасягненняў, росту* (У. Корбан. Балонка і павага).

*Павагу не здабудзе / Сям'я, дзе культ валля. / Дзяцей гадуйце, людзі, – / І ўспомніць вас Зямля* (С. Законнікаў. І ўспомніць вас Зямля).

*Паненскі стан трымала цвёрда, / Каб гонар быў і жаніху!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

**Р***абом тваім быць не жадаю / і царом тваім быць не хачу* (В. Жуковіч. Ты прыгожая, маладая...).

**С***амы вялікі мужчынскі наш грэх – / грэх супраць жаночай гордасці* (А. Вярцінскі. Жаночая гордасць).

*Свой гонар страцілі панкі – /Ўзялі над імі верх жанкі* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Славяцца людзі гуманнасцю спраў. / Не сілай, а веліччу сэрца* (Л. Геніюш. Славяцца людзі...).

*Супраць буры плыць куды пачэсней, / Чым схіліць пакорліва калені* (А. Звонак. Вечар носіць лёгкія сняжынкі...).

*Сцеражыце ж годнасць чалавечую. / Як жыццё, яна у нас – адна* (Л. Геніюш. Моцны дух наш – дарагое рэчыва...).

*Там, / дзе панішчаны гаспадары, / Пасуцца выслужнікі табунамі* (Р. Барадулін. Там...).

*Тых, хто носіць небасхіл у сэрцы, / Нельга ні уджаліць, ні забіць* (У. Караткевіч. Рэчка Папараць).

*Ты – чалавек. / Калі бяда паўзе, / Прад ёй ніколі не спяшай здавацца. / Адлюстраваны у тваёй слязе, / Павінен свет не плакаць, / а смяяцца* (С. Законнікаў. Хвароба, смутак, радасны настрой...).

*Усё мінае – / Гонар не мінае, / Бо народжаны адным сумленнем* (У. Караткевіч. Васілю Быкаву).

*У снежнай наквіцi душы / Ніколі сэрца не прымусіш / Красу і гордасць патушыць* (П. Трус. Зіма... І золкія завеі...).

*Халодная ўвага / не вартая ўвагі* (А. Куляшоў. Спакойнага шчасця не зычу нікому...).

*Хоць раз, ды добра агрызнуўся!* (Я. Колас. Новая зямля).

*Хто не здольны прад здзекам спыніцца – / Панаваць той не будзе ніколі* (Л. Геніюш. На магілах не сеюць пшаніцы...).

**Ц***і не лепш: што ні маем – усё напаказ, / Каб убачыць, што ганьбіць, / што ўсцешвае нас* (А. Бачыла. І намеру такога Прырода не мае...).

**Я** *на панскі капялюш / Брыль свой не змяняю* (Я. Колас. Рыбакова хата).

## *«МІЖ ЛЮДЗЕЙ БЫЦЬ НЕ МОЖА СТАРОННЯГА БОЛЮ»*

### Людзі, народ, нацыя; чалавек і грамадства; чалавек і сусвет; дзяржава і закон; улада; палітыка

**А***дна ў людзей надзея: / на людзей* (У. Някляеў. Ружа вятроў).

*А людства будзе жыць, бо кожны з нас / Па-свойму рысы Бога паўтарае* (Р. Барадулін. А людства будзе жыць, бо кожны з нас...).

*А непадсудны хіба толькі робат: / Яму нішто людское не баліць* (Н. Мацяш. Вечназялёнаю галінай – спробы...).

**Б***ачу я: нехта некага любіць, / Гэта іх справа, / гэта іх права./ Бачу я: нехта некага губіць. / Тут і мая ўжо справа* (А. Вярцінскі. Бачу я...).

*Бедны запомніць багатыя дні. / Бедныя дні не забудзе багаты* (Р. Барадулін. Кожнаму).

*Болем чужым станаўлюся відушчая* (Н. Загорская. Талент Касандры).

*Быць не можа ў братэрства нічыйных палос, / Між людзей / быць не можа староннняга болю!* (Н. Мацяш. Балада руху).

*Быць панамі / не надакучыла панам* (В. Жуковіч. Хворым на панства).

***Г**аварыць з незнаёмым чалавекам, які разумее цябе, – асалода. Маўчаць з блізкім чалавекам, які таксама разумее цябе, – яшчэ большая асалода* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Глядзі людзей, ідзі з людзьмі – чалавекам будзеш* (Ф. Янкоўскі. З нялёгкіх дарог).

*Грамадства, якое кідае каменне ў сваіх паэтаў, – хворае, яго трэба неадкладна лячыць* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

*Гэты свет – / Высокая гаспода, / І ў гаспадзе / Мусім жыць людзьмі* (Р. Барадулін. Прымі!).

***Д**ае Ўсявышні сілу вышыні / Таму, хто рады ёю падзяліцца* (Р. Барадулін. Сіла вышыні).

*Дарога / можа / згубіцца, / Ды знойдзе яе / Народ!* (У. Карызна. Дыялог).

*Дзе разбураюцца асновы ладу, / Усталяванага паміж людзей, – / Там немінуча ўсё ідзе к распаду* (Н. Гілевіч. «Паланэз» Агінскага).

*Дзіва з дзіў для чалавека: ён часовы...* (Н. Мацяш. Набалелае).

*Дзяржава – гэта заўсёды перашкода чалавеку, але ж гэта і яго спакой* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Добра служыць з добрымі людзьмі, а калі пачнуць кусаць адзін другога, то доўга не паслужыш* (Я. Колас. Малады дубок).

*Добрыя людзі – лепшыя дзеці народа* (А. Вярцінскі. Оды добрым людзям).

*Дурань сам па сабе не такі і страшны, а калі падумаць, колькі дурняў, за якімі агромністая сіла ўлады, на якую ён, кожны ўсеўладны дурань, апіраецца* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

**З***а добрым князем народ спявае? / Не, князь славуты сваім народам...* (Т. Бондар. Рагнеда).

*Закон / Ахоўвае матэрыю* (У. Някляеў. Арменія).

*Законам ахвяры ўраўнаважваецца закон улады* (А. Разанаў. Заваёўнікі–ІІ).

*Закон прыроды: / хто бліжэй да неба, / Таму абавязкова халадней* (У. Скарынкін. Ветах у зеніце).

*Законы не сцэнічныя ў гандлярстве* (В. Аколава. Мальер на мінскай Камароўцы).

*З глыбіняў вякоў узнікаюць і зноўку знікаюць дарожныя знакі – людзі, што сустракаюцца нам на нашых шляхах* (А. Разанаў. Дарожныя знакі).

*Змяні свой вузенькі настрой / На шырыню людскіх настрояў* (П. Глебка. Кармэнсіта).

**І** *адзіным выйсцем будзе ў безвыходнай той журбе: / Памагаць чым можаш людзям і не плакаць аб сабе* (Н. Мацяш. Амаль казка).

*І гора – паўгора, калі з людзьмі разам* (А. Макаёнак. Трыбунал).

*І гор у нас няма аніякіх – / Ды людзі ёсць – вышэй ад гор* (П. Броўка. Бывае, хтосьці запытае...).

*І грамада, і я – / нас, блізкіх, двое... / Дай грамадзе маё, а не чужое!* (Е. Лось. Рэдактар кажа...).

*І радасць – ніякая радасць, а горыч, / І песня – ніякая песня, а скарга, / І страва – ніякая страва, а камень, / І брага– ніякая брага, а слёзы, / І сонца – ніякае сонца, а крыга, – / Калі ты на свеце ўсім гэтым / Не маеш з кім падзяліцца.* (М. Танк. І радасць – ніякая радасць, а горыч...).

*І ў тон адзін з зямлёю я пяю, / І кожны міг сябе я пазнаю / Часцінкай злітаю вялікага сусвету* (Я. Колас. Я жыву).

*І чужая бяда азываецца болем* (С. Грахоўскі. Дома).

**К***аб выкурыць сваю люльку жыцця, трэба ж ад некага ўзяць агеньчыку* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Каб людзі ў шматмільярдным стане / Нарэшце зваліся людзьмі* (Н. Мацяш. Голас чацвёртай).

*Каб шчаслівым быць, / Патрэбна не сябе – другіх любіць* (А. Вярцінскі. Шкада мне вас).

*Калі ён сам сябе ўсвядоміў, / Сваю гісторыю, свой лёс, / Свае правы ва ўласным доме, – / Тады – народ, тады – ён ёсць* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Калі ж смяецца грамада, / То смех такі гаворыць многа* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Калі ж цябе не пакідалі, / Людской разлукі не адчуць* (П. Броўка. Ну што ж, бывае і заплачаш...).

*Калі мы лічым адно аднаго на пальцах – нас шмат, / калі мы лічым адно аднаго па душах – нас мала: / нам яшчэ трэба ўбачыць у іншых сябе, у сабе – нябёсы, у нябёсах – сонца, а ў сонцы – сонцалюдзей* (А. Разанаў. Вастрыё стралы).

*Калі мы не ўстанем самі – / Не падыме нас ніхто* (У. Караткевіч. Наследаванне Сыракомлю).

*Калі не буду я сабою, / Хто стане поруч і за мной?* (М. Лужанін. Як нараджаўся новы свет).

*Калі прыдворныя гавораць за народ / і называюць свой народ шчаслівым / (усё адно, ці слепа, ці лісліва), – / існуе тыранія і прыгнёт* (В. Жуковіч. Праклён).

*Калі прыціснуць беды, / Лягчэй, як хтосьці ёсць з табой* (П. Броўка. Маім сябрам).

*Калі твая будучыня / сумесціцца з будучыняй сусвету – / усе словы дарэчы, / усе ўчынкі да месца, / усе стрэлы ляцяць у цэль* (А. Разанаў. Пункціры).

*Калі ты ад клапот / Жыццёвых стараніўся, / Ні хлебам, ні вадой / З сябрамі не дзяліўся, / Нікога не сагрэў / Ні словам, ні спагадай / І ніву не прыкрыў / Грудзьмі ад градападу, / Заўсёды за другіх / Хаваўся ў ліхалеццe, – / Лічы, што не было / Цябе на гэтым свеце* (М. Танк. Калі ты ад клапот...).

*Калі ты з панам не ў ладу, / Трымайся лепш за грамаду* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Калі ты камусьці хоць трошкі патрэбен, / Дык хочацца шчодра і радасна жыць* (С. Грахоўскі. Прызнанне).

*Калі ты патрэбны хоць аднаму чалавеку, можаш лічыць сябе шчаслівым* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Калі чалавек вырасціць у сабе сапраўднага дасканалага чалавека, калі ён нарэшце зразумее, што ўся праўда жыцця ў ім самім, ён створыць на зямлі сапраўдную чалавечую еднасць* (В. Іпатава. 20 хвілін з Немезідай).

*Калі чалавек у масе, ён невідочны, але ён бессмяротны* (В. Іпатава. Ластаўка).

*Калі чуць толькі ўласнае сэрца, / Лепш стрымаць яго, каб не грымела* (Д. Бічэль-Загнетава. Супольна).

*Калі я ў свеце чалавек, / Свет мусіць вечным быць!..* (А. Лойка. На тым стаю, таго гляджу...).

*Канца надзей / Няма ў трывожным свеце, / Пакуль ёсць роднасць між людзей* (С. Законнікаў. Падзяка зялёнаму чаю).

*Кінь сваркі і звадкі, адной дзеці маткі – /Мы злучаны думкай аднэй; /Пры згодзе і ладзе ў нас доля засядзе, /Палічаць і нас за людзей* (Я. Купала. За праўду).

*Кіраваць то ты кіруй, / Ды не вельмі тузай* (К. Крапіва. Едзе крытык маладых).

*Кожны народ мае свой твар* (Я. Колас. У палескай глушы).

*Кожны народ сам сабе пан* (Я. Купала. Ворагам Беларушчыны).

*Крылаты заўжды асмяецца бяскрылымі* (Н. Мацяш. М. Багдановічу).

*Крычым не толькі ад болю свайго – /Яго было б нямнога, – / Крычым мы ад болю ўсяго / Свету зямнога* (А. Вярцінскі. Косім траву – яна крычыць).

*Куды, і па што, і якая пагоня / Трасе ў ліхаманцы разумны народ?* (Я. Янішчыц. Наконт гарадскога мыслення...).

*Лепей недаацаніць сябе, чым пераацаніць. Калі недаацэніш – цябе папрвяць людзі. Пераацэніш – таксама паправяць пасля...* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Лёс кожнага – гэта свой лёс, але без лёсу народа няма і свайго лёсу* (Я. Скрыган. Трывогі).

*Любая прафесія заўсёды была і будзе прывадам, што злучае чалавека і грамадства* (М. Стральцоў. Пры святле трывожнай памяці).

*Любіць трэба ўсе народы, а песціць свой* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Людзей заўсёды да бяды і слёз / Даводзяць абыякавыя людзі* (С. Грахоўскі. Пакрыўдзіў, кажуць, чалавека лёс).

*Людзей смяшы, а сам не смейся* (Я. Брыль. Вачыма друга).

*Людзі ваду да сябе ўздымаюць, / Быдла – схіляецца да вады* (У. Караткевіч. Чашы слёз).

*Людзі / глядзяць у будучыню, / мінулае – / на людзей* (А. Разанаў. Пункціры).

*Людзі, людзі, жывіце нармальна / І пра будучы думайце век* (П. Панчанка. Лясы і рэкі).

*Людзі нясуць свой уласны крыж на сваю ўласную галгофу* (А. Дудараў. Самы цяжкі на свеце крыж).

*Людзі падобныя на запалкі: / калі не гараць – утульваюцца ў бяспеку, / калі гараць – адтульваюцца для свабоды* (А. Разанаў. Пункціры).

*Людзі робяць вясну / І пагоду на свеце!* (А. Бялевіч. Вясна-красна на дварэ...).

*Людзі хочуць, каб званні і славу /Не давалі нікому дарма...* (Г. Бураўкін. Адышлі ў нябыт панегірыкі...).

*Людзі! Цану велічы ведаючы, / смейцеся смела над маніяй велічы* (А. Вярцінскі. Пра веліч).

*Людзі як бы некуды ўзвышаюцца, а застаюцца вечнымі сярод зладзейства, злачынства, варожасці, гвалту...* (У. Ліпскі. Снег на галаве).

*Людзі, як і зёлкі, чый род – палыновы* (Н. Мацяш. Пространь кахання).

*Людзьмі жывіце, людзі, – / І ўспомніць вас Зямля!* (С. Законнікаў. І ўспомніць вас Зямля).

*Лягчэй таму знайсці / Шлях да людскога гора, / Хто меў сваё ў жыцці* (М. Лужанін. Лявоніха).

*Маліцца будуць, калі ты ў славе, / Калі ты ў горы – з насмешкай плюнуць* (П. Панчанка. Прыстасаванцы).

*Малыя народы – як грошы разменныя ў касах* (П. Панчанка. Развітанне).

*Мой крык перад малітвай свету – ноль!* (Я. Купала. Маё цярпенне).

*Мы вартыя не тым, / хто больш сабе нагроб, / А тым – хто больш / аддаў па-людску людзям* (А. Бачыла. Вартасць).

*Мы – насенне жыцця* (А. Разанаў. Пункціры).

*Мы слухаем маўклівае міжзор'е, / А блізкіх нам не можам зразумець* (Г. Бураўкін. Мы хочам зразумець галактык мову...).

*Мы суддзямі тых не выбіралі, / што асуджалі ўсіх на здзек* (П. Панчанка. Думаю, думаю...).

*Мы ў маўчанні – рабы́* (І. Аколава. Маўчанне вачэй).

***Н**ават замілаванне да ўсіх пакрыўджаных трымаецца на клопатах аб сваім уласным шчасці* (К. Чорны. Сястра).

*Нават найпершыя людзі – / Адам і Ева – / Не былі адзінокія / У сусвеце* (Н. Мацяш. І дзеля цябе).

*Навошта бяссрэбранікам серабро – / пасрэдных людзей пасрэднік! / (Гэта ўжо так: серабро – або чыстасумленны бяссрэбранік)* (А. Вярцінскі. Бяссрэбранікі).

*Навошта ж на зямлі / Сваркі і звадкі, боль і горыч, / Калі ўсе мы разам ляцім / Да зор?* (М. Багдановіч. Я хацеў бы спаткацца...).

*На змену тым, што пайшлі ў запас, – / Новыя меры, сферы і эры* (А. Вярцінскі. Бар'ер).

*Нам потым лічыць недароды, / Бо сеялі часта на вецер... / Ідзе размыванне пароды... / Вось так паміраюць народы: / У нас, / А пасля – / і ў дзецях* (А. Камароўскі. Губляюцца фарбы, адценні...).

*На развалінах сем'яў ці можна пабудаваць моцную, цывілізаваную дзяржаву?* (У. Ліпскі. Дай, божа, дзецям долю).

*Народа не народзіш спакваля* (Д. Бічэль-Загнетава. Глядзіш з партрэта на мяне здаля).

*Народа няма напалову – / Ён ёсць ці яго няма* (В. Зуёнак. На скрыжаваннях сусвету...).

*Народ ганяе «Запарожца»! / Народу «Волга» ні к чаму!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Народ куляе стаканамі, / Народ кілішкамі не п'е* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Народ кускі бярэ рукамі! / Народ відэльцамі не есць!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Народ не гоніцца за смакам! / Народ на градусы глядзіць* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Народ не дурны, але часцяком абдураны* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Народ – не зборышча, не гурт... / Калі ён сам сябе ўсвядоміў, / Сваю гісторыю, / Свой лёс, / Свае правы ва ўласным доме, – / Тады – народ, тады – ён ёсць* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Народ не носіць габардзіну, / Народ апрануты ў паркаль* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Народ не слухае сімфоній! / Яму «Лявоніху» падай!..* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Народ не цэніць благавухаў – / Ён любіць водар сенажу!..* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Народ сябе пазнаць павінен! / Народ – не зборышча, не гурт. / Ён мусіць мець – інакш загіне! – /Усведамлення цвёрды грунт* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Народ умее сумяшчацца, / Народ душою не азыз. / Не сумяшчаецца мяшчанства – / З капрызам дробязным капрыз!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Народ усмак цярэбіць кільку! / Народ не просіць селядца!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Не бядней мы за славутыя еўропы, – / проста надта заклапочаны народ... / Нам баляць усе патравы і патопы, / і шкадуем мы сябе на ўсякі зброд* (Е. Лось. Позна вечарам у горадзе пустынна...).

*Нельга ўкараніць у народ чужароднае – у якой бы ўпакоўцы яно ні прапаноўвалася* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Не называйце экстрэмістамі / народы...* (В. Жуковіч. Не называйце экстрэмістамі... .).

*Не спявай пра цёплы кут за грубай, / Пакуль горам поўніцца зямля* (У. Караткевіч. Цвыркун і праблема чыстага мастацтва).

*Не судзі чалавека, калі не жывеш адным з ім жыццём* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Ніякага глупства, ніякага свінства з боку чалавека, што дапускае ён у адносінах да іншых, жыццё не даруе* (Я. Колас. На ростанях).

*Нямала ёсць правадыроў, / Якія любяць люд працоўны / За тое толькі, безумоўна, / Што любяць яго кроў* (К. Крапіва. Вол і Авадзень).

*О, гэта ідэал, каб людзі былі веліканамі ў душы* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Палітыка, ты яд змяіны ў роце* (В. Аколава. Мальер на мінскай Камароўцы).

*Палітыцы – ўсе хлопцы халастыя!* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

*Памагаць, чым можаш, людзям / І не плакаць аб сабе* (Н. Мацяш. Амаль казка).

*Пара быць Чалавекам чалавеку* (С. Грахоўскі. Пакрыўдзіў, кажуць, чалавека лёс).

*Пасада сама па сабе змушае прыніжаць любога чалавека, які стаіць па службовай лесвіцы ніжэй за цябе* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Планета жыве для людзей. / І ніколі не згасне, не згіне* (Н. Загорская. Пасля чарнобыльскай бяды).

*Прагрэс – удасканальванне недасканаласці: яна не знікае, яна не пераадольваецца, яна кшталтуецца* (А. Разанаў. Зномы).

*Прайсці праз сытасць, а душой застацца / Без чорных плям, / з сумленнем не лаўчыць – / Вось гэтаму вя-*

*лікаму мастацтву / Сям'ёй народнай трэба ўсіх вучыць* (С. Законнікаў. Кульмінацыя).

*Пра сталасць і вартасць народа, нацыі сведчыць не тое, якіх талентаў, якіх геніяў нарадзіў народ, а тое, як ставіцца народ, нацыя да народжаных сваіх талентаў, геніяў, як народ, нацыя з імі абышлася і абыходзіцца* (Ф. Янкоўскі. Само слова гаворыць).

*Прыйшлі і адышлі ў нябыт манархі – / Народы застаюцца назаўжды* (В. Зуёнак. Бахчысарайскі палац).

*Прыносяць шчасце людзям людзі, / Бяды – за грошы не пазбыць* (С. Грахоўскі. Пра шчасце).

*Пытаешся, які народ нікчэмны? Дзе ў меншасці пустыя галовы, а ў большасці злыя душы* (Г. Марчук. Голас і слова).

***Р****аскрыймася найлепшым у сабе* (Н. Мацяш. Песня ў цярноўніку).

***С****вае халеры – паўбяды, / а сцюжа чужая – ўдвайне суровая* (А. Вярцінскі. Колькі лет, колькі зім!).

*Сваёй бядзе – не лепшыя мы суддзі. / Лягчэй за ўсё / Ірваць чужую ніць* (А. Бачыла. Сваёй бядзе – не лепшыя мы суддзі...).

*Сініцай не адбудзеш, / Пільнуйся жураўля. / Аб шчасці дбайце, людзі, – / І ўспомніць вас Зямля* (С. Законнікаў. І ўспомніць вас Зямля).

*Супярэчнасці ўнутры народа можа вырашыць толькі сам народ. Збоку вырашыць іх немагчыма. Распаліць, яшчэ больш развярэдзіць збоку іх можна. Вырашыць – ніколі* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

*Сусвет адзіны: / мы – у ім, / і ў нас – ён* (А. Разанаў. Паэзія парушанай мяжы).

***Т**ой дзень зусім закрэслены табою, / Калі ты раўнадушна абмінуў / Бяду чужую, пабаяўся болю, / Абразу хама моўчкі праглынуў* (П. Панчанка. Той дзень прапаў...).

*Травінка кволая – / І тая не ўзрастае / Дзеля самой сябе* ( Н. Мацяш. Нашто мне гэты дзень...).

*Трывучы мой народ, / А песняю – параніш* (Я. Янішчыц. Прызнанне вачамі).

***У** людзей не пазычыш для ўласнае роспачы слёз* (А. Вольскі. Белы попел).

*У палёце імкліва-зямным / Мы, зямляне, – / Ў адным экіпажы!* (М. Арочка. У лядовай разведцы).

*Усе людзі нараджаюцца роўнымі перад жыццём. Гэта час і пасады іх потым падзеляць на вялікіх і малых, на адказных і простых, на тых, хто кіруе, і на тых, хто мусіць падпарадкоўвацца* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Усе пакуты чалавецтва – ад недахопу інфармацыі* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Хвалімся: глядзім у свет далёка, / З выкладкай прадвызначаных вех!.. / А не бачым часта, як пад бокам / Самы блізкі / гіне чалавек* (К. Кірэенка. Глядзім у свет далёка...).

*Хіба яна* [маладзіца] *вінавата, што яе зрабілі такою... пацяробкі культуры* (Я. Колас. У палескай глушы).

*Хочаш сябе ты пазнаць, – / паглядзі на людзей, на іх справы; / Хочаш людзей зразумець, – / у сэрца сваё зазірні!* (М. Багдановіч. З Шылера).

*Хто ж дужэй ад грамады?* (Я. Колас. Песні вясны).

*Хто на вяку задужа крыўд зазнае, – / Не зробіць бліжняму ніякае бяды* (А. Бачыла. Яблыня).

*Цёмнымі і даверлівымі лягчэй камандаваць* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Цяжка расці сярод людзей, у якіх няма чаму павучыцца* (М. Танк. Лісткі календара).

*Цяпер маленькія краіны могуць такое натварыць, што і вялікія не рассёрбаюць* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Чалавек павінен чалавеку / Радасці прыносіць кожны дзень* (С. Грахоўскі. Нельга ні забыцца, ні адкласці).

*Чуе ў бядзе чалавек чалавека. / Да Чалавека ідзе Чалавек* (Я. Янішчыц. Зорная паэма).

*Чым больш я адзіны, тым больш усіхні, чым больш непаўторны, тым больш увабраў у сябе паўтораў, чым*

*больш неўміручы, тым болей адкрыты смерці...* (А. Разанаў. Вастрыё стралы).

*Чым вышэйшы ўзровень культуры таго ці іншага народа, тым больш таленавітых людзей з гэтага народа ведаюць у свеце* (Г. Марчук. Голас і слова).

***Ш**то ні бывала ў гаспадарцы, / дзе не было гаспадара!..* (В. Жуковіч. Развітанне).

***Я** ганаруся абавязкам – / Быць чалавекам для людзей* (К. Кірэенка. Абавязак).

*Які вялікі цяжар нясе на плячах той, за якога хоча трымацца многа людзей* (К. Чорны. Вялікі дзень).

*Як страшна ў вялікай дзеі / Не апраўдаць давер грамады, / Сваіх ашукаць надзеі!* (Н. Гілевіч. Недзяленя).

*Як у садзе няма непрыгожых, не вартых увагі дрэў, так у жыцці няма нецікавых людзей* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Як цывілізацыя нішчыць прыроду, так хамы – грамадства* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Як часта атруту не лічым атрутай / І дзверы адчыненымі пакідаем* (М. Танк. Амстэрдам).

*Я павінен сумець пераканаць людзей рабіць тое, што мне трэба, але каб ім здавалася, нібыта яны самі таго хочуць, а я толькі разумею іх патрэбы* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Я па тым цаню суседа, / Як наклёпана каса* (Я. Янішчыц. Што за гонкая травіца).

# «І ЯК НЕ ШАНАВАЦЬ ПРЫРОДЫ ГОДНАСЦЬ»

## Прырода і чалавек; законы прыроды

*А вачам усё роўна, / што – камень, а што – хлеб* (А. Разанаў. Пункціры).

*Ад прыроды шпак, / А выпендрываецца, як калібры* (Р. Барадулін. Смаргонская акадэмія).

*Акаляючага асяроддзя / Для мяне няма, / не існуе. / Асяроддзе ёсць машын і прэсаў...* (С. Законнікаў. Да пытання пра акаляючае асяроддзе).

*Але ж колькі ні стой у цені, некалі ўсё роўна давядзецца зноў выходзіць на сонца* (Я. Сіпакоў. Заложнік).

*Але лісточкі – яшчэ не дрэва* (А. Вярцінскі. Дрэва жыцця).

*Але не кожны сцяміць мовы / І жальбы ветру між будовы...* (Я. Колас. Новая зямля).

*Арол быў сыты, і цяпер быў ён падобны нечым на варон* (А. Вярцінскі. Тры прытчы).

*Арол не чуе курыцы* (А. Вялюгін. Вецер з Волгі).

*А сосны ідуць не толькі на мачты* (А. Вялюгін. Пад ветразем у полі).

*Асяроддзе выштурхоўвае з сябе, знішчае тое, што нясе яму згубу* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*А як свет ёсць, як зоры гарацць, / Як над морамі сонца ходзіць, / Ці святло з цемрай можна яднаць, / Ці былі яны дзе у згодзе?* (А. Лойка. Балада Тадж-Махала).

***Б**ез сонца / Не родзяцца травы, былінкі* (Я. Колас. Адплата).

***В**ада з балота можа стаць святой. / Растуць спакойна дрэвы на іконы* (Р. Барадулін. Маці і хлеб).

*Вада з камня не ўцячэцца, / холадам зіме не грэцца* (В. Аколава. Случарынкі).

*Вада і тая / Не ўсюды роўны нораў мае* (Я. Колас. Новая зямля).

*Вада няйначай кроў зямлі, / Яна – нязмернае багацце* (П. Броўка. Вада).

*Вада пустаты не трывае...* (К. Цвірка. Закон вады).

*Вада – такая рэч, што не можа доўга стаяць на адным месцы: спакой – вадзе гібель* (Я. Колас. Супраць вады).

*Ваўку не трэба хітраваць вучыцца...* (А. Сербантовіч. Ваўчыца).

*Вельмі няўрымслівая гэта рэч – знайсці душэўны лад са сваім наваколлем* (Я. Скрыган. Мой сусед Іван Мележ).

*Вы – / Не арлы / І вы – Не вораны* (У. Дзюба. Мацней, крыло!).

*Выток і рэк і шляхоў адзіны: / Ад непрыкметнае ручаіны / Паходзяць плыні / рэк паўнаводных, / Шляхі – / ад рэчышчаў пешаходных* (А. Куляшоў. Далёка да акіяна).

*Вялікі колас – сэнс высокі* (А. Лойка. Вялікі колас...).

*Вясна, як і хвароба, пачынаецца з прадчування* (А. Кудравец. Успамін пра шэршня).

*Гасяць, чуў я, пажары лясныя / Сустрэчным агнём...* (А. Куляшоў. Грозная пушча).

*Гром для вёскі сына – / Лепша музыка на свеце...* (Я. Колас. Веснавыя хмаркі).

*Дай бог арла варонай не назваць, / Варону жа арлом – нічога* (М. Багдановіч. Варона і чыж).

*Дзяцел так даваў дразда, што аж даў дуба* (У. Ліпскі. Дай, божа, дзецям долю).

*Для воўка выць ці не выць – тое, што «быць ці не быць»* (А. Вярцінскі. Вызначым першую тэзу).

*Для нас – прыроды болей мілай, / Чым беларуская, няма: / Яна ж усіх нас надзяліла / Душой такою, як сама!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Для нас / стварыла нас прырода, / Каб цераз нас / Спазнаць сябе* (У. Някляеў. Маланка).

*Добры з ваўка музы́ка, / Ды не скакаць пад выццё* (М. Танк. Добры з ваўка музы́ка...).

*Дык нашто ж уваскрасаюць травы/ Там, дзе лугу быць і немагчыма?* (Н. Мацяш. Што ёсць сэнс? Няўжо адзіна справа...).

*Ды не апынішся ты ў становішчы сабакі, які сядзіць на плоце!* (Я. Колас. У палескай глушы).

*Дыплом я заслужыў, здаецца ж, галавою* (К. Крапіва. Дыпламаваны баран).

*Жыта, жыта, вечны скарб, / Спажытак чалавечых цела і душы* (Н. Мацяш. Тры каласкі любові і смутку).

*Забілі зайца, не забілі, / Але ж, брат, гуку нарабілі* (Я. Колас. Новая зямля).

*Забыты той, хто першы дубчык ссек, / Праклятьі, хто апошні секчы будзе!..* (А. Лойка. Мялеюць рэкі)

*Закон адвечны і мудры: / калі сустрэнуць вясну, / жанчыны скінуць футры, / дрэвы накінуць ліству. / Будуць, па тым законе, / жанчыны нас хваляваць, / а дрэвы супакойваць, / думкі навяваць* (А. Вярцінскі. Вясновы закон).

*Закон прыроды: / хто бліжэй да неба, / Таму абавязкова халадней* (У. Скарынкін. Ветах у зеніце).

*Заўжды існуе недзе гай расцвілы / І светлякі ў зраселай мураве* (Н. Мацяш. Вечназялёнаю галінай – спробы...).

*З вёскі пачынаецца горад. / Ці помніць пра гэта ён?* (А. Вярцінскі. Прадмесце).

*Зламаны колас на сцябліне – / як жураўель на папялішчы* (М. Арочка. Колас на іржышчы).

*Зорка – гэта свечка / у Храме сусвету, / запаленая самім Богам* (В. Шніп. Зорка).

*Зоркі-месяц – не пажары... / На няпраўду няма пары!* (В. Аколава. На рацэ Прыманцы...).

*І авечка, хоць дурная, / А ваўка пазнае!* (Ф. Багушэвіч. Воўк і авечка).

*І ніхто няхай не забывае, што ён частка вялікай прыроды* (Я. Колас. Вадаспад).

*Іржа заўжды для шчасця боязь, / Яна й жалезу для згрызот* (А. Астрэйка. Калі дакучлівая дробязь...).

*І так змяркаецца, / што хочацца святлець...* (У. Марук. Прыгнуўся хвойнік... ).

*І як не шанаваць / Прыроды годнасць, / Калі бясконца / Ёй у вечнасць плыць, / Каб праз смяротнасць / Звядаць несмяротнасць, / І ў несмяротнасці – / Смяротнай быць* (А. Грачанікаў. Каля дарогі шапаціць таполя...).

*Калі ёсць у сэрцы любоў да ўсяго жывога – вось пачатак шчасця* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Калі плачуць сокалы – то і гром маўчыць* (В. Акалава. На рацэ Прыманцы...).

*Калі пойдзе дождж, то верабей і сам знойдзе сабе кавалачак страхі* (К. Чорны. Бацькаўшчына).

*Карціна – толькі адно імгненне, а прырода – гэта ж няспынны рух* (А. Чарнышэвіч. Світанне).

*Лес – гэта святарнае мейсца, / для душаў аблудных меса* (А. Сыс. Пан Лес).

*Лес – гэта храм* (А. Сыс. Пан Лес).

*Лес заўсёды расце для таго, каб яго сеч. У гэтым вечнае абнаўленне* (К. Чорны. Сястра).

*Лес не сякуць языкамі* (К. Крапіва. Лясная казка).

*Лес рэдка калі маўчыць. Прывычнае вуха ловіць у ім галасы, але ніхто яшчэ не сцяміў тайны яго мовы* (Я. Колас. Зімні вечар).

*Лес шумеў і будзе шумець* (Я. Брыль. На Быстранцы).

*Любіць Радзіму да скону, / так, / Як любяць расліны – сонца* (Л. Рублеўская. Настаўнік).

***М**нога цікавага пачуе той, хто ўмее чытаць кнігу божай прыроды, божага свету, хто цяміць і разбірае іх мову* (Я. Колас. Каля возера ўночы).

*Мора, / каб хацеў, / дык не сурочыш / Развітальным пошапкам сваім* (С. Законнікаў. Мора, каб хацеў, дык не сурочыш...).

*Мы ўжо не просім міласці ў прыроды, / Прырода моліць літасці у нас* (С. Грахоўскі. Літасць).

*Мы ўсе, мы ўсе – прыроды дзеці, / У нейкім сэнсе – цыганы* (А. Грачанікаў. Бясконцыя рэйкі).

***Н**а дымным ядзерным крыжы / Прырода курчыцца пакутна* (Г. Бураўкін. Хоць ты ў Антарктыку бяжы).

*На зло ліхім прыгодам / Крыніцы свежыя цякуць* (Я. Колас. Новая зямля).

*Нам у вольных дрэваў павучыцца, / Як за родную зямлю трымацца...* (Р. Барадулін. Досыць!).

*На справе сук апошні гнецца, / Дзе два пачэплены гаршкі* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Не дапаможа і дождж раскошны – / Скошанай траве* (І. Багдановіч. Я не хачу, каб ты мяне трывожыў).

*Не Марс да нас – а мы, сябры, цяпер бліжэй да Марса* (А. Вялюгін. Вялікае процістаянне).

*Не на тое свеціць сонца – цені каб цяніці* (В. Акалава. Восень жоўтая да ніткі тчэ вякі на грудзе).

*Не прагнучы ўзнагароды, / Штогод / у людскую кроў / Упарта пампуе прырода / Сілу, / веру, / любоў* (С. Законнікаў. Не прагнучы ўзнагароды...).

*Не роўны дрэвы ў баравінах, / І ў лузе розная трава* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Не ўсё, што расце, для яды, і ўсё, што расце, расце не адною ядою* (А. Разанаў. Дзічка).

*Не ўсім аднолькава / І сонца свеціць, / Ды ўсіх, не супыняючы хады, / Прырода падсілкуе і прывеціць, / І забярэ з сабою назаўжды* (А. Грачанікаў. Каля дарогі шапаціць таполя...).

*Не ўсяму прапасці – / Чаму з воза ўпасці* (М. Арочка. Бацькаўшчына).

*Ніколі не выспее яблык дачасна* (Р. Баравікова. Зачэпіцца сонца за снежную горку...).

*Нічога чорнага ў прыродзе не бывае* (А. Астрэйка. Нічога чорнага ў прыродзе не бывае).

*Ні штормы, / ні смерчы да дна / Не ўздыбяць / глыбокае мора* (У. Скарынкін. Глыбінка).

*Няхай дзьме добры вецер / І дзьме на наш касцёр* (Я. Колас. Адстану я, і час разлукі...).

***П**аводка ачышчае лік зямлі* (У. Някляеў. Майстры вясны).

*Пакідайце і буслу, і чайцы / больш вады і неба на душу* (П. Панчанка. Не люблю я слова «покоритель»...).

*Пакуль ты у лістве, / І ты – / яна, ліства* (Н. Мацяш. Трапечаш між людзьмі...).

*Пакуль яшчэ не абарваўся шлях, / Шукаю – / у трывозе і самоце – / Я жаўранка / ў атручаных палях / І чаплю / на асушаным балоце* (У. Скарынкін. Яшчэ на свеце многа дзівакоў!..).

*Пан Лес не дазволіць мець / пачуццяў, што шкодзяць Лесу* (А. Сыс. Пан Лес).

*Правінцыя! / Люблю твае кантрасты!* (У. Някляеў. Тураў).

*Працавітае стварэнне – мурашка. Многа чаму ёсць навучыцца ў яе гультаю* (Я. Колас. Мурашкі).

*Прырода мае нейкае сваё свядомае жыццё* (Я. Колас. У палескай глушы).

*Прырода – найцікавейшая кніга, якая разгорнута перад вачамі кожнага з нас. Чытаць гэту кнігу, умець адгадаць яе мілагучныя напісы – хіба ж гэта не ёсць шчасце?* (Я. Колас. На прасторах жыцця).

*Прырода не адкрываецца чалавечаму розуму... Яна яго толькі заманьвае* (С. Алексіевіч. Зачараваныя смерцю).

*Прысак варухні – / апаліць жар* (С. Законнікаў. Урбаны).

*Прыстаў пабел да гнілых сцен, / Як да старой бабулі пудра* (Я. Колас. Рыбакова хата).

***Р****аз ёсць начное неба ў зорах – / То, значыць, ёсць і зарапад...* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Разумных бараноў наогул жа нямнога* (К. Крапіва. Дыпламаваны баран).

*Рэкі не вяртаюцца, / Медзякі старыя не блішчаць* (П. Панчанка. Рэкі не вяртаюцца...).

*Саперніцтва з прыродай – непазбежнасць, / Як непазбежнасць – розум у прыродзе* (В. Зуёнак. Сяліба).

*Святла баяцца цёмныя краты́. / Арлы да сонца ведаюць дарогу* (Р. Барадулін. Кат ці ахвяра).

*Сонечныя лапіны не зацямняюць сонца. Лапіны ёсць. А сонца свеціць* (К. Чорны. Сястра).

*Сонца і родная глеба – / Шчодрасці прыклад для нас!* (С. Законнікаў. Ад чалавека да краскі...).

*Сонца і тое мае / Святло і цень, / І ў сонца самога бывае / Ноч і дзень* (А. Бачыла. Пакінеш курыць фіміям...).

*Сонца ўдзячныя вочы не слепіць* (Е. Лось. Крэпасці Грузіі).

*Спавядацца бяжым да прыроды, / Ачышчацца бяжым ад маны* (А. Пісьмянкоў. Спавядацца бяжым да прыроды...).

*Сутокі неба і зямлі...* (Я. Колас. У палескай глушы).

*Таварыш воўк авечцы не таварыш* (Н. Гілевіч. «Паланэз» Агінскага).

*Такі закон прыроды, маці, / У ім ёсць сэнсу глыбіня: / Раней, чым першы смех дзіцяці, / Ты доўга чуеш плач штодня* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Травой траву ніколі не стрымаеш, / І ветрам ветру, мусіць, не спыніць, / І полымя не спаліш у агні...* (Я. Сіпакоў. Травой траву ніколі не стрымаеш...).

*Ты не тужы – мінецца восень, / Імжа рассеецца, як дым* (Я. Колас. Не тужы).

**У** *балоце сонца не загразне, / Бо яно жыццёвы акіян* (А. Астрэйка. На балоце паляць чэрці лазню...).

*Увосень астры даражэй, / Чым сонечнай вясною ружы* (Н. Тарас. Нашто напамінаеш мне...).

*У вяршыні маленькіх і ніцых дрэў / Маланка ніколі не б'е* (У. Караткевіч. На Беларусі Бог жыве).

*У жыта з небыццём няма агулу* (С. Законнікаў. Вечная радня).

*Уласнаю нагою не згінай / Галіну тую, што цябе трымае* (П. Макаль. Сяўба).

*У людзей і ў прыроды патрэба адна: / нараджацца, расці, расцвітаць без патолі, / покуль вясна* (Л. Геніюш. Розна бывае ў жыцці і ў ролі).

*У прыродзе і людзей / часцей кусае дробненькая сошка – / камарык, блошка, / клопік, / мушка, / мошка, – / а буйныя драпежнікі радзей* (А. Вярцінскі. Камары).

*У птушак заўсёды застаецца / недаспяванае, / У дрэў – / недашумленае, / У чалавека – / недагаворанае* (А. Лойка. У птушак заўсёды застаецца недаспяванае...).

*Усё памерана ў прыродзе. / Аблокі – ўнуку./ Дзеду – яма. / Прыроду не расчуліць лямант* (Д. Бічэль-Загнетава. Паслухай).

*Усім патрэбна сонейка, каб выжыць* (Н. Мацяш. Бабіна лета ў Белаазёрску).

*Усіх жа вятроў не глынеш, / Вятрам няма мер, няма меж* (А. Бялевіч. Смерць Маланні).

*У цэнтры – мы, уладары, / вакол – прырода, як імперыя, / ляжыць, прынёсшы нам дары* (А. Вярцінскі. Начны бераг).

***Х**то йдзе – не мінае, бярозу ламае, –/ Ніякага жалю нялюбасць не знае* (В. Аколава. Случарыны).

*Хто падказаў дрэву, усяліў яму думку, што яно павінна нарадзіць свой плод, свой працяг?* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

***Ц**емра – найбольшае адасабленне: у ёй нічога няма. / Святло – найбольшае ўвасабленне: у ім ёсць усё* (А. Разанаў. Адлюстраванні).

***Ч**аму вы, хвалі, хоць імкнеце ўдаль, / Аднак усюды – берагоў палонныя?* (Н. Мацяш. Ля возера).

*Чаму ж павінна гэта зорка / Свяціць яму? Чаму – не мне?* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Чыжу не быць арлом крылатым!* (А. Звонак. Без ружовых акуляраў).

***Ш**чупак жа, ледзь адчуў свабоду, / Накінуўся на дробную пароду* (А. Вольскі. Шчупаковы заступнікі).

***Я**к гэта многа – душа прыроды і душа чалавека* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Як мы ўсё-ткі аблашчаны сонцам / Пры ўзыходжанні на касцёр* (Н. Мацяш. Што пакінем).

*Як ні імкнулася дрэва / ў неба, / яно ўсё роўна / не дасягае неба* (А. Разанаў. Пункціры).

*Як траву ні косіш, / А яна расце!* (У. Карызна. Зайздрасць).

*Як цывілізацыя нішчыць прыроду, так хамы – грамадства* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

## *«ЖЫЦЦЁ – НЕАПЛАТНЫ І СПАДЧЫННЫ ДОЎГ»*

### Жыццё чалавека, яго сутнасць, вартасць, незваротнасць

*А беражы, як сад, як жыта, / Як першы сонечны прамень, / І дзень той, што не так пражыты, / Бо ён народзіць новы дзень* (А. Астрэйка. А беражы, як сад, як жыта).

*Абыдзіся без жабрацкай скаргі на жыццё* (П. Панчанка. Вецер грукнуў форткай).

*Ад гора – ўсё ў свеце няміла, / Ад шчасця – час хутка мінае, / Ад хмелю – марнуюцца сілы, / Ад славы – сяброў убывае... / Вось тут і спыніся на нечым / У гэтым жыцці, чалавеча!* (М. Танк. Ад гора – ўсё ў свеце няміла...).

*Аддавайся жыццю светланосна!* (Н. Мацяш. Твая ўсмешка).

*А можа, і трэба гарэць нам дашчэнту? / А можа, і трэба жыць нам ахвярна?* (А. Вярцінскі. Мая віна).

*А нам стаяць, не гнуцца, як трысцё, / Бо лёс славян і лёс майго народа – / Нялёгкае і гордае жыццё* (У. Караткевіч. Зямля дзядоў).

*А ў жыцці як спатыкнуўся, / Глянеш – дзверы ўсе закрыты* (Я. Колас. Старая праўда).

*А ўсё зіхціць крышталінкаю першаю / Той момант светлы, што не ўбераглі* (А. Звонак. Часцінкі).

**Б***ачу праз перашкоду. Думаю праз перашкоду. Праз перашкоду жыву* (А. Разанаў. Зацьменне).

**В***ек пражыць – не поле перайсці, / А такому падлягаць іспыту: / На каменні зернем прарасці / І зняможанаму ўстаць з нябыту* (С. Гаўрусёў. Век пражыць – не поле перайсці...).

*Верым, што лепшая частка жыцця – / Тая, якую пражыць мы збіраемся* (Р. Барадулін. Верым, што лепшая частка жыцця...).

*Вечнае па-свойму сеем, / Добрае – на свой манер* (Р. Тармола-Мірскі. Пры сякеры да пры ломе...).

*Вопыт пакаленняў нічому не вучыць, словы сведак – бяссільныя. Кожны мае прайсці свой шлях цаной страт і набыткаў* (Г. Марчук. Голас і слова. Афарызмы).

*Вучышся з пагардай / На сэнс жыцця глядзець – няўцям, / Што жыць адно тады і варта, / Калі рабіць дабро людзям* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Вывучай жыццё не зверху, а з сярэдзіны* (Я. Брыль. На Быстранцы).

*Высокі сэнс жыцця і шчасця, / Калі жывеш ты для людзей* (А. Бялевіч. Аддам я радасць...).

*Гэта – мудрая тайна Жыцця –/ Жыць аддана / Да забыцця* (С. Грахоўскі. Тайна).

*Дабівацца / Узлёту, дасягненняў, росту, / А іншы думае парой, /Што ўсё на свеце дужа проста: / Пагаўкаў – і герой* (У. Корбан. Балонка і павага).

*Даецца жыццё нам, каб радасць з адчаем / Вучыліся мы прымірань* (Н. Мацяш. Усё паўтараецца).

*Добрыя справы – мэта чалавечага жыцця. Але як толькі добрыя справы пачынаюць праводзіцца арганізавана, яны ператвараюцца ў сваю супрацьлегласць* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Дробны клопат штодзённага жыцця, нецікавага, часта пустога, нікчэмнага, прыніжае цябе, выціскае з цябе ўсё больш вартоўнае* (Я. Колас. У палескай глушы).

*Дробязяў наогул у жыцці не бывае. Усё мае свой сэнс і сваё значэнне. Толькі мы не заўсёды гэта бачым, ведаем* (Б. Сачанка. Сцяпан Сцяпанавіч Замошка).

*Ды ты жыцця, брат, не здалееш, / Як ты ні дурыш, ні шалееш* (Я. Колас. Новая зямля).

*Жаданне жыць... / Любоў і смага... / Што можа быць вышэй за іх?! / Беззапаветная адвага / з'яднала мёртвых і жывых* (А. Разанаў. Празорца).

*Жыві ў сягонняшнім дні, / Каб заўтрашні / Стаў твaiм* (Р. Барадулін. Жыві!).

*Жыццё без хваляванняў і трывог – / Журба і смутак апусцелай нівы* (У. Скарынкін. Вачэй тваіх паляны).

*Жыццё – віроў дыханне кругавое* (К. Камейша. Круг).

*Жыццёвыя дробязі – нашыя пакуты. Гэта яны не даюць нам жыць. Яны, як авадні, насядаюць на нас. Чалавек цэлы век адганяе іх, і на гэта бывае ідзе палавіна адпушчанага яму богам часу* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Жыццё – гэта свята / Здаровага цела / І душы несуцешнай дасконная праца* (Р. Барадулін. Памаўчаць са здарожаным смуткам разам...).

*Жыццё кожнага – гэта планета са сваімі вачыма, голасам, пачуццямі* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Жыццё – неаплатны і спадчынны доўг* (М. Танк. Жыццё...).

*Жыццё пражыць гатоў / за лепшую узнагароду: / служыць карэньчыкам народу, / крылом быць / для ягоных слоў* (С. Панізнік. Выснова).

*Жыццё пражыць – / Не поле перайсці, / А трэба і жыццё / Прайсці, як поле, / І хоць адным зярняткам узысці, / А бур'яном не зарасці ніколі* (С. Грахоўскі. Жыццё пражыць).

*Жыццё прайсці – / нібы няцяжка. / Яно не муляе плячо* (А. Вольскі. Я помню вечар той – у ніўцы).

*Жыццё пылінку вечнасці сваёй / Пазычыць пад настрой, але адразу / Цярпець прымусіць крыўду і абразу* (Р. Барадулін. Палыновыя санеты).

*Жыцця неўзаранае поле / Чакае свайго плугара* (С. Законнікаў. Урбаны).

*Забава заўсёды небяспечная для жыцця* (Г. Марчук. Голас і слова).

*За крок да ўдачы / спынюся, / за хвіліну да перамогі / паглыблюся ў одум... / Сябры ўздыхнуць і адыдуць прэч, / жыццё ўсміхнецца і спыніцца побач* (А. Разанаў. Пункціры).

*І даражу я кожнаю / Расінкаю жыцця* (П. Панчанка. Нешта пройдзена...).

*І жыў ён птушкай пералётнай, / Хоць, праўда, ў вырай не лятаў* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*І зямля – у жыцця, і ў жыцця – людзі. Дык адкуль адхіленне ўзялося, нібы сваё свайго не пазнала і разышлося бязрадасна?* (А. Разанаў. Паэма сланечніка).

*І ў нашага лёсу ў запасе / Не цэлыя стагоддзі, / І мы за тое ў адказе, / Як нашы дні праходзяць* (А. Вярцінскі. Аптымістычны верш).

*І ўсе жывуць і жыць павінны, / Чыя як зносіць галава* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*І што ёсць на свеце мілей за цябе, пара маладога жыцця, калі душа яшчэ нявінная і чыстая, як ранішняя майская роска?* (Я. Колас. Сірата Юрка).

*І як бы ні была вялікая дарога назад, а, азірнуўшыся, чалавек на ёй убачыць самога сябе, бо, праходзячы праз жыццё, ён заўсёды аставаўся ў ім. А сходкі, якімі ён падымаўся ўгору, праходзячы сваю дарогу, – завуцца яго біяграфіяй* (Я. Скрыган. Смага).

**К***аб выкурыць сваю люльку жыцця, трэба ж ад некага ўзяць агеньчыку* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Каб жыццё ўпустую не пралахаць, / Кожны мусіць нейкі храм свой мець, / Дзе не хочацца ні гаварыць, ні пець – / Толькі моўчкі, безгалоса плакаць* (Н. Гілевіч. Тут не хочацца ні гаварыць, ні пець...).

*Каго прымусіш жыць прынукай?* (С. Законнікаў. Глыбінка).

*Калі жыццё ў маленстве пяратрэ добра – будзе чалавек. Залашчыць – прапаў чалавек* (В. Быкаў. Трэцяя ракета).

*Калі крыштальным быў выток – / Незамутнёным будзь і вусце* (Н. Мацяш. На быстрыні).

*Калі хочаш праўдзіва ты жыць, дык пі чару любую, / Але толькі да дна* (М. Багдановіч. Крэда).

**Л***епшага смаку няма, чым жыць...* (Р. Барадулін. Смак).

**Н***азад не прыйдзе хваля тая, / Што з быстрай рэчкай уплывае* (Я. Колас. Новая зямля).

*Нам без трывог не зберагчы жыцця. / Сябры, давайце будзем хвалявацца / За ўсіх і ўсё* (П. Панчанка. Той дзень прапаў...).

*Напоўненасць жыцця – / лепшае бессмяроцце* (А. Вярцінскі. У Юрмале праз некалькі год).

*На прыбаўку гадоў – / Да жыцця! – / Аніякай надзеі. / Мне б прыбаўку жыцця – / Да гадоў...* (М. Арочка. Закружыліся гады мае...).

*На свеце ўсякага жыцця даволі і чалавечае долі шмат* (К. Чорны. Лявон Бушмар).

*Не жыць як набяжыць, / А кожны дзень жыць годна, / Ахвярна і турботна, / Без зайздрасці ў душы* (А. Зэкаў. Не жыць як набяжыць...).

*Нельга жыць, як нямыя камяні, / Што з ляжачай, халоднай радні* (А. Бялевіч. Мудрасць прымаўкі).

*Не страціш сутнасці сваёй – / Тварыць і сам пераствараецца... / Зжыві сябе – каб іншым жыць* (Л. Галубовіч. На досвітку).

*Не ўпаспешлівай славе / Я цяпер пазнаю / На жыццё свае права, / Неабходнасць сваю* (С. Законнікаў. Неабходнасць).

*Не ўчарашнім днём жыву на свеце – / Велічнай наступнасцю жыву* (А. Бялевіч. У вялікай дарозе).

*Ніхто з граніц сваіх не выйдзе, / З законаў, жыццем напісаных* (Я. Колас. Новая зямля).

***П**акуль на белы свет глядзіш вачыма, / Павер сабе: усё адолець немачыма* (Н. Мацяш. Пакуль глядзіш на белы свет).

*Пакуль не турбуюся аб сабе – магутнейшы за сябе* (А. Разанаў. Вастрыё стралы).

*Там, дзе даверу поўнага няма, / Зліць у адну дзве праўды немагчыма* (Н. Гілевіч. «Паланэз» Агінскага).

*Таму, хто век сяброў не меў, / Хто шчыра пакахаць не змог дзяўчыну, / Хто не гарэў, а толькі цьмеў, / Не палюбіць ніколі і Айчыну* (А. Зарыцкі. Таму, хто век сяброў не меў...).

*Той дзень збяднеў, зліняў на сотню радуг / І, попелам пасыпаны, сканаў, / Калі не падзяліў з суседам радасць / І больш за дзень узяў ты, чым аддаў* (П. Панчанка. Той дзень прапаў...).

*Той дзень прапаў і страчаны навекі, / Калі ты не зрабіў таго, што мог, / Калі не паспрыяў ты чалавеку, / Няшчыры быў, зманіў, не дапамог* (П. Панчанка. Той дзень прапаў...).

*Той дружбай вернай можа даражыць, / Хто сам прайшоў дарогай крамяністай* (А. Звонак. Шчырасць).

**У** *се мы чакаем друга. Таго, што не здрадзіць, не кіне ў бядзе, зразумее цябе не толькі ў празрыстым шчасці* (Я. Брыль. Тройчы пра адзіноту).

*Усе разумныя дружаць між сабою, усе дурныя – сварацца* (Я. Сіпакоў. Усё, што па пары).

**Х** *ай будзе лад ў сваёй гасподзе / Ствараць народ-уладца сам* (Я. Колас. Да працы!).

**Ш** *то б зналі пра жанок мужчыны, / Каб іх сябровак не было* (В. Вярба. Сяброўства шчырыя кветкі...).

***Р****аны гояцца часам, а дружбаю – гора* (А. Куляшоў. Грозная пушча).

***С****абе не знойдзеш долі лепшай, / Чым ведаць: ёсць сябры мае* (С. Законнікаў. Каго люблю, таму на вочы...).

*Спачуванне з жыццём нам далі* (Я. Сіпакоў. Ёсць жа людзі...).

*Сустрэча працягнецца датуль, / Пакуль здаецца немагчымай* (І. Багдановіч. Вязь ненапісаных лістоў).

*Сустрэч не перадорваюць* (В. Аколава. Случарыны).

*Сустрэчы – не толькі збліжэнне. / Ідзе, скрозь шум і тлум, / Узаемапамнажэнне / Нашых душ і дум* (А. Вярцінскі. Сустрэчы).

*Сяброў бяда не дзеліць, а збліжае* (Н. Гілевіч. «Паланэз» Агінскага).

*Сяброўскі дар – найдаражэйшы дар* (А. Зарыцкі. Крылы).

*Сяброўству здраджваць не магу, / Пачуцці ў ланцугі не путаю. / Сяброўства сэрцам берагу, / Я з ім жыву, я з ім пакутую* (А. Астрэйка. Сяброўству здраджваць не магу).

*Сябры з адчаю выцягнуць заўсёды, / Хоць знойдуцца між іх сябры з нагоды* (К. Камейша. Круг).

*Сябры не набіраюцца гадамі. Іх ніколі не бывае так многа, каб сказаць, што сяброў ужо досыць* (Я. Скрыган. Смага).

***Т****абе зрабіўся блізкім цэлы свет! / А ці бліжэйшым стаў табе сусед?* (Н. Гілевіч. Куды ні глянь – над дахам строй антэн).

*Люба цяпельца, / што кожнаму сэрцу жаданае, – / неўтаймаваны, / запалены знічкай давер* (А. Шушко. Садоўнік).

***Н**е кроч на сцежкі бакавыя – / Ямчэй сказаць, памеии зрабіць, – / Бяры адказ сабе на шыю, / Не на сяброўскія гарбы* (М. Лужанін. Як нараджаўся новы свет).

*Не мяняйце сяброў жывых, / А тым болей – сяброў памёрлых* (Г. Бураўкін. Памяці Уладзіміра Караткевіча).

*Ні адна разлука не прыйшла назад* (В. Аколава. На рацэ Прыманцы...).

*Ні сабе, ні камусьці ў блуканнях / Не пасвецяць ні поблізу, ані здалёк / Пераслеплыя да шкадавання* (Н. Мацяш. Тая ўсмешка).

*Новы друг – знаходка рэдкая, а стары – каштоўнасць* (Я. Брыль. Сёння і памяць).

*Няхай не будзе больш згрызот / І змоўкнуць непрыязні словы!* (Я. Колас. Рыбакова хата).

***О**, боязь за другога чалавека!.. / Адна ты робіш чалавека з нас* (Н. Мацяш. За соснамі – мора).

***П**адснежнікавая пара, / Не дай астацца безгалосаю / Каля яднальнага кастра!* (Н. Мацяш. У Люсіне).

*Пакуль са мною плачуць вочы друга / Над цяжкай стратай – ёсць яшчэ жыццё* (У. Караткевіч. Крумкачы).

*Прысяга – / Ноша непасільная / Для сэрца* (Н. Мацяш. З вачэй далоў – і з сэрца прэч...).

*І спрэчку тым яны канчалі, / Што гэту скварку разразалі* (Я. Колас. Новая зямля).

*І ў няшчасці, і ў радасці без дружбы чалавеку нельга быць* (К. Чорны. Насцечка).

*І ў сцюжу нечай ласкай ты сагрэты, / І ў спёку пекане цябе зіма* (П. Панчанка. Апошні дзень вясны і першы лета).

*І цэлы свет – / Адно дамовіўшыся шчыра – / Пазбыцца зможа страшных бед* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Каго б я выбраў на падмогу – / Не падкіх да прыгожых слоў, / Няхай маўклівых, ды сяброў* (П. Броўка. Калі б нанова пачынаць...).

*Калі спагадаеш жывому – / жывеш! / А сееш жывое / – тым болей!* (Г. Пашкоў. Зялёны верш).

*Калючы асот – але... пчала з ім сябруе* (А. Разанаў. Пункціры).

*Крытыкаваць нявартага павагі – свядома нажыць сабе ворага* (Г. Марчук. Голас і слова).

*К чужой не прымяраўся мерцы, / Не ездзіў на чужым кані. / Сяброў я выбіраў па сэрцу, / Па іх душэўнай цеплыні* (А. Астрэйка. К чужой не прымяраўся мерцы...).

*Лашчыць і лечыць чалавечую душу часіна згоды ў прыродзе, але найлепшая згода для чалавека – згода з самім сабою, са сваім сумленнем* (М. Стральцоў. Разам з людзьмі).

*Дзе на стале дармовы цукар, / Там і салодкія сябры* (М. Лужанін. Як нараджаўся новы свет).

*Дзень, што без дружбы й любові пражыты, / Знікне бясследна, навекі забыты* (А. Зарыцкі. Дзень, што без дружбы й любові пражыты...).

*Добры кажух са спагады, / Толькі сцюдзёна ў ім* (М. Танк. Добры з ваўка музыка...).

*Друг сапраўдны назаляць / У бядзе не стане* (В. Зуёнак. Заружовіцца трава).

*Дружба, / Не зведаўшая ліхалецця, / Слава / Без працы мазольнай, упартай, / Слова, / Якое не грэе, не свеціць, – Нічога не варты* (М. Танк. Кій...).

*Дружнасць – першы крок свабоды, / Згода – сіла грамады* (Я. Колас. Песні вясны).

*Дуб і той, калі ў полі адзін, / Не заўсёды адольвае буру* (А. Бачыла. Роднаму краю).

*Ды горшае – гэта сціранне меж паміж непрыяцелямі і сябрамі* (А. Вярцінскі. Ты кажаш, сяброў усё менш і менш?).

*Жыць па чужой не ўмею мерцы, / Не езджу на чужым кані. / Жадаю дружбе я бяссмерця, / Што загартована ў агні* (А. Астрэйка. З сябрамі горыч і самоту...).

*Запомніце таго – хто блізка быў. / Далёка хто – не варушыце праху* (Я. Янішчыц. Птах).

*I воўк жа не цягаецца вечна адзін* (К. Чорны. Лявон Бушмар).

## *«АЛЬФА І АМЕГА СЯБРОЎСТВА – СПАГАДЛІВАСЦЬ І НАДЗЕЙНАСЦЬ»*

### Дружба, сяброўства; давер, згода, лад; сустрэчы і разлукі

*Ад чалавека да краскі – / Прагнуць усе на зямлі / Шчырай спагады і ласкі...* (С. Законнікаў. Ад чалавека да краскі...).

*Альфа і амега сяброўства – спагадлівасць і надзейнасць* (Г. Марчук. Голас і слова).

*А таму – не з'ем адзін вала, / Не зайздроснік я і не хапуга. / Падзяліць гатовы напалам / Нават скібачку малую з другам* (А. Бялевіч. Падзялюся дабратою).

*Без спагады і раны не гояцца* (М. Башлакоў. Ветры дзьмулі з Чарнобыля).

*Быць жа нехта павінен, /Хто цябе правядзе, / Аднаго не пакіне / У расстайнай бядзе* (М. Шабовіч. Быць жа нехта павінен...).

*Давермася найлепшаму ў сабе* (Н. Мацяш. Адказ «Першацвету» на ягоную анкету).

*Давярайце ж сябрам жывым. / А тым болей – сябрам памёрлым* (Г. Бураўкін. Памяці Уладзіміра Караткевіча ).

*Дапамагайце, / як дождж палеткам, / Дапамагайце, / як пчолы кветкам* (П. Макаль. Дапамога павінна быць хуткай...).

*У самых мудрых – самы горкі лёс* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Усё ў жыцці наперад згадана – / І ў чалавека лёс такі: / Згараюць зоркі, зоркі падаюць – / Не тухнуць, быццам светлякі* (В. Рабкевіч. Усё ў жыцці наперад згадана...).

*Хай страціш ты многа, / Каб долі сапраўднай не страціць* (У. Някляеў. Праводзіла з дому...).

*Хацела сцежкай крочыць гладкай, / А спатыкнулася аб пень* (Н. Тарас. Тваё маўчанне – зноў загадка...).

*Хіба ж высока ўзняцца вераб'ям / Над вышынёй пустой мякіннай кучы?!* (А. Звонак. Наканаванасць).

*Хто можа ведаць, што нас стрэне? / Нам прышласць наша не відна* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Хто перад лёсам віхляе анучай, той і звання не варты «народ»* (Н. Арсеннева. Проста ў вочы жыццю).

*Ці мала што ў жыцці бывае! / Якіх вузлоў не вяжа лёс! / Няшчасны той, хто ўсё прымае / Да сэрца блізка і ўсур'ёз* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Які пастух жалезны нас пасе?..* (У. Някляеў. Ружа вятроў).

*Яшчэ ніхто / Свой лёс не перарос* (Р. Барадулін. І толькі след на небе...).

*Ніколі не збочваць з дарогі – / зайздросная доля. / Ды хай не міне цябе доля / дарогу губляць* (У. Някляеў. Праводзіла з дому...).

*О, краю родны! Чым стрымаеш, / Адвернеш лёс свой ад пятлі, / Калі заступніка не маеш / Ні ў небе ты, ні на зямлі?* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Падзея яднае* (А. Разанаў. Паэма запаленых свечак).

*Пакіньма напуста на лёс свой наракаць, / Скрозь слёзы скаргі сеяць па зямлі, – /Нам трэба жыць і долю папраўляць, / Каб нас патомкі з часам не клялі* (Я. Купала. Пакіньма напуста на лёс свой наракаць...).

*Праз дзірван закарузласці / ўпартай зялёнай сцябліналю / Ці дазволіць нам лёс, / ці пасобіць нам час прарасці?* (С. Законнікаў. Кульмінацыя).

*Праўду кажуць, што ў поцемках доля брыдзе, / Бо не раз і не два спатыкаецца* (Н. Мацяш. Тая ўсмешка).

*Сам выбраў долю.../ й нядоля знойдзецца сама* (А. Сыс. З чаго пачаць?..).

*Слязней слязы ... жыццёвы вырак: позна!* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

*Спрэчкі з лёсам – найчарней смалы* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

*Ты ж у лёсу не лёкай, / І не служка ты ў д’ябла, / Пакуль трапнае вока, / Пакуль вострая шабля* (А. Пісьмянкоў. Не журыся, хлапеча).

*Мой боскі лёс так невыносна цяжкі, / Як бервяно, што на плячы мурашкі* (П. Макаль. Забіўшы бога...).

*Мы з табой пералётныя птахі, / Якім / не вярнуцца назад* (А. Пісьмянкоў. Спавядацца бяжым да прыроды...).

*Мы ўсе сваёю доляй здолены* (В. Аколава. Падарожнікі лёсу).

**Н***а вялікія справы – і сэрца вялікае, / На вялікае сэрца – і лёс надзвычайны* (У. Караткевіч. Энтузіясту).

*Наш лёс на смерць падобны, / калі ў ім змаўкае струна* (А. Вярцінскі. Колькі лет, колькі зім!).

*Не выпадае, не выпадае / Вылічыць долю* (У. Някляеў. Пакінуты бераг).

*Не памыляецца наканаванасць* (Н. Мацяш. У святле маланак).

*Не перапішаш лёс на чыставік, / Праверыўшы як след чарнавікамі* (Г. Пашкоў. Не перапішаш лёс на чыставік...).

*Не расці, палыне, пры чужой нядолі, / Не шукай, разлука, трох дарог у полі* (В. Аколава. Пяць пясчын – суглінку і гарчын – палыну).

*Не скончаны дзень тварэння: зноўку і зноў вылеплівае чалавек сваю лепшую долю* (А. Разанаў. Вастрыё стралы).

*Нікога, / хто ў гэты свет прыходзіць, / не абыходзіць доля: / атрымліваюць усе без вынятку / два найвялікшыя падарункі – / жыццё і смерць* (А. Разанаў. Пункціры).

*Лёс – ён лёс, не выпрасіш вякоў* (Е. Лось. «Я – нядоўга», – кажа дуб шумлівы...).

*Лёс, жыццё – гэта шматпакаёвая кватэра, і ў кожным пакоі па чарзе чалавек вымушаны жыць. Але дасада ў тым, што ў кожным пакоі ён розны* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Лёс кожнага – гэта свой лёс, але без лёсу народа няма і свайго лёсу* (Я. Скрыган. Трывогі).

*Лёс не абʼедзеш, як прывідны знак* (Л. Забалоцкая. Ноччу халоднай ліхтар ацалелы...).

*Лёс ніколі не спраміць шляхі* (Л. Рублеўская. Забытыя паэты).

*Лёс удавы – як песня жураўліная* (Л. Забалоцкая. Каліна стукне ў шыбу золкай раніцай...).

*Лёс Хрыста, пакутнага Ісуса, / Таксама, як і доля беларуса, – /Адзін і той вянок на галаву* (Л. Дранько-Майсюк. І з усяго, вялікага-малога...).

*Лёс чалавека цяпер як шарык дзьмухаўца: не трапіў пад вецер і дождж – выстаіць. Трапіў – і няма цябе, застанецца адзін успамін, што ты жыў-быў на свеце* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Лёс, што даў, то адыграе, / Тут – пасее, там – змяце...* (Л. Галубовіч. На могілках).

*Людскі наш лёс – былінка поля* (Я. Колас. Новая зямля).

***М****ітусня – тканіна, на якой чалавек страсцямі, звычкамі, учынкамі, абавязкам вышывае малюнак свайго лёсу* (Г. Марчук. Голас і слова).

*дак ці чыстае сэрца* (Т. Бондар. За дабро не адплацяць дабром?..).

*І на волі / ўсе нявольнікі / свайго лёсу* (В. Рагаўцоў. Імгненні).

*І пакуль нада мной наша роднае неба – / Аніякі мяне не палохае лёс* (А. Бачыла. Да маці).

***К**аб чалавек ведаў наперад свой лёс, ён не выжыў бы* (Л. Геніюш. Споведзь. Прага).

*Калі табе і пашчасціць на Сымона Кірынеяніна, які панясе твой крыж, дык жа твая маленькая галгофа – усё роўна толькі твая. З выпрабаваннем развітальнай самотнасцю, з горыччу паасобных успамінаў* (Я. Брыль. Парастак).

*Калі ўсе згублены ключы, / калі ні шанцу, / анічога – / усё ж ідзі, / любі, / крычы / і пасягай на перамогу* (А. Разанаў. Пункціры).

*Кожны з нас / абраннік / На тым шляху, што двойчы не пачаць* (І. Багдановіч. Вось мы ідзём, як блізкія чужыя).

*Колькі б доля пражы ні напрала, / Ў шлях апошні йдзеш / Гол як сакол* (Р. Барадулін. Здасца хата ўбогая палацам...).

*Колькі б мы наверх ні паўзлі, / не адарвацца нам ад зямлі* (П. Шруб. Аксіёмы лесвіц).

***Л**ёс абачлівых выбірае, / Ды бывае... – то воля нябёс? – / Неабачліваму спрые. / Ўсё ж разважлівых больш любіць лёс* (Н. Маеўская. Ці вучыў нас хто засцярозе...).

*Да скону дзён – / І ў шчасці будзеш нешчаслівы, / І ў славе будзеш не славён...* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Долі не ладзяць з чаратоў, / футра шыюць не з кратоў* (В. Аколава. На рацэ Прыманцы).

*Долі рубцы – незагойныя* (Н. Загорская. Вяртанне).

*Дрэмле Юрка ў заканурку/ І чакае долі* (Я. Колас. Дрэмле Юрка).

*Дык захавай жа, лёс мой, / прагу кожны дзень / І сонцам ззяць, і прарастаць травою* (К. Кірэенка. Дык захавай жа, лёс мой...)

*Дык захавай жа, лёс мой, / прагу пець і жыць, / І спеласцю, як зерне, налівацца. / Хоць і на смерць ісці, а не здавацца, / І справе, што душой абраў, служыць* (К. Кірэенка. Дык захавай жа, лёс мой...)

***Ё****н быў і ёсць – нязменны шанец: / смяяцца-цешыцца ці плакаць* (М. Дукса. Глядзім на свет...).

*Ёсць ты і я, / а паміж намі – лёс, / і ў лёсу / пераменлівыя твары* (А. Разанаў. Паэма чырвоных вяровак).

***Ж****адаю лёсу аднаго: / Для некага быць неабходным, / Не адчуваючы таго* (А. Пысін. Нішто не моднае на свеце...).

***З*** *мілым і пад дубам – доля райская, / Толькі лепш фундамент мураваны* (А. Пысін. Перуны ў сто гармат ударылі...).

***І*** *ад лёсу, як выбраў свой лёс, / Не схавацца ні ў свеце, ні ў смерці: /Данясеш толькі тое, што нёс , – / Смецце зга-*

*Ад лёсу не схаваешся, нідзе не дзенешся* (Б. Сачанка. Трэцяе вока).

*Адным і тым жа ветрам – / Карацець / І доўжыцца...* (Н. Мацяш. Адным і тым жа ветрам...).

*А доля – / Пані не скупая, / З падумкай дзеліцца вярстой. / І басанож душа ступае / Па матчынай зямлі святой* (Р. Барадулін. Басанож).

*А доля проста не рыфмуецца. / Не ўціснеш лёс у верш сілком...* (С. Законнікаў. Рызыка).

*Адрозніць вельмі лёгка ад жывых таго, каго жыццё жадае сцерці* (З. Астапенка. Эдэм).

*Але скажы мне: дзе яна, зарука / ад той маланкі, што абдасць наш свет!* (Е. Лось. Пра ўсё пагаварылі, мой харошы...).

*А лёс Дзяцей, і лёс Радзімы, / І лёс планеты – лёс адзін* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*А лёс захоча – ізноў няшчасце: / стане коўзка і лёгка ўпасці* (П. Шруб. Аксіёмы лесвіц).

***В****ыпадак – наш гаспадар* (А. Вярцінскі. Давайце ўважліва глянем...).

*Выпадак ходзіць там, дзе яго чакаюць* (В. Іпатава. 20 хвілін з Немезідай).

***Д****ай нам, / лёс, / таго, чаго мы вартыя, / Каб не здрадзіць нам / самім сабе* (Н. Мацяш. Ловяць далягляд гады імклівыя).

*Дай табе божа шчасце, і долю, і кашулю на пуп!* (Я. Колас. На ростанях).

*Шлях, які не пройдзеш двойчы, / Называецца – Жыццё!* (К. Камейша. Шлях, які не пройдзеш двойчы...).

*Што значым мы / самі па сабе?.. / Семя знаходзіць сябе / ў сяўбе. / У гэтым полі, / гэтым жыцці / мы павінны / прарасці. / У гэтым полі, / гэтым жыцці / мы павінны / узысці. / У гэтым полі, / гэтым жыцці / мы павінны / сябе знайсці. / А па вясне, / а па сяўбе / мы ўжо / не самі па сабе* (А. Вярцінскі. Што значым мы самі па сабе?..).

*Шукаць апраўданне сваім слабасцям – у гэтым сэнс чалавечага існавання* (У. Рубанаў. Светлы ручай любві).

**Я** *знаю – жыццё нялёгкі паход* (А. Вярцінскі. Маршальскі жэзл).

*Як жа зроблена мала, / каб жыць. / Як жа зроблена многа, / каб нішчыць* (Л. Геніюш. Вайной).

*Як мы жывём , так нам жывецца* (З. Дудзюк. Як мы жывём...).

*Як часта так здараецца ў жыцці, / Што ўжо калі цябе / зусім надзея кіне, – /Знаходзіш той жаданы скарб адзіны, / Што век шукаў і ўсё не мог знайсці* (К. Кірэенка. Як часта так здараецца ў жыцці...).

## *«АД ЛЁСУ НЕ СХАВАЕШСЯ»*

Доля, лёс чалавека, грамадства; прадвызначанасць жыццёвага шляху; выпадак

**А** *выбіраць – не парываўся: / Зайздросны лёс, але – не мой* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Трэба дбаць пра поўныя засекі, / Не ўсім пра мёртвых думаць ёсць калі* (Н. Мацяш. Тры каласкі любові і смутку).

*У жыцці заўсёды ёсць настаўнікі і вучні* (У. Ліпскі. Шукай сябе).

*Усё золата, якое толькі ёсць на свеце, – нікчэмная драбяза і непатрэбшчына перад самім жыццём* (К. Чорны. Пошукі будучыні).

*Усім роўна хочацца жыць на свеце і ўзяць ад жыцця і радасць, і гора, і ўсё тое, чым спатыкае яно кожнага* (Я. Колас. Якую карысць прыносяць нам птушкі).

*У чалавека ёсць два шляхі абессмяроціць сябе: мастацтва і дабрата. Першы падуладны нямногім, другі – усім* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*У час, калі жыццё як падарунак, / Апошнім можа быць / і кожны ўздых, / І кожны пацалунак* (У. Скарынкін. Перад вяселлем сына).

*Цяжка стаяць над магілаю свайго жыцця і пазіраць на яго разваліны* (Я. Колас. Дуб і чароціна).

*Чалавека робіць гаспадаром, ачышчае ягоную душу толькі ўласнасць* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Шкадаванне – гэта пераацэнка ці адмаўленне. Калі гэта адмаўленне, то тут можна сумаваць і зміріцца. А калі гэта шкадаванне аб тым, што ёсць?* (А. Кудравец. Успамін пра шэршня).

*Палову жыцця падаюся ў свет, палову – вяртаюся са свету, / палову жыцця пішу на дарозе свае імёны, / палову – закрэсліваю напісанае, / палову жыцця расту ад зямлі, палову – расту з зямлёю; / і ўсё менш ува мне мяне, і ўсё больш бязмежжа* (А. Разанаў. Бязмежжа).

*Паўсядзённыя клопаты – гэта і ёсць жыццё* (Я. Сіпакоў. Лета з мятлушкай).

*Покі служаць ногі, / Можна бегчы ўсюды, / Ад сябе самога / Не ўцячэш нікуды* (Я. Колас. Дзе дзенешся?).

*Пражыць сваё ў жыцці – / Адказнае мастацтва. / Адкуль прыйшоў – / Пайсці, / А на зямлі – застацца* (Р. Барадулін. Застацца...).

*Прайсці нялёгка год за годам, / Бо шлях – то шоўк, а то асцё...* (П. Броўка. Мера).

*Проці цячэння вады / Зможа толькі жывое паплыць, /Хвалі ж ракі заўсягды / Тое цягнуць, што скончыла жыць* ((М. Багдановіч. Рушымся, брацця, хутчэй).

*Свой век – шчаслівую радоўку – / Трэба не адбыць мне, / а пражыць* (С. Законнікаў. Радоўка).

*Свой шлях у кожнага, свая дарога, / праверана вякамі і жыццём* (Л. Геніюш. Па-беларуску).

*Смак да жыцця падсілкоўвае перамога* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Стаю ў вялізнай чарзе. / Перш, чым з апошняга / стану першым, / пабуду ўсёю чаргой* (А. Разанаў. Пункціры).

*Што значыць сапраўдным другам быць? /– Любіць. / – Што значыць аддана справу рабіць? / – Любіць. / – Што значыць дарогу ў жыцці не згубіць? / – Любіць. / – Што значыць зямное шчасце здабыць? / – Любіць* (А. Вярцінскі. Што значыць сапраўдным другам быць?).

## *«КАХАННЕ І ВЕРУ НЕ ТРЭБА ЎСІМ ВЫСТАЎЛЯЦЬ НАПАКАЗ – ДУШУ ЧУЕ ТОЛЬКІ НЕБА»*

### Шчасце, каханне, вера, вернасць, любоў

*Адзіна праца і каханне / Ў жыцці апірышча і шчыт* (Н. Мацяш. Паэма жніва).

*Ад кахання да расстання – / Дарога тая, што праз нас* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

*Адлучанасць ад шчасця – / як праклён* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

*Аднак саюз мужчынскі – не каханне, / Дзе трэці лішні пакідае двух* (А. Куляшоў. Мой маналог, як палымяны конь...).

*Ад шчасця лекаў я не знаю...* (Я. Янішчыц. Твайго кахання не прашу...).

*Ад шчасця слёзы ў дзяцей не льюцца, / Ад шчасця хочацца ім пець* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*А жонкай стаць і не кахаць нікога – / Усё адно як вольнай жыць без волі...* (М. Шабовіч. Пажухлі кветкі на тваім прычале...).

*Але не звяжаш ты парваных струн, / З двух сэрцаў не зрабіць адно* (А. Астрэйка. Хацеў тугу у вузялок тугі...).

*А не любяць – тады губяць, / а не любяць – і не рупіць / захаваць, засцерагчы* (А. Вярцінскі. Начны бераг).

*А ўсё ж такі... каханне ёсць нейкая хвароба, боль і пакута* (Я. Колас. У палескай глушы).

*А што, урэшце, галоўнае на зямлі і што кіруе светам? Каханне... каханне* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

**Б***ез кахання шчасця, долі / Няма на зямлі* (Я. Купала. Пакахай мяне, дзяўчынка...).

*Без чалавечай і буслінай вернасці / Няма ні дабрыні, ні хараства* (П. Панчанка. Буслы, буслы...).

*Была вясна, было імкненне, / І сэрца ведала тамленне* (Я. Колас. Новая зямля).

**В***еру мусім прымаць напавер, / Вера трымаецца на даверы* (С. Багданкевіч. Вера).

*Відаць, там шчасце не канчаецца, / Дзе ёсць прычыны для трывог* (А. Пысін. Балота патушыла аганькі).

*Вось і для шчасця / патрэбна так мала: / шкельца кахання / ды шкельца цяпла* (П. Шруб. Вечарам ясным...).

*Вялікія людзі нашчадкам у генах / заўжды завяшчалі любоў* (Е. Лось. Праўнук Пушкіна).

*Вясна людзей каханню навучае, / а хто ж любоўю вучыць даражыць?* (Е. Лось. З белых пялёсткаў).

*Дастаткова для шчасця і гора, / Дастаткова, каб сілу адчуць!* (Я. Янішчыц. У заснежаны вечар зімовы...).

*Даўгавечнасць кахання залежыць ад доўгацярплівасці жанчыны і ад ступені мужчынскай ляноты* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Дзе любоў, / там і катастрофа* (А. Вярцінскі. Эдзіт Піяф хоча любві).

*Дзень вяселля назначылі, / Ды вяселля не бачылі...* (Я. Колас. Батрак).

*Для аднаго чалавека набытак – шчасце, для другога страта – шчасце. Усё залежыць ад таго, хто набывае і хто страчвае* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Для закаханага чалавека час прыпыняецца, ён, чалавек, не старэе* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Для лысага – лысыя й словы / Пра вернасць, сямейную святасць* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

*Ды пачуццё не думае пра вечнасць, / Калі агонь палае на губах* (А. Бачыла. Вось-вось гатовы ў мора рухнуць скалы...).

*Ешце з голаду, / кахайце змоладу – / іначай вы – / ні к сялу, ні к гораду* (А. Вярцінскі. Парада юным закаханым).

*Ён і яна – і сусвет не пустое* (Р. Барадулін. Ён і яна...).

*Ёсць светлы міг вясёлкі / І ў навальніц, як вяратоўны мост* (М. Шабовіч. Гаворыш мне, што ўсё прайшло даўно...).

*Ёсць на свеце шчасце, / Пакуль дурманіць сіні хмель вясны* (Г. Бураўкін. У твар дыхнула водарам вясны...).

*Ёсць у кахання справядлівасць, / якой нямнога у людзей* (В. Вярба. За ўдзячнасць гэтае сустрэчы...).

*За любоў не судзі людзей, / Не саромецца ёй – нікога!* (В. Аколава. Князь ты мой, Славамір).

*Зару нельга спыніць, а за шчасце можна змагацца* (І. Дуброўскі. Скасаваны агрэх).

*З горнай вяршыні не сходзіць туман, / З вернага сэрца – любоў* (М. Танк. На развітанне стары чабан...).

*І можа, шчасце ў тым і ёсць, / Каб не напіцца з той крыніцы, / Перад якой ты – вечны госць!* (А. Лойка. Заўсёды трошкі таямніцай...).

*І тыя, хто ў шчаслівых, скажуць людзі: / Цень ад святла – не цень* (В. Аколава. Аднойчы і заўсёды).

*Калі верыць, дык у беззаганнае, / Калі йсці, дык сцяжынай дабра!* (Л. Геніюш. У жыцці добрае і паганае...).

*Калі ёсць каханне, трэба, каб была і сям'я. А калі без сям'і, то гэта ўжо не каханне, а распуста* (Я. Сіпакоў. Лета з мятлушкай).

*Калі каханне абвянчае / Жаданай згодай маладых, / Свайго сумлення не хавае / Яно ад позіркаў чужых. / А звяжа шлюбам маладая / Сябе з нялюбым і старым, / Свайго сумлення не схавае / Яна за прозвішчам чужым* (А. Куляшоў. Калі каханне абвянчае...).

*Калі клопат ёсць любоўны, / тады сэрцы паўнакроўны* (А. Вярцінскі. Начны бераг).

*Калі няма часу думаць пра шчасце – гэта і ёсць шчасце* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Калі ў чалавека няма любові, самому чалавеку цяжка і з ім цяжка* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Калі шчасця трэба дабівацца – гэта ўжо не шчасце. Шчасце прыходзіць натуральна і непрыкметна, часцяком нечакана, але заўсёды заслужана за турботы шчырыя і справы духоўныя* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Камусьці – фрагмент рабра, / узноўлены клон Адама... / А мне – акіян святла – / Каханая, Муза, Мама* (Э. Акулін. Жанчына).

*Каханай сэрца падарыце, – / Любімым будзеце і вы* (А. Бялевіч. Сакрэт).

*Каханне без простран – птах без крыла* (Н. Мацяш. Пространь кахання).

*Каханне, грошы, славы сверб – мана: / Няўмольны час завабіць імі сэрца, / Памучае, а потым насмяецца, – / Не здраджвае Радзіма нам адна* (А. Мінкін. Каханне, грошы, славы сверб – мана...).

*Каханне – гэта нyздатнасць усведамляць небяспеку* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Каханне – гэта цяжкая праца для натхнення і пасля натхнення* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Каханне – ёсць мудрасць, / якую Бог людзям / адкрыў, каб грахі даравацЬ* (Э. Акулін. Каханне).

*Каханне ж – радасць, а не плаха* (Н. Мацяш. Дазвол на адпачынак).

*Каханне і веру не трэба ўсім выстаўляць напаказ – душу чуе толькі неба* (А. Лойка. Заўсёды трошкі таямніцай...).

*Каханне і нянавісць – / Родныя дочкі* (В. Вярба. Лялька).

*Каханне – кароткае свята, пасля жаніцьбы – цяжкі будзень* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Каханне маё, каханне, / Ты – як самазгаранне* (А. Грачанікаў. Нават ценю свайго...).

*Каханне – свята душы, праца – свята розуму, смерць – свята цела* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Кахання не просяць* (М. Рудкоўскі. Сёння досвіткам ўпала на клёны зара...).

*Кліча цябе неспакойнае шчасце, / Толькі хутчэй да яго даплыві* (С. Грахоўскі. Плынь).

*Любімых не забываюць у радасці, а ў горы любяць яшчэ мацней* (С. Грахоўскі. Тры песні любові).

*Любіцьму волю вольную да скону, / ды над каханнем узвышаў яе дарма: / любімая, / мне без твайго палону / якая воля, як жыцця няма?!* (В. Жуковіч. Любіцьму волю вольную да скону...).

*Любіць прызначана мне лёсам. / Я не памру, пакуль люблю. / І крык свой сіплы, безгалосы – / Паэта голас – не згублю* (А. Пісьмянкоў. Мой сад зусім не салаўіны).

*Люблю, таму і не іду на дно* (М. Арочка. Спазнаў я ў жыцці...).

*Люблю, хто з сонцам – за руку* (Л. Якубовіч. Іду ў жыццё).

*Любоў і дружба шчасце росцяць...* (А. Александровіч. Што корні дуба).

*Любоў і лад узвышаюць, / вядуць за далягляд. / Варожасць і злосць прыніжаюць, / адкідваюць назад* (А. Вярцінскі. Любоў адкрывае скарбы).

*Любоў і сама, як шыпшына: адплаціць яна / За дотык бяздушны і грубы, адплаціць заўсёды* (А. Зарыцкі. Напамін).

*Любоў нараджае не толькі дзяцей, / Любоў нараджае не толькі надзеі, / Любоў, апрача дзяцей і надзей, / Прыносіць сумненні й падзенні. / Аддаўшы сябе сваёй сяўбе, / Свету явіўшы плады залатыя, / Самазнішчае яна сябе, / І разам з ёй знішчаюцца тыя, / Хто яе носіць...* (А. Вярцінскі. Любоў нараджае не толькі...).

*Любоў – не райскія сады, / Любоў – не дом падараваны, / Любоў – бяздомнік, прапісаны / У верным сэрцы назаўжды* (А. Куляшоў. Чужой любві я не зайздрошчу...).

**М***не шчасця чужога не трэба, / Пакута – яго берагчы* (А. Астрэйка. Мне шчасця чужога не трэба...).

*Многа пройдзена дарог, / А на ганак, твой парог – / За ўсе карацейшая / І за ўсе лягчэйшая* (А. Бялевіч. Хай пасведчыць сельсавет).

*Можа, шчасцем адтаго й завецца / Тое, што не можна паўтарыць* (Н. Тарас. Ад'язджаеш...).

*Мужы са скуры лезуць, / Каб жонкі ўлезлі ў шкуры* (Р. Барадулін. Пра футры).

*Мы нярэдка губім маладосць, / не падтрымаўшы першае каханне / і першы спеў, калі ў ім нешта ёсць* (Е. Лось. З белых пялёсткаў).

*Мы ўсе – з любові, / А як жа мы прад ёю ўсе ў даўгу* (Н. Мацяш. А можа, ўдасца, мо сябе ўтаймую...).

***Н****а вятрах нецярплівых рук / Выспявае заўсёды ростань* (Н. Тулупава. Хто там знае).

*Найбольш трывалае шчасце – у сумленным выкананні абавязку* (Я. Брыль. Сёння і памяць).

*Наймічку таксама добра каля печкі цалаваць, / Калі лёс не шле царыцы, суджанай навек табе* (У. Караткевіч. Аптымізм).

*Нам усім не хапае спагады, / І любові жывым не стае... / Нам адпушчана так небагата, / Што й грахі не запомніш свае* (А. Пісьмянкоў. Думаць вершы).

*Не ведае каханне плагіяту* (З. Дудзюк. Не ведае каханне плагіяту).

*Не вініць мне цябе, не забыць, / Не звязаць абарваныя ніці. / Проста моц ты адняў, каб любіць. / І бяссілля не даў – ненавідзець* (Л. Паўлікава. Абыду, адыду, саступлю...).

*Не водзяць да царквы любоў і страх за рукі, – / Хто ісціну шукаў – век ходзіць без прынукі* (В. Аколава. Случарыны).

*Не кожнаму дадзена шчасце / Зямлю і сябе зразумець...* (С. Законнікаў. Урбаны).

*Не надзявай аброць / На пачуццё і поўнай меркай мерай / Для ўсіх людзей і радасць і дабро* (А. Бачыла. Жыццё, як белы аркушык паперы...).

*Не, на каханне ланцугоў няма* (Я. Сіпакоў. Як мы, калісьці стрэўшыся, з табой...).

*Не паміраюць ад кахання, / А паміраюць без яго* (З. Дудзюк. Суцешыў сябра незнарок...).

*Не прыйдзе шчасце без прычыны, / Без мужнасці не выстаіць баец, / Без гора не прарэжуцца маршчыны, / Без веры не загоіцца рубец* (С. Грахоўскі. Сэрца).

*Не страшна мне, бо я – кахаю, / Не скрушна мне, бо я – люблю* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Не трэба, каб усе мяне любілі, / Бо і сама камусь сказала: «Не!»* (Я. Янішчыц. Запозна радасць, як даспелы яблык...).

*Нецалаваных на зямлі няма. / І хітрыя жанчыны і дзяўчаткі / У сэрцах носяць свой сакрэтны май / І пацалункаў вечныя пячаткі* (А. Сербантовіч. Нецалаваных на зямлі няма...).

*Ніштo ў чалавеку такім безаглядна-шчырым не бывае, як пачуццё кахання* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Няма амністыі пачуццям, яны без скідкі на гады* (А. Астрэйка. Няма амністыі пачуццям).

*Няма дарогі да шчасця, ёсць дарога да ісціны* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Няма святла, няма кахання* (У. Караткевіч. Дваццаты век, цень верталёта...).

*Няма сцежкі карацейшай, / Як да мілай* (М. Танк. Няма сцежкі карацейшай...).

***П****авек не стане чорнай ганьбай / Любоў прасветлая мая!..* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Пакіньце цішу вуснам і вачам, / Аддайце неба зорам і каханым* (Я. Янішчыц. Пакіньце цішу вуснам і вачам...).

*Пакуль кахаецца – кахай! / А там што будзе – і будзе няхай!* (А. Вярцінскі. Парада юным закаханым).

*Па любімых сумуюць адразу пасля развітання, а сустрэча з любімым становіцца святам* (С. Грахоўскі. Тры песні любові).

*Пачынаецца ўсё з любві* (Я. Янішчыц. Ты пакліч мяне...).

*Перад каханнем, як перад Богам, / няма апраўдання аніякога* (Э. Акулін. Міньён памяці).

*Перасохла крыніца – па дну / Марна чэрпаць і чэрпаць з адчаем: / Дзве жыццёвыя сцежкі ў адну / Не адчай, а любоў спалучае* (Т. Бондар. Крыніца).

*Праводзім шчасце мы, нібыта госця, / І любім, калі трэба разлюбіць* (В. Вярба. Алупкі).

*Прадвызначана напярод: / Любоў – крамола / Там, дзе на долю недарод, / На радасць голад* (Н. Мацяш. Не трэба, дружа, не сваці...).

*Пустым было б і вартым спачування, / Калі б на свеце не было кахання, / Дзе ўсё спрадвек – сакрэт і адкрыццё...* (Г. Бураўкін. Калі хто скажа...).

*Сапраўдным пачуццям не трэба аздобы* (П. Панчанка. Творчасць).

*Святасць жаласці, шкадавання. Усіх, бо ўсе, калі глыбей разабрацца, незразумела і безнадзейна няшчасныя* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Той толькі адчуе ўсю слодыч спаткання, / Хто горкасць разлукі пазнаў* (А. Звонак. Ты снілася мне...).

*Той, хто за веру памерці гатовы, / Той не прыгрэе змяёю ману* (А. Бачыла. Чатырохрадкоўі).

*Той, хто зняверыўся, –/ Іншым не прыклад...* (Н. Гілевіч. Дзённік).

*Трагічна-сумная няўвязка: / ёсць ласка, ёсць патрэба ў ёй, / але раздзелены часта сцяной / патрэба гэтая і ласка* (А. Вярцінскі. Трагічна-сумная няўвязка...).

*Трэба – / Пабыць на самым дне бяды, / Каб шчасце мець / Пад родным небам* (А. Грачанікаў. Бясконцыя рэйкі).

*Тыя, што варты стакрот кахання, – / Тыя не маюць яго на зямлі* (У. Караткевіч. Фантазія).

*У веры ідэі няма. У яе ёсць адны правілы паводзін для душы і цела* (Г. Марчук. Голас і слова).

*У горы таксама ёсць месца для любові* (Я. Скрыган. Трывогі).

*У закаханых – рыцарскае званне* (С. Панізнік. Каханне).

*У імя няўмольнага расстання / Над бяздоннем, / На апошнім дні – /Не карай мяне ўсёдараваннем!* (У. Някляеў. Не дазволь пайсці мне...).

*У кожнага з нас ёсць сасуд любві. Калі ён не напоўнены ў дзяцінстве, дык усё жыццё будзеш пакутаваць ад смагі і неспатоленасці* (С. Алексіевіч. Зачараваныя смерцю).

*Усё створана для любві, усё падапарадкавана яе мудрым законам, і таму нам – і ў жыцці, і ў літаратуры – не трэба парушаць гэтай задуманай гармоніі* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Хоць любоў на зямлі адна, / Паўтарыцца можа яна* (К. Цвірка. Я прыйшоў да вас).

*Хто навучаны болем: да слёз даравацъ, / Той шчасліваe заўтра для заўтра прарочыць* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

*Ці ёсць апраўданне такому каханню, / Якое катуе, якое нявечыць?* (З. Дудзюк. Кахаю. Кахаю... Насуперак лёсу...).

*Чалавек адно датуль шчаслівы, / Пакуль сам / умее шчасце даць* (Н. Мацяш. Ловяць далягляд гады імклівыя...).

*Шчаслівец, хто з мінулым заручон* (А. Лойка. Санет сыну).

*Шчаслівым – шчасце кожны дзень. / Шчаслівыя не каюцца* (А. Сербантовіч. Шчаслівым – шчасце кожны дзень...).

*Шчаслівы той, хто ажаніўся, яшчэ шчаслівейшы той, хто марыць пра шлюб* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Шчаслівы той, хто не зайздросціць поспеху іншага, а дапамагае яму* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Шчасце – гэта гармонія ў тым калектыве, да якога ты належыш* (Я. Колас. Што яны страцілі).

*Шчасце – гэта калі нічога не заўважаеш. Жывеш, як птушка вясной. Сам спяваеш, і ўсё навокал спявае ў поўнай гармоніі* (А. Асіпенка. Цыркачка і маёр).

*Шчасце дакрануцца старой, абветранай дарогамі шчакой да шчочкі дзіцячай, далучыцца да несмяротнасці, якая ў вечным абнаўленні пакаленняў* (Я. Брыль. Вячэрняе).

*Шчасце – / Жыць, працаваць з чалавекам сумленным* (М. Танк. Салчак Тока).

*Шчасце, калі доўга яго чакаеш і калі яно ў нейкі дзень прыходзіць, здаецца неспадзяваным* (М. Танк. Светлая дата).

*Шчасце колісь, як птах, адляціць, / нат каханне згарыць, як лучына, – / сонцам толькі не згасне ў жыцці / несмяротнае слова – Айчына!* (Л. Геніюш. Старажытная сага).

*Шчасце не салавей, ноч у ночку пяяць не будзе* (Н. Арсеннева. Вечар).

*Шчасце – / не тая варона, / Якую не ўхопіш за хвост* (А. Сербантовіч. Надпіс на фотаздымку).

*Шчасце – не тое, што стыне ў граніце, / А тое, што цепліць пачуцці людзей* (А. Бачыла. Цаніце! Высока пачуцці цаніце!).

*Шчасце не ў тым, / Каб шукаць і знайсці ўзнагароду: / Шлях ці знікне ў святле залатым, / Ці застыне пад жвірам халодным* (Т. Бондар. За дабро не адплацяць дабром?..).

*Шчасце! Нешта не чуў я, / Каб хто яго стрэў на чужыне, / Нават самай прыгожай* (М. Танк. Капры).

*Шчасце складаецца не з таго, чаго ў нас няма, а з таго, што мы ёсць* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Шчасце так не даецца, / І яго не купіць; / Шчасце сеецца, жнецца, / Шчасце ў кузнях куецца, / У мартэнах кіпіць* (А. Пысін. Шчасце так не даецца).

*Шчасце у кожнай тваёй перамозе, / Шчасце – адолець і вецер і град, / Шчасце – нідзе не спыняцца ў дарозе, / Спынішся – плынню адгоніць назад* (С. Грахоўскі. Плынь).

*Шчасця большага няма ў зярняці, / Як на ніве роднай прарасці* (В. Таўлай. Якуб Колас).

*Шчасця / На свеце большага няма, / Чым да людской душы дапасці, / Каб засвяцілася яна* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Хто многа любіў – даруецца многа, / Хто мала любіў – даруецца мала* (Р. Барадулін. Выратаванне).

*Як каноплі ў балоце тапіці – / так жыць: не любіці* (В. Аколава. Случарынкі).

## *«ЖАНЧЫНА – ТАЯМНІЦА З ТАЯМНІЦ»*

### Жанчына – жонка, жанчына – маці, яе роля ў сям'і, у грамадстве

*Глянуць адчужана зверху ўніз – / святое жаночае права* (А. Вярцінскі. Жаночая гордасць).

*Гордасць – таксама, мабыць, жаночае хараство* (Я. Скрыган. Наталя).

*Жанчына без дабраты настолькі жанчына, наколькі дрэва без соку можа лічыцца дрэвам* (У. Рубанаў. Светлы ручай любві).

*Жанчына дае жыццё, жанчына аберагае жыццё, жанчына і жыццё – сінонімы* (С. Алексіевіч. У вайны не жаночае аблічча).

*Жанчына – душа мужчыны; яна наша натхняльніца на вялікія справы* (Я. Колас. Забастоўшчыкі).

*Жанчына і дзіця – / працяг у вечнасць* (Л. Забалоцкая. Імжэе сонца высмяглы сланечнік...).

*Жанчына – сасуд без дна. / Дакладней – Сусвет сусветаў. / Сам Бог у яго віна / наліў, каб натхняць паэтаў* (Э. Акулін. Жанчына).

*Жанчына – таямніца з таямніц, / Пачатак шчасця і трывогі* (С. Грахоўскі. Жанчына).

*Жанчына – хараства вяршыня. / Вяршыня радасці – жанчына* (В. Жуковіч. Двухрадкоўі).

*Жанчыны панствуюць і ў мане, / А мужчыны і ў праўдзе – рабы* (У. Караткевіч. Чырвоны шар).

*Заблудзяцца ночы ў днях / у пошуках апахмелкі... / Жанчына – сасуд без дна / для тых, хто душой нямелкі* (Э. Акулін. Жанчына).

*Закон адвечны і мудры: / калі сустрэнуць вясну; / жанчыны скінуць футры, / дрэвы накінуць ліству. / Будуць, па тым законе, / жанчыны нас хвалявацъ, / а дрэвы супакойвацъ, / думкі навявацъ* (А. Вярцінскі. Вясновы закон).

*Замужаства адкрывае жанчыне вочы на самую сябе* (К. Чорны. Люба Лук'янская).

*З дужай стварыы мяне кволай* (Д. Бічэль-Загнетава. А на Палессі).

*З жанчынамі свет не старэ, / Ён маладзее, дабрэе, / І, ўрэшце, нас дорыць ім* (А. Грачанікаў. Жанчыны).

*Зрываюцца ў бездань хвіліны / Са стром пакручастых жыцця – / Высокае імя Жанчыны / Вяртае наноў з небыцця* (Э. Зубрыцкі. Высокае імя Жанчыны).

*І не па рангу, не па чыну, / Калі што-небудзь і цаню – / Цаню я простую жанчыну, / Яе любоў і чысціню!* (А. Сербантовіч. Чысціня).

*Лёс удавы – як песня жураўліная* (Л. Забалоцкая. Каліна стукне ў шыбу золкай раніцай...).

**Н***а беларускую дзяўчыну / Ніхто йшчэ каменем не кінуў / І не паважыцца кідаць* (Я. Купала. Магіла льва).

*Навошта ж воля для жанчыны, / Калі ёй цэлы свет чужы!* (Я. Янішчыц. Вольная жанчына).

*Непрыгожых жанчын не бывае, / Проста шмат невідушчых мужчын* (Г. Бураўкін. Непрыгожых жанчын не бывае...).

*Не трэба з тонкай пекнатою / Жанчынам ля гармат хадзіць. / Вады не трэба, калі ёю / Толькі параненых / Паіць!* (Е. Лось. Севастопальская панарама).

**О***, колькі можа нам жанчына / Сказаць у песні – пра сябе!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

**П***акуль будуць жанчыны, / Не змоўкнуць паэты, / Пакуль будуць паэты, / Жанчыны не будуць старэць* (Г. Бураўкін. Лісток альбома з XIX стагоддзя).

*Пакуль не спыніўся гадзіннік / І лічаць зязюлі гады, / Высокае імя Жанчыны / Заслоніць сабой ад бяды* (Э. Зубрыцкі. Высокае імя Жанчыны).

*Палюбоўнік трэба, калі жанчына хоча даведацца аб сапраўдных лічбах свайго сямейнага бюджэту. Палюбоўніца трэба, калі мужчына хоча даведацца пра хітрыкі і падманы ўласнай жонкі* (Г. Марчук. Голас і слова).

**Р***агнеда, Еўфрасіння і Ларыса – / надзея жыць і прага нараджаць* (А. Хатэнка. Уваскрасаюць постацяў абрысы...).

*Твар у жанчыны, якая многа думае, становіцца шэры, характар – невыносны, старасць – заўчаснай* (Я. Сіпакоў. Лета з мятлушкай).

*Толькі багі / Судзяць гонар славянскай жанчыны* (В. Аколава. Князь ты мой, Славамір).

*У жанчыны дзве святасці: сям'я і дзеці* (У. Рубанаў. Светлы ручай любві).

*У шчэбет і посвіст птушыны / З далёкіх і блізкіх дарог / Высокае імя Жанчыны / Прыводзіць на родны парог* (Э. Зубрыцкі. Высокае імя Жанчыны).

*Хто плюе на жанчыну – / той, нелюдзь, плюе на Радзіму* (А. Сыс. Як святарны абраз...).

*Я жанчына, жанчына... / Жанчына са слёз* (Л. Геніюш. У хвіліну болю).

## *«СЫНОК І МАЦІ – ЗЕРНЕ І РАЛЛЯ, СЫНОК І МАЦІ – МУДРАЯ ІКОНА»*

### Сям'я; бацькі, дзеці; родная хата; родныя, род; сувязь пакаленняў

*А балючэй за ўсякі боль – / Як дзеці любыя чужэюць / І варагуюць між сабой* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*А голас мамін будзе мне / Гучаць, / Нібы малітва ў храме* (Р. Барадулін. Старэе дзень).

*Ад дзетак слава бацькі не ўцячэ* (Н. Гілевіч. А дзецям у вочы – глядзіш?).

*Адкрыю раўнадушнаму душу, / А роднаму ад сораму схлушу* (П. Панчанка. Здараецца часамі я раблю...).

*Адна іх маці радзіла – / Грэла сваім бяссоннем. / Адна іх зямля насіла, / Адно ім свяціла сонца! / Адна гадавала хата: / Адзін узяў меч абаронцы, / Другі ўзяў сякеру ката* (А. Пісьмянкоў. Адна іх маці радзіла...).

*А доля ўсіх матак такая – / Дарогам сыноў аддаваць* (А. Пысін. Дарога).

*Адрачэцца радня па крыві – / Паратуе радня па духу* (Н. Мацяш. Сябрыне).

*Акальцованыя птушкі, акальцованыя жонкі* (П. Панчанка. Думаю, думаю...).

*Але для ўсіх нязменны запавет – /Не толькі род цябе ў жыцці ўзвышае, / Найперш ты сам узвысіць род павінен* (С. Законнікаў. Кульмінацыя).

*А помніш, мама, я дачкой была. / Цяпер далёкай госцяй залятаю* (Л. Тарасюк. Усё як трэба зразумець самой...).

*А ўрэшце кожны плача па сваім бацьку, як умее* (Я. Колас. На ростанях).

***Б**аліць ад усяго люцей / Бацькоўскі боль за дзяцей* (Р. Барадулін. Ксты).

*Барані арліц, арлец!* (В. Аколава. На рацэ Прыманцы...).

*Бацька, і маці, і родная мова, / узнятая к славе амаль з небыцця / паэтаў натхнёным і велічным словам, / для беларусаў – пытанне жыцця* (Л. Геніюш. Як бацька чакае сыноў...).

*Бацькам калісьці памагалі дзеці, / ну а цяпер – надварот* (В. Жуковіч. Цяжкі паварот).

*Бацькі дзяцей не абкрадаюць – / Спакон было так, з роду ў род* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Бацькі з магіл цяплом дыхнулі, / Каб дзецям жыць лягчэй было* (У. Караткевіч. Бацькі з магіл цяплом дыхнулі...).

*Бацькоўская хата без маці – / Што грудзі жывыя без сэрца* (М. Рудкоўскі. Дом без маці).

*Без тваіх, маці, жніўных песень / Свет шырокі зрабіўся б цесен. / Без твае скупой прыгажосці / Я ў жыцці прратаптаўся б госцем* (М. Лужанін. Праз вайну).

*Боль адчуваюць толькі родныя, у каго яны ёсць* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Будзь здарова, радня па крыві, / Будзь бяссмертна, радня па духу!* (Н. Мацяш. Сябрыне).

*Бязроднасць гневіць камяні* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

**В***очы маці – вечнасці акно* (Л. Галубовіч. Люстэрка матчыных вачэй).

*Вялікім, неабдымным, нязмерным можа быць каханне маці* (Р. Мурашка. Сын).

*Голас незнаёмага можа здзівіць, / Голас друга – на хвіліну спыніць, / Голас любай – сагрэць сонцам лета, / Голас маці – вярнуць з таго свету* (М. Танк. Голас).

*Грошы бацькавы – не смецце* (Я. Колас. Новая зямля).

*Дарагія аблічча / Нават смерці не сцерці* (Я. Янішчыц. Вы, шматкроп'і і клічнікі...).

*Дачушка, а потым і ўнучка ў хаце – гэта ж свежы букет на стале* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Дзедава скрыпка – мост пакаленняў, / Вечнасці кладка. Вякоў талісман* (Н. Загорская. Дзедава скрыпка).

*Дзеці – / І Гасподні дар, і кара / Ўсім бацькам за іхнія грахі* (Р. Барадулін. Надзею мецьме...).

*Дзеці – радасць і прыгажосць усіх народаў свету* (Я. Брыль. Вачыма друга).

*Дзеці сентыментальнымі не бываюць* (Я. Брыль. Трохі пра вечнае).

*Дзіця для матулі – радасць на рукі* (Н. Тарас. Вершы, бы дзеці, нараджаюцца ў муках...).

*Дзядоў і прадзедаў знаёмыя сляды / Вядуць сыноў і праўнукаў заўжды / Да роднага любімага парога* (М. Хведаровіч. Калі паўвека мерна адгрукоча).

*Дзяды – вытокі кожнага народа* (А. Лойка. У гэты вечар).

*Дзяды і бабулі патрэбныя дзецям не меней за бацькоў. Ад іх існавання і прысутнасці на доўгія гады заста-*

*еяцца ў дзяцiных душах цеплыня, якой, па маладосцi, не заўсёды хапае бацькам* (А. Васiлевiч. Першая жонка нябожчыка).

*Дзяды i прадзеды – якiя вы? / I дзе, скажыце, тая нiць, / Якую ў спадчыну пакiнулi, / Каб ёй вякi навечна звiць?* (А. Сербантовiч. Дзяды i прадзеды – якiя вы?..).

***Ё**сць лагода на боль, на скруху: / Адрачэцца радня па крывi – / Паратуе радня па духу* (Н. Мацяш. Сябрыне).

***Ж**аночае сэрца робiцца вялiкае, як свет, калi яно чуе боль знявечанага дзiцяцi* (К. Чорны. Пошукi будучынi).

*Жанчына i дзiця – / працяг у вечнасць* (Л. Забалоцкая. Iмжэе сонца высмяглы сланечнiк...).

*Жывём наiўнасцю святой, / Наступным днём, а светлы той, / Калi табе прыснiцца мама* (Р. Барадулiн. Трыпутнiк).

***I** грудзi матчыны кусаюць, / Ледзь-ледзь прарэжацца зубок* (С. Дзяргай. На шашы энтузiястаў).

*Iсцiна не ў вiне, не ў вайне. /Iсцiна ў нашых дзецях* (Л. Дайнека. Iсцiна).

***К**аб выбраць лепшую з дарог, / Патрэбна мудрасць працы / Нашых сэрцаў; / Патрэбны мацi, бацька, педагог* (П. Панчанка. Ратуйце нашы душы).

*Каб у полымi свет не загiнуў, / Пазiрайце часцей на дзяцей* (С. Законнiкаў. Пазiрайце на дзяцей).

*Калi б мы матак не хавалi, / Слёзы б не патрэбны нам былi* (А. Пысiн. Не пялёсткi ганак усцiлаюць).

*Калі браты – браты – не знічкі, / Сузор'ем ім гарэць адным!..* (А. Лойка. Вось, вось яны, жыцця парогі...).

*Калі гарыць дом, першымі заўсёды ратуюць дзяцей, бо менавіта яны вырастуць і адбудуюць новы дом* (У. Ліпскі. Дай, божа, дзецям долю).

*Калі я і навекі анямею, / Мяне ва ўсім матуля зразумее* (М. Рудкоўскі. Вяртаюся у край свой дарагі).

***М**аладыя толькі / Сонца й мама. / Радасць яшчэ маладая таксама* (Р. Барадулін. Ксты).

*Мала маці мы любім, / Рэдка ласку ёй дорым* (П. Панчанка. Маці).

*Малодзяць маці ўдалыя сыны, / І старацъ – як няўдалыя яны* (Я. Сіпакоў. Раджала фараонаў і рабоў...).

*Матуля і мова – з калыскі адное* (В. Аколава. Случарыны).

*Маці – адзінае вышэйшае імя* (С. Грахоўскі. Высокае імя).

*Мне для роднае маці не грэшна / Падарыць салаўіны мой гай, / На далоні падсмажыць яечню, / На далоні спячы каравай* (А. Бялевіч. На далоні спяку каравай).

*Мы ўсе жывём пад зоркамі матуль. / І гэты свет / Сагрэлі нам матулі* (Р. Барадулін. Мы ўсе).

***Н**амарозіць радня па крыві – / Адагрэе радня па долі* (Н. Мацяш. Сябрыне).

*Нам бы самай высокай роднасці, / апантанасці дэфіцытнай!* (В. Жуковіч. Беларусам).

*На прызбу сесці побач з дзедам / Яшчэ патрэбна заслужыць* (С. Законнікаў. Прызба).

*Народ наш у вяках / Трымаўся на сям'і* (Н. Гілевіч. Адказ з пярстом божым).

*Нас дзеці і ўнукі паўтораць нанова – / Народы не спісваюцца на пенсію* (П. Макаль. Родная мова).

*Нельга матак суцяшаць, / Калі яны галосяць па сынах...* (К. Кірэенка. Уступ).

*Не шукай сваіх сярод чужых, / Роднымі не зробяцца чужыя. / І чужая йголка не прышые / Латку радасці да сноў былых* (Р. Барадулін. Парада).

*Нібы дэльфіны, дзеці ад напасці / свет, як тапельца, вынесуць на бераг / усеагульнай еднасці і шчасця* (С. Законнікаў. Кульмінацыя).

*Ні вядзьмар, ні ліхія ваўкі / не страшныя, як брат твой людскі...* (Л. Геніюш. Трывога).

*Нідзе і ніколі / Я не бачыў яшчэ непрыгожых дзяцей* (Н. Гілевіч. Дзеці, дзеці...).

*Нішто так не калечыць хату, як смерць гаспадароў* (Г. Марчук. Канон хаце).

*Ніякай сіле, ліху злому / У сэрцы маці не забіць / Надзею: даць працяг жывому! / Надзею: песціць і любіць!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці ).

*Нявесце пры бацьках і дзень як год, / А сіраце жаніцца – ноч кароткая* (М. Маляўка. Без маці, бацькі блага сіраце...).

*Нягодны ўнуку ўжо тварэнні, / Якія меў на ўслугах дзед* (Я. Купала. Кругаварот).

**О**, *дзеці, дзеці! Дзе мне вочы дзець, / Каб вам у вашы вочы не глядзець?* (Н. Гілевіч. У лета 1986-е).

*О, мацярынства мацярык нязнаны. / Яго заўсёды адкрываюць нанава* (Р. Барадулін. Яшчэ гетэры старажытнай Грэцыі...).

*О, як жа вы ўсе, маці, ў час бяды / Падобны, як дзве кропелькі вады* (А. Бачыла. Гнёзды).

*О, як лёгка ісці, адчуваючы матчыны рукі, / Адчуваючы крылы юнацтва, / Адчуваючы плечы каханай! / І як цяжка цягнуцца, /Ў далонях трымаючы толькі кульбаку ўспамінаў* (М. Танк. О, як лёгка ісці...).

**П***ашана хаце – добры госць!* (Л. Рублеўская. Шляхціц Завальня).

*Першыя дзеці ёсць адзнака маладосці жанчыны. Апошняе дзіця ёсць адзнака сталасці перад старасцю* (К. Чорны. Скіп'ёўскі лес).

*Праўды чорны хлеб і мамы слова / У мяне ніхто не адбярэ* (С. Законнікаў. Нашаму жабрацтву ёсць прычына...).

*Прыемна ў дом зайсці з дарогі, / Дзе рады вам гаспадары* (Я. Колас. Рыбакова хата).

**Р***ана-рана / сталеюць унукі, / Калі / паміраюць дзяды* (А. Пісьмянкоў. Калі ў вёсцы маёй паміраюць дзяды...).

**С***амыя балючыя раны ў дзяцінстве / Перастаюць ныць ад пацалункаў маці. / У юнацтве – самі зажываюць ад вяселля. / У сталасці – загойваюцца ад спагады*

*сяброў... / І толькі пазнейшыя раны/ Ніхто і нішто не залечыць, / Апроч зямлі* (М. Танк. Самыя балючыя раны ў дзяцінстве...).

*Самыя вясёлыя і галасістыя салаўі – / на вясковых могілках. Напэўна, таму, / што і днююць, і начуюць не ў гнёздах, / а ў душах маіх спрахлых дзядоў* (А. Сыс. Рай).

*Сынок і Маці – зерне і ралля. / Сынок і Маці – мудрая ікона* (Я. Янішчыц. Сынок і Маці).

*Сям'я ўратаваная – і ўратаваны народ* (Л. Рублеўская. Вечар у сямейным коле).

*Так ужо наканавана небам: / Маці дзеліцца з дзецьмі / Душою сваёй, як хлебам* (Р. Барадулін. Ксты).

*Таму туды раней за нас матулі / Ідуць, каб зноў вучыць сваіх малых* (Р. Барадулін. Палыновыя санеты).

*Толькі блізкіх зближае ростань. / Толькі з блізкімі час у згодзе* (Н. Мацяш. Чэрвеньскі вецер).

*Толькі ў мамы / Самы суровы дакор / І пяшчотнейшы самы* (Р. Барадулін. Ксты).

*Трэба вучыцца жыць у дзяцей / І яшчэ – / у выдатных людзей. / А гэтыя людзі – / вялікія дзеці / у звычайным дарослым свеце... / Словам, вучыцца трэба ў дзяцей* (А. Вярцінскі. Трэба вучыцца жыць у дзяцей).

*Ты – маці, жонка; ты – дачка, сястра, / Твая заўсёды гожая пара* (Я. Сіпакоў. Жанчына).

*Ты – маці, ты – на ўсё гатова, / Усё – змагчы, усё – аддаць, / Адно б вясёлых ды здаровых / Дзяцей пад сонцам аглядаць* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Ты* [маці] *сэрцам там, дзе плачуць дзеці, / Бо дзеці слёз не льюць здарма* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*У бачыць свет не злым / Умеюць толькі мамы* (У. Дзюба. На дрэвах не відаць...).

*У жанчыны дзве святасці: сям'я і дзеці* (У. Рубанаў. Светлы ручай любві).

*У кожнай дзіцячай слязе – вобраз маці* (М. Танк. У кроплі).

*Усё мяняецца на свеце, / Не толькі дзеці* (П. Трус. На новы лад усё звоніць).

*Усё пачынаецца ад маці, / Ад мовы роднае зямлі* (В. Вярба. Натхненне).

*У цэлым свеце, на планеце, / Ва ўсіх краях, ва ўсіх кутках / З'яднае ўсе людскія сэрцы / Твой* [маці] *вобраз з дзіцем на руках!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Хай вам, бацькі, не плачацца па дзецях: нам сцежкі вашы весці ў глыб жыцця* ( Н. Мацяш. Тры каласкі любові і смутку).

*Хаты не могуць, як дрэвы, расці* (Д. Бічэль-Загнетава. Якутоўка).

*Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, / Хто забыў сваю мову – усё згубіў* (У. Караткевіч. Слова пра чалавечнасць).

*Я вечны ў роднай старане, / Як слова Мама...* (Р. Барадулін. Вечны).

*Я знаў толькі адну зорку – / Пяцікрылую далонь маці* (М. Танк. Не знаю...).

## *«ГАДУЮЦЦА ДЗЕЦІ Ў ЛЮБОВІ – РАТУЕЦЦА ВЕЧНАСЦЬ»*

### Дзяцінства; вучоба і выхаванне маладога пакалення; веды і вопыт; асоба настаўніка, выхавацеля

***А****біжаешся, што ў школе / справядлівасці няма. / Да жыцця рыхтуе школа... / Так што скардзіцца дарма* (В. Жуковіч. Ты за ўсё перажываеш...).

***В****еды, засвоеныя механічна, – нямая вага* (А. Разанаў. Зномы).

*Веды – таксама ежа, разумовая, але ежа, і яна таксама можа быць не на карысць чалавеку, яна таксама можа шкодзіць, і ад яе таксама неабходна час ад часу разгружацца – пасціць* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

*Вучы дзяцей яшчэ з пялёнак: / Каб не скаціцца пад адхон – / Хай з курганоў тваіх зялёных / Бяруць у заўтрае разгон* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Вучыся, нябожа, вучэнне паможа / Змагацца з нядоляй, няволяй* (Я. Купала. Вучыся, нябожа).

*Выхаванне – гэта выхаванне духу. Ці можна дух і душу выхаваць злом, кулаком, зверствам?* (У. Ліпскі. Ачысцім нашы душы).

***Г****адуюцца дзеці ў любові – ратуецца вечнасць* (Л. Рублеўская. Вечар у сямейным коле).

*Дзеці выключна тонкія эстэты. Таму яны і жорсткія... Імі катэгарычна непрымальнае нехараство, немаладосць, нецікавасць* (А. Васілевіч. Пра вечнае).

*Дзеці павінны ўзбагачацца вопытам бацькоў* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Дзеці – сведчанне вечнасці* (Я. Брыль. Вячэрняе).

*Дзіця без дзяцінства – сівы лунь. Дзіця без душы – ледзяны слуп. Дзіця без працы – труцень. Дык вось што трэба для здароўя нашых дзяцей: шчаслівае дзяцінства, высокая духоўнасць, творчая праца!* (У. Ліпскі. Дай, божа, дзецям долю).

*Дзіцячай памяці ўласціва зберагаць першыя ўражанні на ўсё жыццё* (С. Грахоўскі. Зажураныя жураўлі).

*Дзяцінства не ведае жалю, калі / Не помняць спагады дарослыя* (У. Някляеў. Куліна).

*Дзяцінству лёгка дыхаць* (І. Багдановіч. Паяцы).

*Для дзяцей пахнуць травы аднолькава / На Лонг-Айландзе і пад Масквой* (П. Панчанка. Хлопчык з фермы).

*Ён толькі летась скончыў школку / І веды меў у адну столку* (Я. Колас. Новая зямля).

*Ёсць страшны суд дзіцячай адзіноты...* (І. Багдановіч. Дзіцячы дом).

*Заўсёды кніга нараджае кнігу, / Больш дасканалую, бліжэйшую да праўды* (М. Танк. У Татрах).

*І, можа, не варта вучыць іх* [маладых] *навуцы, / калі не з імі на віражах?* (П. Шруб. Законы Ньютана з класічнай фізікі...).

*Каб выбраць лепшую з дарог, / Патрэбна мудрасць працы / Нашых сэрцаў; / Патрэбны маці, бацька, педагог* (П. Панчанка. Ратуйце нашы душы).

*Невычэрпна гэта і невыказна – сутыкненне чысціні, нявіннасці, права на шчасце, на праўду, сутыкненне маленства з лютасцю, чэрствасцю, тупасцю, подласцю дарослых, якія займаюцца не тым, чым чалавеку трэба займацца* (Я. Брыль. Вячэрняе).

*Паставіць няўдача пячатку, / Ну што ж, і няўдача – урокі* (Я. Янішчыц. Пачатковая школа).

*Пражыць, як гавораць, – не поле прайсці, / Вучыцца не позна ніколі* (П. Броўка. Пражыць, як гавораць...).

*Самае складанае ганчарства – гэта ляпіць чалавека* (А. Бадак. Ра).

*Самая вялікая хлусня – гэта хлусня маленькаму чалавеку* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Самая цудоўная, самая міжнародная музыка – дзіцячы смех* (Я. Брыль. Служэнне).

*Табе зайздрошчу светла, мой настаўнік, / няўтомнай эрудыцыі тваёй, / тваёй святой няволі, – толькі ў ёй / душа бяднець і старыцца не стане* (В. Жуковіч. Перада мною вобраз твой паўстане...).

*Так патрабуе ўжо ў калысцы / Дагляду мудрага дзіця, / Каб у жыцці аратым выйсці, / А не нахлебнікам жыцця!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Твая пачэсная справа –/ Жыццё адкрываць другому* (А. Руцкая. Настаўніку).

*Той дзень, лічы, завянуў пустацветам, / Калі ты пяць хвілін пашкадаваў, / Каб дзецям паказаць куточак свету, / І хараство людзей, і дрэў, і траў* (П. Панчанка. Той дзень прапаў...).

***У** кожнага ёсць свая школа / І літары ёсць залатыя* (Я. Янішчыц. Пачатковая школа).

*У маленстве мы спазнаём свет, каб прыняць яго такім, які ён ёсць, каб ведаць, што ён ёсць* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

***Х**то навучан – / праспявае фразу звонкай навіны* (Е. Лось. Не бяры каменьчык, што ты!).

***Ш**кола для таго, каб людзі маглі перадаць адзін аднаму сваю багатую душу* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

***Я**к навучыць дарослых, што дзецям трэба даць «даспець» у дзяцінстве?* (У. Ліпскі. Ачысцім нашы душы).

*Як не хапае нам настаўнікаў, / Што знаюць родную зямлю* (М. Рудкоўскі. Чытаю па складах і думаю...).

*Як рэдка ў рэках нашага маленства / змываем груз дарожнае тугі* (Н. Загорская. Як рэдка ходзім мы...).

*Яшчэ ніколі ніхто не забываў свайго дзяцінства* (Я. Скрыган. Гордасць).

## «З УЧЫНКАЎ МАЛАДОСЦІ І СТАРАСЦЬ У ЛЮДЗЕЙ»

### Юнацтва, маладосць, сталасць, старасць

*Але хоць мы, далёка пакінуўшы за сабою вясну свайго жыцця, часта сядзім каля гнілога карыта растрэсеных думак і зманлівых надзей, усё ж такі мы любоўна глядзім на нашу маладосць і сэрца наша гатова плакаць па ўтрачанай вясне* (Я. Колас. Так і трэба ашуканцу).

*Ах, прага юнацтва, калі б ты умела, / Ах, старасці смага, калі б ты магла!* (А. Звонак. Партрэт).

*Дзе пройдуць ногі маладосці, / Дыхне і мёртвая зямля!* (А. Звонак. Дзе пройдуць ногі маладосці).

*З учынкаў маладосці і старасць у людзей* (В. Аколава. Случарыны).

*І ў хваляванні старэчым, як наўздагон, ёсць свая перавага – такая, як рэха вялікай душэўнай красы, успамінальна-развітальная, журботна-радасная асалода* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Калі сумленна / Ты пражыў свой дзень, / Сумленным, дружа, / Будзе і твой вечар* (А. Грачанікаў. Франтавікі).

*Колькі на вяселлях ні скачы, / Маладосць табе не зберагчы* (А. Грачанікаў. Адцвіла юначая вясна...).

*Маладосці больш у вечнасць верыцца* (К. Кірэенка. Ёсць яшчэ дуброва, ёсць паляна...).

*Маладосць – абарваны трыпціх – / У трывожным жыве падарожжы* (А. Пысін. Памяць).

*Маладосць! Ты маеш дзён багата,/ Ты іх, бесклапотная, не лічыш; / Толькі старасць разумее страту: / Мала – ды ні ў кога не пазычыш* (К. Буйло. Пройдзе дзень – і ў вечнасці затоне...).

*Маладосць хто раскрышыць, разбожыць – / Галаву, як на пласе, спарожніць* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

*Маладыя ногі і ў балоце не гразнуць* (Я. Колас. На прасторах жыцця).

*Маладыя толькі / Сонца й мама. / Радасць яшчэ маладая таксама* (Р. Барадулін. Ксты).

*Можна й вясною дачасна састарыцца, / Можна і полымем ўвосень гарэць* (Л. Геніюш. Нам марыць належыць тады, калі марыцца...).

*Моладзь – гэта надзея, світанне, / каласы нашы і васількі.* (Л. Геніюш. Моладзі).

**Н***а старасці год чалавек не гатовы спажыць здабыткі юначай мары, што нечакана здзейсніліся* (Г. Марчук. Голас і слова).

*На старасці цвярдзее падушка пад галавой і мулкай становіцца пасцель* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Не хачу дажыць часоў, / Калі плечы ад гадоў сагнуцца / І з усіх маіх былых сяброў / Толькі дзве далоні застануцца* (М. Танк. Не хачу пакідаць...).

**О** *маладосць! Як бы мы жылі, калі б тое, што спазнаём пасля, спазналі раней!...* (Б. Сачанка. Наводшыбе).

*Пра маладосць пяюць бярозы, / Пра вечнасць – хмурыя дубы* (А. Бачыла. Нібы сімфонія жывая...).

*Святое права старасці – пісаць тое, што хочацца самому* (Я. Брыль. Вячэрняе).

*Святую наіўнасць маленства ў старасць не пераняцеш* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Спяшаецца і жыць, і адчуваць, / Напэўна ж, / маладосць невыпадкова* (У. Скарынкін. Перад вяселлем сына).

*Сталасць – гэта прага дасканаласці, / У якой няма ў жыцці мяжы* (П. Макаль. Дацягнуцца да старэйшых, вырасці...).

*Старасць мылам не адмыеш* (Я. Сіпакоў. Сцяпан і Рукавок).

*Старасць настае тады, калі ты ўсё больш і больш знаходзіш знаёмых прозвішчаў на надмагільных помніках* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Старасць не радасць, аднак усім хочацца да яе дажыць* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Старасць таксама бывае розная – гордая, як у дуба, плаксівая, як у асіны, тужлівая, як у бярозы, і скрыпучая, як у вяза. Але якая б яна ні была, ёй усё роўна ніхто не зайздросціць* (Б. Сачанка. Пакуль не развіднела).

*Старасць – час, калі не маеш права, / Апроч сну, адпачынку, спакою, / Ні на адзін дзень адкласці свае справы* (М. Танк. Старасць – час, калі не маеш права...).

*Старому трэба не швэндацца па свеце, а трымацца роднага кута – і не таму толькі, што там і сцены дапамагаюць, але ж і дзеля годнага заканчэння свайго жыццёвага шляху, са сваім месцам у Зямлі* (Я. Брыль, З людзьмі і сам-насам).

**Т***акі рухавы малы – / што амаль што выслізгвае са свету, / такі нерухомы стары – / што свет амаль што выслізгвае ад яго* (А. Разанаў. Пункціры).

**У***жо ў цікаўнасці дзіцяці / Гучыць разважнасць сівізны* (А. Грачанікаў. Пераемнасць).

*У маладосці душа і думкі не абцяжараны развагаю аб мэтазгоднасці* (К. Чорны. Пошукі будучыні).

*Ў сямнаццаць кветак ты не бачыш, / Сам – нераспўшчаны бутон* (А. Лойка. Любоў прыходзіць не ў сямнаццаць...).

*У старасці па-дзіцячы здзіўляцца, як гэта вечна, правечна цякуць па зямлі розныя па велічыні, па красе ды такія шматлікія рэкі...* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

**Ч***ас – непадкупны і справядлівы суддзя! / Даруй старэйшым, / Якія асуджалі мяне за маладосць, / Бо самі да яе / Ўжо не маглі вярнуцца. / Даруй і маладзейшым, / Якія асуджаюць мяне зноў / За старасць, / Забыўшыся, што з ёй / І ім не размінуцца* (М. Танк. Час – непадкупны і справядлівы суддзя!)

**Ю***нацтва – мёд, / і ў гэтым мёдзе / Яшчэ не чутна / гаркаты* (А. Пісьмянкоў. Як гэта хораша – юнацтва!..).

## «УСЁ ПАКІНУЦЬ СЛЕД ПАВІННА...»

### Набыткі, жыццёвы плён душы і працы

*Адзін прыйшоў / і след пакінуў, / Другі прыйшоў, / каб наслядзіць* (С. Дзяргай. Згадаў я зерне і мякіну...).

*А след ад вялікай душы застаецца на свеце доўга* (Я. Колас. На ўсё ёсць прычына).

*Вам* [маладым] *доўга крочыць праз гады./ Не забывайцеся ж, якія / Вы пакідаеце сляды* (П. Броўка. Сляды).

*Жыві, шукай, усё рабі як след, / Каб на Радзіме твой свяціўся след* (С. Грахоўскі. Не здавайся, не ўпадзі ў адчай).

*Калі б ды кожны / З маленства думаў, з першых лет, / Які – ці светлы, ці прыгожы – / Пакіне ў памяці ён след* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Кропля крыві / не знікае ніколі / бясследна...* (С. Законнікаў. Ля помніка Шандару Пецёфі).

*Не важна, хто ты – хлебароб, паэт, / Адно на ўсіх людзей зямное шчасце. / Галоўнае, які пакінеш след, – / Па ім ступаць далей твайму нашчадку* (С. Законнікаў. Устань да сонца!).

*Не магу цярпець я верхаглядаў, / Верхалазам – тысяча пашан* (П. Панчанка. Верхалазы).

*Не прыстаць,/ Не здарожыцца,/ Не звярнуць на пярэдых, спачын, /Не пакінуць абурана, / За сабою не ляпнуць дзвярыма, як векам...* (Н. Мацяш. Песня).

*Нідзе / так доўга / сляды / не застаюцца, / Як на душы!* (У. Карызна. Сляды).

**С***амім сабой застаецца святло, / I шчодрае, і скупое...* (Р. Барадулін. Каб потым...).

**У***паў падбіты ў паднябессі жораў, а на зямлі яго не гасне след* (С. Грахоўскі. Развітальная журба).

*Усё знікае, праходзіць, як дым, / Светлы ж след будзе вечна жывым* (М. Багдановіч. Думы).

*Усё пакінуць след павінна, / Бо, як пачаўся белы свет / Прамень, пясчынка і расінка/ Нязменна пакідаюць след* (П. Броўка. Сляды).

**Ч***алавека сляды у стагоддзях не гінуць. / Гэта помні заўжды, / Перш чым след свой пакінуць* (Е. Лось. Чалавека сляды у стагоддзях не гінуць...).

**Ш***то значым мы / самі па сабе?.. / Семя знаходзіць сябе / ў сяўбе. / У гэтым полі, / гэтым жыцці / мы павінны / прарасці. / У гэтым полі, / гэтым жыцці / мы павінны / узысці. / У гэтым полі, / гэтым жыцці / мы павінны / сябе знайсці. / А па вясне, / а па сяўбе / мы ўжо / не самі па сабе* (А. Вярцінскі. Што значым мы самі па сабе?..).

## *«АМНІСТЫІ НЕ ЗНАЕ ПАМЯЦЬ»*

### Памяць чалавека, памяць пакаленняў; мінулае; спадчыннасць і спадчына

*Абшарыць кішэні свае памяці* (Я. Колас. Развіваць і ўзбагачаць літаратурную мову).

*Амністыі не знае памяць, / Яна падзей мінулых склад* (А. Астрэйка. Няма амністыі пачуццям).

*А чалавечая памяць багатая. Ёй трэба насіць усё тое, чаму не трэба – чаму нельга – зноў паўтарыцца* (Я. Скрыган. Смага).

*Будзь да канца са мной, сяброўка-памяць, / Нібы крышталь гранёны, чыстай будзь* (А. Звонак. Памяць).

*Галінка памяці / Не можа не стаць / Галінкай вечнасці!* (А. Лойка. Балада бэзавай галінкі).

*Добра бывае апынуцца ў прыемным ад перажытасці хваляванні. Успомніць забытае, але знаёмае, чапаць яго пальцамі памяці* (Я. Скрыган. Смага).

*Добра жыць і памяццю пакут* (Н. Гілевіч. З кнігі «Сяміраддкоўі»).

*Ды лепшая памяць аб мёртвых – / ваша любоў да жывых* (А. Вярцінскі. Іх апошняя воля).

*Ды памяць, як лішні вагон, / не адчэпіш. / І без яе наперад не рушыш. / У памяці – вочы, / якіх не аслепіш. /*

*У памяці – вушы, / якіх не аглушыш* (П. Макаль. Кажуць, даволі пра дальнія страхі...).

*Ды патрэбна наступніку, / каб сумленнем не слеп, / Нібы воку сляза, / ачышчальная памяць* (С. Законнікаў. Нашы мары бясконцы сусвет абышлі...).

***З****астаецца толькі вечнай памяць / Той зямлі, дзе нарадзіўся ты* (М. Рудкоўскі. Змянліва ўсё на белым свеце).

*З жывым мінулым у жывых вачах / Ясней убачыш будучыні далі* (А. Лойка. Санет сыну).

***І*** *бацьку скора сын забудзе – / Каротка памятка аб людзе, / Аб простым людзе* (Я. Колас. Новая зямля).

*І вочы новых пакаленняў / Жыццё прадкажуць нам ці / Смерць!* (І. Багдановіч. Галасы фрэсак).

*І ўсё, што колісь перажыта, / Цішэй спускаецца на дно* (Я. Колас. Рыбакова хата).

***К****аб расказалі ўсё магілы, / Слёз не хапіла б на зямлі* (С. Грахоўскі. Каб расказалі...).

*Калі б усё збывалася, / чаго жадаюць, – / то не было б сумненняў* (В. Рагаўцоў. Імгненні).

*Калі чалавек памірае, / Згасае яго святло, / Ды новым святлом разгараецца / Памяць аб ім* (Н. Тулупава. Калі памірае зорка).

*Капацца ў мінулым – варушыць, набліжаць будучае* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

*Крый Бог нам абяспамяцець ізноў* (Н. Мацяш. Пяць галасоў).

*Нават кропля вады памяць мае / Літаральна пра ўсё, / Што craналася плыні калісьці* (Н. Мацяш. Збыліся).

*На дрэве памяці з кожным годам багацейшы ўраджай* (М. Танк. На дрэве памяці...).

*Нам паліць з успамінаў цяпельца, / Нам да скону ўспамінамі жыць: / Тым азерцам, / што плешчацца ў сэрцы, / Той рачулкай, / што з сэрца бяжыць* (А. Пісьмянкоў. Спавядацца бяжым да прыроды...).

*Напісанае застаецца, а ненапісанае забываецца* (Г. Марчук. Голас і слова).

*На шляхах у былое /Няма поступу ўперад* (Н. Мацяш. Галінка плюшчу).

*Не заўжды ўспаміны нам апора* (К. Кірэенка. Не, не трэба ўспамінаць...).

*Не мае Памяць межаў і граніц, / Яна пульсуе ў кожным радаводзе* (З. Марозаў. Памяць).

*Не пагарджаць святым сваім мінулым, / А заслужыць яшчэ, і вартым быць яго* (У. Караткевіч. Беларускае мінулае).

*Няма нічога благога ў тым, калі чалавек ступае на адну і тую ж сцежку двойчы і калі на яго ад гэтага находзяць успаміны* (М. Стральцоў. Падарожжа за горад).

*Няхай твае паражэнні, гузакі і мазалі глыбока схаваны ад усіх, ты пра іх абавязаны памятаць заўсёды* (М. Стральцоў. Слова ўдзячнасці).

*Пакіньма спадчыну мы для патомкаў / Іnакшую ад той, / Што узялі ад продкаў на абломках /Гісторыі сваёй* (Я. Купала. Безназоўнае).

*Пакліч – былое адгукнецца / Жалейкаю за хваіной; / Скраніся – і важкой хадой / Наступнае ў паход кранецца* (А. Куляшоў. На паўмільярдным кіламетры).

*Пакуль памяць жывая, ёй не трэба ставіць помнікі, яна сама – помнік* (М. Стральцоў. Ад маладзіка да поўні).

*Памяць і любоў зямная / Не знялі і сёння шынялёў* (С. Законнікаў. Памяць).

*Памяць мая! Ты пухлінамі часу баліш, / Продкаў злачынствы катуюць / пячорны мой розум...* (У. Някляеў. Паляванне).

*Памяць – набытак асобы* (А. Разанаў. Зномы).

*Памяць не нябожчык, і не ёй сатлець* (Л. Геніюш. Памяць).

*Перад намі – унукі, / за намі – магілы дзядоў* (С. Законнікаў. Кульмінацыя).

*Помнікам віны не загладзіш* (А. Рылько. Маці і сын).

*Помнік забыты – / не варты нічога* (Л. Рублеўская. Прыступкі).

*Раны зажываюць – віры памяці ніколі не супакояцца* (А. Вялюгін. Пад ветразем у полі).

*Род звядзецца, / Калі магіл не шанаваць* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Самы магутны метад забыцця – змена летазлічэння* (Г. Марчук. Голас і слова. Афарызмы).

*Сноп апошні залатога жыта / Застаецца ў памяці палос* (А. Куляшоў. Сноп апошні залатога жыта...).

*Спадчынай валодае той, хто мае моц засвоіць яе, той жа, хто гэтай моцы не мае, у лепшым выпадку з'яўляецца яе захавальнікам* (А. Разанаў. Зномы).

*Спадчына не ў мінулым, а з мінулага: яна – вектар, які паказвае дарогу, яна – аблічча ўчалавечанага часу* (А. Разанаў. Зномы).

*Толькі грэцца ці варта / На былым папялішчы?* (А. Пісьмянкоў. Ты ўсміхаешся горка...).

*Трэба тыя* [помнікі] *шанаваць, / Якія не забылі пра падножжа, / Дзе ім наканавана век стаяць* (А. Сербантовіч. І вось яна прыходзіць, наша сталасць...).

*Ты падзякуй таму, / што было і што ёсць, / а то болей нічога не будзе* (Е. Лось. Не шкадую таго, што было і што ёсць...).

*Узнагарода – памяць, / Памяць – кат* (З. Дудзюк. Ці я магла б...).

*У канцы дня стань дворнікам сваіх думак і паводзін. Нешта выграбі на сметнік, каб не замінала заўтра сустрэць узыход сонца. Загарні ў залатую фальгу памяці тое, што дапаможа заўтра жыць* (У. Ліпскі. Дай, божа, дзецям долю).

*У нас добрая спадчына, паболей бы добрых спадчыннікаў* (М. Стральцоў. Спадчыннасць).

*Усё ўспамінам стане* (Н. Мацяш. За соснамі – мора).

*Успаміны сэрцу не апора...* (К. Кірэенка. Не, не трэба ўспамінаць...).

***Ш****то калі нават попел-прысак / Астыў – нашто капацца ў ім?* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

***Я*** *б не сказаў, што кожны доктар / Вядзе свой род ад Скарыны* (М. Лужанін. Як нараджаўся новы свет).

## «ВЕК ЖЫВІ – І ВЕК СПЯЛІ АДВАГУ»

Смеласць, адвага, мужнасць; сіла і спрыт; мэтанакіраванасць і настойлівасць; дысцыпліна

***А****ле Муж – не той, хто не знаў батагоў, / А той, хто пад імі маўчаў* (У. Караткевіч. Песня колаў).

*А хто не надзеецца на сябе, той цягам бывае слабы* (Я. Колас. Дуб і чароціна).

***Б****о мы толькі тады дачакаемся дня, / Калі нас не здалее змаганне злякаць* (М. Багдановіч. Нашых дзедаў душылі абшары лясоў).

*Будзь смелым, як вецер, як воля сама! / Знай, смелых не чэпе ні крыўда, ні цьма!* (Я. Купала. Будзь смелым!..).

*Век жыві – і век спялі адвагу* (С. Законнікаў. За гарою знік лужок маленства...).

*Гаворакць: добрым быць нядобра, / Гаворакць: дрэнным дрэнна быць. / Між злосцю і дабром – харобрым / Заўсёды нам патрэбна быць* (А. Астрэйка. Гаворакць: добрым быць нядобра...).

*Для смелых людзей няма бездарожжа* (Я. Колас. На ростанях).

*Дык вось: ёсць сіла і ў бяссіллі* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Ёсць сіла – будзе справа, / ёсць справа – будзе рух...* (А. Вярцінскі. Ёсць сіла – будзе справа).

*Каб быць смелым, то для гэтага трэба быць дужым, а каб быць дужым, то трэба мець цвёрды грунт пад нагамі і ясна пачуваць і ведаць, дзеля чаго ты жывеш на свеце* (Я. Колас. Асінае гняздо).

*Каб гартавацца, / варта быць са сталі* (А. Разанаў. Паэма парушанай мяжы).

*Калі вам трэба прыняць важнае рашэнне, прымайце тое, на выкананне якога патрэбна больш смеласці* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Нават птушкі супраць буры / Сядзяць наперад галавой* (П. Броўка. Ісці да мэты – ўстаць да ўсходу).

*Нам трэба жыць і долю папраўляць, / Каб нас патомкі з часам не клялі* (Я. Купала. Пакіньма напуста на лёс свой наракаць).

*На плыце сядзець – не на лаве, / Патрэбны і смеласць і спрыт* (Я. Колас. Адплата).

*Настойлівасць – твар упартасці, настырнасць – яе рукі* (Г. Марчук. Голас і слова).

*На хісткай кладцы ты не пахісніся, / Калі прайсці патрэбна напрасткі* (С. Грахоўскі. Калі прыходзіць неспадзеўна сталасць).

*Не справа мужчын – / страхавацца, хавацца, / не справа мужчын – / баяцца, дрыжаць* (А. Вярцінскі. Пра дзярзанне).

*Няма на свеце такой сілы, над каторай не было б большае сілы* (Я. Колас. Ластаўкі).

**П***акуль гарыць горан – датуль ён і волат, / І сам сабе майстра, і сам сабе бог!* (А. Бялевіч. Пакуль жар у сэрцы – датуль у ім сіла).

*Пакуль ёсць баязліўцы – / будуць адважнікі* (Н. Мацяш. Тут, і цяпер).

**Р***аз у цябе ёсць сіла, ты заўсёды знойдзеш спосаб жыць на свеце, праб'еш сабе дарогу – што́ жывое, жывым і застанецца* (Я. Колас. Зло – не заўсёды зло).

**С***абраць з дарог каменні тыя, / Што губяць сілы маладыя* (Я. Колас. Новая зямля).

*Сатыра моцных умацоўвае. А слабыя баяцца сатыры, забараняюць яе* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Сіла ломіць мур* (А. Вялюгін. Вецер з Волгі).

*Сіла простай натуры ідзе ад прыроджанага ўмельства. Быць у спакойнай раўнавазе з першай жа хвіліны, як толькі праходзіць час маладога свавольства і пачынаецца патрэба быць сталым* (К. Чорны. Скіп'ёўскі лес).

**Т***ак, пацярпець! Адно цярпенне / І можа даць табе збавенне...* (Я. Колас. Новая зямля).

**У***зяць сябе на павадок* (Я. Колас. У палескай глушы).

*Усякая разрозненая сіла, сабраная ў адно, звязаная крэпкім абручом і накіраваная ў адзін пункт, робіць цуды* (Я. Колас. На ростанях).

**Х***оць раз, ды добра агрызнуўся!* (Я. Колас. Новая зямля).

*Хто мужны, хто смелы, хто дужы, / Хто цэлем працят залатым, / Над тым неўладарныя сцюжы, / І лёс неўладарны над тым* (У. Жылка. Хто мужны, хто смелы, хто дужы... ).

**Ш***то знаходзіцца паміж смеласцю і нахабствам, што раздзяляе гэтыя, такія блізкія, а па сутнасці – такія далёкія паняцці, што не дае ім зліцца, злучыцца, з'яднацца ў адно? Выхаванасць, прыстойнасць, самапавага* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

## *«ВОЛЯ СОНЕЙКУ РАЎНЯ»*

### Воля, свабода, незалежнасць, роўнасць; дэмакратыя; няволя

***А*** *ці лягчэй нявольніку тады, / Калі на ім аковы залатыя?* (П. Макаль. Без бою я здаю сваю душу...).

***Б****ез повада, без вобруці, / Усім вядома, добра йсці* (Я. Колас. Паслушная жонка).

*Бяруць свабоду сілай духу, / Бяруць са зброяй у руках* (А. Звонак. Смага).

***В****олі не ведае вольны* (У. Някляеў. Выйшаў. Хіснулася поле...).

*Вол прывыкае да ярма – / Як распрагуць, яму нязвычна, / Здаецца, выпраглі дарма* (М. Лужанін. Як нараджаўся новы свет).

*Вольнаму – воля. Шалёнаму – поле. Святому – рай. Шчасліваму – доля. Пчолцы – кветка. Салаўю – май. Рыбе – вада. А што падкідышу?* (У. Ліпскі. Дай, божа, дзецям долю).

*Воля – не тое, што рукі развяжуць, / зменяць на большую клетку малую. / Воля – не тое, што / «вольны ты» – скажуць. / Воля – то воля, якую адчую* (Л. Геніюш. Воля – не тое, што рукі развяжуць...).

*Воля сонейку раўня* (Я. Купала. Песні вольнага чалавека).

*Грудзьмі свабоду прыкрываў* (К. Крапіва. Жалезны маршал).

*Дэмакратыя – гэта калі ты можаш гаварыць, што хочаш, а мяркуюць пра цябе толькі па тваіх учынках, фашызм жа патрабуе субардынацыі слоў, каб можна было рабіць, што хочаш* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Дэмакратыя – гэта палітычная коўдра* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Дэмакратыя пачынаецца, калі ад слоў пераходзяць да справы, а канчаецца, калі ад спраў пераходзяць да слоў* (Г. Марчук. Голас і слова).

*За волю, веды плацяць галавой* (Н. Мацяш. Маналог Казіміра Лышчынскага).

*За дэмакратыю – на словах, / але на справе – за дубінку!* (В. Жуковіч. «Быць альбо не быць!..»).

*Замест свечкі / лепей быць / гранатай* (М. Танк. Жывая свечка).

*Змагайся, каб святое не звялось* (А. Глобус. Паплечніку).

*Калі грамадства ператварае волю ў разбэшчанасць, яна сыходзіць з грамадства* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Калі раб у веры, / Дык у чым жа вольны?!* (Н. Мацяш. Малітва Апанаса Філіповіча).

*Калі шчыруе цемра і турма, / часцей за ўсё прыдворныя прыходзяць* (В. Жуковіч. Падумаў я міжволі: «Што было б...»).

*Класавае, што законна застаецца ў свядомасці, – той векавы жахлівы здзек з прыгнечанай большасці, што выклікаў пратэст, паўстанні, рэвалюцыі, здзек, з якім нельга зміырыцца, і наогул, з пазіцыі чалавечнасці, і таму, што і сам ты з той большасці* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Кропля крыві / не знікае ніколі / бясследна...* (С. Законнікаў. Ля помніка Шандару Пецёфі).

*Кропля крыві, / што праліта за волю, святая...* (С. Законнікаў. Ля помніка Шандару Пецёфі).

***Н**адзець не дайце вечных ланцугоў, / Любыя збіць рыхтуйцеся аковы* (А. Бачыла. Думы Каліноўскага).

*На прывязі быць нават камню нядобра, / Вяроўка ж ратуе і ... звязвае нас* (Р. Тармола-Мірскі. Вяроўка).

*Не звязвайце натруджаныя крыллі, /Яны спазналі – досць! – вышынь і мук* (Я. Янішчыц. Не звязвайце натруджаныя крыллі...).

*Не падуладна толькі слова / Халоднай пэўнасці акоў* (В. Зуёнак. Слова).

*Ніхто так не баіцца дэмакратыі, як мешчанін. Для яго дэмакратыя – няпэўнасць. А ён любіць толькі пэўную сітуацыю* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Няма для духа вольнага граніцы* (Я. Купала. Песня мая).

*Няхай галодная – ды воля, / Чым сытая – але турма!* (В. Вярба. Белыя пісьмы).

*Няхай жыве, заўжды жыве / жаданая свабода духу!* (А. Русецкі. Свабода духу).

***О****, лепей дні пакончыць на полі баявым, / Ніж век глытаць ў кайданах чужынскіх вогнішч дым!* (У. Караткевіч. Балада пра Вячка, князя людзей простых).

***П****асада – заўсёды няволя* (М. Башлакоў. Паэт заўсёды ёсць прарок).

***Р****абскія ланцугі якраз / Не даюць душы развінуцца* (Р. Барадулін. Сорак год).

*Разняволенне – / гэта адраджэння пачатак* (В. Жуковіч. Разняволенне).

***С****ама гісторыя вучыла: / Шануй, народзе, і цані – / Усё, што поіць-жывіць шчыра / Тваёй свабоды карані!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Свабода нашай дэмакратыі – гэта свабода агню, а дзе ж свабода вады?* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Свабодзе нашай грош цана, / калі яна адносная* (В. Жуковіч. Свабодзе нашай грош цана...).

*Свабодны толькі дух – / Душа не мае волі* (Р. Барадулін. Не мае).

*Свабоду зроду / Ніхто ахвотна не даваў* (А. Звонак. Смага).

*Свабоды бог з неба не скіне* (Я. Колас. Андрэй-выбаршчык).

*Страшны... не той палон, у які цябе заключае нехта, а страшны той палон, у які заганяе сам сябе чала-*

*век. Можна быць нявольнікам і на волі, можна быць вольным у няволі* (Б. Сачанка. Адоль).

*Сцежка да волі надта цяжкая...* (С. Законнікаў. Ля «Сіксцінскай мадонны»).

*Толькі воля не ведае здрады* (В. Жуковіч. Ты прыгожая, маладая...).

*Толькі нішто не пагасіць ніколі / ў сэрцы гаручага полымя волі* (М. Танк. Сёння яшчэ мы блукаем бяздомныя).

*У свабоды адзін абаронца – праўда* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Хай лепей ніколі не будзе краіны, / Чым будзе краіна – без волі* (У. Караткевіч. Эпітафія. Пакараным смерцю ў 1882 годзе).

*Хоць бы год, / Каб наш свет – без грымот!* (М. Арочка. Год спакойнага сэрца).

*Хто волю верна svіць, / Працят лятункам аб вялікім, / Таго не спакусіць / Ні ўладай, ні дабром бязлікім* (У. Жылка. Лепей жабрачы лёс...).

*Хто не любіць волі, – не нашага роду* (Я. Купала. Ад рана да рана...).

*Чалавек свабодны толькі на адзіноце* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Чым жыць і гінуць век у кайданах, / Лепш вольным пасці* (М. Танк. Іван-ды-Мар'я).

**Ш***ануй здабытую ў змаганнях волю – / Цябе і праз вякі нашчадкі ўспомняць* (С. Законнікаў. Роздум).

**Я***кая ты ўсё ж неацэнная, Воля, / Калі за скарынку цябе прадаюць!* (С. Законнікаў. Воля).

*Як добра было б жыць на свеце, калі б чалавека не гналі, не крыўдзілі, не пазбаўлялі волі* (Я. Колас. На ростанях).

*Якія нягоды і пакуты могуць спыніць чалавека, калі наперадзе ў яго воля?!* (Я. Сіпакоў. Адзін з нас. Зона).

## «*А ХТО ВЕЦЕР ПАСЕЕ, – ТОЙ БУРУ ПАЖНЕ*»

### Мір, спакой; вайна, змаганне, перамога; ахвяры

**А***дказнасць за мір, за жыццё, за шчасце на зямлі ляжыць на кожным сумленным чалавеку* (М. Танк. На высокім уздыме).

*Адна рука ляжыць на зброі, / Другая лашчыць спелы колас* (С. Законнікаў. Наш лёс).

*Ахвяра ёсць – дык знойдзецца і кат* (С. Казарына. У кожнай скрыні знойдзецца і мыш...).

*Ахвяры не вымяраюцца лічбамі, арыфметычнае мысленне тут нямое, тут – парог, тут мусіць браць слова іншая мова, якой мы яшчэ не валодаем, мусіць гучаць «голас бязмоўя»* (А. Разанаў. Зномы).

*А хто вецер пасее, – / Той буру пажне* (М. Танк. Пражскі дзённік).

***Б****ез атак і абароны / Няма сапраўднае вайны* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Без змагання і няўдач нічога не даецца на свеце* (Я. Колас. Гусі).

*Бурай змецenae лісце / Не вяртаецца на голле* (П. Панчанка. Шчаслівы верасень).

*Былі сусветныя войны, / сусветнага міру – не* (А. Вярцінскі. Іх апошняя воля).

***В****айна заўсёды боль нясе* (П. Броўка. Дахаты).

*Вайна і смерць – самыя родныя і блізкія сваякі і, у адрозненне ад людзей-сваякоў, адна без адной жыць не могуць* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Вайна – самае праклятае з усіх ліхаў, заведзеных жыццём на зямлі* (В. Быкаў. Жураўліны крык).

*Вайну смакаваць не варта* (І. Грамовіч. Хлеб-соль).

*Войны не пахнуць дабром* (А. Бачыла. Хатынскія званы).

*Выбухнула вайна – / знойдуцца і салдаты...* (В. Жуковіч. Праблема?).

*Вяду свой бой мясцовага значэння, / Каб не пачаўся ўсёзнішчальны бой* (С. Законнікаў. Кульмінацыя).

***Г****лянь: / Сярод ракет, сярод радараў, / Босы – на аголеным мячы – / Мір стаіць маленькім санітарам / З ношаю вялікай на плячы* (А. Сербантовіч. Мір).

*Ён маршальскі жэзл не браў у паход, / але салдат ён быў выдатны* (А. Вярцінскі. Маршальскі жэзл).

*Жывыя ідуць наперад – свяшчэнны закон вайны* (К. Кірэенка. Жывыя ідуць наперад...).

*За кожнага бітага ка́та / Адпусціцца сорак грахоў* (Я. Колас. Адплата).

*За шчасце, за волю, за край родны гэты – / Ну хто ж не паўстане, спытай?* (Я. Колас. Дзед-калгаснік).

*Зброя – гэта заўсёды, як громаадвод: яна прыцягвае да сябе зброю* (Я. Сіпакоў. Як спакайней?).

*Званам Хатыні над зямлёю / Грымець праклёнам на вякі, / Хто прагне свет заліць крывёю / І з плуга вырабляць штыкі* (А. Астрэйка. І вось цяпер Хатынь сабрала...).

*З палітыкі уласнай сілы / Магчыма трапіць на ланцуг* (У. Корбан. Асілак).

*І біцца павінны мужчыны, / Бо маюць радзіму, жанчыну і гордасць – адну* (Л. Рублеўская. Вечар у сямейным коле).

*І гора некаму ізноў – / Таму, хто праг паліць, / А апынуўся між агнёў, / Якія не заліць!* (А. Сербантовіч. Пытанне рубам: хто каго...).

*І спакою на нашай планеце не будзе, / Покуль з факелам ходзяць па ёй антылюдзі* (А. Зарыцкі. Антылюдзі).

***К**аб мірна жыць, давядзецца табе / да скону весці вайну* (П. Шруб. Аксіёмы лесвіц).

*Каланізатары таксама, як ваўкі, / Калоніі заўсёды абдзіраюць / І метад свой драпежніцкі такі / Цывілізацыяй вялікай называюць* (У. Корбан. Дабрадзей).

*Калі вялікія спрачаюцца, малыя выйграюць* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Калі страляеш, дык страляй у грудзі / І май адвагу ў вочы мне глядзець* (У. Караткевіч. Зямля дзядоў).

*Калі ў бязмежнай вернасці хлусні / крывёю нехта ўласнаю клянецца, – / чыясьці кроў нявінна льецца...* (В. Жуковіч. Праклён).

*Калі ўпадзе адзін баец – / Заменіць паўшага другі* (А. Вялюгін. Вецер з Волгі).

*Крывінка задаволіць аднаго, / другому падавай кроваправіліцце* (А. Вярцінскі. Камары).

*Куля і абароніць ад кулі* (Я. Сіпакоў. Як спакайней?).

***М**ы вядзём справядлівую, высакародную вайну, але страшнае ў тым, што ніякая вайна не высакароднасць* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Мы ўсё яшчэ будуемся з вайны, / І – ад вайны!– няўжо ізноў залежым?* (Я. Янішчыц. Ружовы цвет і харство садоў...).

***Н**а дзіва наіўныя людзі: каторае стагоддзе ўсё яшчэ патрабуюць справядлівасці і законных падстаў вядзен-*

*ня вайны. Гэта ўсё адно, што патрабаваць пазбаўлення болю пры родах* (Г. Марчук. Голас і слова).

*На карце міру хто паставіць кропку –/ Пакорлівы палітык ці паэт?* (Я. Янішчыц. Слоў медзякі...).

*Насіллем не прынясеш шчасця* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Настае дзень, калі я бяру меч і бяру шчыт. Аднак, перамогшы слабасць, я мушу перамагчы і сілу* (А. Разанаў. Зброя).

*Не крычыце «ўра!», калі дзеці спяць* (П. Панчанка. Думаю, думаю...).

*Не перажывеш нікога злосцю. / Перамога чыніцца мілосцю* (Р. Барадулін. Ксты).

*Не слава, не гонар людзей забіваць, / Моц павялічваць з цярпенняў...* (Л. Геніюш. Даўніна).

*Не тапчыце калыску дзяцей. / У крыві не тапіце надзей* (Н. Загорская. Выстылы попел магіл...).

*Не ўсякая шыя вартая,/ Каб меч тупіць аб яе* (У. Караткевіч. Стаіць ля ідэі на варце...).

*Няма пытання: / «Быць або не быць?» / І лёгка дыхаецца ўсёй планеце, / Пакуль блакіт калышуць галубы, / Малююць сонца на асфальце дзеці* (С. Законнікаў. Малююць дзеці).

***Р****азведка боем – гэта шлях нятораны, / А бой не абыходзіцца без страт* (С. Законнікаў. Усё было, але сваёй гісторыі...).

*Рэвалюцыя нерашучая / патанае ў сваёй тэорыі / і ўласнай крыві* (В. Жуковіч. Рэвалюцыя – не туман).

*Смяротны груз не мае вымярэння, / Сябе не шкадаваць – / вайны закон* (С. Законнікаў. Урбаны).

*Спакой – не сон, не бросня забыцця, / Спакой – жывога руху раўнавага, / Грамоў і бур законнае дзіця, / У спёку – дождж, у дождж – сухая смага* (А. Звонак. Спакой).

*Спее сусветнага жаху града: / Хто пазбірае каменне?* (Я. Янішчыц. Як называюцца слёзы).

*Такой трывожнаю часінай, / Назло шалёнаму звяр'ю – / Для справы міру трэба ўсім нам / Яшчэ мацней любіць зямлю!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Трэба бараніць усё, што любіш, / Каб па праву заспяваць пасля, / Не спявай пра цёплы кут за грубай, / Пакуль горам поўніцца зямля* (У. Караткевіч. Цвыркун і праблема чыстага мастацтва).

*Трэба йсці, не верачы адбою. / Завалы рушыць і вышыні браць, / І цішыні нідзе не давяраць* (К. Камейша. Круг).

*У небяспечны / І трудны час – наадварот: / Стакроць мацней павінен сведчыць / Свой гарт і вытрымку народ* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Хоць на словах – / за рэанімацыю, / зброю новую / ціха намацвае* (В. Жуковіч. Змагары! Наша страта істотная...).

*Хто з дапамогай войнаў вырашае праблемы – той вар'ят* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Хто разбурае свой дом, таму наканавецца вецер* (Р. Барадулін. Нічога не забываецца ў злапомслівым свеце...).

***Ш****тандары нязгоды – штандары надзеі* (Т. Бондар. Нараджэнне сцяга).

***Я*** *думаю, што страшны той прагрэс, / Калі жывём пад ядзернаю пашчай* (Я. Янішчыц. Пакіньце цішу вуснам і вачам).

*Я яшчэ праверыць мушу / Лязо і ў песні, і ў штыка* (М. Танк. Спакойна спіце над затокай...).

## *«АД СЛАВЫ ГАЛАВА НЕ БАЛІЦЬ»*

### Слава і няслава

***А****д славы галава не баліць, а толькі кружыцца* (І. Гурскі. Свае людзі).

*А славу я не мераў на караты, / Бо не рубін яна і не алмаз* (А. Астрэйка. А славу я не мераў на караты).

***Б****ывае слава, як праклён* (В. Зуёнак. Погляд).

***З****абылі пра самую небяспечную хваробу – / Пра слепату / ад славы ці ўлады. / Можа, таму, што яна амаль / Не паддаецца лячэнню* (М. Танк. У акуліста).

*Заўжды пасрэднасць прагне славы* (А. Звонак. Думы).

*Людскую славу погалас хістае, / Нібыта пёрка на капелюшы* (У. Скарынкін. Канцона перакладчыка).

*Навошта наогул / Вянок лаўровы, / Калі, як хамут, / Яго носяць галовы* (Я. Сіпакоў. Слова ў спрэчках).

*Не на ўцеху слава, калі не з дабра* (В. Аколава. Не на ўцеху слава...).

*Не таго патрэбна славіць, / Хто на лёдзе замкі ставіць* (В. Дунін-Марцінкевіч. Літаратурныя клопаты).

*Не трэба слава толькі тая, / Якую носяць на штыках...* (Е. Лось. Севастопальская панарама).

*Пустазелле губіць поле, а няслава – ўсё людское* (В. Аколава. Случарыны).

*Слава аднаго замінае славе другога, загана ж аднаго не замінае загане другога* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Слава – / Медыцынская сястра, / Якая часта блытае адрасы, / Спазняецца / Праверыць пульс / І каму трэба / Аказаць дапамогу* (М. Танк. Слава...).

*Славу паэтаў разносяць па свеце, / Вянкі ўскладаюць і звоняць пахвалай, / Я ж ціха йграю, хто ж ціхіх прымеце?* (Я. Купала. Я не паэта).

*Справа не ў нашых імёнах, не ў тым, / хто, дзе і калі, – не ў славе. / Слава, як вядома, дым. / Справа – у добрай справе* (А. Вярцінскі. Хто вынайшаў веласіпед?).

*Усім хопіць месца пад коўдраю славы. / Яна ж засцілаецца штораз па-новаму* (Р. Барадулін. Прысвячэнне Макаёнку).

**Ч***асам глупства можа набыць славу мудрасці, калі яму не пярэчыць* (Я. Скрыган. Спасціжэнне).

**Я***кая слава мож« » »а ўцешыць, / Калі ты сэрцам – на крыжы?* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Як ні хітруй, а праўда ў тым, / Што ўсе мы хворыя адным: / Нам едкі дым – чужая слава, / Ну, а свая – салодкі дым* (У. Някляеў. Паланэз).

*Як чорная сава ўскідаецца – / так няслава адгукаецца* (В. Аколава. Случарынкі).

## *«І НЯМА НА СВЕЦЕ ЛЕПШАЙ ДОЛІ – НЕСЦІ ЖЫТНІ КОЛАС ПРАЗ ВЯКІ»*

### Працавітасць, дбайнасць, стваральная праца і яе плён

**А** *дарога ад плуга да пяра / Карацейшая, як ад пяра да плуга* (М. Танк. Адлегласць).

*Ад дармаедства ўся распуста: / Нішто душу не губіць так, / Як незаробленая луста, / Якою сыціцца лайдак* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Аддзячыць поле табе, аддзячыць, / Аддасць гарою калосны дар; / Яму вось толькі адчуць і ўбачыць, / Што ты не госць тут, а гаспадар!..* (А. Жамойцін. Аддзячыць поле табе...).

*Акселерацыя – не мода, / А права ранняе на пот* (А. Бачыла. Акселерацыя).

*Але не сляпая доля, / Бо плуг твой цябе вядзе* (Н. Мацяш. Жыццё – як казка).

*Але раз ты наважыў дзела, / Ідзі станоўча, роўна, смела, / Ідзі, назад не аглядайся / І на другіх не пакладайся* (Я. Колас. Новая зямля).

*Без крэсіва ж і крэмень / Не высеча з сябе агонь, / Каб разагнаць густую цемень* (А. Бачыла. Ты ўжо даўно ў пакой зайшла...).

*Браты! Вялікая дарога / Чакае нас і родны край – / Жніво настала, працы многа, – / Навукі семя засявай!* (Я. Колас. Да працы!).

*Дарма пра песню пытацца ў глухога, / Дарма пра сонца пытацца ў сляпога, / Пра слодыч жыцця на зямлі – ў нежывога / І праўды шукаць у таго, хто нічога – / Ані сцяблінкі, ні дрэўца малога – / Не пасадзіў за свой век* (М. Танк. Дарма пра песню пытацца ў глухога...).

*Дзень, што пражыты без працы ахвярнай, / Знікне таксама ў шумлівасці марнай* (А. Зарыцкі. Дзень, што без дружбы й любові пражыты...).

*Ёсць яшчэ ў свеце сейбіты без страху, / Без гэткіх хлеба людзям не было б* (Л. Геніюш. У чыстым полі злосная завея...).

*З ветру валяецца, а даход дае* (Я. Колас. Пісаравы імяніны).

*Знаць, сіла ў сяўца немалая... Захоча – і свет пераверне!* (Я. Купала. З песень аб вясне).

*Зямлі не дагледзіш – адпомсціць табе, / А потам напоіш – адмерыць без меры, / А шчыра палюбіш – палюбіць цябе* (М. Танк. Вясновая ода).

**І** *будзеш мець, калі жыць дбала* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*І, дзе б ні працавалі вы, / Любому кідаецца ў вочы, / Як крэкча цяжкавагавы, / А паражняк – заўжды ляскоча* (А. Грачанікаў. Бясконцыя рэйкі).

*Інач усё, што можаш перайначыць, / Вітай усё, над чым не ўладны ты* (Н. Мацяш. Чуйнар).

*І незайздросны лёс тых, / Хто зможа на шалі палажыць / Толькі лыжку / Ці толькі свой язык* (М. Танк. На пытанне...).

*І немагчымае магчыма / Таму, хто ўзяў рубеж круты!* (А. Звонак. Гады прайшлі, а я ўсё помню...).

*І няма на свеце лепшай долі – / Несці жытні колас праз вякі* (С. Законнікаў. Сейбіту).

*І падлогі мыццё нам аддзячыць, / Калі мыем мы – не напаказ* (Н. Мацяш. Адказ «Першацвету» на ягоную анкету).

*Ісці ў жыцці спрадвечным следам / Можна толькі з мазалём і потам* (С. Законнікаў. Хата).

*І шчаслівей за ўсіх на свеце / Не той, хто жне, а той, хто сее* (П. Макаль. Хаця насення меней, меней...).

*Каб адчуваў і потым, / Што сэрцам не здрабнеў, – / Пераплаўляй работай / Свае любоў і гнеў* (С. Законнікаў. Вера).

*Кавалак жытнёвы смачней, чым пірог, / Калі на рабоце ты сам сабе бог* (А. Бялевіч. Запавет).

*Калі б магло каменне гаварыць / Суровай сілай, мовай абурэння, / Яно б сказала: спадары-сябры, / У самы раз збіраць каменне!* (А. Звонак. Каменне).

*Калі вечар нараджае стому, / Значыць, дзень пражыты нездарма* (А. Астрэйка. Калі вечар нараджае стому...).

*Калі іржу не саскрабці, / Іржа й жалеза пераесць* (П. Броўка. Іржа).

*Калі легчы – / Дык легчы брусам, / Тым, што ў хаты кладуць беларусы!* (М. Арочка. Калі легчы...).

*Калі мудрыя рукі ў цябе – / Пад рукамі / Згубіць цвёрдасць сваю, / Памякчэе і камень* (П. Макаль. Калі мудрыя рукі ў цябе).

*Калі праца душы падабаецца, / Сэрца жаўранкам захліпаецца* (А. Лойка. Калі праца душы падабаецца...).

*Калі рукі ніколі / Не зналі мазоляў, – / Для чаго твае рукі!* (Л. Якубовіч. Чалавеку).

*Калі сееш ты шчодраю рукою, куды б ні кінуў плённае зерне – яно ўзыдзе* (Ю. Геніюш. Жнівень).

*Калі ў жыцці не будзеш плугаром, / Як будзеш ты ад голаду лячыцца?* (П. Макаль. Ворыва).

*Кожнаму трэба / ведаць смак нам здабытага хлеба* (М. Хведаровіч. На сваім парозе).

*Куды шаноўней слесарам выдатным быць, / Чым дрэнным піяністам* (У. Корбан. Музыкальная гісторыя).

***Н****а выцце сабак не адказвай, / Калі цябе кліча жніва* (П. Макаль. Нам заўсёды даюцца ў знакі...).

*Найсмачнейшы – зароблены хлеб / маладымі сваімі рукамі* (Л. Геніюш. Гартаваны працоўнымі днямі...).

*На продаж толькі тое, што ад працы* (В. Аколава. Мальер на мінскай Камароўцы).

*На свеце самае святое / ўсё, што праца набыла* (А. Бачыла. На аўтобусным вакзале...).

*Не аслабяцца рукі на полі, / Калі поўна надзеі душа* (П. Трус. У жніво).

*Не збярэш ураджаю / Там, дзе градам пасекла* (В. Зуёнак. Грамадзяне Сусвету...).

*Не смей, як кот халуйскі, прыніжацца... / Свой дабрабыт, аўтарытэт ствараай / Не ўгодніцтвам, а працай* (Э. Валасевіч. Кот і Вожык).

*Не толькі мы работу робім, / А і работа робіць нас* (Г. Бураўкін. Вечар у вёсцы).

*Не трэба спаць у шапку і чакаць, покі табе пчолы на спіну не сядуць* (Я. Колас. Калодка пчол).

*Не хачу між калоссяў / быць коласам тым, / Што часамі ўзрастае без зерня* (М. Арочка. Пакуль малады).

*Не шукай ракі малочнай./ І не шукай кісельных берагоў* (А. Вольскі. Сяброўская чарка).

*Ніхто ўраджай не пажынаў з пагроз / Ні ў маладым і ні ў старым узросце* (А. Астрэйка. Ніхто ўраджай не пажынаў з пагроз...).

*Няма чаго чакаць панукі, / Калі работы поўны рукі* (Я. Колас. Новая зямля).

*Падмурак ёсць. / Упарта / Будуйся да страхі, / Лічыць яшчэ не варта / Заслугі і грахі* (С. Законнікаў. Вера).

*Паставіш мэту – знойдзецца і цяга* (Н. Гілевіч. «Паланэз» Агінскага).

*Перад зярнятамі, што прападалі, / Схілімся долу* (У. Някляеў. Пакінуты бераг).

*Радасць працы вымагае, каб усё тое, што добра зроблена, было заўважана і адзначана* (К. Чорны. «Святая» папружка).

*Сама ўжо праца пакарае, захапляе чалавека, бо ў гэтай дружнай грамадскай працы так многа і музыкі, і паэзіі, і хараства* (Я. Колас. На прасторах жыцця).

*Так, той толькі жне, хто пасее./ Не, рукі ў сяўца не дрыжаць, / пасеяць ён горкую праўду паспее, / каб волю жаданую жаць* (В. Жуковіч. Праўда Кастуся Каліноўскага).

*Той пераможа, хто не забывае – / Адлегласць ад сяўбы да малацьбы / Даўжэйшаю за век людскі бывае* (П. Макаль. Сяўба).

*То – не рукі, якім працаваць не карціць, / То – не сэрца, што век ні па кім не баліць* (М. Танк. То – не рукі, якім працаваць не карціць...).

*Трымайце лейцы моцна у далонях / і не мыляйце роднай баразны* (Л. Геніюш. Баразна).

*Ты за ядой – як і на працы, / На малацьбе ці на касьбе!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Ты так жа, брат, сееш... а дзе ж тваё жніва* (Я. Купала. Жніво).

***У*** *весь час варушымся, збіраем, / Канца ж патрэбам тым не маем* (Я. Колас. Новая зямля).

*У добрай гаспадыні і на лёдзе жыта расце* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Узнёслай працай можна здзейсніць цуд* (У. Дзюба. Выток).

*У працы не маеш права: / На роспач, / на слабасць, / на стому* (А. Руцкая. Настаўніку).

*Усё, што ёсць, / што будзе, – / Набытак мазаля* (С. Законнікаў. Успомніць вас Зямля).

***Х*** *оць сэрца просіцца ў адстаўку, / А я адстаўкі не даю* (С. Грахоўскі. Хваляванне).

*Хто страціў цікавасць да прафесіі, ідзе ў палітыку* (Г. Марчук. Голас і слова).

***Ц*** *і ж мы, хлопцы, рук не маем? / Ці ж нам сілы бог не даў?* (Я. Колас. Беларусам).

**Ч***ысціць крыніцы – дужа цяжкая, брудная, смуродная праца. Але ж той, хто хоча піць чыстую ваду, – мусіць гэта рабіць* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

**Я** *адны на свеце рукі знаю, / Што ў мазалях. / І ім я давяраю* (М. Танк. Стамбул).

*Які пасееў – такі і высееў* (В. Аколава. У вянок Максіму Багдановічу).

*Яшчэ той брат наш не радзіўся, / Каб на ўзві-вецер жыць багата / І ў дні будныя спраўляць свята* (Я. Колас. Новая зямля).

## *«У КОЖНЫМ ЗЕРНІ НОВЫ КОЛАС ВЯСНЫ ЧАКАЕ»*

### Будучыня, праца для яе; жаданні, мары, імкненні, спадзяванні

**А** *будучыня парасткам належыць, / Бо на дубах былых растуць яны* (У. Караткевіч. Дуб).

*Адлегласць ад сяўбы да жніва / Даўжэй за век людскі бывае* (П. Макаль. Хаця насення меней, меней...).

*Адно толькі сніцца / Крылатай пупышцы / І кожнаму семю – / Хутчэй бы, / хутчэй пралупіцца!* (М. Арочка. Крылатае семя).

*Аслеп учора, / А сёння бачу* (В. Жуковіч. Першае расчараванне).

***Б**оязь засцерагае: у будучыні – смерць!.. Адвага натхняе: у будучыні – неўміручасць!..* (А. Разанаў. Будучыня).

*Будучае наша залежыць ад раўнавагі мудрасці і сілы* (У. Ліпскі. Дай, божа, дзецям долю).

*Бывае так: у добрым севе / Трапляе дзікая трава* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Быў бы юнак, а надзея знойдзецца* (Г. Марчук. Голас і слова).

***Г**історыю надзеі пішуць / На скрыжаванні ўсіх вятроў* (А. Астрэйка. Не кліч дарэмную трывогу...).

***Д**зе сяўба, там ёсць жніво і пожні...* (А. Лойка. Балада шаснаццаці год).

*Ды я жыву святой надзеяй, / Што добры вецер нам павее* (Я. Колас. С. Гарадзецкаму).

***Ж**аданае толькі адно ярмо – / Ярмо Айчыны...* (Р. Барадулін. Ярмо).

***З**аўсёды ёсць у кожнага свая жар-птушка* (С. Грахоўскі. Жар-птушка).

*Зернейку трэба загінуць у чорнай раллі, / Каб выжыць...* (Н. Мацяш. Надмернасць).

*Зерне, якое надта моцна трымаецца за глебу, не здолее адарвацца ад яе – прарасці* (А. Разанаў. Зномы).

*Зярня не ходзіць у пазыку / Па сілу нанава радзіць* (Н. Мацяш. Вясна восемдзесят сёмага).

*Імклівай рэчцы ж / Вечна мора сніцца / І вечна бачыцца ў зялёных вербах шлях* (А. Бачыла. Шуміць рака...).

*І нават хай пажнуць другія, / А трэба сеяць* (П. Макаль. Хаця насення меней, меней...).

*І ніколі не ўзыдзе зерне, / Што упала ў бясплодны пясок* (В. Вітка. Слова).

*Каб нягоды і радасці змераць / І прайсці праз надзеі і ростань, – / Трэба – / у сябе паверыць, / А гэта – не так проста...* (К. Кірэенка. Каб нягоды і радасці змераць...).

*Калі хаця б надзея засталася, / Рыхтуй для ўзлёту новае крыло* (М. Шабовіч. Санеты).

*Колькі мар навырост!* (А. Пісьмянкоў. Маленства).

*Лягчэй памерці, чым астацца навек без надзеі і веры* (К. Чорны. Пошукі будучыні).

*Мара горыччу перацвіце, / Але явай усё ж не стане* (А. Руцкая. Не прыдумвай мяне...).

*Нават у самую безнадзейную хвіліну нам памагае трымацца надзея* (Я. Скрыган. Імгненне).

*Надзея – хлеб душы* (П. Макаль. За буднямі – нядзеля...).

*Не спазніся, наша навальніца, / Высакосным ліўнем зазвіні* (А. Пысін. Не вясной, а летам дрэвы сохнуць...).

*Само сонца ўзяць у рукі / І, як з паходняй, з ім ісці* (Я. Купала. Прыстаў я жыць).

*Самы высокі будынак у свеце / Той, што не ўзведзены* (П. Макаль. Калі мудрыя рукі ў цябе).

*Толькі б вырасці мне сасною / Не крывою, а стрыжнявою!* (М. Арочка. Калі легчы...).

*Толькі той, хто дае з сябе ўсё, мае права на лепшае заўтра* (Н. Арсеннева. Жыві).

*Трэба заўсёды ўзводзіць масты / З надзей, / Летуценняў / І песень* (М. Танк. Трэба заўсёды ўзводзіць масты...).

*Тым, / хто спрабуе / паднавіць мінулае, / У будучым няма чаго рабіць* (С. Законнікаў. Усё было, але сваёй гісторыі...).

*Ты не клыгай старэцкай ступою, / А думай – мне дваццаць адзін* (Я. Колас. Сабе і сваім равеснікам).

*У будучыню дзверы / не ў часе, а ў душы* (А. Разанаў. Пункціры).

*У кожным зерні новы колас / Вясны чакае* (С. Грахоўскі. Зерне).

*Усе мы змалку / Марым аб нябёсах, / Паціху ўрастаючы ў зямлю* (А. Грачанікаў. На ўзлобінах дзялянак баравых...).

*Усё было – і ўсё ж, / Што будзе – не было* (У. Някляеў. У садзе над ракой).

*Успамін і будучыня – / У адным сэрцы. / А ўсё ж будучыня – / Грэе цяплей* (К. Кірэенка. Успамін і будучыня).

*Хай светла збудзецца, што светла сніцца* (Н. Мацяш. А ты жыві, каханы мой, жыві...).

*Хацела лёту – і цяпер ты птушка* (М. Шабовіч. Нам развітання хочацца пазбегнуць).

*Хто навучаны болем: да слёз даравацъ, / Той шчасліваe заўтра для заўтра прарочыць* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

*Хто падказаў дрэву, усяліў яму думку, што яно павінна нарадзіць свой плод, свой працяг?* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Эх, гэта толькі мары-кралі! О, каб яны ды праўдай сталі!* (Я. Колас. Новая зямля).

*Як позна нам становіцца відней, / Што ява з марай у нявечным шлюбе!* (А. Звонак. Шкада)

*Яшчэ ў пупышках новае лісцё, / Якому песню сонца пець старую...* (Н. Мацяш. Яшчэ ў пупышках новае лісцё...).

## *«БУДЗЕ ХЛЕБ – БУДЗЕ РАДАСЦЬ У ХАЦЕ»*

### Хлеб – пражытак, сродак існавання чалавека

*Без хлеба скачацца не надта! / А хлеб буханкай не расце...* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Будзе хлеб – будзе радасць у хаце...* (Н. Гілевіч. А раніцы ўжо не было).

*З агню наш хлеб і песні, / І самі мы народжаны з агню* (С. Законнікаў. Урбаны).

***На*** *адну шалю вагаў / паклаў я хлеб, / на другую – камень, / але, калі яны ўраўнаважыліся, / не змог паверыць, / што важыць хлеб / гэтулькі ж, / колькі камень* (А. Разанаў. Пункціры).

*На бульбе выраслі паэты, / і маршалы, / і касманаўт!* (Е. Лось. Бульба).

*Найсмачнейшы – зароблены хлеб / маладымі сваімі рукамі* (Л. Геніюш. Гартаваны працоўнымі днямі...).

*На пяску, як ні сей, а не ўродзіць / Добрага хлеба ніні* (А. Бачыла. У свеце, дзе тлумна, дзе мулка, дзе густа...).

*Не бывае хлеба, / Калі не зжаць у тэрмін збажыну* (А. Вольскі. Сяброўская чарка).

*Няхай штодзень на стол, / як на прастол, /Каронаю ўзыходзіць бохан хлеба!* (П. Макаль. Круглы стол).

***П****акуль песня – ў хлебе, хлеб – у песні* (А. Пысін. Падымаецца камочак...).

*Пра сапраўдны смак хлеба / Трэба пытацца не ў таго, / Хто яго штодзень / Есць абы-як, / А ў таго, хто яго / Не заўсёды бачыў / І каму ён не раз сніўся / І цяжка даставаўся* (М. Танк. Пра сапраўдны смак хлеба...).

***С****ёння хлеб у нас дваякі: / Чорны, белы... / А ніякі – / Даўні, горкі і пракляты – / Мы не пусцім больш у хату* (М. Арочка. Які бывае хлеб).

*Спачатку ўсё ж быў хлеб, / а потым – слова. / Спакон быў чалавечай мовай хлеб* (М. Арочка. Спачатку ўсё ж быў хлеб...).

*Той не будзе граць няшчыра, / Хто на хлеб рашыў сабраць* (Н. Гілевіч. Рэмінісцэнцыя з цытатай).

*Хлеба кошт не адзін: / то спаўна, / То над крошкай трасуцца галовы... / Не мяняецца толькі цана / Гэткай дробязі – добрага слова* (С. Законнікаў. Добрае слова).

*Хлеб – гэта ўсмешка зямлі* (С. Законнікаў. Урбаны).

*Хлеб – ёсць здаўна завядзёнка – / Першы ўзыходзіць на стол* (С. Законнікаў. Дома).

*Хлеб – мой і твой, яго і ўсіхны. / Ні для каго – не дармавы* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Хлеб... Не за свой загар румяны, / А за святло, што ў душы нёс, / У песнях з сонцам ён зраўняны, / Як цар зямлі – з царом нябёс* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Хлеб, соль і вада – / вось маладзецкая яда* (А. Вярцінскі. Песня пра хлеб).

*Хлеб!.. Толькі смачны, вечна смачны – / Калі зароблены і свой* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Хлеб – / як любоў! / Яму чысціня / Сэрцаў людскіх патрэбна, / Увага / І дабрыня, / А ўзамен – / скібачка хлеба* (У. Карызна. Хлеб).

*Хоць, праўда, хлеб ядуць і з вуды, / Але не ўсе і не заўсюды* (Я. Колас. Новая зямля).

*Што хлеб – гэта хлеб, па-сапраўднаму можна даведацца, толькі адчуўшы голад. Што гераізм – гераізм, а ге-*

*рой – герой, даведацца можна з жыватворчай нізіны скромнасці* (Я. Брыль. Свае старонкі).

*Шукаю заклінання ад распаду / Надзей на гэты цёплы мудры хлеб: / Ён пасланец жыцця, / Ён радзіць раду / З усімі, хто ў шаленстве не аслеп* (М. Арочка. Шукаю заклінання ад распаду).

***Я** здабываю надзённы мой хлеб, / Не трэба мне райскага хлеба!* (А. Бялевіч. Лічу я анёлаў, як белых варон).

## *«ТАЛЕНТ ПАВІНЕН БЫЦЬ НЕПАДКУПНЫ»*

### Дар, здольнасць, таленавітасць

***Б**еларусь, / Свае таленты беражы, / Калі хочаш магутнаю быць!* (Г. Бураўкін. Беларусі 90-х гадоў).

*Беларусь, / Свае таленты беражы, / Калі хочаш разумнаю быць!* (Г. Бураўкін. Беларусі 90-х гадоў).

*Беларусь, / Свае таленты беражы, / Калі хочаш свабоднаю быць !* (Г. Бураўкін. Беларусі 90-х гадоў).

*Беларусь, / Свае таленты беражы, / Калі хочаш славутаю быць!* (Г. Бураўкін. Беларусі 90-х гадоў).

*Беларусь, / Свае таленты беражы, / Калі хочаш шчасліваю быць!* (Г. Бураўкін. Беларусі 90-х гадоў).

*Быў бы талент – знойдзецца пасада* (А. Русецкі. Другі пачатак).

*Геній не толькі стварае, умее ствараць, – геній умее ўбачыць, умее пачуць тое, што ёсць на свеце, у прыродзе, у людзях, на людзях* (Ф. Янкоўскі. З нялёгкіх дарог).

*Задумы вучоны не здзейсніць, / Калі занядбае свой дар* (І. Ралько. Не родзіцца мудрае слова...).

*Здольнасць да абнаўлення – прымета сапраўднага таленту* (М. Стральцоў. Пры святле трывожнай сталасці).

*Калі талент не падмацоўваецца працаю, ён драбнее, мізарнее і ўрэшце ператвараецца ў самы звычайны нуль* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Самае важнае і магутнае для пісьменніка – гэта талент. Але больш важнаю і магутнаю з'яўляецца лянота: яна можа загубіць любы талент* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Спяваеш добра, ды ці тое? / Вярзеш, брат, грушу на вярбе* (Я. Колас. Новая зямля).

*Таленавіты – сам сабе суддзя, / А для паскуд – заўсёды небяспечны* (Я. Янішчыц. Над хронікай 30-х гадоў).

*Таленавіты творца вучыцца сам, няздатны – вучыць іншых* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Талент – гэта не аб'ём, гэта тайна* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Талент – інструмент, пры дапамозе якога чалавек пазнае жыццё, ён – люстра, у якім адбіваецца свет, а*

*карціна гэтага свету будзе тым дакладнейшая, чым дакладнейшы сам інструмент* (М. Стральцоў. Дзень у шэсцьдзясят сутак).

*Талент кіраўніка і талент творцы шмат дзе супадаюць, але часам і ўзаемавыключаюцца* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Талент, як і сумленне, павінен быць непадкупны* (М. Стральцоў. Дзень у шэсцьдзясят сутак).

*Як можна памагчы сапраўднаму таленту? Па-першае, не пабаяцца сказаць яму, што ён талент. А па-другое, стрымаць тых, хто абавязкова хоча перашкодзіць яму працаваць* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

## *«ПЯСНЯР – СЛУГА СЛУГІ УСЯКАЙ, ПЯСНЯР І ЦАР УСІХ ЦАРОЎ»*

### Паэт і паэзія; творца і майстэрства творчасці; натхненне, прызванне; ацэнка твора

*Абавязкаў / Спрадвеку ў Творцы не было* (Л. Галубовіч. Творца).

*Авангардызм – гэта рэалізм з сардэчнай недастатковасцю* (Г. Марчук. Голас і слова).

*А верш адпачынку не просіць* (П. Панчанка. З нас многія прагнуць...).

*А вершы – гэта зоры, гэта вецер, / Імгненне, што застыла пад сцілом* (Л. Рублеўская. Што тут паэт?).

*А вершы пішуць – як жывуць. / Як дыхаюць. Як паміраюць* (У. Някляеў. Майстры вясны).

*А вы, мае песні, удзячныя мала: / Мяне папракаеце кожным радком* (Н. Тарас. Вершы, бы дзеці, нараджаюцца ў муках...).

*Адвечнае пытанне крытыка: сказаць праўду аўтару пра яго твор – пакрыўдзіць аўтара, сказаць няпраўду – пакрыўдзіць сябе* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Адказна ставіць не псеўданім – / прозвішча* (Д. Бічэль-Загнетава. Адказнасць).

*Ад кожнага літаратурнага пакалення патрабуецца ў творчасці новае – за любую цану. Ад кожнай чарговай вясны чагосьці небывалага не патрабуем, абы толькі яна была сама сабою* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Ад неба блізкі ці далёкі, / Хоць у царкве, хоць на піру – / Паэт заўсёды адзінокі* (А. Пісьмянкоў. Мой сад зусім не салаўіны).

*Адно шкада, што добрыя радкі / Ніколі не чытаюць падлюкі...* (Е. Лось. Як многа добрых вершаў, божа мой!).

*Акрамя ўсяго, паэт павінен яшчэ стварыць сваю філасофію. Калі яе няма – няма і паэта* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*А паэты старэюць раней, / чым астатняе ўсё чалавецтва* (М. Скобла. Паэты).

*Асноўная, глабальная, пастаянная задача пісьменніка – будзіць чалавека ў чалавеку* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*А твор павінен мець адзнаку / Сваёй зямлі* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*А трэці быў і раб, і цар, / І слаб, і дуж ва ўсякім дзеле, / Як вечнасць молад быў і стар...* (Я. Купала. На куццю).

*Ах, вялікія людзі мастацтва, – і чаго вам у палітыку?!* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

***Б****ез натхнення творчасці не бывае, можа быць толькі рамесніцтва* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Без солі хлеб – не хлеб / і верш – не верш, / калі няма ў ім солі* (А. Вольскі. Слова ганаровага шахцёра).

*Беларускія звеку паэты / Над хлуснёю і подласцю над!* (В. Аколава. Да Фёдара Янкоўскага ў госці).

*Бывай, паэзія! Дабрыдзень, проза* (С. Дзяргай. Чаканне).

*Былі ж, і ёсць, і будуць такія, што не быць паэтамі не могуць* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Быць мастаком яшчэ не значыць / Хадзіць ды толькі кулдыячыць* (М. Скрыпка. Індык).

*Бяздарнасць глядзіць на свет вачыма зла* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Бяскрылай песняй іскры не запаліш, / Што палкай думкай сэрца апячэ...* (А. Звонак. Без крылаў песні не ўзляцець высока...).

***В****еліч палітыкам ствараюць паэты* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Верш значны не гукам, які чуваць, пакуль верш чытаецца, а сваім рэхам, якое ён утварае, калі адгучыць* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

*Верш напісаць – то не сасну зваліць, – / Патрэбна душы скалануць людскія* (А. Ставер. Бацьку).

*Вершы, бы дзеці, нараджаюцца ў муках – / Лёс, ты пражыць ім сумленна дазволь* (Н. Тарас. Вершы, бы дзеці, нараджаюцца ў муках).

*Вершы нараджаюцца не з уладнага «хачу», а з безабароннага «хочацца»* (А. Разанаў. Зномы).

*Вершы, у якіх карані напаказ, могуць стаць вершамі-цытаваннямі, але не вершамі-адкрыццямі* (А. Разанаў. Зномы).

*Вымераны нормы, / Вымераны жэсты: / Стылізацыя формы – / Стэрылізацыя зместу* (В. Вітка. Другу-стылісту).

*Вытворчасць тым і адрозніваецца ад творчасці, што яна спараджае структуры, памяшканні, пабудовы – неасвечанае* (А. Разанаў. Паляванне ў райскай даліне).

*Вялікія пісьменнікі задавальняюцца і малою сцэнаю, а малыя – патрабуюць толькі вялікую* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі)

***Г**історыі дастаюцца падзеі, а мастацтву – людзі* (А. Разанаў. Паляванне ў райскай даліне).

*Глухому салаўю / Не трэба нотаў велькіх* (Я. Янішчыц. Самае блізкае).

*Гуслі там, дзе ёсць лады...* (В. Аколава. На рацэ Прыманцы...).

*Гуслям, княжа, не пішуць законаў* (Я. Купала. Курган).

*«Гучныя» паэты падобныя да купцоў, якія хваляць свой тавар, «ціхія» – на тавар, які чакае сваіх купцоў* (А. Разанаў. Зномы).

***Д**ва ўзаеманеабходныя і ўзаемавыключныя пачаткі творчасці і культуры: творчасці – самаахвяраванне, культуры – самазахаванне* (А. Разанаў. Зномы).

*Дзівакі, вандроўнікі, паэты – / Гэта водар жыцця і яго яснацвет* (У. Караткевіч. Слова пра чалавечнасць).

*Для мастацтва «маладых» не існуе. Як не існуе «сталых» ці «старых». У ім іншае суаднясенне, іншыя катэгорыі – эстэтычныя, а не дэмаграфічныя* (А. Разанаў. Паляванне ў райскай даліне).

*Для старога пісьменніка ўсе маладыя пішуць не так і не пра тое* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Душа паэта – плач і смех!.. /* (П. Трус. Нашто мне смех...).

*Душа паэта – то ж рэактар вечны, / Што выпраменьвае часціцы болю / І сотні тысяч сэрцаў чалавечых / Бамбардзіруе імі без адбою, / Каб шляхам ядзернага рашчаплення / Прывесці ў рух энергію сумлення* (Н. Гілевіч. Паэт і фізік-атамнік у нечым...).

***Ё**сць, / відаць, / у зямлі на паэтаў патрэба, / Бо ніхто іх не сеяў, / а шчодра ўзышлі...* (С. Законнікаў. Паэты).

*Ёсць доля / у Паэта – / Як ніва ў Мужыка* (Н. Загорская. Купалавы барозны).

*Ёсць задачы-адкрыцці і задачы-пасткі, якія адно толькі забіраюць тваю энергію і розум і, нават выражаныя, нічога табе не кажуць і нікуды цябе не вядуць* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

*Ёсць у паэта свой аблог цалінны, / Некрануты прастор для баразён, / Дзе ён працуе з першае хвіліны / І да апошніх вечаровых дзён* (А. Куляшоў. Ёсць у паэта свой аблог цалінны...).

*Жывая легенда не мае спачыну, / Ёй, вольнай, няма берагоў* (М. Хведаровіч. Аляксандр Матросаў).

*Зайграйце ж, толькі не фальшыва – / Як суддзі, купленыя меддзю* (Я. Купала. Сон на кургане).

*Закалыхваю памяць радком, / Не параньцеся словам паэта!* (В. Аколава. Князь ты мой, Славамір).

*З вершам знаюцца багі* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

*Злосныя радкі шануюць крытыкі, добрыя радкі беражэ народ* (Е. Лось. Ёсць у вершах запісныя ныцікі).

*З маленькіх пачуццяў не зродзіцца верш, / як з пустога вядзерца вада не нальецца* (Л. Геніюш. Верш).

*З няпраўдай / У вяках / Вядуць паэты / Свой паядынак, / Свой няроўны бой* (П. Макаль. Паядынак).

*Зыходны пункт для творчасці – сэрца. Ад яго павінна пачынацца кожная мастацкая рэч, пра што б яна ні расказвала* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

***І** адна у паэтаў віна: / не ўміраюць і ў вечныя векі* (М. Скобла. Паэты).

*І не знікаць паэтам вечна, / У вечнай песні жывучы* (У. Караткевіч. Радок бяззбройны і бясспрэчны).

*Ісці на свой маяк да мэты –/ Такі ў паэта свой наказ* (К. Кірэенка. Раве над морам, б'е віхура...).

*І ў літаратуры, як і ў звычайным жыцці, аднаму вельмі цяжка пратаптаць нават невялічкую сцежачку. Трэба, абавязкова трэба, каб пасля за табою ішлі па ёй наступнікі, паслядоўнікі* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*І ў сценах маўклівых / Ёсць музыка слоў, / І ў песнях – / акорды мелодый ... / Забытых аплачуць вятры за сялом, / Паэтаў – / уславяць народы!..* (П. Трус. Паэтаў уславяць народы).

***К**аб зразумець, што робіцца з каменем, – ці ён ляціць угору, ці падае ўніз, ці на імгненне застыў, вычарпаўшы моц узлёту і не займеўшы інерцыі падзення,– трэба ўлічваць яго фон, трэба бачыць яго ў працэсе. Гэтаксама і мастацкі твор: ён адкрыты разуменню, калі ўтрымлівае ў сабе і « камень», і «фон», і «працэс»* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і ісціну).

*Каб з'яву можна было зразумець, яна павінна выйсці па-за сябе. Выходзячы ў форму, змест адкрываецца для разумення* (А. Разанаў. Зномы).

*Каб стаць дастаткова традыцыйным, неабходна стаць дастаткова творчым* (А. Разанаў. Зномы).

*Каб тэкст «запрацаваў», неабходна надаць яму такое становішча, такі нахіл, каб ён меў патрэбу ў руху, у развіцці, у выйсці. Так выток ракі нахіляецца да сутоку* (А. Разанаў. Зномы).

*Калі б я праз недахоп «сыравіны» застаўся беспрацоўным як сатырык, дык толькі рад быў бы гэтаму як грамадзянін* (К. Крапіва. Што мне рупіць).

*Калі гарыш – ідзеш ты на касцёр* (Н. Тулупава. Цой).

*Калі мне пішацца, тады – такі багаты, / Што ўсе ракфелеры і форды не раўня* (А. Бачыла. Ніколі б я ў жыцці не стаў магнатам...).

*Калі палітыка – мастацтва магчымага, то само мастацтва – мастацтва немагчымага* (А. Разанаў. Зномы).

*Калі паміраюць паэты, / Што ні перад кім не гнуцца, – / У чалавецтва прасветы / На ўсе вякі застаюцца* (А. Грачанікаў. Максіму Багдановічу).

*Калі ты не народны, не народаў, дык, можа быць, антынародны ты?* (Е. Лось. І смешна, калі нейкі зух лапоча...).

*Калі ты паэтам завешся, / Толькі так жыві: / Апошні верш – / Апошняя кропля крыві* (С. Законнікаў. Калі ты паэтам завешся...).

*Калі у нас сапраўднае прызванне, / Дык нас і так прызнае наш народ!* (У. Карызна. Час – гэта мы).

*Калі ў сэрцы паэта попел, / у агонь яго не раздзьмуць* (Л. Геніюш. Сіратліва ўзіраецца топаль...).

*Калі чытаеш цікавую, таленавітую рэч, дык і жыццё мае разумны сэнс* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Канаванай парою пчала / Назапашвае ўзятак мядовы* (Н. Мацяш. Адказ «Першацвету» на ягоную анкету).

*Канвеер у паэзіі – гэта калі рытм ёсць, а душы няма...* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Каханне – вечная вясна паэтаў* (У. Скарынкін. Вачэй тваіх паляны).

*Кінафільм – твор не толькі мастацтва, але і прамысловасці, тэхнікі* (А. Вялюгін. Паслоўе).

*Кіруючыся вечнаю умовай, / і ты, паэт, працуй уважна з мовай: / рыхтуй упарта грунт і працавіта...* (У. Дубоўка. Прамерыць гоні шмат разоў араты).

*Класік – гэта чалавек таксама, / Толькі нейкі адумыславаты... Што ні напіша – цытаты* (М. Танк. Класік).

*Кожны, хто абраў сабе за жыццё творчасць, некалі зразумее, што літаратура – гэта барацьба ідэй, думак, уплываў, школ, мод і г.д.* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Крытык адчувае сябе паміж Парнасам і пісьменнікам, а месца яго – паміж пісьменнікам і чытачом* (Я. Брыль. Сёння і памяць).

*Крытыка – нахлебніца пры талентах* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Лёс паэтаў – крыж* (Н. Гілевіч. «Паланэз» Агінскага).

*Літаратары павінны навучыцца... думаць па-беларуску* (К. Чорны. Небеларуская мова ў беларускай літаратуры).

*Літаратура – адзін з найбольш чулых сейсмографаў нашага жыцця* (М. Танк. Час і літаратура).

*Літаратура – гэта барацьба аднаго з усім сусветам* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Літаратура – гэта заўсёды ўспамін* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Літаратура – гэта прыгоннае права. Пісьменнік працуе без выхадных, і нават таго адзінага вольнага дня на тыдзень, які мелі прыгонныя, у яго няма* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Літаратура – гэта публічнае прызнанне ў слабасці і нежыццяздольнасці свайго народа ці сцвярджэнне веры ў яго розум і несмяротнасць* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Літаратура існуе да таго часу, пакуль ёсць боль, спагада, спачуванне. Там, дзе няма гэтага, дзе ўсе шчаслівыя, літаратура канчаецца – там ёй проста няма чаго рабіць* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Літаратура любіць прыгажосць* (Е. Лось. Літаратура любіць прыгажосць).

*Літаратура не стварае звыклых матэрыяльных каштоўнасцей, яна не вырошвае хлеба, не будуе заводы, не робіць машын. Яна вырошчвае, будуе, робіць, стварае самую высокую і самую галоўную матэрыяль-*

*ную каштоўнасць на зямлі – Чалавека* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Літаратура – паліклініка, а не бальніца. Пісьменнік – доктар, але не хірург. Ён толькі паказвае, дзе баліць, але сам не рэжа – рэжуць ужо іншыя* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Літаратура часам падобна на ЭВМ: многа абмежаванняў – мала творчасці, мала абмежаванняў – «творчасці» многа, але яна носіць «бредовый» (бязглузды, недарэчны) характар* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Майго радка рыфмаванага звон / Мне даражэй за кожны іх* [ракфелераў і фордаў] *мільён* (А. Бачыла. Ніколі б я ў жыцці не стаў магнатам...).

*Майстра заўсёды ацэніць роўнага сабе* (М. Стральцоў. Чалавек – гэта цэлы свет).

*Майстэрству можна вучыцца дзе хочаш і ў каго хочаш* (М. Стральцоў. Слова ўдзячнасці).

*Малюе ж вобраз Непарочнай Дзевы / Мастак падчас з распуснае натуры...* (А. Звонак. Радкі жывуць, напоўненыя верай...).

*Мастак, зразуметы адразу і цалкам пры жыцці, не нясе ў сабе тайны чалавечай душы* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Мастак – кажучы фігуральна, заўсёды большы раяліст, чым Нерон, і большы каталік, чым Папа Рымскі* (А. Разанаў Зномы).

*Мастак – не раб, не палахлівец, / А мужны вучань у жыцця* (С. Законнікаў. Сіксцінская капэла).

*Мастак не ўласнасць: ён не належыць ні сабе, ні каму-небудзь іншаму* (А. Разанаў. Зномы).

*Мітусня – шашаль для творчасці* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Мне верш, што ненапісаны, патрэбны, / Каб веру у сябе не патушыць* (У. Марук. Ненапісаныя вершы ).

*Мусібыць, самая лагічная логіка паэзіі – алагічнасць* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі)

*Мусіць, трохі паэты хлусяць, / Што мы прагнем адных навальніц* (М. Арочка. Год спакойнага сэрца).

*Мы сквапна цягнемся к старым паэтам, / Каб хоць душой у прошлым патануць* (М. Багдановіч. Тэрцыны).

**Н***а вершах стала мала пазалоты, / Замест яе часцей блішчыць алей* (І. Багдановіч. Памяці Сяргея Астрэйкі).

*Навошта ж Радзіма паэту? /Каб косці ў ёй скласці свае* (Н. Гілевіч. Навошта Радзіма паэту).

*Народаў малых няма! / Бываюць малыя паэты...* (Р. Барадулін. Няма народаў малых...).

*Народ можа даравацъ пісьменнікам многае, але не можа даравацъ маўчання ў часы, калі вырашаецца яго лёс* (М. Танк. Лісткі календара).

*Народная творчасць. У ёй ёсць усё – філасофія і геаграфія, раман і аповесць, характары людзей і багацце сюжэтных ліній, едкая сатыра і самая смелая фантастыка... З яе вырасла ўся творчасць. Яна – Адам і*

*Ева кожнай літаратуры* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*На струнах абарваных / гімна шчасцю / маэстра, самы слынны, / не сыграе* (Н. Загорская. На папялішчы не шукай...).

*Натхненне – кропелька, а не струмень. І гэтай кропляй смагі не спатоліш* (Т. Сівец. Натхненне).

*Неабходна скарачацца да такой сціласці і арганічнасці, як гэта ўмее рабіць кропля вады: у адной адбіваецца свет, дзве – расплываюцца, а ўвесь сусветны акіян уяўляе адну вялізную кроплю* (А. Разанаў. Зномы).

*Не бывае бязгрэшных людзей, / Не бывае бязгрэшных паэтаў* (Я. Янішчыц. Ітацмінда).

*Некаторыя пісьменнікі вельмі не любяць, калі крытыкі называюць сябе чытачамі ў першую чаргу* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Нельга параўноўваць двух пісьменнікаў. Яны заўсёды непараўнальныя, як і два светы* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Нельга прыдумваць сабе стыль. Твор павінен сам па сабе, нязмушана выліцца з твае душы. Гэта і будзе тваім стылем* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Не лю́біць творчасць спрату, / Не толькі ёсць учора, ёсць і заўтра, / Не толькі ёсць здабыткі, ёсць і страты!* (А. Звонак. Радкі жывуць, напоўненыя верай...).

*Неміну́чы / паэт неўміручы; / ён – не рэха, ён – голас і зрок!* (В. Жуковіч. Непазбежны...).

*Не можа быць станоўчы герой без нейкага свайго болю* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Не падсумоўвай пакварталыай зводкаю / Таго, што вымяраецца радком* (А. Куляшоў. Парада сабе самому).

*Непазбежны / паэт незалежны, / мужны, гожы, яскравы паэт* (В. Жуковіч. Непазбежны...).

*Не, паэзія не хлеб надзённы, але – н а д д з ё н н ы. Да яе нельга прывыкнуць, і калі прывыкаюць – перастаюць разумець* (А. Разанаў. Зномы).

*Непаэты марудна гараць, / А паэты імгненна згараюць* (Ю. Свірка. Год за годам бліжэй і бліжэй...).

*Не прадаецца міг натхнення, / Ды можна рукапіс прадаць* (В. Вярба. Не прадаецца міг натхнення...).

*Не прычакаўшы ласкі і пахвал, / Паэты паміраюць маладымі* (П. Макаль. Паядынак).

*Не, творчасць не гульня, гэта – такі «сур'ёз», у параўнанні з якім само надзённае жыццё ўяўляецца гульнёю* (А. Разанаў. Зномы).

*Не ўзнікне прызыўная песня, / Калі анямее пясняр* (І. Ралько. Не родзіцца мудрае слова...).

*Не ўсё ўслаўляй, што явай стала, / Пішы аб тым, што ўсхвалявала* (А. Бадак. Паэту).

*Не хараством для хараства жыве душа паэта* (А. Звонак. Запаветнае).

*Не хлебам, а небам / паэты жывуць...* (Э. Акулін. Паэзія).

*Не я пяю – народ божы / Даў мне ў песні лад прыгожы* (Я. Лучына. Не я пяю).

*Ніхто не мае права жыць з Паэтам, / кахаць, пакутаваць і раўнаваць яго* (А. Сыс. Паэт).

*Ніхто не мае права мець Паэта, / рабіць яго паяцам пры двары* (А. Сыс. Паэт).

*Ніхто не стане на зямлі прарокам, / Калі баіцца, што ўсё выйдзе бокам* (А. Грачанікаў. Творчая смеласць).

*Няма такога пісьменніка, які б не жадаў мець музей свайго імя. І лепш яшчэ пры жыцці* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Няўжо мы пішам для бязродных, / А ці чытаем для глухіх?* (Я. Янішчыц. У святаў – грацыі...).

*Няхай іх лёс у песнях не апеты, / але куды б іх ні закінуў лёс, / дамоў, дамоў вяртаюцца паэты / садамі, звонам сосен і бяроз* (П. Макаль. Максімаў сад).

***О**, колькі званняў з лёгкае рукі, / Не разбіраючы, мы шчодра надавалі, / Хоць ведалі, што будуць хвалявацць вякі / Народныя без звання мастакі – / І кавалі, / і сейбіты, / і ткаллі...* (Я. Сіпакоў. О, колькі званняў з лёгкае рукі...).

***П**айшоў пясняр, а песня засталася, / Памёр паэт, а песня будзе жыць* (С. Грахоўскі. Песня будзе жыць).

*Пакуль будуць жанчыны, / Не змоўкнуць паэты, / Пакуль будуць паэты, / Жанчыны не будуць старэць* (Г. Бураўкін. Лісток альбома з XIX стагоддзя).

*Пакуль паэты будуць пець – / Не быць Радзіме безыменнай, / Зямлі бацькоў – не анямець!* (Н. Гілевіч. Спявайце, юныя паэты!).

*Пакуль чалавек жыве, ён усё яшчэ няпоўны, незавершаны, дарэшты не ўвасоблены, ён яшчэ не зусім творца і не зусім твор. Аднак дзякуючы гэтаму «не зусім» магчыма гэтае далейшае ўвасабленне, магчымы пераход недасканалага ў дасканалае, магчыма творчасць* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

*Памёр пясняр... / А песня будзе жыць і жыць!* (Я. Купала. Песняру-беларусу).

*Памёр пясняр, забыт людзьмі, / А песню ўсё яго пяюць* (Я. Купала. Дзве долі).

*Па прызванню быццам дворнік, / А рыхтуе вершаў зборнік* (К. Крапіва. Мілы чалавек).

*Пачуюць паэта, якому / зямлі сваёй раны смыляць, / і словы Скарыны вядомы, / і думы пра слова не спяць* (В. Жуковіч. Пачуюць паэта, якому...).

*Паэзія – агонь і лёд: / Сто раз згарацъ і уздымацца* (Я. Янішчыц. Не прадʼявіць віны пасля...).

*Паэзія, аднойчы нарадзіўшыся і выйшаўшы са свайго канкрэтнага часу, становіцца пазачасавай, сваёю, прыдатнаю для кожнага стагоддзя і для кожнага, без абмежавання, народа – як і паветра, якім можа вольна дыхаць кожны чалавек на зямлі* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Паэзія – / Громаадвод людскога Болю. / Пакутная ахвярніца вякоў* (Н. Загорская. Паэзія...).

*Паэзія – гэта заўсёды свята слова* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Паэзія – душа, а людзі – проза* (Л. Рублеўская. На скрыжаванні лёсаў і падзеяў).

*Паэзія – лекара чын, / Што гіне , душы ратуючы* (В. Зуёнак. Помнікаў шмат узвялі...).

*Паэзія – маці святых парыванняў, / Любові і веры над светам крыло...* (С. Законнікаў. Пра паэзію).

*Паэзія – падзёншчына, не панства.* (В. Аколава. Два імені).

*Паэзія пачынаецца з немагчымасці казаць* (А. Разанаў. Зномы).

*Паэзія – свет здзіўлення, лёт цёмнага свету ў ясны, з яснага зноў у цёмны* (А. Барскі. Кахаюся ў прыгажосці...).

*Паэзія – служанка й каралева* (Р. Барадулін. Палыновыя санеты).

*Паэзія – сляза, і пот, і сэрца кроў, / Айчына мілая і дабрата сяброў* (Э. Валасевіч. Яе пачатак – ад бацькоўскага парога...).

*Паэзія – споведзь веку, прапушчаная праз уласнае сэрца* (П. Панчанка. Думаю, думаю...).

*Паэзія – сястра жыцця. Любімая, цудоўная, можа, нават самая дарагая, але ўсё ж сястра, а не само жыццё. Само жыццё – гэта, мусіць, проза. Не, хутчэй за ўсё і проза – таксама сястра жыцця, толькі ўжо другая* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Паэзія ў жыцці, а ў смерці – проза* (Л. Рублеўская. На скрыжаванні лёсаў і падзеяў).

*Паэзія – хвароба ўсіх вякоў* (Р. Барадулін. Палыновыя санеты).

*Паэзія, яна не знае тлену, / Калі ў душы хоць прыгаршчы святла* (Я. Янішчыц. Прыгаршчы святла).

*Паэта адкрываюць пасля смерці* (В. Зуёнак. Чытаючы гіпотэзы...).

*Паэт – адно з Радзімай, цярплівай і балючай, / Да мужнасці – гаючай* (В. Аколава. У вянок Максіму Багдановічу).

*Паэта не пытаюць, ён нядужы / Ці яшчэ ў сіле сэрца і рука. / Пакуль звініць / жывая сталь радка – / Упэўнен свет: / з ім моц юнацтва дружыць* (К. Кірэенка. Упэўненасць).

*Паэта пазнайце па вершы адным!* (В. Аколава. Малюнкі словам).

*Паэта слова / вечна на паверцы* (С. Законнікаў. Вязынка).

*Паэтаў акрыляе страта, – / І загартоўвае – яна!* (Я. Янішчыц. Гамаюн на Палессі).

*Паэтаў вабіць Хараство, / як матылькоў – святло Венеры* (Э. Акулін. Ластаўка).

*Паэт – душа мовы* (А. Разанаў. Зномы).

*Паэт заўсёды ёсць прарок, / Бо ён ад Бога...* (М. Башлакоў. Паэт заўсёды ёсць прарок).

*Паэт не абуе, паэт не накорміць, / Ды песня сагрэе і ўзвысіць душу* (С. Законнікаў. Пра паэзію).

*Паэт не мае права быць паэтам / цнатлівае і чыстае красы, / калі ў Айчыне загніваюць рэкі / і засыхаюць на вачах лясы* (А. Сыс. Паэт).

*Паэт / пачынаецца са Здзіўлення. / Паэт / пачынаецца з Дабрыні. /З духоўнага акрылення. / З Любові, з Трывог, з Абнаўлення. / У праўдзе – яго карані* (Н. Загорская. Паэт пачынаецца са Здзіўлення...).

*Паэт пачынаецца са слова* (Н. Гілевіч. Валадар роднага слова).

*Паэт – равеснік усім пакаленням* (Р. Бярозкін. Лірыка сейбіта і салдата).

*Паэт у жыцця не нахлебнік, / Ён сейбіт, / Змагар / І прарок* (С. Законнікаў. Кульмінацыя).

*Паэт уласны ў кожнага народа, / І ў кожнага паэта свой Дантэс* (П. Макаль. Паядынак).

*Паэты жыццё не страхуюць, / Таму у вяках і жывуць* (П. Панчанка. Памяці М. Святлова).

*Паэты не забіваюць, паэты не забываюць крывавага* (Л. Геніюш. Споведзь. Прага).

*Паэты паміраюць на світанні – / І астаюцца з намі жыць штодзень* (Г. Бураўкін. І будзе жыць штодзень...).

*Паэты паміраюць на світанні, / Самотным вокам згледзеўшы зару* (Г. Бураўкін. І будзе жыць штодзень...).

*Паэты – салаўі, не крумкачы* (В. Аколава. Два імені).

*Паэты, як птушкі, адчуваюць будучае і церпяць ужо авансам* (Л. Геніюш. Споведзь. Прага).

*Перакладаць словы лёгка. Цяжэй – душу* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Перачытваць сваё – час ад часу – гэта ўсё роўна як папраўляць на сабе збрую перад далейшай дарогай* (Я. Брыль. Вячэрняе).

*Пісаць – браць лёд рукамі голымі, / Пісаць – як жартаваць з агнём...* (С. Законнікаў. Рызыка).

*«Пісаць для вечнасці»– гэта не з думкай пра вечнасць твайго слова, а з належнай настройкай на тое, што па-сапраўднаму жывое і застанецца жыццём* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Пісаць пачынаю ўсё горш я і горш – / Пара выбіраць акадэмікам* (М. Танк. Роздум).

*Пісьменнік – голас Божы, не акцёр. / Прарок, які самотай сушыць цела* (Л. Рублеўская. На скрыжаванні лёсаў і падзеяў).

*Пісьменнік – гэта... ступень і глыбіня спачування чалавеку* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Пісьменнік павінен добра ведаць, што творы – гэта таксама яго біяграфія, а біяграфіяй трэба даражыць* (Я. Скрыган. Шуканні).

*Пісьменніку трэба заўсёды быць з народам. Яму баліць – а ты стогнеш, яго абражаюць – а ты плачаш* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Пісьменніку, які добра ведае чалавека, часам дастаткова бывае якой-небудзь адной дэталі, адной*

*рыскі ў ім, каб, узяўшыся за яе, як за нітку, разматаць увесь клубок – яго жыццё* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Пісьменніцкая і навуковая творчасць – душэўная хвароба, але высакародная хвароба* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Пішаш і слову даверліва верыш, / Пакуль не прыйшло да цябе адкрыццё, / Што самым апошнім праўдзівым вершам / Усё ж застаецца тваё жыццё* (С. Законнікаў. Пішаш і слову даверліва верыш...).

*Плён мераецца не колькасцю твораў, а іхняй някалькасцю – выключнасцю, не многасцю – а дастатковасцю* (А. Разанаў. Зномы).

*Покуль будуць людзі, / Покуль сонца будзе ўсходзіць, / Жыць Купалы песня будзе / Неўміручай у народзе* (А. Бачыла. Зязюля кукавала...).

*Прадбачаць многае паэты, / Што потым суджана згубіць* (В. Вярба. Я веру, што жыццё прадбачыць...).

*Практыка – дакладней за тэорыю. Тэорыя можа памыляцца. Практыка не памыляецца, бо за ёю стаяць мільёны людзей, а за тэорыяй – звычайна адзін чалавек. Але ж тэорыя важней за ўсё: яна нараджае практыку* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

*Пра паэтаў немагчыма гаварыць прозай. Пра паэтаў трэба гаварыць і спяваць толькі вершам...* (А. Васілевіч. Пра вечнае).

*Прывітанне графамана: «Стой! Ні з месца! Чытаць буду!»* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

*Прызванне паэтаў – вырошчваць рэха* (А. Разанаў. Зномы).

*Прыходзіць незвычайная хвіліна, / Калі вастрэе слых, пільнее зрок, / І нібы гронку росную рабіны, / Раптоўна сэрца выспеліць радок* (С. Законнікаў. Вузельчыкі).

*Пэўна, неабходна для паэта / Нават і ў касмічныя вякі, / Каб звінела птушкамі паветра / І цвілі ля сцежак васількі...* (Г. Бураўкін. Як ні называем іх па-свойску...).

*Пясняр – слуга слугі усякай, / Пясняр і цар усіх цароў!* (Я. Купала. Песняру-беларусу).

**Р***адкі паэзіі – пракосы, / А ручка – бацькава каса* (А. Камароўскі. Каса).

*Рамеснік! Ён хацеў быць мастаком!..* (Н. Гальпяровіч. Рамеснік!..).

*Родная мова – бестэрміновы пашпарт пісьменніка* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Розніца паміж арміяй і літаратурай: у арміі асноўны закон – рабі, як я; у літаратуры – якраз наадварот: рабі не так, як я* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Рупная пчала / Умее мёд сабраць і з горкіх кветак* (М. Багдановіч. Летапісец).

*Рым загінуў ад дзіды вандалаў – / Рым жыве ў Ювенала радках!* ( У. Караткевіч. Мастакам).

*Рыфмай лозунгі не псуй* (У. Някляеў. Харэі).

**С***амы кароткі і доўгі век – / у творцаў. / Адны і пры жыцці / паміраюць, / другія і пасля / працягваюць жыць* (В. Рагаўцоў. Імгненні).

*Самым апошнім праўдзівым / вершам / Усё ж застаецца тваё жыццё* (С. Законнікаў. Жыццё – дзве сціплыя, простыя даты...).

*Сапраўднейшы радок – / брат незагойнай раны* (В. Аколава. Лірычная анкета).

*Сапраўдны паэт у пэўнай ступені – прарок, закліка्ны ісці хоць на адзін крок наперадзе падзей* (С. Грахоўскі. Другому сэрцу перадам).

*Сапраўдны пісьменнік – сам сабе настаўнік. І вучань таксама. Ён вучыцца і вучыць адначасова. Сам у сябе вучыцца. І сам сябе вучыць* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

*Сапраўдны пісьменнік той, на творах якога можна навучыцца любові да людзей* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Сатыра моцных умацоўвае. А слабыя баяцца сатыры, забараняюць яе* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Светлы лёс паэта – / Усё жыццё імкнуцца ў маладосць. / Заўжды ў паходзе быць, / пакуль дыханне ёсць – / Быць / маладосці песняром / для свету* (К. Кірэенка. Упэўненасць).

*Славу паэтаў разносяць па свеце, / Вянкі ўскладаюць і звоняць пахвалай, / Я ж ціха йграю, хто ж ціхіх прымéце?* (Я. Купала. Я не паэта).

*Слова паэта – народа працяг* (С. Панізнік. На гронцы жыцця).

*Смерці ў Паэта няма – / Ёсць нараджэнне!* (Я. Янішчыц. Ялта – 1917).

*Спавяданне сціпласці – не ад немачы, а мудра, з высока жыватворчай радасцю. Бачачы вялікіх, адчуваючы іх прысутнасць і ўсведамляючы сваё месца ва ўсеагульным творчым жыцці* (Я. Брыль. З людзьмі і самнасам).

*Срэбра ззяе раскошай, / І сыта яно і адзета, / Толькі бедна натхненнем – / Адзіным багаццем паэта* (А. Куляшоў. На пасадзе цяжкой).

*Сутнасць верша не «ядро арэха», а ўвесь арэх* (А. Разанаў. Зномы).

**Т***абе ж, калі ты пішаш вершы, / не хочаш верш праспаць свой лепшы, / карысна, мабыць, меней спаць, / а болей думаць, болей дбаць* (А. Вярцінскі. Начны бераг).

*Такому б толькі з рук ды ў друк* (А. Вярцінскі. Начны бераг).

*Тварыць – штодзённа, апантана – / Для чалавека значыць – жыць* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Твор не ўдасца, калі перакладчык, хай сабе і вельмі дакладна, перакладзе толькі словы, сказы, а не паэзію і пачуццё* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Творчасць – гэта таксама загадка і шчасце, калі ты нешта добрае адкрываеш людзям* (Я. Скрыган. Спасціжэнне).

*Творчасць – індыкатар, своеасаблівы дарожны знак: кожны раз яна паказвае табе самому, дзе ты цяпер і які ты цяпер* (А. Разанаў. Зномы).

*Творчасць – сустрэча з невядомым. Як толькі невядомае замяняецца вядомым, яна немінуча ператвараецца ў імітацыю* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

*Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш, / Абрабіць яго трэба з цярпеннем. / Як ударыш ты ім, – ён, як звон, зазвініць, / Брызнуць іскры з халодных каменняў* (М. Багдановіч. Песняру).

*Трэба, каб у наш век канвеера і патоку пад кожным вершам, пад кожным радком, пад кожнай дэталлю і кожным словам можна было паставіць, як таўро майстра: «Зроблена ўручную...»* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Трэба любіць і сваіх адмоўных герояў – злой любоўю* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Трэба трымаць думку на пільна насцярожаным курку радка* (А. Вялюгін. Паслоўе).

*Ты, жаданне, – аковы і вольнасць, / А мастацтву – не будзе канца* (Я. Янішчыц. А паэзія ўся ў невядомым).

***У** геніяя ёсць адна асаблівая здольнасць – знаходзіць творчасць ва ўсім* (Г. Марчук. Голас і слова).

*У кожнага з нас свая* ***мелодыя стылю****. Чаму ж ты хіліш, каб я спяваў абавязкова, як ты?* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*У кожным паэце / два доны* [донкіхот і донжуан] */ жывуць адначасна* (А. Пісьмянкоў. Ён некалі марыў пайсці ў донкіхоты...).

*У кожным чалавеку льга знайсці частачку душы паэта* (К. Чорны. Скіп'ёўскі лес).

*У літаратуры, як і ў жыцці, людзі падзяляюцца на тых, хто хоча нешта зрабіць, і на тых, хто абавязкова хоча некім стаць* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*У паэтаў біблейскі узрост / на вякі* (М. Скобла. Паэты).

*У радовішчах чалавечай існасці ёсць пласты, дзе думка і пачуццё сустракаюцца, дзе пачуццё – гэта ўжо і думка, дзе думка – гэта і пачуццё. Калі карані верша не дасягаюць да тых пластоў, тады ён узор дэмагогіі, якая пра ўсё можа нешта сказаць, але нічога не можа выказаць* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

*Усё ва мне і я ва ўсім – самы неабходны, самы патрэбны творчы прынцып для пісьменніка* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Усякі, нават геніяльны паўтор – гэта ёсць бяссілле непаўторы* (Я. Скрыган. Смага).

*Хвалюе музыка, паэзія – як музыка, а добрая, з божым знакам проза таксама хвалюе – паэзіяй* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Цеснаватае ўсё ж для пісьменніка пракрустава ложа крытычных абмежаванняў, бо мастак павінен быць шырэй усіх гэтых берагоў, штучна ўзведзеных вакол яго* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Ці ты музыка з ласкі божай / І для цябе твой дар – твой крыж, / Ці – дзеля сытасці і грошай / Людзей забаўкамі чмурыш?* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Цукар – твая мова, / Слодыч скрозь адметна. / Сведчу, адным словам, – / Пішаш дыябетна* (В. Вітка. Другу-стылісту).

*Цяжка такое – перажыць свае магчымасці. А ці ж усіх сярод нас можна назваць прафесійнымі?* (Я. Брыль. Свае старонкі).

*Цяжка, як без паветра, / людзям жыць без паэта / з ненацягнутым імем – прарок* (В. Жуковіч. Непазбежны...).

*Цяпер зайздрошчу я табе, пясняр: / Ты і жывеш і будзеш жыць крылата!* (А. Зарыцкі. Крылы).

***Ш****то такое ведаць жыццё для пісьменніка? Гэта значыць – проста жыць. Нават адным, толькі сваім жыццём* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Шчырае няўменне ў паэзіі больш паэзія, чым прафесійная імітацыя* (А. Разанаў. Зномы).

***Э****фект творчасці: з цягам часу тое, пра што пішаш, становіцца тым, як пішаш, і тое, на што глядзіш, становіцца тым, як глядзіш* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра існіну).

***Я****го нікому замяніць не суджана – / Ён быў паэт* (С. Законнікаў. Ён быў дзівак...).

*Я ж у песні – не пан, толькі служка* (А. Сыс. Гэты свет – для размену манет).

*Якая гэта жахлівая трагедыя для пісьменніка: глядзець і не бачыць, слухаць і не чуць, пісаць і не тварыць* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Як бы адмыслова ні складваліся дровы для вогнішча, праз гэта яны не запаляцца. Умельства мае справу з дровамі, творчасць – з агнём* (А. Разанаў. Зномы).

*Які народ – такі й паэт. / Які паэт – такія й людзі* (В. Аколава. У вянок Максіму Багдановічу).

*Як нам зрабіць, маё тварэнне, / каб ты было – / само гарэнне? / Не адыход / і не адгон, / а сам агонь* (А. Вярцінскі. Зноў тлен халодны).

*Як не будзе натхнення ў паэта – / Не чакайце і песень яго* (А. Бялевіч. Будні робяць свята).

*«Якое жыццё, такая і літаратура» – у сэнсе адлюстравання. Значыцца, жыццё як мага ніжэй апусціць і туды ўжо цягнуць літаратуру?* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Якое ўсё ж такі шчасце быць паэтам, / Навекі закаханым у жыццё* (А. Звонак. Петрусю Броўку).

*Як цеціва, страла і лук, / як з ноты вызвалены гук, / як палімпсеста тайнадрук, / як варажба цыганскіх рук, як аралля і гостры плуг, / як жырандоля і жаўрук, – / Натхненне* (Э. Акулін. Натхненне).

*Я сейбітам паэта уяўляю* (Л. Галубовіч. Я сейбітам паэта уяўляю...).

## *«НАСТРОЙ – ЯК САЛАВЕЙ СВІТАЛЬНАЮ ПАРОЙ...»*

### Настрой чалавека, яго стан; весялосць; журба, сум, смутак, самота, туга; адзіноцтва, адчай

*Адзіноцтва – не самасуд. Гэта ўнутраная работа, шліфоўка сваіх думак, поглядаў. Гэта праверка сваіх пачуццяў* (У. Ліпскі. Шукай сябе).

*Адчай падманлівей за кропельку надзеі* (В. Аколава. Случарыны).

*А чаму гэта нам, калі ў адзіноце, абавязкова трэба падмацоўвацца то з прэсы, то з эфіру? А калі больш падумаць, спакайней засяродзіцца, зарчэй зірнуць навокал?* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Відаць, страшней, страшней за ўсё на свеце – / Пакінутым усімі быць* (М. Рудкоўскі. Пакінуты бусел).

*Выпрабаванне адзіноцтвам – самае страшнае выпрабаванне* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Гэта страшна – адчуць сябе сярод мноства людзей чужым, адзінокім* (Я. Брыль. Свае старонкі).

*Ёсць страшны суд дзіцячай адзіноты...* (І. Багдановіч. Дзіцячы дом).

*Журба ж і моцных нават горбіць...* (Я. Сіпакоў. Пасля журбы).

*Залежна ад уласнага настрою / наўкольны мы ўспрымаем краявід* (А. Вольскі. Краявіды).

*Здаўна самота – чорнае балота / І злая мачаха зямной красе* (А. Астрэйка. Я свой настрой у сум не апранаю...).

*І салаўя не радуе вясна, / Калі з грудзей не льюцца самі песні* (А. Бачыла. Што можаш здзейсніць...).

*І ў адзіноце няма адчування яе – адзіноты* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*І чарка ў гумар прывядзе* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Калі ж табе сумна – гэта разумна / У цішыні пабыць аднаму* (А. Грачанікаў. Дрэва на выспе).

*Калі сустракаюцца дзве рукі, / Як з нотай у песні нота, / Будуецца мост над прорвай ракі, / Імя якой – адзінота* (П. Макаль. Калі сустракаюцца дзве рукі...).

*Калі ты амаль што ў раі, / тым лесвіца будзе вужэй і вужэй – / і месца няма дваім* (П. Шруб. Аксіёмы лесвіц).

*Кніга – гэта журба па ўсім, што пражыта, і надзея на памяншэнне гэтай журбы ў будучым* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Настрой – / як салавей світальнай парой, / На промні ўсмешкі гушкаецца* (У. Карызна. Настрой).

*Не аддавай сябе самоце, / Заўчасна ёй не саступай* (Н. Мацяш. Не аддавай сябе самоце).

*Ніколі не бываю адзінокім, / Бо мары не згарэлі ўсе да тла* (А. Астрэйка. Ніколі не бываю адзінокім...).

*Няможна патураць тузе, / Каб яву засланіла здань, / Каб зрабавала пакрысе, / Што скарбавалася гадамі* (Н. Мацяш. На быстрыні).

*Пакінутым – жальба па сіле, / Няўдачнікам – зман адкрыцця* (А. Пысін. Пражытага растуць паверхі...).

*Палёгкі дачакацца, як бальзам, / Бывае, і сляза дапамагае* (М. Маляўка. Над краем – дзён сухая паласа...).

*Самотніку не вырвацца з няволі* (Р. Барадулін. Палыновыя санеты).

*Смага – смагу большую раджае, / Дабро – несупакоенасць дабра* (Я. Сіпакоў. Жанчына).

*Сум не мае волі... Сум не мае хаты* (В. Аколава. Малюнкі словам).

*Сумуй па светлых днях, як па расе / Сумуюць ледзь разбуджаныя травы!* (А. Звонак. Вясны мелодыі жывыя).

*Той адзін не заўсёды самотны, / Хто сустрэне самоту хоць раз* (Р. Барадулін. Пасмуткуем з табою).

*Тугу прымаю, як аздобу, / Мадонны ўбраўшую чало* (У. Жылка. Virelai).

*Усміхніся ўсяму, / Што варожаю цемраю гнеціць...* (Н. Мацяш. І дзеля цябе).

*У смуткаў не бывае двайнікоў* (Р. Барадулін. Палыновыя санеты).

*Хацеў – пацешнае, выйшла – грэшнае...* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Якое ўсё умоўнае – / І радасць, / І журботлівы настрой...* (У. Карызна. Крыніца).

## *«СВЕТ ЧАЛАВЕЧЫ ПРАГНЕ ЛЮДСКАСЦІ»*

### Справядлівасць і несправядлівасць; дабро і зло; крыўда; веліч; ганьба; віна і пакаранне; хітрасць, прытворства; заганы, недахопы

*Ад велічы да ганьбы – адзін крок* (А. Вярцінскі. Колькі лет, колькі зім!).

*Ад пракажоных, з язвай невылечнай, / Свяча не ўспыхне* (В. Аколава. Ліст да Яўгеніі Пфляўмбаўм).

*Анёлавы вочы ў віны, / Калі шуфлюе лепшых у магілы* (Н. Загорская. Думаючы пра агульназямное).

*А хто крынічку задушыў – / Не пашкадуе мора* (У. Марук. Мінаю рэкі і брады... ).

*Бойся спазніцца з харошым учынкам: / Тонка прадзецца жыццёвая ніць* (Н. Мацяш. Не спазніся).

*Браток! Ці ж ты вачэй не маеш – / Арлом варону называеш?* (М. Багдановіч. Варона і Чыж).

*Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя – гояцца, і па іх знаку няма. Большыя гояцца, але па іх*

*застаюцца рубцы. / Гэтак на целе. / Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя – гояцца, па іх застаюцца рубцы. Большыя – заўсёды крывавяцца. / Гэтак на сэрцы. / Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя – заўсёды крывавяцца. Большыя – залечвае толькі ... смерць. / Гэтак на душы* (Ядвігін Ш. Раны).

*Быў бы юда, а асіна на яго знойдзецца* (М. Лынькоў. Векапомныя дні).

*Вялікая гэта справа – чалавечая адкрытасць, праўдзівая споведзь без грама разліку, жадання падаць сябе лепшым, чым ёсць на самай справе* (В. Быкаў. Кар'ер).

*Гатовы ліха прыкупіць, / Каб спатайку цябе ўкусіць* (Я. Колас. Новая зямля).

*Горычы на свеце многа, але і ў самай большай пасудзіне ёсць дно, няхай сабе яна і да краёў наліта атрутай* (К. Чорны. Пошукі будучыні).

*Грамату зноўку далі вынаходніку, / стаўку, кватэру, пуцёўку – угодніку* (В. Жуковіч. Стымулятары).

*Да вышыні імкнешся ты з даверам, / А понізу цябе – сякерай* (В. Вітка. Сосны).

*Дабро зрабіў – не гойкай пеўнем* (П. Броўка. Дабро).

*Дабро і зло сумесныя, сумешчаныя – як скрыжаванне і раздарожжа. Калі чалавек кіруецца ў бок дабра, ён адначасова кіруецца і ў процілеглы бок: да аднаго – насустрач, да другога – насупраць* (А. Разанаў. Зномы).

*Дабро мы можам ацаніць самі, а зло часцей за ўсё ацэньваюць на нашым горкім вопыце другія* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Да скону можа хлус-алхімік / Сядзець на пышных пірагах!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Дзе трэба – лі слёзы, / Дзе трэба – падмаж* (А. Александровіч. Цені на сонцы).

*Дзе ўсё прыводзіцца к карыту...* (Я. Колас. Новая зямля).

*Добрае даецца не аднекуль, / І благое – не ад цёмных траў* (А. Пысін. Добрае даецца не аднекуль...).

*Ды не такі ўжо дзікі ты, павер, / Калі ясі з кармушкі* (Е. Лось. Зубр і Дзік).

*Ёсць у нас гаспадары, / Што топчуцца па дабры* (Я. Колас. Ёсць у нас гаспадары...).

*Заганна нажытае багацце заганна і выкарыстоўваецца* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Зажыць па-людску, а не гэтак, / Як у пячурцы таракан* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Замнога тых, / Хто робіць напаўсілы. / Замнога рабавання і маны...* (Н. Загорская. Думаючы пра агульназямное).

*За плячыма ганьба, а перад вачыма пустэча* (К. Чорны. Пошукі будучыні).

*Заўсёды дурні лічаць дурнямі другіх, ды толькі не сябе* (П. Панчанка. Думаю, думаю...).

*За хуліганскія замашкі / Падзякі век ніхто не меў* (У. Корбан. Зух).

*Зла са святлом змаганне йдзе заўсёды. / Няхай святло перамагае ў нас* (Н. Мацяш. Да свята).

*Злаcлівасцю пачуцці не глушы / І не прымай хлуслівых спачуванняў...* (А. Грачанікаў. Без падабенства дзень...).

*Зло – гэта перш за ўсё нелюбоў, нежаданне даравацъ і няўменне спачуваць* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Зло злом яшчэ чарнейшым вернецца, / Дабро паўторыцца стакроць* (Р. Барадулін. Верніца).

*Зло, як Арктыка, абледзяняе. / Цёплае, як сэрца, дабро* (А. Вярцінскі. Дзякуй, тэрмас!).

*Зло, як і дабро, імкнецца да дасканаласці* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Зnітаваны гэты свет / Саюзам ястраба і клеткі* (А. Разанаў. Іх далячыні развялі).

*І багацця на ўсіх хапае, і галечы на ўсіх хапае, толькі дабро ў дэфіцыце* (Г. Марчук. Голас і слова).

*І дойдзе ўжо да галубочка, / Як бы па ніткы да клубочка* (Я. Колас. Новая зямля).

*І едзем мы на нечым возе / Ды ўсё дарожкаю крывой* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Ім цёмна, нема кніга лёсу, / Яны не бачаць далей носу* (Я. Колас. Новая зямля).

*Каб усе былі роўныя або гарбатыя – і справядлівасць была б аднолькавая, і ці не можа быць не аднолькаваю справядлівасць?* (А. Разанаў. Паэма рэха).

*Калі захочуць, знойдуць сведак – / Купіць іх можна і прадаць* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Калі маўчыць душа, гаворыць дурнота* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

*Калі ўсё добра – то патрэбна шмат, / калі ўсё кепска – то нішто не міла...* (Е. Лось. Калі ўсё добра...).

*Круцялёў чым разбіраць, / Лепш абодвух пакараць* (А. Абуховіч. Суд).

*Лёгка злавіць несуна, / цяжка злавіць казнакрада* (В. Жуковіч. Праблема?).

*Лёгка судзіць несуна. / Будзем судзіць казнакрада* (В. Жуковіч. Праблема?).

*Магутнасць і веліч – / у шчырай любві чалавечай* (Л. Рублеўская. Вечар у сямейным коле).

*Мішура пазалоты на ўсім, / Што бязрадасна, пошла, ганебна* (Т. Бондар. Мішура пазалоты на ўсім).

*Мы самі – хуткасць, / Самі ўжо – машыны!..* (У. Някляеў. Ружа вятроў).

*Найцяжэй судзіць сябе самога, / Чым у другога плямінку знайсці* (С. Грахоўскі. Няўцерпныя з сівымі валасамі).

*На ліхое нямнога патрэбна хвілін* (У. Дубоўка. Пастаўская партызанка).

*На свеце ўсякага жыцця даволі і чалавечае долі шмат* (К. Чорны. Лявон Бушмар).

*На шалях / Унутранай раўнавагі / Ураўнаважваеш Паражнечу / і Паўнату / І нікому / Не прызнаешся, чаму / Не пераважвае шаля / Шалі* (А. Разанаў. Гліна).

*Не баіцца дабро знікання. / Не мутнее ў крыніцы вада* (Р. Барадулін. Не ўзірайся на свет варожа...).

*Не будзь, справядлівасць, зялёнай наіўнасцю, / Калі, нібы кактусы, выстаяць хочаш* (А. Бачыла. Кактусы).

*Не ўсе хочуць быць добрымі, / ды хочуць усе дабраты* (А. Вярцінскі. Медсястры).

*Ніхто не даруе нам крыўды і слёз – / Адплаціцца ўсё і адплачацца* (У. Някляеў. Куліна).

**О**, *хітры свет на штукі здаўся!* (Я. Колас. Новая зямля).

**П***а віду пан і ходзіць панам, / А спіць напэўна пад парканам* (Я. Колас. Новая зямля).

*Падробкай пад сумленнасць не хітрыце, / Падробка – смерць заўчасная дабра* (А. Бачыла. Сумленнасць – гэта хітрая, брат, штука...).

*Пакаранне здымае віну, але права тое здабыць нялёгка* (В. Іпатава. Спасціжэнне).

*Па часе будзе і развага, / Калі ў лоб стукне табе шляга!* (Я. Колас. Новая зямля).

*Перш чым на іншага ківаць, / Узорам сам павінен стаць, / Каб прыклад з цябе бралі* (Э. Валасевіч. Алёшка і Кошка).

*Перш, чымсьці з пахвальбой імкнуцца недзе, / Не шкодзіць паглядзець, на чым з нас кожны едзе* (К. Крапіва. Пра цыгана і кабылу).

*Покуль нават хоць раз / Ашукаць дазваляецца – / Справядлівасць ад нас / Не на раз / Аддаляецца* (А. Бачыла. Толькі раз...).

*Прад пошасцю і цвіллю, / Натруджаных, нам не развесці рук* (Я. Янішчыц. Рукі).

*Прызнаць віну, якой не варты вы, – / Адчэпка толькі для суда людскога* (У. Някляеў. Прызнаць віну, якой не варты вы...).

***Р**ака неразумення. / Яе не пераплыць, / Калі гудуць вірамі / Мана, лухта, / Калі між берагамі / Ніводнага маста* (У. Някляеў. Вачэй тваіх сумненне...).

***С**амае галоўнае... не страціць усведамлення сваіх памылак* (Я. Колас. На ростанях).

*Самая большая рана на маім сэрцы – / гэта тая, якую пакінула несправядлівасць* (А. Вярцінскі. Спачуванне).

*Свае ў другім пабачыўшы заганы, / Мы, як на люстра, брэшам на яго!* (А. Звонак. Сабака ў люстры).

*Сваіх згрызот для ўсіх даволі, / Свой клопат кожнаму баліць* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Свет – не навокал, у табе, / і гэткі, вартая якога* (Т. Бондар. Прасцей абвінаваціць свет...).

*Свет ніколі не трымаўся на кампліментах, і мала знойдзецца людзей, якія б усё жыццё хацелі есці толькі*

*салодкае. Гэта і няздорава, і няўежна* (А. Кудравец. Успамін пра шэршня).

*Свет пароўну ўсім належыць, / А доля ў кожнага свая* (С. Законнікаў. А іншага жыцця не будзе...).

*Свет чалавечы прагне людскасці* ( Н. Мацяш. Свет чалавечы прагне людскасці...).

*Суд наш рашаючы і незваротны, – / Суд наш апошні – саміх над сабой* (Я. Янішчыц. Зорная паэма).

*Суды сабе падобных лепяць* (У. Някляеў. Майстры вясны).

*Сябе ты не ратуй, а перайнач / Свой нораў зла, спустошаную волю* (А. Астрэйка. Не разбурай страху над галавой...).

*Таго чакае забыццё й кананне, / Хто ў сваім доме як часовы госць* (У. Мароз. Крыжы на ростанях).

*Тое, што схаваў, – / згубіў навечна. / З'еш адзін вала – / адна хвала* (А. Бялевіч. Лінія душы).

*Толькі выпакутаванае дабро прыносіць шчасце* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Толькі раз з дарогі збоч – / Паселіцца ў сэрцы ноч* (П. Панчанка. Нешта пройдзена...).

*Ты сам свой інквізітар* ... (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*У гэтым свеце аніхто не лішні...* (В. Аколава. Аднойчы і заўсёды).

*У злога царкоўнага старасты і мышы злыя – свечкі ядуць* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Украў свініны кілаграм – / прыгаварылі к тром гадам. / Узяў мільён – не вінават: / далі даведку, што вар'ят* (В. Жуковіч. Пад і над законам).

*У крывадушшы мы зайшлі далёка... / О, толькі б дзеці не пайшлі далей!* (У. Скарынкін. Не трэба нам...).

*У ласых да сну – ўкарачаецца век. / Адольвае іх дрымота і сала, / Жывёлай становіцца чалавек* (Я. Янішчыц. Галалёд).

*Усё найцяжэйшае можа ўспрымацца і перажывацца, як найлягчэйшае, калі ёсць у чалавека тое, чым можна апраўдаць яго* (К. Чорны. Сястра).

*Усіх нас прывучылі за паёк / Не там, дзе трэба, бачыць вінаватых* (Н. Гілевіч. «Паланэз» Агінскага).

**Х***ай раней за дабро памірае гнюсь, / Хай сонца жыве, хай гіне туман... / Бо як без беларусаў мая Беларусь, / Так Арменія без армян* (У. Караткевіч. Віно армянскай гісторыі).

*Хамы лічаць заўсёды «хамскім» / Матчыну песню і матчыну хату* (У. Караткевіч. Калумбы зямлі незнаёмай).

*Хварэць на пана* (Я. Колас. Сымон-музыка).

*Хоць і паны вы па выгодах, / але па сутнасці – рабы* (В. Жуковіч. Вы!).

*Хто ганарлівы, той і зайздросны* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Хто глыбіні спазнаў, / Не прыходзіць назад* (Л. Паўлікава. Тэатр лялек).

*Хто навучаны болем: да слёз даравацъ, / Той шчасліваe заўтра для заўтра прарочыць* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

*Хто носьбіт ёсць пачатку злога, / Не патурай таму ні-ні* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Хто судзіць сябе не ўмее, / Не можа іншага судзіць* (С. Грахоўскі. Самасуд).

*Хто «ўладарыць», той ударыць раптам / Па надзеі, па душы жывой* (П. Панчанка. Не люблю я слова «покоритель»...).

*Хто хаваецца ад сонца далоняй, / у таго і сэрца з лядоўняй* (Д. Бічэль-Загнетава. Хто хаваецца ад сонца далоняй...).

*Хто хлеб дае чужым сабакам – / Свае забрэшуць на таго!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Цёмнымі і даверлівымі лягчэй камандаваць* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Чакаць тады спакойна можна, / Калі няма чаго чакаць!* (А. Звонак. Пад небам поўначы далёкай).

*Часамі ка́ра абыходзіць міма / Гібрыдаў шкодніка і падхаліма* (У. Корбан. Гуркі).

*Часамі скуле і хваробе / Наровяць самі дактары* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Чым больш пазнаём мы свет, тым меншую цану маюць для нас яго скарбы, тым болей бачым благога. Болей здзеку, крыўд і слёз* (Цётка. Шануйце роднае слова!).

*Што можаш здзейсніць – неадступна здзейсні, / Каб не пякла агнём цябе віна...* (А. Бачыла. Што можаш здзейсніць...).

*Якая розніца паміж хітрым і разумным? Хітры на адзін раз. Разумны – назаўсёды* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Як бы там ні было добра, але калі гэтае дабро цэлы век астаецца без усякай змены, то яно лёгка перастае быць дабром* (Я. Колас. Зло – не заўсёды зло).

*Якому дурню свет далі зрабіць, / Які мы ўсё жыццё перарабляем!* (М. Танк. Магло б усё інакш быць зусім...).

*Я ў сілу жорсткасці не веру, / Я веру ў сілу дабраты* (С. Законнікаў. Я жорсткасці зазнаў урокі...).

## «НЕ МАЕ ГРАНІЦ ЛЮДСКАЯ ЗЛОСЦЬ»

Адступніцтва, здрада, вераломства, подласць; злосць, гнеў, крыўда; жорсткасць, нянавісць; глупства, невуцтва; хлусня; ганарлівасць, зазнайства, зайздрасць, хвальба, падхалімства, угодніцтва; абыякавасць

*Ад вёскі адбіўся, у палац не папаў* (Я. Купала. Нібы казка).

*Агрэсіўнасць... можа існаваць не толькі сама па сабе, а яшчэ як адна з магчымасцей атрымаць радасць, мець насалоду, быць шчаслівым, як адна з праяў геданізму* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

*Адкукарэкае, / а там па ім хоць не світай...* (А. Вярцінскі. Начны бераг).

*Адкусілі язык – / за яго скажуць тое, што трэба* (П. Шруб. Магікане).

*Адны трымаюць нос высока, / Другія ў дол спускаюць вока* (Я. Колас. Новая зямля).

*Адступніцтва пачынаецца з выпрацоўкі «высокай» філасофіі, якая апраўдвае здраду* (І. Шамякін. Падзенне).

*Ад Юды каравай, / Што ты ясі, – у роце не дзярэ?* (Н. Гілевіч. А дзецям у вочы – глядзіш?).

*Але не кожны, ой, не кожны бачыць / Боль, як нябесны знак сябе іначыць* (Н. Мацяш. Пра перамогу).

*Але пакуль ёсць праўда і крыўда, ёсць багатыя і бедныя, ёсць сытыя і галодныя, ёсць князі і рабы, ёсць генералы і салдаты, ёсць жандары і паэты, ёсць асуджаныя і ка́ты, да таго часу будуць зайздрасць, падман, грабеж, нянавісць, барацьба, каварства, кулакі, локці, зубы...* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*А му́кі вашы я не разумеў, / Пакуль ад вас не дачакаўся болю* (У. Марук. Ненапісаныя вершы).

*А на аслах часцей бывалі дурні, / І не адзнака для Хрыста – асёл* (У. Караткевіч. Кінааслы).

*Асадзі назад!* (Я. Колас. Асадзі назад!).

*А той, хто злыдняў пакрывае, / Ёсць злыдзень гэтакі і сам* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*А чаму пасля / чалавечага гневу / Чорным робіцца сэрца?..* (У. Карызна. Чалавечы гнеў).

*Баяўся мужыком здацца і выявіў сваё поўнае хамства* (Я. Колас. У палескай глушы).

*Вер часу: глупства мудрых не скасіла, / Са сцежкі яснай зайздрасць не звяла...* (А. Звонак. Без крылаў песні не ўзляцець высока...).

*Глядзіце, якая цаца ззяе ў смецці!* (Я. Колас. Новая зямля).

*Даў бог яму талент, ды на розум, відаць, паскупіўся* (М. Танк. Лісткі календара).

*Дзе ёсць ліслівасць – там і вераломства!* (Э. Валасевіч. Шчупак і плотка).

*Другі баран – ні «бэ», ні «мя», / а любіць гучнае імя* (К. Крапіва. Дыпламаваны баран).

*Жахлівей не бывае здрады, / Як сонца ўласнае забіць!* (Н. Мацяш. Пространь кахання).

*Жорсткасць – гэта ночы, / А дабрата – высокі дзень* (С. Законнікаў. Я жорсткасці зазнаў урокі...).

*Жорсткасць узрастае там, дзе поле пакінула дабрыня* (А. Кудравец. Успамін пра шэршня).

*Жорсткасць, як і боль, даецца чалавеку для самазахавання* (А. Кудравец. Успамін пра шэршня).

*Жыць хоча боль, / Бо ім усё жыве* (Р. Барадулін. Жыць хоча боль...).

*Зайздрасць усеабдымная. Катý і таму зайздросцяць* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Заканамерна глупства на зямлі, / Як плодзяць глупства нават каралі* (Н. Мацяш. Маналог Казіміра Лышчынскага).

*Запісы, зацемкі, споведзі... Ратуй нас, натуральны сэнс, ад старэча-недалужнага стрыптызу, а тым больш – ад бяззуба-чорнай зласлівасці* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Заўсёды дурні лічаць дурнямі другіх, ды толькі не сябе* (П. Панчанка. Думаю, думаю...).

*Здрада, як і подласць, не прыходзіць нечакана* (А. Кудравец. Успамін пра шэршня).

*З жывых / Ніхто ўцячы ад болю, / Як ад Даўца жыцця, / Яшчэ не змог* (Р. Барадулін. Яшчэ ніхто...).

*Знай, што на кволенькіх падпорках / Хлусня будуе п'едэстал... / Прымай лепш праўды чэмер горкі, / Чым вечна – патаку пахвал* (А. Бачыла. Калі хоць раз жыццё імкліва...).

*Зубы выбілі ўсе – / не баліць, як няма зубоў* (П. Шруб. Магікане).

*І здраднік, / і забойца – / не дарадца...* (У. Скарынкін. Тры сустрэчы з Міхалам Глінскім).

*Казырнуў не яму, а партфелю* (А. Куляшоў. Грозная пушча).

*Калі ваша праца не атрымлівае адпаведнай ацэнкі, на тое ёсць дзве прычыны: ці то зайздрасць, ці то неразуменне* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Калі змовяцца несумленныя і зайздросныя людзі, дык можна на вельмі доўгія гады замоўчаць вялікі талент* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Калі слухаеш вельмі многа глупства, трэба мець розум не дадаваць яшчэ і сваё* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Камнем кідаюць пасля дружбы, / Пасля кахання і знявагі...* (М. Танк. Рэабілітацыя камня).

*Кожны добры позірк – набыццё, / а кожны злосны позірк – гэта страта* (А. Вольскі. І радасць набыцця...).

*Колькі нянавісці трэба, каб жыць! А жыць – каб ненавідзець?* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*К праўдзе ўвагі не знае, не чуе, / Як змяя, чалавечая злосць* (Я. Купала. Песня-казка).

*Мы дабратой залішняю грашым, / Яна ж гадуе нечую нянавісць* (А. Звонак. Перадбур'е).

*Навошта пра фальш мы праўдзіва гаворым?* (В. Акслава. Эпілог).

*Навучыўся казаць «благодарю» і «благадарыць» і калі трэба, і калі не трэба* (Я. Колас. «Дзеравеншчына»).

*На тое круча, / каб ведаць, як падаць уніз балюча...* (П. Шруб. Аксіёмы лесвіц).

*Нашто ты, хлопча мой каханы, / Украў яйцо з-пад япрука?* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Не аднаго на свеце мастака / Зазнайства загубіла. / Яно для таленту – магіла* (У. Корбан. Малады салавей).

*Не гіне род майстроў нажывы, /А я малюся аб адным: /Не дай мне, божа, стаць ілжывым, /Зайздросным, злосным і старым* (П. Панчанка. Даверлівая прастадушнасць).

*Не мае граніц людская злосць, і лёгка кінуць чорную пляму на добрае імя чалавека* (Я. Колас. З днеўніка пана Жылака).

*Не падсякай / Любові карані, / Не падмінай / У гневе сам самога* (Н. Загорская. Яшчэ не позна...).

*Нішто / так моцна / не апякае, / Як крыўды сляза!* (У. Карызна. Сляды).

*Няма горшай агіды, чым хвальба ў час чумы* (У. Ліпскі. Дай, божа, дзецям долю).

*Няма такой заплаты, што дае забыццё ад здрады* (Цётка. Шануйце роднае слова!).

*Нянавісць асляпляе відушчага і дае зрок невідушчаму* (Г. Марчук. Голас і слова. Афарызмы).

*Няўмысную крыўду грахом не лічу...* (У. Някляеў. Куліна).

*Няхай шалее ў злосці Мураўёў – / Не вечныя на свеце мураўёвы* (А. Бачыла. Думы Каліноўскага).

***П****акрыўдзіцца можна на таго, каго паважаеш* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Паслухаць вас, усе вы хваты! / А чуць да дзела – душа ў пяты!* (Я. Колас. Новая зямля).

*Паціху, злоснікі, паціху: / Ці перастуміце парог* (Я. Колас. Да 15-й гадавіны Кастрычніка).

*Першыя ўражанні крыўды ўчэпіста і доўга трымаюцца ў чалавечых пачуццях* (В. Быкаў. Жураўліны крык).

*Прывык ты чужымі рукамі / Выгортваць арэхі з агню* (Я. Колас. Адплата).

*Прыстасаванец цытату знойдзе, і занатуе, і дапасуе* (П. Панчанка. Думаю, думаю...).

*Прэтэнзій у яго хапіла б на слана* (К. Крапіва. Та-та-заяц).

*Самая страшная рэч – абыякавасць. Калі з ёй не змагацца, яна, як дрыгва, можа загубіць любога чалавека* (М. Танк. Лісткі календара).

*Сказаць: салгаў – не выпадае, / Паверыць – веры не хапае* (Я. Колас. Новая зямля).

*Спрачацца з дурнем, як тапіць сябе ў пустыні, / Дзе ані кропелькі жывой вады...*( В. Аколава. На ўроках Т. І. Навіцкай).

*Спрачацца з цынікам – як неба разгаворваць* (В. Аколава. Апраўданне вясны).

*Сцеражыся злосці нечай – / яна зневажае* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

*Сэрца чалавечае / Не можа жыць у вечнай весялосці. / Не ные толькі сэрца бессардэчнае, / Счарсцвелае*

*ад зайздрасці і злосці* (Н. Гілевіч. А дзе ж тая крынічанька?).

*Тады народ лічы аблудным, / Калі народзіцца Іуда, / І стане спрытна, бы штукар, / І метадычна год за годам / Чужынцам прадаваць тавар – / За медны грош – душу Народа* (Э. Акулін. Шлях да Радзімы).

*Там, дзе пачынаецца абыякавасць, там недалёка гібель* (К. Чорны. Пошукі будучыні).

*Той, хто хутка купляецца, хутка і прадаецца* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Толькі воля не ведае здрады* (В. Жуковіч. Ты прыгожая, маладая...).

*Ты маеш, значыцца, хаўрусы / І ў адной чарцы мочыш вусы* (Я. Колас. Новая зямля).

*У болю людскога і вясны / ёсць рыса адна агульная – / раптам загінь абсяг зямны, / запоўніць сэрца чуйнае* (А. Вярцінскі. Святло зямное).

*У выхвалякі ўсе сны каляровыя* (Г. Марчук. Голас і слова).

*У злога гаспадара – / заўсёды злы сабака* (А. Пісьмянкоў. Некалі ў школьным юнацтве...).

*У злога царкоўнага старасты і мышы злыя – свечкі ядуць* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Узяць адною рукою два гарбузы адразу – якая гэта назойлівая мара ўсіх хапуг і гультаёў* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Упадае ў сэрца, / З сэрца выплывае / Любові / І нянавісці рака...* (Н. Загорская. Нашто табе...).

*У свеце / Перанаселенасць на боль* (Я. Сіпакоў. Сядзім, смяёмся за сталом...).

**Х***ай вочы есць / папрокаў дым / усім іудам маладым!* (В. Жуковіч. Усім іудам).

*Хай помніць кожнае ліслівае цяля, / Што можна ссаць, ды можна й абассацца* (К. Крапіва. Ліслівае цяля).

*Хай схлусіць хітры рот. Вачамі – не падманіш* (Я. Янішчыц. Прызнанне вачамі).

*Хваліўся збан, што носіць воду, / Але забыўся на слупкі* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Хібам нашым ёсць апраўданне, / подласці апраўдання няма* (А. Вярцінскі. «Чалавек маленькага росту...»).

*Хоць ты і важным пеўнем стаў, / На індыка не надта кукарэкай!* (А. Звонак. Певень і індык).

*Хоць шляхціц цёмны, як саган, / Затое ж сам сабе ён пан* (Я. Колас. Новая зямля).

*Хто ганарлівы, той і зайздросны* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Хто навучаны болем – маліцца часцей – / І маленькаму шчасцю быў радасна рады* (В. Аколава. Я ў чужыя двары не ішла цікаваць...).

*Хто прывучаны ў здрадзе / душою крывіць, / Апраўданню свайму / той шукае прычыны* (А. Бачыла. Жанчынам).

*Хто хоча забіць сабаку – вінавеціць яго ў шалу* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім).

**Ч***амусьці ўсе бяздарныя лічаць сябе несмяротнымі. А можа яны і маюць рацыю, бо, як вядома, чалавечае глупства – вечнае* (М. Танк. Лісткі календара).

*Чарнобыль сягоння – / Везувій сусветнага болю* (В. Гардзей. Зялёныя шаблі аеру...).

*Часамі мана – апраўданне... Бывае і ў праўдзе лухта* (Д. Бічэль-Загнетава. Ты – гэта ты).

*Чорным вокам здрада гляне – / маладосць, як ружа, вяне* (В. Аколава. Случарынкі).

**Я***шчэ так не было на свеце, / Каб Іуда кончыў, як чалавек, жыццё* (М. Танк. Нарач).

## «САГРАВАЦЬ УСЁ Ж УМЕЮЦЬ РЭЧЫ»

### Матэрыяльнае ў чалавечым жыцці; здабыткі і страты

**А** *ты, Янка, не зважай / На кажух падраны!* (Я. Колас. Песня п'янага).

*А што ў застоллі – кіраванне? / Сачы, каб чуўся чарак звон!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

**Б***адай не кожная рэч мае два бакі: паказны і праўдзівы* (Я. Колас. Адзінокае дрэва).

*Галеча / Цябе ачышчае, / Спакой прасвятляе* (А. Разанаў. Гліна).

*Грошы – дробязь. Улада даражэй за ўсякія грошы* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Ёсць рэчы, якія словы толькі разбураюць...* (Я. Сіпакоў. Свята).

*Ёсць флюгеры, якія ловяць толькі «высокі» вецер. Нізкі, нават самы моцны, іх нібы не датычыцца – ён абцякае іх, і яны стаяць, нават не зварухнуўшыся* (Я. Сіпакоў. Натаденне смагі).

*Зайздросная гэта якасць – надаваць духоўнасць, асэнсаванасць рэчам* (М. Стральцоў. Вясёлка і стрэчны вецер).

*Заможныя дыванoў не выбіраюць* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Калі чалавеку шанцуе, гэта ў першую чаргу заўважае кішэня, і калі не шанцуе – гэтаксама «адценьваецца» на кішэні* (А. Разанаў. Кішэня).

*Нашы здабыткі і страты не маюць нейкай паасобнасці ці непадзельнай з намі цаны* (М. Стральцоў. Волька).

*Пакуль не шукаю ратунку – не маю страты* (А. Разанаў. Вастрыё стралы).

*Пасля нас не плачуць нашы рэчы, / Рэчам трэба некаму служыць* (К. Камейша. Пра рэчы).

*Рэчы – апошняе цела людзей, якое жыве найдаўжэй* (А. Разанаў. Рэчы).

*С*а*граваць усё ж умеюць рэчы, а маўчаць, бо не пытаюць іх* (Е. Лось. Калі б рэчы гаварыць умелі...).

*Т*а*емнасць першасных перапляценняў / мы спазнаём у стратах, спакваля* (М. Арочка. Таемнасць першасных перапляценняў...).

*Тое, што без цяжкасці атрымана, – / Без цяжкасці душэўнай / Аддаюць* (А. Бачыла. Я не пішу...).

*Той да прысмакаў не ласы, / Хто на нішчымніцы рос...* (С. Законнікаў. Дома).

*Э*х*, маці-печ! ты – рай нябесны / І найпатрэбнейшая рэч* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Я*к *ні задзіраюцца сані насамі – / Не зрабіцца ніколі коламі палазам* (Р. Барадулін. Лыжка драмаць не павінна ў дармовым супе...).

*Як цяжкі груз на нас зваліўся / Раней не знаны дабрабыт* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Я печ на рай не памяняю* (Я. Колас. Новая зямля).

## «НАМ КРАЙ НАЛЕЖЫЦЬ, ПАКУЛЬ ЗЗЯЮЦЬ ЗОРЫ»

Радзіма, родны край, Бацькаўшчына; патрыятызм

*А*й*чыны б паветра ўзахлёб, / на ўвесь рот, / І матчынай мовы акраец* (С. Законнікаў. Свабодна і лёгка ліюцца ў душу...).

*А калі не співаць аб Радзіме, / Дык навошта наогул співаць?* (Г. Бураўкін. Я не ганю землі чужыя).

*А мне мой кут – навечна Мекка, / Ды і Галгофа разам з тым* (П. Броўка. Мой кут нічым не адмысловы...).

*А там, за светам, на чужыне / Ніхто цябе, ой, не прыхіне !* (Я. Колас. Новая зямля).

*Ах, людзі, людзі.../ Мы ў адказе / За невялічкую Зямлю* (П. Броўка. За ўсё даражэй...).

*А я – твой сын, ад косці тваёй косць, / Кроў ад крыві тваёй, мая Айчына* (С. Дзяргай. Родная мова).

**Б***ез каранёў вялікіх не бываць / Вялікім дубу, хоць з пароды й гэтай!* (Н. Мацяш. Алёша з Доўбуні).

*Без радзімы мы ўсе, хоць на волі, а ўсё ж / у няволі* (Я. Сіпакоў. Настальгія арабінкі).

*Без радзімы народа няма, / Без народа няма Радзімы* (Р. Барадулін. Ураджай, недарод...).

*Быццам недзе ёсць зямля / Больш лячэбная, / Як радзіма* (М. Танк. Мне смешна, калі гавораць).

*Быць шыпшынаю шыпшыне, / Пакуль зямлі трымаецца карэннем* (Н. Мацяш. Шыпшына).

**В***ерай і праўдай / надзеі служы / і жыві, / Помнячы вечна, / што ёсць і табе вымярэнне – / Кропля аддадзенай справе Айчыны / крыві* (С. Законнікаў. Ля помніка Шандару Пецёфі).

*Вечарамі на чужых узгорках, / Дзе чужыя кветкі між травы, / Як нам не хапае родных зорак / І салодкіх ветраў баравых* (Г. Бураўкін. Вечарамі на чужых узгорках...).

*Бідаць, / няма бальчэй пакут, / Чым шкадаваць да скону, / Што не вярнуцца ў матчын кут, / Хоць позна, / ды з паклонам...* (С. Законнікаў. Бацькаўшчына).

*Галоўнае – / З зямлёй бацькоўскай сувязь, / Што б ні было, трывалай зберагчы* (С. Законнікаў. Урбаны).

*Дадому!.. Дахаты!.. Як доўга не гіне / Гук слоў гэтых простых на дальняй чужыне* (М. Танк. На хвалях акіяна).

*Дамоў заўсёды ісціна вядзе. / Яна – напаўзабытая дарога* (А. Сербантовіч. Дамоў заўсёды ісціна вядзе...).

*Да скону пчолам бараніць свой вулей, / Свой спадак працы, сонца і дажджоў* (Н. Мацяш. Тры каласкі любові і смутку).

*Дзе воўк урадзіўся, / Яму куст той мілы* (Я. Купала. З песень аб сваёй старонцы).

*Дзе карані – жыццё красуе!* (У. Карызна. Трыялет).

*Дзе пахавана твая маці, там і радзіма* (Г. Марчук. Голас і слова. Афарызмы).

*Дзе прайшло маленства, там пачынаецца Радзіма* (К. Чорны. У імя будучыні).

*Добры агонь на чужыне, / Толькі грызе вочы дым* (М. Танк. Добры з ваўка музы́ка).

*Дома суха і ў багне, / На чужыне й на ўзгор'і гразка* (Р. Барадулін. Пілнавацiся кожны мусіць...).

*Дома сцены памагаюць, / Што ж казаць пра берагі* (А. Пісьмянкоў. Змрочны ранак...).

*Дом – крэпасць. / Бацькі – крылы. / Дзяды – падмурак крэпасці. / А калі няма ні крэпасці, ні падмурка, ні крылаў?* (У. Ліпскі. Дай, божа, дзецям долю).

*Другу баліць – мне нялёгка, / Маме баліць – вельмі цяжка, / Сыну баліць – невыносна, / А Радзіме баліць – / Стыне сэрца ад болю* (Н. Загорская. Другу баліць – мне нялёгка...).

*Дрэву перасаджанаму гола / У чужой маркоце й ціпыні. / Хай галіны й зашумяць вясёла, / Сумна дол свой / Помняць карані...* (Р. Барадулін. Гола...).

*Ёсць куток на зямлі: / Дзень адзін пражывеш – /Назаўсёды цябе зачаруе* (М. Танк. Казка пра музыку).

*Ёсць Радзіма – і ёсць бяссмерце, / Мова ёсць – не загіне сям'я* (В. Зуёнак. Двор без мамы – народ без мовы...).

*Ёсць у мяне адзін запас трываласці – / Зямля дзядоў, дзе нашы карані* (С. Законнікаў. Кульмінацыя).

*Забудзе таго краіна, / Хто ёй у бядзе не памог... / Таго ж будзе помніць, як сына, / Хто славу Айчыны бярог...* (І. Ралько. Не родзіцца мудрае слова...).

*Залатую расінку ў голасе / Толькі родная дасць / Зямля* (М. Арочка. Сяргею Дзяргаю).

*Запытай ты сябе, чалавеча: / Што зрабіў для айчыны, ці многа?* (Я. Колас. Запытай ты сябе, чалавеча).

*За якімі замор'ямі / Долю ні сватай, / На чужыне й яблокі / Цвярдымі крушнямі. / Неба роднае / Толькі над матчынай хатай* (Р. Барадулін. За якімі замор'ямі...).

*З радзімак тых складаецца / Радзіма, / Але радзімка ў кожнага – свая* (Р. Барадулін. Планета ўся ў радзімках родных стрэх...).

*Зямлёю, вышыня, не пагарджай* (П. Макаль. Сяўба).

*Зямля, дзе ўсе жывуць адной сям'ёй, / Дзе ваяваў Вячко, дзе жыў Вашчыла, – / Не можа быць пахілаю рабой* (У. Караткевіч. Зямля дзядоў).

*Зямля – кладоўка з залатым дабром, / Якую адмыкаеш ты, араты, / Каб людзям скарбы аддаваць суздром, / Ахвярна забываючы на страты* (П. Макаль. Ворыва).

*І ва ўсіх нас ёсць Радзіма, / Што імёны нашы помніць* (М. Танк. Эпітафія).

*І дзе б ні жыў – / Душа вядзе туды, / Дзе родныя нябёсы і клады* (Р. Барадулін. Ксты).

*І мне прадаць бацькоўскі дом, / Нібы прадаць сваю Айчыну* (У. Скарынкін. Я не прадам бацькоўскі дом).

*І пакуль нада мной наша роднае неба – / Аніякі мяне не палохае лёс* (А. Бачыла. Да маці).

*Каб за край быў умерці гатоў, / Каб не прагнуў айчызны чужых* (Ф. Багушэвіч. Ахвяра).

*Калі пакідаеш Радзіму, / Становяцца снамі / І людзі і сосны...* (М. Танк. Калі пакідаеш Радзіму)

*Карцінам трэба, як і людзям, / Жыць на сваёй святой зямлі* (П. Панчанка. Амерыканскія музеі).

*Каханне, грошы, славы сверб – мана: / Няўмольны час завабіць імі сэрца, / Памучае, а потым насмяецца, – /*

*Не здраджвае Радзіма нам адна* (А. Мінкін. Каханне, грошы, славы сверб – мана...).

*Кінь вечны плач свой аб старонцы!* (М. Багдановіч. Кінь вечны плач свой...).

*Кожная птушка ў сваё гняздо вяртаецца з выраю. / Кожны бадзяга-звер знаходзіць сваю бярлогу. / Кожная рыба свайго трымаецца віру. / Дык ці ж магу я забыцца матчынага парогу?* (Г. Бураўкін. Скарына).

*Кожны мае свой бор, / родны бор на зямлі...* (А. Куляшоў. Маё сэрца ў бары).

*Куды б ні выносілі думы, / Айчыны абрыс не згублю. / Тады прачынаецца дужасць, / Як зерне трапляе ў раллю* (С. Законнікаў. Кульмінацыя).

*Куды б цябе ні завяла дарога, / Не забывай бацькоўскага парога* (П. Броўка. Парог).

*Куток, дзе ты першае слова сказаў, / малым называцца не можа* (В. Жуковіч. Малая радзіма...).

*Лёгка быць смелым і сумленным, калі пад нагамі не твая зямля, калі за спіною няма радзімы* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Любіць зямлю! І не наогул, / А – гэту! Нашу! Дзе жывём!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Любіць Радзіму да скону, / так, / Як любяць расліны – сонца* (Л. Рублеўская. Настаўнік).

*Любіць Радзіму ў светлыя і радасныя дні высакародна. Але яшчэ болей высакародна любіць Радзіму тады,*

*калі ёй цяжка, калі гэтая любоў небяспечная* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

*Людзі! / Так па зямлі ступайце, / Як ля калыскі маці, – / Безабаронная наша зямля, / Нібыта сон дзіцяці...* (С. Законнікаў. Людзі!..).

*Можна ўсё: пусціць каханне дымам, / Ўзяць і занядбаць мінулы шлях. / Але толькі – не любіць Радзімы / З чорнаю павязкай на вушах, / З чорнаю павязкаю на вуснах, / З чорнаю павязкай на вачах* (У. Караткевіч. Можна ўсё: пусціць каханне дымам...).

*Мой Край, на шырокім заблытаным свеце / ты мне наймілейшы, бо родны, бо свой* (Л. Геніюш. Чужына).

*Мой родны кут, як ты мне мілы!..* (Я. Колас. Новая зямля).

*Мы вяртаемся, – / і ў гэтым ты і ёсць, / Айчына* (К. Кірэенка. Мы вяртаемся...).

*Мы за цябе яшчэ не паміралі, / Мы для цябе, Радзіма, будзем жыць* (В. Вярба. Я не глытала па акопах дыму).

*Нават страціўшы зрок, / Абыду я паўсвету, / А да родных мясцін шлях заўсёды знайду* (П. Броўка. Байцам-беларусам).

*На гонях родных / Рунь рунейшая* (Р. Барадулін. Чужыя ідалы халодныя...).

*Нам край належыць, пакуль ззяюць зоры* (А. Александровіч. Цені на сонцы).

*Настальгія, як рана, запаўняе збалелыя грудзі / Дрэвам і людзям* (Я. Сіпакоў. Настальгія арабінкі).

*Не буду мяняцца, хоць бы і на за́мкі, – / Калок свой мілейшы, як чужыя клямкі* (Ф. Багушэвіч. Мая хата).

*Не загіне край забраны, / Покі жывы людзі!* (Я. Купала. «Нашай ніве»).

*Не мяняй свой кут на прастору чужую, / У прасторы чужой птушка гнёзды не ўе, / Пі ваду са свайго вадазбору і тую, / Што цячэ дамавіта са студні твае* (Р. Барадулін. Не мяняй свой кут на прастору чужую).

*Не прадайце за цёрты долар / Край, які вам з маленства дораг./ Знайце: новаму не бываць. / Вам у свеце тады – / Бамжаваць* (М. Мятліцкі. Як валошку-сінечу ў жыцці).

*Не трэба нам за трыдзевяць зямель, / Вада жывая – у старонцы роднай* (А. Жыгуноў. Яшчэ пацешыць вока журавель...).

*Не хоча, не стане, не будзе / Айчына царквой на крыві!* (Е. Лось. Аруць – ажно лемех бліскучы...).

*Не цяплее душа / Ля цяпельца чужога, / Каласіцца туга / На чужой араллі* (Р. Барадулін. Пілнавацісяі кожны мусіць...).

*Не шукай сабе, мой братку, /З ветрам Бацькаўшчыну-матку* (Я. Купала. Не шукай...).

*Не шукай ты шчасця, долі / На чужым далёкім полі* (Я. Купала. Не шукай...).

*Ніколі Радзіма не спіша / у бестэрміновы запас* (А. Вялюгін. Песня пра Кірылу Арлоўскага).

*Ні славы, ні скарбаў я не хачу, / Мне б толькі прайсці непрыкметна, / Зямлю сваю пад нагамі адчуць, / Надыхацца родным паветрам* (П. Панчанка. Краіна мая).

*Ніхто з нас бацькаўшчыны не выбірае, / Як не выбірае маці ў жыцці* (Л. Геніюш. Бацькаўшчына, зямля дарагая...).

*Няма Радзімы ў злыдняў хіжых / І Маці ў нелюдзяў – няма* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Няма раднейшага, чым родны кут* (П. Броўка. Бацькоўскі кут).

*Няма таго зелля, / Што хоць на міг ад тугі па Айчыне вылечвае* (Г. Бураўкін. Скарына).

**О***, краю мой! Шчаслівы лёс – плаціць любоўю, / Табе і жыць – адною ёй* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*О, радзіма, мой светач цудоўны, адзіны, / Явар мой, мой агністы снягір на сасне...* (У. Караткевіч. Снягір).

***П****акінуць радзіму – цяжкое злачынства* (М. Лужанін. Ка́ра часу...).

*Пакуль дыхаю родным дымам, / Мне пад небам маім нязмрочна, / Як за пазухай у радзімы, / Як народжанаму ў сарочцы* (А. Пісьмянкоў. Дзень на радзіме).

*Памажы, ойчы кут, / Твайму плыўцу у шторме жыцця / Даплысці да высокага берага мэты* (М. Арочка. Камоэнс).

*Патрыятызм – гэта ўпрыгожванне радзімы талентамі і справамі* (Г. Марчук. Голас і слова. Афарызмы).

*Прызнавацца Радзіме ў сваёй любові да яе трэба ціхім, сціплым і нават крыху сарамлівым голасам – такім, якім прызнаюцца ў сваіх самых цнатлівых і непапраўных пачуццях. Інакш нельга. Інакш яна, Радзіма, падумае, што ты і сам у такое не верыш і крычыш так толькі таму, каб пераканаць у гэтым усіх, а заадно і самога сябе* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

**Р***адзіма ж, ты сёння і потым, / На заўтрае і на Святое!* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

*Радзіма – / Не толькі дом, а і клады́* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Радзіма пачынаецца з жанчыны* (А. Сыс. Радзіма пачынаецца з жанчыны...).

*Радзіма, стой, як горды ўцёс* (У. Караткевіч. Радзіме).

*Радзімы без Апостала няма* (Р. Барадулін. Прыгадваю гарыстыя Бычкі...).

*Радзімы вялікай / Няма без малое* (У. Мазго. Малая радзіма).

*Родны край ніхто не выбірае, / Выбірае родны край цябе* (Р. Барадулін. Пакора).

*Родны край сыноў не дакарае – / Па-бацькоўску кожнага шкада* (Р. Барадулін. Пакора).

*Рукі крыжам – хто ўгневіць Радзіму!* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

**С***ваю Айчыну ўбач і зразумей, / І ў ёй сябе ты зразумееш потым* (Л. Тарасюк. Імя Айчыны).

*Спакон вякоў для селяніна / Няма на свеце дзвюх радзім* (А. Вольскі. Вёска і вяскоўцы).

*Спрачацца з радзімай – / як агнямі па зорах халодных вадзіць* (В. Аколава. Дарожны эпілог).

*Сягаючы імкненнямі высока, / Не забывай пра карані* (С. Законнікаў. Дарога ўцякае паланянкай).

*Тое месца, дзе ронім мы першыя слёзы і пакідаем частку саміх сябе, становіцца дарагое для нас* (Я. Колас «Дзеравеншчына»).

*Той шчаслівы да скону, хто жыў / На зямлі на нашай зялёнай!* (Я. Сіпакоў. Мой агонь пастарэў на год...).

*Той шчаслівы і самы багаты, / Хто любімай Радзіме не госць* (М. Хведаровіч. У час вячэрні).

*Толькі любоў да Радзімы нам зброя* (Л. Рублеўская. Першым беларускім вандроўным тэатрам).

*Толькі страціўшы Радзіму, / Будзеш, як камень, / Сляпы і глухі* (М.Танк. Аслепшы).

*У кожнага быць павінна / Свая баравіна* (П. Панчанка. Баравіна).

*Усё ж пазнáеш і па ўдарах сэрца, / Дзе наша, дзе чужая старана* (М. Танк. Граніца).

*Хто адцураўся маці-Айчыны, – / Мовы яе той нават – баіцца* (А. Грачанікаў. Чорная навука).

*Хто гэта знае: чаму на чужыне / Вецер у вочы дзьме пылам заўсёды* (М. Танк. Хто гэта знае...).

*Хто раней, / хто пазней, / Толькі ўсе / Зноў і зноў / Мы прыходзім / Да простых, / як хлеб і паветра, / Высноў: / Што жыццё чалавеку – / Любому – / Даецца адно, / І што, / як ні надточвай, / Кароткае вельмі яно, / І што праўда на свеце / Адна – / Без крупінкі маны, / І што шчасця на свеце / Няма / Без сваёй стараны...* (Г. Бураўкін. Хто раней...)

***Ч**асам сыходзіць у зямлю крыніца, / Дзесь у нетрах таёмна бяжыць, / Але мусіць урэшце на волю прабіцца, / Шмат яшчэ па зямлі будзе ліцца-каціцца / І радзімаму краю служыць* (М. Багдановіч. Каганцу).

*Чужое неба сэрцу не дагодзіць, / душы не загадае: «Не балі...»* (Е. Лось. Куды паеду ад палян духмяных).

*Чужое неба шчасця не дае* (Н. Мацяш. Разлука).

*Чым больш свайго сцураўся-зрокся, / Тым больш сучасны, вертапрах!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

***Ш**лях да Айчыны адусюль кароткі, / Калі твая Айчына не міраж* (А. Кудравец. Познія яблыкі).

*Шукаем сцежак невядомых, / Чужыя топчам бальшакі. / А песні нас чакаюць дома, / Ля цёплай матчынай шчакі* (Г. Бураўкін. Мы дома песень менш знаходзім...).

*Шчасця большага няма ў зярняці, / Як на ніве роднай прарасці* (В. Таўлай. Якуб Колас).

***Я**к лёгка і проста хваліць і ўзвышаць усё чужое, і як цяжка і небяспечна заступацца за сваё, роднае...* (Я. Сіпакоў. Яма).

*Як цуд чужых вачэй ні цешыў, / Душа шаптала мне сама: / Ёсць край цяплейшы, багацейшы, / Але радней-шага няма* (Г. Бураўкін. Купала).

*Я меў няшчасце / ў гэтым краі нарадзіцца, / Ды, дзякуй Богу, / маю шчасце тут памерці* (А. Бадак. Як хораша душы...).

*Я супраць арфаграфіі грашу, / І з літары вялікае пішу: / Радзіма* (М. Мятліцкі. Дыялог).

## *«БЕЛАРУСЬ ПАД МАЛІТВАМІ БОГА»*

### Радзіма; нацыянальныя сімвалы і рэаліі

***А** глянеш навокал – такая краіна: / дзе ступіш – то рэха, то казка, быліна...* (М. Танк. Казка пра Мядзведзя).

*А хопіць і куточка Беларусі, / Каб цэлы век свой да яе ісці* (Н. Мацяш. Шчэ не журуся я па хараστве...).

***Б**елай Краіне не згінуць парожняй– / абарані ад бяспамяцтва, Божа!* (А. Хатэнка. Дзедава субота).

*Беларуская гасціннасць упартая, неадступная, недалікатная і таму можа здацца навязлівай, калі не адчуць у ёй шчырасці і сардэчнасці, шырыні душы...* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Беларускі народ – не паперкі, / Не духоўны сляпенькі туман* (В. Аколава. Да Фёдара Янкоўскага ў госці).

*Беларускія мудрыя кнігі не замкне палітычны замок!* (В. Аколава. Да Фёдара Янкоўскага ў госці).

*Беларусу і ў Парыжы сняцца / белізна бяроз і сосен медзь* (П. Панчанка. Недзе салавей пяе ў дуброве).

*Беларусь аб сусвет не парань...* (В. Аколава. Да Фёдара Янкоўскага ў госці).

*Беларусь адродзіцца Вераю* (Р. Барадулін. Вераю).

*Беларусь – мая маці і мова, паветра і хлеб* (А. Вялюгін. Прызнанне ў любві).

*Беларусь пад малітвамі Бога! – / Не з калодай раскіданых карт* (В. Аколава. Да Фёдара Янкоўскага ў госці).

*Беларусь перад усім!* (М. Скобла. Зэльвенская каса ў музеі Максіма Багдановіча).

*Беларусь – ты мой сон велікодны, / Сон, што сніцца анёлам вясной* (Р. Барадулін. Беларусь – ты мой сон велікодны.).

*Беларусь утрымалася вераю* (Р. Барадулін. Вераю).

*Божа, / Адвядзі ад Беларусі / Здраду, / Вераломства / І вайну* (Г. Бураўкін. Малітва).

*Божа, / Захіні маю Радзіму/ Мудрасцю, / Спакоем / І цяплом* (Г. Бураўкін. Малітва).

*Больш за сябе я Беларусь люблю / І ёю з нараджэння ганаруся. / Праб'е мой час, / як Каліноўскі праз пятлю, / Я нізка пакланюся Беларусі* (С. Грахоўскі. Больш за сябе я Беларусь люблю...).

*Бо толькі недзе там, за родным Бугам сінім, / Вятры такія, што асушаць слёз паток...* (М. Танк. Рэпатрыянты).

*Будзе жыць Беларусь, / таму што ў прызначаную пару / сыдзе з крыжа Хрыстос* (Л. Рублеўская. Балада пра драўлянага Хрыста).

*Быць беларусам – / Гэта значыць, / Вясёла з сумнай долі кпіць, / Да Бога сцежку верай значыць, /Нагбом з карца надзеі піць* (Р. Барадулін. Быць!).

*Быць беларусам – / Гэта значыць, / За родны край згараць на дым, / Па-беларуску чуць і бачыць / На гэтым свеце і на тым* (Р. Барадулін. Быць!).

*Быць беларусам – / Гэта значыць, / Свайго ні гуку не забыць, / Усё чужое перайначыць, / Каб Беларусі вечнай быць* (Р. Барадулін. Быць!).

***В**ярні нам Бацькаўшчыну нашу, Божа, / Калі ты Цар і неба, і зямлі!* (Я. Купала. Цару неба й зямлі).

***Г**рыбоў няма ў Булонскім лесе, / А ў Сене – хоць бы адзін лешч* (К. Крапіва. Інтэрв'ю Якуба Коласа).

***Д**ай мне, зямля, яшчэ раз прарасці / над Нёмнам тваёю надзеяй.* (Л. Геніюш. Час пазрывае галіны з камля...).

*Для каханае нашай Радзімы / й найдарожшых ахвяр не замнога* (Л. Геніюш. Спатканне).

***Ё**сць Беларусь і будзе, / покуль / ёсць / мы!* (Е. Лось. Ля мора, дзе воблакі-гусі...).

*Ёсць замест прыватнай неўміручасці – / Бессмяротнасць нацыі тваёй* (У. Караткевіч. Бог пайшоў. Жыццё ідзе пад кручу... ).

*Жыві, наш край! Няхай надзея / Гарыць у сэрцы і мацнее* (Я. Колас. Новая зямля).

*Зайздрасць радзімай – не знак беларусаў* (В. Аколава. Малюнкі словам).

*З веку – княжая слава ў беларускіх мужчын* (В. Аколава. Падарожнікі лёсу).

*З веку – любасць князёва ў беларускіх мужчын* (В. Аколава. Падарожнікі лёсу).

*З веку – мудрасць князёва ў беларускіх мужчын* (В. Аколава. Падарожнікі лёсу).

*І дзе на свеце ёсць такая, / Як Нёман, рэчачка другая?* (Я. Колас. Новая зямля).

*І мы ў палатах Гадунова / Аб Беларусі скажам слова* (Я. Колас. С. Гарадзецкаму).

*І скарб твой* [Беларусь] *лепшы – слова, звычай...* (Я. Колас. Да 10-й гадавіны БССР).

*І толькі на цябе надзея, / Край родны мой!* (М. Багдановіч. Даўно ўжо целам я хварэю...).

*І тчэ, забыўшыся, рука, / Замест персідскага узору, / Цвяток радзімы васілька* (М. Багдановіч. Слуцкія ткачыхі).

*І хай з тысяч рэк чужых нап'юся – / Толькі для апошняга глытка / Я прыйду сюды, / да Беларусі, / Да свайго азёрнага кутка* (Г. Бураўкін. Што ты так прыкуты да Радзімы?..).

*Каб над намі зямля паплыла, / Каб вятры захадзілі над намі, – / Трэба верыць у сілу крыла / І абняць Бела-*

*русь крыламі* (Я. Сіпакоў. Варта ў крылы паверыць свае...).

*Калі за Беларусь аддаць жыццё / Святыя клічуць – буду не староннi* (Н. Гілевіч. «Паланэз» Агінскага).

*Калі і ёсць на свеце рай, / Дык ён – / на Беларусі!* (С. Законнікаў. Бацькаўшчына).

*Кім быць на свеце беларусу, / Цяпер залежыць ад яго* (Г. Бураўкін. Я прычакаў агнёў свабоды).

*Куды не трапяць беларусы?* (Я. Колас. Новая зямля).

*Лёгка жыць і верай быць відушчым, / Покуль на ўзбярэжжы сіняй пушчы / Зорыцца акно бацькоўскай хаты* (С. Законнікаў. Хата).

*Люблю непаўторны свой род / І яго анідзе не зракуся, / Як бы лёс не падгорчываў мёд/ Прыналежнасці да Беларусі* (Н. Мацяш. Адказ «Першацвету» на ягоную анкету).

*Люблю цябе такой, якая ёсць, / Зямля мая, зямля бацькоў святая, – / Мая слязінка – са святла наскрозь, / Маё прычасце, мой святлісты лёс... / З табой і паміж бедаў я світаю* (Н. Загорская. Мае ўсе думы звязаны з табой...).

*Маркотна мне без Беларусі* (Я. Купала. Крым).

*Мне бацькаўшчынай цэлы свет, / Ад родных ніў я адвярнуўся.../ Адно... не збыў яшчэ ўсіх бед: / Мне сняцца сны аб Беларусі!* (Я. Купала. О так! Я – пралетар!).

*Мне Загібелька лепш Парыжа* (Я. Колас. Загібелька).

*Мой брат беларус! Тваёй сіле, / Цярпенню твайму пакланіцца* (Я. Колас. Адплата).

*Мой родны кут, як ты мне мілы!..* (Я. Колас. Новая зямля).

*Мы – беларускі лёс, / Покі сумленне ёсць* (А. Глобус. Беларускі рух).

*Мы – тройчы дзеці ў вечным крузе: / Мы – дзеці роднае сям'і, / І – дзеці Маці-Беларусі, / І – дзеці Матухны-Зямлі* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*На Беларусі Бог жыве, – / І няхай давеку жыве* (У. Караткевіч. «На Беларусі Бог жыве»).

*На беларускую дзяўчыну / Ніхто йшчэ каменем не кінуў / І не паважыцца кідаць* (Я. Купала. Магіла льва).

*Навек астанешся ты песняй няспетай, / Мая Беларусь* (А. Бачыла. Ёсць дальнія землі, там вечнае лета).

*Наш Край зляжыў даволі ўжо ахвяраў, / каб вынесціць і ўбачыць свет зары!..* (Л. Геніюш. Як хмарны дзень).

*Не адрокся Бог ад Беларусі* (В. Аколава. Мальер на мінскай Камароўцы).

*Не бядней мы за славутыя еўропы, – / проста надта заклапочаны народ… / Нам баляць усе патравы і патопы, / і шкадуем мы сябе на ўсякі зброд* (Е. Лось. Позна вечарам у горадзе пустынна…).

*Не вернеш / Адданасць пад прымусам. / Ды веру ў сілу зерня, / Што ў душах беларусаў* (С. Законнікаў. І ўсё ж – веру).

*Не вырвеш з нас жывую нашу душу /Бы з дзяснаў слабых набалелы зуб, / Бо мы народ вялікі, непарушны, / Народ, што да зямлі прырос, як дуб* (У. Караткевіч. Зямля дзядоў).

*Не знішчым мы, не страцім, / не загубім / Сваіх азёр, лугоў, сваіх лясоў / І родны край і мову не разлюбім* (В. Гардзей. Мая граматыка).

*Не трэба нам за трыдзевяць зямель, / Вада жывая – у старонцы роднай* (А. Жыгуноў. Яшчэ пацешыць вока жураўель...).

*Не шукай сабе, мой братку, /З ветрам Бацькаўшчыну-матку* (Я. Купала. Не шукай...).

*Няможна жыць, / Зусім няможна жыць без Беларусі* (Г. Бураўкін. Ты, помніш, мне казаў...).

*Няўжо я, дзівак, спадзяюся / Другую радзіму адкрыць, / Як быццам бы без Беларусі / Змагу я і дыхаць і жыць* (М. Танк. І чым ты так вабіш, не знаю...).

**О** *Беларусь! Ты – сэрца і душа, / Нутра зямлі багаты клунак* (Я. Колас. Найдаражэйшы падарунак).

*О Беларусь!.. / Я нарадзіўся ў тваёй хаце, / І лёс мне суджаны адзін: / Ты мне не мачыха, а – маці, / І я – заўжды твой родны сын!* (М. Гіль. О Беларусь!..).

*О, як дажыць хацела б я / Да дня, калі змагу без болю / Аб Беларусі запяяць!* (Н. Мацяш. Лаўлю чорнага ката́ ў чорным пакоі).

***П**окуль век / нітку часу / маўкліва прадзе, / Абрываць не збіраецца ў скрусе, – / І смяецца, / і плачацца так, / як нідзе, / У далонях маёй Беларусі* (С. Законнікаў. Зарыпіць сініх зорак у небе жарства ...).

***С**купая зямля маёй Беларусі / Не раджала рабоў і не мела рабоў* (У. Караткевіч. Буслы вучаць дзяцей).

*Столькі зведаўшы гора, нягод, / Столькі слёз, і крыві, і агню – / Беларусь, ты на тысячы год / Заслужыла сабе цішыню* (Н. Гілевіч. А раніцы ўжо не было).

***Т**ы мой шлях круты, / ты мой боль святы, / Беларусь мая, / мой алтар.* (Л. Геніюш. Маці мая сялянская...).

***У** выраі далёкім / Аднаго для птахаў не стае – / Тых дубоў, / наднёманскіх, высокіх, / Дзе ім трэба гнёзды віць свае* (М. Арочка. Недзе на зялёнай пойме Ніла).

*Усю Беларусь – неаб'ятну, як мора, убачыць у ясным, як сонца, святле* (Я. Купала. Песня мая).

***Х**ай Беларусь, мая старонка, /Ускрэсне к лепшаму жыццю!* (Я. Купала. Хрыстос васкрос).

*Хай славіцца наш беларускі род, /душой з вясны і воляю са сталі, / каб з гнёздаў нам не пеўнікі на плот, / а горда арляняты вылятালі!* (Л. Геніюш. Хай славіцца наш беларускі род...).

***Ш**то мне Вена, Мадрыд, што мне / Лондан туманны, / Больш за ўсё я бацькоўскаму краю / адданы!* (В. Дунін-Марцінкевіч. Благаслаўлёная сям'я).

***Я** й стагоддзем Вам пакланюся: / Мова. Матуля. Мінск і Няміга* (В. Аколава. Малюнкі словам).

*Якая Беларусь – такі й народ* (В. Аколава. Два імені).

*Як дуб за жвір трымаецца карэннем, / Так Беларусь стаіць на курганах* (В. Шніп. Беларусь стаіць на курганах).

*Як жыла і жывеш, будзеш жыць, Беларушчына! / Зразумеў і успомніў цябе твой мільённы народ* (Я. Купала. Беларушчына).

*Як жыць – дык жыць для Беларусі, / а без яе – зусім не жыць* (Л. Геніюш. Адзінай мэты не зракуся...).

*Я не га́ню землі чужыя – / Хай іх сонца не абміне. / Толькі дзе за морам ні жыў я, / Беларусь мая снілася мне* (Г. Бураўкін. Я не га́ню землі чужыя).

*Я – сірата / Без маёй Беларусі. / Ад роднай мовы, / Ад роднай нацыі / Не адцураюся, / Не адракуся* (П. Панчанка. Дружа, Быкаў...).

## «ЗЯМЛЯ НІКОЛІ СМУТАК НЕ РАДЖАЛА І ЗА ДАБРО ПЛАЦІЛА НАМ ДАБРОМ»

### Зямля, яе месца ў жыцці чалавека; зямля – родны дом зямлян

***А**сушаюць зямлю неразумныя душы – / І не толькі зямлю неразумнасцю сушаць* (А. Бачыла. Асушаюць зямлю неразумныя душы...).

*Асцярожна, людзі, асцярожна / З тым, што сёння можна на зямлі!* (А. Сербантовіч. Глуха свіснуў камень прыдарожны...).

*А ў нас зямля – якую краску, / Якую былку ні сарві – / Кладзі да сэрца як лякарства / І – здаравей, брат, і жыві!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

**В***ачыма неба мерай, / Але зямлёй жыві – / І радасная вера / Народзіцца ў крыві* (С. Законнікаў. Вера).

**Г***історыю зямлі маёй цярплівай / Падручнікам вучнёўскім не ахопіш* (С. Законнікаў. Роздум).

**Д***ай мне, зямля, яшчэ раз прарасці / над Нёмнам тваёю надзеяй.* (Л. Геніюш. Час пазрывае галіны з камля...).

**З***а неба ўдзячны будзь зямлі!* (Н. Мацяш. Сакраментальна вырашаем).

*Збядніваць зямлю – усё адно, калі не горш, як шукаць, зарабляць на сваю галаву кары, пакарання* (Ф. Янкоўскі. Ранкам-раніцаю).

*Зямлёю, вышыня, не пагарджай* (П. Макаль. Сяўба).

*Зямлі не дагледзіш – адпомсціць табе, / А потам напоіш – адмерыць без меры, / А шчыра палюбіш – палюбіць цябе* (М. Танк. Вясновая ода).

*Зямлю забяры – / І карэнню не жыць...* (У. Карызна. Вясна на бацькаўшчыне).

*Зямлю – не ашукаеш: / у складках-скібах яе – / Вякоў незлічоных мудрасць* (К. Цвірка. Зямлі патрэбны паэты...).

*Зямля бацькоў – адвечны слоўнік той, / Дзе ўсё цвіце, спявае, каласіцца* (М. Маляўка. Мае бацькі без слоўніка жылі...).

*Зямля, брат, сілы многа мае – / Такія вежы выганяе* (Я. Колас. Новая зямля).

*Зямля зялёная – бярыце / Для жыцця, і працы, і для мар* (П. Панчанка. Не люблю я...).

*Зямля калыша А б е л і с к і* (Н. Загорская. Скрозь – абеліскі).

*Зямля – касмічны карабель, / Ды мы у ім не рулявыя* (Г. Валкавыцкі. Зямное прыцяжэнне).

*Зямля – кладоўка з залатым дабром, / Якую адмыкаеш ты, араты, / Каб людзям скарбы аддаваць суздром, / Ахвярна забываючы на страты* (П. Макаль. Ворыва).

*Зямля людзей, / над прорваю ты стала, / Да небыцця адзін застаўся крок* (С. Законнікаў. Блакіт тэлівізійнага экрана...).

*Зямля – мая калыска, / Табе адной відаць, / Што немагчыма нізка / Ні падаць, ні лятаць* (Я. Янішчыц. Жывіце і любіце...).

*Зямля мая – карміцелька людзей, / Высокіх мар і дабраты калыска!* (С. Законнікаў. Зямля мая – карміцелька людзей...).

*Зямля ніколі смутак не раджала / І за дабро плаціла нам дабром* (А. Астрэйка. Я свой настрой у сум не апранаю...).

*Зямля рунець жадае аксамітам. / Ёй не ўсё роўна: сноп альбо акоп* (М. Арочка. Матчына жыта).

*Зямля сяброў і ворагаў раўняе – / Зямля калыскаю для ўсіх часін* (Р. Барадулін. І толькі след на небе...).

*Зямля – / твой лёс, / твая жывая доля, – / Любі ж яе, – / сябе ўсяго аддай, / Што б ні было на свеце, ніколі / Адну ў бядзе / Яе не пакідай* (А. Бачыла. Паэма вяртання).

*Зямля, / Ты насенніцай стала ў сусвеце, / Радзімай і зерня і семя* (М. Арочка. Крылатае семя).

*Зямлячка, шукай сваё семя, / На роднай зямлі караніся* (Р. Барадулін. Вяртанне ў першы снег).

*Зямля! Што ж не навучыш мяне – / Сваю жменю пяску – / Маўчаць!* (М. Танк. Зямля).

*Зямля, што нарадзіла, / Заўжды шчадрэй на сонца...* (С. Законнікаў. Рэчка Дзіва).

*Зямля, як і раней, увіхаецца каля Сонца. Чалавек – каля ежы, вопраткі, грошай...* (У. Ліпскі. Дай, божа, дзецям долю).

*Зямля – як размах чалавечай радасці– шырокая, бяскрайняя, здольная будзіць вялікія імкненні пачуцця і думак* (К. Чорны. Зямля).

*І зямля свой твар мяняе* (Я. Колас. Сымон-музыка).

*Калі зямлі / бывае вельмі цяжка, / Ты сам хоць частку / цяжару прымі* (А. Бачыла. Паэма вяртання).

*Моцна трымае зямлі пупавіна / Сэрцы людскія і кліча дамоў* (Л. Геніюш. Бацькаўшчына, зямля дарагая...).

*Мы, як дубы, / нас можна знішчыць громам, / але з зямлі нас роднай / не скрануць* (Л. Геніюш. Мы, як зубры...).

***Н****ават думы, / нават слова – / Усё з зямлі. / З яе адной* (С. Законнікаў. Усё з зямлі).

*Нам, / землянам, / разам ратаваць, / Ад гнілога бруду адмываць / І нядзеліць радасцю / планету* (С. Законнікаў. Слухаю начную цішыню).

*Нас на Зямлі за ўсё мацней / Трымае смутак развітання* (Р. Барадулін. Трымае...).

*Няхай жыве бязбожнік малады! – / не грэх і паўтарыць нам заклік / весні, – / але няхай ён моліцца заўжды / свайму сярпу, і коласу, і песні* (Е. Лось. Вера).

***О****, прастата, ды не святая! / Як ты далёка завяла / Падумаць толькі: ён пытае: / «За што любіць цябе, зямля?»* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

***П****авінна ў рэшце рэшт і на зямліцу / Быць красная, адменная цана!* (Я. Янішчыц. Красная цана).

*Пагавары са мной, / Зямля, вачамі* (Я. Янішчыц. Прызнанне вачамі).

*Пакуль зямля твая жывая, / І ты – жывы* (А. Пысін. Акопы, ямы, дол...).

***С****ама зямля не йдзе да спадара, – / Яна чакае ласкі чалавечай!* (А. Звонак. Малітва).

*Свайму абаронцу, мабыць, / Магілай не можа зямля быць!..* (А. Лойка. Балада пра Філіповіча).

**Т***аемны вы, зямлі скрыжалі! / Чаго ў сябе вы не ўпісалі!* (Я. Колас. Новая зямля).

*Такой трывожнаю часінай, / Назло шалёнаму звяр'ю – / Для справы міру трэба ўсім нам / Яшчэ мацней любіць зямлю!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Ты згасіш сонца, час, але не згіне / Наш род людскі – каманда карабля,/ – Ён мачтавыя сосны не пакіне, / Пакуль ім будзе палубай зямля* (А. Куляшоў. Ты згасіш сонца, час, але не згіне...).

**У***сё з зямлі. / З яе адной* (С. Законнікаў. Усё з зямлі).

*Уся зямля – адзін стары курган, / Куды сышліся нашых продкаў продкі* (Л. Тарасюк. Да этнагенезу беларусаў).

*У халёнага, хамелеоннага, / Прыстасаванага і не ўлюбёнага / У нашу зямлю – не ўздрыгне душа* (Я. Янішчыц. Зорная паэма).

**Х***ай свеціцца між зорак у сусвеце / Зямля – / людскі наш інтэрнат* (К. Цвірка. Інтэрнат).

*Хлеб – гэта ўсмешка зямлі* (С. Законнікаў. Урбаны).

*Хлеб, напэўна, нікому не горкі, / Толькі горкая праўда зямлі* (А. Пысін. Хлеб, напэўна, нікому не горкі...).

*Хоць не забылі б сейбітавы дзеці, / Што сіла ў сіле роднае зямлі* (С. Грахоўскі. Зямля).

*Хто зямлю пакалечыць, згвалтуе – / Рукі пеклам смалы засмалуе* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

*Чым далей / Ад зямлі мы збяжым – / Тым бліжэй да бяды* (Н. Гілевіч. Пра дзядоў і зямлю).

*Чым далей ад паверхні мы зямлі, / То ўсё даступней нам яе глыбіні* (Н. Мацяш. Сказала...).

*Шчыруйце ў працы, людзі, – / І ўспомніць вас Зямля* (С. Законнікаў. І ўспомніць вас Зямля).

*Якая вялікая трагедыя зямлі, калі ёю не можа камандаваць чалавек! І якая вялікая трагедыя чалавека, калі душыць, панствуе над ім зямля* (Я. Скрыган. Смага).

*Як выдых: / Хай былое – тлен. / І як удых: / Няхай зародзіць!* (Н. Мацяш. Дэкаратыўная свяча на століку...).

*Я ўрос у зямлю* (Я. Колас. Рыбакова хата).

## *«І НАША МОВА – З-ПАД КРЫЛА ДУШЫ»*

### Думка, мова, слова

*Абароньвайся, Слова, сабою!* (В. Аколава. Да Фёдара Янкоўскага ў госці).

*Абломкі крыўдных слоў сядзяць у душы, як стрэмкі* (П. Панчанка. Думаю, думаю...).

*Абмежавана зместам слова* (К. Буйло. Па траскіх гасцях).

*Агонь і слова – гэта адкрыцці, / Якім нялёгка роўных падшукаць* (А. Зарыцкі. Агонь і слова).

*Ад зерня – колас, ад слова –мова* (Э. Акулін. Шлях да Радзімы).

*Адна быць можа роднай маці ў сына, / Як мова родпай можа быць адна* (А. Звонак. Адна).

*Адным словам можна вельмі шмат выказаць, або тым жа самым словам нічога не сказаць* (К. Чорны. Небеларуская мова ў беларускай літаратуры).

*А калі б думкі мелі колер: / Светлыя – тады табе светла, / Цёмныя – цёмна, – / Многія так бы і не ўбачылі / Весняй красы / і нябеснай сіні, / І, пэўна, / не ведаў бы свет тады / Трагедый Сангмі і Хатыні* (У. Карызна. Думаю: навошта запалкі людзям?..).

*Але дзе, / калі, / на чым, скажыце, – /На вячэрніх зорах / ці... на жыце / Згаварыць прабабчыну замову: / Родныя, / аддана беражыце / Край – жыцця і вернасці аснову, / Беражыце мову* (Н. Загорская. Сынам).

*Але нічым – ні здзекаў намеццю, / Ніякай ласкай і хвальбой / Адбіць няможна добрай памяці, / Што ў мове точыцца жывой* (М. Лужанін. Я на руках малую гушкаю...).

*А слова павінна быць, / як насенне, / якое сеем у дзень вясенні, / слова павінна прарастаць, / даваць усходы, / рунець, / красаваць* (А. Вярцінскі. Выбраў харошую гадзіну...).

*А слова – сапраўды жывая рэч!* (Л. Геніюш. Споведзь. Лагер).

**Б***ацька, і маці, і родная мова, / узнятая к славе амаль з небыцця / паэтаў натхнёным і велічным словам, / для*

*беларусаў – пытанне жыцця* (Л. Геніюш. Як бацька чакае сыноў...).

*Без роднай мовы / Людзі ў родным краі, / Як тыя кватаранты-немтуры...* (Р. Барадулін. Як і...).

*Беражы і ахоўвай / Залатыя правы / Нашай роднае мовы, – / І ты вечна жывы...* (М. Лужанін. Праводзіны).

*Бойся спазніцца са словам харошым: / Тонка прадзецца жыццёвая ніць* (Н. Мацяш. Не спазніся).

***В**едае свет, што вялікіх дум цвет / Адно толькі на зломе ўзрастае* (Я. Купала. Песня званара).

*Верны будзь слову, / якое ўпала / з матчыных вуснаў, / як з неба, / ў душу* (Л. Геніюш. Верны будзь слову...).

*Выказванне таму і магчыма, што ёсць невыказнае. Інакш усё можна было б выказаць адразу, нібы вычарпаць радовішча* (А. Разанаў. Зномы).

***Г**утарка – гаспадарка, у якой усё ў зборы, усё ў гурце, усё зацікаўлена адно адным і ўторыць адно аднаму* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

***Д**аўно нас вучыць / твой, Купала, дух / Ісці праз слова – / у самасвядомасць!* (М. Арочка. Слова да Купалы).

*Дзе б далёка ні жылі мы, / а заўсёды роднай мовай снім* (А. Русецкі. Другі пачатак).

*Дзяды і бацькі нашу мову стваралі, / Каб звонка звінела, была, як агонь* (П. Броўка. Родныя словы).

*Долі інакшай не трэба зямной, / Сэрца пагоднее ад суцяшэння: / Родная мова ступала за мной / Ад калы-*

*ханкі / Да галашэння* (Р. Барадулін. Долі інакшай не трэба зямной...).

*Думаць на сваёй роднай мове народу не забароніш!* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Думаць – цяжкая, няўдзячная работа, апроч таго і небяспека – ці не таму многія проста баяцца думаць!* (В. Іпатава. 20 хвілін з Немезідай).

*Думка абмяжоўвае. Наколькі адкрывае, настолькі абмяжоўвае* (А. Разанаў. Зномы).

*Думка – вось той бур, з дапамогай якога чалавек даследуе сваю пароду* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

*Думка ідзе ўслед за жыццём, жыццё – услед за думкай, але гэта не рух па крузе, гэта рух усім кругам – у новую якасць, у новае вымярэнне* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

*Думка мае душу маладую, / Думка не сівее ніколі* (Р. Барадулін. Ніколі...).

*Думка ходзіць, дзе захоча: / Ад зямлі да зор і сонца / Няма думкам забароны* (Якуб Колас. Сымон-музыка).

*Думкі пра Бога, маці, дзіця, радзіму заўсёды надаюць сілу* (Г. Марчук. Голас і слова. Афарызмы).

*Думкі чалавека – / вы працяг / Нейчых недаходжаных дарог, / Нейчага кароткага жыцця, / Што сусвет / прадбачліва збярог* (Я. Сіпакоў. Думкі чалавека...).

*Думкі чалавека – / вы святло / Зор, / што змоўклі рана ў вышыні* (Я. Сіпакоў. Думкі чалавека...).

*Дум не скуеш ланцугамі* (Янка Купала. Курган).

*Думу не давярай суму. / І цішыні не мані* (Р. Барадулін. Ксты).

*Ды калі ты не бязродны сын – / Гавары са мной па-беларуску* (Я. Янішчыц. Будзе слоту абвяшчаць прагноз...).

*Дык шануй, Беларус, сваю мову – / Гэта скарб нам на вечныя годы; / За пашану радзімаму слову / Ушануюць нас брацця-народы!* (А. Гарун. У чатырохлецце «Нашае Нівы»).

*Ды судзіць лёс – што значаць словы?* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

**Е***днасці лепшай не знойдзецца, мусіць, – /Слова з мелодыяй, як спарышы* (С. Законнікаў. Слухаю...).

**Ё***сць нешта дзіўнае і важнае ў гэтым спакоі летняй ночы, чаго выказаць не можа беднае слова чалавека* (Я. Колас. Чужы сад).

**Ж***ывое слова – увасабленне / любові жывой, жывога сумлення* (А. Вярцінскі. Выбраў харошую гадзіну...).

**З***алацей за залатога – праўда, шчырасць слова* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

*За словамі не бачым мы жывой работы, сапраўднага дзела. А слова-гаварню за гэтае дзела прымаем* (Я. Колас. На прасторах жыцця).

*Зняможаным не кажуць слоў прыгожых, / Ад гучных слоў не прыбывае сіл...* (А. Бачыла. Што можаш здзейсніць...).

*З чым параўнаць народ з чужою моваю? / Мая душа такі адказ дала: / я параўнаў бы з кветкай папяроваю, / калі б не ведаў чучала арла* (В. Жуковіч. У прыватнай гаворцы).

***І** калі мой час настане / Ціхім сном навек забыцца – / Перад тым на развітанне / Дайце словам наталіцца* (Г. Дзмітрыеў. Усяму свая патрэба...).

*І на іншых вяршынях суровых / (Вера! Роўнасць! Свабода! Край!) / Ты струменьчык матчынай мовы, / Быццам маці, не забывай* (У. Караткевіч. Мова).

*І наша мова – з-пад крыла душы* (С. Панізнік. З-пад крыла душы).

*Іншы бохан ляжыць пад абрусам, / на сцяне цікавейшы абраз, / толькі роднае мовы на вуснах / не крануў ўсё мяняючы час* (Л. Геніюш. Іншы бохан ляжыць пад абрусам...).

*І толькі слова, толькі песні / Жывучыя, як мой народ* (С. Законнікаў. Народныя песні).

*І ў кожным з нас нерастрачанай спадчынай / Жывуць, ратуючы нашы дні, / Вяртаючы душы ад вышыні, / Балючыя словы малітвы матчынай* (Р. Барадулін. Малітва матчына).

*І ўсё мілагучна для слыху майго: / І звонкае «дзе», і густое «чаго»* ( П. Панчанка. Пад'язджаючы да Мінска).

***К**аб вольна было думцы, трэба, каб вольна было словам, каб лёгка ліліся яны з душы, з падсвядомасці, з пад-*

*свядомай памяці. Неабходна менавіта **такое** веданне мовы, адчуванне яе* (Т. Бондар. З дзённікаў).

*Каб выказаць разумную думку, не трэба многа прыгожых і выкручастых слоў* (Я. Колас. На прасторах жыцця).

*Каб вясне прабіць дарогу, / Каб калісь вярнуўся рай, – / Слова праўды, слова Бога / Мусіш слухаць, родны Край* (У. Караткевіч. Наследаванне Сыракомлю).

*Каб зразумець сябе – /думка / дзеліцца на дзве часткі: / адна становіцца паляўнічым, / другая – уцекачом / і спасцігаецца, / калі гіне* (А. Разанаў. Пункціры).

*Калі б думкі смелыя былі, / за сабою войска павялі* (Д. Бічэль-Загнетава. А на Палессі).

*Калі ж спакойна на душы, / Парожнім словам не грашы* (С. Грахоўскі. Паэт).

*Калі не забыў сваёй мовы / І колер блакіту вясновы, / Дык ты на чужыне гаротнай / Яшчэ не самотны* (М. Танк. Міхаілу Забэйду).

*Калі ўжо чалавека / За зямное смерць карае, / Дык, як водзіцца спрадвеку, / Першай мову адбірае* (А. Бачыла. Пра нашу віну).

*Кінь саромецца мовы сваёй, / ЗвацЬ сябе беларусам пачні* (М. Чарот. Звон).

*Кірунак слова, як і зярняці, – знутры* (А. Разанаў. Зномы).

*Клопат усялякага слова – знайсці найкарацейшы шлях да суразмоўніка, слухача, чытача* (М. Стральцоў. «Усе жанры добрыя, акрамя сумнага»).

*Кожны век, кожны год, кожны дзень / Слова страчвае сэнс адмысловы* (Т. Бондар. Кожны век...).

*Кожны народ сваю думку хоць смела /Моваю роднай не ў сорам казаў, / А беларуса ганьбоўна нямела – / Кожны мужычай яе называў...* (А. Гурло. Вольнае слова).

*Кожны народ стварыў хоць бы адзін геніяльны твор, і твор гэты – мова* (А. Разанаў. Зномы).

*Культура нацыі без культуры роднай мовы – нонсенс, бяссэнсіца* (Н. Гілевіч. Між былым і наступным).

*Лепшыя думкі і словы з маўчання* (В. Аколава. Случарыны.).

*Лес, і рэчку, і клёкат бусловы, / Чалавечую ўсмешку ўраз / Можна знішчыць адным толькі словам, / Што бяздумна вырвецца ў нас* (В. Вітка. Слова).

*Лёсу майго кірунак, / долі маёй выснова, / як паратунак, / матчына слова, / бацькоўскае слова, / роднае вечнае слова!* (Н. Гілевіч. Роднае слова).

*Матуля і мова – з калыскі адное* (В. Аколава. Случарыны).

*Матчынай мовы, багатай і слаўнай, / Што ў скарбах народа бы фонд залаты, / Не аддавайце бяздумна, бяспраўна, / Не прадавайце святога, браты!* (Л. Геніюш. Матчынай мовы, багатай і слаўнай...).

*Мая мова – як шчасце на вуснах, / хвалявання гарачы прыбой, / можа быць, на чужой засмяюся, / ўсё ж заплачу з тугі на сваёй* (Л. Геніюш. Мая мова).

*Метафара – транскрыпцыя: яна перадае на «тутэйшай» мове «тамтэйшае»* (А. Разанаў. Зномы).

*Мне болей шкада тых думак, якія не выйшлі за межы галавы, – гэта было самагубства...* (В. Жуковіч. Шкадаванне).

*Мне слова матчына не ў лішак... Бязроднасць гневіць камяні* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

*Мова... – вялікай навукі вытокі / і паэзія праўды, / якая не мае граніц* (А. Вечар. Зварот да слова).

*Мова – гэта душа нацыянальная народа, калі ёсць такая душа, то ёсць і гаспадар яе – гэта сам народ, а як не гіне народ з нацыянальнай душой, так не загіне беларускі народ!* (Ядвігін Ш. Лісты з дарогі ).

*Мова – гэта ключ да дзвярэй у свет, і кожны павінен выйсці праз свае дзверы. Гаварыць не на сваёй мове – тое самае, што глядзець на свет не сваімі вачыма* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Мова – жывая істота. Яна жыве, а не існуе* (К. Чорны. Небеларуская мова ў беларускай літаратуры).

*Мовай чужынскай і воляй варожай не пакарай мяне, праведны Божа!* (А. Хатэнка. Дзедава субота).

*Мова родная, мова дзядоў! Іншай мовы мы сэрцам не чуем* (Л. Геніюш. Родная мова).

*Мова родная што віцязь напагатове...* (С. Панізнік. Нам ніколі не памерці...).

*Мова сяброў – / На свеце найлепшая мова* (А. Зарыцкі. Лепшая мова).

*Мова ў паэзіі згушчаецца, насычаецца энергіяй, якая, як магніт жалезнае пілавінне, размяшчае словы па сваіх сілавых лініях. Паэт трансфармуе мову, выводзіць яе са звычайнага ўжытку да той стадыі, як таго вымагае твор. І трансфармацыя мовы тут проста неабходная: дзякуючы ёй арганізуецца твор, яна – спосаб арганізацыі твора* (А. Разанаў Зномы).

*Моваў шмат, пра-мова адна: невыказнае. Гэта на ёй «гаварылі» да слыннага Вавілонскага непаразумення* (А. Разанаў. Зномы).

*Мовы мяжуюць не як плоскасці, а ўзаемапранікаючыся сваімі пазамі і выступамі, як растапыраныя пальцы рук. Яны дапаўняюцца і тлумачацца адна адной* (А. Разанаў. Зномы).

*Моц думкі не залежыць ад фізічнай моцы чалавека. Праз яе выходзіць энергія душы. Фізічная энергія кудысьці знікае, энергія думкі лунае вечна* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Мы для ўнукаў павінны дарогу прабіць. / Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе. / Хто забыў сваю мову – усё згубіў* (У. Караткевіч. Слова пра чалавечнасць).

*Мы заўважаем і кажам тое, што адгукаецца нам, што само падае нам свой голас* (А. Разанаў. Зномы).

*Мы пастаянна шукаем адно слова, якое б канчаткова і поўна выказала нас. Роўнае яму хіба што маўчанне: гэта тое ж слова, але са знакам мінус, яго страта, яго след, яго адсутнасць* (А. Разанаў. Зномы).

***Н**ад намі пануе... шаблон пустых слоў, пустыя выразы, чужыя формы думак* (Я. Колас. У палескай глушы).

*Найшырэйшая з дэвальвацый – / Дэвальвацыя гучных слоў* (Г. Бураўкін. Дэвальвацыя).

*На назвы няма манаполій* (А. Пысін. Краснаполле).

*На родных мовах – як аднолькава, / як горка плачуць дзеці ўсе...* (В. Зуёнак. Люлялі воды Адрыятыкі).

*На філасофскі часам лад / Настроіш думкі ты ў самоце* (Я. Колас. Загібелька).

*Нацыянальная псіхалогія, і склад мыслення, і пачуццё мовы – гэта тое, што даецца як бы ад нараджэння, як бы з малаком маткі* (М. Стральцоў. Загадка Багдановіча).

*Нашто нямое слова, / Калі гаворыць дух?!* (Ю. Кісялеўскі. Было спачатку слова).

*Не ад куль – / Часцей мы падаем ад слоў , / Кулі словамі апрануты, / як плаццем, / Невыноснаю цаной людскіх / галоў / За маўчанне палахлівае мы / плацім* (П. Макаль. Ты маўчаў тады...).

*Не бойся слова гучнага – прарок! – /Прарок не Бога – праўды слых і зрок* (А. Куляшоў. Варшаўскі шлях).

*Не з чаркі – з сэрца роднага народа, / пяюння-мова, / п'ю цябе да дна* (Л. Геніюш. Гасціна).

*Нельга есці хлеб народа і грэбаваць ягонай моваи* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім).

*Не, не будзе Радзіма страчана, / Калі маці мову нясуць / І па слоўку, па гуку – у спадчыну, / Як дыханне,*

*дзецям даюць* (В. Зуёнак. Двор без мамы – народ без мовы...).

*Не падуладна толькі слова / Халоднай пэўнасці акоў* (В. Зуёнак. Слова).

*Не прыпыняйся, не жахайся, слова!.. / Хай адвячорак доўгім ценем лёг – /Магчыма немагчымая размова / Датуль, пакуль магчымы маналог* (А. Куляшоў. Не бачыўся я ўсё жыццё амаль...).

*Не разумее слоў адна стыхія* (К. Камейша. Круг).

*Не родзіцца мудрае слова, / Калі не радзіўся мудрэц* (І. Ралько. Не родзіцца мудрае слова...).

*Не срэбра шчырае, шчырае слова – / Галоўны скарб наш у свеце часовым* (Р. Барадулін. Адна ў небыццё і ў быццё дарога...).

*Не часта даецца, каб чужое слова кранулася дна душы* (Я. Скрыган. Дно душы).

*Ні болей, ні меней: жывое слова, / Слова інакшым не можа быць. / Іначай што яно можа зрабіць? / Іначай не зерне яно, а палова* (А. Вярцінскі. Выбраў харошую гадзіну...).

*Нібы маці, берагчы / Працаўніцу нашу – мову, /Бо яна – жыцця зачын / І пачатак песні новай* (Я. Сіпакоў. Зразумець, што ты – народ...).

*Ні прага славы Слова не народзіць, / ні мітусня, ні лоўкая хлусня* (В. Жуковіч. Пытальны лад).

*Новы час непатрэбнае крышыць. / Наша ж мова, як вечнасці ніць, / з праславянскіх крыніц і узвышшаў /*

*красавець з намі будзе і жыць.* (Л. Геніюш. Іншы бохан ляжыць пад абрусам...).

*Няма чаго мяняць языкам, / А крык, як быў, і будзе крыкам* (Я. Колас. Новая зямля).

*Няхай красуе слова. Толькі слову, / Якое роўна сэрцу, сталі і агню, / Па праву першынство аддаць гатовы, / Як пасля ночы сонечнаму дню* (А. Астрэйка. А славу ж я не мераў на караты...).

*Няхай родным словам шчасна / Загаворыць наш народ* (Якуб Колас. Мы маўчалі, як нямыя...).

***О****й, многа, як многа / Для думак дарог! / Не спыніць іх лёту / Ніякі парог* (Я. Колас. Адплата).

*О, мова! / Усе, як магеланы, / К табе мы вернемся наўпрост, / Каб ты знайсці дапамагла нам / І ДОМ, / і МАЦІ, / і ПАГОСТ...* (Л. Галубовіч. Мова).

***П****авага да роднай мовы заўсёды нараджае павагу да ўсіх без выключэння – вялікіх і маленькіх – моў свету* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

*Павагу і добрае слова / У нашыя мірныя дні / Давайце вучыцца нанова, / Як хлеб у блакаду, цаніць !* (С. Законнікаў. Заўвага).

*Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы: хто якую носе; ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы* (Ф. Багушэвіч. Прадмова да зборніка «Дудка беларуская»).

*Пакінутая думка – гэта бессмяротнасць. Яе трэба занатоўваць перш на паперу* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Пакуль яшчэ ідуць у бой / З маной і раўнадушшам смела, / То не загінуць мове той, / Што з вуснаў маця-рок зляцела* (Н. Гальпяровіч. Мова).

*Пароль неўміручасці – родная мова* (П. Макаль. Родная мова).

*Патрэбна, як хлеб, людзям слова...* (С. Законнікаў. Стаяць у чаканні людзі...).

*Патухне радзімае слова, / Калі перастанеш гарэць* (І. Ралько. Не родзіцца мудрае слова...).

*Перабівацца нішчымніцай думкі, наіўнай пыхі, затоенай зайздрасці – і нудна ж яно, і так непатрэбна!* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Плод без зярняці – не плод, / I без мовы – насельніцтва мы, не народ* (У. Паўлаў. Народ, пачуй!).

*Прарастаю я роднай мовай / У чалавечнасць* (М. Трафімчук. Будзе цёплым зямное слова).

*Пра слова меркаваць можна толькі вымаўляючы... Тады адчуеш ягоны смак, як адчуваеш смак ежы* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Праўды чорны хлеб і мамы слова / У мяне ніхто не адбярэ* (С. Законнікаў. Нашаму жабрацтву ёсць прычына...).

*Прыгожая мова – не ўся мова, толькі адзін з яе пластоў, адзін з яе стыляў* (А. Разанаў. Зномы).

***Р****аднёю і мовай не грэбуй, / Ты – колас сярод каласоў...* (С. Законнікаў. Кульмінацыя).

*Развязаліся языкі, з'явілася і рызыка* (Я. Колас. Тоўстае палена).

*Размова – мова думак, маўчанне – мова ісціны* (А. Разанаў. Зномы).

*Родная мова – бестэрміновы пашпарт пісьменніка* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Родная мова – гэта кроў народа, пакуль жыве яна – жыве народ* (Ядвігін Ш. Хто чым можа – хай дапаможа).

*Родная мова, / узнятая к славе амаль з небыцця / паэтаў натхнёным і велічным словам, / для беларусаў – пытанне жыцця* (Л. Геніюш. Як бацька чакае сыноў).

*Самаўладная кара ў жыцці – / Быць да крэўнага слова прыкутым* (Р. Барадулін. На гару прабачэння ўзысці...).

*Са словам дабрыні / Спяшайце не спазніцца* (Р. Барадулін. Кажыце пры жыцці...).

*Слова валодае таямнічай сілай – бывае хвіліна ці імгненне, калі яно, кінутае ў свет, як каменьчык, выклікае абвал – нябачны, нячутны, які доўжыцца гады* (В. Іпатава. 20 хвілін з Немезідай).

*Слова, дум ніхто не звяжа* (Янка Купала. Гэй, наперад!).

*Слова забіяцкага / Не чэшуць тут пад шнур* (Якуб Колас. Паслушная жонка).

*Слова «кахаю»– слабае слова. /Мужнае слова – «абараню»!* (Л. Геніюш. Сёння на пласе родная мова...).

*Словам можна забіць, словам можна скалечыць...* (Н. Тарас. Слова пра слова).

*Слова праўды нельга сцерці, / Не зжаць палетак жыта без сярпа!* (А. Астрэйка. Яго чытаем...).

*Слова-радасць, слова-чары, / Вобраз вечна юных вёсен, / Ёсць ты ўсюды: ў сонца, ў хмары, / Ты глядзіш праз неба просінь, / Лашчыш слух мой слова-ззянне, / Атуляеш сэрца ласкай, / Ноч і вечар, дзень, світанне / Абняло ты, слова-краска* (Я. Колас. Слова).

*Слова тады мае сілу, / Калі яно зрошана потам / І з праўдай людской здружыла* (М. Танк. Калісьці я ў славутых...).

*Слова, ты гучы! / І хай маўчаць гарматы і мячы!* (А. Вярцінскі. Стук малатка. Пачатак пасяджэння).

*Слова – усяго аснова. / Душа крылатая ў слова* (Р. Барадулін. Ксты).

*Словы без справы – / Шум ветру толькі* (М. Танк. Словы без справы).

*Слоў не крышыць ні век, ні тапор* (Янка Купала. Памяці Т. Шаўчэнкі).

*Слоў у нас вельмі многа. Куды ні пайдзі, усё толькі чуеш прамовы... Адно якое-небудзь слова выклікае тысячы другіх слоў. Слова на слове едзе і словам паганяе* (Я. Колас. На прасторах жыцця).

*Спачатку – слова. Тайны знак спярша* (Я. Янішчыц. На месцы дуэлі Лермантава).

*Спеўная мова твайго народа будзе чуцца і ў сне* (Я. Пархута. Камароўка).

*Стаю прад словам на каленях, / Прыйдзі, харошае, прыйдзі / І ў садзе вершаў не вясенніх / Сваю ты ру-*

*жу пасадзі* (А. Астрэйка. Не раз прад словам на каленях...).

*Сто тысяч год няхай вакол шумяць палі, / Сто тысяч год няхай вакол гудуць дубровы, / Пакуль гучыць вакол святая наша мова, / Пакуль ёсць беларусы на зямлі* (У. Караткевіч. Дом сябра).

*Страціў слова, страціў спадчыннае слова, – / Штосьці страціў у душы абавязкова! / Можа – годнасці хоць кропельку якую? / Можа – мудрасці хоць дробачку якую? / Можа – памяці хоць зернетка-іскрынку? / Можа – праўды хоць пылінку-парушынку? / Я не ведаю дакладна, што ты страціў. / Запытайся – ці не скажа табе маці* (Н. Гілевіч. Страціў слова, страціў спадчыннае слова...).

*Суседзі ў слове... / Без мяжы* (С. Панізнік. Суседства).

*Схавай выбуховае слова / на ворага. / А другу хай будзе адкрыта душа* (П. Макаль. Пасварымся часам...).

*Так і мова, словы ў ёй – / зярняты. / З кожным зернем – ўсё дужэе / колас, / Бо зярнятка – гэта яго голас* (Г. Мяцеліца. Роднае слова).

*Там, / Дзе не шануюць роднай мовы, / Мялеюць рэкі, / Нішчацца дубровы, / Каля магілак пасвяцца каровы, / Народ там мёртвы, / А той край – нямы* (Г. Бураўкін. Я ведаю...).

*Той, хто любіць папраўдзе, ён ціха / слова роднае ў сэрцы спяліць, / беражэ ад пагарднага ліха: / калі слову, то й сэрцу баліць* (Е. Лось. Слова).

*Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам, бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

*Трэба слова ўзважыць, / Перш чым ім каго з размаху спляжыць* (У. Папковіч. Самакрытычная парада).

*Ты, мой брат, каго зваць Беларусам, / Роднай мовы сваёй не цурайся; / Як не зрокся яе пад прымусам, / Так і вольны цяпер не зракайся* (А. Гарун. У чатырохлецце «Нашае Нівы»).

*Тэатр збудоўваецца з тайны слова* (В. Акалава. Случарыны).

**У**

*У акіяне слова – / ані мяжы, ні донца. / Ёсць там адна аснова: / праца / і праца бясконца!..* (В. Жуковіч. Мова).

*У блізкіх мовах блізкасць родных душ, / Адзінай дружбы чыстыя крыніцы, / Калі даводзілася сустракаць бяду / І разам паўставаць супраць чужынцаў* (Н. Гальпяровіч. У блізкіх мовах блізкасць родных душ...).

*У кожным слове ёсць мастацтва, / жыве па прынцыпу адным: / з маленства ўступіш у сваяцтва – / неназавеш павек чужым* (Р. Баравікова. У кожным слове ёсць мастацтва...).

*У кожным слове жыве дух усёй мовы* (А. Разанаў. Зномы).

*У песні ёсць аснова / Той таямнічасці жыцця, / Перад якой нямее мова / Ад лішку мар і пачуцця* (А. Грачанікаў. Бясконцыя рэйкі).

*У самім слове няма ніводнага атама, няма нічога з таго, што падуладна смерці. Яно, хоць само жывое, не праходзіць звычайных стадый усяго жывога: нараджэнне, саленне, старэнне, смерць. Бо яно дух, а дух не мае смерці* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Усё жывое расце знутры: дрэва з зярняці, квецень з дрэва, плод з квецені, зерне з плода... Кірунак слова, як і зярняці, – знутры* (А. Разанаў. Зномы).

**Х***ай бед людскіх не развясці рукамі – / Успыхне слова выйсцем пра запас* ( Н. Мацяш. Красавік у Саках).

*Хай кажа слова чалавечы род!* (А. Вярцінскі. Стук малатка. Пачатак пасяджэння).

*Хай салодзіць думка, калі плод гарчыць...*(В. Акалава. На рацэ Прыманцы...).

*Хай слова слова апячэ, / І хай шукае месца клічнік / У неадкрытым, / у яшчэ / Чужым і стоеным абліччы* (Я. Янішчыц. Падставіць голасу лісток...).

*Халаднавата сэрцу ў мове чужой, / Нібыта ў неасвечаным храме, / Што поўніцца неабжытай імжой / І неўсвядомленымі дарамі* (Р. Барадулін. Хоць прысак у прыцемку не атух...).

*Хата – прыпынак роднае мовы, / веры, што, покуль народ будзе жыць, / мова прыдасца для шчырай размовы* (Л. Геніюш. Вечар жыцця).

*Хіба можна бачыць, не гледзячы? / Хіба можна чуць, не слухаючы? / Хіба можна гаварыць, не адкрываючы рота? / А ўсё ж гэта спрабуюць рабіць тыя, хто добра-*

*ахвотна і лёгка адмовіўся ад роднай мовы* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

*Хлеба кошт не адзін: / то спаўна, / То над крошкай трасуцца галовы... / Не мяняецца толькі цана / Гэткай дробязі – добрага слова* (С. Законнікаў. Добрае слова).

*Хоць груба скажа – але трапна, / Хоць рэзкі выраз – але свой* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Хоць мова наша не царская, / Ды гаспадарская* (В. Дашкевіч. Розніца).

*Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, / Хто забыў сваю мову – усё згубіў* (У. Караткевіч. Слова пра чалавечнасць).

*Хто мову сваю ганіць – матчын дар, /Не прынясе карысці ён народу, / Бо па жыцці, як люты янычар, / Ён коціцца – ні племя і ні роду* (А. Грачанікаў. Хто мову сваю ганіць – матчын дар...).

*Хто не любіць роднай мовы, / Той любіць толькі сам сябе* (С. Грахоўскі. Пацеркі).

**Ц***яжка таму, хто не можа смела сказаць аб сваіх думках і хто мусіць насіць іх, як атруту, на сэрцы* (Я. Колас. Малады дубок).

**Ч***алавечая мова / заўсёды даецца з калыскі. / Але голас асобы / прырода дала салаўю, / І яна не знаходзіла, мабыць, / ніякай карысці, / Каб і птушкі ўсе пелі / аднолькава песню сваю* (А. Вечар. Зварот да слова).

***Ш**када, што казачныя словы / Мы хочам зберагчы на потым* (С. Законнікаў. Увагай шчырай, пацалункамі...).

*Што ў душы, тое будзе і ў слове* (С. Законнікаў. І стаю я, жыццё, прад табой...).

***Э**нергія думак, калі іх нават мала, не знікае; пасланая думкаю, яна існуе вечна, пераўтвараючы сабою, аказваючы ўплыў на зямное жыццё* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

***Я** й стагоддзем Вам пакланюся: / Мова. Матуля. Мінск і Няміга* (В. Аколава. Малюнкі словам).

*Як выказаць цябе, маё маўчанне?* (А. Разанаў. Пункціры).

*Як для дрэва корань, так і слова / Сілу, годнасць не дае нам страціць* (Э. Валасевіч. Не шукайце шчасця на чужыне...).

*Як немагчыма прынізіць абразаю / Маці-зямелюхну, неба і сонца – / Гэтак і мовы, што служыць украсаю / Роду людскога, не ўнізіць – ні слоўца!* (Н. Гілевіч. Вы не яе – вы сябе прыніжаеце).

*Якой бы музыкай гучала наша мова, / Калі б умелі слова шанаваць, / Калі б фальшыўцаў лёс караў сурова / І за знявагу і за крыўду слова / Забаранялі вершыкі пісаць!* (Я. Непачаловіч. Калі б умелі слова шанаваць...).

*Якой жа моваю, скажы мне, / Мы будзем гутарыць з табой. / Я – не валодаю чужымі, / Ты, бог, – не ведаеш маёй* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Я пастаянна казаў, што меў, / я пастаянна кажу, што маю, / нічога не ўтойваючы, / нічога не пакідаючы на чорны дзень: / мае канчатковыя аргументы тут – у кожнай хвіліне, у кожным дні, ва ўсім маім існаванні* (А. Разанаў. Камяні).

*Я – раб паэзіі. І ўсё ж на дзіва / Шчаслівы, што – як вязень ланцугом – / Прыкуты сваёй мовай да Радзімы* (Л. Галубовіч. Я – раб паэзіі. І ўсё ж...).

*Я ў крузе, дзе слова шукае Слова, а чалавек – Чалавека* (А. Разанаў. У крузе).

*Яшчэ ніколі на пустым загоне / Ад славаслоўя збожжа не расло!* (А. Звонак. Веліч).

## *«БЕЗ ПЕСЕНЬ СВАЙГО НАРОДА НЯМЕЕ НАВАТ ПРЫРОДА»*

У песні – душа і жыццё чалавека, яго мары і надзеі

***А*** *песня не носіць ярма* (Р. Барадулін. Няма народаў малых...).

***Б****ез крылаў песні не ўзляцець высока* (А. Звонак. Без крылаў песні не ўзляцець высока...).

*Без песень свайго народа / Нямее нават прырода* (А. Грачанікаў. Народ і песні).

*Была б праўдзіва песня спета, / А вывад – кожны зробіць сам* (А. Бачыла. Сышліся жонкі на хвіліну...).

*Бяскрылай песняй іскры не запаліш, / Што палкай думкай сэрца апячэ...* (А. Звонак. Без крылаў песні не ўзляцець высока...)

*Дзе песня галаву ўзняла, / Там шэрасці не выжыць* (Н. Мацяш. Узмах крыла, узмах крыла...).

*Долю чорную ноч не схавае, / Калі выльецца песня жывая !* (М. Багдановіч. Дождж у полі і холад...).

*Ды песню адбярыце вы ў народа – / І можна пакарыць тады народ* (У. Карызна. Песня – душа народа).

*Ён песень чужых не ўжывае: / Сваю зацягнуць цікавей* (Я. Колас. Адплата).

*Ёсць адна песня песняў – / Пра Радзіму. / Ніхто не знае, / Хто яе пачаў, / І ніхто не знае, / Хто і калі яе закончыць* (М. Танк. Ёсць адна песня песняў...)

*З агню наш хлеб і песні / І самі мы народжаны з агню* (С. Законнікаў. Урбаны).

*Заспявай ты мне песню такую, / Каб душу мне паліла яна, / Каб у ёй ты нядолю людскую / І ўсё вычарпаў гора да дна... /* (Я. Колас. Песняру).

*Заўсёды песні лечаць, / нават горкія калі...* (А. Зэкаў. Матуліны песні).

*І салаўя не радуе вясна, / Калі з грудзей не льюцца самі песні* (А. Бачыла. Што можаш здзейсніць...).

*Каб песню, вартую народа, / На поўны голас шчыра спець – / Што трэба творцу? Вельмі многа! – Радзіму ў сэрцы трэба мець!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Калі вы далоні злучылі навек, / Каб крочыць дарогай адною, – / На шчасце, на згоду, як дар-запавет – / Песню бярыце з сабою!* (Н. Гілевіч. Песню бярыце з сабою).

*Калі не складаецца песня, / Сумей / Адмовіцца слабую скласці* (Ю. Свірка. Калі не складаецца песня...).

*Калі песня не грэе / У мароз і завею, – /Дык нашто твая песня!* (Л. Якубовіч. Чалавеку).

*Калі пяецца песня, / Тады мілей паход* (А. Александровіч. Сонца і песня).

*Каротка, песня, ты, каротка! / І заціхаеш так не ў часе!* (Я. Колас. Новая зямля).

*Колькі жыць на свеце будуць людзі, / пра адно спяваць ім птушка будзе. / І ніхто не ў крыўдзе на яе, / што старую песню зноў пяе* (А. Вольскі. Мы адны...).

*Мне з песняй / трэба уваскрэснуць / І над самім сабой / паўстаць...* (С. Законнікаў. Спрадвечны круг жыцця і смерці...).

*Нават сумная песня – / не плач па жывым чалавеку* (Д. Бічэль-Загнетава. Ефрасіння Полацкая).

*Навек астанешся ты песняй няспетай, / Мая Беларусь* (А. Бачыла. Ёсць дальнія землі, там вечнае лета).

*Нам песня – тое, што і хлеб* (С. Законнікаў. Родная песня).

*Народ без песні – не ўмее, / Народ без песні – нямее* (А. Грачанікаў. Народ і песні).

*Не прыдумаць цяплейшага краю / за родную песню* (Д. Бічэль-Загнетава. Ты – гэта ты).

*Не ўзнікне прызыўная песня, / Калі анямее пясняр* (І. Ралько. Не родзіцца мудрае слова...).

*Не цурайцесь роднай песні ў шчасці і ў жалобе* (Я. Купала. Падсякайце тое дрэва).

*Не я пяю – народ божы / Даў мне ў песні лад прыгожы* (Я. Лучына. Не я пяю).

*Няўжо ж тая песня спета, / І ёй водгулля няма?* (Я. Колас. Сымон-музыка).

*Няўжо наш век аглухне і адвернецца / Ад гэтых песень, што спявае мама?* (Н. Гілевіч. А дзе ж тая крынічанька?).

***О**, колькі можа нам жанчына / Сказаць у песні – пра сябе!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

***П**акуль песня – ў хлебе, хлеб – у песні* (А. Пысін. Падымаецца камочак...).

*Песень дар – агонь душы і сэрца жар* (Я. Колас. Сымон-музыка).

*Песні, знайце, – сэрца дар* (Я. Купала. Песня аб песнях).

*Песня вольная / Вольную мае душу, / Не пяецца ў няволі ніколі* (Р. Барадулін. Заваёўнікам трэба песняў...).

*Песня – душа мая ў слове* (Л. Геніюш. Пясняр).

*Песня і праўда – бясцэнныя злiткі!* (Я. Янішчыц. І прасвечваюць нашыя сэрцы).

*Песня мая не ўзышла сярод кветак* (Я. Купала. Песня мая...).

*Песня мая не шукае чырвонцаў* (Я. Купала. Песня мая...).

*Песня не ведае скону і тлену. / Дзедава песня – эпохі арган* (Н. Загорская. Дзедава скрыпка).

*Песня не носіць ярма* (Р. Барадулін. Няма народаў малых...).

*Песня помніць: / Адступіся яна ад людское душы – / І ўжо не ўберагчы /Анічым / Чалавека* (Н. Мацяш. Песня).

*Песня пташкі ўсім належыць, / не належачы нікому* (В. Жуковіч. Воля).

*Песня-споведзь / Умее абмываць душу* (А. Пысін. Хмарынку ручаі напояць...).

*Піце з чыстай крыніцы, з напеваў матчыных, / Сцеражыцеся, хлопцы, частушкі таннай, / Паважайце, любіце бацькоўскую спадчыну – / Ўсё сплыве, а легенды і песні застануцца* (У. Караткевіч. Энтузіясту).

*Спяваеш добра, ды ці тое? / Вярзеш, брат, грушу на вярбе* (Я. Колас. Новая зямля).

*Сярод людзей / Без песні – няма надзей* (А. Грачанікаў. Народ і песні).

*Таму лепш песень не дарыць, / Хто сам свае спявае* (Ю. Свірка. Я лесу песню падарыў...).

*Ты любіш народ свой і край? / Песні яго спявай* (А. Грачанікаў. Народ і песні).

***У** кожнай песні доля свая, / Адной – лунаць у нябёсах, / Другая між траў / У смутку чмяля / Шукае мядовага лёсу* (Н. Тарас. У кожнай песні доля свая).

*У кожнай песні свае тоны / I свой адбітак глыбіні* (Я. Колас. Мой дом).

*У песні ёсць аснова / Той таямнічасці жыцця, / Перад якой нямее мова / Ад лішку мар і пачуцця* (А. Грачанікаў. Бясконцыя рэйкі).

***Х**ай песня будзе, як песня. / Ганаровы у песні удзел: / Яна не напітак прэсны, / А самы моцны хмель* (Л. Геніюш. Пясняр).

*Хацела словы слаць прывету, / А выйшла песня незнарок* (Н. Тарас. Тваё маўчанне – зноў загадка...).

*Хіба без песні жыў чумацкі шлях?* (Я. Янішчыц. Тарасаў шлях).

*Хто з песняй ды танцам сябруе, той і грашыць меней* (І. Жарнасек. Апошняя дзея).

*Хто склаў песню народу, / Яе рэхам уваскросне* (М. Танк. Той, хто дрэвы садзіў...).

***Я**кая песня ў лебедзя? /Як лебедзь* (У. Някляеў. Майстры вясны).

*Якія песні – такі й лад./ Які мінор – такія й гуслі* (В.Аколава. У вянок Максіму Багдановічу).

*Яшчэ ў пупышках новае лісцё,/ Якому песню сонца пець старую...* (Н. Мацяш. Яшчэ ў пупышках новае лісцё...).

# *«АД ІСЦІНЫ – ДА ІСЦІНЫ: ХАДЫ – НА ВЕК ЖЫЦЦЯ»*

## Ісціна, праўда, праўдзівасць

***А****д ісціны – да ісціны: хады – / На век жыцця... ні кроку болей* (В. Аколава. Князь ты мой, Славамір).

*Ад праўды раз адкруцішся – / Няпраўдаю атруцішся* (П. Панчанка. Нешта пройдзена).

*Акно – самы просты тэлевізар у свеце* (У. Рубанаў. Светлы ручай любві).

*А нашча хмеліць і вада* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Апраўданне – гэта заўсёды даraванне* (У. Рубанаў. Светлы ручай любві).

***Б****ез праўды людзі робяцца злыя! Нават добрыя людзі! Нават дзеці!* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Бывае, і відавокі – ад сляпога / Народзіцца* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

***В****аляцца ўсе шышкі / Нават на ньютонаў зверху ўніз* (А. Русецкі. Другі пачатак).

*Выбраўшы вечнае, ісціну можна не выбраць* (У. Някляеў. Паляванне).

*Вышэйшай праўды чыстая крыніца / Знайшла б з пячорных нетраў верны ход, / Каб праз хлусні чысцілішча прабіцца / Ва ўсёй красе да сонечных варот!* (А. Звонак. Кругазварот).

*Вядома, хто дальш ад кватэры, / Таму менш стукаюць у дзверы* (Я. Колас. Новая зямля).

*Голыя факты, як і голых людзей, не заўсёды і не кожнаму прыемна бачыць* (К. Крапіва. Біблія).

*Дзе вынік – там і фініш* (А. Разанаў. Зномы).

*Дзе плачуць, там, канечне, не смяюцца, а дзе смяюцца, там можна часам і паплакаць* (Я. Сіпакоў. Абсурд).

*Добры чарпак з рэшата, / Ды толькі з яго не піццё* (М. Танк. Добры з ваўка музыка...).

*Доктар доктару вока не выклюе* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Ды ёсць жа ты, праўда, на свеце, / Ды ёсць жа ты, вечны закон* (Я. Колас. Адплата).

*Дэвальвацыя праўды і веры – / Як трывогі апошні званок...* (Г. Бураўкін. Дэвальвацыя).

*Ёсць жа вялікая праўда на свеце – / Праўда, сілаю роўная сонца агням* (Я. Купала. Можна).

*Жарт не вымерзне зімой* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

*Звяргае догмы ісцін рух упарты, / І пал любві нясе ў ядры сваім / Зародак той, што ўсіх адкрыццяў варты* (А. Звонак. Індэкс).

*Згіне ліха, бо на свеце / Праўда ёсць* (Я. Колас. Рыбакова хата).

***І*** *кожны з нас цяпер не мае права / Маўчаць або ружовенька маніць. / Эквівалентам нейкім іншым праўду / У гэтым свеце нельга замяніць* (С. Законнікаў. Кульмінацыя).

*І можа, ісціна у гэтым. / І мэта – ў вечнай барацьбе / Твайго маленечкага свету / З тым, што не змесціш у сабе?* (С. Дзяргай. Бывае сум...).

*Інтэлігенцыя не ўся і не заўсёды бывае інтэлігентнаю* (Я. Брыль. Сёння і памяць).

*І сёння трэба ў полі праўду сеяць. / Бо што пасеем, тое і пажнём* (Л. Геніюш. Я не спяшаюся).

*Ісціна – / вечнае. / Звыш – / толькі* ***выбар яе*** (У. Някляеў. Паляванне).

*Ісціна нагадвае яшчарку: яна хаваецца ад даследчыка, пакідаючы яму свае аўтографы – хвасты* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

*Ісціна не ў віне, не ў вайне. /Ісціна ў нашых дзецях* (Л. Дайнека. Ісціна).

*І ці можна праўду важыць, / МерацЬ на разліў?* (С. Законнікаў. Праўда наша...).

***К****аб не трымацца рэкам берагоў, – / Дык не зазнаць бы ім ніколі мора* (Н. Тулупава. Сустрэча з ракой маленства).

*Каб сонца засланіць – вушэй асліных мала* (К. Крапіва. Сава, Асёл ды Сонца).

*Каб узляцець, патрэбен штуршок, – / Ісціну сцвердзіў вопыт...* (В. Зуёнак. Штуршок).

*Каб хтосьці мог вышэй узняцца ўгору, / Павінен нехта апусціцца долу* (А. Звонак. Радкі жывуць, напоўненыя верай...).

*Какецтва і флірт – не ўменне, а паталогія* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Калі бачыш, што нічым значным не застаешся ў гісторыі, адшукай хаця б аднаго вялікага, які нарадзіўся з табой у адзін дзень, і ты суцешышся* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Калі будзеш есці* [яблык] *– ён будзе горкі, а калі з'есца – стане салодкі, у ім* *р а з у м е н н е:* *бяры, каштуй...* (А. Разанаў. Дрэвы).

*Калі ёсць пакуты, трэба, каб было і выйсце з іх* (Я. Сіпакоў. Клетка).

*Калі ёсць тупік, трэба, каб і сцежка ад яго нарадзілася* (Я. Сіпакоў. Клетка).

*Калі няма сваёй рукі, не разлічвай на цуд* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Калі расстаешся з богам, / Шукай да людзей дарогі* (П. Макаль. Калі расстаешся з богам...).

*Калі розум слабаваты, / Не віні падкоўкі* (М. Лужанін. Вожык і заяц).

*Калі роўныя тры дубочкі, / то каторы з іх лепшы?* (Е. Лось. Неспакойныя ночкі...).

*Калі ўсё звесці толькі да самога сябе, дык не назаўсёды ж самога сябе хопіць* (Я. Брыль. Вячэрняе).

*Карані не трэба чапаць, ісціны ў іх няма: там адно толькі пануе змрок і вызмейваецца жах. Ісціна* каранёў

*па-за імі, над імі – у кветцы* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

*Карэнне ў дрэва ёсць апроч ствала, / Апроч карэнняў прагных ёсць насенне* (А. Куляшоў. Адзіным дрэвам дружбы мы раслі...).

*Крыкі спрэчкі не развяжуць* (Я. Колас. Паслушная жонка).

***Л**епшае – заўсёды вораг харошага. Але горшае – гэта ўжо сябра і памочнік лепшага, бо яно нібыта падымае харошае на якую падстаўку, нібыта высвечвае з усіх бакоў і дапамагае ўбачыць усе самыя цудоўныя і прывабныя яго якасці* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Лепш падаць і ўставаць з нялёгкай ношаю, / Чым злёгку папіхаць яе рукой* (А. Куляшоў. Мой новы год).

***М**аўчанне адназначным не бывае* (У. Караткевіч. З абмона хтось крычаў пра шлях да раю).

*Маўчанне / Ніколі не было / І не будзе золатам: / Яно – або / У шмат разоў даражэйшае, / Або – нічога не вартае* (М. Танк. Маўчанне).

*Мёды п'ём, а душыць смага:/ Што ні кропля, то гарчэй* (Я. Янішчыц. Жораў ты, а я – сініца...).

*Можна верыць у парадак, / а ў непарадак як паверыш ты?* (А. Вярцінскі. Колькі лет, колькі зім!).

*Мозг – унікальны млын. Ён усё змеле* (Г. Марчук. Голас і слова).

***Н**айлепшы сведка Праўды – Мана* (Г. Марчук. Голас і слова).

*На магілах не сеюць пшаніцы. / З чужой крыўды не вырасце доля* (Л. Геніюш. На магілах не сеюць пшаніцы...).

*На папялішчы не шукай / прасветленай усмешкі. / На выкашаным лузе – / першацвету* (Н. Загорская. На папялішчы не шукай...).

*На свеце тайн такіх няма, што асталіся б не раскрыты* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*На святло і ружы – голаду няма* (В. Аколава. Малюнкі словам).

*На скрыжаванні дабрыні і зла / І ў грэшнага – святыя – ёсць памылкі* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

*Настойлівасць – твар упартасці, настырнасць – яе рукі* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Не абняць / Ніколі неабдымнае...* (А. Сербантовіч. А я цябе прыдумаў сам...).

*Не бывае рознай праўды – рознай бывае хлусня. Зменлівая і здольная мяняць сваю скульптуру ў адпаведнасці са зменлівымі ўмовамі жыцця* (А. Дудараў. Самы цяжкі на свеце крыж).

*Не было і не будзе ніколі, / Каб хадзіў ясны месяц назад* (Я. Колас. Народу-барацьбіту).

*Не вінаваты высакосны год, /Што пражыта бедаў да скanання...* (Е. Лось. Не вінаваты высакосны год...).

*Не водзяць да царквы любоў і страх за рукі, – /Хто ісціну шукаў – век ходзіць без прынукі* (В. Аколава. Случарыны).

*Не вяртаецца ў неба / Раскуты прамень* (Л. Паўлікава. Тэатр лялек).

*Не загаснуць зоркі ў небе, / Покі неба будзе!* (Я. Купала. «Нашай ніве»).

*Не наракаю на люстэрка: / У ім, на жаль, адбітак мой* (А. Пісьмянкоў. Узрост. Няўжо, браток, узрост?..).

*Не прыйдзе шчасце без прычыны, / Без мужнасці не выстаіць баец, / Без гора не прарэжуцца маршчыны, / Без веры не загоіцца рубец* (С. Грахоўскі. Сэрца).

*Не прыходзіць рака / У абдымкі вытоку* (Л. Паўлікава. Тэатр лялек ).

*Не тое пярцо, не тое крылцо / У сокала, як у голуба* (В. Аколава. Случарыны).

*Не трызняць бяссрэбранікі серабром* (А. Вярцінскі. Бяссрэбранікі).

*Ніхто, нават Цар, не можа зрабіць так, каб сонца заходзіла часцей, чым яно ўзыходзіць* (Я. Сіпакоў. Заложнік ).

*Ніхто не чуў на свеце штосьці, / Каб стаў гусак арлом хаця б ад злосці!* (А. Звонак. Гусак і арол).

*Новае з праху / не ўзыдзе ніколі* (А. Пісьмянкоў. Знямелае дрэва...).

*Няма дарогі да шчасця, ёсць дарога да ісціны* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Няма патрэбы хваліцца тым, што ад пачатку і назаўсёды твае* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Няхай душу не пудзіць / Зняверанасці тля. / За праўду стойце, людзі, – / І ўспомніць вас Зямля* (С. Законнікаў. І ўспомніць вас Зямля).

*Няхай жыве няведанне – яно, / адно яно не ўмее памыляцца* (А. Разанаў. Паэма калодзежа).

**П***акідае праўда кут – / крыўда тут як тут* (В. Жуковіч. Двухрадкоўі).

*Паміж праўдай і выдумкаю, падобнаю да праўды, трудна, мой дружа, правесці мяжу* (Я. Колас. На ростанях).

*Паслугачкай, / як ні пніся, / Праўду не зрабіць* (С. Законнікаў. Праўда наша...).

*Персцень не ў дарунак, калі ён – чужы* (В. Аколава. На рацэ Прыманцы).

*Перш чым браць, трэба даць* (Я. Пархута. Філасофія).

*Прастата, якая не прайшла стадыі складанасці, – прымітыў* (А. Разанаў. Зномы).

*Праўда ёсць на белым свеце / І на ўсіх – / адна* (С. Законнікаў. Праўда наша).

*Праўда – люксус для выбраных, / воля – капрыз адзінак* (Л. Геніюш. Успаміны).

*Праўда наша, / праўда ваша.../ Хто ж яе дзяліў?* (С. Законнікаў. Праўда наша...).

*Праўда не святая, што была ў ілжы* (В. Аколава. На рацэ Прыманцы).

*Праўда не ў тым, што нас папіраюць. / Ісціна ў тым, што без нас – паміраюць* (Н. Мацяш. Прастрань кахання).

*Праўда – посах пільгрыма / ў бездарожжы жыцця...* (Л. Геніюш. Йду шляхамі крутымі...).

*Праўда, прыкрытая дзяружкаю, цікавей за голую праўду* (Я. Колас. На ростанях).

*Праўда – самы цяжкі на свеце крыж* (А. Дудараў. Самы цяжкі на свеце крыж).

*Праўду здабываць трэба з боем* (Я. Колас. На ростанях).

*Раны соллю не засыпаюць* (Б. Сачанка. На хутары ў Вахлака).

*Рука ў руку з хлуснёю / Праўда / Не пойдзе – хоць звяжы! / Бо праўда свет кіруе ў заўтра, / Хлусня – да гібельнай мяжы* (Н. Гілевіч. Каму і з кім не па дарозе).

*Салавейку ж і ў непагадзь / трэба пець!* (М. Арочка. Салавей).

*Самае простае і самае цяжкае – гэта праўда* (В. Іпатава. Авантура).

*Сіла ломіць мур* (А. Вялюгін. Вецер з Волгі).

*Сон – не заўсёды асалода* (А. Грачанікаў. Шлюбныя ночы).

*Стагоддзі, бы кіты, плысці, / Пакуль – у муках – зможа наш нашчадак / Да сутнасці нябеснае дайсці* (М. Рудкоўскі. Мы думаць будзем...).

*Суддзя галоўны мой – маё сумленне, / А ісціна – адзіны ў свеце бог* (М. Рудкоўскі. Развеяў я і горыч і сумненні...).

*Такая круглая зямля – / З самім сабой не размінуцца* (А. Жыгуноў. Неспадзявана рыпнуць дзверы).

*Таму Янка і галее, / Што папраўдзе жыць умее* (Я. Колас. Як Янка забагацеў).

*Тое, што без цяжкасці атрымана, – / Без цяжкасці душэўнай / Аддаюць* (А. Бачыла. Я не пішу...).

*Тое, што відаць усім, – кропля, а тое, што павінны былі ўсе бачыць, – не бачна нікому* (Я. Сіпакоў. Адзін з нас).

*Тое, што здаецца нам будзённым, / Нібы свята, ўспомніцца пасля* (П. Панчанка. Вецер груккнуў форткаю).

*Тое, што потым, здалёк успамінаецца як шчасце* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Трывала тое на паверхні, / Што даспявае ў глыбіні* (А. Пысін. Пражытага растуць паверхі...).

*У квадрата чатыры вуглы. / Хай вялікі ці самы малы, / А ўсё роўна, як ні павярні, –/ У квадрата чатыры вуглы* (А. Глобус. Квадрат).

*У кожны момант і на кожнай мясцінцы зямлі адбываюцца найцікавейшыя рэчы і складаюцца самыя дзівосныя казкі, падобныя іншы раз да праўды, і нараджаецца праўда, яшчэ болей цікавая часамі, чым сама казка* (Я. Колас. Залаты прамень).

*У самых мудрых – самы горкі лёс* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Усё дапушчальна, калі дапускаем...* (З. Дудзюк. ЧДУ).

*Усё міне, а праўда застанецца, / І толькі ёй адной заўсёды жыць* (А. Звонак. Усё міне, а праўда застанецца...).

*Усё міне, а праўда застанецца, / На ўсё жыццё пакіне росчырк свой* (А. Звонак. Усё міне, а праўда застанецца...).

*У тэатр папасці лёгка, за куліcы трудна* (К. Чорны. Сястра).

*Уяўленне аб рэчаіснасці і сама рэчаіснасць – розныя рэчы* (Я. Колас. У глыбі Палесся).

*Хай спеюць няспешна ісціны* (А. Бачыла. Ну колькі тае карысці нам).

*Хваробы лечаць і атрутамі* (М. Багдановіч. Уступ).

*Хіба ж высока ўзняцца вераб'ям / Над вышынёй пустой мякіннай кучы?!* (А. Звонак. Наканаванасць).

*Хоць з наўпростай дарогі / Смяецца крывая, / Праўда ходзіць / Наўпростай дарогай здаўна* (Р. Барадулін. Праўда ўперадзе...).

*Хоць прыйдзе спёка, мароз лютуе – / Зярняты праўды зямля ўзгадуе!* (Л. Геніюш. Сёння аб сцежках нялёгкай долі...).

*Хоць часам праўда / прад маной / і гнулася, / Ды не на гэтым белы свет стаіць...* (С. Законнікаў. Усё было, але сваёй гісторыі...).

*Хоць шмат на свеце ёсць маны, / Для праўды ж – не – няма труны: / З вады ўсплыве яна і з мроку* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Хто нараджаецца, той не пытае, што яму рабіць* (К.Чорны. Вялікі дзень).

*Хто стане здзіўляцца, што ў хаты ёсць дзверы, у поля – сланечнік, у неба – сонца?.. Здзіўляцца, што няма* (А. Разанаў. Паэма сланечніка).

***Ц**уд, каб часты быў, не зваўся б цудам* (Н. Мацяш. Ода дзівосна прыгожаму чалавеку).

*Цэмент і моцны, і выклікае давер, але без слабога і мяккага пяску не абыходзіцца* (Г. Марчук. Голас і слова. Афарызмы).

*Цяжкая цана / Ісціны, што глеба ёсць пад намі, / Хоць часамі зыбкая яна* (А. Пысін. Ноч у Ташкенце).

***Ч**асамі да самых простых ісцін мы даходзім запозна* (Я. Скрыган. Спасціжэнне).

*Чым меней праўды, тым гусцейшы морак* (Н. Мацяш. Маналог Казіміра Лышчынскага).

***Ш**то ў небе ёсць, над галавой, / Свіння не бачыла ніколі* (К. Крапіва. Давялося Свінні на неба глядзець...).

*Што чакае за крутой гарой – / Высветліцца толькі на вяршыні* (Н. Мацяш. Паэма жніва).

*Шукаем ісціну.../ Яе не знае здавалёны, / яна сасмяглага вядзе* (А. Разанаў. Пункціры).

*Шырэй за берагі / Рэчак не бывае* (У. Някляеў. Скончылася лета...).

***Я** баюся таго, што ведаю* (А. Разанаў. Вучань чараўніка).

*Яблык ад яблыні коціцца / Ў рукі таму, хто народзіцца* (А. Пысін. Белыя яблыні, белыя...).

*Як злуешся – спрэчкі-звады / не высмечвай з хаты* (В. Аколава. Ой, ці ўзыдзе...).

*Якой бы святой ні была тая троіца, / Да троіцы той хтось чацвёрты прыстроіцца* (А. Вярцінскі. Заканамернасць).

*Як парад без салдат – не парад, / Так квадрат без вуглоў – не квадрат. / Як футболу патрэбны галы, / Так квадрату патрэбны вуглы* (А. Глобус. Квадрат).

*Як свет стаіць, то яшчэ не было вядома, каб на нянавісці вырасла шчасце, а радасць на чужой бядзе* (К. Чорны. Пошукі будучыні).

*Як цяжка ўсім да простых ісцін / Праз лес хлусні старой дайсці* (П. Панчанка. Ламае час былыя звычкі...).

## «ДА МУДРАСЦІ НЯЛЁГКАЯ ДАРОГА»

### Роздум, разважлівасць; розум; мудрасць; пазнанне, вопыт; звычаі, традыцыі, народныя прыметы

*Аўтарытэт – не абавязкова любаванне самім сабою* (Я. Брыль. Сёння і памяць).

*Афарызм – гэта разумна выказаная думка, якая жыла ў галаве філосафа, а цяпер будзе вісець на кручку мудрасці* (Я. Колас. Забастоўшчыкі).

*Афарызмы – гэта тэрміновыя тэлеграмы розуму* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Афарызмы ніколі не характарызуюць аднаго чалавека. Яны здольныя ахапіць усё чалавецтва. Але ж, як ні дзіўна, у іх прысутнічае нацыянальны каларыт аўтараў* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Ах, якая ты жорсткая ўсё-ткі, / мудрасць людская* (Н. Гілевіч. Песня ў аўтобусе).

**Б***алючай раны не дражні, / мудрым будзь, ды не мудруйся* (К. Кірэенка. Урок жыцця).

*Быць доктарам філасофскіх навук і філосафам – часцяком вельмі розныя рэчы* (Г. Марчук. Голас і слова).

**В***опыт людства ды ўласны наш вопыт / Прымушаюць нас у глыбіню / Кожнай з'явы глядзець* (Н. Мацяш. Адказ «Першацвету» на ягоную анкету).

*Вопыт пакаленняў нічому не вучыць... словы сведак – бяссільныя. Кожны мае прайсці свой шлях цаной страт і набыткаў* (Г. Марчук. Голас і слова. Афарызмы).

**Д***а мудрасці нялёгкая дарога* (А. Звонак. Мудрасць).

*Дзе вяселле п'юць – / Там і чаркі б'юць. / Дзе вяселяцца – / Там і хваляцца* (Я. Янішчыц. Павяртаюся да роду...).

*Дзякуй, пане, бо пазнаў ад вас і я, – /Не на трох кітах трымаецца зямля* (М. Багдановіч. Пан і мужык).

*Другім ямы не капай, / Чужой жонкі не чапай* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Другіх не папракай і не вучы, / А паспрабуй сябе перамагчы* (С. Грахоўскі. Перамога).

*Дрэннаму – не пакарыцца. / Добрае не празяваць. / З дробнай хлуснёй не мірыцца, / З буйнай хлуснёй выяваць* (П. Панчанка. Мала сказаць ненавіджу...).

*Д'яблу трэба паказваць люстэрка. Каб ён не думаў, што невідочны* (С. Алексіевіч. Зачараваныя смерцю).

*Ёсць галоўная кніга, якую чытаем-пішам, – мы самі, і галоўнае поле, якое праз век вырабляем – самі... Хто пісьменны тут, а хто цёмны...* (А. Разанаў. Паэма сланечніка).

*Ёсць глыбіні, у якіх мы не вызналі дна* (М. Арочка. Бяздоннае).

*Жалеза моцнае, але цярпенне і настойлівасць чалавечыя яшчэ мацнейшыя* (Я. Сіпакоў. Клетка).

*Запэцканага не бяры, аддавай назад таму, хто запэцкаў* (К. Чорны. Сястра).

*Заслоны мудрасці – гэта ўменне маўчаць, бо невук гатовы ўсё растлумачыць проста, бо будучыня толькі ўяўная* (В. Іпатава. За морам Хвалынскім).

*Зацішку не шукайце для сябе. / Зацішку не шукайце для дзяцей. / Зацішак нас саміх / у нас крадзе* (Н. Загорская. Не ліце слёзы...).

*З веку – мудрасць князёва ў беларускіх мужчын* (В. Аколава. Падарожнікі лёсу).

*Згубіць – не мудра. / Удзячліва – знайсці* (С. Панізнік. З-пад крыла душы).

*З-за вуха не сячы, / Пакуль не абмазгуеш* (В. Зуёнак. Сяліба).

*Зусім не хістаюцца слупы, асабліва – глыбока ўкапаныя* (Я. Брыль. Трохі пра вечнае).

*І, значыць, сонцу ёсць каму свяціць, / І, значыць, ёсць каму казаць дарогу, / І, значыць, ёсць на свеце мудрацы, / А ўсё астатняе за пазухай у Бога* (А. Звонак. Каму свеціць сонца).

*І маю шчаслівую падкову / Конь яшчэ не скінуў з капыта* (С. Законнікаў. Ён, здаецца, побач запаветны...).

*Імя даюць тады, калі яшчэ невядома, які чалавек будзе. А мянушку – па заслугах* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Каб адшукацца, трэба спачатку згубіцца* (А. Разанаў. У лесе).

*Каб адысці – пагаснуць неабходна* (А. Разанаў. Паэма запаленых свечак).

*Каб зрабіць першы крок, / Патрэбна нам / Рука маці; / Каб, спатыкнуўшыся, / Зноўку падняцца – / Вера ў дарогу; / Каб адчуць цяпло сонца – / Дружба; / Каб не знаць адзіноцтва – / Радзіма* (М. Танк. Каб зрабіць першы крок...).

*Кажуць, шлях да пазнання доўгі і цяжкі. Ён бясконцы. Ніхто не паспявае за жыццё пазнаць самога сябе* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Калі да паўнаты адной з'явы, адной сістэмы дадаецца яшчэ нешта, яно, гэтае «звыш», не ўзбагачае яе,*

*а збядняе, парушае, пераарганізоўвае ў непаўнату* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і ісціну).

*Калі ж не колецца дзярвяка, / Дык у яе ўбіваюць клін* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Калі маўчанне – золата, дык замоўчваць недахопы блізкіх нават і проста выгадна: не патрацішся дарма найдаражэйшым* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Калі мудрасць прыходзіць – / быць мудрай пара* (В. Аколава. На рацэ Прыманцы).

*Калі пайшоў, здружыўшыся, у лес / З ваўкамі – паваўчынаму і вый* (М. Танк. Янук Сяліба).

*Калі справа не пад сілу, / Дык на плечы не бяры* (М. Лужанін. Піва).

*Калі хочаш быць разумным чалавекам, то бяры прыклад ад разумных людзей* (А. Чарнышэвіч. Світанне).

*Кожная гісторыя, пакуль стане гісторыяй, абапёртай на факты і дакументы, – пачынаецца з легенды ці казкі* (М. Танк. Лісткі календара).

*Круты палёт пчалы руплівай, / Карона сонца ў вышыні / І немаўлятак смех шчаслівы – / Ва ўсім пазнання карані* (С. Законнікаў. Дзівосы ўсюды прыкмячаю...).

*Лес не сякуць языкамі* (К. Крапіва. Лясная казка).

*Лётаць і лунаць / На вышыні / Маеш права – / Поўзаць немагчыма!* (Р. Барадулін. Вышыня).

*Ліпаю ў печы не паляць. Душа ліпы ў агні плача* (Г. Марчук. Канон хаце).

*Маламу веліччу быць хочацца заўсёды* (К. Крапіва. Саманадзейны конь).

*Малы палёт – малыя веды* (У. Корбан. Вераб'іны далягляд).

*Малы разгон, а ўзмах вялікі* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Моц розуму – хіба не ў аддаленні / Ад зла?* (М. Арочка. Курганне).

*Мудрасць – багацце людзей, якія ўжо збяднелі на цэлую маладосць!* (М. Стральцоў. Чалавек – гэта цэлы свет).

*Мудрасць здолее ў цемры свяціць* (Л. Геніюш. Скарына).

*Мудрасць крылатая, яна, як насенне дуба, ляціць і ўкараняецца ўжо на вечнасць* (Л. Геніюш. Споведзь. Прага).

*Мудрасць – не ад барады* (В. Аколава. На рацэ Прыманцы...).

*Мудраца і шэпат чутны/ Незалежна ад пагоды* (Р. Тармола-Мірскі. Не крычы: ты самы-самы...).

*Мудры чалавек ніколі не скажа, што ён мудры* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Мы плацім за пазнанне нязменнаю цаной* (А. Разанаў. Эксперымент).

*На свеце часта бывае так, што самая простая справа, самая ясная праўда пазнаецца цаной вялікай пакуты, – надта цяжкая дарога прыводзіць да такога пазнання* (Я. Колас. Стары лес).

*Не адказвай на брэх сабакі, / Калі цябе кліча ворыва...; / Не адказвай на брэх сабачы, / Калі цябе кліча поліва* (П. Макаль. Нам заўсёды даюцца ў знакі...).

*Не адкладвайце на потым / добрых спраў, / Не адкладвайце на потым / справядлівасці* (П. Макаль. Ты маўчаў тады...).

*Не быць у чэрствасці ў палоне / І даражыць на ўсе часы / І крошкай хлеба на далоні, / І нават кропляю расы* (А. Пысін. Карабельныя сосны).

*Не кіньце каменем – / у неба Памяці. / У неба прыязні. / У неба даверу. / У неба любові, / у неба надзей / не кіньце каменем* (Н. Загорская. Не кіньце каменем...).

*Не любіся з дзеўкамі ў жыце / і ў красках не любіся, / бо колькі каласоў зломіш – / столькі людзей / ад голаду сканае, / а колькі красак звяне – / столькі дзетак / на свет не народзіцца* (У. Арлоў. Вучыла бабуля).

*Не памагайце, калі не просяць, / І не прыходзьце, калі не клічуць* (П. Макаль. Дапамога павінна быць хуткай...).

*Не помсці за крыўды, плаці лепш дабром, – / Не з кожнай маланкай сябруе і гром* (В. Аколава. Случарыны).

*Не прызначай / сустрэчы на хаўтурах, / не замуці сірочае слязы* ( Н. Загорская. На папялішчы не шукай...).

*Не разбурай п'едэсталаў, усё роўна на іх нехта павінен стаяць* (Я. Скрыган. Дзядзька Цішка).

*Не разбурай страху над галавой, / Бо сёння сонца, заўтра ж – / Дождж пальецца...* (А. Астрэйка. Не разбурай страху над галавой...).

*Не разбурай таго, што ёсць* (Н. Мацяш. Зялёны ліст, чырвоны квет).

*Неразумны ў мудрага сэрца будзе рабом* (Р. Барадулін. Нічога не забываецца ў злапомлівым свеце...).

*Не спі, калі сонца сядае, / бо заснеш з ім разам, / а ўранні ўжо не прачнешся* (У. Арлоў. Вучыла бабуля).

*Не стаў сабе дачасна помнік /І ў неўміручасць не спяшы* (П. Панчанка. Думаю, думаю...).

*Не стварайце сабе багоў!* (Г. Бураўкін. Не рабіце з людзей багоў...).

*Не ступай у чужыя сляды / На бацькоўскай зямлі запаветнай* (Н. Гілевіч. Як бяздольнік-жабрак...).

*Не таго патрэбна славіць, / Хто на лёдзе замкі ставіць* (В. Дунін-Марцінкевіч. Літаратурныя клопаты).

*Не тое лепшае, што навейшае, / А тое лепшае, што раднейшае. / Не тое лепшае, што вышэйшае, / А тое лепшае, што бліжэйшае. / Не тое лепшае, што прыгажэйшае, / А тое лепшае, што даражэйшае!..* (А. Вярцінскі. Домік маленькі, бачу я, знеслі).

*Не трэба хіміяй фарсіць, / А трэба з лёну ды аўчыны / На целе вопратку насіць!..* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Не хітрасць – прысягнуць, / А мудрасць – дасягнуць* (П. Панчанка. Не раз мы пад крывавымі сцягамі...).

*Нічога ў свеце больш няма / Мацней людскога розуму* (П. Броўка. Не страшны здзекі, ні турма...).

*Нязгасным – / асанна!* (В. Аксак. Грамнічная свечка).

*Няма іншай мудрасці для нас, чалавекаў, акрамя той, што трэба быць па-чалавечы добрым і мужным, – у часы бурнаплыннай маладосці і на марудлівым сконе дзён* (М. Стральцоў. Адзін лапаць, адзін чунь).

*Няма патрэбы хваліцца тым, што ад пачатку і назаўсёды тваё* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

***О** Божа, дай мне сілы не змяніць / Таго, чаго змяніць не ў сіле я... / І дай мне мудрасці, каб разлічыць, / Што – не пад сілу мне, а што – мой абавязак...* (Н. Мацяш. Душою з небам гаварыць).

***П**а зімах гадаюць пра лета, / Па з'явах – аб сэнсе падзей* (Я. Колас. Адплата).

*Палеткі мудрасці народаў – кнігі* (Д. Бічэль-Загнетава. Шарая гадзіна).

*Паслухмяным заўсёды меншы кавалак дастаецца* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Пацёмшчыкі святла не любяць* (Р. Барадулін. Пацёмшчыкі святла не любяць...).

*Прастата, якая не прайшла стадыі складанасці, – прымітыў* (А. Разанаў. Зномы).

*Пра юбіляраў і нябожчыкаў гавораць толькі добрае* (П. Панчанка. Думаю, думаю...).

*Прызнаю ўсё існае на свеце. / У звярах людзей не прызнаю* (У. Някляеў. Даведка аб нараджэнні).

**Р***озум заўсёды ваюе думкамі* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

**С***амы лёгкі тавар – розум* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Свае ў маўчанні ёсць граніцы, / Свая бяда, свае масты. / Ёсць у маўчанні таямніца / Ад мудрасці да прастаты* (Я. Янішчыц. Сябе нанова адкрываю).

*Спазнай самога сябе... Але як нельга прымусіць нанава гарэць т о е, што ўжо згарэла, – попел, так нельга спазнаць т о е, чым ты ёсць, і гэта таму, што я н о, гэтае т о е, ужо «спазнанае»...* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

**Т***ады выстойваюць падлескі, / калі выстойваюць лясы* (А. Разанаў. Запавет).

*Так спрадвеку, / Так ад бога: / Стрэчным двум – / Адна дарога...* (А. Лойка. Балада двух вяселляў).

*Таямніца – прысутнасць у адсутнасці* (А. Разанаў. Зномы).

*Тое, што відаць усім, – кропля, а тое, што павінны былі ўсе бачыць, – не бачна нікому* (Я. Сіпакоў. Адзін з нас).

*Той яснасць вока й думкі зберажэ, / Каму ў жыцці зазнаць прыпала многа* (А. Звонак. Мудрасць).

*Традыцыя не толькі дыялог таго, што ёсць, і таго, што было, але і таго, што будзе* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

*У вёсцы не любяць гнацца за жураўлём у небе, калі сініца ў руцэ* (М. Стральцоў. Трывожна крычыць птушка).

*У вёсцы так было адвеку: / Калі дасціпнае імя / Прышпіліць нехта чалавеку – / То не здзярэ і смерць сама* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Усё мае сваю мяжу, і толькі цярпенне наша, / о Божа, бязмежнае* (Я. Сіпакоў. Одзіум).

*Філасофія – гэта кругазварот думак чалавека* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Філосаф пра простых людзей кажа так: яны зведалі ўсё і не спазналі нічога ў гэтым свеце – няшчасныя людзі. Звычайны чалавек адзначыць: яны былі, зведалі гора і нястачу, каханне, радасць і сум – шчаслівыя людзі* (Г. Марчук. Голас і слова. Афарызмы).

*Філосафы любяць пачынаць свае разважанні тэмаю пра пачатак існага, але аб самім існым нічога зразумелага не скажуць* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Хваробы лечаць і атрутамі* (М. Багдановіч. Уступ).

*Хто глыбіні спазнаў, / Не прыходзіць назад* (Л. Паўлікава. Тэатр лялек).

*Хто намагаецца ўсяму надаць сэнс, той мудрэц* (Г. Марчук. Голас і слова).

***Ц**яжкасці дазваляюць ісці хутчэй. Кісцяпёрая рыба, выйшаўшы на сушу, «пайшла» хутчэй і «дайшла» да чалавека* (А. Разанаў. Зномы).

***Ч**асам глупства можа набыць славу мудрасці, калі яму не пярэчыць* (Я. Скрыган. Спасціжэнне).

*Чым больш пазнаём мы свет, тым меншую цану маюць для нас яго скарбы, тым болей бачым благога. Болей здзеку, крыўд і слёз* (Цётка. Шануйце роднае слова!).

*Чым больш пакут, тым болей сіл трываць* (Н. Мацяш. Пяты сезон).

***Ш**када, што розуму няма ў аптэках. / Ён выдаецца па рэцэптах Бога / Адзіны раз святы для ўсіх найгрэшных...* (В. Аколава. Мальер на мінскай Камароўцы).

*Шукаю заклінання ад распаду / Надзей на гэты цёплы мудры хлеб: / Ён пасланец жыцця, / Ён радзіць раду / З усімі, хто ў шаленстве не аслеп* (М. Арочка. Шукаю заклінання ад распаду).

***Я** – за прагрэс! І ўвесь мой клопат / У тым, што мы, мясцовы люд, / Не беражом, не цэнім вопыт, / Які ў вяках капіўся тут* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Як злуешся – спрэчкі-звады / не высмечвай з хаты* (В. Аколава. Ой, ці ўзыдзе...).

*Які дагляд – такі й прыплод* (В. Аколава. У вянок Максіму Багдановічу).

*Які пасеў – такі і высеў* (В. Аколава. У вянок Максіму Багдановічу).

*Як ні мудруй, ні пругайся, / А немагчыма, немагчыма / Адолець прыцяжэнне часу* (В. Аколава. Случарынкі).

*Я спытаў чалавека, / Які прайшоў праз агонь, / І ваду, / І медныя трубы: / – Што самае цяжкое / На гэтым свеце? / І ён адказаў: / – Прайсці праз вернасць* (М. Танк. Я спытаў чалавека...).

*Яшчэ асаблівасць усіх ступеней: / чым вышэй – тым месца меней, / чым вышэй, / тым падымацца цяжэй і цяжэй* (П. Шруб. Аксіёмы лесвіц).

## *«ДУХОЎНАСЦЬ – СВЯТАЯ ЖЫВЫМІ»*

### Дух, душа, духоўнасць; Бог, вера, святасць

***А** багатая душа маладая, /Бо старэць ёй няма калі. / А багатая душа галадае – / Не пякуць ёй хлеб на зямлі* (Р. Барадулін. А як жывецца...).

*Адвечная дылема для чалавека – калі не скараешся Богу, не супрацьстаіш д'яблу* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Адзін Гасподзь – /Надзейная апора / Ўсяму, што ім задумана, ўсяму* (Р. Барадулін. Сцяна плачу...).

*Адна толькі культура працуе на дух. Усё астатняе – на жывот...* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*А душа наша – ўся са спагады* (Я. Сіпакоў. Ёсць жа людзі...).

*Адчувае душу чужую, / Хто пачуў цішыню нябёс* (Р. Барадулін. Толькі той).

*А калі бог захоча цяжка пакараць чалавека, ён задавальняе ўсе яго пажаданні* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Акрылёная душа – святкуе штодня!* (У. Ліпскі. Снег на галаве).

*А на зямлі паланянку-душу / Толькі / Туга па радзіме трымае* (Р. Барадулін. Нешта птушынае...).

*Анёл – ужо таму не анёл, / што ёсць сатана, ёсць д'яблы* (А. Вярцінскі. Бунт анёла).

*Апосталы прыходзяць на зямлю, / Каб нагадаць паспець, / Што ўсіх чакае...* (Р. Барадулін. Апосталам балюча на зямлі...).

*А спярша – / Патрэбен плач, каб болем спелым / Магла напоўніцца душа* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Астудзім так яго* [сэрца], *і ўжо не сэрца будзе, / А торбачка крыві, што ні сабе ні людзям* (М. Лужанін. Дарада сэрцу).

*Атэіст – гэта не той, хто не верыць у Бога, а той, хто намагаецца паставіць сябе на яго месца* (Г. Марчук. Голас і слова).

**Б***агаты духам той, хто дорыць многа, / Убогі – хто не дорыць, а бярэ* (А. Звонак. Дзіва).

*Багоў заўжды на свеце многа, / Бо чалавекам быць – цяжэй* (В. Зуёнак. Я не кумір – я чорны раб).

*Байцам тэхнічнага прагрэсу / Не забыцца б на прагрэс душы* (С. Законнікаў. Да пытання пра акаляючае асяроддзе).

*Балюча насіць у сабе скарб і не карыстацца ім* (Я. Сіпакоў. Яма).

*Без Бога жыць можна, але з Богам у душы надзейней і спакайней* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Беларусь адродзіцца Вераю* (Р. Барадулін. Вераю).

*Беларусь утрымалася вераю* (Р. Барадулін. Вераю).

*Блізкай дзе няма душы, – / Пустыня* (Н. Мацяш. Скарга дзікай яблыні).

*Бог абірае таго, хто сам сябе здольны абраць* (А. Разанаў. Заваёўнікі).

*Бог апошнім падзеліцца ў кожнай долі / І пра гэта не напомніць ніколі* (Р. Барадулін. Ксты).

*Бог – таму і бог, што яму ўсё вядома!* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

*Бог – чалавек! І чалавек, вялікі / Сваёй вялікай верою ў людзей!* (Т. Бондар. Белая літара).

*Бог – чалавек, распяты на паперы / Усіх ілжэвучэнняў пра яго* (Т. Бондар. Белая літара).

*Бог чуе тых, / Хто даравання просіць* (Р. Барадулін. Зрачэнец).

*Божа! Жабрацкую торбу не дай – / Душою не дай ажабіцца* (У. Някляеў. Зона).

*Божа, ратуй мяне ад самай большай спакусы і граху – паўтарэння і пераймання* (М. Танк. Лісткі календара).

*Будзе жыць Беларусь, / таму што ў прызначаную пару / сыдзе з крыжа Хрыстос* (Л. Рублеўская. Балада пра драўлянага Хрыста).

*Будзь як на споведзі / Перад сабой* (Р. Барадулін. Як на споведзі).

*Была б ікона – знойдзецца святы!* (В. Зуёнак. Сяліба).

*Вялікае шчасце – / Душою наноў нараджацца* (К. Кірэенка. Яшчэ раз спаткацца).

*Вяльмуе Бог абраннікаў сваіх. / Без іх / На сэрцы свету халадае...* (Р. Барадулін. Вяльмуе Бог...).

*Вярні нам Бацькаўшчыну нашу, Божа, / Калі ты Цар і неба, і зямлі!* (Я. Купала. Цару неба й зямлі).

*Гаварыць штодзень пра Бога і Смерць яшчэ не прыкмета геніяльнасці...* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Гадае той аб прышласці далёкай, / Хто верыць у сучаснае душой* (П. Глебка. Нашто гадаць і марыць аб далёкім...).

*Гасподзь схіляецца да ўсіх, / Ды духам ніцых ён не чуе* (Н. Мацяш. Не чуе).

*Да раю – грахоў / Не пушчаюць завалы, / Да пекла – нібыта / Яшчэ іх замала* (М. Танк. Аптымістычная рэзігнацыя).

*Да споведзі прыходзіць кожны з нас, / Грахоўны больш ці менш сваёй істотай* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

*Дзе нам баліць, там і душа: / З душы ўвесь чалавек сабраны* (Я. Сіпакоў. Дзе нам баліць, там і душа...).

*Дзень палохае і Бога з развянчанага парога* (В. Аколава. Случарынкі).

*Дзе толькі сытасць – там душы няма* (Н. Мацяш. Тры каласкі любові і смутку).

*Дзякуй богу, што бог сярдзітым людзям не дае многа сілы* (Я. Колас. Дзяліцьба).

*Для бездухоўнага чалавека не існуе паняццяў радзіма, народ* (Г. Марчук. Голас і слова. Афарызмы).

*Для раскрытай душы / Немата – / Гэта горш, чым вачэй / Слепата* (У. Нядзведскі. Немата).

*Добра быць коласам; але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком. Бо нашто каласы, калі няма васількоў?* (М. Багдановіч. Апокрыф).

*Добра, што сэрца не знае верлібраў, / А роўна адлічвае кожны удар* (С. Грахоўскі. Трактат пра верлібр).

*Дух абнаўлення – цудадзейны дух, / У новы дзень нам паскарае рух* (А. Грачанікаў. Спакуслівы сучаснасці пірог...).

*Духоўнасць – святая жывымі* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

*Духоўным карміцеся змоладу хлебам* (В. Аколава. Случарыны).

*Дух уратуецца вечнаю верай* (С. Законнікаў. На валатоўцы).

*Душа – адзіны храм, дзе Бог жыве* (Р. Барадулін. Адзіны).

*Душа беларуса – / Вечная каня, / Якая адводзіць бяду ад гнязда...* (Р. Барадулін. Адводзіць...).

*Душа / Вернападданіцай Хрыста / Паўторыцца нанова, як абнова* (Р. Барадулін. Ён цяжка нёс...).

*Душа вяртаецца дадому / Да першавоч, / Да першасноў* (Р. Барадулін. Душа вяртаецца дадому).

*Душа – гэта сонца, / якое і грэе, і свеціць, / жыццё наша / ўсмешкамі радасці / квеціць!* (К. Цвірка. Не запірайце душу на завалы...).

*Душа дзіцячая не ведае падману* (І. Багдановіч. Дзіцячы дом).

*Душа – для згоды і дабра, / Засцерагчы ад злога, / Каб свет не заступіў за край, / За край сябе самога* (А. Бадак. У гэты свет не першы век...).

*Душа змялее, калі здалеее / бяда-вампір./ А як ачысціць душу ад глею? / У вір!* (Д. Бічэль-Загнетава. Да Нёмана).

*Душа людская – дно марское...* (Н. Тарас. Мора).

*Душа – маці характару* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Душа не паддаецца лекам, / Душу найлепш адразу мецъ* (Я. Сіпакоў. Тлумачэнні камп'ютару).

*Душа пацясняецца целам...* (В. Жуковіч. Хто?).

*Душа паэта – то ж рэактар вечны, / Што выпраменьвае часціцы болю / І сотні тысяч сэрцаў чалавечых / Бамбардзіруе імі без адбою, / Каб шляхам ядзернага рашчаплення / Прывесці ў рух энергію сумлення* (Н. Гілевіч. Паэт і фізік-атамнік у нечым...).

*Душа – са споведзяў, а не з праклёнцяў* (В. Аколава. Мальер на мінскай Камароўцы).

*Душа – скарб чалавека, яго валюта* (У. Ліпскі. Снег на галаве).

*Душа спакойная – што дно* (В. Жуковіч. За трыбунай).

*Душа становіцца безабароннай – / Душа без голасу зямлі сваёй* (Н. Гілевіч. Размова з планавіком).

*Душою з небам гаварыць* (Н. Мацяш. Голас чацвёртай).

*Душою не крыві, / Бо чалавечы век усё ж кароткі, / І водгуллем у кожнага ў крыві / Азвацца могуць прашчуры і продкі* (С. Грахоўскі. Звяно).

*Душы злачынна немай быць, / Як свет турбот такі вялікі* (Н. Мацяш. Вясна восемдзесят сёмага).

*Душэўныя раны баляць доўга і многім не зарубцавацца ніколі* (В. Быкаў. Жывыя – памяці мёртвых).

***Ё**сць нейкая сіла ў гэтай цішы і закінутасці глухіх мясцінаў роднай зямлі. Цішыня нешта кажа душы. Толькі трэба пачуць* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Ёсць толькі біяграфія душы, / На жаль, / яна не кожнага цікавіць* (У. Скарынкін. Сказалі...).

*Ёсць у кожнага з нас вышыня. / Без вышыняў душа астыне* (Н. Тулупава. Ёсць у нас вышыня).

*Ёсць час, калі мяняецца душа, / Адзіная душа ўсяго народа* (Н. Тулупава. Ёсць час, калі мяняецца душа).

***Ж**ывеш не вечна, чалавек, – / Перажыві ж у момант век! / Жыві і цэльнасці шукай, / Аб шыраце духоўнай дбай* (М. Багдановіч. Жывеш не вечна, чалавек...).

***З**айшлі мы ў бездухоўнасці далёка... / О, толькі б дзеці не пайшлі далей!* (У. Скарынкін. Не трэба нам...).

*Заманліва стаць крылатым, / Ды, што ні кажы, / Распятасць – нязмерна вялікая плата / За ззянне душы* (Н. Мацяш. Адкажы).

*Запасіць толькі чужое, не развіваючы свайго... – гэта значыць глуміць народную душу* (М. Багдановіч. Забыты шлях).

*За чубы хай бяруцца ўсе тыя, / Хто душою, як смецце, – пустыя* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

*З гадамі душа ціпшэе, лагаднее, супакойваецца, але не засынае: яна, як і раней, шукае радасці, толькі ведае ўжо, што хоча іменна яе* (М. Стральцоў. Сена на асфальце).

*Змагайся, каб святое не звялось* (А. Глобус. Паплечніку).

***І** душа мая часта, нібы матылёк, / На агонь вылятае, ды агню не баіцца* (Я. Янішчыц. Ты вучыла мяне...).

*І, значыць, сонцу ёсць каму свяціць, / І, значыць, ёсць каму казаць дарогу, / І, значыць, ёсць на свеце мудрацы, / А ўсё астатняе за пазухай у Бога* (А. Звонак. Каму свеціць сонца).

*І колькі б ні цвіло зарой усходаў, / Заходаў ні сыходзіла на скон, / Суровай геніяльнасці прыроды / Душа аддасць без вагання паклон* (С. Законнікаў. Кульмінацыя).

*І на светлай душы нават светлыя плямы відаць* (У. Марук. Вы, заступнікі-сны...).

*І пацалунак безграхоўны той, / Якім цалуем маці й хлеб надзённы* (Р. Барадулін. Маці і хлеб).

*І ўсё, што словам ты ні назавеш, / Маўчыць, як цішыня ці як вятрак без ветру, / І не даецца сэнс, нібы руцэ паветра. / Калі душа маўчыць, не гаварыце лепш* (М. Стральцоў. Засцярога).

***К**аб чалавек душы не страціў – / Ёсць педагогіка адна: / Вучыць любові і пашане / Да хлеба труднага ў жыцці* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Каго палюбілі аднойчы багі, / са статкам той не сальецца* (Л. Геніюш. Зубр-адзінец).

*Калі абмялее аднойчы рака, / То ёй чалавек – дапамога спрадвеку. / А хто дапаможа душы чалавека, / Калі абмялее яна, як рака?* (С. Законнікаў. Душа чалавека, нібыта рака...).

*Калі адчай трапляе ў душу і ахоплівае яе, глыбей усведамляеш недасканаласць чалавечай натуры* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Калі б на выдумкі быў творца небагат, / Ніколі б мы не мелі столькі свят* (А. Бачыла. Калі б на выдумкі быў творца небагат...).

*Калі дабра не бачыш ад людзей, / Знайсці спагаду спадзяешся ў Бога* (Г. Бураўкін. Бязбожнікі былыя ўсё часцей...).

*Калі ёсць вера, ёсць і небяспека* (Я. Сіпакоў. Гумно).

*Калі ж спакойна на душы, / Парожнім словам не грашы* (С. Грахоўскі. Паэт).

*Калі маўчыць душа, гібее розум наш, / Як дрэва без вады ці як вятрак без ветру* (М. Стральцоў. Засцярога).

*Калі няма пакаяння – нараджаюцца новыя грахі* (У. Ліпскі. У імя Айца, Сына і Святога духа).

*Калі расстаешся з богам, / Шукай да людзей дарогі* (П. Макаль. Калі расстаешся з богам...).

*Калі сумлення недарод, / то боль душы не выспеў* (В. Аколава. У вянок Максіму Багдановічу).

*Калі сэрца не плача, / Як бязногага ўбачыш, – / То не сэрца, а камень!* (Л. Якубовіч. Чалавеку).

*Калі ты ўсё спазнаў па поўнай меры / І не паспеў душою ачарсцвець, / Не бойся, што баліць часамі сэрца, – / Яно ж таму і сэрца, каб балець* (С. Грахоўскі. Сэрца).

*Калі ў вас з'явіцца адчуванне сораму – значыць вы сапраўды пранíклі трохі сабе ў душу* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Кволасць душы, як вада нежывая, / А ў нежывой жа нішто не жыве* (А. Бачыла. Кволасць душы, як вада нежывая...).

*Кропля крыві, / што праліта за волю, святая...* (С. Законнікаў. Ля помніка Шандару Пецёфі).

*Крыжы залатыя для тога, / Хто ўвесь да крыві – са святога!* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

*Лепш быць сляпым або бязногім, / чым мець халодную душу* (С. Грахоўскі. Хваляванне).

*Лёгка жыць і верай быць відушчым, / Покуль на ўзбярэжжы сіняй пушчы / Зорыцца акно бацькоўскай хаты* (С. Законнікаў. Хата).

*Людзі з запаснай душой. Гэта пра тых, што працуюць у чужой культуры, а потым некаторыя вяртаюцца ў сваю* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Людзі любяць душу прасаваць, / калі гэта душа чужая* (У. Дубоўка. Пальцы жоўтых кляновых лістоў...).

*Людское сэрца быццам мора, / У ім бывае шторм і штыль* (П. Броўка. Людское сэрца).

*Магчыма, бывае малая любоў, / святыні малой не бывае* (В. Жуковіч. Малая радзіма...).

*Матылёк – дзявочая душа* (А. Вольскі. Матылёк).

*Мы зноў з табой, душа, / як на пачатку поля. / Было б што сеяць там / І жаць было б каму* (Л. Тарасюк. Яшчэ душа баліць...).

*Мы на зямлі па-рознаму святыя* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

*На Беларусі Бог жыве, – / І няхай давеку жыве* (У. Караткевіч. «На Беларусі Бог жыве»).

*Навечна целу дадзена душа. / Бяда, калі душу губляе цела!* (М. Арочка. Уражаны сустрэчнаю красой...).

*Навошта душу / Раскрываць гэтак смела, / Калі ў той душы / Бяздушнасць засела* (Я. Сіпакоў. Слова ў спрэчках).

*Над кожнаю душой / Свой воран кружыць* (Н. Мацяш. Воран кружыць).

*Найстрашнейшая з усіх разрух – / ... душ і сэрцаў разбурэнне* (Н. Гілевіч. «Паланэз» Агінскага).

*На пустым і закінутым полі / Не народзяць зярнят каласы. / Так і ў сэрцы халодным ніколі не зайграюць жыцця галасы* (А. Бялевіч. Хай радасць жыве!).

*На скрыжаванні дабрыні і зла / І ў грэшнага – святыя – ёсць памылкі* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

*Нашто нямое слова, / Калі гаворыць дух?!* (Ю. Кісялеўскі. Было спачатку слова).

*Не адрокся Бог ад Беларусі* (В. Аколава. Мальер на мінскай Камароўцы).

*Не бойся / Піць гора з поўнага каўша. / Зірні ў самотныя нябёсы, / Каб усміхнулася душа* (Р. Барадулін. Пачулася...).

*Не валодаючы целам, / Не авалодаеш душой* (А. Звонак. Душа).

*Не век, не два шукаем шлях да неба, / хоць знаем: неба ў кожнага сваё* (Т. Бондар. Тысяча першыя дзверы...).

*Не дай вам бог з нялюбай цалавацца, / Сваю сям'ю чужому пакідаць. / І ад зямлі – не дай вам! – адарвацца, / А галавою – неба не дастаць!* (А. Сербантовіч. Усё злілося ў музыцы і танцы...).

*Не дай мне Бог духоўным стаць бадзягам, / Без памяці жывой, без каранёў* (В. Зуёнак. Не дай мне Бог)

*Не запірайце душу на завалы, / не замыкайце!* (К. Цвірка. Не запірайце душу на завалы...).

*Не збыць да скону рабскую работу: / Свайго народа выслухаць душу* (Л. Галубовіч. Паэзія, ці станеш ты працягам...).

*Не з суглінак душа, не з цаглінак* (В. Аколава. Князь ты мой, Славамір).

*Не кожны кірунак ад сонца праменны, / не кожны дарунак глядзіцца святым...* (Е. Лось. Школы...).

*Не прарасце быльнёг, / Дзе ёсць душа і воля!* (А. Звонак. Плач зямлі).

*Не рабіце з людзей багоў. / Хай людзьмі застаюцца людзі* (Г. Бураўкін. Не рабіце з людзей багоў...).

*Нешта выспявае ў душы кожнага чалавека. Прабіваецца выток спасціжэння жыцця. Толькі як падняць усё гэта ў людзях? Бо тое, што носіш у сабе, пры табе толькі і застаецца* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Ні дар, ні спрыт, ні навык / Не дапаможа, калі спіць душа* (Н. Гілевіч. Нарач).

*Нізкая душа, вырваўшыся з-пад прыгнёту, прыгнятае сама* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Нізкая душа, дарваўшыся да ўлады, рада помсціць кожнаму, хто перад ёй у нечым «вінаваты»* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Нічога не важыць / забытая вера* (Л. Рублеўская. Прыступкі).

*Нічога так не ўзнімае дух, як нечакана знойдзены на вуліцы рубель* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Нязгасным – / асанна!* (В. Аксак. Грамнічная свечка).

*Няма гармоніі, дый годзе: / да чысціні ўсё ліпне бруд. / А Гулівера часта водзіць / за нос / духоўны ліліпут* (В. Жуковіч. Няма гармоніі, дый годзе...).

*Няма для духа вольнага граніцы* (Я. Купала. Песня мая).

*Няма прасторы для душы, / А цэлы свет – / прастора* (У. Марук. Мінаю рэкі і брады...).

*Няўжо ж ты, божачка, пчале і мурашцы даў больш розуму і лепшую душу, як чалавеку?* (Я. Колас. Паўлюковы думкі).

*Няхай душу нянавісць не спустошыць, / Пакуль жыве ў грудзях любоў* (А. Звонак. Без крылаў песні не ўзляцець высока...).

*Няхай жыве ў душы былое – / не дробнае і не малое!...* (Е. Лось. З лірыкі).

***П****аважаю чужых багоў, / Ды прывыкла сваім маліцца* (Л. Геніюш. Мудрасць спелую сівых вякоў...).

*Пакуль баліць душа, / З надзеяй / Можа біцца сэрца* (Р. Барадулін. Душа баліць...).

*Пакуль жар у сэрцы – датуль у ім сіла, / Узлёт і натхнення жывы аганёк* (А. Бялевіч. Пакуль жар у сэрцы – датуль у ім сіла).

*Пакуль з табою Бог, / Датуль і ты – пад Богам* (М. Шабовіч. Шлях да Бога).

*Пакуль у целе чуецца душа, / Не веру я ў таемны сэнс другога / Яе жыцця* (А. Куляшоў. Варшаўскі шлях).

*Паміж заплаканых крыжоў / шукаем вечны шлях – да Бога* (А. Хатэнка. Успамін учарашняга дажджу).

*Паўторыць шчодрасць сама сябе, / I шчыры колас нальецца верай* (Р. Барадулін. Каму соладка і ў палыне...).

*Песень дар – агонь душы і сэрца жар* (Я. Колас. Сымон-музыка).

*Праведнік той, хто і грэшнік вялікі* (І. Багдановіч. Струны Басэтлі).

*Прыгожыя – не толькі тварам, / А тыя, ў кім душы святло* (П. Броўка. Прыгожы чалавек).

***Р**ужы хінуцца / Адно да найчыстых душою – / Бытуе спрадвеку прыкмета* (Н. Гілевіч. Мілая! Сведкам падзей...).

***С**вабодны толькі дух – / Душа не мае волі* (Р. Барадулін. Не мае).

*Сённяшнія дзеці – заўтрашні народ. А хіба хілы душой і здароўем народ утрымае наш сцяг?* (У. Ліпскі. Дай, божа, дзецям долю).

*Сляпыя гінуць душы* (Н. Мацяш. Узмах крыла, узмах крыла).

*Справядлівы Бог адзін. / З правам першага суддзі* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

***Т**ам толькі, / Дзе душа начуе / І прачынаецца, / Жывеш...* (Р. Барадулін. Там...).

*Той, хто за веру памерці гатовы, / Той не прыгрэе змяёю ману* (А. Бачыла. Чатырохрадкоўі).

*Толькі багі / Судзяць гонар славянскай жанчыны* (В. Аколава. Князь ты мой, Славамір).

*Толькі Богу, душа, толькі Небу – / Падуладная ты на Зямлі* (В. Аколава. Эпілог для радка).

*Толькі са сваёю, а не з чужою душою чалавек застаецца чалавекам, а без душы – ён ужо ніхто, ён проста раб і ўжо не супраціўляецца ніякаму здзеку, ніякай абразе* (Я. Сіпакоў. Гумно).

*Толькі той дўшы лекаваць дужы, / Што з душою балючай сам* (Р. Барадулін. Толькі той).

*Ты вобмацкам не шукай / Дарогу веры* (У. Някляеў. Брат, забывай, што маладыя...).

**У** *кожнай душы неміначай / Сядзяць – Чалавек і журба* (Н. Мацяш. Так званаму рэалісту).

*У кожнай кветцы дух жыве ахвярны* (Л. Дранько-Майсюк. Вядома ж, не... Мне гэта ўсё здалося!).

*Усе знаходзяцца на аднолькавай адлегласці а д Бога, але на рознай д а Бога* (А. Разанаў. Зномы).

*Усё мае сваю мяжу, і толькі цярпенне наша, / о Божа, бязмежнае* (Я. Сіпакоў. Одзіум).

**Х***ай душа баліць, / Хай ачысціць боль* (А. Пісьмянкоў. Сябру).

*Хацела аднаго ад долі: / Душою з небам гаварыць* (Н. Мацяш. Голас чацвёртай).

*Хлусяць не багі, а людзі, / Крывадушнічаюць не багі* (П. Панчанка. Сумленне).

*Хто гандлюе святыняй – той маці сваю прадае* (А. Сыс. Як святарны абраз...).

*Хто «ўладарыць», той ударыць раптам / Па надзеі, па душы жывой* (П. Панчанка. Не люблю я слова «покоритель»...).

*Цела ўмірае, а дух не памрэ* (Я. Янішчыц. Прадзед Фёдар...).

*Цяжка сваімі рукамі звязваць крылле сваёй душы* (А. Кудравец. Успамін пра шэршня).

*Чужое неба сэрцу не дагодзіць, / душы не загадае: «Не балі...»* (Е. Лось. Куды паеду ад палян духмяных ).

*Чым глыбей чалавек апускаецца ў сваю душу, тым вышэй падымаецца ў сусвет* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Чыстая душа не ўгразне ў бродзе, / Ёй свяціць алмазам і на дне!* (А. Звонак. Адзінота).

*Шануй душу сваю, народзе, / І ўласнай памяці не траць, / Каб у нязведанай дарозе / Ахвярай хуткасці не стаць!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Што ёсць Суды – / Багі не вінаваты* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

*Што ж яшчэ тут / Здольна з мораку выводзіць, / Калі не распрамененыя сэрцы?* (Н. Мацяш. Не да́ймася).

*Што святое – то й для ўсіх святое!* (В. Аколава. Маргарыта расказвае пра сябе).

*Шукае, шукае душа гармоніі / У свеце негарманічным* (К. Цвірка. Мы б'ёмся над рыфмай...).

*Як гэта многа – душа прыроды і душа чалавека* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Як жа скараціць / адлегласць тую, / Што між берагамі / Нашых душ?!* (У. Карызна. Берагі).

*Які б ні быў для рук занятак – / Усё ж палёгка для душы* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Як поле, у людзей душа адкрыта, / Пасей дабра зярняты ў глебу ты – / Дабра саспее колас залаты* (С. Законнікаў. Вечная радня).

*Як той алень шукае крыніцы чыстай, / так шукаю Бога я* (М. Багдановіч. Кніга).

*Як цяжка робіцца ў душы, / Калі ў ёй толькі... / Толькі міражы* (А. Грачанікаў. Ад горкай аднастайнасці ў душы...).

## *«РАДАСЦЬ НАВАТ МІЛЬЁНАЎ НЕ ЗМЕНШЫЦЬ ГОРА АДНАГО ЧАЛАВЕКА»*

Бяда, гора, ліха, няшчасце; пакуты; адчай, страх

***А** ліха прыйдзе без падмогі, / Бо ліху – бітыя дарогі* (Я. Колас. Новая зямля).

*Арыенціраў не ведае страх / І не разбірае дарогі* (Н. Гілевіч. Вечны матыў).

***Б**яда аб'яўляецца спадсподу, як прарастае спадсподу трава-лебяда, гора абрушваецца згары. Бяда – яда: яна есць чалавека, гора – пітво: яно п'е чалавека, бяда салёная, гора горкае, бяда – яд, гора – атрута. Бяда прыходзіць знянацку, гора – раптоўна, бяда – выпадак, гора – здарэнне, бяда – Сцыла, гора – Харыбда* (А. Разанаў. Бяда і гора).

*Бяда баліць, гора гняце, бяда галосіць, гора наракае, у бяды ўсё падае з рук, у гора ўсё згортваецца. Бяда бледная, гора чорнае, бяда – пятля, гора – горан, бяда – вужака, гора – груган, гора гародзіць між светам і чалавекам платы, бяда выбудоўвае сцены. Але ўсё на свеце мінае: і сплывае бяда, бы вада, і згарае, нібы агонь, гора* (А. Разанаў. Бяда і гора).

*Бяда не збудзецца слязьмі, / Пайдзі параіцца з людзьмі, / І ключык знойдзеш неспадзеўна* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Бяду пазнаеш па хадзе* (А. Вярцінскі. Дажынкі).

*Вялікая сіла – вера. Але не меншая сіла і страх* (Б. Сачанка. Тыя).

*Гора ж не сціхне ад слоў!* (Я. Колас. Старыя песні).

*Гора – не бяда, бяда – не гора: / Пабыла – сплыла, нібы вада. / Няма праўды – гэта ўжо горай, / Гэта ўжо цэлая бяда* (А. Вярцінскі. Гора – не бяда, бяда – не гора).

*Горам / Гоіцца боль лагоды* (Р. Барадулін. Зацякаюць ногі...).

*Дарогі гора не пытае* (Н. Мацяш. Мінск, 30 студзеня 1980).

*Ёсць слёзы радасці і гора, / Але й прытворства слёзы ёсць* (П. Броўка. Ёсць слёзы розныя...).

*Каб пераадолець гора, яго трэба перастаць палохацца* (У. Ліпскі. У імя Айца, Сына і Святога Духа).

*Каб усім паспачуваць, ахапіўшы сэрцам тое, што чуеш пра людскія беды і трагедыі, – сэрца патрэбна хіба такое ж, як сонца* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Ліха знойдзе ўсюды, / Шчасце ж уцякае* (Я. Колас. Дні ідуць за днямі...).

*Нараканнем не зможаш бяды* (Я. Купала. Адвечная песня).

*Не трэба бяду забываць, / Каб сувязі нітку жывую / Шчаслівай парой не парваць* (С. Законнікаў. Жывая сувязь).

*Няшчасце яднае людзей, абуджаючы ў душах тыя пачуцці і думкі, якія даюць надзею на святлейшую будучыню чалавецтва* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Паніка – гэта геніяльная празорлівасць і прадчуванне бяды, якія даюцца натурам глыбокім і тонкім* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Радасць нават мільёнаў не зменшыць гора аднаго чалавека* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Радні ў слязы – няма* (В. Аколава. Афганскі матыў).

*Рэкі злучаюцца – / Мора. / Слёзы разлукі – / Гора...* (Н. Загорская. Рэкі злучаюцца...).

*Сваёй бядзе – не лепшыя мы суддзі. / Цяжэй за ўсё / Свая ірвецца ніць* (А. Бачыла. Сваёй бядзе – не лепшыя мы суддзі...).

*Страх і цемната – неразлучныя прыяцелі* (Я. Колас. У палескай глушы).

*Там бяда выпаўзае, / дзе шашаль заводзіцца ў памяці* (С. Законнікаў. Кульмінацыя).

*Танцаваць – не гараваць!* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

*Твая бяда, што ты не здольны / Пераступіць якісь парог, / Каб навізну прыняць бязбольна, / І мне шкада цябе, дальбог!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Той мёртвы смех, якім смяюцца, / Калі ахвота зарыдаць* (А. Сербантовіч. Спыніся: у позірку суровым...).

*Толькі ліха сну не мае* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*У горы таксама ёсць месца для любові* (Я. Скрыган. Трывогі).

*Хвала і слава могуць разлучыць, / А гора і бяда заўсёды зблізяць* (П. Панчанка. Сяброўства).

*Хоць* [дрэвы] *невідушчыя, але і не сляпыя, / Мы ж і відушчыя, але падчас нямыя ...* (А. Бачыла. Не ведаю, што дрэвы адчуваюць...).

*Хто страх не зведаў – той і не баіцца, / А той, хто зведаў, – не забудзе страх* (У. Някляеў. Ружа вятроў).

*Шмат незарубцаваных ран / На долах і ў сэрцы народа* (Я. Колас. Адплата).

*Штосьці з намі не так, / калі нават буслы не вярнуліся гэтай вясной* (Н. Маеўская. Вось і дажылі мы да вясны...).

*Эх! Іграй жа той, хто можа: / Плакаць будзе весялей* (Я. Купала. Аўтарцы «Скрыпкі беларускай»).

*Як ні рыхтуй сябе загодзь – ніхто не можа / Да самоты быць гатовы* (Н. Мацяш. Сказала: «Лепей самотай»...).

## *«МАЛОЕ ЗЕРНЕ МЕСЦІЦЬ ЦЭЛЫ СВЕТ»*

### Вялікае і малое, значнае і дробнае ў чалавечым жыцці

*Выток і рэк і шляхоў адзіны: / Ад непрыкметнае ручаіны / Паходзяць плыні / рэк паўнаводных, / Шляхі – / ад рэчышчаў пешаходных* (А. Куляшоў. Далёка да акіяна).

*Вялікага дуба не бывае / з карэннем малым* (К. Кірэенка. Урок жыцця).

*Закладзены у кроплі акіяны, / Ў імгненні – эры, / У пясчынцы – горы* (М. Рудкоўскі. Закладзены у кроплі акіяны).

*З дробнага вялікае, дробнае з вялікага – / Вось ён, існавання пакручасты ход!* (А. Звонак. З дробнага вялікае ...).

*З нічога паўстаюць не для нічога* (А. Разанаў. Паэма жніва).

*Кожная сцежка / Шукае дарогу* (П. Макаль. Кожная сцежка...).

***М**алое зерне месціць цэлы свет. / Там спеюць нашы мускулы і праца / І прарастаюць / гарады планет* (Я. Сіпакоў. «Самадзержац»).

*Мы бачым, што мы нічога не бачым, а чаму нічога не бачым, зараз пабачым* (Я. Колас. На ростанях).

*Мы пастаянна шукаем адно слова, якое б канчаткова і поўна выказала нас. Роўнае яму хіба што маўчанне: гэта тое ж слова, але са знакам мінус, яго страта, яго след, яго адсутнасць* (А. Разанаў. Зномы).

***Н**авошта мне кропля / Твайго неспакою, / Калі ў гэтай кроплі / Мора спакою* (Я. Сіпакоў. Слова ў спрэчках).

*Не быць у чэрствасці ў палоне / І даражыць на ўсе часы / І крошкай хлеба на далоні, / І нават кропляю расы* (А. Пысін. Карабельныя сосны).

*Не глядзі ў люстэрка апоўначы, / бо растанеш у ім, / як солі драбінка / ў студні* (У. Арлоў. Вучыла бабуля).

*Незлічонае мноства дробязей. Можна іх пазнаваць, не пазнаваць, зноў пазнаваць – усё роўна для пазнавання іх не паменшае* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Не змізарнець бы на вяку, / Не зблоцілася б глеба тая, / Дзе і крынічка б'е, пакуль / Рака плыве і не сплывае* (Н. Мацяш. На быстрыні).

*Не з пацукамі, не з кратáмі / вяршыні знаюцца – з арламі* (В. Жуковіч. Двухрадкоўі).

*Не можа ўратаваць / Саломінка ў віры жыцця тапельца* (С. Дзяргай. Бура).

*Непатрэбнае ўчора назаўтра патрэбным здаецца; / Неабходнае сёння губляе свой кошт неўзабаве; / Так букеты святочныя ператвараюцца ў смецце, / А насенне чакае ў зямлі, спадзяецца на травень* (А. Глобус. Вазвай).

*Не цяжка травінцы / расінку трымаць* (С. Панізнік. Суайчыннікам за мяжой).

*Нярэдка яшчэ, ілюзіям верачы, / прымаем за веліч мы манію велічы. / Хоць гэта зусім розныя рэчы: / друг і вораг чалавечы* (А. Вярцінскі. Пра веліч).

***П**аселішча калючай драбнаты / не радуе, хаця і зацвітае* (Е. Лось. І драбнату даводзіцца страчаць...).

*Плод без зярняці – не плод, / І без мовы – насельніцтва мы, не народ* (У. Паўлаў. Народ, пачуй!).

*Поле пасрэднасці дбайна араць – / Тая ж дарэмная трата дабра...* (А. Бачыла. У свеце, дзе тлумна, дзе мулка, дзе густа...).

***Т**ое, што відаць усім, – кропля, а тое, што павінны былі ўсе бачыць, – не бачна нікому* (Я. Сіпакоў. Адзін з нас ).

***У** малым вялікае ўбачыш толькі розумам, / Створана вялікае з дробных велічынь* (А. Звонак. З дробнага вялікае...).

*У моцных целам ёсць слабое месца, / і волат думкі мае хісткасць меркаванняў* (С. Казарына. У кожнай скрыні знойдзецца і мыш...).

*Часамі ж трэба пабыць аднаму, зусім аднаму, каб не чуць і голасу людскога* (Я. Колас. На прасторах жыцця).

*Часамі самае маленькае знаходзіцца ў блізкай і цеснай сувязі з самым вялікім. Трэба толькі ўмець знайсці месца іх стыку* (Я. Колас. Ноч, калі папараць цвіце).

*Часамі самыя простыя рэчы пры пэўных абставінах паказваюцца страшэнна заблытанымі, завязанымі ў такі вузел, што і развязаць нельга* (Я. Колас. На ўсё ёсць прычына).

*Як бы ты ні бедаваў,/ Не прасі нічога ў Бога – / Ён і так табе ўсё даў* (У. Някляеў. Так).

*Якую б даль пазнаць ні давялося, – / А ўсё ж навуку пройдзеце адну: / З драбнюткага зярнятка – ўсё калоссе, / І толькі плуг / узніме цаліну* (Я. Сіпакоў. Байцам спявае рэквіем сасоннік).

## «БЕЗ ЧАЛАВЕЧНАСЦІ НЕ БУДЗЕ ВЕЧНАСЦІ»

### Дабрата, чалавечнасць, чуласць, сумленнасць, шчырасць

*А вось чуласць, чалавечнасць – / Ім дарога проста ў вечнасць – /Больш за ўсё нам даражэй* (Я. Колас. С.І. Ліранцэвічу).

*Ад чалавека да краскі – / Прагнуць усе на зямлі / Шчырай спагады і ласкі...* (С. Законнікаў. Ад чалавека да краскі...).

*А можа быць, каб бачыць добрых, / Дык варта й помніць пра благіх?* (П. Броўка. З гадамі пражыта многа).

**Б***ез дабрыні мы не людзі, а голыя дрэвы* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Без чалавечнасці не будзе вечнасці* (П. Панчанка. За вогненнымі вякамі).

*Будзь шчодры: сам не паскупіся / І за дабро чакай дабра* (М. Лужанін. Як нараджаўся новы свет).

**В***ажны, і галоўны, і самы светлы талент – дабрата* (С. Грахоўскі. Дабрата).

**Д***абрата – гэта не значыць, што нельга абурацца* (У. Рубанаў. Светлы ручай любві).

*Дабрата – гэта не толькі ад шчырасці, але і ад усведамлення сілы, ад дзейнай веры, якая не прымае маны, спекуляцыі на дарагім паняцці ці слове* (М. Стральцоў. Пры святле трывожнай памяці).

*Дзе памерла сумленне – дабру не прабіцца* (А. Бачыла. Дзе памерла сумленне...).

*Для паслушэнства галоўнае – стымул* (В. Жуковіч. Я – сведка).

*Добрае і гордае чуецца здаля* (В. Аколава. На рацэ Прыманцы).

*Ды ці можа апраўдаць / перад сумленнем / Дабрата, / якую робіце не ў час, / Справядлівасць, / Што прыходзіць са спазненнем?* (П. Макаль. Ты маўчаў тады...).

*Жорсткасць узрастае там, дзе поле пакінула дабрыня* (А. Кудравец. Успамін пра шэршня).

*За даверлівасць / плацяць дорага* (А. Сербантовіч. Сонца падала...).

*За смехам бывае пустэча, / А ў сумных вачах – чалавечнасць* (Л. Геніюш. Даўніна).

*І ведай: з сумленнем змагацца – / гэта няўдзячная праца, / гэта разбой, а не бой...* (А. Вярцінскі. Выключэнне).

*І кожнага ў свеце дарога / Вядзе да апошняй вярсты, / Таму не шкадуй ні для кога / Сваёй дабраты* (С. Грахоўскі. Змяркаецца рана ўвосень).

*Іскрынку прывету – і годзе!* (Я. Купала. Сяброўцам па долі).

*Калі сумленна / Ты пражыў свой дзень, / Сумленным, дружа, / Будзе і твой вечар* (А. Грачанікаў. Франтавікі).

*Калі сумленны перад другімі, / Тады сумленны перад сабой* (П. Броўка. Аб сумленні).

*Крылы мы даўно сабе зрабілі – / Столькі ў нас крылатае радні!.. / Мітусні ж занадта вераб'інай, / Салаўінай мала дабрыні* (А. Пысін. Мову продкаў птушкі захавалі...).

***Л**ечыцца трава ад спёкі ліўнем, / Людзі ласкай лечацца людской* (П. Панчанка. Чалавечнасць).

*Людское сумленне за грошы / Купілі – прыстойны тавар. / Цяпер яно беднасці можа / З пагардаю глянуць у твар, / Зрабіцца паважным, вяльможным, / Пашану і славу набыць... / Адно яно толькі не можа – / Сумленнем някупленым быць* (А. Куляшоў. Людское сумленне за грошы...).

***Н**айстрашнейшая з дэвальвацый – / Дэвальвацыя дабрыні* (Г. Бураўкін. Дэвальвацыя).

*Натоўп не верыць у шчырасць слёз* (П. Панчанка. Надзея).

*Наш самы строгі кат – сумленне, / Што суд найправедны вяршыць: / Непакараных – на каленях / Усё жыццё прымусіць жыць* (Я. Сіпакоў. Наш самы строгі кат – сумленне...).

*Не адбірайце хлеба ў вераб'я – / Падданага павятранай краіны!..* (П. Макаль. Нашто з гарматы б'юць па вераб'ю?).

*Няма сумлення – няма і чалавека* (Л. Геніюш. Споведзь).

***О**, боязь за другога чалавека!.. / Адна ты робіш чалавека з нас* (Н. Мацяш. За соснамі – мора).

***П**атрабуе чыстае сумленне / Быць неабходным хоць малым звяном / Паміж сваім і новым пакаленнем* (С. Грахоўскі. Звяно).

*Пачуцці, у тым ліку і пачуццё чалавечнасці, у палітыцы не шануюцца* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

*Прадаваць свае мазгі за мяжу не зможа той, у каго яны непарыўна змантаваны з сумленнем сына свайго народа* (Я. Брыль. Вячэрняе).

***Р**абі дабро! Хоць нават коштам / Апошніх сіл, апошніх мук. / І не пытай: каму? завошта? / Рабі – без просьбаў і прынук!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

***С**амы асноўны клопат у людзей – баяцца* (Я. Сіпакоў. Адзін з нас ).

*Самы вялікі начальнік над чалавекам – сумленне* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Сапраўдны гумар – як гасціннасць, / У ім асновай – дабрыня* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Славяцца людзі гуманнасцю спраў. / Не сілай, а веліччу сэрца* (Л. Геніюш. Славяцца людзі...).

*Спачуванне з жыццём нам далі* (Я. Сіпакоў. Ёсць жа людзі...).

*Суддзя галоўны мой – маё сумленне, / А ісціна – адзіны ў свеце бог* (М. Рудкоўскі. Развеяў я і горыч і сумненні...).

*Сумленнасць – гэта вечная навука / Старannнага прымнажання дабра* (А. Бачыла. Сумленнасць – гэта хітрая, брат, штука...).

*Сумленне – заўсёды / на лаўцы падсудных. / Само сябе садзіць, / само сябе судзіць* (А. Вярцінскі. Мая віна).

*Сумленне таленту радня* (Р. Барадулін. І зноў пра сумленне).

*Сумленне, як ласку матчыну, / Не купіш і ў складчыну* (Р. Барадулін. Ксты).

*Сумленны, працалюбівы чалавек, які моўчкі працуе, не трубячы пра гэта на кожным скрыжаванні, які цягне ўсё, што на яго наваляць, рызыкуе падзяліць лёс таго рахманага каня, якога запрагае кожны, каму не лянота, а сам ён нават убрыкнуць не адважваецца* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Сумленны чалавек часцяком адчувае грэх з-за таго, што сусед побач жыве ў галечы* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Сумленню з подласцю ў суполцы / Ганебна мерацъ шлях стары: / Сумленне рвецца ўвысь, да сонца, / А подласць – шчэрыцца ў нары* (Н. Гілевіч. Каму і з кім не па дарозе?).

*Так няпроста / даходзім да простай высновы – / Не шкадуй дабрыні, / што б з табой ні было...* (С. Законнікаў. Не сказалі таварышу добрага слова...).

*Тварыць дабро патрэбен талент, / Прыносіць гора – толькі злосць* (С. Грахоўскі. Талент).

*Той сумленна рассудзіць, / Хто сабе не даруе...* (Г. Бураўкін. Ад залысін да лысін...).

*Той, хто думае пра годны канец жыцця, жыве сумленна* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Ты сам зямлі часцінка... /Ёй – маці – не змані, / Каб не сысці з гасцінца / Любові, / дабрыні* (С. Законнікаў. З жыццёвага запасу...).

*Убачыш камень – ты яго з дарогі / Прымі, каб іншым ён не замінаў* (М. Танк. Табе).

*У наіўнасць, / Што ўсім спавядацца рада; / У шукальнікаў папараць-кветкі / І праўды; / У мару, / Што вечна жыве чаканнем, – / Не кіну ніколі – / Насмешкі каменем, / Бо траплю ў сябе* (М. Арочка. У наіўнасць...).

*У чалавека ёсць два шляхі абессмяроціць сябе: мастацтва і дабрата. Першы падуладны нямногім, другі – усім* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Фарба сораму – самы чалавечны колер нашага твару* (У. Ліпскі. Ачысцім нашы душы).

*Хто сам не творыць дабраты, / На дабрату не мае права* (А. Бачыла. Крэда).

*Хто сумленню і праўдзе служыў, / Значыць – век не дарэмна пражыў* (С. Грахоўскі. Хвіліны).

*Чалавек, памятлівы на дабро, – самы добры* (У. Рубанаў. Светлы ручай любві).

*Чалавечнасць, як вечнасць, / Твой бязмерны маштаб!* (П. Макаль. Мера).

*Чалавечнасць, / яна – ад слова «чалавек»* (А. Вярцінскі. Мы напачатку зазналі страху).

*Часцей сумленне сваё турбуйце, / Не зневажайце яго законаў* (П. Макаль. Дапамога павінна быць хуткай...).

***Ш**чырасць – гэта праз мудрасць дарога* (В. Аколава. Аўтограф на кнізе начы).

***Я** жорсткасці зазнаў урокі, / Ды больш вучылі дабратой. / І каб, здаецца, не сурочыць, – / Жыў і жыву навукай той* (С. Законнікаў. Я жорсткасці зазнаў урокі...).

*Я не хачу нікога павучаць, / Я абуджаю ў сэрцах чалавечнасць: / Калі баліць, давайце не маўчаць, / Калі хто падае, – свае падставім плечы* (А. Бачыла. Не ведаю, што дрэвы адчуваюць...).

*Я ў сілу жорсткасці не веру, / Я веру ў сілу дабраты* (С. Законнікаў. Я жорсткасці зазнаў урокі...).

## *«НЕ ВЕДАЕ МЕЖАЎ КРАСА»*

### Прыгажосць, хараство, краса, гармонія прыроды і чалавека

***А**дно не міне, не замосціцца – прорва самоты / Духоўнай істоты ў шуканні Красы між марноты* (Н. Мацяш. Між квецевам снегу).

*Ах, колькі ёсць красы цудоўнай поруч з намі, / Калі глядзець вакол дзіцячымі вачамі* (М. Багдановіч. Пад ценем цёмных ліп...).

***Б**ывае часта хараство бяздумным і пустым* (А. Звонак. Запаветнае).

*Датуль не знікне хараство, / Пакуль яго шукаюць людзі* (І. Багдановіч. Вязь ненапісаных лістоў).

*Ды што краса без аўладання? / Адно пустое парыванне...* (Я. Колас. Новая зямля).

*Жанчына – хараства вяршыня. / Вяршыня радасці – жанчына* (В. Жуковіч. Двухрадкоўі).

*За прыгажосць гэтак жа помсцяць, як і за талент. Самыя нешчаслівыя бываюць прыгожыя і таленавітыя* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Красой адзінай чалавек жыве – / Аскепак космасу / І сон бяды зямное* (Р. Барадулін. Аскепак).

*Красы адцвіўшая прынада / Крылом надзей не закране* (А. Звонак. На перавале).

*Не ведае межаў Краса* (Н. Мацяш. Жыццю векавечна ў далоні...).

*Прыгожыя – не толькі тварам, / А тыя, ў кім душы святло* (П. Броўка. Прыгожы чалавек).

*Узросту не мае Гармонія, / Не ведае межаў Краса* (Н. Мацяш. Жыццю векавечна ў далоні...).

*У снежнай наквіцці душы / Ніколі сэрца не прымусіш / Красу і гордасць патушыць* (П. Трус. Зіма... І золкія завеі...).

*Як часта мы забываемся, што чалавек прыгожы перш за ўсё ўнутраным хараством* (Я. Скрыган. Шуканні).

## *«А РАДАСЦЬ НЕ ЗАЛУЧЫШ ПРА ЗАПАС»*

### Радасць, хваляванне; надзеі, мары, летуценні

*Адшчыравала радасці пчала* (Н. Мацяш. Маналог каханай Кастуся Каліноўскага).

*А па зямлі ўсе сцелюцца дарогі – / Гасцінцы, магістралі, бальшакі – /Не для пакут, не для людской трывогі – / Для радасці і шчасця на вякі* (Н. Гілевіч. Заручыны).

*А радасць не залучыш пра запас* (Н. Мацяш. Пушкін у Міхайлаўскім).

*Вельмі прыемна, калі чалавеку дасі хоць невялікую радасць* (Я. Скрыган. Жыву адна з сынам).

*Дай, божа, ніколі / Дактароў не ведаць. / Лепш у чыстым полі / Снедаць і абедаць* (Я. Колас. «Рої» і «хрыпы»).

*Ды радасцю нягоды не спатоліш, / І цішынёю зваблівай ніколі / Трывогі свету нам не заглушыць* (Я. Сіпакоў. Не, на каханне ланцугоў няма...).

*Калі ты нават нешчаслівы, / Надзею ў сэрцы не губі* (А. Астрэйка. На свеце ёсць багата дзіваў...).

*Кветкі на радасць табе расцвітаюць – / Не дазваляй іх таптаць* (А. Бачыла. Многа шчасця на свеце).

*Лепш у белым, чым у чорным на вуліцу выйсці* (В. Аколава. Случарыны).

*Надзея – хлеб душы* (П. Макаль. За буднямі – нядзеля...).

*Не грэюць сэрца зорныя агні, / Калі надзеі адбірае скруха* (М. Шабовіч. Не грэюць сэрца зорныя агні...).

*Не па каменні носіцца бяда, / Але і радасць ходзіць жа – па людзях* (Н. Мацяш. Душою з небам гаварыць).

*Радасць перад вялікімі, не пройдзенымі шляхамі ўзвышае і ўпрыгожвае чалавека і вялікім імкненнем поўніць яго* (К. Чорны. Сястра).

*Радасць – пераспелы адуванчык, / Дзьмухні – і рассыплецца ушчэнт* (А. Сербантовіч. Хмурымся, трывожымся і плачам...).

*Радасць працы вымагае, каб усё тое, што добра зроблена, было заўважана і адзначана* (К. Чорны. «Святая» папружка).

*Сама пакажа справа, / Ці варта шуму ўся аблава* (Я. Колас. Новая зямля).

*Таму і смутак нам патрэбен, / Каб радасць большаю была* (Я. Сіпакоў. І прыйдзе смутак нечакана...).

*У радасці свае парадкі, / Свае крыжы, свае вянцы – / Такія светлыя пачаткі / І вельмі сумныя канцы* (Л. Дранько-Майсюк. Калі званілі ў Кафедральным...).

*У радасці свая вясна, і калі стане вясновай душа – народзіцца радасць* (М. Стральцоў. Жураўліная песня).

*Хоць горшы, а быць сярод лепшых* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

*Хоць чорт, а здавацца прыгожым* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

*Хто не хвалюецца, тым можна / Усёй душой паспагадаць* (Я. Сіпакоў. Тлумачэнні камп'ютару).

***Ч****акайце, калі ёсць каго чакаць* (В. Аколава. Эпілог).

***Я****кое ўсё умоўнае – / І радасць, / І журботлівы настрой...* (У. Карызна. Крыніца).

*Як часта так здараецца ў жыцці, / Што ўжо калі цябе / зусім надзея кіне, – / Знаходзіш той жаданы скарб адзіны, / Што век шукаў і ўсё не мог знайсці* (К. Кірэенка. Як часта так здараецца ў жыцці...).

## *«ДАРОГІ – НАЙВЫДАТНЕЙШЫЯ ПОМНІКІ ЧАЛАВЕЦТВА»*

### Дарога – шлях, накірунак у жыцці

***А****д тайны да звычайнасці – дарога мураша* (В. Аколава. Эпілог).

*А найлепшая тая дарога, / Што вядзе на бацькоўскі парог* (А. Бялевіч. Бацькоўскі край).

*А па зямлі ўсе сцелюцца дарогі – / Гасцінцы, магістралі, бальшакі – /Не для пакут, не для людской трывогі – / Для радасці і шчасця на вякі* (Н. Гілевіч. Заручыны).

*А парогі – прэч з дарогі!* (Я. Колас. Сымон-музыка).

**Б***лудная дарога, ды конь яе знае* (Я. Колас. Новая зямля).

**Д***арога далёкая, шорсткая і ўпартая, як шорсткае і ўпартае жыццё чалавека* (Я. Скрыган. Шорсткая дарога).

*Дарога заўсёды вядзе дадому. Нават тая, якая толькі што выйшла з дому* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Дарога / можа / згубіцца, / Ды знойдзе яе / Народ!* (У. Карызна. Дыялог).

*Дарога не па бальшаку, / Дарога збоку* (У. Някляеў. Брат, забывай, што малады...).

*Дарога памяці пад ногі не кладзецца / Праспектам людным...* (А. Звонак. Памяць).

*Дарога полем – да маці, / Дарога лугам – да бацькі, / Дарога рэчкай – да любай, / Але / і полем, і лугам, і рэчкай / іду заўжды да Радзімы* (А. Сыс. Дарога полем – да маці...).

*Дарогі будуць датуль, / пакуль будуць людзі* (К. Цвірка. Дарогі).

*Дарогі, вечныя дарогі! / Не вечна ходзяць па вас ногі!* (Я. Колас. Новая зямля).

*Дарогі гора не пытае* (Н. Мацяш. Мінск, 30 студзеня 1980).

*Дарогі – / маўклівыя паскі, / Вы – зямлі фанатэка, / Што складзена / з тысячы / крокаў / Вечнага Чалавека* (Я. Сіпакоў. Гукі дарог).

*Дарогі – / найвыдатнейшыя помнікі чалавецтва, / Але на іх не трэба вешаць таблічкі / са словамі: «Ахоўваецца дзяржавай»* (К. Цвірка. Дарогі).

*Дарогі, цёмныя дарогі! Вы так маўклівы, вы так строгі! / Хто вас аблічыць? Хто вас змерыць? / Хто вашы звівы ўсе праверыць? / Хто вашы ходы адшукае? / Бо ўсё сваю дарогу мае!* (Я. Колас. Новая зямля).

*Дарог у звяроў няма* (К. Цвірка. Дарогі).

*Дарог у свеце вельмі многа, / А ты між іх сваю найдзі.* (П. Броўка. А ты ідзі!).

*Да роднага парога на паклон / Ідуць усе дарогі і сцяжыны...* (Р. Барадулін. Да роднага парога на паклон).

*Добра быць у дарозе, якую ты сам сабе выбіраеш* (Я. Колас. На ростанях).

**З***агубіцца сцежка – / забудзецца род...* (С. Панізнік. Суайчыннікам за мяжой).

*Злучыліся: з дарогамі дарога, / З лістамі дрэва, са слязою пыл, / І ў сэрцы тым, дзе ўсёй зямлі трывога, / У тры разы прыбавілася сіл* (А. Куляшоў. Мой маналог, як палымяны конь... ).

*З простай дарогі смяецца крывая, / З лёгкай дарогі – цяжкая* (М. Танк. Помню аднойчы я ў полі прыкмеціў...).

**І** *ўсё ж такі добрая справа – дарога* (Я. Колас. На ростанях).

**К***алі відзён ужо канец дарогі, / Ты сам сабе – суддзя і пракурор* (С. Грахоўскі. Прызнанне).

*Куды ні йдзі – не доўжацца дарогі, / А карацеюць з кожнаю хвілінай* (М. Шабовіч. Лагодны вецер з поўдня павявае...).

*Мінем дарогі, іх малюнкі, / Ім не падведзены рахункі* (Я. Колас. Новая зямля).

*Найлепшая з нашых дарог – / Дарога дадому* (П. Панчанка. Жывая рака ў няспынным руху...).

*На ростані дарогаў многа, / А лучнасць іх – пахілы крыж* (У. Жылка. На ростані).

*Не верце гладзенькай дарозе, / Бо, часам, не туды вядзе* (А. Грачанікаў. Не верце гладзенькай дарозе...).

*Не верце, калі хто скажа, што хоць адна дарога ў жыцці лёгкая* (І. Шамякін. Крыніцы).

*Ні адна дарога не прыйшла назад* (В. Аколава. На рацэ Прыманцы...).

*Ніколі не збочваць з дарогі – / зайздросная доля. / Ды хай не міне цябе доля / дарогу губляць* (У. Някляеў. Праводзіла з дому...).

*Няма дарогі да шчасця, ёсць дарога да ісціны* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Паміж заплаканых крыжоў / шукаем вечны шлях – да Бога* (А. Хатэнка. Успамін учарашняга дажджу).

*Першая дарога, як і першае каханне, ніколі не забываецца* (А. Дзятлаў. Сляды).

*Праз сутонне / Прастуецца / У вечнасць шлях* (В. Рабкевіч. Мярэжы на мярэжы...).

*Складаная дарога ўдаль, / То дзень пагодны, / То імжа...* (П. Броўка. Іржа).

*Сярод усіх вятроў / адзін спадарожны, / Сярод усіх шляхоў / адзін незваротны* (А. Разанаў. Пункціры).

*Так спрадвеку, / Так ад бога: / Стрэчным двум – / Адна дарога...* (А. Лойка. Балада двух вяселляў).

*Там, дзе у бурах / Сыпалася зерне, / Бур'янам дзікім / Шлях не зарасце* (П. Трус. Над чаркай возера...).

*Ты вобмацкам не шукай / Дарогу веры* (У. Някляеў. Брат, забывай, што маладыя...).

*Тым зайздрошчу, / хто многа шляхоў абышоў / І цяпер – з багажом за плячыма* (М. Арочка. Пакуль малады).

*Тым, хто ў дарозе, / Далёка відаць* (А. Бачыла. Ля помніка Янку Купалу).

*У кожнага зярняці – пэўны шлях...* (Н. Мацяш. Асвойваем юдоль мы непамерна...).

*У новы дзень дарогі / Няма без адкрыцця* (С. Законнікаў. Вера).

*Усе дарогі, апроч тых, што вядуць на пагост, / Бясконцыя* (М. Танк. Усе песні...).

*Усе шляхі вядуць дахаты, / Выток шануючы / Спрадвек* (У. Мазго. Шляхі).

*Ўсе шляхі прыводзяць не да Рыма, / А да родных вербаў і бяроз* (У. Караткевіч. У дняпроўскіх хвалях, бы ў калысцы...).

*Усё, што варта нас, / Дарогу заступае, / Бо шлях адзін: не ўскрай, а толькі праз* (Н. Мацяш. Песня ў цярноўніку).

*У чалавека ёсць два шляхі абессмяроціць сябе: мастацтва і дабрата. Першы падуладны нямногім, другі – усім* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

***Х**іба, каб адолець дарогу спаўна, канчаткова, дарэшты, трэба спаткнуцца аб кожны камень, зваліцца ў кожную яму, патрапіць у кожны след?!* (А. Разанаў. Ролі).

***Ч**аму ж тады дарога дамоў / Карацейшая, як з дому, / Аб чым знае нават конь* (М. Танк. Адлегласць).

***Ш**лях да Айчыны адусюль кароткі, / Калі твая Айчына не міраж* (А. Кудравец. Познія яблыкі).

*Шлях далёк, а дзень высок!* (В. Гардзей. Я жыву на сваім чарнагор'і...).

*Шляхі не купляюць за пяць капеек – / Будуюць іх жыццём сваім* (В. Зуёнак. Развітанне Каліноўскага).

*Шляхі твае, о Божа, нязведаныя. / Нам здаецца часам, што мы набліжаем волю, а на самай справе мы накладаем на сябе новыя вярыгі. / Нам здаецца, што мы ўратоўваем жыццё, а на самай справе спяшаемся туды, дзе нас чакае смерць. / Ратуючыся, мы паміраем. / А можа, і паміраючы, вартыя жыцця, застаюцца жыць вечна? / Бо не толькі жыццё, а і смерць хут-*

*чэй за ўсё скарб ёсць. / І падман – таксама* (Я. Сіпакоў. Яма).

*Шляхі – як тайны, тайны – як грахі, / Ў іх спавядацца рана або позна* (З. Дудзюк. Тэатр).

*Шлях чалавека шырокі / Канчаецца вузкай разоркай* (Я. Колас. Адплата).

*Шлях, які мы праходзім, застаецца не па-за намі, а становіцца намі самімі – адкладваецца і акумулюецца ў нас, нібы ў колцах дрэва пражытыя ім гады, і толькі таму ён пройдзены, і толькі таму мы здольныя і вольныя ісці далей* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

*Шлях, які не пройдзеш двойчы, / Называецца – Жыццё!* (К. Камейша. Шлях, які не пройдзеш двойчы...).

*Шмат у нашым жыцці ёсць дарог, / А вядуць яны ўсе да магілы* (М. Багдановіч. Шмат у нашым жыцці ёсць дарог...).

**Э***х шляхі, родныя шляхі! Хто перакажа нам вашы казкі, разгадае думкі?* (Я. Колас. У палескай глушы).

**Ю***дольныя, і плацім мыта / За ўсё, што выпадзе ў дарозе...* (Н. Мацяш. Душою з небам гаварыць).

**Я***к шляхі жыццёвыя ні блудзяць, / А да Хлеба існыя ляжаць* (Н. Мацяш. Тры каласкі любові і смутку).

## *«СПЫНІШСЯ – ПЛЫННЮ АДГОНІЦЬ НАЗАД»*

Рух, дзейснасць, актыўнасць як неабходныя ўмовы жыццядзейнасці, існавання

*Гэта няпроста / абрастанне адрозніць ад росту* (А. Вярцінскі. Абрастаем).

*Дух абнаўлення – цудадзейны дух, / У новы дзень нам паскарае рух* (А. Грачанікаў. Спакуслівы сучаснасці пірог...).

*Ёсць сіла – будзе справа, / ёсць справа – будзе рух...* (А. Вярцінскі. Ёсць сіла – будзе справа).

*І рух разгортвае абсяг / Бязмежжа за вяршыняй скрухі...* (Н. Мацяш. Калі б замовіла свой страх...).

*Не спыніцца ў гонцы, / Ні зблізку не разгледзець, ні здаля – / Хто спрынтэры і хто тут марафонцы...* (У. Някляеў. Ружа вятроў).

*О, сродкі сучасныя перамяшчэння, / Ці мне прыбывае свету ад вас?* (М. Арочка. Пануе ў свеце закон паскарэння...).

*Рака жыцця згубіла б воблік свой, / Калі б не знала / самаачышчэння* (М. Арочка. Ты даравала ўсё...).

*Спынішся – плынню адгоніць назад* (С. Грахоўскі. Плынь).

*Супынак нават на імгненне – смерць* (М. Рудкоўскі. Існуючае – у векавечным руху).

*Таму крыніца чыстая заўжды, / Што не стаіць яна на месцы* (Н. Тарас. Пад белым яварам).

*Таму ў імклівасці / і смутак не агорне, / ніхто не здолее, / каб пагасіць зару...* (П. Трус. Сцежкі).

*Толькі ўперад і ўперад, / Ні кроку назад!* (А. Куляшоў. Толькі ўперад).

*У сажалцы застойнай / не ачэрпаць / крынічнае / гаючае вады* (Н. Загорская. На папялішчы не шукай...).

*Усе мы ў хадзьбе / Да небакраю* (Н. Мацяш. Усе мы ў хадзьбе...).

*Усялякая канцэпцыя плённая датуль, пакуль яна здатная рухацца і змяняцца. Зацвярдзелая – яна замінае жывому, становіцца перажыткам* (А. Разанаў. Зномы).

*Што прымушае нас незаўважна пераходзіць з гадзіны ў гадзіну, з дня ў дзень, з года ў год і не дазваляе спыніцца?* (А. Разанаў. Вастрыё стралы).

## *«МІГ І ВЕЧНАСЦЬ – СВЯТОГА ЗАРУБКІ»*

### Філасофія жыцця і смерці

*А вечнасць – / момант / ў красе/ і... / смерці* (П. Трус. Думы).

*Ад здрадлівага – сэрцам адыдзі, / Ад цыніка – свой смутак уратоўвай, / Зайздрослівага шчодра не віні, – / Жыві праўдзіва – усяго і толькі...* (В. Аколава. Непадсуднасць грахоў).

*Адзіна той Жыццю слугуе, / Хто знае пра сваю віну* (Т. Бондар. Чым ганарыцца?..).

*Адзін прыходзіш на свет калючы / І адыходзіш – адзін* (Р. Барадулін. Адзін).

*Адна на ўсіх суровая чарга / Туды вядзе, і лік той некароткі* (Л. Тарасюк. Да этнагенезу беларусаў).

*Аднастайнасць – смерць усяму жывому* (Б. Сачанка. Пакуль не развіднела).

*Адной і той жа хадой / Прыходзяць у жыццё / І пакідаюць яго* (А. Вярцінскі. Назіранне).

*Адной палавінай жыцця набываю, / другою – трачу: / раскрыжаваны / ў самім сабе* (А. Разанаў. Пункціры).

*Адны бягуць ад пастак і засад, / другія ўсё жыццё палююць* (А. Вольскі. І радасць набыцця...).

*Адрозніць вельмі лёгка ад жывых таго, каго жыццё жадае сцерці* (З. Астапенка. Эдэм).

*Ад шчасця можна адкупіцца,/ А смерць ніхто не падмануў* (В. Вярба. Даўгі).

*А жыццё (хоць памры!) не пачнецца спачатку* (В. Аколава. Ты і я).

*А з пекла ў рай / не далятае нават рэха* (В. Жуковіч. Чыноўнік).

*А каму ж гэта з нас у жыцці не хочацца / Быць хоць за што, а пахваленым...* (А. Бачыла. Разважанні падхаліма).

*А колькі ж каштуе святло? – / Белы свет /Знае плату адну за яго спакон веку: / Жыццё чалавека* (Н. Мацяш. Плата).

*Але дарма: жывую сілу / Не запраторыш ты ў магілу...* (Я. Колас. Новая зямля).

*Але закон жыцця суровы: / Адзін затоміцца – / другі Займае месца важакова* (А. Бачыла. Жураўліныя ключы).

*Але якія б высі ні ўздымалі, / Ізноў вяртацца трэба на зямлю* (П. Макаль. Вечны кліч).

*А мы жывём, адно пакуль зямнуем* (Н. Мацяш. Маналог Казіміра Лышчынскага).

*А мы ўсе роўна прагнем свята – / Аж да апошняе мяжы. / І дамагаемся упарта, / Бо дамагацца – значыць жыць!* (Я. Сіпакоў. Чаго дамогся – не цікава...).

*Апошняга нічога не бывае. / Жыццё і пачынаецца з канца* (Р. Барадулін. І гэты свет аднойчы быў пачаты...).

*Араты ссівеў. Конь здох. Плуг заржавеў. Поле зарасло быльнягом. Засталася пуга. Ляскаць ёю ёсць каму. А паганяць няма каго...* (У. Ліпскі. Дай, божа, дзецям долю).

*Асіліць не магу / На тройку з мінусам / Адзін прадмет – Жыццё* (М. Танк. Зайздрасць).

*А ў жыцці – / перапынку няма, / Перапынку няма!* (К. Кірэенка. Прывалу няма).

*А ў спешнасці, як грэшнасці, ёсць здрада і мана* (В. Аколава. Світанак).

***Б****аяцца – ці не гэта і ёсць звычайнае чалавечае жыццё?* (Я. Сіпакоў. Адзін з нас ).

*Без гаркоты веку не пражыць* (З. Дудзюк. Пе-ражыць на сто гадоў).

*Бярэ і сына любага і ка́та / Адна ўсёдаравальная зямля* (Р. Барадулін. Зямля).

*Бясконцага веку / Не спытаць, не купіць / ні ў людзей, / ні ў багоў* (С. Законнікаў. У хвіліну вяртання снягоў).

*Бясконцае шчасце – / З юнацтвам наперад ісці* (К. Кірэенка. Яшчэ раз спаткацца).

***В****ажна адно – быць жывому, жыць і змагацца* (Я. Колас. На ростанях).

*Важней за ўсё – правільна думаць і адчуваць, не шкадуючы самога сябе дзеля праўды, бачачы сваё месца ў нашым жыцці, сваю работу, свой абавязак і сваю віну* (Я. Брыль. Свае старонкі).

*Вайна – самае праклятае з усіх ліхаў, заведзеных жыццём на зямлі* (В. Быкаў. Жураўліны крык).

*Варта змяніцца варункам, / Як мяняюцца гаспадары, / І – Альбо хаўрусуй з імі, / Альбо памры* (Н. Мацяш. Душою з небам гаварыць).

*Ведаем, жывём занадта мала, / Каб напрыканцы не шкадаваць, / Што не ўсё, чым доля нас вітала, / З год-*

*насцю мы ўмелі адвітаць* (Н. Мацяш. Ведаем, жывём занадта мала...).

*Век жыві – і век спялі адвагу* (С. Законнікаў. За гарою знік лужок маленства...).

*Верай і праўдай / надзеі служы / і жыві, / Помнячы вечна, / што ёсць і табе вымярэнне – / Кропля аддадзенай справе Айчыны / крыві* (С. Законнікаў. Ля помніка Шандару Пецёфі).

*Вечна жыць жывому, што заклікана / Весці ў свет Наступнага чалавечы род* (А. Звонак. З дробнага вялікае...).

*Вечны свет, а я – жыхар часовы... / Ды вучуся ў зерня і раллі / Радавацца / і душой, / і словам / Усяму жывому на зямлі* (С. Законнікаў. З невядомасці на свет з'явіцца...).

*Дагараю, але не згараю,/ Бо нязменна гляджу на зару!* (Я. Янішчыц. У заснежаны вечар зімовы...).

*Да дрэў не вярнуцца лісткам адарваным* (Р. Баравікова. Пасля вяртання на радзіму).

*Дакуль – ніхто не знае – сніць дамавіне цвік...* (Э. Акулін. Трыццаць манет за здраду...).

*Дарэмна ловіце вы ў сетку матылька, / Каб лепей крылы разглядзець; / Ударыўшы, памне іх сець, / І яркі пыл сатрэ няспрытная рука* (М. Багдановіч. Крытыку).

*Даўно з бяссмерцем / людзі ў добрай згодзе. / Яно заўжды трымаецца на тым – / мы каласамі ў гэты свет прыходзім, / Каб сілу даць зярнятам маладым* (С. Законнікаў. Даўно з бяссмерцем людзі ў добрай згодзе).

*Дзень і жыццё, / Ёсць у іх падабенства. / Раніца звонкая, / нібы маленства, / Поўдзень гарачы і дужы, / як сталасць, / Вечар задумлівы, ціхі, / як старасць* (С. Законнікаў. Дзень і жыццё...).

*Дзярзаць – значыць жыць! / Жыць – значыць дзярзаць* (А. Вярцінскі. Пра дзярзанне).

*Добра жыць і памяццю пакут* (Н. Гілевіч. З кнігі «Сямірадкоўі»).

*Ды лепшая памяць аб мёртвых – / ваша любоў да жывых* (А. Вярцінскі. Іх апошняя воля).

*Ды радасцю нягоды не спатоліш, / І цішынёю зваблівай ніколі / Трывогі свету нам не заглушыць* (Я. Сіпакоў. Не, на каханне ланцугоў няма...).

*Ёсць важныя дзве часціны, з якіх складаецца жыццё і яго глыбокі сэнс і хараство, – чалавек і прырода* (Я. Колас. У палескай глушы).

*Ёсць жа нешта ў жыцці, / Што не прадаецца* (А. Бачыла. Удовіны заляцанні).

*Ёсць імгненне жыцця, і імгненне смерці, / І імгненне веры ў вечнасць жыцця* (У. Караткевіч. На празрыстаблакітную роўнядзь мора...).

*Жывеш, / І дзіўна так выходзіць: / Ступенькі год / Ля ног ляглі, / І колькі ты / Ні узыходзіш, / А апынаешся / Ў зямлі* (А. Сербантовіч. Роздум песіміста).

*Жывеш не вечна, чалавек, – / Перажыві ж у момант век! / Жыві і цэльнасці шукай, / Аб шыраце духоўнай дбай* (М. Багдановіч. Жывеш не вечна, чалавек...).

*Жывём, клапоцімся і дбаем, / І ўсе нарэшце паміраем* (Я. Колас. Новая зямля).

*Жыві ў сягоньняшнім дні, / Каб заўтрашні / Стаў твaім* (Р. Барадулін. Жыві!).

*Жывіце, людзі добрыя, буйней, і цешцеся, і цешце без апаскі* (Е. Лось. І драбнату даводзіцца страчаць...).

*Жыву на паверхні зямлі, і вады, і агню, і паветра, і цела – паверхня майго жыцця, і розум – паверхня цела. Паверхняю – разважаю, паверхняю – разумею, паверхняю – мераю глыбіню...* (А. Разанаў. Паверхня).

*Жыву, не трацячы надзей, / Бо веру у дабро людзей* (С. Грахоўскі. Колеры жыцця).

*Жыву прасветлена і ведаю, / Што на зямлі у розны час / Трыумф злучаецца з трагедыяй, / З усмешкай мудраю – адчай* (Л. Забалоцкая. Ключы ляжаць на кніжным століку...).

*Жывым з мёртвымі не па дарозе* (Я. Сіпакоў. Перад гільяцінай).

*Жыццё – адзіны валадар / І радасці, і слёз, і мрояў. / Геройскі ўчынак негероя – / Не прапусціць чарговы ўдар* (Т. Бондар. Чым ганарыцца?..).

*Жыццё – бы той гасцінец, па якім праходзім вярсту за вярстою* (С. Яновіч. Гасцінец).

*Жыццё – веснаход, а не ціхенькі рай, / Народжана ў бурах эпоха!* (А. Бялевіч. Размова з начальнікам).

*Жыццё выпрабоўвае гневам і болем, / І сумам цяжкім, і жалобаю стратнаю. / І шчасце – / калі пад няго-*

*дай любою / Ты чуеш падтрымку сардэчную, братнюю* (К. Кірэенка. Нашчадкі Тараса).

*Жыццёвыя вартасці існуюць і жыццядзейнічаюць на пэўнай «адлегласці» ад чалавека, адкрываючыся адно толькі звычайнаму зроку. Набліжаючы іх, трацім іх: ні каханую, ні маці ў мікраскоп убачыць нельга* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

*Жыццё – дар Божы. Дарам дадзены дар. Даражы жыццём, Чалавек. Апраўдаеш дар – будзеш абдораны вечнасцю* (У. Ліпскі. Снег на галаве).

*Жыццё – / дзве сціплыя, / простыя даты, / І рыска – як шлях па зямлі... / І хоць не паўторыцца гэтае свята, / Ды ўсё ж мы былі, / мы жылі!* (С. Законнікаў. Жыццё – дзве сціплыя, простыя даты...).

*Жыццё ёсць шчасце – / Аксіёма! / Ды кожны з нас часовы госць* (П. Броўка. Ці ж гэта праўда?).

*Жыццё, жыццё! / Ты не праходзіш бокам, / Але і не ратуеш / Ад бяды* (А. Грачанікаў. Знаходкі і дары).

*Жыццё закон нязменны мае: / ніколі праўда не ўмірае* (У. Дубоўка. Ніколі праўда не ўмірае).

*Жыццё заўжды – іспыт на мужнасць. / Яе ж не возьмеш напракат....*(Н. Мацяш. На лёс ці варта наракаць?).

*Жыццё зямное – непаўторны дар, / Дзе кожны дзень – і творчасць, і натхненне. / Над ім не ты – народ твой гаспадар!* (А. Звонак. Мужнасць.)

*Жыццё ідзе кругам, вяртаючыся да пачатку, / Смерць – нацянькі* (А. Разанаў. Палёт стралы).

*Жыццё і жыта – вечная радня* (С. Законнікаў. Вечная радня).

*Жыццё – імгненне, / якое не паўтараецца / і ў якім не паўторышся* (В. Рагаўцоў. Імгненні).

*Жыццё, і падзеі, і людзі ў ім праходзяць, нібы тыя рачныя хвалі* (Я. Колас. На ростанях).

*Жыццё і смерць... / Спрадвеку / ім няма вымярэння... / Галоўнае для чалавека – / Паверыць ў сваё паўтарэнне!* (С. Законнікаў. Між пажоўклых старонак кнігі жыцця...).

*Жыццё кожны раз падводзіць чалавека да краю жыцця, нагадваючы, што яно не самамэта, што жыць, каб адно толькі жыць, нельга. Чалавек «далейшы» за жыццё, і не можа ён сцвердзіцца ў ім інакш, як толькі пераадольваючы, пераўзыходзячы яго* (А. Разанаў. Зномы).

*Жыццё людзей – імклівы крос. / І пасля бурнай маладосці / Туды пацягне, дзе ты рос* (А. Сербантовіч. Мы ўсе на гэтым свеце – госці...).

*Жыццё – мацней за Смерць, / і Смерць за гэта помсціць* (Э. Акулін. Жыццё і Смерць).

*Жыццё мяняецца. Адна яго форма змяняе другую, і так бесперастанку – такі ўжо закон жыцця* (Я. Колас. Страказа).

*Жыццё на ўсё знаходзіць лек, / Яно не любіць, каб няшчасным / На свеце чуўся чалавек* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Жыццё – / невымоўная драма* (В. Жуковіч. Што такое – жыццё?).

*Жыццё нельга спыніць, яно, як тая вада, цячэ і цячэ... Няможна яму цячы ракою – будзе цячы ручайком... Маленькім-маленькім, тоненькім, як нітка, а ўсё роўна не змоўкне, будзе цячы...* (Б. Сачанка. Апошнія і першыя).

*Жыццё – не маскарад. / І блат ёсць блат, / Але і брат ёсць брат* (А. Грачанікаў. Тлусцеючы ад карка і да пят...).

*Жыццё не распішаш / доктарскім парадкам* (П. Броўка. У парку курортным).

*Жыццё не трэба смерцю страшыць, / За хуткаплыннасць дакараць, / Бо на такой зямлі, / як наша, / Не боязна і паміраць* (С. Законнікаў. Жыццё не трэба смерцю страшыць...).

*Жыццё – нібы цягнік... / Гады мае – вагоны...* (Л. Якубовіч. Жыццё – нібы цягнік).

*Жыццё – няроўная дарога / Паміж няроўных і людзей* (П. Броўка. З гадамі пражыта многа...).

*Жыццё пакінула струну / Замест суладнага аркестра* (П. Макаль. Ну што ж, таварыш ваенком...).

*Жыццё – парыў адвечнае красы* (П. Трус. Ізноў я там).

*Жыццё – патрэба ўсіх патрэб* (А. Вялюгін. Вецер з Волгі).

*Жыццё перабірае іпастасі* (А. Разанаў. Паэма запаленых свечак).

*Жыццё пражыць – не поле перайсці... /Ды ўсе і поле, і жыццё праходзяць* (М. Рудкоўскі. Прызнанні).

*Жыццё пражыць – не старыцца – / Не рэчку перайсці* (М. Хведаровіч. Усё, аб чым нам марыцца...).

*Жыццё робіць сваю справу голасна, а смерць – моўчкі* (Л. Галубовіч. Зацемкі з левай кішэні).

*Жыццё, сапраўды, як казка: / Ідзеш ад бяды да бяды* (Н. Мацяш. Жыццё – як казка).

*Жыццё сплятае сетку-асяроддзе – / І свой дае распазнавальны знак* (І. Багдановіч. Кераміка).

*Жыццё –толькі момант* (П. Трус. Не засні, пабудзі мяне рана...).

*Жыццё – то ўзвышша, то правал* (Р. Баравікова. Назіранне).

*Жыццё! / Ты – кульмінацыя скразная / Ад самага пачатку да канца* (С. Законнікаў. Кульмінацыя).

*Жыццё ў бядзе і ў радасці – адзінае* (П. Панчанка. Апошні дзень вясны і першы лета).

*Жыццё ўвесь час – цяжкі экзамен* (П. Броўка. Жыццё ўвесь час...).

*Жыццё – у вэлюме вянчальным, / тугім спляценні каранёў. / У тым, чым дыхаеш: у веры...* (А. Шушко. Чаго крычу падчас адчайна...).

*Жыццё ў грамадстве – як сярод ваўкоў: / Ні праўды, ні свабоды, ні маралі...* (Н. Гілевіч. «Паланэз» Агінскага).

*Жыццё – у магчымасці жыцця, чалавек – у магчымасці чалавека: ён ёсць настолькі, наколькі становіцца тым, кім можа стаць* (А. Разанаў. Зномы).

*Жыццё – цудоўная магчымасць выбраць сабе спадарожнікаў, з якімі хацелася б прадоўжыць існаванне і ў іншым свеце* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Жыццё – / шляхоў і рэк падабенства: / Рух падарожны / распачынае / Юнацтва наша / з крыніц маленства / І ў акіян небыцця / ўпадае* (А. Куляшоў. Далёка да акіяна).

*Жыццё, як і належыць, – / Не крыжыкі, не нолікі. / Лёс не манна* (І. Багдановіч. Паяцы).

*Жыццё, як лёс, неспадзяванае. / Трымціць напятая струна... / Калі ж апошняя, то самая / Найзапаветная яна* (М. Башлакоў. Музыка нязваная).

*Жыццё – як падводная лодка, / Што памяццю ўрэзана ў грунт* (К. Камейша. Пагружэнне).

*Жыццё, як прырода, / І поры года / Ў ім часта мяняюцца* (В. Вярба. Поры годы).

*Жыццё – яно вялікі карнавал, / Дзе мы з сваімі меркамі малымі* (І. Багдановіч. Белая пячатка).

*Жыццю не зблытаць белай фарбы з чорнай* (В. Аколава. Мінск–Бараўляны–Мінск).

*Жыцця ніколі не бывае многа, / Так, як і праўды, – колькі ні жыві* (С. Законнікаў. Адшчыраваў пчаліным звонам ліпень...).

*Жыць – кідаць зерне у ворыва спорна, / садзіць маладыя лясы і сады. / Дотыкам ног цалаваць тое поле, / дзе цяжка ступалі бацькі і дзяды* (Л. Геніюш. Жыць).

*Жыць трэба да самай смерці* (Л. Галубовіч. Зацемкі з левай кішэні).

*Жыць успамінамі не так і блага* (Н. Гілевіч. З кнігі «Сямірадкоўі»).

*Забава заўсёды небяспечная для жыцця* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Замяніцца кніга кнігай, хлеб – хлебам і поле – полем: прытомяць жыццём – падмацуюць жыццём, спытаюцца пра жыццё – і пра жыццё раскажуць* (А. Разанаў. Паэма сланечніка).

*Запозненай не трэба асцярожнасці / Аднолькава – / ні мёртвым, / ні жывым* (С. Законнікаў. Усё было, але сваёй гісторыі...).

*За шкурку плоціць тхор галоўкай* (Я. Колас. Новая зямля).

*Зашмат тэатра ў кожнага ў жыцці* (З. Дудзюк. Тэатр).

*З болем на свет прыходзіць жыццё, / болем яно адкупляецца* (Л. Геніюш. Два рэхі).

*Здзяйсняць свае задумы трэба ўпарта, / Жыць дзеля помнікаў сваіх не варта* (У. Скарынкін. Канцона перакладчыка).

*І ад шчаслівай гінулі развязкі, / І гора узнімае да вяршынь* (А. Грачанікаў. Спазнала і прылівы, і адлівы...).

*І будзеце зноў вы, / раз ёсць, раз былі вы...* (А. Вярцінскі. Паэма мора).

*І варта жыць, / Каб неба ўсё – ад Месяца / Да самых дробных зорак – прачытаць* (Ю. Свірка. І варта жыць...).

*І вочы новых пакаленняў / Жыццё прадкажуць нам ці Смерць!* (І. Багдановіч. Галасы фрэсак).

*Ідзеш, пакуль вядзе дарога, / Жывеш, пакуль не сплакаў слёз* (Т. Бондар. Чым ганарыцца?..).

*І зорка падае, згараючы датла... / Каб з небыцця прабіцца зноў крыніцай* (Н. Загорская. Званы Юліі Барысавай).

*І кожнага ў свеце дарога / Вядзе да апошняй вярсты, / Таму не шкадуй ні для кога / Сваёй дабраты* (С. Грахоўскі. Змяркаецца рана ўвосень).

*І кожны момант выпадковы, / і выпадкова / адкрыццё* (А. Разанаў. Пункціры).

*Імгненне – гэта вечнасць, бо яна заўсёды з табою, калі б ты ні ўспомніў пра яго* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Імгненне мы расцягваем у век, / Каб зразумець, што смерці не адпрэчым* (М. Маляўка. Не замярзае вечнасці рака...).

*І нават у маўчанні – / мудры сэнс жыцця* (К. Кірэенка. Сярод землякоў).

*І ніколі не ўзыдзе зерне, / Што упала ў бясплодны пясок* (В. Вітка. Слова).

*Іншамернасць – уласцівасць жывога* (А. Разанаў. Зномы).

*І праўда, / лётчыкаў магілы / Спаткаеш рэдка на зямлі* (А. Вялюгін. Віры нябёс).

*І сціраюцца дзіўныя дні. / Не пражыць іх нанова ніколі...* (Л. Забалоцкая. Шэры попел ахутаў махнаты...).

*І трэба часам крыж пакуты / Панесці...* (Я. Колас. Новая зямля).

*І ты, чалавеча, як снег у адлігу: / Упаў і сканаў, і няма* (Я. Колас. Забытая магіла).

*І ў жыцці бывае май і студзень* (А. Пысін. Вяснянкі).

***К****аб нарадзіцца, трэба памерці* (В. Іпатава. Вузялок).

*Казачае смерці / на свеце няма!* (А. Вялюгін. Бацька Дняпро).

*Калі адчуеш, што ўжо дажываеш, / Зразумееш нарэшце, / што Ты жывеш* (Р. Барадулін. Штодзень...).

*Калі вечна на ўзмежку, / Без агню і усмешкі, – / Дык нашто і жыццё ?* (Л. Якубовіч. Чалавеку).

*Калі відзён ужо канец дарогі, / Ты сам сабе – суддзя і пракурор* (С. Грахоўскі. Прызнанне).

*Калі нараджаецца чалавек, нічога ў свеце не памірае ўзамен* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Калі памерці трэба, я памру, / Каб толькі горкай праўдзе не памерці* (С. Грахоўскі. Трывожная ноч).

*Калі свет чалавек пакідае аднойчы – / у здзіўленні глядзіць, хоць ад болю прыціх, / як спадае, гусцеючы, цемра на вочы / і жыццё паўстае, як адзін неспасцігнуты міг...* (В. Ярац. Калі падае ў лесе сасна векавая...).

*Калі твае пакуты ператвараюцца ў пакуты іншых – час паміраць* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Калі ты камень, то трымайся дна* (К. Чорны. Пошукі будучыні).

*Канец жыцця / Пачатак паўтарае: / Які прыйшоў – / Такі й ты адыходзіш* (Р. Барадулін. Не верыш).

*Капцы жадаюць вечнага спакою, / Жывыя – працаваць, кахаць і пець* (У. Караткевіч. Зямля дзядоў).

*Кожнае стварэнне мае такое ж права на жыццё, як і чалавек* (Я. Колас. Якую карысць прыносяць нам птушкі).

*Кожны мусіць свой цень паўтарыць, / Перш чым з прашчурамі спаткацца...* (Р. Барадулін. Мусіць...).

*Колькі б доля пражы ні напрала, / Ў шлях апошні йдзеш / Гол як сакол* (Р. Барадулін. Здасца хата ўбогая палацам...).

*Крыкам чалавек абвяшчае сваё з'яўленне на свет. / Вось толькі ніяк ён не навучыцца развітвацца непрыкметна* (М. Танк. Лісткі календара).

*Лісцё нашых дзён лістабоем нябыту сячэ, / Калі маладыя, нічога не страшна яшчэ, / Пад старасць ужо нам не страшна нічога* (Р. Барадулін. Трыпутнік).

*Лічы, спаліў дзень, калі нікому нічога не зрабіў добрага. Так можа растапіцца ўся свечка жыцця...* (У. Ліпскі. Ачысцім нашы душы).

*Любое жыццё асобнага чалавека – легенда* (І. Шамякін. Падзенне).

*Мерка жыцця ўсё ж: / «Ёсць ці няма што ўспомніць!»* (А. Вярцінскі. Колькі лет, колькі зім!).

*Мёртвым лягчэй, і нясцерпна жывым, / Што мёртвых у сэрцы нясуць* (У. Караткевіч. Грубае і ласкавае).

*Міг і Вечнасць – святога зарубкі* (В. Аколава. Князь ты мой, Славамір).

*Мілей за прыстань ціхую спачыну / Хай будзе руху несціханы шум!* (А. Звонак. Шчырасць).

*Можна й вясною дачасна састарыцца, / Можна і полымем ўвосень гарэць* (Л. Геніюш. Нам марыць належыць тады, калі марыцца...).

*Мы ёсць, каб не быць* (А. Разанаў. Паляванне ў райскай даліне).

*Мы жанр падзей сабе не выбіраем* (В. Аколава. Мальер на мінскай Камароўцы).

*Мы жывём, каб вяртацца...* (А. Вярцінскі. Мы жывём, каб вяртацца).

*Мы каласамі ў гэты свет прыходзім, / Каб сілу даць зярнятам залатым* (С. Законнікаў. Між пажоўклых старонак кнігі жыцця...).

*Мы... міласэрнасць забылі навек. / Толькі б уласны ручай наш не высах. / Днём жа адзіным жыве чалавек...* (Л. Забалоцкая. Сцюжа скалелая просіцца ў дзверы...).

*Мы не бязродныя на свеце / І не бяздомныя ў жыцці. / Чым дагараць у пустацвеце – / Лепш не ўзысці і не цвісці !* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*Мы ўсе жывём за кулісамі, а паказваем сябе на сцэне і нават гаворым заўсёды аб сцэне* (К. Чорны. Сястра).

*Мы ўсе памалу прыйдзем к небыццю. / Судзі мне, доля, мужнаму памерці / І праспяваць перад вачамі смерці / Апошняй песняю хвалу жыццю!* (П. Глебка. Смерць салдата).

*Мэта мэты – станавіцца ўсім жыццём* (А. Разанаў. Зномы).

*Нават мары аб вясне даволі, /Каб вясна цвіла ў жыцці тваім* (В. Вярба. Васількі апошнія у полі...).

*Нават смерць, нарэшце, плата замалая / За той дар бясцэнны, што жыццём завём* (А. Зарыцкі. Бясцэнны дар).

*Нават у самую безнадзейную хвіліну нам памагае трымацца надзея* (Я. Скрыган. Імгненне).

*На зямлі існуе адзіная непапраўнасць, адзіная незваротнасць. Гэта смерць. Пакуль яна не прыйшла – усё можа змяніцца тваёй воляй або капрызам лёсу* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім).

*Нам здаецца так, / як у жыцці, / Самым блізкім / перавал высокі, / На які нам трэба / узысці!* (А. Сербантовіч. Перавал).

*Нам не дадзена двойчы жыць, / Але дадзена нам неўміручасць* (Н. Тулупава. Ёсць у нас вышыня).

*Нам не з жыцця сыходзіць страшна, / А з добрай памяці людской* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

*На паўторнае жыццё / Не пакінуць перавучвацца / нікога* (П. Макаль. Ты маўчаў тады...).

*Нарадзіўся, каб памерці. Але развітваюцца са светам, калі па-Божаму, як дагарыць свечка жыцця. Калі аддасі сваё цяпло спадчыннікам. Калі сэрца перахварэе каханнем. Калі спазнаеш свята душы. Калі ты ў нейкім і ў нечым прадоўжыш сябе на Зямлі* (У. Ліпскі. Ачысцім нашы душы).

*Нараджаемся не для смерці, / Нараджаемся мы, каб жыць* (Л. Якубовіч. Нараджаемся не для смерці).

*На свеце ўсё канец свой мае, / І ты, мінуціна змяркання, / Спяеш нам песню расставання* (Я. Колас. Новая зямля).

*Нас з кожнай стрэчай раптам меншае, / І ў мройным марыве жыцця / Мы бачым – адыходзяць лепшыя / У свой анёлавы прасцяг* (Л. Забалоцкая. Ключы ляжаць на кніжным століку...).

*Нашай існасці кволай пылінку / Затрымае жыццё на хвілінку, / Каб навечна аддаць небыццю* (Р. Барадулін. Трыпутнік).

*Не адгародзішся харомамі, / Калі жыццё – сусветным выганам* (У. Ківатыцкі. Вячаславу Жыбулю).

*Не журыся, хлапеча, / Што памрэш не на печы. / Ганарыся, хлапеча, / Што загінеш у сечы* (А. Пісьмянкоў. Не журыся, хлапеча).

*Нельга маўчаць, калі людзі не дрэвы, / Памёршым замоўкнуць, жывым гаварыць. / Не крочыць зямлёю ў хістанні няпэўным, / А горда, з дастойнасцю жыць і тварыць!* (Л. Геніюш. Пад нашым небам чыстым і сінім...).

*Не прашу прывала, / Апроч таго, што суджана усім* (А. Пысін. Я зведаў адставання шлях пакутны...).

*Не рызыкуе скруціць галаву толькі слімак, які па лісце поўзае...* (П. Броўка. Калі зліваюцца рэкі).

*Не саступай з абранае дарогі. / Пакуль жывы, / Жыві!* (Г. Бураўкін. Пакуль жывы...).

*Не страціш сутнасці сваёй – / Тварыць і сам перастварацца... / Зжыві сябе – каб іншым жыць* (Л. Галубовіч. На досвітку).

*Не так жыць, як дажываць* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Не, той не памірае, / каго вядзе дух / дзярзання і парывання* (А. Вярцінскі. Пра дзярзанне).

*Не ўцячы жывому ад долі. / Жыццё, як і жытні хлеб, / Не прыядаецца ніколі* (Р. Барадулін. Ксты).

*Не хачу ў нябёсы дыму воблачкам, / Мне б у зямлю, / сваю зямлю сысці* (А. Русецкі. Я – мужыцкі сын, і радаслоўная...).

*Не цалуе Іуда, / Не вядуць да крыжа, / Мой ланцуг непрыкуты / Есць паволі іржа* (А. Пісьмянкоў. Крок за крокам, за крокам... ).

*Нікога, / хто ў гэты свет прыходзіць, / не абыходзіць доля: / атрымліваюць усе без вынятку / два найвялікшыя падарункі – / жыццё і смерць* (А. Разанаў. Пункціры).

*Нічога не паўтараецца ў жыцці двойчы. Як дрэва, што, бывае, знячэўку зломіш... Парастак пусціць, але гэта ўжо не тое дрэва, што было...* (Б. Сачанка. Апошнія і першыя).

*Няма гордасці за самога сябе, ёсць гордасць за другіх, каб, гледзячы на іх, ніколі не таміцца жыць* (Я. Скрыган. Гордасць).

*Няма звароту у маленства... / А хвалі – блізкая радня – / завабяць, знойдуць падабенства... / Але гняце нас*

*глыбіня – / няма звароту у маленства* (А. Разанаў. Пункціры).

*Няма на зямлі небыцця: / Будзе вечна пад сонцам грацъ / Залатое кола жыцця* (К. Цвірка. Я прыйшоў да вас).

*Няма на свеце горшага ліха, / Як самотным жыць і самотным сканаць* (У. Караткевіч. Слова пра чалавечнасць).

*Няма нічога, кром жыцця і смерці. / Шлях праўды не закончыцца на мне* (Н. Мацяш. Маналог Казіміра Лышчынскага).

*Няма шляхоў да самазахавання, / Няма дарог да светазабыцця / У час ліхі ўзаемапалявання / Сіл супрацьлеглых: смерці і жыцця* (А. Куляшоў. Цунамі).

**О**, *калі б кожны памятаў, што вечны ён!* (Н. Мацяш. І гэты вечар).

**П***ад халодным лёдам... / Крыніцы свежыя цякуць* (Я. Колас. Новая зямля).

*Пад яркім лакам той жа тлен, / а не агонь – / жывы, свяшчэнны* (А. Вярцінскі. Зноў тлен халодны).

*Пакуль жывы, / Турбуйся аб жыцці, / Але пра смерць не забывай таксама, / Каб з першым і апошнім словам «мама», / З якім у свет прыйшоў, / З яго пайсці* (Г. Бураўкін. Пакуль жывы...).

*Пакуль ты плывеш, / ты ёсць рыба. / Не выплывеш, / ты – саркафаг* (К. Камейша. Пагружэнне).

*Памёр, / Прыкрылі некралогам / І ўсёй вядомасці канец* (П. Броўка. Адны пакуты).

*Памёр чалавек / і з сабою ў зямлю / свет свой панёс, / Свет, які так і застаўся / нікім не адкрыты...* (К. Цвірка. Памёр чалавек...).

*Паміж берагамі нараджэння і смерці, пытання і адказу, пачатку і канца тая прастрань, якую нельга запоўніць ніякай іншай матэрыяй, як толькі матэрыяй свайго жыцця* (А. Разанаў. Зномы).

*Пасад і званняў абляціць лісцё, / І застанецца голы ствол слупка / Магільнага* (Р. Барадулін. Пасад і званняў абляціць лісцё...).

*Паспей для ўнука дрэва пасадзіць / І пыл з іконы старадаўні сцерці. / І памятай заўсёды: / Толькі ў смерці / Ёсць права ўсё спакойна рассудзіць* (Г. Бураўкін. Пакуль жывы...).

*Прага да жыцця мацней законаў* (У. Гайдук. Вырай).

*Пражытым даражы / І ў сённяшнім не кісні. / Жыццё – не міражы, / Жыццё – жывая існіна* (П. Пруднікаў. Гары, пакуль гарыш...).

*Прызвычайся рэчышчам цячы / І, імгненнем будучым багаты, / Страчанае / стратай не лічы* (У. Някляеў. Скончылася лета...).

*Прымаю тое, што ёсць, і не прымаю таго, што ёсць* (А. Разанаў. Вастрыё стралы).

*Пяройдзе шлях у новы шлях, / Расстанне – / ў новае спатканне, / Напеў жалейкі – / ў труб гучанне, / Выток*

*жыцця – / ў жыцця працяг* (А. Куляшоў. На паўмільярдным кіламетры).

***Р**ай – калі ёсць выбар, а пекла – калі выбару няма* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Рака жыцця згубіла б воблік свой, / Калі б не знала / самаачышчэння* (М. Арочка. Ты даравала ўсё...).

***С**абачае жыццё незайздроснае, але ніякіх павіннасцей сабака не нясе* (Я. Колас. Наталька, Джон і Муха).

*Самы большы страх чалавечы – страх за сваё жыццё* (Я. Колас. Васіль Чурыла).

*Сваёй сцяжынай цвёрда, / роўненька / Ідзе праз вечнасць чалавек* (С. Законнікаў. Ідзе чалавек).

*Свет і жыцце мнагалучны / І мнагавобразны, выключны* (Я. Колас. Новая зямля).

*Сілкуецца зноў хлебам чорным / Зямнога жыцця вечны круг... / Зярністыя шэрыя жорны / Ніколі не спыняць свой рух* (С. Законнікаў. Жорны).

*Сканаў Хрыстос. / Але жыве Іуда / І прызначае тайную цану* (Я. Янішчыц. Мэрлін Манро).

*Складаецца з трагедый чалавечых / Вялікая трагедыя жыцця* (А. Сербантовіч. Запіска, знойдзеная ў кнізе).

*Смерць амаль заўсёды па-новаму выяўляе чалавечую сутнасць, адкідваючы дробязнае і другараднае, буйным планам высвечваючы тое, што было не навідавоку* (М. Стральцоў. І жыццём і песняй).

*Смерць выдатных людзей заўсёды з'яўляецца ўрокам для жывых. Робіцца вельмі відно, што нам ёсць чаму вучыцца* (Я. Скрыган. Самая доўгая дружба).

*Смерць – вынік жыцця* (У. Ліпскі. Ачысцім нашы душы).

*Смерць – нонсенс, але жыццё раіцца з ёю* (А. Разанаў. Паляванне ў райскай даліне).

*Смерць у цішы страшней за раптоўную смерць у бурах* (К. Чорны. Хвоі гавораць).

*Смерць – яна не ў кожным разе драма...* (Н. Мацяш. Душою з небам гаварыць).

*Сонца вечна людзям свеціць. / Хто прыйшоў з цьмы, сойдзе ў цьму* (Я. Колас. Суд у лесе).

*Спазнаць цану любой хвіліны / І кожным крокам даражыць: / Шукаць, знаходзіць, быць няспынным, / Не проста існаваць, а жыць* (С. Грахоўскі. Дакор сабе).

*Спакойнага шчасця / не зычу нікому: / Навошта грымотам / маланка без грому, / Навошта ручай / без пякучае смагі, / Халодная ўвага / не вартая ўвагі, / Жаданні, што прагныя крылы згарнулі, / Зязюля без лесу / і лес без зязюлі?* (А. Куляшоў. Спакойнага шчасця не зычу нікому...).

*Спрадвечны круг жыцця і смерці / Ніхто / нічым не разамкне...* (С. Законнікаў. Спрадвечны круг жыцця і смерці...).

*Стварыць сабе куміра і пакланяцца яму – гэта значыць, разбурыць, бязлітасна знішчыць сябе як асобу* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

*Страшна не жыць у знябытасці, / а паміраць* (Н. Гілевіч. Жыць у знябытасці цяжка, пакутна і ўсё ж...).

*Сумна тваё адцвітанне, / Квеце зямлі, чалавек!* (У. Жылка. Virelai).

*Сумненні – асноўная і нябачная сіла жыцця* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Сцвярджае час: заўжды жыццю на змену / Прыходзіць смерць, для ўсіх – адзін закон* (А. Куляшоў. Сцвярджае час).

*Сэнсу страта – / то, пэўна, страта ўсяго* (А. Разанаў. Пункціры).

*Таго, хто ролю чужую выконвае, / Падсцерагае сумны канец* (П. Макаль. Хочаце – пераніцую...).

*Той свет і гэты з'ядноўваюцца ўва мне, знаходзяць смерць і жыццё ўва мне ўвасабленне* (А. Разанаў. Спарышы).

*Той свет / Цікавіць нас на гэтым свеце, / А ці ўзгадаем / Гэты свет на тым?* (Р. Барадулін. І гэты свет аднойчы быў пачаты...).

*Той, хто думае пра годны канец жыцця, жыве сумленна* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Толькі б / Не паказацца смешным / На сваім апошнім рубяжы* (А. Грачанікаў. Не палохайце мяне бядою...).

*Толькі свет пакідаючы, не бярыце нічога, / Нават ключ ад дзвярэй перадайце суседу* (М. Танк. Ідучы на сустрэчу).

*Толькі тады, калі неба зґаджаецца ўзяць чалавека, зямля зґаджаецца яго адпусціць* (А. Разанаў. Зномы).

*Толькі той, хто ўведаў, што такое жыць, / Тужыць, што са смерцю ён не размінецца* (А. Зарыцкі. Бясцэнны дар).

*Толькі ў маладосці здаецца, / быццам жыць табе вечна* (А. Вялюгін. Паслоўе).

***У** апошнюю дарогу / не бярэцца анічога – / пралетарскі наш той свет* (В. Жуковіч. Пытанне і адказ).

*У жыццё прыходзім выпадкова, сыходзім заканамерна* (Г. Марчук. Голас і слова).

*У жыцці – нібы ў прымах мы* ( А. Вольскі. Прымаўкі).

*У жыцці няма нічога вечнага, / бо жыццё самое да пары.* (Л. Геніюш. Доўг).

*У жыцці толькі той пераможа, / хто ў сябе мудрасць старца ўвабраў* (Л. Геніюш. Маладосць і старасць).

*У канцы дня стань дворнікам сваіх думак і паводзін. Нешта выграбі на сметнік, каб не замінала заўтра сустрэць узыход сонца. Загарні ў залатую фальгу памяці тое, што дапаможа заўтра жыць* (У. Ліпскі. Дай, божа, дзецям долю).

*У кожнага – адзіная дарога / Ад метрыкі да некралога, / А паміж імі, як заўжды, – / Хвіліны радасці і горычы гады...* (С. Грахоўскі. Трэба жыць).

*Усё жыццё – адно імгненне. / Зацвіў... Час прыйдзе адцвісці* (П. Броўка. Усё жыццё – адно імгненне...).

*Усё жыццё жывем расстаннем* (Р. Барадулін. Усё жыццё...).

*Усё жыццё – змаганне з цемраю* (Р. Барадулін. З вышыні самалёта).

*Усё жыццё – з сустрэч і развітанняў* (А. Звонак. Над бухтай шторм...).

*Усё жыццё – паэзія і кроў, / Усё жыццё – трыванне і спатоля* (Я. Янішчыц. Таму што снег кладзецца галубіны).

*Усё золата, якое толькі ёсць на свеце, – нікчэмная драбяза і непатрэбшчына перад самім жыццём* (К. Чорны. Пошукі будучыні).

*Усё найцяжэйшае можа ўспрымацца і перажывацца, як найлягчэйшае, калі ёсць у чалавека тое, чым можна апраўдаць яго* (К. Чорны. Сястра).

*Усё ў жыцці лагічна, / калі ўсё яно – з нягод...*(Е. Лось. Радкі журбы).

*Ўся вартасць людскога жыцця – у тварэнні, / Калі застаецца раз'іскраны след!* (Л. Геніюш. Нам марыць належыць тады, калі марыцца...).

*Усяму, перш чым быць, жыць, трэба нарадзіцца. І чалавеку таксама* (Б. Сачанка. Ворчык).

*Хочаш жыць у святле і цяпле – / Сам здабывай агонь для сябе* (А. Вярцінскі. Непраметэі).

*Хто не спытаў хоць раз трывогі, / Жыццю не ведае цаны* (А. Звонак. На аўтастрадзе Мінск–Масква).

*Хто ў людскім свеце жыў ад нараджэння, / Без страт няўхільных не пакіне свет* (А. Куляшоў. Цунамі).

***Ц**ябе сустрэне Ўсё, / праводзіць Анічога* (А. Разанаў. Пункціры).

***Ч**аму ж тады жыццё зямное / Мне даражэй – з яго маною – / За праўду вечнасці самой?* (У. Някляеў. Маланка).

*Час смерці, у якім усё згушчаецца, факусіруецца і пераацэньваецца, паказвае чалавеку, кім ён павінен быць у жыцці* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра існіну).

*Часцей за ўсё людзі не сэнсу жыцця шукаюць, а, самі таго не падазраючы, шукаюць прычыну смерці* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Чым часцей даведваюцца да нас нягоды, тым глыбей пачуванне цаны жыцця, тым ясней яго светлыя моманты* (Я. Колас. Камень).

***Ш**лях, які мы праходзім, застаецца не па-за намі, а становіцца намі самімі – адкладваецца і акумулюецца ў нас, нібы ў кольцах дрэва пражытыя ім гады, і толькі таму ён пройдзены, і толькі таму мы здольныя і вольныя ісці далей* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра існіну).

*Шлях, які не пройдзеш двойчы, / Называецца – Жыццё!* (К. Камейша. Шлях, які не пройдзеш двойчы...).

*Шмат у нашым жыцці ёсць дарог, / А вядуць яны ўсе да магілы* (М. Багдановіч. Шмат у нашым жыцці ёсць дарог...).

*Што адцвіло – таму сатлець* (Н. Мацяш. Дэкаратыўная свяча на століку).

*Што выйдзе з ценю – згіне ценем, / Куды б ні мкнуў духоўны шлях* (Т. Бондар. Мой век, няўрымслівы дзівак...).

*Што згублена – лёс не вяртае* (В. Аколава. Князь ты мой, Славамір).

*Што памерла, таго не спрабуй абудзіць* (А. Бачыла. Дзе памерла сумленне...).

*Што такое жыццё? Гэта адзінства, узаемаразуменне і садружнасць зямлі, вады, паветра і агню. / І яшчэ – думкі. Але думка можа і не адбыцца, калі няма папярэдняга ўзаемаразумення. / А можа, наадварот, думка якраз і з'яўляецца насуперак такому адзінству і такой садружнасці?* (Я. Сіпакоў. Узятак з маўчання).

**Э***х ты, жыццё, жыццё людское! / Няма табе, няма спакою: / Ты – суматоха, вір бурлівы, / Ў табе загіне баязлівы* (Я. Колас. Новая зямля).

**Я** *ведаю: / ёсць час скупы і горкі, /Ёсць міг, / калі у подзвігу сваім / Жывыя ўсё ж звяртаюцца да мёртвых / І мёртвыя адказваюць жывым!* (Я. Янішчыц. Абеліскі).

*Я ж у свеце толькі госць, / Як і госці ў свеце людзі...* (Я. Колас. Сымон-музыка).

*Я імгненне жыву, і памру на імгненне, / І у думцы і ў слове маім аджыву* (У. Караткевіч. На празрыстаблакітную роўнядзь мора...).

*Як дым, жыццё ты чалавеча: / Дыхнуў віхор – і згінуў след* (Я. Колас. Забытая магіла).

*Я крэўнасцю намёртва звязан / З усім, / што будзе, / ёсць, / было* (С. Законнікаў. Спрадвечны круг жыцця і смерці...).

*Як цяжка радзіцца коласам, / А яшчэ цяжэй – васільком* (А. Лойка. Балада васількоў).

*Я не мог спыніцца на прывале, / Бо не для прывалаў я жыву* (К. Кірэенка. Прывалу няма).

## «АЛЕ ЎСЯМУ СВАЯ ЁСЦЬ МЕРА»

### Пачатак і канец; пара́; мяжа; паралелі; цана

*Агню без цемры цемнавата, / Не цёмна цемры без агню...* (Р. Барадулін. Не ўпершыню).

*Ад лёту да падзення – адзін крок* (А. Вярцінскі. Колькі лет, колькі зім!).

*А калі б думкі мелі колер: / Светлыя – тады табе светла, / Цёмныя – цёмна, – / Многія так бы і не ўбачылі / Весняй красы / і нябеснай сіні, / І, пэўна, / не ведаў бы свет тады / Трагедый Сангмі і Хатыні* (У. Карызна. Думаю: навошта запалкі людзям?..).

*Але ўсяму свая ёсць мера* (Я. Колас. Заходняй Беларусі).

*Апошні акт у першай з'яве: / Падаць руку і ставіць крыж* (Я. Колас. Рыбакова хата).

***Б**агаты духам той, хто дорыць многа, / Убогі – хто не дорыць, а бярэ* (А. Звонак. Дзіва).

*Без дабрыні мы не людзі, а голыя дрэвы* (Г. Марчук. Голас і слова).

***В**артасць кожнага чынамі мерыцца / і законам зямлі і нябёс* (Л. Геніюш. Замерзлымі пальцамі...).

*Вольнаму – воля. Шалёнаму – поле. Святому – рай. Шчасліваму – доля. Пчолцы – кветка. Салаўю – май. Рыбе – вада. А што падкідышу?* (У. Ліпскі. Дай, божа, дзецям долю).

***Г**эта – як музыка за сцяной: / ты чуеш яе, ды не лічыш сваёй* (А. Вярцінскі. Параўнанне).

***Д**а кожнай з'явы на свеце трэба падыходзіць са словамі: чаму? і з чаго? Бо гэта ёсць пачатак мудрасці і філасофіі. А гэтая філасофія нам кажа: на ўсё ёсць прычына* (Я. Колас. На ўсё ёсць прычына).

*Дакуль дасягае мой слых і зрок – датуль мой абсяг* (А. Разанаў. Абсяг).

*Далёкае не адгукаецца, / А блізкае – дык рэхам коціцца* (А. Астрэйка. Далёкае не адгукаецца...).

*Дарма не скача і каза* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Для паперы самая вялікая небяспека – пажар, для думак – нудота* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Добры рубель пазычаны, / Толькі спаць не дае* (М. Танк. Добры з ваўка музыка...).

*Ды горшае – гэта сціранне меж паміж непрыяцелямі і сябрамі* (А. Вярцінскі. Ты кажаш, сяброў усё менш і менш?).

*Ёсць глыбіні, у якіх мы не вызналі дна* (М. Арочка. Бяздоннае).

*Жанчына без дабраты настолькі жанчына, наколькі дрэва без соку можа лічыцца дрэвам* (У. Рубанаў. Светлы ручай любві).

*З адным крылом ніхто ляцець не можа, / З адным крылом – нібы зусім без крыл* (А. Бачыла. Што можаш здзейсніць...).

*Здаровы да непрыстойнасці* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Зямля без сонца – прах, а не зямля, / А без любові чалавек – што камень* (М. Рудкоўскі. Чытала ты...).

*І ў самай большай пасудзіне на свеце ёсць дно* (К. Чорны. Пошукі будучыні).

*Калі б не зналі мы пра спады, / Не быў бы велічны узлёт* (П. Броўка. Калі б...).

*Калі даспела ў жніўні збажына, / то красавацца зноў не зможа* (Д. Бічэль-Загнетава. А на Палессі).

*Калі даць, дык – надта хітры, / Калі ўзяць, дык – «носік вытры»* (К. Крапіва. Кулак).

*Калі справа не пад сілу, / Дык на плечы не бяры* (М. Лужанін. Піва).

*Калі хочаш праўдзіва ты жыць, дык пі чару любую, / Але толькі да дна* (М. Багдановіч. Крэда).

*Кароль на месцы пешкі надта смешны, / Ды ў дзесяць раз пацешней пешка / У каралёвай шапцы й сабалях* (М. Рудкоўскі. Верагоднае).

*Куток, дзе ты першае слова сказаў, / малым называцца не можа* (В. Жуковіч. Малая радзіма...).

**Л***ечыцца трава ад спёкі ліўнем, / Людзі ласкай лечацца людской* (П. Панчанка. Чалавечнасць).

**М***алы палёт – малыя веды* (У. Корбан. Вераб'іны далягляд).

*Малы разгон, а ўзмах вялікі* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Меншасць замольвае грахі, а большасць запівае* (Г. Марчук. Голас і слова. Афарызмы).

*Мерае чалавека меркай адною зямля, адваротнаю – неба, і меркай двайною сам сябе чалавек* (А. Разанаў. Вастрыё стралы).

*Мільён – адзінка, шэсць нулёў. Чагось, вядома, горба. / Насып хоць макавых зярнят, а поўнай будзе торба. / Сама ж адзінка без кружкоў як кіёк жабрачы, / Як крыж на ростані дарог, / Як чалавек без сваякоў – адцяты хвост сабачы* (Ю. Геніюш. Нас мільён).

*Мне не патрэбна дзея, / Калі вядомы да драбніц фінал* (С. Законнікаў. Кульмінацыя).

*Могуць вымераць карані / Глыбіню ціशыні. / Цішыня глыбіні / Можа выслухаць карані* (Р. Барадулін. Ксты).

*На вялікія справы – і сэрца вялікае, / На вялікае сэрца – і лёс надзвычайны* (У. Караткевіч. Энтузіясту).

*Найсаладзей быць чалавекам унізе, чым варонай на вышыні* (У. Ліпскі. Дай, божа, дзецям долю).

*Нам тыя вяртаюцца кветкі, што самі сабе ўзгадавалі...*(Е. Лось. Валошка на мяжы).

*На самы жорсткі, незагойны верад / Ёсць недзе, ёсць зялінка на загой!* (Н. Мацяш. Шарэе па-асенняму наваколле).

*На свеце ёсць мера ўсяму* (Я. Колас. У глыбі Палесся).

*На свеце ёсць на ўсё прычына, і кожная прычына мае сваю прычыну, і ў аснове кожнай прычыны ляжыць таксама прычына* (Я. Колас. На ўсё ёсць прычына).

*На свеце тайн такіх няма, што асталіся б не раскрыты* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Насенне чакае / Сваёй пары – / Замкнёнае ў сховішчах сэнсу* (А. Разанаў. Гліна).

*На словах – магутны слон, / А на дзеле – моль...* (Я. Купала. Эпіграма на беларускую суполку «Загляне сонца і ў наша аконца»).

*На ўсё была свая прычына / І адпаведная часіна* (Я. Колас. Новая зямля).

*Нашы здабыткі і страты не маюць нейкай паасобнасці ці непадзельнай з намі цаны* (М. Стральцоў. Волька).

*Не бараніце яго дужа: / Дзе ёсць дымок, агонь там ёсць* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Недарэчна з угатаванай меркай падыходзіць да таго, што інакшае* (А. Разанаў. Зномы).

*Не для ўсіх адчыняюцца дзверы, / што вы пнецеся, містэр Форд!* (А. Вялюгін. Здымак).

*Не стацца юдам – гэта ўжо нямала* (Н. Гілевіч. Крыху споведзі).

*Не тое лепшае, што навейшае, / А тое лепшае, што раднейшае. / Не тое лепшае, што вышэйшае, / А тое лепшае, што бліжэйшае. / Не тое лепшае, што прыгажэйшае, / А тое лепшае, што даражэйшае!..* (А. Вярцінскі. Домік маленькі, бачу я, знеслі).

*Не тое пярцо, не тое крылцо / У сокала, як у голуба* (В. Аколава. Случарыны).

*Не ўсе, хто крылы мае, / Могуць падымацца і лятаць* (А. Сербантовіч. Птушкі поўдзень не цяпер адкрылі...).

*Не ўсё аднолькавага крою, / Што намі створана ў жыцці!* (А. Звонак. На аўтастрадзе Мінск–Масква).

*Не ўсё – на кўплю, не на ўсё ёсць хабар* (В. Аколава. Мальер на мінскай Камароўцы).

*Не ўсё страчана безнадзейна, але ўсё безнадзейнае страчана* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Не шуршаць паперы / Пад даклад пусты* (Я. Колас. Памяці нябожчыкаў).

*Нямала дзеячоў такога ж ліку – / У справах вынікі з яйцо, а крыку...* (У. Корбан. Куры).

*Няма на свеце такой сілы, над каторай не было б большае сілы* (Я. Колас. Ластаўкі).

***О**й, тут здарылася драка... / Гусь пабілася з свіннёй!* (Я. Колас. Дары пана Тарбецкага).

***П**авінна ў рэшце рэшт і на зямліцу / Быць красная, адменная цана!* (Я. Янішчыц. Красная цана).

*Па-рознаму страчаюць чалавека – / Шавец глядзіць, якія ў цябе боты, / Кравец глядзіць, як твой касцюм пашыты, / Як ты падстрыжаны, глядзіць цырульнік, / А я, паэт, гляджу, якія ў каго вочы...* (А. Лойка. Па-рознаму страчаюць чалавека...).

*Паўзерня праўды – на сноп хлусні* (П. Панчанка. Думаю, думаю...).

*Першая дарога, як і першае каханне, ніколі не забываецца* (А. Дзятлаў. Сляды).

***Р**адкі паэзіі – пракосы, / А ручка – бацькава каса* (А. Камароўскі. Каса).

*Разняволенне – / гэта адраджэння пачатак* (В. Жуковіч. Разняволенне).

*Рай – калі ёсць выбар, а пекла – калі выбару няма* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Расцэнкі новыя – на даўнія пытанні* (В. Аколава. Мальер на мінскай Камароўцы).

***С**вая пара / Ўзысці на запаветныя вяршыні* (А. Звонак. Свая пара).

*Сталасць – гэта прага дасканаласці, / У якой няма ў жыцці мяжы* (П. Макаль. Дацягнуцца да старэйшых, вырасці...).

*Стаўшы лапцем, трымайся, як лапаць, лапцей: / Разам з імі на печ, разам з імі ў музей* (А. Куляшоў. Грозная пушча).

*Сэнс любой вандроўкі ў завяршэнні: куды і з чым ты прыйдзеш?* (Я. Сіпакоў. Тыя, што ідуць).

*Татальная стомленасць – гэта калі на самога сябе цяжка глядзець* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Трывала тое на паверхні, / Што даспявае ў глыбіні* (А. Пысін. Пражытага растуць паверхі...).

*У радасці свае парадкі, / Свае крыжы, свае вянцы – / Такія светлыя пачаткі / І вельмі сумныя канцы* (Л. Дранько-Майсюк. Калі званілі ў Кафедральным...).

*Усе людзі нараджаюцца роўнымі перад жыццём. Гэта час і пасады іх потым падзеляць на вялікіх і малых, на адказных і простых, на тых, хто кіруе, і на тых, хто мусіць падпарадкоўвацца* (Я. Сіпакоў. Наталенне смагі).

*Усё дапушчальна, калі дапускаем...* (З. Дудзюк. ЧДУ).

*Усё мае сваю мяжу, і толькі цярпенне наша, / о Божа, бязмежнае* (Я. Сіпакоў. Одзіум).

*Усё памерана ў прыродзе. / Аблокі – ўнуку. / Дзеду – яма. / Прыроду не расчуліць лямант* (Д. Бічэль-Загнетава. Паслухай).

*Усё, што ў пару сваю, – лепей* (А. Вярцінскі. Колькі лет, колькі зім!).

*Усіх пачаткаў я – працяг, / Усіх працягаў я – пачатак* (В. Зуёнак. Мільёны год...).

*Устойлівасць і напраўду моцная, але настойлівасць... мацнейшая за яе* (Я. Сіпакоў. Клетка).

*Усюды і ва ўсім трэба мець розум і ведаць меру* (Я. Колас. Як птушкі дуб ратавалі).

***Х**аос нічога не знішчае, а толькі пераводзіць у іншы стан* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Хлеба кошт не адзін: / то спаўна, / То над крошкай трасуцца галовы... / Не мяняецца толькі цана / Гэткай дробязі – добрага слова* (С. Законнікаў. Добрае слова).

*Хоць магілкі адны – /парадкі не адны: / Усё улічана ў бетоне – / І тытулы, / і рангі, / і чыны...* (А. Бачыла. Роздум на венскіх могілках).

*Хтосьці жыў, хтосьці неба капціў, / Кожны мае сваё, па заслугах* (Т. Бондар. За дабро не адплацяць дабром?..).

***Ц**ені – спадарожнікі святла, / Цёмныя яго далоні* (А. Пысін. Лямпачка свяціла, грэла...).

***Ч**алавек – гэта два чалавекі, як дзве / далоні, што лепяць суладна снежку ці / перакідваюць, каб утрымаць, жарыну: / адзін з іх – пачатак, другі – завяршэнне, / адзін з іх – выток, другі – суток, / адзін з іх – прычына, другі з іх – вынік, / адзін з іх – пытанне, другі – адказ, / а паміж імі цякуць, вынікаючы з іх / і ўпадаючы ў іх,*

*сусветы... Калі чалавек сустрэнецца з чалавекам* (А. Разанаў. Вастрыё стралы).

*Чым глыбей чалавек апускаецца ў сваю душу, тым вышэй падымаецца ў сусвет* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

***Ш****ырэй за берагі / Рэчак не бывае* (У. Някляеў. Скончылася лета...).

***Я*** *вечны ў роднай старане, / Як слова Мама...* (Р. Барадулін. Вечны).

*Якая ты ўсё ж неацэнная, Воля, / Калі за скарынку цябе прадаюць!* (С. Законнікаў. Воля).

*Як жа зроблена мала, / каб жыць. / Як жа зроблена многа, / каб нішчыць* (Л. Геніюш. Вайной).

*Які б глыбокі ні быў акіян – ён усё роўна мае паверхню, якая б ні была плыткая лужына – яна ўсё роўна мае паверхню. Цела – таксама паверхня, «нулявы ўзровень» быцця, адваротнае дно, яно не можа «патануць» у быцці, але ў залежнасці ад таго, што там, за ім, лужына альбо акіян, мяняюцца яго паводзіны, яго аблічча, яго не месца, а сэнсазнаходжанне* (А. Разанаў. Зномы).

*Які прывет – такі прыём, / Які тавар – такая плата* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Як цывілізацыя нішчыць прыроду, так хамы – грамадства* (У. Рубанаў. Не аднойчы забіты).

*Я – мэта, што тоесна перашкодзе* (А. Разанаў. Мэта).

## *«ЧАС – НАЙЛЕПШЫ ДОКТАР ЧАЛАВЕКУ»*

### Вечнасць, бясконцасць, няспыннасць, хуткаплыннасць, заканамернасць і непрадказальнасць часу; часовае і пазачасавае; час і бясчассе

*Ад спакою час цябе ўратуе, / Ад самоты – сам сябе ратуй* (У. Някляеў. Выйшаў. Хіснулася поле...).

*Адцвітае, усё адцвітае – / і гады, і хвіліны, і кветкі* (У. Дубоўка. Палыны пасівелі на ўзгорку).

*Але скрыжалі зямлі, дзе запісваюцца казка-праўда і праўда-казка, такія разнастайныя і такія багатыя, што людзі вечна будуць іх чытаць і ўсяго не перачытаюць* (Я. Колас. Залаты прамень).

*А над Сусветам, / над тваім быццём /Звон часу б'е / няўмольна і адчайна* (С. Законнікаў. Звон часу).

*А раптам тое, што страціў ззаду, знойдзеш якраз наперадзе...* (Я. Сіпакоў. Тыя, што ідуць).

*А самых лепшых – час не беражэ* (Я. Янішчыц. Птах).

*А суд гісторыі цяжкі* (Я. Купала. У праўдзе).

*А час на твары піша й піша – / Усе дарогі, ўсе шляхі, / Усе здабыткі і грахі* (П. Броўка. Час піша...).

*А часу без людзей няма* (У. Карызна. Час – гэта мы).

*Бег часу не адчуць у мітусні, / У зладжанай зададзенасці быту...* (С. Законнікаў. Звон часу).

*Бруд вякоў і ліўням цяжка змыць* (П. Панчанка. На схіле веку).

*Бываюць дні без шчасця, / бясчэсця сумныя гады, – / то паласа бясчасся* (А. Вярцінскі. Навагодні тост).

*Векавечны толькі край, і далеч, / І жоўты ліст на зелені травы* (У. Караткевіч. У векавечнай бацькаўшчыне клёны...).

*Век – смелы цыркач на канаце* (В. Аколава. Ты і я).

*Вечнасць на імгненне не зважае* (Р. Барадулін. Вечнасць... не зважае).

*Выбраўшы вечнае, ісціну можна не выбраць* (У. Някляеў. Паляванне).

*Вякоў гісторыю нам пішуць дні* (П. Трус. Санет).

*Вялікі доктар усялякай хворасці ў чалавечай душы – час – мае вечнага свайго дапаможніка – працу* (К. Чорны. Пошукі будучыні).

*Вялікі доктар – час – спакойна і безупынна ідзе па свеце і лечыць і гоіць* (К. Чорны. Пошукі будучыні).

*Гадзіннік мой – не сонца, што ў зеніце, / Гадзіннік мой – не сэрца, што ў грудзях. / Сваім дакладным часам на арбіце / Сама зямля мой вымярае шлях* (А. Куляшоў. Гадзіннік мой – не сонца, што ў зеніце...).

*Гадоў неўгамонных імклівы экспрэс, / Спыніся хоць... / на павароце* (А. Бачыла. Куды вы, гады мае...).

*Гады ляцяць – каб не вяртацца. / Мне б на чарговым рубяжы / гадоў на дваццаць акапацца* (А. Вольскі. Рубяжы).

*Ганебны час, калі прышэптваюць паэты, / Трагічны час, калі змаўкаюць назаўжды* (У. Ківатыцкі. Алесю Пісьмянкову).

*Гэта многа – слухаць вечнасць, / Піць зямлі гаючы пах. / Любавацца Шляхам Млечным / І любіць / няпросты / шлях* (А. Пісьмянкоў. Гэта многа – слухаць вечнасць...).

*Гэта час, / калі ў душу маю / Чысціня заходзіць найглыбока, / Калі ў тым, / каго не пазнаю́, / Уяўляю светлага прарока* (У. Марук. Снег ды снег... ).

*Дабрэюць хай тыя, хто чуе, / Што Вечнасць у Мінску начуе!* (В. Аколава. Пракурор і казіно).

*Для рэчы кожнай час ёсць свой* (Я. Колас. Рыбакова хата).

*Дні – колавы спіцы, / А час – агонь-рысак* (В. Зуёнак. Дні – колавы спіцы).

*Дык не гаруй жа, брат-нябога: / Дзянькоў вясёлых яшчэ многа!..* (Я. Колас. Новая зямля).

*Дыстанцыя ў часе дае пэўную аб'ектыўнасць у стаўленні да зробленага самім табою. Аднак ёсць тут і доля асабістай прыхільнасці, можа, нават і нейкая міжвольная ільгота, спагада самому сабе* (Я. Брыль. З людзьмі і сам-насам).

**Ё***сць нешта, што я павінен зрабіць, а не раблю, і прыйдзе той час, калі ўбачу, што іменна павінен быў зрабіць, а не зрабіў...* (М. Танк. Лісткі календара).

**З***аўтрае – на заўтра. Сёння – на цяпер!* (В. Аколава. Малюнкі словам).

*З гадамі ўсе дні пачынаеш любіць...* (М. Танк. З гадамі ўсе дні пачынаеш любіць...).

*Здалёку ўсё з'яўляецца нам іначай, як яно ёсць папраўдзе, бо такая ўжо натура і схільнасць нашай душы – бачыць усё добрае і прыгожае ў тым, што далёка ад нас, што не з намі* (Я. Колас. Хмарка).

*Здалёку ўсё прыгажэй блішчыць* (Я. Сіпакоў. Сцяпан і Рукавок).

*З намі час, як з пяском дзіця, / Забаўляецца, праз пальцы цэдзіць – / І здзімае з далоні жыцця* (Р. Барадулін. Трыпутнік).

*Знішчалі старое мы самі, / А будаваць жа новае хто будзе?* (К. Крапіва. Захар – дырэктар).

*Зрушыць стагоддзі – як трапіць у вір / Ці ў глыбіню іншасвету таксама* (І. Багдановіч. Радзіма Дамейкі).

**І** *не магу ўявіць ніяк бясконцасць, / А толькі вечнасць дрэў, зямлі, вады* (П. Панчанка. Думаю, думаю...).

*Іншы бохан ляжыць пад абрусам, / на сцяне цікавейшы абраз, / толькі роднае мовы на вуснах / не крануў усё мяняючы час* (Л. Геніюш. Іншы бохан ляжыць пад абрусам...).

*І ў дзён / зусім касмічны разгон / і касмічная пустата* (П. Шруб. Часу няма сказаць «люблю»...).

*І ўсё вяртаецца да нас, /Што высахла, забыта. / Дзе у нябыт ступае час, / – І час ідзе з нябыту* (У. Марук. Мінаю рэкі і брады ...).

*І час ляціць! – для ўсіх абмежаваны / Хваробаю, нястачаю, вайной* (А. Куляшоў. Варшаўскі шлях).

*І час нам павялічвае даўгі / За разбурэнне дум, а не каменняў* (І. Багдановіч. Домік М. Багдановіча).

***К****аб дачакацца, / не хапіла хвіліны, / каб назаўсёды расстацца – / хапіла якраз / хвіліны* (А. Разанаў. Пункціры).

*Каб ярка свяціла перлінка-слова, / Каб людзям зіхцела на ўсе бакі, / Яго шліфавалі як след, адмыслова / Найлепшыя ў свеце тачылы-вякі* (К. Цвірка. Перлы роднай зямлі).

*Калі гарыць свяча, яна гарыць век, калі расце дрэва, яно расце век, калі жыве чалавек, ён жыве век, і які б гэты век ні быў – кароткі ці доўгі, роўны ці пакручасты,– ён усё роўна вялікі* (А. Разанаў. Век).

*Кожны год да нас прыходзіць новым, / Адыходзіць змрочным і старым* (П. Панчанка. Не спявай мне песню пра арэлі).

*Кожны міг мудрэе Вечнасць* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

*Куды? Адкуль?.. – / маўчанне. / Не дасць адказу час. / Стаю – і сам пытанне, / іду – і сам адказ* (А. Разанаў. Пункціры).

*Людцы вы мае, у кожным часе / Затоены свой нейкі план* (Я. Колас. Адплата).

*Мадэль часу нагадвае кола: у ім ёсць акружнасць і ёсць цэнтр, дынаміка і статыка, цэнтраімклівае і цэнтрабежнае* (А. Разанаў. Зномы).

*Мешчанін разумее толькі «жыццё», але ніколі не спасцігае ягонай меры – часу* (М. Стральцоў. Загадка Багдановіча).

*Мінулае жыве, / яно за намі назірае* (А. Разанаў. Пункціры).

*Мінулае наша гэтак жа неаддзельнае ад нас, як і будучае* (М. Стральцоў. Часоў былых і новых сувязь).

*Мінулае тоіцца ў змроку, будучыня – у светлыні* (А. Разанаў. Парог).

*Мы з гадамі, як ракаўкі, дзе / Глуха мора надзеі гудзе, / Калі вечнасць падносіць да вуха* (Р. Барадулін. Трыпутнік).

*Мы рухаемся з адной цяперашнасці ў другую і як сваю долю прымаем тое, што ёсць. / Наша дарога праходзіць праз нашы сэрцы, / кожны наш крок – гэта крок за небакрай, / і ў кожным нашым імгненні змяшчаецца ўвесь час* (А. Разанаў. Навобмацак).

*На зямлі, / у небе / і ў вадзе / Жорсткі і спрадвечны паядынак / Заўтрашняга з сённяшнім ідзе* (А. Сербантовіч. Снегу, як у млыне тым, завозна...).

*Нам часу дадзена не шмат – / Міне яшчэ адна хвіліна, / Ёй не вярнуцца ўжо назад* (П. Броўка. Ёсць непагоджанасць якая...).

*Нам часу на вандроўкі / дана мала. / А сэрца кліча ўсё далей ісці, / каб нават смерць / з'явілася прывалам, / а не канцом вандровак у жыцці* (А. Вольскі. Дарога жыцця).

*Не вечны чалавек, / яго ж памкненні вечныя* (М. Рудкоўскі. Бясконцы ён і неспакойны, свет...).

*Не журыся, што час адлятае, / Толькі хай праз мяне ён ляціць, / І ў прадонне душы ападае / З яго тое, што можа свяціць* (А. Салтук. Не журыся, што час адлятае...).

*Не любіць Час ілжэімён* (А. Вярцінскі. Навагодні тост).

*Немагчыма / Адолець прыцяжэнне часу* (Н. Мацяш. Прыцяжэнне часу).

*Не, ты не вечны, чалавек! / І у цябе не многа часу. / Дык думак добрыя запасы / У доўгі не кладзі засек* (К. Буйло. Не, ты не вечны, чалавек...).

*Не ўсё мінулае мілей / Таго, што здарыцца, / Што будзе!* (А. Грачанікаў. Усё было...).

*Ніколі не трэба папраўляць час, праўда астаецца заўсёды за ім* (Я. Скрыган. Світанак).

*Нічога вечнага на свеце / Няма для шумнага жыцця, / Здарэнні, многія сталецці / Ідуць пад века забыцця* (Я. Купала. Кругаварот).

*Ніякіх скідак на імклівы век! / Душа не знойдзе аніякіх лекаў, / Калі ў жалезным веку чалавек / Не будзе заставацца Чалавекам* (А. Камароўскі. Жалезны век).

*Новы час непатрэбнае крышыць. / Наша ж мова, як вечнасці ніць, / з праславянскіх крыніц і узвышшаў / красавацъ з намі будзе і жыць.* (Л. Геніюш. Іншы бохан ляжыць пад абрусам...).

*О, каб маглі мы у мінуту страты / Вярнуць той час хаця б на дзень яшчэ!.. / Ды горка ўцямім, што насупраць скату, / Назад – ніколі рэчка не цячэ* (Н. Тарас. Плывём мы часам па жыццёвых хвалях...).

*Пакуль вясну змяняе лета, /Ёсць час яшчэ хоць на вады глыток / І на глыток паветра* (У. Някляеў. Зона).

*Па-рознаму адлегласць паміж стартам / І фінішам нам адмярае час* (А. Куляшоў. Устоіць той, хто варт...).

*Перабыты час – цяжэнная аграмадзіна над крохкім дрэвам жыцця* (А. Вялюгін. Спроба тэстамента).

*Поезд часу у няспынным руху / Да вялікай станцыі бяжыць. / Не паспееў – адстанеш, бедны духам, / На паўстанку сонечнай мяжы* (А. Звонак. Размова ад душы).

*Пылінкі праху / раздзьмувае час – / І з мёртвага успыхвае жывое* (М. Арочка. Слова да Купалы).

*Рана – пытанні, / адказы знаходзяцца / позна* (У. Някляеў. Паляванне).

*Раны гояцца часам, а дружбаю – гора* (А. Куляшоў. Грозная пушча).

*Самы магутны метад забыцця – змена летазлічэння* (Г. Марчук. Голас і слова. Афарызмы).

*Свая пара / Дайсці да нешматлюднага паўстанку / І думаць, што вячэрняя зара / Бок адваротны алага світанку* (А. Звонак. Свая пара).

*Свая пара / Хвіліне найшчаслівейшай незваротнай, / Калі старое прэч ідзе з двара, / Каб новаму пастукацца у вокны* (А. Звонак. Свая пара).

*Свежыя навокал дэкарацыі, / Але той жа дзейсніцца сюжэт* (М. Дукса. Гэта вельмі-вельмі проста сталася...).

*Слязней слязы ... жыццёвы вырак: позна!* (В. Аколава. Уваскрэслы агонь).

*Такі наш век: / не падай у знямозе* (П. Панчанка. Тысяча небасхілаў).

*Традыцыя не толькі дыялог таго, што ёсць, і таго, што было, але і таго, што будзе* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

*Трывацьме на зямлі каменны век, / Пакуль на сэрцы / Камень носіць чалавек* (Р. Барадулін. Ксты).

*У вечнасць / Усе мы з вамі – мост перакідны* (А. Сербантовіч. Пабляклі вочы...).

*Узор рэлятыўнай прыроды часу: з пункту гледжання каменя ўсё, што ёсць, ужо было, з пункту гледжання промня ўсё, што ёсць, – будзе, з пункту гледжання чалавека ўсё, што ёсць, – ёсць* (А. Разанаў. Зномы).

*Усе мы – як лісце на дрэвах... Пакуль вецер часу не адарве нас ад галінкі, праз якую мы злучаны з дрэвам, мы расцём, зеляНеем. Мы жывём!..* (Б. Сачанка. Апошнія і першыя).

*Хоць век ніхто мне не надточыць, / Другога не хачу жыцця, / Бо нават будні дзень – / святочны, / Ён – / час зямнога адкрыцця* (С. Законнікаў. Дзівосы ўсюды прыкмячаю...).

*Хочацца, прызнаюся, на «ты» / Хоць хвіліну з вечнасцю пабыць* (А. Сербантовіч. Хочацца спакойнай прастаты...).

*Ці гэта час належыць нам, / ці гэта мы яму належныя?* (А. Разанаў. Пункціры).

*Цяжка ўявіць, / што бачыш / часу свайго распад, / Думаючы пры гэтым / пра нескончоны час* (У. Марук Змена квадры).

*Чалавека сляды у стагоддзях не гінуць. / Гэта помні заўжды, / Перш чым след свой пакінуць* (Е. Лось. Чалавека сляды у стагоддзях не гінуць...).

*Чалавек не толькі часовы, але і пазачасавы, і з гэтай пазачасавасцю, як са сваёй жабрацкай перспектывай, сустракаецца не толькі ў канцы свайго шляху, але і ў кожным яго пункце, калі адважваецца паглядзець над сабой, калі ўскрыльвае духам* (А. Разанаў. Сёе-тое пра карані і пра ісціну).

*Час Адама ад яблыка / горкі* (А. Глобус. Меліярацыя).

*Час вельмі не любіць, каб без яго перараблялі гісторыю* (Я. Скрыган. Гордасць).

*Час вялікіх спраў – / не да малых!* (У. Някляеў. Даведка аб нараджэнні).

*Час загойвае ўсякія раны. Але бывае, што ад тых ран астаюцца рубцы, якіх не можа згладзіць ніякі час* (Я. Скрыган. Развітанне).

*Час і грошы – дзве рэчы, якіх заўсёды бракуе чалавеку* (К. Камейша. Паміж кубкам і вуснамі).

*Час – / калі адна мэта / слухаецца другую. / Бясчассе – / калі замінае / кожная кожнай* (А. Разанаў. Пункціры).

*Час – лекар болю, а яго шпіталь – / Без краю, без пачатку памяшканне* (А. Куляшоў. Пра боль).

*Час – лекар болю, боль – жывая рана, / Дзіця, не ўтаймаванае нічым: / Ні вечнай калыханкай акіяна, / Ні вечнасці надвор'ем штармавым* (А. Куляшоў. Пра боль).

*Час – люстэрка, якое дазваляе ўбачыць сябе як некага. Але сябе – мінулага* (А. Разанаў. Зномы).

*Час – найлепшы доктар чалавеку. Ён уціхамірыць хоць які боль* (К. Чорны. Вялікае сэрца).

*Час настаў такі, / Калі – ні ў вучні, ні ў настаўнікі* (У. Някляеў. Майстры вясны).

*Час – непадкупны і справядлівы суддзя! / Даруй старэйшым, / Якія асуджалі мяне за маладосць, / Бо самі да яе / Ўжо не маглі вярнуцца. / Даруй і маладзейшым, / Якія асуджаюць мяне зноў / За старасць, / Забыўшыся, што з ёй / І ім не размінуцца* (М. Танк. Час – непадкупны і справядлівы суддзя!)

*Часова – навечна: вечная памяць у форме рэха...* (А. Разанаў. Паэма калодзежа).

*Часова ўсё, да роспачы часова* (А. Салтук. Не трэба спачувальных тэлеграм...).

*Час праходзіць праз душы людзей, нанізвае іх, як на верацяно. Мы не належым сабе, мы належым часу* (В. Каваленка. Падвышанае неба).

*Час просіць першае зрабіць – / Не даць усемагутны розум / Рукою нелюдзяў забіць* (С. Законнікаў. Напярэдадзе нялёгкай працы...).

*Час робіць вялікім, што некалі здавалася не вартым увагі, але той жа час нярэдка робіць звычайным, будзённым і непрыкметным тое, што яшчэ зусім нядаўна лічылася вялікім...* (Я. Сіпакоў. Як птушкі ў лёце).

*Час узбуйняе мастака. Чым далей ён ад нас, тым значнейшымі здаюцца нам яго творы* (Г. Марчук. Голас і слова).

*Часу няма калі жыць* (П. Шруб. Часу няма сказаць «люблю»...).

*Час, што ніяк не спыніць, – / Ведае ўсё: ён ад Бога найпершы вястун* (М. Шабовіч. Дзень адгарыцц непрыкметна...).

*Час – як грамацей* (В. Аколава. Зоркамі праз цень воблік твой расце).

*Чым захапляўся – / тое наракае* (А. Разанаў. Паэма запаленых свечак).

***Ш****то адмерана – / пройдзеш са славай, / ці прасунешся – / як набяжыць. / Ды нікому не дадзена права /*

*Выбраць час, у якім яму жыць* (Г. Пашкоў. Вогнішча на доце).

*Што прайшло, таго не вернеш, / Не скажаш часу: «Пачакай»* (С. Грахоўскі. Дакор сабе).

**Я** *знаю: скончыцца дарога, / Бо ноч нябыту, ноч-аблога / Сачыць наш час ад дня раджэння / Сляпымі зрэнкамі зацьмення, / Як дух закляцця, дух праклёну* (Я. Колас. Новая зямля).

*Я й стагоддзем Вам пакланюся: / Мова. Матуля. Мінск і Няміга* (В. Аколава. Малюнкі словам).

*Як ні мудруй, ні пругайся, / А немагчыма, немагчыма / Адолець прыцяжэнне часу* (В. Аколава. Случарынкі).

*Як ні рашай, крытычны кворум, / Прыкметы часу часцяком / Не ў тым відны, што ў поце творым, / А ў тым, што смехам сказанём* (М. Лужанін. Як нараджаўся новы свет).

# Алфавітны паказальнік афарыстычных выслоўяў

*Абавязкаў / Спрадвеку ў Творцы не было* 186

*А багатая душа маладая, /Бо старэць ёй няма калі. / А багатая душа галадае – / Не пякуць ёй хлеб на зямлі* 315

*А балючэй за ўсякі боль – / Як дзеці любыя чужэюць / І варагуюць між сабой* 128

*Абароньвайся, Слова, сабою* 264

*А беражы, як сад, як жыта, / Як першы сонечны прамень, / І дзень той, што не так пражыты, / Бо ён народзіць новы дзень* 88

*Абіжаешся, што ў школе / справядлівасці няма. / Да жыцця рыхтуе школа... / Так што скардзіцца дарма* 138

*Абломкі крыўдных слоў сядзяць у душы, як стрэмкі* 264

*Абмежавана зместам слова* 264

*А буду – прысутным! – / памру, ды не вымру* 54

*А будучыня парасткам належыць, / Бо на дубах былых растуць яны* 177

*А буслы белы гонар маюць...* 55

*Абшарыць кішэні свае памяці* 148

*Абыдзіся без жабрацкай скаргі на жыццё* 88

*Авангардызм – гэта рэалізм з сардэчнай недастатковасцю* 186

*А вачам усё роўна, / што – камень, а што – хлеб* 77

*А верш адпачынку не просіць* 186

*А вершы – гэта зоры, гэта вецер, / Імгненне, што застыла пад сцілом* 186

*А вершы пішуць – як жывуць. / Як дыхаюць. Як паміраюць* 187

*А вечнасць – / момант / ў красе/ і... / смерці* 358

*А вось чуласць, чалавечнасць – / Ім дарога проста ў вечнасць – / Больш за ўсё нам даражэй* 339

*А выбіраць – не парываўся: / Зайздросны лёс, але – не мой* 97

*А вы, мае песні, удзячныя мала: / Мяне папракаеце кожным радком* 187

*А глянеш навокал – такая краіна: / дзе ступіш – то рэха, то казка, быліна...* 250

*Агню без цемры цемнавата, / Не цёмна цемры без агню* 387

*А голас мамін будзе мне / Гучаць, / Нібы малітва ў храме* 128

*Агонь і слова – гэта адкрыцці, / Якім нялёгка роўных падшукаць* 264

*Агрэсіўнасць... можа існаваць не толькі сама па сабе, а яшчэ як адна з магчымасцей атрымаць радасць, мець насалоду, быць шчаслівым, як адна з праяў геданізму* 228

*А дарога ад плуга да пяра / Карацейшая, як ад пяра да плуга* 170

*Ад велічы да ганьбы – адзін крок* 217

*Адвечнае пытанне крытыка: сказаць праўду аўтару пра яго твор – пакрыўдзіць аўтара, сказаць няпраўду – пакрыўдзіць сябе* 187

*Адвечная дылема для чалавека – калі не скараешся Богу, не супрацьстаіш д'яблу* 315

*Ад вёскі адбіўся, у палац не папаў* 227

*Ад гора – усё ў свеце няміла, / Ад шчасця – час хутка мінае, / Ад хмелю – марнуюцца сілы, / Ад славы – сяброў убывае... / Вось тут і спыніся на нечым / У гэтым жыцці, чалавеча!* 88

*Аддавайся жыццю светланосна!* 88

*Ад дармаедства ўся распуста: / Нішто душу не губіць так, / Як незаробленая луста, / Якою сыціцца лайдак* 170

*Ад дзетак слава бацькі не ўцячэ* 129

*Аддзячыць поле табе, аддзячыць, / Аддасць гарою калосны дар; / Яму вось толькі адчуць і ўбачыць, / Што ты не госць тут, а гаспадар!..* 170

*Ад здрадлівага – сэрцам адыдзі, / Ад цыніка – свой смутак уратоўвай, / Зайздрослівага шчодра не віні, –/ Жыві праўдзіва – усяго і толькі...* 359

*Ад зерня – колас, ад слова –мова* 265

*Адзіна праца і каханне / Ў жыцці апірышча і шчыт* 111

*Адзіна той Жыццю слугуе, / Хто знае пра сваю віну* 359

*Адзін Гасподзь – /Надзейная апора / Ўсяму, што ім задумана, ўсяму* 315

*Адзіноцтва – не самасуд. Гэта ўнутраная работа, шліфоўка сваіх думак, поглядаў. Гэта праверка сваіх пачуццяў* 214

*Адзін прыйшоў / і след пакінуў, / Другі прыйшоў, / каб наслядзіць* 146, 214

*Адзін прыходзіш на свет калючы / І адыходзіш – адзін* 359

*Ад ісціны – да ісціны: хады – / На век жыцця... ні кроку болей* 291

*Адказна ставіць не псеўданім – / прозвішча* 187

*Адказнасць за мір, за жыццё, за шчасце на зямлі ляжыць на кожным сумленным чалавеку* 162

*Ад кахання да расстання – / Дарога тая, што праз нас* 111

*Ад кожнага літаратурнага пакалення патрабуецца ў творчасці новае – за любую цану. Ад кожнай чарговай вясны чагосьці небывалага не патрабуем, абы толькі яна была сама сабою* 187

*Адкрыю раўнадушнаму душу, / А роднаму ад сораму схлушу* 129
*Адкукарэкае, / а там па ім хоць не світай...* 228
*Адкусілі язык – / за яго скажуць тое, што трэба* 228
*Адлегласць ад сяўбы да жніва / Даўжэй за век людскі бывае* 177
*Ад лёсу не схаваешся, нідзе не дзенешся* 98
*Ад лёту да падзення – адзін крок* 387
*Адлучанасць ад шчасця – / як праклён* 111
*Адна быць можа роднай маці ў сына, / Як мова роднай можа быць адна* 265
*Адна іх маці радзіла – / Грэла сваім бяссоннем. / Адна іх зямля насіла, / Адно ім свяціла сонца! / Адна гадавала хата: / Адзін узяў меч абаронцы, / Другі ўзяў сякеру ката* 129
*Аднак саюз мужчынскі – не каханне, / Дзе трэці лішні пакідае двух* 111
*Адна на ўсіх суровая чарга / Туды вядзе, і лік той некароткі* 359
*Адна рука ляжыць на зброі, / Другая лашчыць спелы колас* 162
*Аднастайнасць – смерць усяму жывому* 359
*Адна толькі культура працуе на дух. Усё астатняе – на жывот...* 315
*Адна ў людзей надзея: / на людзей* 61
*Ад неба блізкі ці далёкі, / Хоць у царкве, хоць на піру – / Паэт заўсёды адзінокі* 187
*Адной і той жа хадой / Прыходзяць у жыццё / І пакідаюць яго* 359
*Адной палавінай жыцця набываю, / другою – трачу: / раскрыжаваны / ў самім сабе* 359

*Адно не міне, не замосціцца – прорва самоты / Духоўнай істоты ў шуканні Красы між марноты* 346
*Адно толькі сніцца / Крылатай пупышцы / І кожнаму семю – / Хутчэй бы, / хутчэй пралупіцца!* 177
*Адно шкада, што добрыя радкі / Ніколі не чытаюць падлюкі...* 187
*Адны бягуць ад пастак і засад, / другія ўсё жыццё палююць* 359
*Адны жабракі могуць праз усё жыццё толькі браць,* 55
*Адным і тым жа ветрам – / Карацець / І доўжыцца...* 98
*Адным ляцець высока; ходам крэсным / Паўзці другім, хто розумам аглух* 38
*Адным словам можна вельмі шмат выказаць, або тым жа самым словам нічога не сказаць* 265
*Адны сцягі нідзе не плачуць, / Хоць і схіляюцца сцягі* 55
*Адны трымаюць нос высока, / Другія ў дол спускаюць вока* 38, 228
*Адных прывозілі таксісты, / Другіх прыносілі буслы* 38
*Адольваючы моцную даўно, / Спакусліваю сэрцу іншароднасць, / Няпростая, як свет, / людская годнасць / Па рысачцы складаецца адной* 55
*А доля – / Пані не скупая, / З падумкай дзеліцца вярстой. / І басанож душа ступае / Па матчынай зямлі святой* 98
*А доля проста не рыфмуецца. / Не ўціснеш лёс у верш сілком...* 98
*А доля ўсіх матак такая – / Дарогам сыноў аддаваць* 129
*Ад пракажоных, з язвай невылечнай, / Свяча не ўспыхне* 217
*Ад праўды раз адкруцішся – / Няпраўдаю атруцішся* 291
*Ад прыроды шпак, / А выпендрываецца, як калібры* 77

*Адрачэцца радня па крыві – / Паратуе радня па духу* 129
*Адрозніць вельмі лёгка ад жывых таго, каго жыццё жадае сэрцы* 98, 359
*Ад славы галава не баліць, а толькі кружыцца* 168
*Ад спакою час цябе ўратуе, / Ад самоты – сам сябе ратуй* 397
*Адступніцтва пачынаецца з выпрацоўкі «высокай» філасофіі, якая апраўдвае здраду* 228
*Ад сябе самога не схавацца, / Ад сябе самога не ўцячэш* 38
*Ад тайны да звычайнасці – дарога мураша* 350
*А душа наша – ўся са спагады* 315
*Адцвітае, усё адцвітае – / і гады, і хвіліны, і кветкі* 397
*Адчай падманлівей за кропельку надзеі* 214
*Ад чалавека да краскі – / Прагнуць усе на зямлі / Шчырай спагады і ласкі...* 105, 340
*Адчувае душу чужую, / Хто пачуў цішыню нябёс* 315
*Ад шчасця лекаў я не знаю...* 111
*Ад шчасця можна адкупіцца, / А смерць ніхто не падмануў* 359
*Ад шчасця слёзы ў іх [дзяцей] не льюцца, / Ад шчасця хочацца ім пець* 111
*Адшчыравала радасці пчала* 348
*Ад Юды каравай, / Што ты ясі, – у роце не дзярэ?* 228
*А жонкай стаць і не кахаць нікога – / Усё адно як вольнай жыць без волі...* 111
*А жыццё (хоць памры!) не пачнецца спачатку* 359
*А з пекла ў рай / не далятае нават рэха* 359
*Айчыны б паветра ўзахлёб, / на ўвесь рот, / І матчынай мовы акраец* 238
*А калі б думкі мелі колер: / Светлыя – тады табе светла, / Цёмныя – цёмна, – / Многія так бы і не ўбачылі / Весняй красы / і*

*нябеснай сіні, / І, пэўна, / не ведаў бы свет тады / Трагедый Сангмі і Хатыні* 265, 387

*А калі бог захоча цяжка пакараць чалавека, ён задавальняе ўсе яго пажаданні* 316

*А калі не спяваць аб Радзіме, / Дык навошта наогул спяваць?* 239

*Акальцованыя птушкі, акальцованыя жонкі* 129

*Акаляючага асяроддзя / Для мяне няма, / не існуе. /Асяроддзе ёсць машын і прэсаў...* 77

*А каму ж гэта з нас у жыцці не хочацца / Быць хоць за што, а пахваленым...* 360

*Акно – самы просты тэлевізар у свеце* 291

*А колькі ж каштуе святло? – / Белы свет /Знае плату адну за яго спакон веку: / Жыццё чалавека* 360

*Акрамя ўсяго, паэт павінен яшчэ стварыць сваю філасофію. Калі яе няма – няма і паэта* 187

*Акрылёная душа – святкуе штодня!* 316

*Акселерацыя – не мода, / А права ранняе на пот* 171

*Але дарма: жывую сілу / Не запраторыш ты ў магілу...* 360

*Але дзе, / калі, / на чым, скажыце, – / На вячэрніх зорах / ці... на жыце / Згаварыць прабабчыну замову: / Родныя, / аддана беражыце / Край – жыцця і вернасці аснову, / Беражыце мову* 265

*Але для ўсіх нязменны запавет – /Не толькі род цябе ў жыцці ўзвышае, / Найперш ты сам узвысіць род павінен* 129

*Але ж колькі ні стой у цені, некалі ўсё роўна давядзецца зноў выходзіць на сонца* 77

*Але закон жыцця суровы: / Адзін затоміцца – / другі / Займае месца важакова* 360

*Але лісточкі – яшчэ не дрэва* 77

*Але Муж – не той, хто не знаў батагоў, / А той, хто пад імі маўчаў* 153
*Але не звяжаш ты парваных струн, / З двух сэрцаў не зрабіць адно* 112
*Але не кожны, ой, не кожны бачыць / Боль, як нябесны знак сябе іначыць* 228
*Але не кожны сцяміць мовы / І жальбы ветру між будовы...* 77
*Але не сляпая доля, / Бо плуг твой цябе вядзе* 171
*Але нічым – ні здзекаў намеццю, / Ніякай ласкай і хвальбой / Адбіць няможна добрай памяці, / Што ў мове точыцца жывой* 265
*Але пакуль ёсць праўда і крыўда, ёсць багатыя і бедныя, ёсць сытыя і галодныя, ёсць князі і рабы, ёсць генералы і салдаты, ёсць жандары і паэты, ёсць асуджаныя і ка́ты, да таго часу будуць зайздрасць, падман, грабеж, нянавісць, барацьба, каварства, кулакі, локці, зубы...* 228
*Але раз ты наважыў дзела, / Ідзі станоўча, роўна, смела, / Ідзі, назад не аглядайся / І на другіх не пакладайся* 171
*Але скажы мне: дзе яна, зарука / ад той маланкі, што абдасць наш свет!* 98
*Але скрыжалі зямлі, дзе запісваюцца казка-праўда і праўда-казка, такія разнастайныя і такія багатыя, што людзі вечна будуць іх чытаць і ўсяго не перачытаюць* 397
*Але ў святла – святая тайна: / Разліцца ў колерах усіх* 55
*Але ўсяму свая ёсць мера* 387
*Але хоць мы, далёка пакінуўшы за сабою вясну свайго жыцця, часта сядзім каля гнілога карыта растрэсеных думак і зманлівых надзей, усё ж такі мы любоўна глядзім на нашу маладосць і сэрца наша гатова плакаць па ўтрачанай вясне* 142

*Але якія б высі ні ўздымалі, / Ізноў вяртацца трэба на зямлю* 360

*А лёс Дзяцей, і лёс Радзімы, / І лёс планеты – лёс адзін* 98

*А лёс захоча – ізноў няшчасце: / стане коўзка і лёгка ўпасці* 98

*А ліха прыйдзе без падмогі, / Бо ліху – бітыя дарогі* 332

*Альфа і амега сяброўства – спагадлівасць і надзейнасць* 105

*А людства будзе жыць, бо кожны з нас / Па-свойму рысы Бога паўтарае* 61

*А мне мой кут – навечна Мекка, / Ды і Галгофа разам з тым* 239

*Амністыі не знае памяць, / Яна падзей мінулых склад* 148

*А можа быць, каб бачыць добрых, / Дык варта й помніць пра благіх?* 340

*А можа, і трэба гарэць нам дашчэнту? / А можа, і трэба жыць нам ахвярна?* 89

*А можа, першы воўк ёсць той сабака, / Які лізнуць адмовіўся руку?* 55

*А мукі вашы я не разумеў, / Пакуль ад вас не дачакаўся болю* 228

*А мы жывём, адно пакуль зямнуем* 360

*А мы ўсе роўна прагнем свята – / Аж да апошняе мяжы. / І дамагаемся упарта, / Бо дамагацца – значыць жыць!* 360

*А на аслах часцей бывалі дурні, / І не адзнака для Хрыста – асёл* 228

*А над Сусветам, / над тваім быццём / Звон часу б'е / няўмольна і адчайна* 397

*А на зямлі паланянку-душу / Толькі / Туга па радзіме трымае* 316

*А найлепшая тая дарога, / Што вядзе на бацькоўскі парог* 350

*А нам стаяць, не гнуцца, як трысцё, / Бо лёс славян і лёс майго народа – / Нялёгкае і гордае жыццё* 89

*А нашча хмеліць і вада* 291

*А не любяць – тады губяць, / а не любяць – і не рупіць / захаваць, засцерагчы* 112

*А непадсудны хіба толькі робат: / Яму нішто людское не баліць* 61

*Анёлавы вочы ў віны, / Калі шуфлюе лепшых у магілы* 217

*Анёл – ужо таму не анёл, / што ёсць сатана, ёсць д'яблы* 316

*А па зямлі ўсе сцелюцца дарогі – / Гасцінцы, магістралі, бальшакі – / Не для пакут, не для людской трывогі – / Для радасці і шчасця на вякі* 348, 350

*А парогі – прэч з дарогі!* 351

*А паэты старэюць раней, / чым астатняе ўсё чалавецтва* 187

*А песня не носіць ярма* 285

*А помніш, мама, я дачкой была. / Цяпер далёкай госцяй залятаю* 129

*Апосталы прыходзяць на зямлю, / Каб нагадаць паспець, / Што ўсіх чакае...* 316

*Апошні акт у першай з'яве: / Падаць руку і ставіць крыж* 387

*Апошняга нічога не бывае. / Жыццё і пачынаецца з канца* 360

*Апраўданне – гэта заўсёды даравание* 291

*Апынуся калі сярод чорных варон,– / Я памру, ды не буду па-іхняму каркаць* 55

*А радасць не залучыш пра запас* 348

*А раптам тое, што страціў ззаду, знойдзеш якраз наперадзе...* 397

*Араты ссівеў. Конь здох. Плуг заржавеў. Поле зарасло быльнягом. Засталася пуга. Ляскаць ёю ёсць каму. А паганяць няма каго...* 360

*Арол быў сыты, і цяпер быў ён падобны нечым на варон* 77

*Арол застаецца арлом / І з адным крылом,* 55

*Арол не чуе курыцы* 77

*Арыенціраў не ведае страх / І не разбірае дарогі* 332

*Асадзі назад!* 228

*А самых лепшых – час не беражэ* 397

*Асёл, нагружаны цюкамі кніг, / Яшчэ не мае годнасці вучонай!* 55

*Асіліць не магу /На тройку з мінусам / Адзін прадмет – Жыццё* 360

*А славу я не мераў на караты, / Бо не рубін яна і не алмаз* 168

*А след ад вялікай душы застаецца на свеце доўга* 146

*Аслеп учора, / А сёння бачу* 177

*А слова павінна быць, / як насенне, / якое сеем у дзень вясенні, / слова павінна прарастаць, / даваць усходы, / рунець, / красаваць* 265

*А слова – сапраўды жывая рэч!* 265

*Асноўная, глабальная, пастаянная задача пісьменніка – будзіць чалавека ў чалавеку* 187

*А сосны ідуць не толькі на мачты* 77

*А спярша – / Патрэбен плач, каб болем спелым / Магла напоўніцца душа* 316

*Астудзім так яго* [сэрца], *і ўжо не сэрца будзе, / А торбачка крыві, што ні сабе ні людзям* 316

*А суд гісторыі цяжкі* 397

*Асушаюць зямлю неразумныя душы – / І не толькі зямлю неразумнасцю сушаць* 258

*Асцярожна, людзі, асцярожна / З тым, што сёння можна на зямлі!* 259

*Асяроддзе выштурхоўвае з сябе, знішчае тое, што нясе яму згубу* 77

*А там, за светам, на чужыне, / Ніхто цябе, ой, не прыхіне!* 239

*А таму – не з'ем адзін вала, / Не зайздроснік я і не хапуга. / Падзяліць гатовы напалам / Нават скібачку малую з другам* 105

*А твор павінен мець адзнаку / Сваёй зямлі* 188

*А той, хто злыдняў пакрывае, / Ёсць злыдзень гэтакі і сам* 229

*А трэці быў і раб, і цар, / І слаб, і дуж ва ўсякім дзеле, / Як вечнасць молад быў і стар...* 188

*Атэіст – гэта не той, хто не верыць у Бога, а той, хто намагаецца паставіць сябе на яго месца* 316

*А ты, Янка, не зважай / На кажух падраны!* 236

*А ў жыцці – / перапынку няма, / Перапынку няма!* 360

*А ў жыцці як спатыкнуўся, / Глянеш – дзверы ўсе закрыты* 89, 360

*А ў кандыдатах ніколі нястачы не бывае на свеце* 38

*А ў нас зямля – якую краску, / Якую былку ні сарві – / Кладзі да сэрца як лякарства / І – здаравей, брат, і жыві!* 259

*А ўрэшце кожны плача па сваім бацьку, як умее* 129

*А ўсё ж такі... каханне ёсць нейкая хвароба, боль і пакута* 112

*А ўсё зіхціць крышталінкаю першаю / Той момант светлы, што не ўберaглі* 89

*А ў спешнасці, як грэшнасці, ёсць здрада і мана* 361

*Аўтарытэт – не абавязкова любаванне самім сабою* 303

*Афарызм – гэта разумна выказаная думка, якая жыла ў галаве філосафа, а цяпер будзе вісець на кручку мудрасці* 303

*Афарызмы – гэта тэрміновыя тэлеграмы розуму* 303

*Афарызмы ніколі не характарызуюць аднаго чалавека. Яны здольныя ахапіць усё чалавецтва. Але ж, як ні дзіўна, у іх прысутнічае нацыянальны каларыт аўтараў* 304

*Ах, вялікія людзі мастацтва, – і чаго вам у палітыку?!* 188

*Ахвяра ёсць – дык знойдзецца і кат* 162

*Ахвяры не вымяраюцца лічбамі, арыфметычнае мысленне тут нямое, тут – парог, тут мусіць браць слова іншая мова, якой мы яшчэ не валодаем, мусіць гучаць «голас бязмоўя»* 162

*Ах, колькі ёсць красы цудоўнай поруч з намі, / Калі глядзець вакол дзіцячымі вачамі* 346

*Ах, людзі, людзі.../ Мы ў адказе / За невялічкую Зямлю* 239

*Ах, прага юнацтва, калі б ты умела, / Ах, старасці смага, калі б ты магла!* 142

*А хопіць і куточка Беларусі, / Каб цэлы век свой да яе ісці* 250

*А хто вецер пасее, – / Той буру пажне* 163

*А хто крынічку задушыў – / Не пашкадуе мора* 217

*А хто не надзеецца на сябе, той цягам бывае слабы* 153

*А хто не паважае сябе, таго і другія не паважаюць* 55

*Ах, якая ты жорсткая ўсё-ткі, / мудрасць людская* 304

*А ці лягчэй нявольніку тады, / Калі на ім аковы залатыя?* 157

*А чалавечая памяць багатая. Ёй трэба насіць усё тое, чаму не трэба – чаму нельга – зноў паўтарыцца* 148

*А чаму гэта нам, калі ў адзіноце, абавязкова трэба падмацоўвацца то з прэсы, то з эфіру? А калі больш падумаць, спакайней засяродзіцца, зарчэй зірнуць навокал?* 214

*А чаму пасля / чалавечага гневу / Чорным робіцца сэрца?..* 229
*А час на твары піша й піша – / Усе дарогі, ўсе шляхі, / Усе здабыткі і грахі* 397
*А часу без людзей няма* 397
*А што ў застоллі – кіраванне? / Сачы, каб чуўся чарак звон!* 236
*А што, урэшце, галоўнае на зямлі і што кіруе светам? Каханне... каханне* 112
*А як свет ёсць, як зоры гарацъ, / Як над морамі сонца ходзіць, / Ці святло з цемрай можна яднаць, / Ці былі яны дзе у згодзе?* 77
*А я – твой сын, ад косці тваёй косць, / Кроў ад крыві тваёй, мая Айчына* 239

*Багаты духам той, хто дорыць многа, / Убогі – хто не дорыць, а бярэ* 316, 388
*Багоў заўжды на свеце многа, / Бо чалавекам быць – цяжэй* 316
*Бадай не кожная рэч мае два бакі: паказны і праўдзівы* 236
*Байцам тэхнічнага прагрэсу / Не забыцца б на прагрэс душы* 316
*Баліць ад усяго люцей / Бацькоўскі боль за дзяцей* 129
*Балюча ведаць, які ты багаты, калі ўсе толькі і пераконваюць цябе, што ты самы бедны на зямлі!* 38
*Балючай раны не дражні, / мудрым будзь, ды не мудруйся* 304
*Балюча насіць у сабе скарб і не карыстацца ім* 317
*Баляваў, зухаваў, / Ды свой гонар пахаваў* 55
*Барані арліц, арлец!* 129

*Бацька, і маці, і родная мова, / узнятая к славе амаль з небыцця, / паэтаў натхнёным і велічным словам, / для беларусаў – пытанне жыцця* 130, 265

*Бацькам калісьці памагалі дзеці, / ну а цяпер – наадварот* 130

*Бацькі дзяцей не абкрадаюць – / Спакон было так, з роду ў род* 130

*Бацькі з магіл цяплом дыхнулі, / Каб дзецям жыць лягчэй было* 130

*Бацькоўская хата без маці – / Што грудзі жывыя без сэрца* 130

*Бачу праз перашкоду. Думаю праз перашкоду. Праз перашкоду жыву* 89

*Бачу я: нехта некага любіць, / Гэта іх справа, / гэта іх права./ Бачу я: нехта некага губіць. / Тут і мая ўжо справа* 61

*Баюся тых, / што прытаіліся, / Баюся тых, / якіх не распазнаць* 38

*Баяўся мужыком здацца і выявіў сваё поўнае хамства* 229

*Баяцца – ці не гэта і ёсць звычайнае чалавечае жыццё?* 361

*Бег часу не адчуць у мітусні, / У зладжанай зададзенасці быту...* 398

*Бедны запомніць багатыя дні. / Бедныя дні не забудзе багаты* 62

*Без атак і абароны / Няма сапраўднае вайны* 163

*Без Бога жыць можна, але з Богам у душы надзейней і спакайней* 317

*Без гаркоты веку не пражыць* 361

*Без дабрыні мы не людзі, а голыя дрэвы* 340, 388

*Без змагання і няўдач нічога не даецца на свеце* 163
*Без каранёў вялікіх не бываць Вялікім дубу, хоць з пароды й гэтай!* 239
*Без кахання шчасця, долі / Няма на зямлі* 112
*Без крылаў песні не ўзляцець высока* 239, 285
*Без крэсіва ж і крэмень / Не высеча з сябе агонь, / Каб разагнаць густую цемень* 171
*Без мазаля чалавека спрадвеку / Не лічаць у нас, не завуць чалавекам* 38
*Без натхнення творчасці не бывае, можа быць толькі рамесніцтва* 188
*Без песень свайго народа / Нямее нават прырода* 285
*Без повада, без вобруці, / Усім вядома, добра йсці* 157
*Без праўды людзі робяцца злыя! Нават добрыя людзі! Нават дзеці!* 291
*Без радзімы мы ўсе, хоць на волі, а ўсё ж / у няволі* 239
*Без радзімы народа няма, / Без народа няма Радзімы* 299
*Без роднай мовы / Людзі ў родным краі, / Як тыя кватаранты-нямтуры...* 266
*Без солі хлеб – не хлеб / і верш – не верш, / калі няма ў ім солі* 188
*Без сонца / Не родзяцца травы, былінкі* 78
*Без спагады і раны не гояцца* 105
*Без тваіх, маці, жніўных песень / Свет шырокі зрабіўся б цесен. / Без твае скупой прыгажосці / Я ў жыцці пратаптаўся б госцем* 130
*Без хлеба скачацца не надта! / А хлеб буханкай не расце...* 181
*Без чалавечай і буслінай вернасці / Няма ні дабрыні, ні хараства* 112
*Без чалавечнасці не будзе вечнасці* 340

*Белай Краіне не згінуць парожняй – / абарані ад бяспамяцтва, Божа!* 250

*Беларуская гасціннасць упартая, неадступная, недалікатная і таму можа здацца навязлівай, калі не адчуць у ёй шчырасці і сардэчнасці, шырыні душы...* 250

*Беларускі народ – не паперкі, / Не духоўны сляпенькі туман* 250

*Беларускія звеку паэты / Над хлуснёю і подласцю над!* 188

*Беларускія мудрыя кнігі не замкне палітычны замок!* 251

*Беларусу і ў Парыжы сняцца белізна бяроз і сосен медзь* 251

*Беларусь аб сусвет не парань...* 251

*Беларусь адродзіцца Верай* 251, 317

*Беларусь – мая маці і мова, паветра і хлеб* 251

*Беларусь пад малітвамі Бога! / Не з калодай раскіданых карт* 251

*Беларусь перад усім!* 251

*Беларусь, / Свае таленты беражы, / Калі хочаш магутнаю быць!* 184

*Беларусь, / Свае таленты беражы, / Калі хочаш разумнаю быць!* 184

*Беларусь, / Свае таленты беражы, / Калі хочаш свабоднаю быць!* 184

*Беларусь, / Свае таленты беражы, / Калі хочаш славутаю быць!* 184

*Беларусь, / Свае таленты беражы, / Калі хочаш шчасліваю быць!* 184

*Беларусь – ты мой сон велікодны, / Сон, што сніцца анёлам вясной* 251

*Беларусь утрымалася верай* 251, 317

*Беражы і ахоўвай / Залатыя правы / Нашай роднае мовы, – / І ты вечна жывы...* 266

*Біяграфія – гісторыя чалавека* 38
*Блізкай дзе няма душы, – / Пустыня* 317
*Блудная дарога, ды конь яе знае* 351
*Бог абірае таго, хто сам сябе здольны абраць* 317
*Бог апошнім падзеліцца ў кожнай долі / І пра гэта не напомніць ніколі* 317
*Бог – таму і бог, што яму ўсё вядома!* 317
*Бог – чалавек! І чалавек, вялікі / Сваёй вялікай вераю ў людзей!* 317
*Бог – чалавек, распяты на паперы / Усіх ілжэвучэнняў пра яго* 317
*Бог чуе тых, / Хто даравання просіць* 317
*Божа, / Адвядзі ад Беларусі / Здраду, / Вераломства / І вайну* 251
*Божа! Жабрацкую торбу не дай – / Душою не дай ажабіцца* 317
*Божа, / Захіні маю Радзіму/ Мудрасцю, / Спакоем / І цяплом* 251
*Божа, ратуй мяне ад самай большай спакусы і граху – паўтарэння і перайманне* 317
*Бойся спазніцца з харошым учынкам: / Тонка прадзецца жыццёвая ніць* 217
*Бойся спазніцца са словам харошым: / Тонка прадзецца жыццёвая ніць* 217, 266
*Болем чужым станаўлюся відушчая* 62
*Боль адчуваюць толькі родныя, у каго яны ёсць* 130
*Больш за сябе я Беларусь люблю / І ёю з нараджэння ганаруся. / Праб'е мой час, / як Каліноўскі праз пятлю, / Я нізка пакланюся Беларусі* 251
*Бо мы толькі тады дачакаемся дня, / Калі нас не здалее змаганне злякаць* 153

*Бо толькі недзе там, за родным Бугам сінім, / Вятры такія, што асушаць слёз паток...* 251

*Бо трэба ведаць, хто і дзе ты* 38

*Бо чалавек – высокая пасада* 38

*Боязь засцерагае: у будучыні – смерць!.. Адвага натхняе: у будучыні – неўміручасць!..* 178

*Браток! Ці ж ты вачэй не маеш – / Арлом варону называеш?* 217

*Браток, Ямелю не зваляй! / Сястра, не зблоць Жанчыны!* 55

*Браты! Вялікая дарога / Чакае нас і родны край – / Жніво настала, працы многа, – / Навукі семя засявай!* 171

*Бруд вякоў і ліўням цяжка змыць* 398

*Будзе жыць Беларусь, / таму што ў прызначаную пару / сыдзе з крыжа Хрыстос* 252, 317

*Будзе хлеб – будзе радасць у хаце...* 181

*Будзь да канца са мной, сяброўка-памяць, / Нібы крышталь гранёны, чыстай будзь* 148

*Будзь здарова, радня па крыві, / Будзь бяссмертна, радня па духу!* 130

*Будзь смелым, як вецер, як воля сама! / Знай, смелых не чэпе ні крыўда, ні цьма!* 153

*Будзь шчодры: сам не паскупіся / І за дабро чакай дабра* 340

*Будзь як на споведзі / Перад сабой* 318

*Будучае наша залежыць ад раўнавагі мудрасці і сілы* 178

*Бурай змецёнае лісце / Не вяртаецца на голле* 163

*Бывае, і відавокі – ад сляпога / Народзіцца* 291

*Бывае слава, як праклён* 168

*Бывае так: у добрым севе / Трапляе дзікая трава* 178

*Бывае часта хараство бяздумным і пустым* 346

*Бывай, паэзія! Дабрыдзень, проза* 188

*Бываюць дні без шчасця, / бясчэсця сумныя гады, – / то паласа бясчасся* 398

*Бываюць жа такія людзі, што, сустрэўшыся нечакана, надоўга ў душы пакідаюць свой след* 39

*Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя – гояцца, і па іх знаку няма. Большыя гояцца, але па іх застаюцца рубцы. / Гэтак на целе. / Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя – гояцца, па іх застаюцца рубцы. Большыя – заўсёды крывавяцца. / Гэтак на сэрцы. / Бываюць раны большыя і меншыя. Меншыя – заўсёды крывавяцца. Большыя – залечвае толькі ... смерць. / Гэтак на душы* 217

*Была б ікона – знойдзецца святы!* 318

*Была б праўдзіва песня спета, / А вывад – кожны зробіць сам* 285

*Была б свіння, а лужа будзе* 39

*Была вясна, было імкненне, / І сэрца ведала тамленне* 112

*Былі ж, і ёсць, і будуць такія, што не быць паэтамі не могуць* 188

*Былі сусветныя войны, / сусветнага міру – не* 163

*Быў бы талент – знойдзецца пасада* 184

*Быў бы юда, а асіна на яго знойдзецца* 218

*Быў бы юнак, а надзея знойдзецца* 178

*Быццам недзе ёсць зямля / Больш лячэбная, / Як радзіма* 239

*Быць беларусам – / Гэта значыць, / Вясёла з сумнай долі кпіць, / Да Бога сцежку верай значыць, /Нагбом з карца надзеі піць* 252

*Быць беларусам – / Гэта значыць, / За родны край згараць на дым, / Па-беларуску чуць і бачыць / На гэтым свеце і на тым* 252

*Быць беларусам – / Гэта значыць, / Свайго ні гуку не забыць, / Усё чужое перайначыць, / Каб Беларусі вечнай быць* 252

*Быць доктарам філасофскіх навук і філосафам – часцяком вельмі розныя рэчы* 304

*Быць жа нехта павінен, / Хто цябе правядзе, / Аднаго не пакіне / У расстайнай бядзе* 105

*Быць людзьмі. / Не толькі імі звацца,* 56

*Быць мастаком шчэ не значыць / Хадзіць ды толькі кулдыячыць* 188

*Быць не можа ў братэрства нічыйных палос, / Між людзей / быць не можа старонняга болю!* 62

*Быць панамі / не надакучыла панам* 62

*Быць пігмеем ці лепей –/ Са стромы?* 56

*Быць сабою самім / І не лёгка й не проста* 56

*Быць чалавекам свайго часу трэба, дакладней кажучы – нельга не быць. Але ж як гэта важна быць яшчэ і над часам, быць тым, хто бачыць далей наперад, вышэй – у агульначалавечае* 39

*Быць чалавекам – цяжкае прызванне, / не ўсім, не кожнаму ўтрымаць яго* 39

*Быць шыпшынаю шыпшыне, / Пакуль зямлі трымаецца карэннем* 239

*Бяда аб'яўляецца спадсподу, як прарастае спадсподу трава-лебяда, гора абрушваецца згары. Бяда – яда: яна есць чалавека, гора – пітво: яно п'е чалавека, бяда салёная, гора горкае, бяда – яд, гора – атрута. Бяда прыходзіць знянацку, гора – раптоўна, бяда – выпадак, гора – здарэнне, бяда – Сцыла, гора – Харыбда* 332

*Бяда баліць, гора гняце, бяда галосіць, гора наракае, у бяды ўсё падае з рук, у гора ўсё згортваецца. Бяда бледная, гора чор-*

*нае, бяда – пятля, гора – горан, бяда – вужака, гора – груган, гора гародзіць між светам і чалавекам платы, бяда выбудоўвае сцены. Але ўсё на свеце мінае: і сплывае бяда, бы вада, і згарае, нібы агонь, гора* 333

*Бяда не збудзецца слязьмі, / Пайдзі параіцца з людзьмі, / І ключык знойдзеш неспадзеўна* 333

*Бяду пазнаеш па хадзе* 333

*Бязбожна блытаюць дзве розныя рэчы: вартасць з папулярнасцю, забываючы пра тое, што апошняя складаецца з элементаў ужо ўцэненых, страціўшых сваю арыгінальнасць* 39

*Бяздарнасць глядзіць на свет вачыма зла* 188

*Бязроднасць гневіць камяні* 130

*Бяруць свабоду сілай духу, / Бяруць са зброяй у руках* 157

*Бярэ і сына любага і ка́та / Адна ўсёдаравальная зямля* 361

*Бясконцага веку / Не спытаць, не купіць / ні ў людзей, / ні ў багоў* 361

*Бясконцае шчасце – / З юнацтвам наперад ісці* 361

*Бяскрылай песняй іскры не запаліш, / Што палкай думкай сэрца апячэ...* 188, 286

***В****ада з балота можа стаць святой. /Растуць спакойна дрэвы на іконы* 78

*Вада з камня не ўцячэцца, / холадам зіме не грэцца* 78

*Вада і агонь, якія пярэчаць адно аднаму, мірацца на чалавеку: і вада ачышчае яго, і агонь таксама* 39

*Вада і тая / Не ўсюды роўны нораў мае* 78

*Вада няйначай кроў зямлі, / Яна – нязмернае багацце* 78

*Вада пустаты не трывае...* 78

*Вада – такая рэч, што не можа доўга стаяць на адным месцы: / Спакой – вадзе гібель* 78

*Важна адно – быць жывому, жыць і змагацца* 361

*Важней за ўсё – правільна думаць і адчуваць, не шкадуючы самога сябе дзеля праўды, бачачы сваё месца ў нашым жыцці, сваю работу, свой абавязак і сваю віну* 361

*Важны, і галоўны, і самы светлы талент – дабрата* 340

*Вайна заўсёды боль нясе* 163

*Вайна і смерць – самыя родныя і блізкія сваякі і, у адрозненне ад людзей-сваякоў, адна без адной жыць не могуць* 163

*Вайна – самае праклятае з усіх ліхаў, заведзеных жыццём на зямлі* 163, 361

*Вайну смакаваць не варта* 163

*Валяцца ўсе шышкі / Нават на ньютонаў зверху ўніз* 291

*Вам* [маладым] *доўга крочыць праз гады. / Не забывайцеся ж, якія / Вы пакідаеце сляды* 146

*Варта змяніцца варункам, / Як мяняюцца гаспадары, / І – / Альбо хаўрусуй з імі,/ Альбо камры* 361

*Вартасць кожнага чынамі мерыцца і законам зямлі і нябёс* 388

*Ваўку не трэба хітраваць вучыцца...* 78

*Вачыма неба мерай, / Але зямлёй жыві – / І радасная вера / Народзіцца ў крыві* 259

*Ведаем, жывём занадта мала, / Каб напрыканцы не шкадаваць, / Што не ўсё, чым доля нас вітала, / З годнасцю мы ўмелі адвітаць* 56, 361

*Ведае свет, што вялікіх дум цвет / Адно толькі на зломе ўзрастае* 266

*Веды, засвоеныя механічна, – нямая вага* 138

*Веды – таксама ежа, разумовая, але ежа, і яна таксама можа быць не на карысць чалавеку, яна таксама можа шкодзіць, і ад яе таксама неабходна час ад часу разгружацца – пасціць* 138

*Векавечны толькі край, і далеч, / І жоўты ліст на зелені травы* 398

*Век жыві – і век спялі адвагу* 154, 362

*Век пражыць – не поле перайсці, / А такому падлягаць іспыту: / На каменні зернем прарасці / І зняможанаму ўстаць з нябыту* 89

*Век – смелы цыркач на канаце* 398

*Веліч палітыкам ствараюць паэты* 188

*Вельмі няўрымслівая гэта рэч – знайсці душэўны лад са сваім наваколлем* 78

*Вельмі прыемна, калі чалавеку дасі хоць невялікую радасць* 348

*Верай і праўдай / надзеі служы / і жыві, / Помнячы вечна, / што ёсць і табе вымярэнне – / Кропля аддадзенай справе Айчыны / крыві* 239, 348

*Верны будзь слову, / якое ўпала / з матчыных вуснаў, / як з неба, / ў душу* 266

*Веру мусім прымаць напавер, / Вера трымаецца на даверы* 112

*Вер часу: глупства мудрых не скасіла, / Са сцежкі яснай зайздрасць не звяла...* 229

*Верш значны не гукам, які чуваць, пакуль верш чытаецца, а сваім рэхам, якое ён утварае, калі адгучыць* 189

*Верш напісаць – то не сасну зваліць, – / Патрэбна душы скалануць людскія* 189

*Вершы, бы дзеці, нараджаюцца ў муках – / Лёс, ты пражыць ім сумленна дазволь* 189

*Вершы нараджаюцца не з уладнага «хачу», а з безабароннага «хочацца»* 189

*Вершы, у якіх карані напаказ, могуць стаць вершамі-цытаваннямі, але не вершамі-адкрыццямі* 189

*Верым, што лепшая частка жыцця – / Тая, якую пражыць мы збіраемся* 89

*Вечарамі на чужых узгорках, / Дзе чужыя кветкі між травы, / Як нам не хапае родных зорак / І салодкіх ветраў баравых* 239

*Вечнае па-свойму сеем, / Добрае – на свой манер* 89

*Вечна жыць жывому, што заклікана / Весці ў свет Наступнага чалавечы род* 362

*Вечназялёнага дрэва жыцця /Плод самы спелы і мудры садоўнік – / Ты, чалавек!* 39

*Вечнасць на імгненне не зважае* 398

*Вечны свет, а я – жыхар часовы... / Ды вучуся ў зерня і раллі / Радавацца / і душой, / і словам / Усяму жывому на зямлі* 362

*Відаць, / няма бальчэй пакут, / Чым шкадаваць да скону, / Што не вярнуцца ў матчын кут, / Хоць позна, / ды з паклонам...* 240

*Відаць, страшней, страшней за ўсё на свеце – / Пакінутым усімі быць* 214

*Відаць, там шчасце не канчаецца, / Дзе ёсць прычыны для трывог* 112

*Войны не пахнуць дабром* 163

*Волі не ведае вольны* 157

*Вол прывыкае да ярма – / Як распрагуць, яму нязвычна, / Здаецца, выпраглі дарма* 157

*Вольнаму – воля. Шалёнаму – поле. Святому – рай. Шчасліваму – доля. Пчолцы – кветка. Салаўю – май. Рыбе – вада. А што падкідышу?* 157, 388

*Воля – не тое, што рукі развяжуць, / зменяць на большую клетку малую. / Воля – не тое, што / «вольны ты» – скажуць. / Воля – то воля, якую адчую* 157

*Воля сонейку раўня* 157

*Вопыт людства ды ўласны наш вопыт / Прымушаюць нас у глыбіню / Кожнай з'явы глядзець* 304

*Вопыт пакаленняў нічому не вучыць, словы сведак – бяссільныя. Кожны мае прайсці свой шлях цаной страт і набыткаў* 89, 304

*Вось і для шчасця / патрэбна так мала: / шкельца кахання / ды шкельца цяпла* 112

*Вочы маці – вечнасці акно* 130

*Вучы дзяцей яшчэ з пялёнак: / Каб не скаціцца пад адхон – / Хай з курганоў тваіх зялёных / Бяруць у заўтрае разгон* 138

*Вучыся, нябожа, вучэнне паможа / Змагацца з нядоляй, няволяй* 138

*Вучышся з пагардай / На сэнс жыцця глядзець – няўцям, / Што жыць адно тады і варта, / Калі рабіць дабро людзям* 89

*Выбраўшы вечнае, ісціну можна не выбіраць* 291, 398

*Выбухнула вайна – / знойдуцца і салдаты...* 163

*Вывучай жыццё не зверху, а з сярэдзіны* 90

*Выказванне таму і магчыма, што ёсць невыказнае. Інакш усё можна было б выказаць адразу, нібы вычарпаць радовішча* 266

*Вымераны нормы, / Вымераны жэсты: / Стылізацыя формы – / Стэрылізацыя зместу* 189

*Вы – / Не арлы / І вы – Не вораны* 78

*Выпадак – наш гаспадар* 98

*Выпадак ходзіць там, дзе яго чакаюць* 98

*Выпрабаванне адзіноцтвам – самае страшнае выпрабаванне* 214

*Высокі сэнс жыцця і шчасця, / Калі жывеш ты для людзей* 90

*Вытворчасць тым і адрозніваецца ад творчасці, што яна спараджае структуры, памяшканні, пабудовы – неасвечанае* 189

*Выток і рэк і шляхоў адзіны: / Ад непрыкметнае ручаіны / Паходзяць плыні / рэк паўнаводных, / Шляхі – / ад рэчышчаў пешаходных* 78, 336

*Выхаванне – гэта выхаванне духу. Ці можна дух і душу выхаваць злом, кулаком, зверствам?* 138

*Вышэйшай праўды чыстая крыніца / Знайшла б з пячорных нетраў верны ход, / Каб праз хлусні чысцілішча прабіцца / Ва ўсёй красе да сонечных варот!* 201

*Вядома, хто далыш ад кватэры, / Таму менш стукаюць у дзверы* 292

*Вяду свой бой мясцовага значэння, / Каб не пачаўся ўсёзнішчальны бой* 163

*Вякоў гісторыю нам пішуць дні* 398

*Вялікае шчасце – / Душою наноў нараджацца* 318

*Вялікага дуба не бывае / з карэннем малым* 336

*Вялікаму ўласціва не спяшацца* 39

*Вялікая гэта справа – чалавечая адкрытасць, праўдзівая споведзь без грама разліку, жадання падаць сябе лепшым, чым ёсць на самай справе* 89, 218

*Вялікая сіла – вера. Але не меншая сіла і страх* 333

*Вялікі доктар усялякай хворасці ў чалавечай душы – час – мае вечнага свайго дапаможніка – працу* 398

*Вялікі доктар – час– спакойна і безупынна ідзе па свеце і лечыць і гоіць* 398

*Вялікі колас – сэнс высокі* 78

*Вялікім, неабдымным, нязмерным можа быць каханне маці* 130

*Вялікія людзі нашчадкам у генах / заўжды завяшчалі любоў* 112

*Вялікія пісьменнікі задавальняюцца і малою сцэнаю, а малыя – патрабуюць толькі вялікую* 189

*Вяльмуе Бог абраннікаў сваіх. / Без іх / На сэрцы свету халадае...* 318

*Вянкоў мы славы не насілі* 56

*Вярні нам Бацькаўшчыну нашу, Божа, / Калі ты Цар і неба, і зямлі!* 252, 318

*Вясна людзей каханню навучае, / а хто ж любоўю вучыць даражыць?* 112

*Вясна, як і хвароба, пачынаецца з прадчування* 79

*Гаварыць з незнаёмым чалавекам, які разумее цябе, – асалода. Маўчаць з блізкім чалавекам, які таксама разумее цябе, – яшчэ большая асалода* 62

*Гаварыць штодзень пра Бога і Смерць яшчэ не прыкмета геніяльнасці...* 318

*Гаворань: добрым быць нядобра, / Гавораць: дрэнным дрэнна быць. / Між злосцю і дабром – харобрым / Заўсёды нам патрэбна быць* 154

*Гадае той аб прышласці далёкай, / Хто верыць у сучаснае душой* 318

*Гадзіннік мой – не сонца, што ў зеніце, / Гадзіннік мой – не сэрца, што ў грудзях. / Сваім дакладным часам на арбіце / Сама зямля мой вымярае шлях* 398

*Гадоў неўгамонных імклівы экспрэс, / Спыніся хоць... / на павароце* 398

*Гадуе лічбы бег матораў, шын... /Мы – іх рабы, палоннікі, прыслуга... / Каб нас сейсмограф вартасці праслухаў – / У нашых душах нешта ад машын* 40

*Гадуюцца дзеці ў любові – ратуецца вечнасць* 138
*Гады ляцяць – каб не вяртацца. / Мне б на чарговым рубяжы / гадоў на дваццаць акапацца* 399
*Галеча / Цябе ачышчае, / Спакой прасвятляе* 237
*Галінка памяці / Не можа не стаць / Галінкай вечнасці!* 148
*Галоўнае – / З зямлёй бацькоўскай сувязь, / Што б ні было, трывалай зберагчы* 240
*Ганебны час, калі прышэптваюць паэты, / Трагічны час, калі змаўкаюць назаўжды* 399
*Гаршчок агорнуты пашанай, / Хоць ён фаміліі глінянай* 56
*Гасподзь схіляецца да ўсіх, / Ды духам ніцых ён не чуе* 318
*Гасяць, чуў я, пажары лясныя / Сустрэчным агнём...* 79
*Гатовы ліха прыкупіць, / Каб спатайку цябе ўкусіць* 218
*Геній адрозніваецца ад простага смяротнага тым, што ў яго няма геніяльных запатрабаванняў і прэтэнзій* 40
*Геній не толькі стварае, умее ствараць, – геній умее ўбачыць, умее пачуць тое, што ёсць на свеце, у прыродзе, у людзях, на людзях* 40, 185
*Гісторыі дастаюцца падзеі, а мастацтву – людзі* 189
*Гісторыю зямлі маёй цярплівай / Падручнікам вучнёўскім не ахопіш* 259
*Гісторыю надзеі пішуць / На скрыжаванні ўсіх вятроў* 178
*Глухому салаўю / Не трэба нотаў велькіх* 189
*Глыбакадумныя на фота, / Пустапарожнія ў жыцці* 40
*Глядзі людзей, ідзі з людзьмі – чалавекам будзеш* 62
*Глядзіце зверху ўніз на травы / Ці на ваду, / Не на людзей* 56
*Глядзіце, якая цаца ззяе ў смецці!* 229
*Глянуць адчужана зверху ўніз – / святое жаночае права* 125

*Глянь: / Сярод ракет, сярод радараў, / Босы – на аголеным мячы – / Мір стаіць маленькім санітарам / З ношаю вялікай на плячы* 163

*Голас незнаёмага можа здзівіць, / Голас друга – на хвіліну спыніць, / Голас любай – сагрэць сонцам лета, / Голас маці – вярнуць з таго свету* 131

*Голы, босы, адны косці, а бутэлькі гне* 40

*Голыя факты, як і голых людзей, не заўсёды і не кожнаму прыемна бачыць* 292

*Гонар – як горан: ён асвятляе, і грэе чалавека, і дапамагае яму захаваць яго сапраўднае аблічча, яго чалавечы ранг... але тады, калі чалавек, як Богу, дазваляе гонару ўгрунтавацца ў нораў і розум і, як Бога, слухаецца яго, гонар «іграе» на чалавеку і «прайграе» яго,* 56

*Гора ж не сціхне ад слоў!* 333

*Горам / Гоіцца боль лагоды* 333

*Гора – не бяда, бяда – не гора: / Пабыла – сплыла, нібы вада. / Няма праўды – гэта ўжо горай, / Гэта ўжо цэлая бяда* 333

*Гордасць – таксама, мабыць, жаночае хараство* 125

*Горычы на свеце многа, але і ў самай большай пасудзіне ёсць дно, няхай сабе яна і да краёў наліта атрутай* 218

*Грамадства, якое кідае каменне ў сваіх паэтаў, – хворае, яго трэба неадкладна лячыць* 62

*Грамату зноўку далі вынаходніку, / стаўку, кватэру, пуцёўку – угодніку* 218

*Гром для вёскі сына – / Лепша музыка на свеце...* 79

*Грошы бацькавы – не смецце* 131

*Грошы – дробязь. Улада даражэй за ўсякія грошы* 237

*Грудзьмі свабоду прыкрываў* 158

*Грыбоў няма ў Булонскім лесе, / А ў Сене – хоць бы адзін лешч* 252

*Гутарка – гаспадарка, у якой усё ў зборы, усё ў гурце, усё зацікаўлена адно адным і ўторыць адно аднаму* 266

*Гуслі там, дзе ёсць лады...* 190

*Гуслям, княжа, не пішуць законаў* 190

*«Гучныя» паэты падобны да купцоў, якія хваляць свой тавар, «ціхія» – на тавар, які чакае сваіх купцоў* 190

*Гэта вялікая справа – паставіць чалавека на сваё месца* 40

*Гэта многа – слухаць вечнасць, / Піць зямлі гаючы пах. / Любавацца Шляхам Млечным / І любіць / няпросты / шлях* 399

*Гэта – мудрая тайна Жыцця – / Жыць аддана / Да забыцця* 90

*Гэта няпроста / абрастанне адрозніць ад росту* 357

*Гэта страшна – адчуць сябе сярод мноства людзей чужым, адзінокім* 40, 214

*Гэта страшна – / Застацца патухлым вулканам, / Бачыць усё з вышыні / І маўчаць* 40

*Гэта час, / калі ў душу маю / Чысціня заходзіць найглыбока, / Калі ў тым, / каго не пазнаю, / Уяўляю светлага прарока* 399

*Гэта – як музыка за сцяной: / ты чуеш яе, ды не лічыш сваёй* 388

*Гэты свет – / Высокая гаспода, / І ў гасподзе / Мусім жыць людзьмі* 62

*Дабівацца / Ўзлёту, дасягненняў, росту, / А іншы думае парой, / Што ўсё на свеце дужа проста: / Пагаўкаў – і герой* 90

*Дабрата – гэта не значыць, што нельга абурацца. / Дабрата – гэта не толькі ад шчырасці, але і ад усведамлення*

*сілы, ад дзейнай веры, якая не прымае маны, спекуляцыі на дарагім паняцці ці слове* 340

*Дабро зрабіў – не гойкай пеўнем* 218

*Дабро і зло сумесныя, сумешчаныя – як скрыжаванне і раздарожжа. Калі чалавек кіруецца ў бок дабра, ён адначасова кіруецца і ў процілеглы бок: да аднаго – насустрач, да другога – насупраць* 218

*Дабро мы можам ацаніць самі, а зло часцей за ўсё ацэньваюць на нашым горкім вопыце другія* 219

*Дабрэюць хай тыя, хто чуе, / Што Вечнасць у Мінску начуе!* 399

*Давермася найлепшаму ў сабе* 105

*Да вышыні імкнешся ты з даверам, / А пенізу цябе – сякерай* 218

*Давярайце ж сябрам жывым. / А тым болей – сябрам памёрлым* 105

*Дагараю, але не згараю, / Бо нязменна гляджу на зару!* 362

*Дадому!.. Дахаты!.. Як доўга не гіне / Гук слоў гэтых простых на дальняй чужыне* 240

*Да дрэў не вярнуцца лісткам адарваным* 362

*Дае Ўсявышні сілу вышыні / Таму, хто рады ёю падзяліцца* 62

*Даецца жыццё нам, каб радасць з адчаем / Вучыліся мы прымірацць* 90

*Даецца толькі тым жывучасць, / Хто годны ў муках сцвердзіць сваё «я»* 40

*Дай бог арла варонай не назваць, / Варону жа арлом – нічога* 79

*Дай, божа, ніколі / Дактароў не ведаць. / Лепш у чыстым полі / Снедаць і абедаць* 348

*Дай мне, зямля, яшчэ раз прарасці / над Нёмнам тваёю надзеяй* 252, 259

*Дай нам, / лёс, / таго, чаго мы вартыя, / Каб не здрадзіць нам / самім сабе* 98

*Дай табе божа шчасце, і долю, і кашулю на пуп!* 98

*Да кожнай з'явы на свеце трэба падыходзіць са словамі: чаму? і з чаго? Бо гэта ёсць пачатак мудрасці і філасофіі. А гэтая філасофія нам кажа: на ўсё ёсць прычына* 388

*Дакуль дасягае мой слых і зрок – датуль мой абсяг* 388

*Дакуль – ніхто не знае – сніць дамавіне цвік...* 362

*Далёкае не адгукаецца, / А блізкае – дык рэхам коціцца* 388

*Дамоў заўсёды ісціна вядзе. / Яна – напаўзабытая дарога* 240

*Да мудрасці нялёгкая дарога* 304

*Дапамагайце, / як дождж палеткам, / Дапамагайце, / як пчолы кветкам* 105

*Даравацьь – не для кожнага гонар...* 56

*Дарагія аблічча / Нават смерці не сцерці* 131

*Да раю – грахоў / Не пушчаюць завалы, / Да пекла – нібыта / Яшчэ іх замала* 318

*Дарма не скача і каза* 388

*Дарма пра песню пытацца ў глухога, / Дарма пра сонца пытацца ў сляпога, / Пра слодыч жыцця на зямлі – ў нежывога / І праўды шукаць у таго, хто нічога – / Ані сцяблінкі, ні дрэўца малога – / Не пасадзіў за свой век* 171

*Дарога далёкая, шорсткая і ўпартая, як шорсткае і ўпартае жыццё чалавека* 351

*Дарога заўсёды вядзе дадому. Нават тая, якая толькі што выйшла з дому* 351

*Дарога / можа / згубіцца, / Ды знойдзе яе / Народ!* 351

*Дарога не па бальшаку, / Дарога збоку* 351

*Дарога памяці пад ногі не кладзецца / Праспектам людным...* 351

*Дарога полем – да маці, / Дарога лугам – да бацькі, / Дарога рэчкай – да любай, / Але / і полем, і лугам, і рэчкай / іду заўжды да Радзімы* 351

*Дарогі будуць датуль, / пакуль будуць людзі* 351

*Дарогі, вечныя дарогі! / Не вечна ходзяць па вас ногі!* 351

*Дарогі гора не пытае* 333, 351

*Дарогі – / маўклівыя паскі, / Вы – зямлі фанатэка, / Што складзена / з тысячы / крокаў / Вечнага Чалавека* 351

*Дарогі – / найвыдатнейшыя помнікі чалавецтва, / Але на іх не трэба вешаць таблічкі / са словамі: «Ахоўваецца дзяржавай»* 352

*Дарогі, цёмныя дарогі! Вы так маўклівы, вы так строгі! / Хто вас аблічыць? Хто вас змерыць ? / Хто вашы звівы ўсе праверыць? / Хто вашы ходы адшукае? / Бо ўсё сваю дарогу мае!* 352

*Дарог у звяроў няма* 352

*Дарог у свеце вельмі многа, / А ты між іх сваю найдзі* 352

*Да роднага парога на паклон / Ідуць усе дарогі і сцяжыны...* 352

*Дарэмна ловіце вы ў сетку матылька, / Каб лепей крылы разглядзець; / Ударыўшы, памне іх сець,/ І яркі пыл сатрэ няспрытная рука* 362

*Дарэмная спроба – у культ вазвядзенне пасрэднай асобы,* 40

*Да скону дзён – / І ў шчасці будзеш нешчаслівы, / І ў славе будзеш не славён...* 99

*Да скону можа хлус-алхімік / Сядзець на пышных пірагах!* 219

*Да скону пчолам бараніць свой вулей, / Свой сподак працы, сонца і дажджоў* 240

*Да споведзі прыходзіць кожны з нас, / Грахоўны больш ці менш сваёй істотай* 318

*Дастаткова для шчасця і гора, / Дастаткова, каб сілу адчуць!* 113

*Да таго, хто забівае ў палёце ластаўку, з асцярогай падыходзяць і просты чалавек, і прэзідэнт* 40

*Датуль не знікне хараство, / Пакуль яго шукаюць людзі* 347

*Даў бог яму талент, ды на розум, відаць, паскупіўся* 229

*Даўгавечнасць кахання залежыць ад доўгацярплівасці жанчыны і ад ступені мужчынскай ляноты* 118

*Даўно з бяссмерцем / людзі ў добрай згодзе. / Яно заўжды трымаецца на тым – / мы каласамі ў гэты свет прыходзім, / Каб сілу даць зярнятам маладым* 362

*Даўно нас вучыць / твой, Купала, дух / Ісці праз слова – / у самасвядомасць!* 266

*Дачушка, а потым і ўнучка ў хаце – гэта ж свежы букет на стале* 131

*Дбаючы разам з векам / Аб электронным цудзе, / Памятай – / чалавекам / Ніхто за цябе не будзе* 41

*Два ўзаеманеабходныя і ўзаемавыключныя пачаткі творчасці і культуры: творчасці – самаахвяраванне, культуры – самазахаванне* 190

*Дзе б далёка ні жылі мы, / а заўсёды роднай мовай снім* 266

*Дзе воўк урадзіўся, / Яму куст той мілы* 240

*Дзе вынік – там і фініш* 292

*Дзе вяселле п’юць – / Там і чаркі б’юць. / Дзе вяселяцца – / Там і хваляцца* 304

*Дзедава скрыпка – мост пакаленняў, / Вечнасці кладка. Вякоў талісман* 131

*Дзе ёсць ліслівасць – там і вераломства!* 229

*Дзе карані – жыццё красуе!* 240

*Дзе любоў, / там і катастрофа* 113

*Дзе нам баліць, там і душа: / З душы ўвесь чалавек сабраны* 318

*Дзе на стале дармовы цукар, / Там і салодкія сябры* 106

*Дзень вяселля назначылі, / Ды вяселля не бачылі...* 113

*Дзень і жыццё, / Ёсць у іх падабенства. / Раніца звонкая, / нібы маленства, / Поўдзень гарачы і дужы, / як сталасць, / Вечар задумлівы, ціхі, / як старасць* 363

*Дзень палохае і Бога з развянчанага парога* 318

*Дзень, што без дружбы й любові пражыты, / Знікне бясследна, навекі забыты* 106

*Дзень, што пражыты без працы ахвярнай, / Знікне таксама ў шумлівасці марнай* 171

*Дзе памерла сумленне – дабру не прабіцца* 340

*Дзе пахавана твая маці, там і радзіма* 240

*Дзе песня галаву ўзняла, / Там шэрасці не выжыць* 286

*Дзе плачуць, там, канечне, не смяюцца, а дзе смяюцца, там можна часам і паплакаць* 292

*Дзе прайшло маленства, там пачынаецца Радзіма* 240

*Дзе пройдуць ногі маладосці, / Дыхне і мёртвая зямля!* 142

*Дзе разбураюцца асновы ладу, / Усталяванага паміж людзей, – / Там немінуча ўсё ідзе к распаду* 62

*Дзе сяўба, там ёсць жніво і пожні...* 178

*Дзе толькі сытасць – там душы няма* 319

*Дзе трэба – лі слёзы, / Дзе трэба – падмаж* 219

*Дзе ўсё прыводзіцца к карыту...* 219

*Дзеці выключна тонкія эстэты. Таму яны і жорсткія... Імі катэгарычна непрымальнае нехараство, немаладосць, нецікавасць* 139

*Дзеці – / І Гасподні дар, і кара / Ўсім бацькам за іхнія грахі* 131

*Дзеці павінны ўзбагачацца вопытам бацькоў* 139

*Дзеці – радасць і прыгажосць усіх народаў свету* 131

*Дзеці – сведчанне вечнасці* 139

*Дзеці сентыментальнымі не бываюць* 131

*Дзіва з дзіў для чалавека: ён часовы...* 63

*Дзівакі, вандроўнікі, паэты – / Гэта водар жыцця і яго яснацвет* 190

*Дзіця без дзяцінства – сівы лунь. Дзіця без душы – ледзяны слуп. Дзіця без працы – труцень. Дык вось што трэба для здароўя нашых дзяцей: шчаслівае дзяцінства, высокая духоўнасць, творчая праца!* 139

*Дзіця для матулі – радасць на рукі* 131

*Дзіцячай памяці ўласціва зберагаць першыя ўражанні на ўсё жыццё* 139

*Дзядоў і прадзедаў знаёмыя сляды / Вядуць сыноў і праўнукаў заўжды / Да роднага любімага парога* 131

*Дзяды – вытокі кожнага народа* 131

*Дзяды і бабулі патрэбныя дзецям не меней за бацькоў. Ад іх існавання і прысутнасці на доўгія гады застаецца ў дзяцiных душах цеплыня, якой, па маладосці, не заўсёды хапае бацькам* 131

*Дзяды і бацькі нашу мову стваралі, / Каб звонка звінела, была, як агонь* 226

*Дзяды і прадзеды – якія вы? / І дзе, скажыце, тая ніць, / Якую ў спадчыну пакінулі, / Каб ёй вякі навечна звіць?* 132

*Дзякуй богу, што бог сярдзітым людзям не дае многа сілы* 319

*Дзякуй, пане, бо пазнаў ад вас і я, – /Не на трох кітах трымаецца зямля* 304

*Дзяржава – гэта заўсёды перашкода чалавеку, але ж гэта і яго спакой* 63

*Дзярзаць – значыць жыць! / Жыць – значыць дзярзаць* 363

*Дзяцел так даваў дразда, што аж даў дуба* 79

*Дзяцінства не ведае жалю, калі / Не помняць спагады дарослыя* 139

*Дзяцінству лёгка дыхаць* 139

*Для аднаго чалавека набытак – шчасце, для другога страта – шчасце. Усё залежыць ад таго, хто набывае і хто страчвае* 113

*Для бездухоўнага чалавека не існуе паняццяў радзіма, народ* 319

*Для воўка выць ці не выць – тое, што «быць ці не быць»* 79

*Для дзяцей пахнуць травы аднолькава / На Лонг-Айландзе і пад Масквой* 139

*Для закаханага чалавека час прыпыняецца, ён, чалавек, не старэ* 113

*Для каханае нашай Радзімы / й найдарожшых ахвяр не замнога* 252

*Для лысага – лысыя й словы / Пра вернасць, сямейную святасць* 113

*Для мастацтва «маладых» не існуе. Як не існуе «сталых» ці «старых». У ім іншае суаднясенне, іншыя катэгорыі – эстэтычныя, а не дэмаграфічныя* 190

*Для нас – прыроды болей мілай, / Чым беларуская, няма: / Яна ж усіх нас надзяліла / Душой такою, як сама!* 79

*Для нас / стварыла нас прырода, / Каб цераз нас / Спазнаць сябе* 79

*Для паперы самая вялікая небяспека – пажар, для думак – нудота* 388

*Для паслушэнства галоўнае – стымул* 340

*Для раскрытай душы / Немата – / Гэта горш, чым вачэй / Слепата* 319

*Для рэчы кожнай час ёсць свой* 399

*Для смелых людзей няма бездарожжа* 154

*Для старога пісьменніка ўсе маладыя пішуць не так і не пра тое* 190

*Дні – колавы спіцы, / А час – агонь-рысак* 399

*Добра бывае апынуцца ў прыемным ад перажытасці хваляванні. Успомніць забытае, але знаёмае, чапаць яго пальцамі памяці* 148

*Добра быць коласам; але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком. Бо нашто каласы, калі няма васількоў?* 319

*Добра быць у дарозе, якую ты сам сабе выбіраеш* 352

*Добрае даецца не аднекуль, / І благое – не ад цёмных траў* 219

*Добрае і гордае чуецца здаля* 340

*Добра жыць і памяццю пакут* 148, 363

*Добра служыць з добрымі людзьмі, а калі пачнуць кусаць адзін другога, то доўга не паслужыш* 63

*Добра, што сэрца не знае верлібраў, / А роўна адлічвае кожны удар* 319

*Добры агонь на чужыне, / Толькі грызе вочы дым* 240

*Добры з ваўка музыка, / Ды не скакаць пад выццё* 79

*Добры кажух са спагады, / Толькі сцюдзёна ў ім* 106

*Добры рубель пазычаны, / Толькі спаць не дае* 388

*Добры чарпак з рэшата, / Ды толькі з яго не піццё* 292

*Добрыя людзі – лепшыя дзеці народа* 63

*Добрыя справы – мэта чалавечага жыцця. Але як толькі добрыя справы пачынаюць праводзіцца арганізавана, яны ператвараюцца ў сваю супрацьлегласць* 90

*Доктар доктару вока не выклюе* 292

*Долі інакшай не трэба зямной, / Сэрца пагоднее ад суцяшэння: / Родная мова ступала за мной / Ад калыханкі / Да галашэння* 266

*Долі не ладзяць з чаратоў, / футра шыюць не з кратоў* 99

*Долі рубцы – незагойныя* 99

*Долю чорную ноч не схавае, / Калі выльецца песня жывая!* 286

*Дома суха і ў багне, / На чужыне й на ўзгор'і гразка* 240

*Дома сцены памагаюць, / Што ж казаць пра берагі* 240

*Дом – крэпасць. / Бацькі – крылы. / Дзяды – падмурак крэпасці. / А калі няма ні крэпасці, ні падмурка, ні крылаў?* 241

*Дробны клопат штодзённага жыцця, нецікавага, часта пустога, нікчэмнага, прыніжае цябе, выціскае з цябе ўсё больш вартоўнае* 90

*Дробязяў наогул у жыцці не бывае. Усё мае свой сэнс і сваё значэнне. Толькі мы не заўсёды гэта бачым, ведаем* 90

*Другі баран – ні «бэ», ні «мя», / а любіць гучнае імя* 229

*Другім ямы не капай, / Чужой жонкі не чапай* 304

*Другіх не папракай і не вучы, / А паспрабуй сябе перамагчы* 304

*Друг сапраўдныназаляць / У бядзе не стане* 106

*Другу баліць – мне нялёгка, / Маме баліць – вельмі цяжка, / Сыну баліць – невыносна, / А Радзіме баліць – / Стыне сэрца ад болю* 241

*Дружба, / Не зведаўшая ліхалецця, / Слава / Без працы мазольнай, упартай, / Слова, Якое не грэе, не свеціць, – Нічога не варты* 106

*Дружнасць – першы крок свабоды, / Згода – сіла грамады* 106

*Дрэву перасаджанаму гола / У чужой маркоце й цішыні. / Хай галіны й зашумяць вясёла, / Сумна дол свой / Помняць карані...* 241

*Дрэмле Юрка ў заканурку/ І чакае долі* 99

*Дрэннаму – не пакарыцца. / Добрае не празяваць. / З дробнай хлуснёй не мірыцца, / З буйнай хлуснёй ваяваць* 56, 305

*Дрэнна, непрыемна і крыўдна хваліцца тым, што над табою злітаваліся, цябе пашкадавалі,* 57

*Дуб і той, калі ў полі адзін, / Не заўсёды адольвае буру* 106

*Думай самастойна, чалавек!* 41

*Думаць на сваёй роднай мове народу не забароніш!* 267

*Думаць – цяжкая, няўдзячная работа, апроч таго і небяспека – ці не таму многія проста баяцца думаць!* 267

*Думаць, што ён самы разумны, можа толькі самы дурны чалавек* 41

*Думка абмяжоўвае. Наколькі адкрывае, настолькі абмяжоўвае* 267

*Думка – вось той бур, з дапамогай якога чалавек даследуе сваю пароду* 267

*Думка ідзе ўслед за жыццём, жыццё – услед за думкай, але гэта не рух па крузе, гэта рух усім кругам – у новую якасць, у новае вымярэнне* 267

*Думка мае душу маладую, / Думка не сівее ніколі* 267

*Думка ходзіць, дзе захоча: / Ад зямлі да зор і сонца / Няма думкам забаронцы* 267

*Думкі пра Бога, маці, дзіця, радзіму заўсёды надаюць сілу* 267

*Думкі чалавека – / вы працяг / Нейчых недаходжаных дарог, / Нейчага кароткага жыцця, / Што сусвет / прадбачліва збярог* 267

*Думкі чалавека – / вы святло / Зор, / што змоўклі рана ў вышыні* 267

*Дум не скуеш ланцугамі* 268

*Думу не давярай суму. / І цішыні не мані* 268

*Дурань дурнем, але нават ён не кажа пра свае заганы* 41

*Дурань таму і блішчыць здалёк, што знаходзіцца не на сваім месцы* 41

*Дурань сам па сабе не такі і страшны, а калі падумаць, колькі дурняў, за якімі агромністая сіла ўлады, на якую ён, кожны ўсеўладны дурань, апіраецца* 63

*Дух абнаўлення – цудадзейны дух, / У новы дзень нам паскарае рух* 319, 357

*Духоўнасць – святая жывымі* 319

*Духоўным карміцеся змоладу хлебам* 319

*Дух уратуецца вечнаю верай* 319

*Душа – адзіны храм, дзе Бог жыве* 319

*Душа беларуса – / Вечная каня, / Якая адводзіць бяду ад гнязда...* 319

*Душа / Вернападданіцай Хрыста / Паўторыцца нанова, як абнова* 319

*Душа вяртаецца дадому / Да першавоч, / Да першасноў* 320

*Душа – гэта сонца, / якое і грэе, і свеціць, / жыццё наша / ўсмешкамі радасці / квеціць!* 320

*Душа дзіцячая не ведае падману* 320

*Душа – для згоды і дабра, / Засцерагчы ад злога, / Каб свет не заступіў за край, / За край сябе самога* 320

*Душа змялее, калі здалеее / бяда-вампір./ А як ачысціць душу ад глею? / У вір!* 320
*Душа людская – дно марское...* 320
*Душа – маці характару* 320
*Душа не паддаецца лекам, / Душу найлепш адразу мець* 320
*Душа пацясняецца целам...* 320
*Душа паэта – плач і смех!..* 190
*Душа паэта – то ж рэактар вечны, / Што выпраменьвае часціцы болю / І сотні тысяч сэрцаў чалавечых / Бамбардзіруе імі без адбою, / Каб шляхам ядзернага рашчаплення / Прывесці ў рух энергію сумлення* 190, 320
*Душа – са споведзяў, а не з пракляццяў* 320
*Душа – скарб чалавека, яго валюта* 320
*Душа спакойная – што дно* 321
*Душа становіцца безабароннай – / Душа без голасу зямлі сваёй* 321
*Душою з небам гаварыць* 321
*Душою не крыві, / Бо чалавечы век усё ж кароткі, / І водгуллем у кожнага ў крыві / Азвацца могуць прашчуры і продкі* 321
*Душы злачынна немай быць, / Як свет турбот такі вялікі* 321
*Душэўныя раны баляць доўга і многім не зарубцавацца ніколі* 321
*Ды горшае – гэта сціранне меж паміж непрыяцелямі і сябрамі* 106, 389
*Ды ён жа двойчы хамелеон! / Там, дзе авечкі, – у шкуры авечай. / Там, дзе чалавекі, – у чалавечай* 41
*Ды ёсць жа ты, праўда, на свеце, / Ды ёсць жа ты, вечны закон* 292

*Ды калі ты не бязродны сын – / Гавары са мной па-беларус-ку* 268

*Дык вось: ёсць сіла і ў бяссіллі* 154

*Дык захавай жа, лёс мой, / прагу кожны дзень / І сонцам ззяць, і прарастаць травою* 99

*Дык захавай жа, лёс мой, / прагу пець і жыць, / І спеласцю, як зерне, наліваца. / Хоць і на смерць ісці, а не здавацца / І справе, што душой абраў, служыць* 99

*Дык нашто ж уваскрасаюць травы / Там, дзе лугу быць і немагчыма?* 79

*Дык не гаруй жа , брат-нябога: / Дзянькоў вясёлых яшчэ многа!..* 399

*Дык шануй, Беларус, сваю мову – / Гэта скарб нам на веч-ныя годы; / За пашану радзімаму слову / Ушануюць нас брацця-народы!* 268

*Ды лепшая памяць аб мёртвых – / ваша любоў да жывых* 148, 363

*Ды на зямлі ўсё ж ёсць адна істота, / Ад якой усе непа-мыслоты: / Сам на сябе палюе чалавек...* 41

*Ды наш народ – асілак-дуб / І сцяг высока ўмее несці* 57

*Ды не апынішся ты ў становішчы сабакі, які сядзіць на плоце!* 79

*Ды не такі ўжо дзікі ты, павер, / Калі ясі з кармушкі* 219

*Ды памяць, як лішні вагон, / не адчэпіш. / І без яе наперад не рушыш. / У памяці – вочы, / якіх не аслепіш. / У памяці – вушы, / якіх не аглушыш* 148

*Ды патрэбна наступніку, / каб сумленнем не слеп, / Нібы воку сляза, / ачышчальная памяць* 149

*Ды пачуццё не думае пра вечнасць, / Калі агонь палае на губах* 113

*Ды песню адбярыце вы ў народа – / І можна пакарыць тады народ* 286

*Дыплом я заслужыў, здаецца ж, галавою* 79

*Ды радасцю нягоды не спатоліш, / І цішынёю звабліваі ніколі / Трывогі свету нам не заглушыць* 348, 363

*Ды рыбакі не ўсе аднакі – / Свае ў іх густы і адзнакі* 41

*Ды сатварыцца з нас нашчадкаў час, / Народ – не раб, не скот, не кат – / ды сатварыцца* 57

*Дыстанцыя ў часе дае пэўную аб'ектыўнасць у стаўленні да зробленага самім табою. Аднак ёсць тут і доля асабістай прыхільнасці, можа, нават і нейкая міжвольная ільгота, спагада самому сабе* 399

*Ды судзіць лёс – што значаць словы?* 268

*Ды ты жыцця, брат, не здалееш, / Як ты ні дурыш, ні шалееш* 90

*Ды ўжо гэтакі род чалавечы, / Што, не хочучы боль свой забыць, / Ён чамусьці усё, што не вечна, / Будзе вечнай любоўю любіць,* 41

*Ды ці можа апраўдаць / перад сумленнем / Дабрата, / якую робіце не ў час, / Справядлівасць, / Што прыходзіць са спазненнем?* 341

*Ды што краса без аўладання? / Адно пустое парыванне...* 347

*Ды я жыву святой надзеяй, / Што добры вецер нам павее* 178

*Дэвальвацыя праўды і веры – / Як трывогі апошні званок...* 292

*Дэмакратыя – гэта калі ты можаш гаварыць, што хочаш, а мяркуюць пра цябе толькі па тваіх учынках, фашызм жа патрабуе субардынацыі слоў, каб можна было рабіць, што хочаш* 158

*Дэмакратыя – гэта палітычная коўдра* 158
*Дэмакратыя пачынаецца, калі ад слоў пераходзяць да справы, а канчаецца, калі ад спраў пераходзяць да слоў* 158
*Д'яблу трэба паказваць люстэрка. Каб ён не думаў, што невідочны* 158, 305

*Еднасці лепшай не знойдзецца, мусіць, – / Слова з мелодыяй, як спарышы* 268
*Ешце з голаду, / кахайце змоладу – / іначай вы – / ні к сялу, ні к гораду* 113

*Ён быў і ёсць – нязменны шанец: / смяяцца-цешыцца ці плакаць* 99
*Ён і яна – і сусвет не пустое* 113
*Ён маршальскі жэзл не браў у паход, / але салдат ён быў выдатны* 164
*Ён песень чужых не ўжывае: / Сваю зацягнуць цікавей* 286
*Ён толькі летась скончыў школку / І веды меў у адну столку* 139
*Ёсць адна песня песняў – / Пра Радзіму. / Ніхто не знае, / Хто яе пачаў, / І ніхто не знае, / Хто і калі яе закончыць* 286
*Ёсць Беларусь і будзе, / покуль / ёсць / мы!* 252
*Ёсць важныя дзве часціны, з якіх складаецца жыццё і яго глыбокі сэнс і хараство, -- чалавек і прырода* 363
*Ёсць, / відаць, / у зямлі на паэтаў патрэба, / Бо ніхто іх не сеяў, / а шчодра ўзышлі...* 190
*Ёсць галоўная кніга, якую чытаем-пішам, – мы самі, і галоўнае поле, якое праз век вырабляем, – самі... Хто пісьменны тут, а хто цёмны...* 305
*Ёсць глыбіні, у якіх мы не вызналі дна* 305, 389
*Ёсць доля / у Паэта – / Як ніва ў Мужыка* 191

*Ёсць жа вялікая праўда на свеце – / Праўда, сілаю роўная сонца агням* 292

*Ёсць жа нешта ў жыцці, / Што не прадаецца* 363

*Ёсць задачы-адкрыцці і задачы-пасткі, якія адно толькі забіраюць тваю энергію і розум і, нават выражаныя, нічога табе не кажуць і нікуды цябе не вядуць* 191

*Ёсць замест прыватнай неўміручасці – / Бессмяротнасць нацыі тваёй* 252

*Ёсць імгненне жыцця, і імгненне смерці, / І імгненне веры ў вечнасць жыцця* 363

*Ёсць куток на зямлі: / Дзень адзін пражывеш – / Назаўсёды цябе зачаруе* 241

*Ёсць лагода на боль, на скруху: / Адрачэцца радня па крыві – / Паратуе радня па духу* 132

*Ёсць на свеце шчасце, / Пакуль дурманіць сіні хмель вясны* 114

*Ёсць нейкая сіла ў гэтай цішы і закінутасці глухіх мясцінаў роднай зямлі. Цішыня нешта кажа душы. Толькі трэба пачуць* 321

*Ёсць нешта дзіўнае і важнае ў гэтым спакоі летняй ночы, чаго выказаць не можа беднае слова чалавека* 268

*Ёсць нешта, што я павінен зрабіць, а не раблю, і прыйдзе той час, калі ўбачу, што іменна павінен быў зрабіць, а не зрабіў...* 400

*Ёсць подзвіг прывычны – ісці... А ёсць і такі – застацца!* 57

*Ёсць Радзіма – і ёсць бяссмерце, / Мова ёсць – не загіне сям'я* 241

*Ёсць рэчы, якія словы толькі разбураюць...* 237

*Ёсць светлы міг вясёлкі / І ў навальніц, як выратоўны мост* 113

*Ёсць сіла – будзе справа, / ёсць справа – будзе рух...* 154, 357

*Ёсць слёзы радасці і гора, / Але й прытворства слёзы ёсць* 333

*Ёсць страшны суд дзіцячай адзіноты...* 139, 214

*Ёсць толькі біяграфія душы, / На жаль, / яна не кожнага цікавіць* 321

*Ёсць ты і я, / а паміж намі – лёс, / і ў лёсу / пераменлівыя твары* 99

*Ёсць у кахання справядлівасць, / якой нямнога у людзей* 114

*Ёсць у кожнага з нас вышыня. / Без вышыняў душа астыне* 321

*Ёсць у мяне адзін запас трываласці – / Зямля дзядоў, дзе нашы карані* 241

*Ёсць у нас гаспадары, / Што топчуцца па дабры* 219

*Ёсць у паэта свой аблог цалінны, / Некрануты прастор для баразён, / Дзе ён працуе з першае хвіліны / І да апошніх вечаровых дзён* 191

*Ёсць флюгеры, якія ловяць толькі «высокі» вецер. Нізкі, нават самы моцны, іх нібы не датычыцца – ён абцякае іх, і яны стаяць, нават не зварухнуўшыся* 237

*Ёсць час, калі мяняецца душа, / Адзіная душа ўсяго народа* 321

*Ёсць яшчэ ў свеце сейбіты без страху, / Без гэткіх хлеба людзям не было б* 171

*Жаданае толькі адно ярмо – / Ярмо Айчыны...* 178

*Жаданне жыць... / Любоў і смага... / Што можа быць вышэй за іх?! / Беззапаветная адвага / з'яднала мёртвых і жывых* 90

*Жадаю лёсу аднаго: / Для некага быць неабходным, / Не адчуваючы таго* 99

*Жалеза моцнае, але цярпенне і настойлівасць чалавечыя яшчэ мацнейшыя* 305

*Жаночае сэрца робіцца вялікае, як свет, калі яно чуе боль зняверанага дзіцяці* 132

*Жанчына без дабраты настолькі жанчына, наколькі дрэва без соку можа лічыцца дрэвам* 125, 389

*Жанчына дае жыццё, жанчына аберагае жыццё, жанчына і жыццё – сінонімы* 125

*Жанчына – душа мужчыны; яна наша натхняльніца на вялікія справы* 125

*Жанчына і дзіця – / працяг у вечнасць* 125, 132

*Жанчына – сасуд без дна. / Дакладней – Сусвет сусветаў. / Сам Бог у яго віна / наліў, каб натхняць паэтаў* 125

*Жанчына – таямніца з таямніц, / Пачатак шчасця і трывогі* 125

*Жанчына – хараства вяршыня. / Вяршыня радасці – жанчына* 126, 347

*Жанчыны панствуюць і ў мане, / А мужчыны і ў праўдзе – рабы* 126

*Жарт не вымерзне зімой* 292

*Жахлівей не бывае здрады, / Як сонца ўласнае забіць!* 229

*Жорсткасць – гэта ночы, / А дабрата – высокі дзень* 229

*Жорсткасць узрастае там, дзе поле пакінула дабрыня* 229, 341

*Жорсткасць, як і боль, даецца чалавеку для самазахавання* 229

*Журба ж і моцных нават горбіць...* 214

*Жывая легенда не мае спачыну, / Ёй, вольнай, няма берагоў* 191

*Жывеш, / І дзіўна так выходзіць: / Ступенькі год / Ля ног ляглі, / І колькі ты / Ні узыходзіш, / А апынаешся / Ў зямлі* 363

*Жывеш не вечна, чалавек, – / Перажыві ж у момант век! / Жыві і цэльнасці шукай, / Аб шыраце духоўнай дбай* 321, 363

*Жывём, клапоцімся і дбаем, / І ўсе нарэшце паміраем* 364

*Жывём наіўнасцю святой, / Наступным днём, а светлы той, / Калі табе прысніцца мама* 132

*Жыві, наш край! Няхай надзея / Гарыць у сэрцы і мацнее* 253

*Жыві ў сягонняшнім дні, / Каб заўтрашні / Стаў тваім* 91, 364

*Жывіце, людзі добрыя, буйней, і цешцеся, і цешце без апаскі* 364

*Жыві, шукай, усё рабі як след, / Каб на Радзіме твой свяціўся след* 146

*Жывое слова – увасабленне / любові жывой, жывога сумлення* 268

*Жыву на паверхні зямлі, і вады, і агню, і паветра, і цела – паверхня майго жыцця, і розум – паверхня цела. Паверхняю – разв족жаю, паверхняю – разумею, паверхняю – мераю глыбіню...* 364

*Жыву, не трацячы надзей, / Бо веру у дабро людзей* 364

*Жыву прасветлена і ведаю, / Што на зямлі у розны час / Трыумф злучаецца з трагедыяй, / З усмешкай мудраю – адчай* 364

*Жывым з мёртвымі не па дарозе* 364

*Жывыя ідуць наперад – свяшчэнны закон вайны* 164

*Жыта, жыта, вечны скарб, / Спажытак чалавечых цела і душы* 80

*Жыццё – адзіны валадар / І радасці, і слёз, і мрояў. / Геройскі ўчынак негероя – / Не прапусціць чарговы ўдар* 364

*Жыццё без хваляванняў і трывог – / Журба і смутак апусцелай нівы* 91

*Жыццё – бы той гасцінец, па якім праходзім вярсту за вярстою* 364

*Жыццё – веснаход, а не ціхенькі рай, / Народжана ў бурах эпоха!* 364

*Жыццё – віроў дыханне кругавое* 91

*Жыццё выпрабоўвае гневам і болем, / І сумам цяжкім, і жалобаю стратнаю. / І шчасце – / калі пад нягодай любою / Ты чуеш падтрымку сардэчную, братнюю* 364

*Жыццёвыя вартасці існуюць і жыццядзейнічаюць на пэўнай «адлегласці» ад чалавека, адкрываючыся адно толькі звычайнаму зроку. Набліжаючы іх, трацім іх: ні каханую, ні маці ў мікраскоп убачыць нельга* 365

*Жыццё – гэта свята / Здаровага цела / І душы несуцешнай дасконная праца* 91

*Жыццёвыя дробязі – нашыя пакуты. Гэта яны не даюць нам жыць. Яны, як авадні, насядаюць на нас. Чалавек цэлы век адганяе іх, і на гэта бывае ідзе палавіна адпушчанага яму богам часу* 91

*Жыццё – дар Божы. Дарам дадзены дар. Даражы жыццём, Чалавек. Апраўдаеш дар – будзеш абдораны вечнасцю* 365

*Жыццё – / дзве сціплыя, / простыя даты, / І рыска – як шлях па зямлі... / І хоць не паўторыцца гэтае свята, / Ды ўсё ж мы былі, / мы жылі!* 365

*Жыццё ёсць шчасце – / Аксіёма! / Ды кожны з нас часовы госць* 365

*Жыццё, жыццё! / Ты не праходзіш бокам, / Але і не ратуеш / Ад бяды* 365

*Жыццё закон нязменны мае: / ніколі праўда не ўмірае* 365

*Жыццё заўжды – іспыт на мужнасць. / Яе ж не возьмеш напракат...* 365

*Жыццё зямное – непаўторны дар, / Дзе кожны дзень – і творчасць, і натхненне. / Над ім не ты – народ твой гаспадар!* 365

*Жыццё ідзе кругам, вяртаючыся да пачатку, / Смерць – нацянькі* 365

*Жыццё і жыта – вечная радня* 366

*Жыццё – імгненне, / якое не паўтараецца / і ў якім не паўторышся* 366

*Жыццё, і падзеі, і людзі ў ім праходзяць, нібы тыя рачныя хвалі* 366

*Жыццё і смерць... / Спрадвеку / ім няма вымярэння... / Галоўнае для чалавека – / Паверыць ў сваё паўтарэнне!* 366

*Жыццё кожнага – гэта планета са сваімі вачыма, голасам, пачуццямі* 91

*Жыццё кожны раз падводзіць чалавека да краю жыцця, нагадваючы, што яно не самамэта, што жыць, каб адно толькі жыць, нельга. Чалавек «далейшы» за жыццё, і не можа ён сцвердзіцца ў ім інакш, як толькі пераадольваючы, пераўзыходзячы яго* 366

*Жыццё людзей – імклівы крос. / І пасля бурнай маладосці / Туды пацягне, дзе ты рос* 366

*Жыццё – мацней за Смерць, / і Смерць за гэта помсціць* 366

*Жыццё мяняецца. Адна яго форма змяняе другую, і так беспрастанку – такі ўжо закон жыцця* 366

*Жыццё на ўсё знаходзіць лек, / Яно не любіць, каб няшчасным / На свеце чуўся чалавек* 366

*Жыццё – / неаплатны і спадчынны доўг* 91

*Жыццё – / невымоўная драма* 367

*Жыццё нельга спыніць, яно, як тая вада, цячэ і цячэ... Няможна яму цячы ракою – будзе цячы ручайком... Маленькім-*

*маленькім, тоненькім, як нітка, а ўсё роўна не змоўкне, будзе цячы...* 367

*Жыццё – не маскарад. / І блат ёсць блат, / Але і брат ёсць брат* 367

*Жыццё не распішаш / доктарскім парадкам* 367

*Жыццё не трэба смерцю страшыць, / За хуткаплыннасць дакараць, / Бо на такой зямлі, / як наша, / Не боязна і паміраць* 367

*Жыццё – нібы цягнік... / Гады мае – вагоны...* 367

*Жыццё – няроўная дарога / Паміж няроўных і людзей* 367

*Жыццё пакінула струну / Замест суладнага аркестра* 367

*Жыццё – парыў адвечнае красы* 367

*Жыццё – патрэба ўсіх патрэб* 367

*Жыццё перабірае іпастасі* 367

*Жыццё пражыць гатоў / за лепшую ўзнагароду: / служыць карэньчыкам народу, / крылом быць / для ягоных слоў* 91

*Жыццё пражыць – / Не поле перайсці, / А трэба і жыццё / Прайсці, як поле, / І хоць адным зярняткам узысці, / А бур'янам не зарасці ніколі* 91

*Жыццё пражыць – не поле перайсці... /Ды ўсе і поле, і жыццё праходзяць* 368

*Жыццё пражыць – не старыцца – / Не рэчку перайсці* 368

*Жыццё прайсці – / нібы няцяжка. / Яно не муляе плячо* 91

*Жыццё пылінку вечнасці сваёй / Пазычыць пад настрой, але адразу / Цярпець прымусіць крыўду і абразу* 92

*Жыццё робіць сваю справу голасна, а смерць – моўчкі* 368

*Жыццё, сапраўды, як казка: / Ідзеш ад бяды да бяды* 368

*Жыццё сплятае сетку-асяроддзе – / І свой дае распазнавальны знак* 368

*Жыццё – толькі момант* 368

*Жыццё – то ўзвышша, то правал* 368
*Жыццё! / Ты – кульмінацыя скразная / Ад самага пачатку да канца* 368
*Жыццё ў бядзе і ў радасці – адзінае* 368
*Жыццё ўвесь час – цяжкі экзамен* 368
*Жыццё – у вэлюме вянчальным, / тугім сплячэнні каранёў. / У тым, чым дыхаеш: у веры...* 368
*Жыццё ў грамадстве – як сярод ваўкоў: / Ні праўды, ні свабоды, ні маралі...* 368
*Жыццё – у магчымасці жыцця, чалавек – у магчымасці чалавека: ён ёсць настолькі, наколькі становіцца тым, кім можа стаць* 368
*Жыццё – цудоўная мажлівасць выбраць сабе спадарожнікаў, з якімі хацелася б прадоўжыць існаванне і ў іншым свеце* 369
*Жыццё – / шляхоў і рэк падабенства: / Рух падарожны / распачынае / Юнацтва наша / з крыніц маленства / І ў акіян небыцця / ўпадае* 369
*Жыццё, як і належыць, – / Не крыжыкі, не нолікі. / Лёс не манна* 369
*Жыццё, як лёс, неспадзяванае. / Трымціць напятая струна... / Калі ж апошняя, то самая / Найзапаветная яна* 369
*Жыццё – як падводная лодка, / Што памяццю ўрэзана ў грунт* 369
*Жыццё як прырода, / І поры года / Ў ім часта мяняюцца* 369
*Жыццё – яно вялікі карнавал, / Дзе мы з сваімі меркамі малымі* 369
*Жыццю не зблытаць белай фарбы з чорнай* 369
*Жыцця неўзаранае поле / Чакае свайго плугара* 92

*Жыцця ніколі не бывае многа, / Так, як і праўды, – колькі ні жыві* 369
*Жыць – кідаць зерне у ворыва спорна, / садзіць маладыя лясы і сады. / Дотыкам ног цалаваць тое поле, / дзе цяжка ступалі бацькі і дзяды* 369
*Жыць па чужой не ўмею мерцы, / Не езджу на чужым кані. / Жадаю дружбе я бяссмерця, / Што загартована ў агні* 106
*Жыць трэба да самай смерці* 369
*Жыць успамінамі не так і блага* 370
*Жыць хоча боль, / Бо ім усё жыве* 230

*Забава заўсёды небяспечная для жыцця* 92, 370
*Забілі зайца, не забілі, / Але ж, брат, гуку нарабілі* 80
*Заблудзяцца ночы ў днях / у пошуках апахмелкі... / Жанчына – сасуд без дна / для тых, хто душой нямелкі* 126
*Забудзе таго краіна, / Хто ёй у бядзе не памог... / Таго ж будзе помніць, як сына, / Хто славу Айчыны бярог...* 241
*Забылі пра самую небяспечную хваробу – / Пра слепату / ад славы ці ўлады. / Можа, таму, што яна амаль / Не паддаецца лячэнню* 168
*Забыты гаспадар – нязваны госць* 41
*Забыты той, хто першы дубчык ссек, / Пракляты, хто апошні секчы будзе!..* 80
*За волю, веды плацяць галавой* 158
*Заганна нажытае багацце заганна і выкарыстоўваецца* 219
*З агню наш хлеб і песні, / І самі мы народжаны з агню* 181, 286
*Загубіцца сцежка, / забудзецца род* 352
*За даверлівасць / плацяць дорага* 341
*З адным крылом ніхто ляцець не можа, / З адным крылом – нібы зусім без крыл* 389

*За добрым князем народ спявае? Не, князь славуты сваім народам...* 63
*Задумы вучоны не здзейсніць, / Калі занядбае свой дар* 185
*За дэмакратыю – на словах, / але на справе – за дубінку!* 158
*Зажыць па-людску, а не гэтак, / Як у пячурцы таракан* 219
*Зайграйце ж, толькі не фальшыва – / Як суддзі, купленыя меддзю* 191
*Зайздрасць радзімай – не знак беларусаў* 253
*Зайздрасць усеабдымная. Кату і таму зайздросцяць* 230
*Зайздросная гэта якасць – надаваць духоўнасць, асэнсаванасць рэчам* 237
*Зайшлі мы ў бездухоўнасці далёка... / О, толькі б дзеці не пайшлі далей!* 321
*Закалыхваю памяць радком, / Не параньцеся словам паэта!* 191
*Заканамерна глупства на зямлі, / Як плодзяць глупства нават каралі* 230
*Закладзены у кроплі акіяны, / Ў імгненні – эры, / У пясчынцы – горы* 336
*За кожнага бітага ка́та / Адпусціцца сорак грахоў* 164
*Закон адвечны і мудры: / калі сустрэнуць вясну; / жанчыны скінуць футры, / дрэвы накінуць ліству. / Будуць, па тым законе, / жанчыны нас хваляваць, / а дрэвы супакойваць, / думкі навяваць* 80, 126
*Законам ахвяры ўраўнаважваецца закон улады* 63
*Закон / Ахоўвае матэрыю* 63
*Закон прыроды: / хто бліжэй да неба, / Таму абавязкова халадней* 63, 80
*Законы не сцэнічныя ў гандлярстве* 63

*За крок да ўдачы / спынюся, / за хвіліну да перамогі / паглыблюся ў одум... / Сябры ўздыхнуць і адыдуць прэч, / жыццё ўсміхнецца і спыніцца побач* 92

*Залатую расінку ў голасе / Толькі родная дасць / Зямля* 241

*Залацей за залатога – праўда, шчырасць слова* 268

*Залежна ад уласнага настрою / наўкольны мы ўспрымаем краявід* 215

*За любоў не судзі людзей, / Не саромецца ёй – нікога!* 114

*Заманліва стаць крылатым, / Ды, што ні кажы, / Распятасць – нязмерна вялікая плата / За ззянне душы?* 322

*Заменіцца кніга кнігай, хлеб – хлебам і поле – полем: прытомяць жыццём – падмацуюць жыццём, спытаюцца пра жыццё – і пра жыццё раскажуць* 370

*Замест свечкі / лепей быць / гранатай* 158

*Замнога тых, / Хто робіць напаўсілы. / Замнога рабавання і маны...* 219

*Заможныя дываноў не выбіраюць* 237

*Замужжаства адкрывае жанчыне вочы на самую сябе* 126

*Запасіць толькі чужое, не развіваючы свайго... – гэта значыць глуміць народную душу* 322

*За неба ўдзячны будзь зямлі!* 259

*Запалілі свечку, а вакол сляпыя* 41

*Запісы, зацемкі, сповedзі... Ратуй нас, натуральны сэнс, ад старэча-недалужнага стрыптызу, а тым больш – ад бяззуба-чорнай зласлівасці* 230

*За плячыма ганьба, а перад вачыма пустэча* 219

*Запознена не трэба асцярожнасці / Аднолькава – / ні мёртвым, / ні жывым* 370

*Запомніце таго – хто блізка быў. / Далёка хто – не варушыце праху* 106

*За прыгажосць гэтак жа помсцяць, як і за талент. Самыя нешчаслівыя бываюць прыгожыя і таленавітыя* 347

*Запытай ты сябе, чалавеча: / Што зрабіў для айчыны, ці многа?* 241

*Запэцканага не бяры, аддавай назад таму, хто запэцкаў* 305

*Зару нельга спыніць, а за шчасце можна змагацца* 114

*За словамі не бачым мы жывой работы, сапраўднага дзела. А слова-гаварню за гэтае дзела прымаем* 268

*Заслоны мудрасці – гэта ўменне маўчаць, бо невук гатовы ўсё растлумачыць проста, бо будучыня толькі ўяўная* 305

*За смехам бывае пустэча, / А ў сумных вачах – чалавечнасць* 341

*Заспявай ты мне песню такую, / Каб душу мне паліла яна, / Каб у ёй ты нядолю людскую / І ўсё вычарпаў гора да дна* 286

*Застаецца толькі вечнай памяць / Той зямлі, дзе нарадзіўся ты* 149

*Заўжды дурань лічыць дурнем / Іншых, толькі не сябе...* 42

*Заўжды існуе недзе гай расцвілы / І светлякі ў зраселай мураве* 80

*Заўжды пасрэднасць прагне славы* 168

*Заўсёды дурні лічаць дурнямі другіх, ды толькі не сябе* 219, 230

*Заўсёды ёсць у кожнага свая жар-птушка* 178

*Заўсёды кніга нараджае кнігу, / Больш дасканалую, бліжэйшую да праўды* 139

*Заўсёды песні лечаць, / нават горкія калі...* 286

*Заўтрае – на заўтра. Сёння – на цяпер!* 400

*За хуліганскія замашкі / Падзякі век ніхто не меў* 220

*Зацішку не шукайце для сябе. / Зацішку не шукайце для дзяцей. / Зацішак нас саміх / у нас крадзе* 305
*За чубы хай бяруцца ўсе тыя, / Хто душою, як смецце, – пустыя* 322
*За шкурку плоціць тхор галоўкай* 370
*Зашмат тэатра ў кожнага ў жыцці* 370
*За шчасце, за волю, за край родны гэты – / Ну хто ж не паўстане, спытай?* 164
*За якімі замор'ямі / Долю ні сватай, / На чужыне й аблокі / Цвярдымі крушнямі. / Неба роднае / Толькі над матчынай хатай* 241
*Збедніваць зямлю – усё адно, калі не горш, як шукаць, зарабляць на сваю галаву кары, пакарання* 259
*З болем на свет прыходзіць жыццё, / болем яно адкупляецца* 370
*Зброя – гэта заўсёды, як громаадвод: яна прыцягвае да сябе зброю* 164
*Званам Хатыні над зямлёю / Грымець праклёнам на вякі, / Хто прагне свет заліць крывёю / І з плуга вырабляць штыкі* 164
*Звацца герояў нашчадкамі проста, / Але не так проста быць роўнымі ім!* 57
*З веку – княжая слава ў беларускіх мужчын* 253
*З веку – любасць князёва ў беларускіх мужчын* 253
*З веку – мудрасць князёва ў беларускіх мужчын* 253, 305
*З вершам знаюцца багі* 191
*З ветру валяецца, а даход дае* 171
*З вёскі пачынаецца горад. / Ці помніць пра гэта ён?* 80
*Звяргае догмы ісцін рух упарты, / І пал любві нясе ў ядры сваім / Зародак той, што ўсіх адкрыццяў варты* 292

*З гадамі душа ціпиэ, лагаднее, супакойваецца, але не засынае: яна, як і раней, шукае радасці, толькі ведае ўжо, што хоча іменна яе* 322

*З гадамі ўсе дні пачынаеш любіць...* 400

*Згіне ліха, бо на свеце / Праўда ёсць* 292

*З глыбіняў вякоў узнікаюць і зноўку знікаюць дарожныя знакі – людзі, што сустракаюцца нам на нашых шляхах* 63

*З горнай вяршыні не сходзіць туман, / З вернага сэрца – любоў* 114

*Згубіць – не мудра. / Удзячліва – знайсці* 305

*Здалёку ўсё з'яўляецца нам іначай, як яно ёсць папраўдзе, бо такая ўжо натура і схільнасць нашай душы – бачыць усё добрае і прыгожае ў тым, што далёка ад нас, што не з намі* 400

*Здалёку ўсё прыгажэй бліпчыць* 400

*Здараецца, што раптам адчуеш сябе пагарэльцам і ў жыцці, і ў літаратуры: маўляў, нічога ў цябе няма – ні хаты, ні двара, і ўсё, выключна ўсё трэба пачынаць спачатку...* 42

*Здаровы да непрыстойнасці* 389

*Даўна самота – чорнае балота / І злая мачаха зямной красе* 215

*Здзяйсняць свае задумы трэба ўпарта, / Жыць дзеля помнікаў сваіх не варта* 370

*Здольнасць да абнаўлення – прымета сапраўднага таленту* 185

*Здрада, як і подласць, не прыходзіць нечакана* 230

*З дробнага вялікае, дробнае з вялікага – / Вось ён, існавання пакручасты ход!* 336

*З дужай стварыы мяне кволай* 126

*Зернейку трэба загінуць у чорнай раллі, / Каб выжыць...* 178

*Зерне, якое надта моцна трымаецца за глебу, не здолее адарвацца ад яе – прарасці* 178

*З жанчынамі свет не старэе, / Ён маладзее, дабрэе, / І, ўрэшце, нас дорыць ім* 126

*З жывым мінулым у жывых вачах / Ясней убачыш будучыні далі* 149

*З жывых / Ніхто ўцячы ад болю, / Як ад Даўца жыцця, / Яшчэ не змог* 230

*З-за вуха не сячы, / Пакуль не абмазгуеш* 306

*Зламаны колас на сцябліне – / як журавель на папялішчы* 80

*Зла са святлом змаганне йдзе заўсёды. / Няхай святло перамагае ў нас* 220

*Злаславасцю пачуцці не глушы / І не прымай хлуслівых спачуванняў...* 220

*Зло – гэта перш за ўсё нелюбоў, нежаданне даравацьі няўменне спачуваць* 220

*Зло злом яшчэ чарнейшым вернецца, / Дабро паўторыцца стакроць* 220

*Злосныя радкі шануюць крытыкі, добрыя радкі беражэ народ* 191

*Зло, як Арктыка, абледзяняе. / Цёплае, як сэрца, дабро* 220

*Зло, як і дабро, імкнецца да дасканаласці* 220

*Злучыліся: з дарогамі дарога, / З лістамі дрэва, са слязою пыл, / І ў сэрцы тым, дзе ўсёй зямлі трывога, / У тры разы прыбавілася сіл* 352

*Змагайся, каб святое не звялось* 158, 322

*З маленькіх пачуццяў не зродзіцца верш, / як з пустога вядзерца вада не нальецца* 191

*З мілым і пад дубам – доля райская, / Толькі лепш фундамент мураваны* 99

*Змяні свой вузенькі настрой / На шырыню людскіх настрояў* 63

*Знай, што на кволенькіх падпорках / Хлусня будуе п'едэстал... / Прымай лепш праўды чэмер горкі, / Чым вечна – патаку пахвал* 230

*З намі час, як з пяском дзіця, / Забаўляецца, праз пальцы цэдзіць – / І здзімае з далоні жыцця* 400

*З нас кожны ўсё жыццё паэму піша / На скрыжаваннях сцежак і дарог* 42

*Знаць, сіла ў сяўца немалая... Захоча – і свет пераверне!* 172

*Значная чалавечая асоба звычайна не крычыць пра сябе на ўсіх скрыжаваннях. Сціпласць для яе – часта неўсвядомлены спосаб абароны сваёй значнасці, боязь раўнадушнай людской цікавасці, помслівай зайздрасці і непавагі* 42

*Знітаваны гэты свет / Саюзам ястраба і клеткі* 220

*З нічога паўстаюць не для нічога* 336

*Знішчалі старое мы самі, / А будаваць жа новае хто будзе?* 400

*Знявага і павага / Заўсёды побач крочаць* 57

*Зняможаным не кажуць слоў прыгожых, / Ад гучных слоў не прыбывае сіл...* 268

*З няпраўдай / У вяках / Вядуць паэты / Свой паядынак, / Свой няроўны бой* 191

*Зорка – гэта свечка / у Храме сусвету, / запаленая самім Богам* 80

*Зоркі-месяц – не пажары... / На няпраўду няма пары!* 80

*З палітыкі уласнай сілы / Магчыма трапіць на ланцуг* 164

*З простай дарогі смяецца крывая, / З лёгкай дарогі – цяжкая* 352

*З радзімак тых складаецца / Радзіма, / Але радзімка ў кожнага – свая* 242

*Зрушыць стагоддзі – як трапіць у вір / Ці ў глыбіню іншасвету таксама* 400

*Зрываюцца ў бездань хвіліны / Са стром пакручастых жыцця – / Высокае імя Жанчыны / Вяртае наноў з небыцця* 126

*Зубы выбілі ўсе – / не баліць, як няма зубоў* 230

*Зусім не хістаюцца слупы, асабліва – глыбока ўкапаныя* 306

*З учынкаў маладосці і старасць у людзей* 142

*З чым параўнаць народ з чужою мовай? / Мая душа такі адказ дала: / я параўнаў бы з кветкай папяровай, / калі б не ведаў чучала арла* 269

*Зыходны пункт для творчасці – сэрца. Ад яго павінна пачынацца кожная мастацкая рэч, пра што б яна ні расказвала* 191

*Зямлёю, вышыня, не пагарджай* 242, 259

*Зямлі не дагледзіш – адпомсціць табе, / А потам напоіш – адмерыць без меры, / А шчыра палюбіш – палюбіць цябе* 172, 259

*Зямлю забяры – / І карэнню не жыць...* 259

*Зямлю – не ашукаеш: / у складках-скібах яе – / Вякоў незлічоных мудрасць* 259

*Зямля бацькоў – адвечны слоўнік той, / Дзе ўсё цвіце, спявае, каласіцца* 260

*Зямля без сонца – прах, а не зямля, / А без любові чалавек – што камень* 389

*Зямля, брат, сілы многа мае – / Такія вежы выганяе* 260

*Зямля, дзе ўсе жывуць адной сям'ёй, / Дзе ваяваў Вячко, дзе жыў Вашчыла, – / Не можа быць пахілаю рабой* 242

*Зямля зялёная – бярыце / Для жыцця, і працы, і для мар* 260

*Зямля калыша А б е л і с к і* 260

*Зямля – касмічны карабель, / Ды мы у ім не рулявыя* 260

*Зямля – кладоўка з залатым дабром, / Якую адмыкаеш ты, араты, / Каб людзям скарбы аддаваць суздром, / Ахвярна забываючы на страты* 242, 260

*Зямля людзей, / над прорваю ты стала, / Да небыцця адзін застаўся крок* 260

*Зямля – мая калыска, / Табе адной відаць, / Што немагчыма нізка / Ні падаць, ні лятаць* 260

*Зямля мая – карміцелька людзей, / Высокіх мар і дабраты калыска!* 260

*Зямля ніколі смутак не раджала / І за дабро плаціла нам дабром* 260

*Зямля рунець жадае аксамітам. / Ёй не ўсё роўна: сноп альбо акоп* 261

*Зямля сяброў і ворагаў раўняе – / Зямля калыскаю для ўсіх часін* 261

*Зямля – / твой лёс, / твая жывая доля, – /Любі ж яе, – / сябе ўсяго аддай, / Што б ні было на свеце, аніколі / Адну ў бядзе / Яе не пакідай* 261

*Зямля, / Ты насенніцай стала ў сусвеце, / Радзімай і зерня і семя* 261

*Зямлячка, шукай сваё семя, / На роднай зямлі караніся* 261

*Зямля! Што ж не навучыш мяне – / Сваю жменю пяску – / Маўчаць!* 261
*Зямля, што нарадзіла, / Заўжды шчадрэй на сонца...* 261
*Зямля, як і раней, увіхаецца каля Сонца. Чалавек – каля ежы, вопраткі, грошай...* 261
*Зямля – як размах чалавечай радасці – шырокая, бяскрайняя, здольная будзіць вялікія імкненні пачуцця і думак* 261
*Зярня не ходзіць у пазыку / Па сілу нанава радзіць* 178

*І авечка, хоць дурная, / А ваўка пазнае!* 80
*І адзіным выйсцем будзе ў безвыходнай той журбе: / Памагаць чым можаш людзям і не плакаць аб сабе* 64
*І ад лёсу, як выбраў свой лёс, / Не схавацца ні ў свеце, ні ў смерці: / Данясеш толькі тое, што нёс,– / Смецце згадак ці чыстае сэрца* 99
*І адна у паэтаў віна: / не ўміраюць і ў вечныя векі* 192, 370
*І багацця на ўсіх хапае, і галечы на ўсіх хапае, толькі дабро ў дэфіцыце* 220
*І бацьку скора сын забудзе – / Каротка памятка аб людзе, / Аб простым людзе* 149
*І біцца павінны мужчыны, / Бо маюць радзіму, жанчыну і гордасць – адну* 164
*І будзеш мець, калі жыць дбала* 172
*І будзеце зноў вы, / раз ёсць, раз былі вы...* 370
*І варта жыць, / Каб неба ўсё – ад Месяца / Да самых дробных зорак – прачытаць* 370
*І ва ўсіх нас ёсць Радзіма, / Што імёны нашы помніць* 242
*І ведай: з сумленнем змагацца – / гэта няўдзячная праца, / гэта разбой, а не бой...* 341
*І воўк жа не цягаецца вечна адзін* 106

*І вочы новых пакаленняў / Жыццё прадкажуць нам ці Смерць!* 149, 371

*І гонар свой – не трэба нам благога. / І звычай свой па-людску жыць з людзьмі. / Дабро сваё, не трэба нам чужога. / І будзе ўсё. / Бо з працавітых мы* 57

*І гора некаму ізноў – / Таму, хто праг паліць, / А апынуўся між агнёў, / Якія не заліць!* 164

*І гора – паўгора, калі з людзьмі разам* 64

*І гор у нас няма аніякіх – / Ды людзі ёсць – вышэй ад гор* 64

*І грамада, і я – / нас, блізкіх, двое... / Дай грамадзе маё, а не чужое!* 64

*І грудзі матчыны кусаюць, / Ледзь-ледзь прарэжацца зубок* 132

*І даражу я кожнаю / Расінкаю жыцця* 92

*І дзе б ні жыў – / Душа вядзе туды, / Дзе родныя нябёсы і клады* 242

*І, дзе б ні працавалі вы, / Любому кідаецца ў вочы, / Як крэкча цяжкавагавы, / А паражняк – заўжды ляскоча* 172

*І дзе на свеце ёсць такая, / Як Нёман, рэчачка другая?* 253

*Ідзеш, пакуль вядзе дарога, / Жывеш, пакуль не сплакаў слёз* 371

*І дойдзе ўжо да галубочка, / Як бы па нітцы да клубочка* 220

*І душа мая часта, нібы матылёк, / На агонь вылятае, ды агню не баіцца* 322

*І едзем мы на нечым возе / Ды ўсё дарожкаю крывой* 220

*І жыў ён птушкай пералётнай, / Хоць, праўда, ў вырай не лятаў* 92

*І здраднік, / і забойца – / не дарадца...* 230

*І, значыць, сонцу ёсць каму свяціць, / І, значыць, ёсць каму казаць дарогу, / І, значыць, ёсць на свеце мудрацы, / А ўсё астатняе за пазухай у Бога* 306, 322

*І зорка падае, згараючы датла... / Каб з небыцця прабіцца зноў крыніцай* 371

*І зямля свой твар мяняе* 261

*І зямля – у жыцця, і ў жыцця – людзі. Дык адкуль адхіленне ўзялося, нібы сваё свайго не пазнала і разышлося бязрадасна?* 92

*І калі мой час настане / Ціхім сном навек забыцца – / Перад тым на развітанне / Дайце словам наталіцца* 269

*І кожнага ў свеце дарога / Вядзе да апошняй вярсты, / Таму не шкадуй ні для кога / Сваёй дабраты* 341, 371

*І кожны з нас цяпер не мае права / Маўчаць або ружовенька маніць. / Эквівалентам нейкім іншым праўду / У гэтым свеце нельга замяніць* 293

*І кожны момант выпадковы, / і выпадкова / адкрыццё* 371

*І колькі б ні цвіло зарой усходаў, / Заходаў ні сыходзіла на скон, / Суровай геніяльнасці прыроды / Душа аддасць без вагання паклон* 322

*І маю шчаслівую падкову / Конь яшчэ не скінуў з капыта* 306

*Імгненне – гэта вечнасць, бо яна заўсёды з табою, калі б ты ні ўспомніў пра яго* 371

*Імгненне мы расцягваем у век, / Каб зразумець, што смерці не адпрэчым* 371

*Імклівай рэчцы ж / Вечна мора сніцца / І вечна бачыцца ў зялёных вербах шлях* 179

*І мне прадаць бацькоўскі дом, / Нібы прадаць сваю Айчыну* 242

*І можа, ісціна у гэтым. / І мэта – ў вечнай барацьбе / Твайго маленечкага свету / З тым, што не змесціш у сабе?* 293

*І, можа, не варта вучыць іх* [маладых] *навуцы, / калі не з імі на віражах?* 139

*І можа, шчасце ў тым і ёсць, / Каб не напіцца з той крыніцы, / Перад якой ты – вечны госць!* 114

*Ім цёмна, нема кніга лёсу, / Яны не бачаць далей носу* 220

*І мы ў палатах Гадунова / Аб Беларусі скажам слова* 253

*Імя даюць тады, калі яшчэ невядома, які чалавек будзе. А мянушку – па заслугах* 306

*І нават у маўчанні – / мудры сэнс жыцця* 371

*І нават хай пажнуць другія, / А трэба сеяць* 179

*І на волі / ўсе нявольнікі / свайго лёсу* 100

*І на іншых вяршынях суровых / (Вера! Роўнасць! Свабода! Край!) / Ты струменьчык матчынай мовы, / Быццам маці, не забывай* 269

*І на светлай душы нават светлыя плямы відаць* 322

*Інач усё, што можаш перайначыць, / Вітай усё, над чым не ўладны ты* 172

*І наша мова – з-пад крыла душы* 269

*І незайздросны лёс тых, / Хто зможа на шалі палажыць / Толькі лыжку / Ці толькі свой язык* 172

*І не знікаць паэтам вечна, / У вечнай песні жывучы* 192

*І не магу ўявіць ніяк бясконцасць, / А толькі вечнасць дрэў, зямлі, вады* 400

*І немагчымае магчыма / Таму, хто ўзяў рубеж круты!* 172

*І не па рангу, не па чыну, / Калі што-небудзь і цаню – / Цаню я простую жанчыну, / Яе любоў і чысціню!* 126

*І ніколі не ўзыдзе зерне, / Што упала ў бясплодны пясок* 179, 371

*І ніхто няхай не забывае, што ён частка вялікай прыроды* 81

*І носам, і зрокам – карішун* 42

*Інтэлігенцыя не ўся і не заўсёды бывае інтэлігентнаю* 293

*Іншамернасць – уласцівасць жывога* 371

*Іншы бохан ляжыць пад абрусам, / на сцяне цікавейшы абраз, / толькі роднае мовы на вуснах / не крануў ўсё змяняючы час* 269, 400

*І няма на свеце лепшай долі – / Несці жытні колас праз вякі* 172

*І падлогі мыццё нам аддзячыць, / Калі мыем мы – не напаказ* 172

*І пакуль нада мной наша роднае неба – / Аніякі мяне не палохае лёс* 100, 242

*І пацалунак безграхоўны той, / Якім цалуем маці й хлеб надзённы* 322

*І праўда, / лётчыкаў магілы / Спаткаеш рэдка на зямлі* 371

*І радасць – ніякая радасць, а горыч, / І песня – ніякая песня, а скарга, / І страва – ніякая страва, а камень, / І брага– ніякая брага, а слёзы, / І сонца – ніякае сонца, а крыга, – / Калі ты на свеце ўсім гэтым / Не маеш з кім падзяліцца* 64

*Іржа заўжды для шчасця боязь, / Яна й жалезу для згрызот* 81

*І салаўя не радуе вясна, / Калі з грудзей не льюцца самі песні* 215 286 357

*І светла нам, калі мы свецім, / І горка ад заган сваіх* 42

*І сёння трэба ў полі праўду сеяць. / Бо што пасеем, тое і пажнём* 293

*І скарб твой* [Беларусь] *лепшы – слова, звычай...* 253
*Іскрынку прывету – і годзе!* 341
*І спакою на нашай планеце не будзе, / Покуль з факелам ходзяць па ёй антылюдзі* 164
*І спрэчку тым яны канчалі, / Што гэту скварку разразалі* 107
*Ісціна – / вечнае. / Звыш – / толькі выбар яе* 293
*Ісціна нагадвае яшчарку: яна хаваецца ад даследчыка, пакідаючы яму свае аўтографы – хвасты* 293
*Ісціна не ў віне, не ў вайне. / Ісціна ў нашых дзецях* 132, 293
*Ісці на свой маяк да мэты – / Такі ў паэта свой наказ* 192
*І сціраюцца дзіўныя дні. / Не пражыць іх нанова ніколі...* 371
*Ісці ў жыццё спрадвечным следам / Можна толькі з мазалём і потам* 172
*І так змяркаецца, / што хочацца святлець...* 81
*І там, дзе сустракаюць па адзенні,– / Наіўныя, не ўбачыце мяне,* 57
*І толькі на цябе надзея, / Край родны мой!* 253
*І толькі слова, толькі песні / Жывучыя, як мой народ* 269
*І толькі той, хто будзе многа любіць і многа ведаць, зможа зрабіць нямала,* 42
*І трэба часам крыж пакуты / Панесці...* 372
*І тчэ, забыўшыся, рука, / Заміж персідскага узору, / Цвяток радзімы васілька* 253
*І ты, чалавеча, як снег у адлігу: / Упаў і сканаў, і няма* 372
*І тыя, хто ў шчаслівых, скажуць людзі: / Цень ад святла – не цень* 114
*І ў адзіноце няма адчування яе – адзіноты* 215
*І ў дзён / зусім касмічны разгон / і касмічная пустата* 401
*І ў жыцці бывае май і студзень* 372

*І ў кожным з нас нерастрачанай спадчынай / Жывуць, ратуючы нашы дні, / Вяртаючы душы ад вышыні, / Балючыя словы малітвы матчынай* 269

*І ў літаратуры, як і ў звычайным жыцці, аднаму вельмі цяжка пратаптаць нават невялічкую сцежачку. Трэба, абавязкова трэба, каб пасля за табою ішлі па ёй наступнікі, паслядоўнікі* 192

*І ў нашага лёсу ў запасе / Не цэлыя стагоддзі, / І мы за тое ў адказе, / Як нашы дні праходзяць* 92

*І ў няшчасці, і ў радасці без дружбы чалавеку нельга быць* 107

*І ў самай большай пасудзіне на свеце ёсць дно* 389

*І ўсе жывуць і жыць павінны, / Чыя як зносіць галава* 92

*І ўсё вяртаецца да нас, / Што высахла, забыта. / Дзе у нябыт ступае час, / – І час ідзе з нябыту* 401

*І ўсё ж такі добрая справа – дарога* 352

*І ўсё мілагучна для слыху майго: / І звонкае «дзе» і густое «чаго»* 269

*І ўсё, што калісь перажыта, / Цішэй спускаецца на дно* 149

*І ўсё, што словам ты ні назавеш, / Маўчыць, як цішыня ці як вятрак без ветру, / І не даецца сэнс, нібы руцэ паветра. / Калі душа маўчыць, не гаварыце лепш* 323

*І ў сценах маўклівых / Ёсць музыка слоў, / І ў песнях – / акорды мелодый... / Забытых аплачуць вятры за сялом, / Паэтаў – / уславяць народы!..* 192

*І ў сцюжу нечай ласкай ты сагрэты, / І ў спёку пекане цябе зіма* 107

*І ў тон адзін з зямлёю я пяю, / І кожны міг сябе я пазнаю / Часцінкай злітаю вялікага сусвету* 64

*І ў тым, каб доляй роднай даражыць, / Не выглядаючы выгодаў лепшых... / Перад няўмольнасцю зямлёю легчы – / Ёсць толькі права / чалавекам быць* 57

*І ў хваляванні старэчым, як наўздагон, ёсць свая перавага – такая, як рэха вялікай душэўнай красы, успамінальна-развітальная, журботна-радасная асалода* 142

*І ў чалавека раны зарастуць, / Але рубцы навечна застануцца* 42

*І хай з тысяч рэк чужых нап'юся – / Толькі для апошняга глытка / Я прыйду сюды, / да Беларусі, / Да свайго азёрнага кутка* 253

*І ці можна праўду важыць, / Мераць на разліў?* 293

*І цэлы свет – / Адно дамовіўшыся шчыра – / Пазбыцца зможа страшных бед* 107

*І чарка ў гумар прывядзе* 215

*І час ляціць! – для ўсіх абмежаваны / Хваробаю, нястачаю, вайной* 401

*І час нам павялічвае даўгі / За разбурэнне дум, а не каменняў* 401

*І чужая бяда азываецца болем* 64

*І што ёсць на свеце мілей за цябе, пара маладога жыцця, калі душа яшчэ нявінная і чыстая, як ранішняя майская роска?* 92

*І шчаслівей за ўсіх на свеце / Не той, хто жне, а той, хто сее* 172

*І як бы ні была вялікая дарога назад, а, азірнуўшыся, чалавек на ёй убачыць самога сябе, бо, праходзячы праз жыццё, ён заўсёды аставаўся ў ім. А сходкі, якімі ён падымаўся ўгору, праходзячы сваю дарогу, – завуцца яго біяграфіяй* 93

*І як не шанаваць / Прыроды годнасць, / Калі бясконца / Ёй у вечнасць плыць, / Каб праз смяротнасць / Зведаць несмяротнасць / І ў несмяротнасці – / Смяротнай быць* 81

*І я – як дрэва ў маладой абнове: / Глыбей карэнне – я вышэй расту* 42

***К**аб адчуваў і потым, / Што сэрцам не здрабнеў, – / Пераплаўляй работай / Свае любоў і гнеў* 173

*Каб адшукацца, трэба спачатку згубіцца* 306

*Каб адысці – пагаснуць неабходна* 306

*Каб быць смелым, то для гэтага трэба быць дужым, а каб быць дужым, то трэба мець цвёрды грунт пад нагамі і ясна пачуваць і ведаць, дзеля чаго ты жывеш на свеце* 154

*Каб вольна было думцы, трэба, каб вольна было словам, каб лёгка ліліся яны з душы, з падсвядомасці, з падсвядомай памяці. Неабходна менавіта* ***такое*** *веданне мовы, адчуванне яе* 269

*Каб выбраць лепшую з дарог, / Патрэбна мудрасць працы / Нашых сэрцаў; / Патрэбны маці, бацька, педагог* 132, 140

*Каб выказаць разумную думку, не трэба многа прыгожых і выкручастых слоў* 270

*Каб выкурыць сваю люльку жыцця, трэба ж ад некага ўзяць агеньчыку* 64, 93

*Каб вясне прабіць дарогу, / Каб калісь вярнуўся рай, – / Слова праўды, слова Бога / Мусіш слухаць, родны Край* 270

*Каб гартавацца, / варта быць са сталі* 154

*Каб дачакацца, / не хапіла хвіліны, / каб назаўсёды расстацца – / хапіла якраз / хвіліны* 401

*Каб жыццё ўпустую не пралахаць, / Кожны мусіць нейкі храм свой мець, / Дзе не хочацца ні гаварыць, ні пець – / Толькі моўчкі, безгалоса плакаць* 93

*Каб за край быў умерці гатоў, / Каб не прагнуў айчызны чужых* 242

*Каб зрабіць першы крок, / Патрэбна нам / Рука маці; / Каб, спатыкнуўшыся, / Зноўку падняцца – / Вера ў дарогу; / Каб адчуць цяпло сонца – / Дружба; / Каб не знаць адзіноцтва – / Радзіма* 306

*Каб зразумець сябе – /думка / дзеліцца на дзве часткі: / адна становіцца паляўнічым, / другая – уцекачом / і спасцігаецца, / калі гіне* 270

*Каб зразумець, што робіцца з каменем, – ці ён ляціць угору, ці падае ўніз, ці на імгненне застыў, вычарпаўшы моц узлёту і не займеўшы інерцыі падзення,– трэба ўлічваць яго фон, трэба бачыць яго ў працэсе. Гэтаксама і мастацкі твор: ён адкрыты разуменню, калі ўтрымлівае ў сабе і « камень», і «фон», і «працэс»* 192

*Каб з'яву можна было зразумець, яна павінна выйсці паза сябе. Выходзячы ў форму, змест адкрываецца для разумення* 192

*Каб людзі ў шматмільярдным стане / Нарэшце зваліся людзьмі* 64

*Каб мірна жыць, давядзецца табе / да скону весці вайну* 165

*Каб нарадзіцца, трэба памерці* 372

*Каб не ерэтык Галілей, Зямля наша да гэтага часу стаяла б на трох кітах. Не было б Магелана – не было б і Амерыкі* 42

*Каб не трымацца рэкам берагоў, – / Дык не зазнаць бы ім ніколі мора* 293

*Каб нягоды і радасці змераць / І прайсці праз надзеі і ростань, – / Трэба – / у сябе паверыць, / А гэта – не так проста...* 179

*Каб пад намі зямля паплыла, / Каб вятры захадзілі над намі, – / Трэба верыць у сілу крыла / І абняць Беларусь крыламі* 253

*Каб пераадолець гора, яго трэба перастаць палохацца* 333

*Каб песню, вартую народа, / На поўны голас шчыра спець – / Што трэба творцу? Вельмі многа! – Радзіму ў сэрцы трэба мець!* 287

*Каб расказалі ўсё магілы, / Слёз не хапіла б на зямлі* 149

*Каб сонца засланіць – вушэй асліных мала* 293

*Каб стаць дастаткова традыцыйным, неабходна стаць дастаткова творчым* 192

*Каб тэкст «запрацаваў», неабходна надаць яму такое становішча, такі нахіл, каб ён меў патрэбу ў руху, у развіцці, у выйсці. Так выток ракі нахіляецца да сутоку* 193

*Каб узляцець, патрэбен штуршок, – / Ісціну сцвердзіў вопыт...* 293

*Каб у полымі свет не загінуў, / Пазірайце часцей на дзяцей* 132

*Каб усе былі роўныя або гарбатыя – і справядлівасць была б аднолькавая, і ці не можа быць не аднолькаваю справядлівасць?* 220

*Каб усім паспачуваць, ахапіўшы сэрцам тое, што чуеш пра людскія беды і трагедыі, – сэрца патрэбна хіба такое ж, як сонца* 334

*Каб хтосьці мог вышэй узняцца ўгору, / Павінен нехта апусціцца долу* 294

*Каб чалавек ведаў наперад свой лёс, ён не выжыў бы* 100

*Каб чалавек душы не страціў – / Ёсць педагогіка адна: / Вучыць любові і пашане / Да хлеба труднага ў жыцці* 323

*Каб шчаслівым быць, / Патрэбна не сябе – другіх любіць* 64

*Каб ярка свяціла перлінка-слова, / Каб людзям зіхцела на ўсе бакі, / Яго шліфавалі як след, адмыслова / Найлепшыя ў свеце тачылы-вякі* 401

*Кавалак жытнёвы смачней, чым пірог, / Калі на рабоце ты сам сабе бог* 173

*Каго б я выбраў на падмогу – / Не падкіх да прыгожых слоў, / Няхай маўклівых, ды сяброў* 107

*Каго палюбілі аднойчы багі, / са статкам той не сальецца* 323

*Каго прымусіш жыць прынукай?* 93

*Кажуць, шлях да пазнання доўгі і цяжкі. Ён бясконцы. Ніхто не паспявае за жыццё пазнаць самога сябе* 306

*Казачае смерці / на свеце няма!* 372

*Казырнуў не яму, а партфелю* 230

*Какецтва і флірт – не ўменне, а паталогія* 294

*Каланізатары таксама, як ваўкі, / Калоніі заўсёды абдзіраюць / І метад свой драпежніцкі такі / Цывілізацыяй вялікай называюць* 165

*Калі абмялее аднойчы рака, / То ёй чалавек – дапамога спрадвеку. / А хто дапаможа душы чалавека, / Калі абмялее яна, як рака?* 323

*Калі адчай трапляе ў душу і ахоплівае яе, глыбей усведамляеш недасканаласць чалавечай натуры* 323

*Калі адчуеш, што ўжо дажываеш, / Зразумееш нарэшце, / што Ты жывеш* 372

*Калі багі раздавалі ўсім людзям талент, апошняму дастаўся толькі смех, на які ніхто не звярнуў увагі. Толькі потым з жахам схамянуліся багі, што чалавек, узброены смехам, можа аказацца дужэйшым за іх* 43

*Калі бачыш, што нічым значным не застаешся ў гісторыі, адшукай хаця б аднаго вялікага, які нарадзіўся з табой у адзін дзень, і ты суцешышся* 293

*Калі б думкі смелыя былі, / за сабою войска павялі* 270

*Калі б ды кожны / З маленства думаў, з першых лет, / Які – ці светлы, ці прыгожы – / Пакіне ў памяці ён след* 146

*Калі б магло каменне гаварыць / Суровай сілай, мовай абурэння, / Яно б сказала: спадары-сябры, / У самы раз збіраць каменне!* 173

*Калі б мы матак не хавалі, / Слёзы б не патрэбны нам былі* 132

*Калі б на выдумкі быў творца небагат, / Ніколі б мы не мелі столькі свят* 323

*Калі б не зналі мы пра спады, / Не быў бы велічны ўзлёт* 389

*Калі браты – браты – не знічкі, / Сузор'ем ім гарэць адным!..* 133

*Калі будзеш есці* [яблык] *– ён будзе горкі, а калі з'есца – стане салодкі, у ім р а з у м е н н е : бяры, каштуй...* 294

*Калі б усё збывалася, / чаго жадаюць, – / то не было б сумненняў* 149

*Калі б я праз недахоп «сыравіны» застаўся беспрацоўным як сатырык, дык толькі рад быў бы гэтаму як грамадзянін* 193

*Калі вам трэба прыняць важнае рашэнне, прымайце тое, на выкананне якога патрэбна больш смеласці* 154

*Калі ваша праца не атрымлівае адпаведнай ацэнкі, на тое ёсць дзве прычыны: ці то зайздрасць, ці то неразуменне* 231

*Калі верыць, дык у беззаганнае, / Калі йсці, дык сцяжынай дабра!* 114

*Калі вечар нараджае стому, / Значыць, дзень пражыты нездарма* 173

*Калі вечна на ўзмежку, / Без агню і усмешкі, –/ Дык нашто і жыццё ?* 372

*Калі відзён ужо канец дарогі, / Ты сам сабе – суддзя і пракурор* 352, 372

*Калі вы далоні злучылі навек, / Каб крочыць дарогай адною, – / На шчасце, на згоду, як дар-запавет – / Песню бярыце з сабою!* 287

*Калі вялікія спрачаюцца, малыя выйграюць* 165

*Калі гарыць дом, першымі заўсёды ратуюць дзяцей, бо менавіта яны вырастуць і адбудуюць новы дом* 133

*Калі гарыць свяча, яна гарыць век, калі расце дрэва, яно расце век, калі жыве чалавек, ён жыве век, і які б гэты век ні быў – кароткі ці доўгі, роўны ці пакручасты,– ён усё роўна вялікі* 401

*Калі гарыш – ідзеш ты на касцёр* 193

*Калі грамадства ператварае волю ў разбэшчанасць, яна сыходзіць з грамадства* 158

*Калі дабра не бачыш ад людзей, / Знайсці спагаду спадзяешся ў Бога* 323

*Калі да паўнаты адной з'явы, адной сістэмы дадаецца яшчэ нешта, яно, гэтае «звыш», не ўзбагачае яе, а збядняе, парушае, пераарганізоўвае ў непаўнату* 306

*Калі даспела ў жніўні збажына, / то красавацца зноў не зможа* 389

*Калі даць, дык – надта хітры, / Калі ўзяць, дык – «носік вытры»* 389

*Калі ён сам сябе ўсвядоміў, / Сваю гісторыю, свой лёс, / Свае правы ва ўласным доме, – / Тады – народ, тады – ён ёсць* 64

*Калі ёсць вера, ёсць і небяспека* 323

*Калі ёсць каханне, трэба, каб была і сям'я. А калі без сям'і, то гэта ўжо не каханне, а распуста* 114
*Калі ёсць пакуты, трэба, каб было і выйсце з іх* 294
*Калі ёсць тупік, трэба, каб і сцежка ад яго нарадзілася* 294
*Калі ёсць у сэрцы любоў да ўсяго жывога – вось пачатак шчасця* 81
*Калі ж не колецца дзярвяка, / Дык у яе ўбіваюць клін* 307
*Калі ж смяецца грамада, / То смех такі гаворыць многа* 65
*Калі ж спакойна на душы, / Парожнім словам не грашы* 270, 323
*Калі ж табе сумна – гэта разумна / У цішыні пабыць аднаму* 215
*Калі ж цябе не пакідалі, / Людской разлукі не адчуць* 65
*Калі жыццё ў маленстве ператрэ добра – будзе чалавек. Залашчыць – прапаў чалавек* 93
*Калі за Беларусь аддаць жыццё / Святыя клічуць – буду не староннi* 254
*Калі захочуць, знойдуць сведак – / Купіць іх можна і прадаць* 221
*Калі змовяцца несумленныя і зайздросныя людзі, дык можна на вельмі доўгія гады замоўчаць вялікі талент* 231
*Калі зямлі / бывае вельмі цяжка, / Ты сам хоць частку/ цяжару прымі* 261
*Калі і ёсць на свеце рай, / Дык ён – / на Беларусі!* 254
*Калі іржу не саскрабці, / Іржа й жалеза пераесць* 173
*Калі каханне абвянчае / Жаданай згодай маладых, / Свайго сумлення не хавае / Яно ад позіркаў чужых. / А звяжа шлюбам маладая / Сябе з нялюбым і старым, / Свайго сумлення не схавае / Яна за прозвішчам чужым* 174
*Калі клопат ёсць любоўны, / тады сэрцы паўнакроўны* 115

*Калі крыштальным быў выток – / Незамутнёным будзь і вусце* 93

*Калі легчы – / Дык легчы брусам, / Тым, што ў хаты кладуць беларусы!* 173

*Калі маўчанне – золата, дык замоўчваць недахопы блізкіх нават і проста выгадна: не патрацішся дарма найдаражэйшым* 307

*Калі маўчыць душа, гаворыць дурнота* 221

*Калі маўчыць душа, гібее розум наш, / Як дрэва без вады ці як вятрак без ветру* 323

*Калі мне пішацца, тады – такі багаты, / Што ўсе ракфелеры і форды не раўня* 193

*Калі мудрасць прыходзіць – / быць мудрай пара* 307

*Калі мудрыя рукі ў цябе – / Пад рукамі / Згубіць цвёрдасць сваю, / Памякчэе і камень* 173

*Калі мы лічым адно аднаго на пальцах – нас шмат, / калі мы лічым адно аднаго па душах – нас мала: / нам яшчэ трэба ўбачыць у іншых сябе, у сабе – нябёсы, у нябёсах – сонца, а ў сонцы – сонцалюдзей* 65

*Калі мы не ўстанем самі – / Не падыме нас ніхто* 65

*Калі нават на чале войска на чужую тэрыторыю ўвойдзе разумны і мудры генерал, ён усё роўна застанецца ў гісторыі як дзікі акупант* 43

*Калі нараджаецца чалавек, нічога ў свеце не памірае ўзамен* 372

*Калі не буду я сабою, / Хто стане поруч і за мной?* 65

*Калі не забыў сваёй мовы / І колер блакіту вясновы, / Дык ты на чужыне гаротнай / Яшчэ не самотны* 270

*Калі не складаецца песня, / Сумей / Адмовіцца слабую скласці* 287

*Калі няма пакаяння – нараджаюцца новыя грахі* 324

*Калі няма сваёй рукі, не разлічвай на цуд* 294

*Калі няма часу думаць пра шчасце – гэта і ёсць шчасце* 115

*Калі пайшоў, здружыўшыся, у лес / З ваўкамі – па-ваўчынаму і вый* 307

*Калі пакідае каханая, / Навекі табе жаданая, – / Не пакажыся чэзлым, / Зацюканым і балесным, / Не апускайся на дно* 58

*Калі пакідаеш Радзіму, / Становяцца снамі / І людзі і сосны...* 242

*Калі палітыка – мастацтва магчымага, то само мастацтва – мастацтва немагчымага* 193

*Калі памерці трэба, я памру, / Каб толькі горкай праўдзе не памерці* 372

*Калі паміраюць паэты, / Што ні перад кім не гнуцца, – / У чалавецтва прасветы / На ўсе вякі застаюцца* 193

*Калі песня не грэе / У мароз і завею, – /Дык нашто твая песня!* 287

*Калі плачуць сокалы – то і гром маўчыць* 81

*Калі пойдзе дождж, то верабей і сам знойдзе сабе кавалачак страхі* 81

*Калі праца душы падабаецца, / Сэрца жаўранкам захліпаецца* 173

*Калі прыдворныя гавораць за народ / і называюць свой народ шчаслівым / (усё адно, ці слепа, ці ліслiва), – / існуе тыранія і прыгнёт* 65

*Калі прыціснуць беды, / Лягчэй, як хтосьці ёсць з табой* 65

*Калі пяецца песня, / Тады мілей паход* 287

*Калі раб у веры, / Дык у чым жа вольны?!* 158

*Калі рака ты – быць ракой павінна, / Не паступацца чысцінёй нідзе...* 58

*Калі расстаешся з богам, / Шукай да людзей дарогі* 294, 324

*Калі розум слабаваты, / Не віні падкоўкі* 294

*Калі роўныя тры дубочкі, / то каторы з іх лепшы?* 294

*Калі рукі ніколі / Не зналі мазоляў, – / Для чаго твае рукі!* 173

*Калі свет чалавек пакідае аднойчы – / у здзіўленні глядзіць, хоць ад болю прыціх, / як спадае, гусцеючы, цемра на вочы / і жыццё паўстае, як адзін неспасцігнуты міг...* 372

*Калі сееш ты шчодраю рукою, куды б ні кінуў плённае зерне – яно ўзыдзе* 173

*Калі слухаеш вельмі многа глупства, трэба мець розум не дадаваць яшчэ і сваё* 231

*Калі спагадаеш жывому – / жывеш! / А сееш жывое / – тым болей!* 107

*Калі справа не пад сілу, / Дык на плечы не бяры* 307, 389

*Калі страляеш, дык страляй у грудзі / І май адвагу ў вочы мне глядзець* 165

*Калі сумленна / Ты пражыў свой дзень, / Сумленным, дружа, / Будзе і твой вечар* 142, 341

*Калі сумленны перад другімі, / Тады сумленны перад сабой* 341

*Калі сумленне недарод, то боль душы не выспеў* 324

*Калі сустракаюцца дзве рукі, / Як з нотай у песні нота, / Будуецца мост над прорвай ракі, / Імя якой – адзінота* 215

*Калі сэрца не плача, / Як бязногага ўбачыш, – / То не сэрца, а камень!* 324

*Калі табе і пашчасціць на Сымона Кірынеяніна, які панясе твой крыж, дык жа твая маленькая галгофа – усё роўна*

*толькі твая. З выпрабаваннем развітальнай самотнасцю, з горыччу паасобных успамінаў* 100

*Калі талент не падмацоўваецца працаю, ён драбнее, мізарнее і ўрэшце ператвараецца ў самы звычайны нуль* 185

*Калі твае пакуты ператвараюцца ў пакуты іншых – час паміраць* 372

*Калі твая будучыня / сумесціцца з будучыняй сусвету – / усе словы дарэчы, / усе ўчынкі да месца, / усе стрэлы ляцяць у цэль* 65

*Калі ты ад клапот / Жыццёвых стараніўся, / Ні хлебам, ні вадой / З сябрамі не дзяліўся, / Нікога не сагрэў / Ні словам, ні спагадай / І ніву не прыкрыў / Грудзьмі ад градападу, / Заўсёды за другіх / Хаваўся ў ліхалеццe, – / Лічы, што не было / Цябе на гэтым свеце* 65

*Калі ты амаль што ў раі, / тым лесвіца будзе вужэй і вужэй – / і месца няма дваім* 215

*Калі ты выпіў з крывадушнікам на брудэршафт, ты таксама крывадушнік* 58

*Калі ты з панам не ў ладу, / Трымайся лепш за грамаду* 66

*Калі ты камень, то трымайся дна* 372

*Калі ты камусьці хоць трошкі патрэбен, / Дык хочацца шчодра і радасна жыць* 66

*Калі ты нават не шчаслівы, / Надзею ў сэрцы не губі* 348

*Калі ты не народны, не народаў, дык, можа быць, антынародны ты?* 193

*Калі ты патрэбны хоць аднаму чалавеку, можаш лічыць сябе шчаслівым* 66

*Калі ты паэтам завешся, / Толькі так жыві: / Апошні верш – / Апошняя кропля крыві* 193

*Калі ты ўсё спазнаў па поўнай меры / І не паспеў душою ачарсцвець, / Не бойся, што баліць часамі сэрца, – / Яно ж таму і сэрца, каб балець* 324

*Калі ў бязмежнай вернасці хлусні / крывёю нехта ўласнаю клянецца, – / чыясьці кроў нявінна льецца...* 165

*Калі ў вас з'явіцца адчуванне сораму – значыць вы сапраўды пранікалі трохі сабе ў душу* 324

*Калі ўжо чалавека / За зямное смерць карае, / Дык, як водзіцца спрадвеку, / Першай мову адбірае* 270

*Калі ў жыцці не будзеш плугаром, / Як будзеш ты ад голаду лячыцца?* 173

*Калі у нас сапраўднае прызванне, / Дык нас і так прызнае наш народ!* 193

*Калі ўпадзе адзін баец – / Заменіць паўшага другі* 165

*Калі ўсе згублены ключы, / калі ні шанцу, / анічога – / усё ж ідзі, / любі, / крычы / і пасягай на перамогу* 100

*Калі ўсё добра – то патрэбна шмат, / калі ўсё кепска – то нішто не міла...* 221

*Калі ўсё звесці толькі да самога сябе, дык не назаўсёды ж самога сябе хопіць* 294

*Калі ў сэрцы паэта попел, / у агонь яго не раздзьмуць* 193

*Калі ў чалавека няма любові, самому чалавеку цяжка і з ім цяжка* 115

*Калі хаця б надзея засталася, / Рыхтуй для ўзлёту новае крыло* 179

*Калі хочаш быць разумным чалавекам, то бяры прыклад ад разумных людзей* 307

*Калі хочаш праўдзіва ты жыць, дык пі чару любую, / Але толькі да дна* 93, 390

*Калі чакання невады з вады / Выцягваюць сушыць тваё гады, – / Час пазнаёміцца з самім сабою* 43

*Калі чалавек атаясамліваецца са званнем, пасадай, заняткам, функцыяй, тады ён самаабмяжоўваецца, застойваецца, бо ні званне, ні занятак не здольныя эвалюцыяніраваць* 43

*Калі чалавек вырасціць у сабе сапраўднага дасканалага чалавека, калі ён нарэшце зразумее, што ўся праўда жыцця ў ім самім, ён створыць на зямлі сапраўдную чалавечую еднасць* 66

*Калі чалавек змагаецца, ён змагаецца і супраць сябе* 43

*Калі чалавек памірае, / Згасае яго святло, / Ды новым святлом разгараецца / Памяць аб ім* 149

*Калі чалавек у масе, ён невідочны, але ён бессмяротны* 66

*Калі чалавеку шанцуе, гэта ў першую чаргу заўважае кішэня, і калі не шанцуе – гэтаксама «адценьваецца» на кішэні* 237

*Калі чуць толькі ўласнае сэрца, / Лепш стрымаць яго, каб не грымела* 66

*Калі чытаеш цікавую, таленавітую рэч, дык і жыццё мае разумны сэнс* 194

*Калі шчасця трэба дабівацца – гэта ўжо не шчасце. Шчасце прыходзіць натуральна і непрыкметна, часцяком нечакана, але заўсёды заслужана за турботы шчырыя і справы духоўныя* 115

*Калі шчыруе цемра і турма, / часцей за ўсё прыдворныя прыходзяць* 158

*Калі я і навекі анямею, / Мяне ва ўсім матуля зразумее* 133

*Калі я ў свеце чалавек, / Свет мусіць вечным быць!..* 66

*Калючы асот – але... пчала з ім сябруе* 107

*Камнем кідаюць пасля дружбы, / Пасля кахання і знявагі...* 231

*Каму ж верыць, як не чалавеку?* 43

*Камусьці – фрагмент рабра, / узноўлены клон Адама... / А мне – акіян святла – / Каханая, Муза, Мама* 115

*Канаванай парою пчала / Назапашвае ўзятак мядовы* 194
*Канвеер у паэзіі – гэта калі рытм ёсць, а душы няма...* 194
*Канец жыцця / Пачатак паўтарае: / Які прыйшоў – / Такі й ты адыходзіш* 373
*Канца надзей / Няма ў трывожным свеце, / Пакуль ёсць роднасць між людзей* 66
*Капацца ў мінулым – варушыць, набліжаць будучае* 149
*Капцы жадаюць вечнага спакою, / Жывыя – працаваць, кахаць і пець* 373
*Карані не трэба чапаць, ісціны ў іх няма: там адно толькі пануе змрок і вызмейваецца жах. Ісціна каранёў па-за імі, над імі – у кветцы* 294
*Кароль на месцы пешкі надта смешны, / Ды ў дзесяць раз пацешней пешка / У каралёвай шапцы й сабалях* 43, 390
*Каротка, песня, ты, каротка! / І заціхаеш так не ў часе!* 287
*Карцінам трэба, як і людзям, / Жыць на сваёй святой зямлі* 242
*Карціна – толькі адно імгненне, а прырода – гэта ж няспынны рух* 81
*Карэнне ў дрэва ёсць апроч ствала, / Апроч карэнняў прагных ёсць насенне* 295
*Каханай сэрца падарыце, – / Любімым будзеце і вы* 115
*Каханне без прастрані – птах без крыла* 115
*Каханне – вечная вясна паэтаў* 194
*Каханне, грошы, славы сверб – мана: / Няўмольны час завабіць імі сэрца, / Памучае, а потым насмяецца – / Не здраджвае Радзіма нам адна* 115, 242
*Каханне – гэта няздатнасць усведамляць небяспеку* 115
*Каханне – гэта цяжкая праца для натхнення і пасля натхнення* 115

*Каханне – ёсць мудрасць, / якую Бог людзям / адкрыў, каб грахі даравацъ* 115
*Каханне ж – радасць, а не плаха* 116
*Каханне і веру не трэба ўсім выстаўляць напаказ – душу чуе толькі неба* 116
*Каханне і нянавісць – / Родныя дочкі* 116
*Каханне – кароткае свята, пасля жаніцьбы – цяжкі будзень* 116
*Каханне маё, каханне, / Ты – як самазгаранне* 116
*Каханне – свята душы, праца – свята розуму, смерць – свята цела* 116
*Кахання не просяць* 116
*Кветкі на радасць табе расцвітаюць – / Не дазваляй іх таптаць* 348
*Кволасць душы, як вада нежывая, / А ў нежывой жа нішто не жыве* 324
*Кім быць на свеце беларусу, / Цяпер залежыць ад яго* 254
*Кінафільм – твор не толькі мастацтва, але і прамысловасці, тэхнікі* 194
*Кінь вечны плач свой аб старонцы!* 243
*Кінь саромецца мовы сваёй, / Зваць сябе беларусам пачні* 270
*Кінь сваркі і звадкі, адной дзеці маткі – / Мы злучаны думкай аднэй; /Пры згодзе і ладзе ў нас доля засядзе, / Палічаць і нас за людзей* 58, 66
*Кіраваць то ты кіруй, / Ды не вельмі тузай* 66
*Кірунак слова, як і зярняці, – знутры* 270
*Кіруючыся вечнаю умовай, / і ты, паэт, працуй уважна з мовай: / рыхтуй упарта грунт і працавіта...* 194
*Класавае, што законна застаецца ў свядомасці, – той векавы жахлівы здзек з прыгнечанай большасці, што выклікаў*

*пратэст, паўстанні, рэвалюцыі, здзек, з якім нельга зміріцца, і наогул, з пазіцыі чалавечнасці, і таму, што і сам ты з той большасці* 159
*Класік – гэта чалавек таксама, / Толькі нейкі адумыславаты... Што ні напіша – цытаты* 194
*Кліча цябе неспакойнае шчасце, / Толькі хутчэй да яго даплыві* 116
*Клопат усялякага слова – знайсці найкарацейшы шлях да суразмоўніка, слухача, чытача* 270
*Кніга – гэта журба па ўсім, што пражыта, і надзея на памяншэнне гэтай журбы ў будучым* 215
*Кожнага чалавека на зямлі трэба хваліць, але пры гэтым не перабольшваць* 43
*Кожнае стварэнне мае такое ж права на жыццё, як і чалавек* 373
*Кожнай жывой істоце трэба мець штосьці СВАЁ* 43
*Кожнаму свая слава ў родным кутку* 43
*Кожнаму трэба / ведаць смак нам здабытага хлеба* 174
*Кожная гісторыя, пакуль стане гісторыяй, абапёртай на факты і дакументы, – пачынаецца з легенды ці казкі* 307
*Кожная птушка ў сваё гняздо вяртаецца з выраю. / Кожны бадзяга-звер знаходзіць сваю бярлогу. / Кожная рыба свайго трымаецца віру. / Дык ці ж магу я забыцца матчынага парогу?* 243
*Кожная сцежка / Шукае дарогу* 336
*Кожны век, кожны год, кожны дзень / Слова страчвае сэнс адмысловы* 271
*Кожны год да нас прыходзіць новым, / Адыходзіць змрочным і старым* 401

*Кожны добры позірк – набыццё, / а кожны злосны позірк – гэта страта* 231

*Кожны з нас / абраннік / На тым шляху, што двойчы не пачаць* 100

*Кожны любіць цешыцца уладай, нават уладар малой пасады* 44

*Кожны мае сваю арбіту, бліжэй да сонца імкнецца* 44

*Кожны мае свой бор, / родны бор на зямлі...* 243

*Кожны міг мудрэе Вечнасць* 401

*Кожны мусіць свой цень паўтарыць, / Перш чым з прашчурамі спаткацца...* 373

*Кожны народ мае свой твар* 66

*Кожны народ сам сабе пан* 66

*Кожны народ сваю думку хоць смела /Моваю роднай не ў сорам казаў, / А беларуса ганьбоўна нямела – / Кожны мужычай яе называў...* 271

*Кожны народ стварыў хоць бы адзін геніяльны твор, і твор гэты – мова* 271

*Кожны сам сваю капае студню* 44

*Кожны хацеў бы апошнім / стаць перад бядой* 44

*Кожны, хто абраў сабе за жыццё творчасць, некалі зразумее, што літаратура – гэта барацьба ідэй, думак, уплываў, школ, мод і г.д.* 194

*Кожны чалавек – ад прыроды чалавек. Жыццё робіць з яго генія або злыдня* 44

*Кожны чалавек – гэта свет, адна істота – неабдымны прастор, і разглядай яго, калі ўмееш* 44

*Кожны чалавек – гэта цэлы свет* 44

*Кожны чалавек імкнецца да шчасця. Шукае, як шукальнік залатую жылу* 44

*Кожны чалавек мае права любіць нешта асабліва моцна* 44
*Кожны чалавек носіць у сабе храм. Штодзень, з году ў год. Толькі ў адных ён маўчыць, а ў другіх звоніць на ўсе свае званы. Але ёсць яшчэ і трэція: званы раздзіраюць такому душу, аднак ніхто гэтага звону не чуе – чалавек не выпускае яго з сябе. Апошнія паміраюць першымі – раней за ўсіх. Ад карозіі храма, які яны носяць у сабе. А раўнадушныя сцвярджаюць – ад разрыву сэрца* 44
*Кожны чалавек павінен добра ведаць сваё месца на зямлі* 44
*Кожны чалавек хоча быць хоць каму патрэбны* 45
*Колькі б доля пражы ні напрала, / Ў шлях апошні йдзеш / Гол як сакол* 100, 373
*Колькі б мы наверх ні паўзлі, / не адарвацца нам ад зямлі* 100
*Колькі жыць на свеце будуць людзі, / пра адно спяваць ім птушка будзе. / І ніхто не ўкрыўдзе на яе, / што старую песню зноў пяе* 287
*Колькі мар навырост!* 179
*Колькі на вяселлях ні скачы, / Маладосць табе не зберагчы* 142
*Колькі нянавісці трэба, каб жыць! А жыць – каб ненавідзець?* 231
*К праўдзе ўвагі не знае, не чуе, / Як змяя, чалавечая злосць* 231
*Красой адзінай чалавек жыве – /Аскепак космасу / І сон бяды зямное* 347
*Красы адцвіўшая прынада / Крылом надзей не закране* 347
*Кропля крыві / не знікае ніколі / бясследна...* 146, 159
*Кропля крыві, / што праліта за волю, святая...* 159, 324

*Круты палёт пчалы руплівай, / Карона сонца ў вышыні / І немаўлятак смех шчаслівы – / Ва ўсім пазнання карані* 307
*Круцялёў чым разбіраць, / Лепш абодвух пакараць* 221
*Крывінка задаволіць аднаго, / другому падавай кровапраліцце* 165
*Крыжы залатыя для тога, / Хто ўвесь да крыві – са святога!* 324
*Крый Бог нам абяспамяцець ізноў* 149
*Крыкам чалавек абвяшчае сваё з'яўленне на свет. / Вось толькі ніяк ён не навучыцца развітвацца непрыкметна* 373
*Крыкі спрэчкі не развяжуць* 295
*Крылаты заўжды асмяецца бяскрылымі* 67
*Крылы мы даўно сабе зрабілі – / Столькі ў нас крылатае радні!.. / Мітусні ж занадта вераб'інай, / Салаўінай мала дабрыні* 341
*Крытык адчувае сябе паміж Парнасам і пісьменнікам, а месца яго – паміж пісьменнікам і чытачом* 194
*Крытыкаваць нявартага павагі – свядома нажыць сабе ворага* 107
*Крытыка – нахлебніца пры талентах* 194
*Крычым не толькі ад болю свайго – / Яго было б нямнога, – / Крычым мы ад болю ўсяго / Свету зямнога* 67
*Куды? Адкуль?.. – / маўчанне. / Не дасць адказу час. / Стаю – і сам пытанне, / іду – і сам адказ* 401
*Куды б ні выносілі думы, / Айчыны абрыс не згублю. / Тады прачынаецца дужасць, / Як зерне трапляе ў раллю* 243
*Куды б цябе ні завяла дарога, / Не забывай бацькоўскага парога* 243
*Куды, і па што, і якая пагоня / Трасе ў ліхаманцы разумны народ?* 67
*Куды не трапяць беларусы?* 254

*Куды ні йдзі – не доўжацца дарогі, / А карацеюць з кожнаю хвілінай* 353

*Куды шаноўней слесарам выдатным быць, / Чым дрэнным піяністам* 174

*Культура нацыі без культуры роднай мовы – нонсенс, бяссэнсіца* 271

*Куля і абароніць ад кулі* 165

*Куток, дзе ты першае слова сказаў, / малым называцца не можа* 243, 390

*К чужой не прымяраўся мерцы, / Не ездзіў на чужым кані. / Сяброў я выбіраў па сэрцы, / Па іх душэўнай цеплыні* 107

*Лашчыць і лечыць чалавечую душу часіна згоды ў прыродзе, але найлепшая згода для чалавека – згода з самім сабою, са сваім сумленнем* 107

*Лепей зламацца зусім, чым гнуцца ўсякай сіле* 58

*Лепей недааціць сябе, чым пераацаніць. Калі недаацэніш – цябе паправяць людзі. Пераацэніш – таксама паправяць пасля...* 67

*Лепшага смаку няма, чым жыць...* 93

*Лепшае – заўсёды вораг харошага. Але горшае – гэта ўжо сябра і памочнік лепшага, бо яно нібыта падымае харошае на якую падстаўку, нібыта высвечвае з усіх бакоў і дапамагае ўбачыць усе самыя цудоўныя і прывабныя яго якасці* 295

*Лепш быць сляпым або бязногім, чым мець халодную душу* 324

*Лепш падаць і ўставаць з нялёгкай ношаю, / Чым злёгку папіхаць яе рукой* 295

*Лепш у белым, чым у чорным на вуліцу выйсці* 348

*Лепшыя думкі і словы з маўчання* 271

*Лес – гэта святарнае мейсца, / для душаў аблудных меса* 81

*Лес – гэта храм* 81

*Лес заўсёды расце для таго, каб яго сеч. У гэтым вечнае абнаўленне* 81

*Лес, і рэчку, і клёкат бусловы, / Чалавечую ўсмешку ўраз / Можна знішчыць адным толькі словам, / Што бяздумна вырвецца ў нас* 271

*Лес не сякуць языкамі* 81, 307

*Лес рэдка калі маўчыць. Прывычнае вуха ловіць у ім галасы, але ніхто яшчэ не сцяміў тайны яго мовы* 81

*Лес шумеў і будзе шумець* 82

*Лечыцца трава ад спёкі ліўнем, / Людзі ласкай лечацца людской* 342, 390

*Лёгка быць смелым і сумленным, калі пад нагамі не твая зямля, калі за спіною няма радзімы* 243

*Лёгка жыць і верай быць відушчым, / Покуль на ўзбярэжжы сіняй пушчы / Зорыцца акно бацькоўскай хаты* 254, 324

*Лёгка злавіць несуна, / цяжка злавіць казнакрада* 221

*Лёгка судзіць несуна. / Будзем судзіць казнакрада* 221

*Лёс абачлівых выбірае, / Ды бывае... – то воля нябёс? – / Неабачліваму спрыяе. / Усё ж разважлівых больш любіць лёс* 100

*Лёс – ён лёс, не выпрасіш вякоў* 101

*Лёс, жыццё – гэта шматпакаёвая кватэра, і ў кожным пакоі па чарзе чалавек вымушаны жыць. Але дасада ў тым, што ў кожным пакоі ён розны* 101

*Лёс кожнага – гэта свой лёс, але без лёсу народа няма і свайго лёсу* 67, 101

*Лёс не аб'едзеш, як прывідны знак* 101

*Лёс ніколі не спраміць шляхі* 101

*Лёс паэтаў – крыж* 195

*Лёс удавы – як песня жураўліная* 101, 126

*Лёсу майго кірунак, / долі маёй выснова, / як паратунак, / матчына слова, / бацькоўскае слова, / роднае вечнае слова!* 271

*Лёс Хрыста, пакутнага Ісуса, / Таксама, як і доля беларуса, – / Адзін і той вянок на галаву* 101

*Лёс чалавека цяпер як шарык дзьмухаўца: не трапіў пад вецер і дождж – выстаіць. Трапіў – і няма цябе, застанецца адзін успамін, што ты жыў-быў на свеце* 101

*Лёс, што даў, то адыграе, / Тут – пасее, там – змяце...* 101

*Лётаць і лунаць / На вышыні / Маеш права – / Поўзаць немагчыма!* 307

*Ліпаю ў печы не паляць. Душа ліпы ў агні плача* 307

*Лісцё нашых дзён лістабоем нябыту сячэ, / Калі маладыя, нічога не страшна яшчэ, / Пад старасць ужо нам не страшна нічога* 373

*Літаратары павінны навучыцца ... думаць па-беларуску* 195

*Літаратура – адзін з найбольш чулых сейсмографаў нашага жыцця* 195

*Літаратура – гэта барацьба аднаго з усім сусветам* 195

*Літаратура – гэта заўсёды ўспамін* 195

*Літаратура – гэта прыгоннае права. Пісьменнік працуе без выхадных, і нават таго адзінага вольнага дня на тыдзень, які мелі прыгонныя, у яго няма* 195

*Літаратура – гэта публічнае прызнанне ў слабасці і нежыццяздольнасці свайго народа ці сцвярджэнне веры ў яго розум і несмяротнасць* 195

*Літаратура існуе да таго часу, пакуль ёсць боль, спагада, спачуванне. Там, дзе няма гэтага, дзе ўсе шчаслівыя, літаратура канчаецца – там ёй проста няма чаго рабіць* 195

*Літаратура любіць прыгажосць* 195

*Літаратура не стварае звыклых матэрыяльных каштоўнасцей, яна не выпрошвае хлеба, не будуе заводы, не робіць машын. Яна вырошчвае, будуе, робіць, стварае самую высокую і самую галоўную матэрыяльную каштоўнасць на зямлі – Чалавека* 195

*Літаратура – паліклініка, а не бальніца. Пісьменнік – доктар, але не хірург. Ён толькі паказвае, дзе баліць, але сам не рэжа – рэжуць ужо іншыя* 196

*Літаратура часам падобна на ЭВМ: многа абмежаванняў – мала творчасці, мала абмежаванняў – «творчасці» многа, але яна носіць «бредовый» (бязглузды, недарэчны) характар* 196

*Ліха знойдзе ўсюды, / Шчасце ж уцякае* 334

*Лічы, спаліў дзень, калі нікому нічога не зрабіў добрага. Так можа растапіцца ўся свечка жыцця...* 373

*Люба цяпельца, / што кожнаму сэрцу жаданае, – / неўтаймаваны, / запалены знічкай давер* 108

*Любая прафесія заўсёды была і будзе прывадам, што злучае чалавека і грамадства* 67

*Любімых не забываюць у радасці, а ў горы любяць яшчэ мацней* 116

*Любіце тут. / Любіць дарэмна там. / Бо чалавек жа бачыцца здалёк. / Бо чалавек жа бачыцца па справах* 45

*Любіць зямлю! І не наогул, / А – гэту! Нашу! Дзе жывём!* 243

*Любіцьму волю вольную да скону, / ды над каханнем узвышаў яе дарма: / любімая, / мне без твайго палону / якая воля, як жыцця няма?!* 116

*Любіць прызначана мне лёсам. / Я не памру, пакуль люблю. / І крык свой сціплы безгалосы – / Паэта голас – не згублю* 116

*Любіць Радзіму да скону, / так, / Як любяць расліны – сонца* 82, 243

*Любіць Радзіму ў светлыя і радасныя дні высакародна. Але яшчэ болей высакародна любіць Радзіму тады, калі ёй цяжка, калі гэтая любоў небяспечная* 243

*Любіць трэба ўсе народы, а песціць свой* 67

*Люблю непаўторны свой род / І яго анідзе не зракуся, / Як бы лёс не падгорчываў мёд / Прыналежнасці да Беларусі* 254

*Люблю, таму і не іду на дно* 116

*Люблю, хто з сонцам – за руку* 117

*Люблю цябе такой, якая ёсць, / Зямля мая, зямля бацькоў святая, – / Мая слязінка – са святла наскрозь, / Маё прычасце, мой святлісты лёс... / З табой і паміж бедаў я світаю* 254

*Любое жыццё асобнага чалавека – легенда* 373

*Любоў і дружба шчасце росцяць...* 117

*Любоў і лад узвышаюць, / вядуць за далягляд. / Варожасць і злосць прыніжаюць, / адкідваюць назад* 117

*Любоў і сама, як шыпшына: адплаціць яна / За дотык бяздушны і грубы, адплаціць заўсёды* 117

*Любоў нараджае не толькі дзяцей, / Любоў нараджае не толькі надзеі, / Любоў, апрача дзяцей і надзей, / Прыносіць сумненні й падзенні. / Аддаўшы сябе сваёй сяўбе, / Свету явіўшы плады залатыя, / Самазнішчае яна сябе, / І разам з ёй знішчаюцца тыя, / Хто яе носіць...* 117

*Любоў – не райскія сады, / Любоў – не дом падараваны, / Любоў – бяздомнік, прапісаны / У верным сэрцы назаўжды* 117

*Людзей заўсёды да бяды і слёз / Даводзяць абыякавыя людзі* 67

*Людзей смяшы, а сам не смейся* 67

*Людзі ваду да сябе ўздымаюць, / Быдла – схіляецца да вады* 67

*Людзі / глядзяць у будучыню, / мінулае – / на людзей* 67

*Людзі з запасной душой. Гэта пра тых, што працуюць у чужой культуры, а потым некаторыя вяртаюцца ў сваю* 325

*Людзі любяць душу прасаваць, / калі гэта душа чужая* 325

*Людзі, людзі, жывіце нармальна / І пра будучы думайце век* 68

*Людзі нясуць свой уласны крыж на сваю ўласную галгофу* 68

*Людзі падобныя на запалкі: / калі не гараць – утульваюцца ў бяспеку, / калі гараць – адтульваюцца для свабоды* 68

*Людзі робяць вясну / І пагоду на свеце!* 68

*Людзі! / Так па зямлі ступайце, / Як ля калыскі маці, – / Безабаронная наша зямля, / Нібыта сон дзіцяці...* 244

*Людзі хочуць, каб званні і славу / Не давалі нікому дарма...* 68

*Людзі! Цану велічы ведаючы, / смейцеся смела над маніяй велічы* 68

*Людзі як бы некуды ўзвышаюцца, а застаюцца вечнымі сярод зладзейства, злачынства, варожасці, гвалту...* 68

*Людзі, як і зёлкі, чый род – палыновы* 68

*Людзьмі жывіце, людзі, – / І ўспомніць вас Зямля!* 68

*Людскі наш лёс – былінка поля* 101

*Людское сумленне за грошы / Купілі – прыстойны тавар. / Цяпер яно беднасці можа / З пагардаю глянуць у твар, / Зрабіцца паважным, вяльможным, / Пашану і славу набыць... / Адно яно толькі не можа – / Сумленнем някупленым быць* 342

*Людское сэрца быццам мора, / У ім бывае шторм і штыль* 325

*Людскую славу погалас хістае, / Нібыта пёрка на капелюшы* 169

*Людцы вы мае, у кожным часе / Затоены свой нейкі план* 402

*Лябедзіку, застанься недасяжным, / высока шыю белую нясі, / не распускайся птахам нехлямяжным / і мяккай булкі з рук ты не прасі!* 58

*Лягчэй памерці, чым астацца навек без надзеі і веры* 179

*Лягчэй таму знайсці / Шлях да людскога гора, / Хто меў сваё ў жыцці* 68

*Магутнасць і веліч – / у шчырай любві чалавечай* 221

*Магчыма, бывае малая любоў, / святыні малой не бывае* 325

*Мадэль часу нагадвае кола: у ім ёсць акружнасць і ёсць цэнтр, дынаміка і статыка, цэнтраімклівае і цэнтрабежнае* 402

*Майго радка рыфмованага звон / Мне даражэй за кожны іх* [ракфелераў і фордаў] *мільён* 196

*Майстра заўсёды ацэніць роўнага сабе* 196

*Майстэрству можна вучыцца дзе хочаш і ў каго хочаш* 196

*Маладосці больш у вечнасць верыцца* 142

*Маладосць – абарваны трыпціх – / У трывожным жыве падарожжы* 143

*Маладосць! Ты маеш дзён багата,/ Ты іх, бесклапотная, не лічыш; / Толькі старасць разумее страту: / Мала – ды ні ў кога не пазычыш* 143

*Маладосць хто раскрышыць, разбожыць – / Галаву, як на пласе, спарожніць* 143

*Маладыя ногі і ў балоце не гразнуць* 143

*Маладыя толькі / Сонца й мама./ Радасць яшчэ маладая таксама* 133, 143

*Мала маці мы любім, / Рэдка ласку ёй дорым* 133
*Маліцца будуць, калі ты ў славе, / Калі ты ў горы – з насмешкай плюнуць* 68
*Малодзяць маці ўдалыя сыны, І стараць – як няўдалыя яны* 133
*Малое зерне месціць цэлы свет. / Там спеюць нашы мускулы і праца / І прарастаюць / гарады планет* 337
*Малому велічу быць хочацца заўсёды* 308
*Малы палёт – малыя веды* 308
*Малы разгон, а ўзмах вялікі* 308, 390
*Малыя народы – як грошы разменныя ў касах* 68
*Малюе ж вобраз Непарочнай Дзевы / Мастак падчас з распуснае натуры...* 196
*Мара горыччу перацвіце, / Але явай усё ж не стане* 179
*Маркотна мне без Беларусі* 254
*Мастак, зразуметы адразу і цалкам пры жыцці, не нясе ў сабе тайны чалавечай душы* 196
*Мастак – кажучы фігуральна, заўсёды большы раяліст, чым Нерон, і большы католік, чым Папа Рымскі* 196
*Мастак – не раб, не палахлівец, / А мужны вучань у жыцця* 197
*Мастак не ўласнасць: ён не належыць ні сабе, ні каму-небудзь іншаму* 197
*Матуля і мова – з калыскі адное* 133, 271
*Матчынай мовы, багатай і слаўнай, / Што ў скарбах народа бы фонд залаты, / Не аддавайце бяздумна, бяспраўна, / Не прадавайце святога, браты!* 271
*Матылёк – дзявочая душа* 325
*Маўчанне адназначным не бывае* 295
*Маўчанне / Ніколі не было / І не будзе золатам: / Яно – або / У шмат разоў даражэйшае, / Або – нічога не вартае* 295

*Маці – адзінае вышэйшае імя* 133

*Мая мова – як шчасце на вуснах, / хвалявання гарачы прыбой, / можа быць, на чужой засмяюся, / ўсё ж заплачу з тугі на сваёй* 271

*Меншасць замольвае грахі, а большасць запівае* 390

*Мерае чалавека меркай адною зямля, адваротнаю – неба, і меркай двайною сам сябе чалавек* 390

*Мерка жыцця ўсё ж: / «Ёсць ці няма што ўспомніць!»* 373

*Метафара – транскрыпцыя: яна перадае на «тутэйшай» мове «тамтэйшае»* 272

*Мешчанін разумее толькі «жыццё», але ніколі не спасцігае ягонай меры – часу* 402

*Мёды п'ём, а душыць смага: / Што ні кропля, то гарчэй* 295

*Мёртвым лягчэй, і нясцерпна жывым, / Што мёртвых у сэрцы нясуць* 373

*Міг і Вечнасць – святога зарубкі* 374

*Міласць – горды знак,* 58

*Мілей за прыстань ціхую спачыну / Хай будзе руху несціханы шум!* 374

*Мільён – адзінка, шэсць нулёў. Чагось, вядома, горба. / Насып хоць макавых зярнят, а поўнай будзе торба. / Сама ж адзінка без кружкоў як кіёк жабрачы, / Як крыж на ростані дарог, / Як чалавек без сваякоў – адцяты хвост сабачы* 390

*Мінем дарогі, іх малюнкі, / Ім не падведзены рахункі* 353

*Мінулае жыве, / яно за намі назірае* 402

*Мінулае наша гэтак жа неаддзельнае ад нас, як і будучае* 402

*Мінулае тоіцца ў змроку, будучыня – у светлыні* 402

*Мітусня – тканіна, на якой чалавек страсцямі, звычкамі, учынкамі, абавязкам вышывае малюнак свайго лёсу* 101

*Мітусня – шашаль для творчасці* 197

*Мішура пазалоты на ўсім, / Што бязрадасна, пошла, ганебна* 221

*Мне бацькаўшчынай цэлы свет, / Ад родных ніў я адвярнуўся... / Адно... не збыў яшчэ ўсіх бед: / Мне сняцца сны аб Беларусі!* 254

*Мне болей шкада тых думак, якія не выйшлі за межы галавы, – гэта было самагубства...* 272

*Мне верш, што ненапісаны, патрэбны, / Каб веру у сябе не патушыць* 197

*Мне для роднае маці не грэшна / Падарыць салаўіны мой гай, / На далоні падсмажыць яечню, / На далоні спячы каравай* 133

*Мне Загібелька лепш Парыжа* 254

*Мне з песняй / трэба уваскрэснуць / І над самім сабой / паўстаць...* 287

*Мне людзі бачацца багамі / Часінай першай баразны,* 45

*Мне не патрэбна дзея, / Калі вядомы да драбніц фінал* 390

*Мне слова матчына не ў лішак... Бязроднасць гневіць камяні* 272

*Мне шчасця чужога не трэба, / Пакута – яго берагчы* 117

*Многа пройдзена дарог, / А на ганак, твой парог – / За ўсе карацейшая / І за ўсе лягчэйшая* 117

*Многа цікавага пачуе той, хто ўмее чытаць кнігу божай прыроды, божага свету, хто цяміць і разбірае іх мову* 82

*Мова... – вялікай навукі вытокі / і паэзія праўды, / якая не мае граніц* 272

*Мова – гэта душа нацыянальная народа, калі ёсць такая душа, то ёсць і гаспадар яе – гэта сам народ, а як не гіне народ з нацыянальнай душой, так не загіне беларускі народ!* 272

*Мова – гэта ключ да дзвярэй у свет, і кожны павінен выйсці праз свае дзверы. Гаварыць не на сваёй мове – тое самае, што глядзець на свет не сваімі вачыма* 272

*Мова – жывая істота. Яна жыве, а не існуе* 272

*Мовай чужынскай і воляй варожай не пакарай мяне, праведны Божа!* 272

*Мова родная, мова дзядоў! Іншай мовы мы сэрцам не чуем* 272

*Мова родная што віцязь напагатове...* 272

*Мова сяброў – / На свеце найлепшая мова* 272

*Мова ў паэзіі згушчаецца, насычаецца энергіяй, якая, як магніт жалезнае пілавінне, размяшчае словы па сваіх сілавых лініях. Паэт трансфармуе мову, выводзіць яе са звычайнага ўжытку да той стадыі, як таго вымагае твор. І трансфармацыя мовы тут проста неабходная: дзякуючы ёй арганізуецца твор, яна – спосаб арганізацыі твора* 273

*Моваў шмат, пра-мова адна: невыказнае. Гэта на ёй «гаварылі» да слыннага Вавілонскага непаразумення* 273

*Мовы мяжуюць не як плоскасці, а ўзаемапранікаючыся сваімі пазамі і выступамі, як растапыраныя пальцы рук. Яны дапаўняюцца і тлумачацца адна адной* 273

*Могуць вымераць карані / Глыбіню цішыні. / Цішыня глыбіні / Можа выслухаць карані* 390

*Можа, шчасцем адтаго й завецца / Тое, што не можна паўтарыць* 117

*Можна верыць у парадак, / а ў непарадак як паверыш ты?* 295

*Можна й вясною дачасна састарыцца, / Можна і полымем ўвосень гарэць* 143, 374

*Можна ўсё: пусціць каханне дымам, / Ўзяць і занядбаць мінулы шлях. / Але толькі – не любіць Радзімы / З чорнаю павязкай на вушах, / З чорнаю павязкаю на вуснах, / З чорнаю павязкай на вачах* 244
*Мозг – унікальны млын. Ён усё змеле* 295
*Мой боскі лёс так невыносна цяжкі, / Як бервяно, што на плячы мурашкі* 102
*Мой брат беларус! Тваёй сіле, / Цярпенню твайму пакланіцца* 255
*Мой Край, на шырокім заблытаным свеце / ты мне наймілейшы, бо родны, бо свой* 244
*Мой крык перад малітвай свету – ноль!* 69
*Мой родны кут, як ты мне мілы!..* 244, 255
*Моладзь – гэта надзея, світанне, / каласы нашы і васількі* 143
*Мора, / каб хацеў, / дык не сурочыш / Развітальным пошапкам сваім* 82
*Моц думкі не залежыць ад фізічнай моцы чалавека. Праз яе выходзіць энергія душы. Фізічная энергія кудысьці знікае, энергія думкі лунае вечна* 273
*Моцна трымае зямлі пупавіна / Сэрцы людскія і кліча дамоў* 261
*Моц розуму – хіба не ў аддаленні / Ад зла?* 308
*Мудрасць – багацце людзей, якія ўжо збяднелі на цэлую маладосць!* 308
*Мудрасць здолее ў цемры свяціць* 308
*Мудрасць крылатая, яна, як насенне дуба, ляціць і ўкараняецца ўжо на вечнасць* 308
*Мудрасць – не ад барады* 308
*Мудраца і шэпат чутны / Незалежна ад пагоды* 308

*Мудры чалавек ніколі не скажа, што ён мудры* 308
*Мужы са скуры лезуць, / Каб жонкі ўлезлі ў шкуры* 118
*Мусібыць, самая лагічная логіка паэзіі – алагічнасць* 197
*Мусіць, трохі паэты хлусяць, / Што мы прагнем адных навальніц* 197
*Мы бачым, што мы нічога не бачым, а чаму нічога не бачым, зараз пабачым* 337
*Мы – беларускі лёс, / Покі сумленне ёсць* 255
*Мы вартыя не тым, / хто больш сабе нагроб, / А тым – хто больш / аддаў па-людску людзям* 69
*Мы вядзём справядлівую, высакародную вайну, але страшнае ў тым, што ніякая вайна не высакароднасць* 165
*Мы вяртаемся, – / і ў гэтым ты і ёсць, / Айчына* 244
*Мы дабратой залішняю грашым, / Яна ж гадуе нечую нянавісць* 231
*Мы для ўнукаў павінны дарогу прабіць. / Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе. / Хто забыў сваю мову – усё згубіў* 273
*Мы ёсць, каб не быць* 374
*Мы жанр падзей сабе не выбіраем* 374
*Мы жывём, каб вяртацца...* 374
*Мы заўважаем і кажам тое, што адгукаецца нам, што само падае нам свой голас* 273
*Мы за цябе яшчэ не паміралі, / Мы для цябе, Радзіма, будзем жыць* 244
*Мы з гадамі, як ракаўкі, дзе / Глуха мора надзеі гудзе, / Калі вечнасць падносіць да вуха* 402
*Мы зноў з табой, душа, / як на пачатку поля. / Было б што сеяць там / I жаць было б каму* 325
*Мы з табой пералётныя птахі, / Якім / не вярнуцца назад* 102

*Мы каласамі ў гэты свет прыходзім, / Каб сілу даць зярнятам залатым* 374

*Мы... міласэрнасць забылі навек. / Толькі б уласны ручай наш не высах. / Днём жа адзіным жыве чалавек...* 374

*Мы на зямлі па-рознаму святыя* 325

*Мы – насенне жыцця* 69

*Мы не бязродныя на свеце /І не бяздомныя ў жыцці. / Чым дагараць у пустацвеце – / Лепш не ўзысці і не цвісці!* 374

*Мы нярэдка губім маладосць, / не падтрымаўшы першае каханне / і першы спеў, калі ў ім нешта ёсць* 118

*Мы пастаянна шукаем адно слова, якое б канчаткова і поўна выказала нас. Роўнае яму хіба што маўчанне: гэта тое ж слова, але са знакам мінус, яго страта, яго след, яго адсутнасць* 273, 337

*Мы плацім за пазнанне нязменнаю цаной* 308

*Мы рухаемся з адной цяперашнасці ў другую і як сваю долю прымаем тое, што ёсць. / Наша дарога праходзіць праз нашы сэрцы, / кожны наш крок – гэта крок за небакрай, / і ў кожным нашым імгненні змяшчаецца ўвесь час* 402

*Мы самі – хуткасць, / Самі ўжо – машыны!..* 221

*Мы сквапна цягнемся к старым паэтам, / Каб хоць душой у прошлым патануць* 197

*Мы слухаем маўклівае міжзор'е, / А блізкіх нам не можам зразумець* 69

*Мы суддзямі тых не выбіралі, / што асуджалі ўсіх на здзек* 69

*Мы – тройчы дзеці ў вечным крузе: / Мы – дзеці роднае сям'і, / І – дзеці Маці-Беларусі, / І – дзеці Матухны-Зямлі* 255

*Мы ўжо не просім міласці ў прыроды, /Прырода моліць літасці у нас* 82

*Мы ў маўчанні – рабы* 69

*Мы ўсе жывём за кулісамі, а паказваем сябе на сцэне і нават гаворым заўсёды аб сцэне* 374
*Мы ўсе жывём пад зоркамі матуль. / І гэты свет / Сагрэлі нам матулі* 133
*Мы ўсе – з любові, / А як жа мы прад ёю ўсе ў даўгу* 118
*Мы ўсе, мы ўсе – прыроды дзеці, / У нейкім сэнсе – цыганы* 82
*Мы ўсе памалу прыйдзем к небыццю. / Судзі мне, доля, мужнаму памерці / І праспяваць перад вачамі смерці / Апошняй песняю хвалу жыццю!* 374
*Мы ўсе сваёю доляй здолены* 102
*Мы ўсё яшчэ будуемся з вайны, / І – ад вайны!– няўжо ізноў залежым?* 165
*Мы, як дубы, / нас можна знішчыць громам, / але з зямлі нас роднай / не скрануць* 262
*Мэта мэты – станавіцца ўсім жыццём* 375

***Н**а адну шалю вагаў / паклаў я хлеб, / на другую – камень, / але, калі яны ўраўнаважыліся, / не змог / паверыць, што важыць хлеб / гэтулькі ж, / колькі камень* 182
*На Беларусі Бог жыве, – / І няхай давеку жыве* 255, 325
*На беларускую дзяўчыну / Ніхто йшчэ каменем не кінуў / І не паважыцца кідаць* 127, 255
*На бульбе выраслі паэты, / і маршалы, / і касманаўт!* 182
*Нават думы, / нават слова – / Усё з зямлі. / З яе адной* 262
*Нават замілаванне да ўсіх пакрыўджаных трымаецца на клопатах аб сваім уласным шчасці* 69
*Нават кропля вады памяць мае/ Літаральна пра ўсё, / Што кранался плыні калісьці* 150
*Нават мары аб вясне даволі, /Каб вясна цвіла ў жыцці тваім* 375

*Нават найпершыя людзі – / Адам і Ева – / Не былі адзінокія / У сусвеце* 69

*Нават птушкі супраць буры / Сядзяць наперад галавой* 154

*Нават смерць, нарэшце, плата замалая / За той дар бясцэнны, што жыццём завём* 375

*Нават страціўшы зрок, / Абыду я паўсвету, / А да родных мясцін шлях заўсёды знайду* 244

*Нават сумная песня – / не плач па жывым чалавеку* 287

*Нават у самую безнадзейную хвіліну нам памагае трымацца надзея* 179, 375

*Навек астанешся ты песняй няспетай, / Мая Беларусь* 255, 287

*На вершах стала мала пазалоты, / Замест яе часцей блішчыць алей* 197

*Навечна целу дадзена душа. / Бяда, калі душу губляе цела!* 325

*Навошта бяссрэбранікам серабро – / пасрэдных людзей пасрэднік! / (Гэта ўжо так: серабро – або чыстасумленны бяссрэбранік)* 69

*Навошта душу / Раскрываць гэтак смела, / Калі ў той душы / Бяздушнасць засела* 325

*Навошта ж воля для жанчыны, / Калі ёй цэлы свет чужы!* 127

*Навошта ж на зямлі / Сваркі і звадкі, боль і горыч, /Калі ўсе мы разам ляцім / Да зор?* 69

*Навошта ж Радзіма паэту? / Каб косці ў ёй скласці свае* 197

*Навошта мне кропля / Твайго неспакою, / Калі ў гэтай кроплі / Мора спакою* 337

*Навошта наогул / Вянок лаўровы, / Калі, як хамут / Яго носяць галовы* 169

*Навошта пра фальш мы праўдзіва гаворым?* 231

*Навучыўся казаць «благодарю» і «благадарыць» і калі трэба, і калі не трэба* 231

*На выццё сабак не адказвай, / Калі цябе кліча жніва* 174

*На вялікія справы – і сэрца вялікае, / На вялікае сэрца – і лёс надзвычайны* 102, 391

*На вятрах нецярплівых рук / Выспявае заўсёды ростань* 118

*На гонары далёка не заедзеш* 58

*На гонях родных / Рунь рунейшая* 244

*Надзець не дайце вечных ланцугоў, / Любыя збіць рыхтуйцеся аковы* 159

*Надзея – хлеб душы* 179, 349

*На дзіва наіўныя людзі: каторае стагоддзе ўсё яшчэ патрабуюць справядлівасці і законных падстаў вядзення вайны. Гэта ўсё адно, што патрабаваць пазбаўлення болю пры родах* 165

*Над кожнаю душой / Свой воран кружыць* 325

*Над намі пануе... шаблон пустых слоў, пустыя выразы, чужыя формы думак* 274

*На дрэве памяці з кожным годам багацейшы ўраджай* 150

*На дымным ядзерным крыжы / Прырода курчыцца пакутна* 82

*Назад не прыйдзе хваля тая, / Што з быстрай рэчкай уплывае* 93

*На зло ліхім прыгодам / Крыніцы свежыя цякуць* 82

*На змену тым, што пайшлі ў запас, – / Новыя меры, сферы і эры* 69

*На зямлі – адзіная удача: / Ў вечным слове чалавекам быць,* 45

*На зямлі існуе адзіная непапраўнасць, адзіная незваротнасць. Гэта смерць. Пакуль яна не прыйшла – усё можа змяніцца тваёй воляй або капрызам лёсу* 375

*На зямлі, / у небе / і ў вадзе / Жорсткі і спрадвечны паядынак / Заўтрашняга з сённяшнім ідзе* 402
*Найбольш трывалае шчасце – у сумленным выконванні абавязку* 118
*Найлепшая з нашых дарог – / Дарога дадому* 353
*Найлепшы сведка Праўды – Мана* 295
*Наймічку таксама добра каля печкі цалаваць, / Калі лёс не шле царыцы, суджанай навек табе* 118
*Найсаладзей быць чалавекам унізе, чым варонай на вышыні* 58, 391
*Найсмачнейшы – зароблены хлеб / маладымі сваімі рукамі* 174, 182
*Найстрашнейшая з дэвальвацый – / Дэвальвацыя дабрыні* 342
*Найстрашнейшая з усіх разрух – / ... душ і сэрцаў разбурэнне* 325
*Найцяжэй судзіць сябе самога, / Чым у другога плямінку знайсці* 221
*Найшырэйшая з дэвальвацый – / Дэвальвацыя гучных слоў* 274
*На карце міру хто паставіць кропку –/ Пакорлівы палітык ці паэт?* 166
*На ліхое нямнога патрэбна хвілін* 221
*На магілах не сеюць пшаніцы. / З чужой крыўды не вырасце доля* 296
*Намарозіць радня па крыві – / Адагрэе радня па долі* 133
*Нам без трывог не зберагчы жыцця. / Сябры, давайце будзем хвалявацца / За ўсіх і ўсё* 93
*Нам бы самай высокай роднасці, / апантанасці дэфіцытнай!* 133

*Нам здаецца так, / як у жыцці, / Самым блізкім / перавал высокі, / На які нам трэба / узысці!* 375

*Нам, / зямлянам, / разам ратаваць, / Ад гнілога бруду адмываць / І нядзеліць радасцю / планету* 262

*Нам край належыць, пакуль ззяюць зоры* 244

*Нам не дадзена двойчы жыць, / Але дадзена нам неўміручасць* 375

*Нам не з жыцця сыходзіць страшна, / А з добрай памяці людской* 375

*Нам паліць з успамінаў цяпельца, / Нам да скону ўспамінамі жыць: / Тым азерцам, / што плешчацца ў сэрцы, / Той ручулкай, / што з сэрца бяжыць* 150

*Нам песня – тое, што і хлеб* 287

*Нам потым лічыць недароды, / Бо сеялі часта на вецер... / Ідзе размыванне пароды... / Вось так паміраюць народы: / У нас, / А пасля – / і у дзецях* 70

*Нам трэба жыць і долю папраўляць, / Каб нас патомкі з часам не клялі* 155

*Нам тыя вяртаюцца кветкі, што самі сабе ўзгадавалі...* 391

*Нам у вольных дрэваў павучыцца, / Як за родную зямлю трымацца...* 82

*Нам усім не хапае спагады, / І любові жывым не стае... / Нам адпушчана так небагата, / Што й грахі не запомніш свае* 118

*Нам часу дадзена не шмат – / Міне яшчэ адна хвіліна, / Ёй не вярнуцца ўжо назад* 402

*Нам часу на вандроўкі / дана мала. / А сэрца кліча ўсё далей ісці, / каб нават смерць / з'явілася прывалам, / а не канцом вандровак у жыцці* 403

*Нам, як пачатак буквара, – / Святло, Любоў і Годнасць* 58

*На назвы няма манаполій* 274

*На папялішчы не шукай / прасветленай усмешкі. / На выкашаным лузе – / першацвету* 296

*На паўторнае жыццё / Не пакінуць перавучвацца / ніко-га* 375

*Напісанае застаецца, а ненапісанае забываецца* 150

*На плыце сядзець – не на лаве, / Патрэбны і смеласць і спрыт* 155

*Напоўненасць жыцця – / лепшае бессмяроцце* 94

*На продаж толькі тое, што ад працы* 174

*На прыбаўку гадоў – / Да жыцця! – / Аніякай надзеі. / Мне б прыбаўку жыцця – / Да гадоў...* 94

*На прывязі быць нават камню нядобра, / Вяроўка ж ратуе і ... звязвае нас* 159

*На прызбу сесці побач з дзедам / Яшчэ патрэбна заслужыць* 134

*На пустым і закінутым полі / Не народзяць зярнят каласы. / Так і ў сэрцы халодным ніколі не зайграюць жыцця галасы* 326

*На пяску, як ні сей, а не ўродзіць / Добрага хлеба ні-ні* 182

*Нарадзіўся, каб памерці. Але развітваюцца са светам, калі па-Божаму, як дагарыць свечка жыцця. Калі аддасі сваё цяпло спадчыннікам. Калі сэрца перахварэе каханнем. Калі спазнаеш свята душы. Калі ты ў нейкім і ў нечым прадоўжыш сябе на Зямлі* 375

*Нараджаемся не для смерці, / Нараджаемся мы, каб жыць* 376

*На развалінах сем'яў ці можна пабудаваць моцную, цывілізаваную дзяржаву?* 70

*Нараканнем не зможаш бяды* 334

*Народа не народзіш спакваля* 70

*Народа няма напалову – / Ён ёсць ці яго няма* 70
*Народаў малых няма! / Бываюць малыя паэты...* 197
*Народ без песні – не ўмее, / Народ без песні – нямее* 288
*Народ ганяе «Запарожца»! / Народу «Волга» ні к чаму!* 70
*Народ куляе стаканамі, / Народ кілішкамі не п'е* 70
*Народ кускі бярэ рукамі! / Народ відэльцамі не есць!* 70
*Народ можа даравацъ пісьменнікам многае, але не можа дараваць маўчання ў часы, калі вырашаецца яго лёс* 197
*Народ наш у вяках / Трымаўся на сям'і* 134
*Народная творчасць. У ёй ёсць усё – філасофія і геаграфія, раман і аповесць, характары людзей і багацце сюжэтных ліній, едкая сатыра і самая смелая фантастыка... З яе вырасла ўся творчасць. Яна – Адам і Ева кожнай літаратуры* 197
*Народ не гоніцца за смакам! / Народ на градусы глядзіць* 70
*Народ не дурны, але часцяком абдураны* 70
*Народ – не зборышча, не гурт... / Калі ён сам сябе ўсвядоміў, / Сваю гісторыю, / Свой лёс, / Свае правы ва ўласным доме, – / Тады – народ, тады – ён ёсць* 70
*Народ не носіць габардзіну, / Народ апрануты ў паркаль* 70
*Народ не слухае сімфоній! / Яму «Лявоніху» падай!..* 71
*Народ не цэніць благавухаў – / Ён любіць водар сенажу!..* 71
*На родных мовах – як аднолькава, / як горка плачуць дзеці ўсе...* 274
*Народ сябе пазнаць павінен! / Народ – не зборышча, не гурт. / Ён мусіць мець – інакш загіне! – /Усведамлення цвёрды грунт* 71
*Народ умее сумяшчацца, / Народ душою не азыз. / Не сумяшчаецца мяшчанства – / З капрызам дробязным капрыз!* 71
*Народ усмак цярэбіць кільку! / Народ не просіць селядца!* 71

*На ростані дарогаў многа, / А лучнасць іх – пахілы крыж* 353

*На самы жорсткі, незагойны верад / Ёсць недзе, ёсць зялінка на загой!* 391

*На свеце ёсць мера ўсяму* 391

*На свеце ёсць на ўсё прычына, і кожная прычына мае сваю прычыну, і ў аснове кожнай прычыны ляжыць таксама прычына* 391

*На свеце самае святое / ўсё, што праца набыла* 174

*На свеце тайн такіх няма, што асталіся б не раскрыты* 296, 391

*На свеце ўсё канец свой мае, / І ты, мінуціна змяркання, / Спяеш нам песню расставання* 376

*На свеце ўсякага жыцця даволі і чалавечае долі шмат* 94, 221

*На свеце часта бывае так, што самая простая справа, самая ясная праўда пазнаецца цаной вялікай пакуты, – надта цяжкая дарога прыводзіць да такога пазнання* 308

*На святло і ружы – голаду няма* 296

*Нас дзеці і ўнукі паўтораць нанова – / Народы не спісваюцца на пенсію* 134

*Нас з кожнай стрэчай раптам меншае, / І ў мройным марыве жыцця / Мы бачым – адыходзяць лепшыя / У свой анёлавы прасцяг* 376

*Насенне чакае / Сваёй пары – / Замкнёнае ў сховішчах сэнсу* 391

*Насіллем не прынясеш шчасця* 166

*На скрыжаванні дабрыні і зла / І ў грэшнага – святыя – ёсць памылкі* 296, 326

*На словах – магутны слон, / А на дзеле – моль...* 391

*Нас на Зямлі за ўсё мацней / Трымае смутак развітання* 262
*На справе сук апошні гнецца, / Дзе два пачэплены гаршкі* 82
*Настае дзень, калі я бяру меч і бяру шчыт. Аднак, перамогшы слабасць, я мушу перамагчы і сілу* 166
*Настальгія, як рана, запаўняе збалелыя грудзі / Дрэвам і людзям* 245
*На старасці год чалавек не гатовы спажыць здабыткі юначай мары, што нечакана здзейсніліся* 143
*На старасці цвярдзее падушка пад галавой і мулкай становіцца пасцель* 143
*Настойлівасць – твар упартасці, настырнасць – яе рукі* 155, 296
*Настрой – / як салавей світальнай парой, / На промні ўсмешкі гушкаецца* 215
*На струнах абарваных / гімна шчасцю / маэстра, самы слынны, / не сыграе* 198
*На тое круча, / каб ведаць, як падаць уніз балюча...* 231
*Натоўп не верыць у шчырасць слёз* 342
*Натхненне – кропелька, а не струмень. І гэтай кропляй смагі не спатоліш* 198
*На ўсё была свая прычына / І адпаведная часіна* 391
*На філасофскі часам лад / Настроіш думкі ты ў самоце* 274
*На хісткай кладцы ты не пахісніся, / Калі прайсці патрэбна напрасткі* 155
*Нацыянальная псіхалогія, і склад мыслення, і пачуццё мовы – гэта тое, што даецца як бы ад нараджэння, як бы з малаком маткі* 274

*Нацыя, / Якая пакорна маўчыць, / Якая забыла пра годнасць, /Якая не ўмее / Нічым даражыць: / Ні краем, / Ні словам родным, / Якая памерці згодна, – / Ці мае права / Нацыяй быць?!* 58

*Нашай існасці кволай пылінку / Затрымае жыццё на хвілінку, / Каб навечна аддаць небыццю* 376

*На шалях / Унутранай раўнавагі / Ураўнаважваеш Паражнечу / і Паўнату / І нікому / Не прызнаешся, чаму / Не пераважвае шаля / Шалі* 222

*Наш Край злажыў даволі ўжо ахвяраў, / каб выпесціць і ўбачыць свет зары!..* 255

*Наш лёс на смерць падобны, / калі ў ім змаўкае струна* 102

*На шляхах у былое /Няма поступу ўперад* 102, 150

*Наш самы строгі кат – сумленне, / Што суд найправедны вяршыць: / Непакараных – на каленях / Усё жыццё прымусіць жыць* 342

*Нашто ва ўсю трубу трубіць / Аб тым, як іншых судзіш строга. / Ты хочаш свет перарабіць? / Дык пачынай з сябе самога!* 45

*Нашто нямое слова, / Калі гаворыць дух?!* 274, 326

*Нашто ты, хлопча мой каханы, / Украў яйцо з-пад япрука?* 232

*Нашы здабыткі і страты не маюць нейкай паасобнасці ці непадзельнай з намі цаны* 237, 391

*Не абняць / Ніколі неабдымнае...* 296

*Неабходна скарачацца да такой сціспласці і арганічнасці, як гэта ўмее рабіць кропля вады: у адной адбіваецца свет, дзве – расплываюцца, а ўвесь сусветны акіян уяўляе адну вялізную кроплю* 198

*Не адбірайце хлеба ў вераб'я – / Падданага паветранай краіны!..* 342

*Не адгародзішся харомамі, / Калі жыццё – сусветным выганам* 376

*Не аддавай сябе самоце, / Заўчасна ёй не саступай* 215

*Не адказвай на брэх сабакі, / Калі цябе кліча ворыва; / Не адказвай на брэх сабачы, / Калі цябе кліча поліва* 309

*Не адкладвайце на потым / добрых спраў, / Не адкладвайце на потым / справядлівасці* 309

*Не ад куль – / Часцей мы падаем ад слоў, / Кулі словамі апрануты, / як плаццем, / Невыносную цаной людскіх / галоў / За маўчанне палахлівае мы / плацім* 274

*Не аднаго на свеце мастака / Зазнайства загубіла. / Яно для таленту – магіла* 232

*Не адрокся Бог ад Беларусі* 255, 326

*Не аслабяцца рукі на полі, / Калі поўна надзеі душа* 174

*Не баіцца дабро знікання. / Не мутнее ў крыніцы вада* 222

*Не бараніце яго дужа: / Дзе ёсць дымок, агонь там ёсць* 391

*Не бойся / Піць гора з поўнага каўша. / Зірні ў самотныя нябёсы, / Каб усміхнулася душа* 326

*Не бойся слова гучнага – прарок! – / Прарок не Бога – праўды слых і зрок* 274

*Не будзем, крый Бог, параўноўвацца, аднак, дзеля патрэбнага часам супакаення ад залішняга самаедства, успомнім чалавечую складанасць і вялікіх, у каго мы вучымся* 45

*Не будзь, справядлівасць, зялёнай наіўнасцю, / Калі, нібы кактусы, выстаяць хочаш* 222

*Не буду мяняцца, хоць бы і на за́мкі, – / Калок свой мілейшы, як чужыя клямкі* 245

*Не бывае бязгрэшных людзей, / Не бывае бязгрэшных паэтаў* 198

*Не бывае рознай праўды – рознай бывае хлусня. Зменлівая і здольная мяняць сваю скульптуру ў адпаведнасці са зменлівымі ўмовамі жыцця* 296

*Не бывае хлеба, / Калі не зжаць у тэрмін збажыну* 182

*Не было і не будзе ніколі, / Каб хадзіў ясны месяц назад* 296

*Не быць у чэрствасці ў палоне / І даражыць на ўсе часы / І крошкай хлеба на далоні, / І нават кропляю расы* 309

*Не бядней мы за славутыя еўропы, – / проста надта заклапочаны народ... / Нам баляць усе патравы і патопы, / і шкадуем мы сябе на ўсякі зброд* 71, 255

*Не важна, хто ты – хлебароб, паэт, / Адно на ўсіх людзей зямное шчасце. / Галоўнае, які пакінеш след, – / Па ім ступаць далей твайму нашчадку* 146

*Не валодаючы целам, / Не авалодаеш душой* 326

*Не ведае каханне плагіяту* 118

*Не ведае межаў Краса* 347

*Не век, не два шукаем шлях да неба, / хоць знаем: неба ў кожнага сваё* 326

*Не вернеш / Адданасць пад прымусам. / Ды веру ў сілу зерня, / Што ў душах беларусаў* 256

*Не верце гладзенькай дарозе, / Бо, часам, не туды вядзе* 353

*Не верце, калі хто скажа, што хоць адна дарога ў жыцці лёгкая* 353

*Не вечны чалавек, / яго ж памкненні вечныя* 403

*Не вінаваты высакосны год, / Што пражыта бедаў да сканання...* 296

*Не вініць мне цябе, не забыць, / Не звязаць абарваныя ніці. / Проста моц ты адняў, каб любіць. / І бяссілля не даў – ненавідзець* 118

*Не водзяць да царквы любоў і страх за рукі, – / Хто ісціну шукаў – век ходзіць без прынукі* 118, 296

*Не выклікай / да сябе шкадавання, / Лепш выклікай / на сябе агонь!..* 59

*Не выпадае, не выпадае / Вылічыць долю* 102

*Не вырвеш з нас жывую нашу душу, /Бы з дзяснаў слабых набалелы зуб, / Бо мы народ вялікі, непарушны, / Народ, што да зямлі прырос, як дуб* 256

*Невычэрпна гэта і невыказна – сутыкненне чысціні, нявіннасці, права на шчасце, на праўду, сутыкненне маленства з лютасцю, чэрствасцю, тупасцю, подласцю дарослых, якія займаюцца не тым, чым чалавеку трэба займацца* 140

*Не вяртаецца ў неба / Раскуты прамень* 297

*Не гаспадар злы – кажа ўсякі, – / А гаспадарскія сабакі* 45

*Не гіне род майстроў нажывы, /А я малюся аб адным: /Не дай мне, божа, стаць ілжывым, / Зайздросным, злосным і старым* 232

*Не глядзі ў люстэрка апоўначы, / бо растанеш у ім, / як солі драбінка / ў студні* 337

*Не грэюць сэрца зорныя агні, / Калі надзеі адбірае скруха* 349

*Не дай вам бог з нялюбай цалавацца, / Сваю сям'ю чужому пакідаць. / І ад зямлі – не дай вам! – адарвацца, / А галавою – неба не дастаць!* 326

*Не дай мне Бог духоўным стаць бадзягам, / Без памяці жывой, без каранёў* 326

*Не дапаможа і дождж раскошны – / Скошанай траве* 82

*Недарэчна з угатаванай меркай падыходзіць да таго, што інакшае* 392

*Не для ўсіх адчыняюцца дзверы, / што вы пнецеся, містэр Форд!* 392

*Не журыся, хлапеча, / Што памрэш не на печы. / Ганарыся, хлапеча, / Што загінеш у сечы* 376

*Не журыся, што час адлятае, / Толькі хай праз мяне ён ляціць, / І ў прадонне душы ападае / З яго тое, што можа свяціць* 403

*Не жыць як набяжыць, / А кожны дзень жыць годна, / Ахвярна і турботна, / Без зайздрасці ў душы* 94

*Не загаснуць зоркі ў небе, / Покі неба будзе!* 297

*Не загіне край забраны, / Покі жывы людзі!* 245

*Не запірайце душу на завалы, / не замыкайце!* 326

*Не заўжды ўспаміны нам апора* 150

*Не збыць да скону рабскую работу: / Свайго народа выслухаць душу* 326

*Не збярэш ураджаю / Там, дзе градам пасекла* 174

*Не звязвайце натруджаныя крыллі, / Яны спазналі – досць! – вышынь і мук* 159

*Незлічонае мноства дробязей. Можна іх пазнаваць, не пазнаваць, зноў пазнаваць – усё роўна для пазнавання іх не паменшае* 337

*Не змізарнець бы на вяку, / Не зблоцілася б глеба тая, / Дзе і крынічка б'е, пакуль / Рака плыве і не сплывае* 337

*Не знішчым мы, не страцім, / не загубім / Сваіх азёр, лугоў, сваіх лясоў / І родны край і мову не разлюбім* 256

*Не з пацукамі, не з кратáмі / вяршыні знаюцца – з арламі* 337

*Не з суглінак душа, не з цаглінак* 327

*Не з чаркі – з сэрца роднага народа, / пяюнне-мова, / п'ю цябе да дна* 274

*Некаторыя пісьменнікі вельмі не любяць, калі крытыкі называюць сябе чытачамі ў першую чаргу* 198

*Не кіньце каменем – / у неба Памяці. / У неба прыязні. / У неба даверу. / У неба любові, / у неба надзей / не кіньце каменем* 309

*Не кожнаму дадзена шчасце / Зямлю і сябе зразумець...* 119

*Не кожны кірунак ад сонца праменны, / не кожны дарунак глядзіцца святым...* 327

*Не кроч на сцежкі бакавыя – / Ямчэй сказаць, паменш зрабіць, – / Бяры адказ сабе на шыю, / Не на сяброўскія гарбы* 108

*Не крычыце «ўра!», калі дзеці спяць* 166

*Нельга есці хлеб народа і грэбаваць ягонай мовай* 274

*Нельга жыць, як нямыя камяні, / Што з ляжачай, халоднай радні* 94

*Нельга матак суцяшаць, / Калі яны галосяць па сынах...* 134

*Нельга маўчаць, калі людзі не дрэвы, / Памёршым замоўкнуць, жывым гаварыць. / Не крочыць зямлёю ў хістанні няпэўным, / А горда, з дастойнасцю жыць і тварыць!* 376

*Нельга параўноўваць двух пісьменнікаў. Яны заўсёды непараўнальныя, як і два светы* 198

*Нельга прыдумваць сабе стыль. Твор павінен сам па сабе, нязмушана выліцца з твае душы. Гэта і будзе тваім стылем* 198

*Нельга ўкараніць у народ чужароднае – у якой бы ўпакоўцы яно ні прапаноўвалася* 71

*Не любіся з дзеўкамі ў жыце / і ў красках не любіся, / бо колькі каласоў зломіш – / столькі людзей / ад голаду сканае, / а колькі красак звяне – / столькі дзетак / на свет не народзіцца* 309

*Не любіць творчасць спрату, / Не толькі ёсць учора, ёсць і заўтра, / Не толькі ёсць здабыткі, ёсць і страты!* 198

*Не лю́біць Час ілжэімён* 403

*Не магу цярпець я верхаглядаў, / Верхалазам – тысяча пашан* 146

*Немагчыма / Адолець прыцяжэнне часу* 403

*Не мае граніц людская злосць, і лёгка кінуць чорную пляму на добрае імя чалавека* 232
*Не мае Памяць межаў і граніц, / Яна пульсуе ў кожным рададводзе* 150
*Не Марс да нас – / а мы, сябры, цяпер бліжэй да Марса* 83
*Немінучы / паэт неўміручы; / ён – не рэха, ён – голас і зрок!* 198
*Не можа быць станоўчы герой без нейкага свайго болю* 199
*Не можа ўратаваць / Саломінка ў віры жыцця тапельца* 199, 337
*Не, мы – не лісце на вятрах,* 59
*Не мяняй свой кут на прастору чужую, / У прасторы чужой птушка гнёзды не ўе, / Пі ваду са свайго вадазбору і тую, / Што цячэ дамавіта са студні твае* 245
*Не мяняйце сяброў жывых. / А тым болей – сяброў памёрлых* 108
*Не надзявай аброць / На пачуццё і поўнай меркай мерай / Для ўсіх людзей і радасць і дабро* 119
*Не называйце экстрэмістамі / народы...* 71
*Не, на каханне ланцугоў няма* 119
*Не наракаю на люстэрка: / У ім, на жаль, адбітак мой* 297
*Не на тое свеціць сонца – цені каб цяніці* 82
*Не на ўцеху слава, калі не з дабра* 169
*Не, не будзе Радзіма страчана, / Калі маці мову нясуць / І па слоўку, па гуку – у спадчыну, / Як дыханне, дзецям даюць* 274
*Не, не здаволіш чалавека, / І будзе вечна ён калека: / Чагонібудзь, а будзе брак* 45
*Не па адзенні чалавека цэнім, / Разумным лічым не за горы кніг* 45

*Не пагарджаць святым сваім мінулым, / А заслужыць яшчэ, і вартым быць яго* 150

*Не падсумоўвай пакварталънай зводкаю / Таго, што вымяраецца радком* 199

*Не падсякай / Любові карані, / Не падмінай / У гневе сам самога* 232

*Не падуладна толькі слова / Халоднай пэўнасці акоў* 159, 275

*Непазбежны / паэт незалежны, / мужны, гожы, яскравы паэт* 199

*Не па каменні носіцца бяда, / Але і радасць ходзіць жа – па людзях* 349

*Не памагайце, калі не просяць, / І не прыходзьце, калі не клічуць* 309

*Не паміраюць ад кахання, / А паміраюць без яго* 119

*Не памыляецца наканаванасць* 102

*Непатрэбнае ўчора назаўтра патрэбным здаецца; / Неабходнае сёння губляе свой кошт неўзабаве; / Так букеты святочныя ператвараюцца ў смецце, / А насенне чакае ў зямлі, спадзяецца на травень* 338

*Не, паэзія не хлеб надзённы, але – н а д д з ё н н ы. Да яе нельга прывыкнуць, і калі прывыкаюць – перастаюць разумець* 199

*Непаэты марудна гараць, / А паэты імгненна згараюць* 199

*Не пераживеш нікога злосцю. / Перамога чыніцца міласцю* 166

*Не перапішаш лёс на чыставік, / Праверыўшы як след чарнавікамі* 102

*Не помсці за крыўды, плаці лепш дабром, – / Не з кожнай маланкай сябруе і гром* 309

*Не прагнучы ўзнагароды, / Штогод / у людскую кроў / Упарта пампуе прырода / Сілу, / веру, / любоў* 83

*Не прадаецца міг натхнення, / Ды можна рукапіс прадаць* 199

*Не прадайце за цёрты долар / Край, які вам з маленства дораг./ Знайце: новаму не бываць. / Вам у свеце тады – / Бамжаваць* 245

*Не прарасце быльнёг, / Дзе ёсць душа і воля!* 327

*Не прашу прывала, / Апроч таго, што суджана усім* 376

*Непрыгожых жанчын не бывае, / Проста шмат невідушчых мужчын* 127

*Не прыдумаць цяплейшага краю / за родную песню* 288

*Не прызначай / сустрэчы на хаўтурах, / не замуці сірочае слязы* 309

*Не прыйдзе шчасце без прычыны, / Без мужнасці не выстаіць баец, / Без гора не прарэжуцца маршчыны, / Без веры не загоіцца рубец* 119, 297

*Не прыпыняйся, не жахайся, слова!.. / Хай адвячорак доўгім ценем лёг – / Магчыма немагчымая размова / Датуль, пакуль магчымы маналог* 275

*Не прыстаць, / Не здарожыцца, / Не звярнуць на пярэдых, спачын, / Не пакінуць абурана, / За сабою не ляпнуць дзвярыма, як векам...* 147

*Не прыходзіць рака / У абдымкі вытоку* 296

*Не прычакаўшы ласкі і пахвал, / Паэты паміраюць маладымі* 199

*Не рабіце з людзей багоў. / Хай людзьмі застаюцца людзі* 327

*Не разбурай п'едэсталаў, усё роўна на іх нехта павінен стаяць* 309

*Не разбурай страху над галавой, / Бо сёння сонца, заўтра ж – / Дождж пальецца...* 310

*Не разбурай таго, што ёсць* 310

*Не разумее слоў адна стыхія* 275

*Неразумны ў мудрага сэрца будзе рабом* 310

*Не расці, палыне, пры чужой нядолі, / Не шукай, разлука, трох дарог у полі* 102

*Не родзіцца мудрае слова, / Калі не радзіўся мудрэц* 275

*Не роўны дрэвы ў баравінах, / І ў лузе розная трава* 83

*Не рызыкуе скруціць галаву толькі слімак, які па лісце поўзае...* 376

*Не саступай з абранае дарогі. / Пакуль жывы, / Жыві!* 376

*Не скончаны дзень тварэння: зноўку і зноў вылеплівае чалавек сваю лепшую долю* 102

*Не слава, не гонар людзей забіваць, / Моц павялічваць з цярпенняў...* 166

*Не смей, як кот халуйскі, прыніжацца... / Свой дабрабыт, аўтарытэт стварай / Не ўгодніцтвам, а працай* 174

*Не спадзявайся на пракрокаў – / Будзь сам пракрокам, чалавек* 45

*Не спазніся, наша навальніца, / Высакосным ліўнем* 179

*Не спі, калі сонца сядае, / бо заснеш з ім разам, / а ўранні ўжо не прачнешся* 310

*Не справа мужчын – / страхавацца, хавацца, / не справа мужчын – / баяцца, дрыжаць* 155

*Не спыніцца ў гонцы, / Ні зблізку не разгледзець, ні здаля – / Хто спрынтэры і хто тут марафонцы...*357

*Не спявай пра цёплы кут за грубай, / Пакуль горам поўніцца зямля* 71

*Не срэбра шчырае, шчырае слова – / Галоўны скарб наш у свеце часовым* 275

*Не стаў сабе дачасна помнік / І ў неўміручасць не спяшы* 310

*Не стацца юдам – гэта ўжо нямала* 392

*Не стварайце сабе багоў!* 310

*Не страціш сутнасці сваёй – / Тварыць і сам перастварацца... / Зжыві сябе – каб іншым жыць* 94, 377

*Не страшна мне, бо я – кахаю, / Не скрушна мне, бо я – люблю* 119

*Не ступай у чужыя сляды / На бацькоўскай зямлі запаветнай* 310

*Не судзі чалавека, калі не жывеш адным з ім жыццём* 71

*Не таго патрэбна славіць, / Хто на лёдзе замкі ставіць* 169 310

*Не так жыць, як дажываць* 377

*Не тапчыце калыску дзяцей. / У крыві не тапіце надзей* 166

*Не, творчасць не гульня, гэта – такі «сур'ёз», у параўнанні з якім само надзённае жыццё ўяўляецца гульнёю* 199

*Не тое лепшае, што навейшае, / А тое лепшае, што раднейшае. / Не тое лепшае, што вышэйшае, / А тое лепшае, што бліжэйшае. / Не тое лепшае, што прыгажэйшае, / А тое лепшае, што даражэйшае!..* 310 392

*Не тое пярцо, не тое крыльцо / У сокала, як у голуба* 296, 392

*Не, той не памірае, / каго вядзе дух / дзярзання і парывання* 377

*Не толькі мы работу робім, / А і работа робіць нас* 174

*Не трэба бяду забываць, / Каб сувязі нітку жывую / Шчаслівай парой не парваць* 334

*Не трэба з тонкай пекнатою / Жанчынам ля гармат хадзіць. / Вады не трэба, калі ёю / Толькі параненых / Паіць!* 127

*Не трэба, каб усе мяне любілі, / Бо і сама камусь сказала: «Не!»* 119

*Не трэба нам за трыдзевяць зямель, / Вада жывая – у старонцы роднай* 245, 256

*Не трэба слава толькі тая, / Якую носяць на штыках...* 169

*Не трэба спаць у шапку і чакаць, покі табе пчолы на спіну не сядуць* 174

*Не трэба хіміяй фарсіць, / А трэба з лёну ды аўчыны / На целе вопратку насіць!..* 310

*Не трызняць бяссрэбранікі серабром* 297

*Не, ты не вечны, чалавек! / І у цябе не многа часу. / Дык думак добрыя запасы / У доўгі не кладзі засек* 403

*Не ўзнікне прызыўная песня, / Калі анямее пясняр* 199, 288

*Не ў паспешлівай славе / Я цяпер пазнаю / На жыццё свае права, / Неабходнасць сваю* 94

*Не ўсе хочуць быць добрымі, / ды хочуць усе дабраты* 222

*Не ўсе, хто крылы мае, / Могуць падымацца і лятаць* 392

*Не ўсё аднолькавага крою, / Што намі створана ў жыцці!* 392

*Не ўсё мінулае мілей / Таго, што здарыцца, / Што будзе!* 403

*Не ўсё – на кўплю, не на ўсё ёсць хабар* 392

*Не ўсё страчана безнадзейна, але ўсё безнадзейнае страчана* 392

*Не ўсё ўслаўляй, што явай стала, / Пішы аб тым, што ўсхвалявала* 199

*Не ўсё, што расце, для яды, і ўсё, што расце, расце не адною ядою* 83

*Не ўсім аднолькава / І сонца свеціць, / Ды ўсіх, не супыняючы хады, / Прырода падсілкуе, і прывеціць, / І забярэ з сабою назаўжды* 83

*Не ўсякая шыя вартая,/ Каб меч тупіць аб яе* 166

*Не ўсяму прапасці – / Чаму з воза ўпасці* 83

*Не ўцячы жывому ад долі. / Жыццё, як і жытні хлеб, / Не прыядаецца ніколі* 377

*Не ўчарашнім днём жыву на свеце – / Велічнай наступнасцю жыву* 94

*Не хавайце ў магілу мовы, / Сваіх звычаяў і імя, / Крывічы мы, род ганаровы, / І не зроджаны да ярма* 59

*Не хараствоm для хараства жыве душа паэта* 199

*Не хачу дажыць часоў, / Калі плечы ад гадоў сагнуцца / І з усіх маіх былых сяброў / Толькі дзве далоні застануцца* 143

*Не хачу між калоссяў / быць коласам тым, / Што часамі ўзрастае без зерня* 174

*Не хачу ў нябёсы дыму воблачкам, / Мне б ў зямлю, / сваю зямлю сысці* 377

*Не хітрасць – прысягнуць, / А мудрасць – дасягнуць* 310

*Не хлебам, а небам / паэты жывуць...* 199

*Не хоча, не стане, не будзе Айчына царквой на крыві!* 245

*Нецалаваных на зямлі няма. / І хітрыя жанчыны і дзяўчаткі / У сэрцах носяць свой сакрэтны май / І пацалункаў вечныя пячаткі* 119

*Не цалуе Іуда, / Не вядуць да крыжа, / Мой ланцуг непрыкуты / Есць паволі іржа* 377

*Не цурайцесь роднай песні ў шчасці і ў жалобе* 288

*Не цяжка травінцы / расінку трымаць* 338

*Не цяплее душа / Ля цяпельца чужога, / Каласіцца туга / На чужой араллі* 245

*Не часта даецца, каб чужое слова кранулася дна душы* 275

*Нешта выспявае ў душы кожнага чалавека. Прабіваецца выток спасціжэння жыцця. Толькі як падняць усё гэта ў людзях? Бо тое, што носіш у сабе, пры табе толькі застаецца* 327

*Не шукай на свеце нейкую падкову, /Што прыносіць шчасце і знішчае злосць. / Не чакай ад неба цудаў і спакою, / Ведай: / На Зямлі ты – гаспадар, не госць,* 46

*Не шукай ракі малочнай. / І не шукай кісельных берагоў* 175

*Не шукай сабе, мой братку, / З ветрам Бацькаўшчынуматку* 245, 256

*Не шукай сваіх сярод чужых, / Роднымі не зробяцца чужыя. / І чужая йголка не прышые / Латку радасці да сноў былых* 134

*Не шукай ты шчасця, долі / На чужым далёкім полі* 245

*Не шуршаць паперы / Пад даклад пусты* 392

*Не я пяю – народ божы / Даў мне ў песні лад прыгожы* 200, 288

*Ні адна дарога не прыйшла назад* 353

*Ні адна разлука не прыйшла назад* 108

*Ні болей, ні меней: жывое слова, / Слова інакшым не можа быць. / Іначай што яно можа зрабіць? / Іначай не зерне яно, а палова* 275

*Нібы дэльфіны, дзеці ад напасці / свет, як тапельца, вынесуць на бераг / усеагульнай еднасці і шчасця* 134

*Нібы маці, берагчы / Працаўніцу нашу – мову, /Бо яна – жыцця зачын / І пачатак песні новай* 275

*Ні вядзьмар, ні ліхія ваўкі / не страшныя, як брат твой людскі...* 134

*Ні дар, ні спрыт, ні навык / Не дапаможа, калі спіць душа* 327

*Нідзе і ніколі / Я не бачыў яшчэ непрыгожых дзяцей* 134

*Нідзе / так доўга / сляды / не застаюцца, / Як на душы!* 147

*Нізкая душа, вырваўшыся з-пад прыгнёту, прыгнятае сама* 327

*Нізкая душа, дарваўшыся да ўлады, рада помсціць кожнаму, хто перад ёй у нечым «вінаваты»* 327

*Нікога, / хто ў гэты свет прыходзіць, / не абыходзіць доля: / атрымліваюць усе без вынятку / два найвялікшыя падарункі – / жыццё і смерць* 102, 377

*Ніколі не бываю адзінокім, / Бо мары не згарэлі ўсе да тла* 215

*Ніколі не выспее яблык дачасна* 83

*Ніколі не збочваць з дарогі – / зайздросная доля. / Ды хай не міне цябе доля / дарогу губляць* 103, 353

*Ніколі не страціць для нас цікавасці чалавек, бо праяўленне яго розуму бязмежна, бо дарогі яго не вызначаны, бо формы яго жыцця і яго адносіны да другіх людзей бясконца разнастайныя, канчаткова не выяўлены* 46

*Ніколі не трэба папраўляць час, праўда астаецца заўсёды за ім* 403

*Ніколі Радзіма не спіша / у бестэрміновы запас* 245

*Ні прага славы Слова не народзіць, / ні мітусня, ні лоўкая хлусня* 275

*Ні сабе, ні камусьці ў блуканнях / Не пасвецяць ні поблізу, ані здалёк / Пераслеплыя да шкадавання* 108

*Ні славы, ні скарбаў я не хачу, / Мне б толькі прайсці непрыкметна, / Зямлю сваю пад нагамі адчуць, / Надыхацца родным паветрам* 246

*Ніхто з граніц сваіх не выйдзе, / З законаў, жыццем напісаных* 94

*Ніхто з нас бацькаўшчыны не выбірае, / Як не выбірае маці ў жыцці* 246

*Ніхто, нават Цар, не можа зрабіць так, каб сонца заходзіла часцей, чым яно ўзыходзіць* 297

*Ніхто не даруе нам крыўды і слёз – / Адплаціцца ўсё і адплачацца* 222

*Ніхто не мае права жыць з Паэтам, / кахаць, пакутаваць і раўнаваць яго* 200

*Ніхто не мае права мець Паэта, / рабіць яго паяцам пры двары* 200

*Ніхто не стане на зямлі прарокам, / Калі баіцца, што ўсё выйдзе бокам* 200

*Ніхто не чуў на свеце штосьці, / Каб стаў гусак арлом хаця б ад злосці!* 297

*Ніхто так не баіцца дэмакратыі, як мешчанін. Для яго дэмакратыя – няпэўнасць. А ён любіць толькі пэўную сітуацыю* 159

*Ніхто ўраджай не пажынаў з пагроз / Ні ў маладым і ні ў старым узросце* 175

*Ніхто чалавека не тыраніць больш, чым ён сам сябе* 46

*Нічога вечнага на свеце / Няма для шумнага жыцця, / Здарэнні, многія сталецці / Ідуць пад века забыцця* 403

*Нічога не важыць / забытая вера* 327

*Нічога не паўтараецца ў жыцці двойчы. Як дрэва, што, бывае, знячэўку зломіш... Парастак пусціць, але гэта ўжо не тое дрэва, што было...* 377

*Нічога так не ўзнімае дух, як нечакана знойдзены на вуліцы рубель* 327
*Нічога ў свеце больш няма / Мацней людскога розуму* 311
*Нічога чорнага ў прыродзе не бывае* 83
*Нішто – кароль без каваля, / І ўсё – каваль без караля* 46
*Ні штормы, / ні смерчы да дна / Не ўздыбяць / глыбокае мора* 83
*Нішто / так моцна / не апякае, / Як крыўды сляза!* 232
*Нішто так не калечыць хату, як смерць гаспадароў* 134
*Нішто ў чалавеку такім безаглядна-шчырым не бывае, як пачуццё кахання* 119
*Ніякага глупства, ніякага свінства з боку чалавека, што дапускае ён у адносінах да іншых, жыццё не даруе* 72
*Ніякай сіле, ліху злому / У сэрцы маці не забіць / Надзею: даць працяг жывому! / Надзею: песціць і любіць!* 134
*Ніякіх скідак на імклівы век! / Душа не знойдзе аніякіх лекаў, / Калі ў жалезным веку чалавек / Не будзе заставацца Чалавекам* 46, 403
*Новае з праху / не ўзыдзе ніколі* 297
*Новы друг – знаходка рэдкая, а стары – каштоўнасць* 108
*Новы час непатрэбнае крышыць. / Наша ж мова, як вечнасці ніць, / з праславянскіх крыніц і узвышшаў / красаваць з намі будзе і жыць* 275, 404
*Нявесце пры бацьках і дзень як год, / А сіраце жаніцца – ноч кароткая* 134
*Нягодны ўнуку ўжо тварэнні, / Якія меў на ўслугах дзед* 134
*Нязгасным – / асанна!* 311, 327
*Няма амністыі пачуццям, яны без скідак на гады* 119
*Няма гармоніі, дый годзе: / да чысціні ўсё ліпне бруд. / А Гулівера часта водзіць / за нос / духоўны ліліпут* 327

*Няма гордасці за самога сябе, ёсць гордасць за другіх, каб, гледзячы на іх, ніколі не таміцца жыць* 59, 377

*Няма горшай агіды, чым хвальба ў час чумы* 232

*Няма дарогі да шчасця, ёсць дарога да ісціны* 119, 297, 353

*Няма для духа вольнага граніцы, меры* 159, 328

*Няма звароту у маленства... / А хвалі – блізкая радня – / завабяць, знойдуць падабенства... / Але гняце нас глыбіня – / няма звароту у маленства* 377

*Няма іншай мудрасці для нас, чалавекаў, акрамя той, што трэба быць па-чалавечы добрым і мужным, – у часы бурнаплыннай маладосці і на марудлівым сконе дзён* 311

*Нямала дзеячоў такога ж ліку – / У справах выцікі з яйцо, а крыку...* 392

*Нямала ёсць правадыроў, / Якія любяць люд працоўны / За тое толькі, безумоўна, / Што любяць яго кроў* 72

*Няма на зямлі небыцця: / Будзе вечна пад сонцам грацць / Залатое кола жыцця* 378

*Няма на свеце горшага ліха, / Як самотным жыць і самотным сканаць* 378

*Няма на свеце такога невясёлага становішча, дзе б вясёлыя людзі не знайшлі сабе весялосці* 46

*Няма на свеце такой сілы, над каторай не было б большае сілы* 155, 392

*Няма нічога благога ў тым, калі чалавек ступае на адну і тую ж сцежку двойчы і калі на яго ад гэтага находзяць успаміны* 150

*Няма нічога, кром жыцця і смерці. / Шлях праўды не закончыцца на мне* 378

*Няма патрэбы хваліцца тым, што ад пачатку і назаўсёды твае* 297, 311

*Няма прасторы для душы, / А цэлы свет – / прастора* 328

*Няма пытання: / «Быць або не быць?» / І лёгка дыхаецца ўсёй планеце, / Пакуль блакіт калышуць галубы, / Малююць сонца на асфальце дзеці* 166

*Няма Радзімы ў злыдняў хіжых / І Маці ў нелюдзяў – няма* 246

*Няма раднейшага, чым родны кут* 246

*Няма святла, няма кахання* 120

*Няма сумлення – няма і чалавека* 342

*Няма сцежкі карацейшай, / Як да мілай* 120

*Няма таго зелля, / Што хоць на міг ад тугі па Айчыне вылечвае* 246

*Няма такога пісьменніка, які б не жадаў мець музей свайго імя. Ілепш яшчэ пры жыцці* 200

*Няма такой заплаты, што дае забыццё ад здрады* 232

*Няма чаго мянціць языкам, / А крык, як быў, і будзе крыкам* 276

*Няма чаго чакаць панукі, / Калі работы поўны рукі* 175

*Няма шляхоў да самазахавання, / Няма дарог да светазабыцця / У час ліхі ўзаемапалявання / Сіл супрацьлеглых: смерці і жыцця* 378

*Няможна жыць, / Зусім няможна жыць без Беларусі* 256

*Няможна патураць тузе, / Каб яву засланіла зданню, / Каб зрабавала пакрысе, / Што скарбавалася гадамі* 216

*Нянавісць асляпляе відушчага і дае зрок невідушчаму* 232

*Нярэдка яшчэ, ілюзіям верачы, / прымаем за веліч мы манію велічы. / Хоць гэта зусім розныя рэчы: / друг і вораг чалавечы* 338

*Няўжо ж тая песня спета, / І ёй водгулля няма?* 288

*Няўжо ж ты, божачка, пчале і мурашцы даў больш розуму і лепшую душу, як чалавеку?* 328
*Няўжо мы пішам для бязродных, / А ці чытаем для глухіх?* 200
*Няўжо наш век аглухне і адвернецца / Ад гэтых песень, што спявае мама?* 288
*Няўжо я, дзівак, спадзяюся / Другую радзіму адкрыць, / Як быццам бы без Беларусі / Змагу я і дыхаць і жыць* 256
*Няўмысную крыўду грахом не лічу...* 232
*Няхай галодная – ды воля, / Чым сытая – але турма!* 159
*Няхай дзьме добры вецер / І дзьме на наш касцёр* 83
*Няхай душу не пудзіць / Зняверанасці тля. / За праўду стойце, людзі, – / І ўспомніць вас Зямля* 298
*Няхай душу нянавісць не спустошыць, / Пакуль жыве ў грудзях любоў* 328
*Няхай жыве бязбожнік малады! – / не грэх і паўтарыць нам заклік / весні, – / але няхай ён моліцца заўжды / свайму сярпу, і коласу, і песні* 262
*Няхай жыве, заўжды жыве / жаданая свабода духу!* 160
*Няхай жыве няведанне – яно, / адно яно не ўмее памыляцца* 298
*Няхай жыве ў душы былое – / не дробнае і не малое!..* 328
*Няхай іх лёс у песнях не апеты, / але куды б іх ні закінуў лёс, / дамоў, дамоў вяртаюцца паэты / садамі, звонам сосен і бяроз* 200
*Няхай красуе слова. Толькі слову, / Якое роўна сэрцу, сталі і агню, / Па праву першынство аддаць гатовы, / Як пасля ночы сонечнаму дню* 276
*Няхай не будзе больш згрызот / І змоўкнуць непрыязні словы!* 108

*Няхай родным словам шчасна / Загаворыць наш народ* 276
*Няхай твае паражэнні, гузакі і мазалі глыбока схаваны ад усіх, ты пра іх абавязаны памятаць заўсёды* 150
*Няхай шалее ў злосці Мураўёў – / Не вечныя на свеце мураўёвы* 232
*Няхай штодзень на стол, / як на прастол, /Каронаю ўзыходзіць бохан хлеба!* 182
*Няшчасце яднае людзей, абуджаючы ў душах тыя пачуцці і думкі, якія даюць надзею на святлейшую будучыню чалавецтва* 334

*О Беларусь! Ты – сэрца і душа, / Нутра зямлі багаты клунак* 256
*О Беларусь!.. / Я нарадзіўся ў тваёй хаце, / і лёс мне суджаны адзін: / Ты мне не мачыха, а – маці, / І я заўжды твой родны сын!* 256
*О Божа, дай мне сілы не змяніць / Таго, чаго змяніць не ў сіле я... / І дай мне мудрасці, каб разлічыць, / Што – не пад сілу мне, а што – мой абавязак...* 311
*О, боязь за другога чалавека!.. /Адна ты робіш чалавека з нас* 46, 108, 342
*О, гэта ідэал, каб людзі былі веліканамі ў душы* 72
*О, дзеці, дзеці! Дзе мне вочы дзець, / Каб вам у вашы вочы не глядзець?* 135
*Ой, многа, як многа / Для думак дарог! / Не спыніць іх лёту / Ніякі парог* 276
*Ой, тут здарылася драка... / Гусь пабілася з свіннёй!* 393
*О, каб маглі мы у мінуту страты / Вярнуць той час хаця б на дзень яшчэ!.. / Ды горка ўцямім, што насупраць скату, / Назад – ніколі рэчка не цячэ* 404
*О, калі б кожны памятаў, што вечны ён!* 378

*О, колькі званняў з лёгкае рукі, / Не разбіраючы, мы шчодра надавалі, / Хоць ведалі, што будуць хваляваць вякі / Народныя без звання мастакі – / І кавалі, / і сейбіты, / і ткаллі...* 200

*О, колькі можа нам жанчына / Сказаць у песні – пра сябе!* 127, 288

*О, краю мой! Шчаслівы лёс – плаціць любоўю, / Табе і жыць – адною ёй* 246

*О, краю родны! Чым стрымаеш, / Адвернеш лёс свой ад пятлі, / Калі заступніка не маеш / Ні ў небе ты, ні на зямлі?* 103

*О, лепей дні пакончыць на полі баявым, / Ніж век глытаць ў кайданах чужынскіх вогнішч дым!* 160

*О, маладосць! Як бы мы жылі, калі б тое, што спазнаём пасля, спазналі раней!..* 143

*О, мацярынства мацярык нязнаны. / Яго заўсёды адкрываюць нанава* 135

*О, мова! / Ўсе, як магеланы, / К табе мы вернемся наўпрост, / Каб ты знайсці дапамагла нам / І ДОМ, / і МАЦІ, / і ПАГОСТ...* 276

*О, прастата, ды не святая! / Як ты далёка завяла / Падумаць толькі: ён пытае: / «За што любіць цябе, зямля?»* 262

*О, радзіма, мой светач цудоўны, адзіны, / Явар мой, мой агністы снягір на сасне...* 246

*О, сродкі сучасныя перамяшчэння, / Ці мне прыбывае свету ад вас?* 357

*О, ты Сальмон у нас вялікі, / Як на чытанне, так на лікі...* 46

*О, хітры свет на штукі здаўся!* 222

*О, як дажыць хацела б я / Да дня, калі змагу без болю / Аб Беларусі запяяць!* 256

*О, як жа вы ўсе, маці, ў час бяды / Падобны, як дзве кропелькі вады* 135

*О, як лёгка ісці, адчуваючы матчыны рукі, / Адчуваючы крылы юнацтва, / Адчуваючы плечы каханай! / І як цяжка цягнуцца, /Ў далонях трымаючы толькі кульбаку ўспамінаў* 135

*О, як трэба шукаць на шляхах чалавека, / Як любіць, берагчы, не крыўдзіць яго, / Каб пабачыць славу наступнага века / Ў сэрцы сціплага сына суседа свайго!* 46

***П**авага да роднай мовы заўсёды нараджае павагу да ўсіх без выключэння – вялікіх і маленькіх – моў свету* 276

*Павага – самае святое, / Бо людзей з нас лепіць на зямлі* 59

*Павага толькі з тым гатова знацца, / Хто ўмее плённай працай / Дабівацца / Узлёту, дасягненняў, росту* 59

*Павагу і добрае слова / У нашыя мірныя дні / Давайце вучыцца нанова, / Як хлеб у блакаду, цаніць!* 274

*Павагу не здабудзе / Сям'я, дзе культ валля. / Дзяцей гадуйце, людзі, – / І ўспомніць вас Зямля* 59

*Паважаю чужых багоў, / Ды прывыкла сваім маліцца* 328

*Павек не стане чорнай ганьбай / Любоў прасветлая мая!..* 120

*Па віду пан і ходзіць панам, / А спіць напэўна пад парканам* 222

*Павінна ў рэшце рэшт і на зямліцу / Быць красная, адменная цана!* 262, 393

*Паводка ачышчае лік зямлі* 89

*Пагавары са мной, / Зямля, вачамі* 262

*Падзея яднае* 103

*Падмурак ёсць. / Упарта / Будуйся да страхі, / Лічыць яшчэ не варта / Заслугі і грахі* 175

*Падробкай пад сумленнасць не хітрыце, / Падробка – смерць заўчасная дабра* 222

*Падснежнікавая пара, / Не дай астацца безгалосаю / Каля яднальнага кастра!* 108

*Пад халодным лёдам. / Крыніцы свежыя цякуць* 378

*Пад яркім лакам той жа тлен, / а не агонь – / жывы, свяшчэнны* 378

*Па зімах гадаюць пра лета, / Па з'явах – аб сэнсе падзей* 311

*Пазнаць не трудна чалавека / Па ўсіх паводзінах яго, – / Ці ён гультай, ці недарэка, / Ці не стае яму чаго* 47

*Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы: хто якую носе; ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы* 276

*Пайшоў пясняр, а песня засталася, / Памёр паэт, а песня будзе жыць* 200

*Пакаранне здымае віну, але права тое здабыць нялёгка* 222

*Пакідае праўда кут – / крыўда тут як тут* 298

*Пакідайце і буслу, і чайцы / больш вады і неба на душу* 83

*Пакінутая думка – гэта бессмяротнасць. Яе трэба занатоўваць перш на паперу* 276

*Пакінутым – жальба па сіле, / Няўдачнікам – зман адкрыцця* 216

*Пакінуць радзіму – цяжкое злачынства* 246

*Пакінь адну пасаду – / Быць Чалавекам на зямлі* 47

*Пакіньма напуста на лёс свой наракаць, / Скрозь слёзы скаргі сеяць па зямлі, – / Нам трэба жыць і долю папраўляць, / Каб нас патомкі з часам не клялі* 103, 151

*Пакіньма спадчыну мы для патомкаў / Інакшую ад той, / Што узялі ад продкаў на абломках / Гісторыі сваёй* 151

*Пакіньце цішу вуснам і вачам, / Аддайце неба зорам і каханым* 120

*Пакліч – былое адгукнецца / Жалейкаю за хваіной; / Скраніся – і важкой хадой / Наступнае ў паход кранецца* 151

*Пакрыўдзіцца можна на таго, каго паважаеш* 232

*Пакуль баліць душа, / З надзеяй / Можа біцца сэрца* 328

*Пакуль будуць жанчыны, / Не змоўкнуць паэты, / Пакуль будуць паэты, / Жанчыны не будуць старэць* 127, 200

*Пакуль вясну змяняе лета, / Ёсць час яшчэ хоць на вады глыток / І на глыток паветра* 404

*Пакуль гарыць горан – датуль ён і волат, / І сам сабе майстра, і сам сабе бог!* 155

*Пакуль дыхаю родным дымам, / Мне пад небам маім нязмрочна, / Як за пазухай у радзімы, / Як народжанаму ў сарочцы* 246

*Пакуль ёсць баязліўцы – / будуць адважнікі* 155

*Пакуль жар у сэрцы – датуль у ім сіла, / Узлёт і натхненне жывы аганёк* 328

*Пакуль жывы, / Турбуйся аб жыцці, / Але пра смерць не забывай таксама, / Каб з першым і апошнім словам «мама», / З якім у свет прыйшоў, / З яго пайсці* 378

*Пакуль з табою Бог, / Датуль і ты – пад Богам* 328

*Пакуль зямля твая жывая, / І ты – жывы* 262

*Пакуль кахаецца – кахай! / А там што будзе – і будзе няхай!* 120

*Пакуль на белы свет глядзіш вачыма, / Павер сабе: усё адолець немагчыма* 94

*Пакуль не спыніўся гадзіннік / І лічаць зязюлі гады, / Высокае імя Жанчыны / Заслоніць сабой ад бяды* 127

*Пакуль не турбуюся аб сабе – магутнейшы за сябе* 94

*Пакуль не шукаю ратунку – не маю страты* 237

*Пакуль памяць жывая, ёй не трэба ставіць помнікі, яна сама – помнік* 151

*Пакуль паэты будуць пець – / Не быць Радзіме безымен-най, / Зямлі бацькоў – не анямець!* 201

*Пакуль песня – ў хлебе, хлеб – у песні* 182, 288

*Пакуль са мною плачуць вочы друга / Над цяжкай стратай – ёсць яшчэ жыццё* 108

*Пакуль ты плывеш, / ты ёсць рыба. /Не выплывеш, / ты – саркафаг* 378

*Пакуль ты у лістве, / І ты – / яна, ліства* 84

*Пакуль у целе чуецца душа, / Не веру я ў таемны сэнс друго-га / Яе жыцця* 328

*Пакуль чалавек жыве, ён усё яшчэ няпоўны, незавершаны, дарэшты не ўвасоблены, ён яшчэ не зусім творца і не зусім твор. Аднак дзякуючы гэтаму «не зусім» магчыма гэтае да-лейшае ўвасабленне, магчымы пераход недасканалага ў даска-налае, магчыма творчасць* 201

*Пакуль яшчэ ідуць у бой / З маной і раўнадушшам смела, / То не загінуць мове той, / Што з вуснаў мацярок зляцела* 277

*Пакуль яшчэ не абарваўся шлях, / Шукаю – / у трывозе і самоце – / Я жаўранка / ў атручаных палях / І чаплю / на асу-шаным балоце* 84

*Пакуты робяць чалавека чалавекам. / Чалавек без пакут – трава* 47

*Палеткі мудрасці народаў – кнігі* 311

*Палёгкі дачакацца, як бальзам, / Бывае, і сляза дапама-гае* 216

*Палітыка, ты яд змяіны ў роце* 72

*Палітыцы – ўсе хлопцы халастыя!* 72

*Палі ты яго і расстрэльвай, / А ён, славянін, будзе жыць* 47

*Палову жыцця падаюся ў свет, палову – вяртаюся са све-ту, / палову жыцця пішу на дарозе свае імёны, / палову –*

*закрэсліваю напісанае, / палову жыцця расту ад зямлі, палову – расту з зямлёю; / і ўсё менш ува мне мяне, і ўсё больш бязмежжа* 95

*Па любімых сумуюць адразу пасля развітання, а сустрэча з любімым становіцца святам* 120

*Палюбі чалавека, зразумей чалавека, / памажы чалавеку, калі ты чалавек* 47

*Палюбоўнік трэба, калі жанчына хоча даведацца аб сапраўдных лічбах свайго сямейнага бюджэту. Палюбоўніца трэба, калі мужчына хоча даведацца пра хітрыкі і падманы ўласнай жонкі* 127

*Памагаць, чым можаш, людзям / І не плакаць аб сабе* 72

*Памажы, ойчы кут, / Твайму плыўцу у шторме жыцця / Даплысці да высокага берага мэты* 246

*Памёр, / Прыкрылі некралогам, / І ўсёй вядомасці канец* 379

*Памёр пясняр... / А песня будзе жыць і жыць!* 201

*Памёр пясняр, забыт людзьмі, / А песню ўсё яго пяюць* 201

*Памёр чалавек / і з сабою ў зямлю / свет свой панёс, / Свет, які так і застаўся / нікім не адкрыты...* 379

*Паміж берагамі нараджэння і смерці, пытання і адказу, пачатку і канца тая пространь, якую нельга запоўніць ніякай іншай матэрыяй, як толькі матэрыяй свайго жыцця* 379

*Паміж заплаканых крыжоў / шукаем вечны шлях – да Бога* 328, 353

*Паміж праўдай і выдумкаю, падобнаю да праўды, трудна, мой дружа, правесці мяжу* 298

*Памяць і любоў зямная / Не знялі і сёння шынялёў* 151

*Памяць мая! Ты пухлінамі часу баліш, / Продкаў злачынствы катуюць / пячорны мой розум...* 151

*Памяць – набытак асобы* 151

*Памяць не нябожчык, і не ёй сатлець* 151

*Паніка – гэта геніяльная празорлівасць і прадчуванне бяды, якія даюцца натурам глыбокім і тонкім* 334

*Паненскі стан трымала цвёрда, / Каб гонар быў і жаніху!* 59

*Пан Лес не дазволіць мець / пачуццяў, што шкодзяць Лесу* 84

*Па прызванню быццам дворнік, / А рыхтуе вершаў зборнік* 201

*Пара быць Чалавекам чалавеку* 47, 72

*Па-рознаму адлегласць паміж стартам / І фінішам нам адмярае час* 404

*Па-рознаму страчаюць чалавека – / Шавец глядзіць, якія ў цябе боты, / Кравец глядзіць, як твой касцюм пашыты, / Як ты падстрыжаны, глядзіць цырульнік, / А я, паэт, гляджу, якія ў каго вочы...* 47, 393

*Пароль неўміручасці – родная мова* 277

*Пасада – заўсёды няволя* 160

*Пасада сама па сабе змушае прыніжаць любога чалавека, які стаіць па службовай лесвіцы ніжэй за цябе* 72

*Пасад і званняў абляціць лісцё, / І застанецца голы ствол слупка / Магільнага* 379

*Паселішча калючай драбнаты / не радуе, хаця і зацвітае* 338

*Паслугачкай, / як ні пніся, / Праўду не зрабіць* 298

*Паслухаць вас, усе вы хваты! / А чуць да дзела – душа ў пяты!* 233

*Паслухмяным заўсёды меншы кавалак дастаецца* 311

*Пасля нас не плачуць нашы рэчы, / Рэчам трэба некаму служыць* 237

*Паспей для ўнука дрэва пасадзіць / І пыл з іконы старадаўні сцерці. / І памятай заўсёды: / Толькі ў смерці / Ёсць права ўсё спакойна рассудзіць* 379

*Паставіш мэту – знойдзецца і цяга* 175

*Паставіць няўдача пячатку, / Ну што ж, і няўдача – урокі* 140

*Патрабуе чыстае сумленне / Быць неабходным хоць малым звяном / Паміж сваім і новым пакаленнем* 342

*Патрыятызм – гэта ўпрыгожванне радзімы талентамі і справамі* 246

*Патрэбна, як хлеб, людзям слова...* 277

*Патухне радзімае слова, / Калі перастанеш гарэць* 277

*Паўзерня праўды – на сноп хлусні* 393

*Паўторыць шчодрасць сама сябе, / І шчыры колас нальецца верай* 328

*Паўсядзённыя клопаты – гэта і ёсць жыццё* 95

*Пацёмшчыкі святла не любяць* 311

*ПацІху, злоснікі, пацІху: / Ці пераступіце парог* 233

*Па часе будзе і развага, / Калі ў лоб стукне табе шляга!* 222

*Пачуцці, у тым ліку і пачуццё чалавечнасці, у палітыцы не шануюцца* 343

*Пачуюць паэта, якому / зямлі сваёй раны смыляць, / і словы Скарыны вядомы, / і думы пра слова не спяць* 201

*Пачынаецца ўсё з любві* 120

*Пашана хаце – добры госць!* 135

*Паэзія – агонь і лёд: / Сто раз згараць і уздымацца* 201

*Паэзія, аднойчы нарадзіўшыся і выйшаўшы са свайго канкрэтнага часу, становіцца пазачасавай, сваёю, прыдатнаю для кожнага стагоддзя і для кожнага, без абмежавання, народа – як і паветра, якім можа вольна дыхаць кожны чалавек на зямлі* 201

*Паэзія – / Громаадвод людскога Болю. / Пакутная ахвярніца вякоў* 201

*Паэзія – гэта заўсёды свята слова* 202

*Паэзія – душа, а людзі – проза* 202

*Паэзія – лекара чын, / Што гіне , дўшы ратуючы* 202

*Паэзія – маці святых парыванняў, / Любові і веры над светам крыло...* 202

*Паэзія – падзёншчына, не панства* 202

*Паэзія пачынаецца з немагчымасці казаць* 202

*Паэзія – свет здзіўлення, лёт цёмнага свету ў ясны, з яснага зноў у цёмны* 202

*Паэзія – служанка й каралева* 202

*Паэзія – сляза, і пот, і сэрца кроў, / Айчына мілая і дабрата сяброў* 202

*Паэзія – споведзь веку, прапушчаная праз уласнае сэрца* 202

*Паэзія – сястра жыцця. Любімая, цудоўная, можа, нават самая дарагая, але ўсё ж сястра, а не само жыццё. Само жыццё – гэта, мусіць, проза. Не, хутчэй за ўсё і проза – таксама сястра жыцця, толькі ўжо другая* 202

*Паэзія ў жыцці, а ў смерці – проза* 203

*Паэзія – хвароба ўсіх вякоў* 203

*Паэзія, яна не знае тлену, / Калі ў душы хоць прыгаршчы святла* 203

*Паэта адкрываюць пасля смерці* 203

*Паэт – адно з Радзімай, цярплівай і балючай, / Да мужнасці – гаючай* 203

*Паэта не пытаюць, ён нядужы / Ці яшчэ ў сіле сэрца і рука. / Пакуль звініць / жывая сталь радка – / Упэўнен свет: / з ім моц юнацтва дружыць* 203

*Паэта пазнайце па вершы адным!* 203

*Паэта слова / вечна на паверцы* 203

*Паэтаў акрыляе страта, – / І загартоўвае – яна!* 203

*Паэтаў вабіць Хараство, / як матылькоў – святло Венеры* 203

*Паэт – душа мовы* 203

*Паэт заўсёды ёсць прарок, / Бо ён ад Бога...* 203

*Паэт не абуе, паэт не накорміць, / Ды песня сагрэе і ўзвысіць душу* 203

*Паэт не мае права быць паэтам / цнатлівае і чыстае красы, / калі ў Айчыне загніваюць рэкі / і засыхаюць на вачах лясы* 204

*Паэт / пачынаецца са Здзіўлення. / Паэт / пачынаецца з Дабрыні. /З духоўнага акрылення. / З Любові, з Трывог, з Абнаўлення. / У праўдзе – яго карані* 204

*Паэт пачынаецца са слова* 204

*Паэт – равеснік усім пакаленням* 204

*Паэт у жыцця не нахлебнік, / Ён сейбіт, / Змагар / І прарок* 204

*Паэт уласны ў кожнага народа, / І ў кожнага паэта свой Дантэс* 204

*Паэты жыццё не страхуюць, / Таму у вяках і жывуць* 204

*Паэты не забіваюць, паэты не забываюць крывавага* 204

*Паэты паміраюць на світанні – / І астаюцца з намі жыць штодзень* 204

*Паэты паміраюць на світанні, / Самотным вокам згледзеўшы зару* 204

*Паэты – салаўі, не крумкачы* 204

*Паэты, як птушкі, адчуваюць будучае і церпяць ужо авансам* 204

*Перабівацца нішчымніцай думкі, наіўнай пыхі, затоенай зайздрасці – і нудна ж яно, і так непатрэбна!* 277

*Перабыты час – цяжэнная аграмадзіна над крохкім дрэвам жыцця* 404

*Перад зярнятамі, што прападалі, / Схілімся долу* 175

*Перад каханнем, як перад Богам, / няма апраўдання аніякога* 120

*Перакладаць словы лёгка. Цяжэй – душу* 205

*Перад намі – унукі, / за намі – магілы дзядоў* 151

*Перасохла крыніца – па дну / Марна чэрпаць і чэрпаць з адчаем: / Дзве жыццёвыя сцежкі ў адну / Не адчай, а любоў спалучае* 120

*Перачытваць сваё – час ад часу – гэта ўсё роўна як папраўляць на сабе збрую перад далейшай дарогай* 205

*Перашкоды – брускі, якія альбо вострацъ лязо чалавечай існасці, альбо – у залежнасці ад таго, як яно ставіцца да іх, – шчарбацяць яго і тупяць* 47

*Персцень не ў дарунак, калі ён – чужы* 298

*Першая дарога, як і першае каханне, ніколі не забываецца* 353, 393

*Перш чым браць, трэба даць* 298

*Перш чым на іншага ківаць, / Узорам сам павінен стаць, / Каб прыклад з цябе бралі* 222

*Перш, чымсьці з пахвальбой імкнуцца недзе, / Не шкодзіць паглядзець, на чым з нас кожны едзе* 223

*Першыя дзеці ёсць адзнака маладосці жанчыны. Апошняе дзіця ёсць адзнака сталасці перад старасцю* 135

*Першыя ўражанні крыўды ўчэпіста і доўга трымаюцца ў чалавечых пачуццях* 233

*Песень дар – агонь душы і сэрца жар* 288, 329

*Песні, знайце, – сэрца дар* 288

*Песня вольная / Вольную мае душу, / Не пяецца ў няволі ніколі* 288

*Песня – душа мая ў слове* 288

*Песня і праўда – бясцэнныя зліткі!* 288

*Песня мая не ўзышла сярод кветак* 289

*Песня мая не шукае чырвонцаў* 289

*Песня не ведае скону і тлену. / Дзедава песня – эпохі арган* 289

*Песня не носіць ярма* 289

*Песня помніць: / Адступіся яна ад людское душы – / І ўжо не ўберагчы / Анічым / Чалавека* 289

*Песня пташкі ўсім належыць, / не належачы нікому* 289

*Песня-споведзь / Умее абмываць душу* 289

*Пісаць – браць лёд рукамі голымі, / Пісаць – як жартаваць з агнём...* 205

*«Пісаць для вечнасці» – гэта не з думкай пра вечнасць твайго слова, а з належнай настройкай на тое, што па-сапраўднаму жывое і застанецца жыццём* 205

*Пісаць пачынаю ўсё горш я і горш – / Пара выбіраць акадэмікам* 205

*Пісьменнік – голас Божы, не акцёр. / Прарок, які самотай сушыць цела* 205

*Пісьменнік – гэта... ступень і глыбіня спачування чалавеку* 205

*Пісьменнік павінен добра ведаць, што творы – гэта таксама яго біяграфія, а біяграфіяй трэба даражыць* 205

*Пісьменніку трэба заўсёды быць з народам. Яму баліць – а ты стогнеш, яго абражаюць – а ты плачаш* 205

*Пісьменніку, які добра ведае чалавека, часам дастаткова бывае якой-небудзь адной дэталі, адной рыскі ў ім, каб, узяўшыся за яе, як за нітку, разматаць увесь клубок – яго жыццё* 205

*Пісьменніцкая і навуковая творчасць – душэўная хвароба, але высакародная хвароба* 206

*Піце з чыстай крыніцы, з напеваў матчыных, / Сцеражыцеся, хлопцы, частушкі таннай, / Паважайце, любіце бацькоўскую спадчыну – / Усё сплыве, а легенды і песні застануцца* 289

*Пішаш і слову даверліва верыш, / Пакуль не прыйшло да цябе адкрыццё, / Што самым апошнім праўдзівым вершам / Усё ж застаецца тваё жыццё* 206

*Планета жыве для людзей. / І ніколі не згасне, не згіне* 72

*Плён мераецца не колькасцю твораў, а іхняй някалькасцю – выключнасцю, не многасцю – а дастатковасцю* 206

*Плод без зярняці – не плод, / І без мовы – насельніцтва мы, не народ* 277, 338

*Поезд часу у няспынным руху / Да вялікай станцыі бяжыць. / Не паспееў – адстанеш, бедны духам, / На паўстанку сонечнай мяжы* 404

*Покі служаць ногі, / Можна бегчы ўсюды, / Ад сябе самога / Не ўцячэш нікуды* 95

*Покі Юрка не меў чына, / Быў нішто сабе дзяціна* 47

*Покуль будуць людзі, / Покуль сонца будзе ўсходзіць, / Жыць Купалы песня будзе / Неўміручай у народзе* 206

*Покуль век / нітку часу / маўкліва прадзе, / Абрываць не збіраецца ў скрусе, – / І смяецца, / і плачацца так, / як нідзе, / У далонях маёй Беларусі* 257

*Покуль нават хоць раз / Ашукаць дазваляецца – / Справядлівасць ад нас / Не на раз / Аддаляецца* 223

*Поле пасрэднасці дбайна араць – / Тая ж дарэмная трата дабра...* 338

*Помнікам віны не загладзіш* 151

*Помнік забыты – / не варты нічога* 151

*Праведнік той, хто і грэшнік вялікі* 329

*Правінцыя! / Люблю твае кантрасты!* 84

*Праводзім шчасце мы, нібыта госця, / І любім, калі трэба разлюбіць* 120

*Прага да жыцця мацней законаў* 379

*Прагрэс – удасканальванне недасканаласці: яна не знікае, яна не пераадольваецца, яна кшталтуецца* 72

*Прадаваць свае мазгі за мяжу не зможа той, у каго яны непарыўна змантаваны з сумленнем сына свайго народа* 343

*Прадбачаць многае паэты, / Што потым суджана згубіць* 206

*Прадвызначана напярод: / Любоў – крамола / Там, дзе на долю недарод, / На радасць голад* 120

*Прад пошасцю і цвіллю, / Натруджаных, нам не развесці рук* 223

*Пражытым даражы / І ў сённяшнім не кісні. / Жыццё – не міражы, / Жыццё – жывая ісціна* 379

*Пражыць сваё ў жыцці – / Адказнае мастацтва. / Адкуль прыйшоў – / Пайсці, / А на зямлі – застацца* 95

*Пражыць, як гавораць, – не поле прайсці, / Вучыцца не позна ніколі* 140

*Праз дзірван закарузласці / ўпартай зялёнай сцяблінаю / Ці дазволіць нам лёс, / ці пасобіць нам час прарасці?* 103

*Праз сутонне / Прастуецца / У вечнасць шлях* 353

*Прайсці нялёгка год за годам, / Бо шлях – то шоўк, а то асцё...* 95

*Прайсці праз сытасць, а душой застацца / Без чорных плям, / з сумленнем не лаўчыць – / Вось гэтаму вялікаму мастацтву / Сям'ёй народнай трэба ўсіх вучыць* 72

*Практыка – дакладней за тэорыю. Тэорыя можа памыляцца. Практыка не памыляецца, бо за ёю стаяць мільёны людзей, а за тэорыяй – звычайна адзін чалавек. Але ж тэорыя важней за ўсё: яна нараджае практыку* 206

*Пра маладосць пяюць бярозы, / Пра вечнасць – хмурыя дубы* 144

*Пра паэтаў немагчыма гаварыць прозай. Пра паэтаў трэба гаварыць і спяваць толькі вершам...* 206

*Прарастаю я роднай мовай / У чалавечнасць* 277

*Пра сапраўдны смак хлеба / Трэба пытацца не ў таго, / Хто яго штодзень / Есць абы-як, / А ў таго, хто яго / Не заўсёды бачыў / І каму ён не раз сніўся / І цяжка даставаўся* 182

*Пра слова меркаваць можна толькі вымаўляючы... Тады адчуеш ягоны смак, як адчуваеш смак ежы* 277

*Пра сталасць і вартасць народа, нацыі сведчыць не тое, якіх талентаў, якіх геніяў нарадзіў народ, а тое, як ставіцца народ, нацыя да народжаных сваіх талентаў, геніяў, як народ, нацыя з імі абышлася і абыходзіцца* 73

*Прастата, якая не прайшла стадыі складанасці, – прымітыў* 298, 311

*Праўда ёсць на белым свеце, / І на ўсіх – / адна* 298

*Праўда – люксус для выбраных, / воля – капрыз адзінак* 298

*Праўда наша, / праўда ваша.../ Хто ж яе дзяліў?* 298

*Праўда не святая, што была ў ілжы* 298

*Праўда не ў тым, што нас папіраюць. / Ісціна ў тым, што без нас – паміраюць* 298

*Праўда – посах пільгрыма / ў бездарожжы жыцця* 299

*Праўда, прыкрытая дзяружкаю, цікавей за голую праўду* 299

*Праўда – самы цяжкі на свеце крыж* 299

*Праўду здабываць трэба з боем* 299

*Праўду кажуць, што ў поцемках доля брыдзе, / Бо не раз і не два спатыкаецца* 103

*Праўды чорны хлеб і мамы слова / У мяне ніхто не адбярэ* 135, 277

*Працавітае стварэнне – мурашка. Многа чаму ёсць навучыцца ў яе гультаю* 84

*Пра юбіляраў і нябожчыкаў гавораць толькі добрае* 311

*Проці цячэння вады / Зможа толькі жывое паплыць, /Хвалі ж ракі заўсягды / Тое цягнуць, што скончыла жыць* 95

*Прывітанне графамана: «Стой! Ні з месца! Чытаць буду!»* 206

*Прывык ты чужымі рукамі / Выгортваць арэхі з агню* 233

*Прыгожая мова – не ўся мова, толькі адзін з яе пластоў, адзін з яе стыляў* 277

*Прыгожыя – не толькі тварам, / А тыя, ў кім душы святло* 329, 347

*Прыемна ў дом зайсці з дарогі, / Дзе рады вам гаспадары* 135

*Прызванне паэтаў – вырошчваць рэха* 206

*Прызвычайся рэчышчам цячы / І, імгненнем будучым багаты, / Страчанае / стратай не лічы* 379

*Прызнавацца Радзіме ў сваёй любові да яе трэба ціхім, сціплым і нават крыху сарамлівым голасам – такім, якім прызнаюцца ў сваіх самых цнатлівых і непапраўных пачуццях. Інакш нельга. Інакш яна, Радзіма, падумае, што ты і сам у такое не верыш і крычыш так толькі таму, каб пераканаць у гэтым усіх, а заадно і самога сябе* 247

*Прызнаць віну, якой не варты вы, – / Адчэпка толькі для суда людскога* 223

*Прызнаю ўсё існае на свеце. / У звярах людзей не прызнаю* 311

*Прыйшлі і адышлі ў нябыт манархі – / Народы застаюцца назаўжды* 73

*Прымаю тое, што ёсць, і не прымаю таго, што ёсць* 379

*Прыносяць шчасце людзям людзі, / Бяды – за грошы не пазбыць* 73

*Прырода мае нейкае сваё свядомае жыццё* 84

*Прырода – найцікавейшая кніга, якая разгорнута перад вачамі кожнага з нас. Чытаць гэту кнігу, умець адгадаць яе мілагучныя напісы – хіба ж гэта не ёсць шчасце?* 84

*Прырода не адкрываецца чалавечаму розуму... Яна яго толькі заманьвае* 84

*Прысак варухні – / апаліць жар* 84

*Прыстасаванец цытату знойдзе, і занатуе, і дапасуе* 233

*Прыстаў пабел да гнілых сцен, / Як да старой бабулі пудра* 84

*Прысяга – / Ноша непасільная / Для сэрца* 108

*Прыходзіць незвычайная хвіліна, / Калі вастрэе слых, пільнее зрок, / І нібы гронку росную рабіны, / Раптоўна сэрца выспеліць радок* 207

*Прэтэнзій у яго хапіла б на слана* 233

*Пустазелле губіць поле, а няслава – ўсё людское* 169

*Пустым было б і вартым спачування, / Калі б на свеце не было кахання, / Дзе ўсё спрадвек – сакрэт і адкрыццё...* 121

*Пылінкі праху / раздзьмувае час – / І з мёртвага успыхвае жывое* 404

*Пытаешся, які народ нікчэмны? Дзе ў меншасці пустыя галовы, а ў большасці злыя душы* 73

*Пэўна, неабходна для паэта / Нават і ў касмічныя вякі, / Каб звінела птушкамі паветра / І цвілі ля сцежак васількі...* 207

*Пяройдзе шлях у новы шлях, / Расстанне – / ў новае спатканне, / Напеў жалейкі – / ў труб гучанне, / Вытак жыцця – / ў жыцця працяг* 379

*Пясняр – слуга слугі усякай, / Пясняр і цар усіх цароў!* 207

***Р****абі дабро! Хоць нават коштам / Апошніх сіл, апошніх мук. / І не пытай: каму? завошта? / Рабі – без просьбаў і прынук!* 343

*Рабом тваім быць не жадаю / і царом тваім быць не хачу* 59

*Рабскія ланцугі якраз / Не даюць душы развінуцца* 160

*Рагнеда, Еўфрасіння і Ларыса, / ад краю адвядзіце чорны зман!* 127

*Рагнеда, Еўфрасіння і Ларыса – / надзея жыць і прага нараджаць* 127

*Радасць нават мільёнаў не зменшыць гора аднаго чалавека* 334

*Радасць перад вялікімі, не пройдзенымі шляхамі ўзвышае і ўпрыгожвае чалавека і вялікім імкненнем поўніць яго* 349

*Радасць – пераспелы адуванчык, / Дзьмухні – і рассыплецца ушчэнт* 349

*Радасць працы вымагае, каб усё тое, што добра зроблена, было заўважана і адзначана* 175, 349

*Радзіма ж, ты сёння і потым, / На заўтрае і на Святое!* 247

*Радзіма – / Не толькі дом, а і клады́* 247

*Радзіма пачынаецца з жанчыны* 247

*Радзіма, стой, як горды ўцёс* 247

*Радзімы без Апостала няма* 247
*Радзімы вялікай / Няма без малое* 247
*Радкі паэзіі – пракосы, / А ручка – бацькава каса* 207, 393
*Раднёю і мовай не грэбуй, / Ты – колас сярод каласоў...* 277
*Радні ў слязы – няма* 334
*Разведка боем – гэта шлях нятораны, / А бой не абыходзіцца без страт* 166
*Развязаліся языкі, з'явілася і рызыка* 277
*Раз ёсць начное неба ў зорах – / То, значыць, ёсць і захад...* 84
*Размова – мова думак, маўчанне – мова ісціны* 278
*Разняволенне – / гэта адраджэння пачатак* 160, 393
*Разумных бараноў наогул жа нямнога* 85
*Разумны чалавек заўсёды ратуе свой народ, / а дурны яго забівае* 48
*Раз у цябе ёсць сіла, ты заўсёды знойдзеш спосаб жыць на свеце, праб'еш сабе дарогу – штó жывое, жывым і застанецца* 155
*Рай – калі ёсць выбар, а пекла – калі выбару няма* 380, 393
*Рака жыцця згубіла б воблік свой, / Калі б не знала / самаачышчэння* 357, 380
*Рака неразумення. / Яе не пераплыць, / Калі гудуць вірамі / Мана, лухта, / Калі між берагамі / Ніводнага маста* 223
*Рамеснік! Ён хацеў быць мастаком!..* 207
*Рана – пытанні, / адказы знаходзяцца / позна* 404
*Рана-рана / сталеюць унукі, / Калі / паміраюць дзяды* 135
*Раны гояцца часам, а дружбаю – гора* 109, 404
*Раны зажываюць – віры памяці ніколі не супакояцца* 151
*Раны соллю не засыпаюць* 299
*Раскрыймася найлепшым у сабе* 73

*Расцэнкі новыя – на даўнія пытанні* 393
*Рацыяналіст забірае сваё і для сябе ад кожнага дня* 48
*Род звядзецца, / Калі магіл не шанаваць* 151
*Родная мова – бестэрміновы пашпарт пісьменніка* 207, 278
*Родная мова – гэта кроў народа, пакуль жыве яна – жыве народ* 278
*Родная мова, / узнятая к славе амаль з небыцця / паэтаў натхнёным і велічным словам, / для беларусаў – пытанне жыцця* 278
*Родны край ніхто не выбірае, / Выбірае родны край цябе* 247
*Родны край сыноў не дакарае – / Па-бацькоўску кожнага шкада* 247
*Розніца паміж арміяй і літаратурай: у арміі асноўны закон – рабі, як я; у літаратуры – якраз наадварот: рабі не так, як я* 207
*Розум заўсёды ваюе думкамі* 312
*Ружы хінуцца / Адно да найчыстых душою – / Бытуе спрадвеку прыкмета* 329
*Рука ў руку з хлуснёю / Праўда / Не пойдзе – хоць звяжы! Бо праўда свет кіруе ў заўтра, / Хлусня – да гібельнай мяжы* 299
*Рукі крыжам – хто ўгневіць Радзіму!* 247
*Рупная пчала / Умее мёд сабраць і з горкіх кветак* 207
*Рэвалюцыя нерашучая / патанае ў сваёй тэорыі / і ўласнай крыві* 167
*Рэкі злучаюцца – / Мора. / Слёзы разлукі – / Гора...* 334
*Рэкі не вяртаюцца, / Медзякі старыя не блішчаць* 85
*Рэчы – апошняе цела людзей, якое жыве найдаўжэй* 237
*Рым загінуў ад дзіды вандалаў – / Рым жыве ў Ювенала радках!* 207
*Рыфмай лозунгі не псуй* 207

*Сабачае жыццё незайздроснае, але ніякіх павіннасцей сабака не нясе* 380

*Сабе не знойдзеш долі лепшай, / Чым ведаць: ёсць сябры мае* 109

*Сабе сам пан, сабе сам служка* 48

*Сабраць з дарог камені тыя, / Што губяць сілы маладыя* 155

*Саграваць усё ж умеюць рэчы, а маўчаць, бо не пытаюць іх* 238

*Салавейку ж і ў непагадзь / трэба пець!* 299

*Сама гісторыя вучыла: / Шануй, народзе, і цані – / Усё, што поіць-жывіць шчыра / Тваёй свабоды карані!* 160

*Самае важнае і магутнае для пісьменніка – гэта талент. Але больш важнаю і магутнаю з'яўляецца лянота: яна можа загубіць любы талент* 185

*Самае галоўнае... не страціць усведамлення сваіх памылак* 223

*Самае простае і самае цяжкае – гэта праўда* 299

*Самае складанае ганчарства – гэта ляпіць чалавека* 140

*Сама зямля не йдзе да спадара, – / Яна чакае ласкі чалавечай!* 262

*Сама пакажа справа, / Ці варта шуму ўся аблава* 349

*Сама ўжо праца пакарае, захапляе чалавека, бо ў гэтай дружнай грамадскай працы так многа і музыкі, і паэзіі, і хараства* 175

*Самаўладная кара ў жыцці – / Быць да крэўнага слова прыкутым* 278

*Самая большая рана на маім сэрцы – / гэта тая, якую пакінула несправядлівасць* 223

*Самая вялікая хлусня – гэта хлусня маленькаму чалавеку* 140

*Самая страшная рэч – абыякавасць. Калі з ёй не змагацца, яна, як дрыгва, можа загубіць любога чалавека* 233

*Самая цудоўная, самая міжнародная музыка – дзіцячы смех* 140

*Сам выбраў долю.../ й нядоля знойдзецца сама* 103

*Самім сабой застаецца святло, / І шчодрае, і скупое...* 147

*Само сонца ўзяць у рукі / І, як з паходняй, з ім ісці* 179

*Самотніку не вырвацца з няволі* 216

*Самы асноўны клопат у людзей – баяцца* 343

*Самы большы страх чалавечы – страх за сваё жыццё* 380

*Самы высокі будынак у свеце / Той, што не ўзведзены* 180

*Самы вялікі мужчынскі наш грэх – / грэх супраць жаночай гордасці* 59

*Самы вялікі начальнік над чалавекам – сумленне* 343

*Самы дасканалы чалавек – гэта чалавек з памылкамі,* 48

*Самы караткі і доўгі век – / у творцаў. / Адны і пры жыцці / паміраюць, / другія і пасля / працягваюць жыць* 207

*Самы лёгкі тавар – розум* 312

*Самы магутны метад забыцця – змена летазлічэння* 152, 404

*Самым апошнім праўдзівым / вершам / Усё ж застаецца тваё жыццё* 208

*Самыя балючыя раны ў дзяцінстве/ Перастаюць ныць ад пацалункаў маці, / У юнацтве – самі зажываюць ад вяселля. / У сталасці – загойваюцца ад спагады сяброў... / І толькі пазнейшыя раны / Ніхто і нішто не залечыць, / Апроч зямлі* 135

*Самыя вясёлыя і галасістыя салаўі – / на вясковых могілках. Напэўна, таму, / што і днююць, і начуюць не ў гнёздах, / а ў душах маіх спрахлых дзядоў* 136

*Саперніцтва з прыродай – непазбежнасць, / Як непазбежнасць – розум у прыродзе* 85

*Сапраўднейшы радок – / брат незагойнай раны* 208

*Сапраўдны гумар – як гасціннасць, / У ім асновай – дабрыня* 343

*Сапраўдным пачуццям не трэба аздобы* 121

*Сапраўдны паэт у пэўнай ступені – прарок, заклікабыі ісці хоць на адзін крок наперадзе падзей* 208

*Сапраўдны пісьменнік – сам сабе настаўнік. І вучань таксама. Ён вучыцца і вучыць адначасова. Сам у сябе вучыцца. І сам сябе вучыць* 208

*Сапраўдны пісьменнік той, на творах якога можна навучыцца любові да людзей* 208

*Са словам дабрыні / Спяшайце не спазніцца* 278

*Сатыра моцных умацоўвае. А слабыя баяцца сатыры, забараняюць яе* 156, 208

*Свабода нашай дэмакратыі – гэта свабода агню, а дзе ж свабода вады?* 160

*Свабодзе нашай грош цана, / калі яна адносная* 160

*Свабодны толькі дух – / Душа не мае волі* 160, 329

*Свабоду зроду / Ніхто ахвотна не даваў* 160

*Свабоды бог з неба не скіне* 160

*Свае ў другім пабачыўшы заганы, / Мы, як на люстра, брэшам на яго!* 223

*Свае ў маўчанні ёсць граніцы, / Свая бяда, свае масты. / Ёсць у маўчанні таямніца / Ад мудрасці да прастаты* 312

*Свае халеры – паўбяды, / а сцюжа чужая – ўдвайне суровая* 73

*Сваёй бядзе – не лепшыя мы суддзі. / Лягчэй за ўсё / Ірваць чужую ніць* 73

*Сваёй бядзе – не лепшыя мы суддзі. / Цяжэй за ўсё / Своя ірвецца ніць* 334

*Сваёй сцяжынай цвёрда, / роўненька / Ідзе праз вечнасць чалавек* 380

*Сваіх згрызот для ўсіх даволі, / Свой клопат кожнаму баліць* 228

*Свайму абаронцу, мабыць, / Магілай не можа зямля быць!..* 262

*Сваю Айчыну ўбач і зразумей, / І ў ёй сябе ты зразумееш потым* 247

*Свая пара / Дайсці да непаматлюднага паўстанку / І думаць, што вячэрняя зара / Бок адваротны алага світанку* 405

*Свая пара / Ўзысці на запаветныя вяршыні* 393

*Свая пара / Хвіліне найшчаслівейшай незваротнай, / Калі старое прэч ідзе з двара, / Каб новаму пастукацца у вокны* 405

*Свежыя навокал дэкарацыі, / Але той жа дзейсніцца сюжэт* 405

*Свет і жыццё мнагалучны / І мнагавобразны, выключны* 380

*Светлы лёс паэта – / Усё жыццё імкнуцца ў маладосць. / Заўжды ў паходзе быць, / пакуль дыханне ёсць – / Быць / маладосці песняром / для свету* 208

*Свет – не навокал, у табе, / і гэткі, вартая якога* 223

*Свет ніколі не трымаўся на камплiментах, і мала знойдзецца людзей, якія б усё жыццё хацелі есці толькі салодкае. Гэта і няздорава і няўежна* 223

*Свет пароўну ўсім належыць, / А доля ў кожнага свая* 224
*Свет чалавечы прагне людскасці* 224
*Свой век – шчаслівую радоўку – / Трэба не адбыць мне, / а пражыць* 95
*Свой гонар страцілі панкі – / Ўзялі над імі верх жанкі* 60
*Свой шлях у кожнага, свая дарога, / праверана вякамі і жыццём* 95
*Святасць жаласці, шкадавання. Усіх, бо ўсе, калі глыбей разабрацца, незразумела і безнадзейна няшчасныя* 121
*Святла баяцца цёмныя краты́. / Арлы да сонца ведаюць дарогу* 85
*Святое права старасці – пісаць тое, што хочацца самому* 144
*Святую наіўнасць маленства ў старасць не перанясеш* 144
*Сёння хлеб у нас дваякі: / Чорны, белы... / А ніякі – / Даўні, горкі і пракляты – / Мы не пусцім больш у хату* 182
*Сённяшнія дзеці – заўтрашні народ. А хіба хілы душой і здароўем народ утрымае наш сцяг?* 329
*Сіла ломіць мур* 156, 299
*Сіла простай натуры ідзе ад прыроджанага ўмельства. Быць у спакойнай раўнавазе з першай жа хвіліны, як толькі праходзіць час маладога свавольства і пачынаецца патрэба быць сталым* 156
*Сілкуецца зноў хлебам чорным / Зямнога жыцця вечны круг... / Зярністыя шэрыя жорны / Ніколі не спыняць свой рух* 380
*Сініцай не адбудзеш, / Пільнуйся жураўля. / Аб шчасці дбайце, людзі, – / І ўспомніць вас Зямля* 73
*Сказаць: салгаў – не выпадае, / Паверыць – веры не хапае* 233

*Сканаў Хрыстос. / Але жыве Іуда / І прызначае тайную цану* 380

*Складаецца з трагедый чалавечых / Вялікая трагедыя жыцця* 380

*Складана чалавекам быць. / Астатняе ўсё – / проста!* 48

*Складаная дарога ўдаль, / То дзень пагодны, / То імжа...* 354

*Скупая зямля маёй Беларусі / Не раджала рабоў і не мела рабоў* 257

*Слава аднаго замінае славе другога, загана ж аднаго не замінае загане другога* 169

*Слава – / Медыцынская сястра, / Якая часта блытае адрасы, / Спазняецца / Праверыць пульс / І каму трэба / Аказаць дапамогу* 169

*Славу паэтаў разносяць па свеце, / Вянкі ўскладаюць і звоняць пахвалай, / Я ж ціха йграю, хто ж ціхіх прымéце?* 169

*Славяцца людзі гуманнасцю спраў. / Не сілай, а веліччу сэрца* 60, 208, 343

*Слова валодае таямнічай сілай – бывае хвіліна ці імгненне, калі яно, кінутае ў свет, як каменьчык, выклікае абвал – нябачны, нячутны, які доўжыцца гады* 278

*Слова, дум ніхто не звяжа* 278

*Слова забіяцкага / Не чэшуць тут пад шнур* 278

*Слова «кахаю» – слабае слова. / Мужнае слова – «абараню»!* 278

*Словам можна забіць, словам мóжна / скалечыць...* 278

*Слова паэта – народа працяг* 208

*Слова праўды нельга сцерці, / Не зжаць палетак жыта без сярпа!* 279

*Слова-радасць, слова-чары, / Вобраз вечна юных вёсен, / Ёсць ты ўсюды: ў сонца, ў хмары, / Ты глядзіш праз неба про-*

*сінь, / Лашчыш слух мой слова-ззянне, / Атуляеш сэрца ласкай, / Ноч і вечар, дзень, світанне / Абняло ты, слова-краска* 279

*Слова тады мае сілу, / Калі яно зрошана потам / І з праўдай людской здружыла* 279

*Слова, ты гучы! / І хай маўчаць гарматы і мячы!* 279

*Слова – усяго аснова. / Душа крылатая ў слова* 279

*Словы без справы – / Шум ветру толькі* 279

*Слоў не крышыць ні век, ні тапор* 279

*Слоў у нас вельмі многа. Куды ні пайдзі, усё толькі чуеш прамовы... Адно якое-небудзь слова выклікае тысячы другіх слоў. Слова на слове едзе і словам паганяе* 279

*Слязней слязы ... жыццёвы вырак: позна!* 103, 405

*Сляпыя гінуць душы* 329

*Смак да жыцця падсілкоўвае перамога* 95

*Смерці ў Паэта няма – / Ёсць нараджэнне!* 208

*Смерць амаль заўсёды па-новаму выяўляе чалавечую сутнасць, адкідваючы дробязнае і другараднае, буйным планам высвечваючы тое, што было не навідавоку* 380

*Смерць выдатных людзей заўсёды з'яўляецца ўрокам для жывых. Робіцца вельмі відно, што нам ёсць чаму вучыцца* 381

*Смерць – вынік жыцця* 381

*Смерць – нонсенс, але жыццё раіцца з ёю* 381

*Смерць у цішы страшней за раптоўную смерць у бурах* 381

*Смерць – яна не ў кожным разе драма...* 381

*Смяротны груз не мае вымярэння, / Сябе не шкадаваць – / вайны закон* 167

*Сноп апошні залатога жыта / Застаецца ў памяці палос* 152

*Сонечныя лапіны не зацямняюць сонца. Лапіны ёсць. А сонца свеціць* 85

*Сон – не заўсёды асалода* 299

*Сонца вечна людзям свеціць. / Хто прыйшоў з цьмы, сойдзе ў цьму* 381

*Сонца і родная глеба – / Шчодрасці прыклад для нас!* 85

*Сонца і тое мае / Святло і цень, / І ў сонца самога бывае / Ноч і дзень* 85

*Сонца ўдзячныя вочы не слепіць* 85

*Спавяданне сціпласці – не ад немачы, а мудра, з высока жыватворчай радасцю. Бачачы вялікіх, адчуваючы іх прысутнасць і ўсведамляючы сваё месца ва ўсеагульным творчым жыцці* 209

*Спавядацца бяжым да прыроды, / Ачышчацца бяжым ад маны* 85

*Спадчынай валодае той, хто мае моц засвоіць яе, той жа, хто гэтай моцы не мае, у лепшым выпадку з'яўляецца яе захавальнікам* 152

*Спадчына не ў мінулым, а з мінулага: яна – вектар, які паказвае дарогу, яна – аблічча ўчалавечанага часу* 152

*Спазнай самога сябе... Але як нельга прымусіць нанава гарэць тое, што ўжо згарэла, – попел, так нельга спазнаць т о е, чым ты ёсць, і гэта таму, што я н о, гэтае т о е, ужо «спазнанае»...* 312

*Спазнаць цану любой хвіліны / І кожным крокам даражыць: / Шукаць, знаходзіць, быць няспынным, / Не проста існаваць, а жыць* 381

*Спакойнага шчасця / не зычу нікому: / Навошта грымотам / маланка без грому, / Навошта ручай / без пякучае смагі, / Халодная ўвага / не вартая ўвагі, / Жаданні, што прагныя крылы згарнулі, / Зязюля без лесу / і лес без зязюлі?* 381

*Спакой – не сон, не бросня забыцця, / Спакой – жывога руху раўнавага, / Грамоў і бур законнае дзіця, / У спёку – дождж, у дождж – сухая смага* 167

*Спакон вякоў для селяніна / Няма на свеце дзвюх радзім* 248

*Спачатку – слова. Тайны знак спярша* 279

*Спачатку ўсё ж быў хлеб, / а потым – слова. / Спакон быў чалавечай мовай хлеб* 182

*Спачуванне з жыццём нам далі* 109, 343

*Спее сусветнага жаху града: / Хто пазбірае каменне?* 167

*Спеўная мова твайго народа будзе чуцца і ў сне* 279

*Справа не ў нашых імёнах, не ў тым, / хто, дзе і калі, – не ў славе. / Слава, як вядома, дым. / Справа – у добрай справе* 169

*Справядлівы Бог адзін. З правам першага суддзі* 329

*Спрадвечны круг жыцця і смерці / Ніхто / нічым не разамкне...* 381

*Спрачацца з дурнем, як тапіць сябе ў пустыні, / Дзе ані кропелькі жывой вады...* 233

*Спрачацца з радзімай – як агнямі па зорах халодных вадзіць* 248

*Спрачацца з цынікам – як неба разгаворваць* 233

*Спынішся – плынню адгоніць назад* 357

*Спрэчкі з лёсам – найчарней смалы* 103

*Сяваеш добра, ды ці тое? / Вярзеш, брат, грушу на вярбе* 185, 289

*Спяшаецца і жыць, і адчуваць, / Напэўна ж, / маладосць невыпадкова* 144

*Срэбра зззяе раскошай, / І сыта яно і адзета, / Толькі бедна натхненнем – / Адзіным багаццем паэта* 209

*Стагоддзі, бы кіты, плысці, / Пакуль – у муках – зможа наш нашчадак / Да сутнасці нябеснае дайсці* 299

*Сталасць – гэта прага дасканаласці, / У якой няма ў жыцці мяжы* 144, 393

*Старасць мылам не адмыеш* 144

*Старасць настае тады, калі ты ўсё больш і больш знаходзіш знаёмых прозвішчаў на надмагільных помніках* 144

*Старасць не радасць, аднак усім хочацца да яе дажыць* 144

*Старасць таксама бывае розная – гордая, як у дуба, плаксівая, як у асіны, тужлівая, як у бярозы, і скрыпучая, як у вяза. Але якая б яна ні была, ёй усё роўна ніхто не зайздросціць* 144

*Старасць – час, калі не маеш права, / Апроч сну, адпачынку, спакою, / Ні на адзін дзень адкласці свае справы* 144

*Старому трэба не швэндацца па свеце, а трымацца роднага кута – і не таму толькі, што там і сцены дапамагаюць, але ж і дзеля годнага заканчэння свайго жыццёвага шляху, са сваім месцам у Зямлі* 145

*Стаўшы лапцем, трымайся, як лапаць, лапцей: / Разам з імі на печ, разам з імі ў музей* 394

*Стаю прад словам на каленях, / Прыйдзі, харошае, прыйдзі / І ў садзе вершаў не вясенніх / Сваю ты ружу пасадзі* 279

*Стаю ў вялізнай чарзе. / Перш, чым з апошняга / стану першым, / пабуду ўсёю чаргой* 95

*Стварыць сабе куміра і пакланяцца яму – гэта значыць, разбурыць, бязлітасна знішчыць сябе як асобу* 381

*Столькі зведаўшы гора, нягод, / Столькі слёз, і крыві, і агню – / Беларусь, ты на тысячы год / Заслужыла сабе цішыню* 257

*Сто тысяч год няхай вакол шумяць палі, / Сто тысяч год няхай вакол гудуць дубровы, / Пакуль гучыць вакол святая наша мова, / Пакуль ёсць беларусы на зямлі* 280

*Страх і цемната – неразлучныя прыяцелі* 335

*Страціў слова, страціў спадчыннае слова, – / Штосьці страціў у душы абавязкова! / Можа – годнасці хоць кропельку якую? / Можа – мудрасці хоць дробачку якую? / Можа – памяці хоць зернетка-іскрынку? / Можа – праўды хоць пылінку-парушынку? / Я не ведаю дакладна, што ты страціў. / Запытайся – ці не скажа табе маці* 280

*Страшна не жыць у знябытасці, / а паміраць* 382

*Страшны... не той палон, у які цябе заключае нехта, а страшны той палон, у які заганяе сам сябе чалавек. Можна быць нявольнікам і на волі, можна быць вольным у няволі* 160

*Суддзя галоўны мой – маё сумленне, / А ісціна – адзіны ў свеце бог* 299, 343

*Суд наш рашаючы і незваротны, – / Суд наш апошні – саміх над сабой* 224

*Суды сабе падобных лепяць* 224

*Сумленнасць – гэта вечная навука / Стараннага прымнажання дабра* 343

*Сумленне – заўсёды / на лаўцы падсудных. / Само сябе садзіць, / само сябе судзіць* 343

*Сумленне таленту радня* 344

*Сумленне, як ласку матчыну, / Не купіш і ў складчыну* 344

*Сумленны, працалюбівы чалавек, які моўчкі працуе, не трубячы пра гэта на кожным скрыжаванні, які цягне ўсё, што на яго наваляць, рызыкуе падзяліць лёс таго рахманага каня, якога запрагае кожны, каму не лянота, а сам ён нават убрыкнуць не адважваецца* 344

*Сумленны чалавек часцяком адчувае грэх з-за таго, што сусед побач жыве ў галечы* 344
*Сумленню з подласцю ў суполцы / Ганебна мерацъ шлях стары: / Сумленне рвецца ўвысь, да сонца, / А подласць – шчэрыцца ў нары* 344
*Сумна тваё адцвітанне, / Квеце зямлі, чалавек!* 48, 382
*Сум не мае волі... Сум не мае хаты* 216
*Сумненні – асноўная і нябачная сіла жыцця* 382
*Сумуй па светлых днях, як па расе / Сумуюць ледзь разбуджаныя травы!* 216
*Супраць буры плыць куды пачэсней, / Чым схіліць пакорліва калені* 60
*Супынак нават на імгненне – смерць* 358
*Супярэчнасці ўнутры народа можа вырашыць толькі сам народ. Збоку вырашыць іх немагчыма. Распаліць, яшчэ больш развярэдзіць збоку іх можна. Вырашыць – ніколі* 74
*Сусвет адзіны: / мы – у ім, / і ў нас – ён* 74
*Суседзі ў слове... / Без мяжы* 280
*Сустрэча працягнецца датуль, / Пакуль здаецца немагчымай* 109
*Сустрэч не перадорваюць* 109
*Сустрэчы – не толькі збліжэнне. / Ідзе, скрозь шум і тлум, / Узаемапамнажэнне / Нашых душ і дум* 109
*Сутнасць верша не «ядро арэха», а ўвесь арэх* 209
*Сутнасць: не я лепшы за ўсіх, а я – такі ж, як і ўсе* 48
*Сутокі неба і зямлі...* 85
*Схавай выбуховае слова / на ворага. / А другу хай будзе адкрыта душа* 280
*Сцвярджае час: заўжды жыццю на змену / Прыходзіць смерць, для ўсіх – адзін закон* 382

*Сцежка да волі надта цяжкая...* 161
*Сцеражыце ж годнасць чалавечую. / Як жыццё, яна у нас – адна* 60
*Сцеражыся злосці нечай – / яна зневажае* 233
*Сынок і Маці – зерне і ралля. / Сынок і Маці – мудрая ікона* 136
*Сэнс любой вандроўкі ў завяршэнні: куды і з чым ты прыйдзеш?* 394
*Сэнсу страта – / то, пэўна, страта ўсяго* 382
*Сэрца чалавечае / Не можа жыць у вечнай весялосці. / Не ныне толькі сэрца бессардэчнае, / Счарсцвелае ад зайздрасці і злосці* 233
*Сябе мы часам выстаўляем, / А добрага ў другіх не прыкмячаем* 48
*Сябе не зразумець – / Не зразумець нікога* 48
*Сябе ты не ратуй, а перайнач / Свой нораў зла, спустошаную волю* 224
*Сяброў бяда не дзеліць, а зліжае* 109
*Сяброўскі дар – найдаражэйшы дар* 109
*Сяброўству здраджваць не магу, / Пачуцці ў ланцугі не путаю. / Сяброўства сэрцам берагу, / Я з ім жыву, я з ім пакутую* 109
*Сябры з адчаю выцягнуць заўсёды, / Хоць знойдуцца між іх сябры з нагоды* 109
*Сябры не набіраюцца гадамі. Іх ніколі не бывае так многа, каб сказаць, што сяброў ужо досыць* 109
*Сягаючы імкненнямі высока, / Не забывай пра карані* 248
*Сям'я ўратаваная – і ўратаваны народ* 136
*Сярод людзей / Без песні – няма надзей* 289

*Сярод усіх вятроў / адзін спадарожны, / Сярод усіх шляхоў / адзін незваротны* 354

*Табе ж, калі ты пішаш вершы, / не хочаш верш праспаць свой лепшы, / карысна, мабыць, меней спаць, / а болей думаць, болей дбаць* 209

*Табе зайздрошчу светла, мой настаўнік, / няўтомнай эрудыцыі тваёй, / тваёй святой няволі, – толькі ў ёй / душа бяднець і старыцца не стане* 140

*Табе зрабіўся блізкім цэлы свет! / А ці бліжэйшым стаў табе сусед?* 109

*Таварыш воўк авечцы не таварыш* 85

*Таго, хто ролю чужую выконвае, / Падсцерагае сумны канец* 382

*Таго чакае забыццё й кананне, / Хто ў сваім доме як часовы госць* 224

*Тады выстойваюць падлескі, / калі выстойваюць лясы* 312

*Тады народ лічы аблудным, / Калі народзіцца Іуда, / І стане спрытна, бы штукар, / І метадычна год за годам / Чужынцам прадаваць тавар – / За медны грош – душу Народа* 234

*Таемнасць першасных перапляценняў / мы спазнаём у стратах, спакваля* 238

*Таемны вы, зямлі скрыжалі! / Чаго ў сябе вы не ўпісалі!* 263

*Такая круглая зямля – / З самім сабой не размінуцца* 300

*Так бывае цяжка паверыць у прарока ў Айчыне сваёй!* 48

*Такі закон прыроды, маці, / У ім ёсць сэнсу глыбіня: / Раней, чым першы смех дзіцяці, / Ты доўга чуеш плач штодня* 85

*Так і мова, словы ў ёй – / зярняты. / З кожным зернем – ўсё дужэе / колас, / Бо зярнятка – гэта яго голас* 280

*Такі наш век: / не падай у знямозе* 405

*Такі рухавы малы – / што амаль што выслізгвае са свету, / такі нерухомы стары – / што свет амаль што выслізгвае ад яго* 145

*Так няпроста / даходзім да простай высновы – / Не шкадуй дабрыні, / што б з табой ні было...* 344

*Такой трывожнаю часінай, / Назло шалёнаму звяр'ю – / Для справы міру трэба ўсім нам / Яшчэ мацней любіць зямлю!* 167, 263

*Такому б толькі з рук ды ў друк* 209

*Так патрабуе ўжо ў калысцы / Дагляду мудрага дзіця, / Каб у жыцці аратым выйсці, / А не нахлебнікам жыцця!* 140

*Так, пацярпець! Адно цярпенне / І можа даць табе збавенне...* 156

*Так спрадвеку, / Так ад Бога: / Стрэчным двум – / Адна дарога...* 312, 354

*Так, той толькі жне, хто пасее. / Не, рукі ў сяўца не дрыжаць, / пасеяць ён горкую праўду паспее, / каб волю жаданую жаць* 175

*Так ужо наканавана небам: / Маці дзеліцца з дзецьмі / Душою сваёй, як хлебам* 136

*Таленавіты – сам сабе суддзя, / А для паскуд – заўсёды небяспечны* 185

*Таленавіты творца вучыцца сам, няздатны – вучыць іншых* 185

*Талент – гэта не аб'ём, гэта тайна* 185

*Талент – інструмент, пры дапамозе якога чалавек пазнае жыццё, ён – люстра, у якім адбіваецца свет, а карціна гэтага свету будзе тым дакладнейшая, чым дакладнейшы сам інструмент* 185

*Талент кіраўніка і талент творцы шмат дзе супадаюць, але часам і ўзаемавыключающца* 186

*Талент, як і сумленне, павінен быць непадкупны* 186

*Там бяда выпаўзае, / дзе шашаль заводзіцца ў памяці* 335

*Там, дзе даверу поўнага няма, / Зліць у адну дзве праўды немагчыма* 110

*Там, / Дзе не шануюць роднай мовы, / Мялеюць рэкі, /Нішчацца дубровы, / Каля магілак пасвяцца каровы, / Народ там мёртвы, / А той край – нямы* 280

*Там, / дзе панішчаны гаспадары, / Пасуцца выслужнікі табунамі* 60

*Там, дзе пачынаецца абыякавасць, там недалёка гібель* 234

*Там, дзе у бурах / Сыпалася зерне, / Бур'янам дзікім / Шлях не зарасце* 354

*Там толькі, / Дзе душа начуе / І прачынаецца, / Жывеш...* 329

*Таму і смутак нам патрэбен, / Каб радасць большаю была* 349

*Таму крыніца чыстая заўжды, / Што не стаіць яна на месцы* 358

*Таму лепш песень не дарыць, / Хто сам свае спявае* 289

*Таму туды раней за нас матулі / Ідуць, каб зноў вучыць сваіх малых* 136

*Таму ў імклівасці / і смутак не агорне, / ніхто не здолее, / каб пагасіць зару...*358

*Таму, хто век сяброў не меў, / Хто шчыра пакахаць не змог дзяўчыну, / Хто не гарэў, а толькі цьмеў, / Не палюбіць ніколі і Айчыну* 110

*Таму Янка і галее, / Што папраўдзе жыць умее* 300

*Танцаваць – не гараваць!* 335

*Татальная стомленасць – гэта калі на самога сябе цяжка глядзець* 394

*Таямніца – прысутнасць у адсутнасці* 312

*Твар у жанчыны, якая многа думае, становіцца шэры, характар – невыносны, старасць – заўчаснай* 128

*Тварыць дабро патрэбен талент, / Прыносіць гора – толькі злосць* 209, 344

*Тварыць – штодзённа, апантана – / Для чалавека значыць – жыць* 209

*Твая бяда, што ты не здольны / Пераступіць якісь парог, / Каб навізну прыняць бязбольна, / І мне шкада цябе, дальбог!* 335

*Твая пачэсная справа – / Жыццё адкрываць другому* 141

*Твор не ўдасца, калі перакладчык, хай сабе і вельмі дакладна, перакладзе толькі словы, сказы, а не паэзію і пачуццё* 209

*Творчасць – гэта таксама загадка і шчасце, калі ты нешта добрае адкрываеш людзям* 209

*Творчасць – індыкатар, своеасаблівы дарожны знак: кожны раз яна паказвае табе самому, дзе ты цяпер і які ты цяпер* 209

*Творчасць – сустрэча з невядомым. Як толькі невядомае замяняецца вядомым, яна немінуча ператвараецца ў імітацыю* 210

*Тое месца, дзе ронім мы першыя слёзы і пакідаем частку саміх сябе, становіцца дарагое для нас* 248

*Тое, што без цяжкасці атрымана, – / Без цяжкасці душэўнай / Аддаюць* 238, 300

*Тое, што відаць усім, – кропля, а тое, што павінны былі ўсе бачыць, – не бачна нікому* 300, 312, 338

*Тое, што здаецца нам будзённым, / Нібы свята, ўспомніцца пасля* 300

*Тое, што потым, здалёк успамінаецца як шчасце* 300

*Тое, што схаваў, – / згубіў навечна. / З'еш адзін вала – / адна хвала* 224

*Той адзін не заўсёды самотны, / Хто сустрэне самоту хоць раз* 216

*Той да прысмакаў не ласы, / Хто на нішчымніцы рос...* 237

*Той дзень збяднеў, зліняў на сотню радуг / І, попелам пасыпаны, сканаў, / Калі не падзяліў з суседам радасць / І больш за дзень узяў ты, чым аддаў* 110

*Той дзень зусім закрэслены табою, / Калі ты раўнадушна абмінуў / Бяду чужую, пабаяўся болю, / Абразу хама моўчкі праглынуў* 74

*Той дзень, лічы, завянуў пустацветам, / Калі ты пяць хвілін пашкадаваў, / Каб дзецям паказаць куточак свету, / І хараство людзей, і дрэў, і траў* 141

*Той дзень прапаў і страчаны навекі, / Калі ты не зрабіў таго, што мог, / Калі не паспрыяў ты чалавеку, / Няшчыры быў, зманіў, не дапамог* 110

*Той дружбай вернай можа даражыць, / Хто сам прайшоў дарогай крамяністай* 110

*Той мёртвы смех, якім смяюцца, / Калі ахвота зарыдаць* 335

*Той не будзе граць няшчыра, / Хто на хлеб рашыў сабраць* 183

*Той пераможа, хто не забывае – / Адлегласць ад сяўбы да малацьбы / Даўжэйшаю за век людскі бывае* 175

*Той свет і гэты з'ядноўваюцца ўва мне, знаходзяць смерць і жыццё ўва мне ўвасабленне* 382

*Той свет / Цікавіць нас на гэтым свеце, / А ці ўзгадаем / Гэты свет на тым?* 382

*Той сумленна рассудзіць, / Хто сабе не даруе...* 344

*Той толькі адчуе ўсю слодыч спаткання, / Хто горкасць разлукі пазнаў* 121

*Той, хто думае пра годны канец жыцця, жыве сумленна* 344, 382

*Той, хто за веру памерці гатовы, / Той не прыгрэе змяёю ману* 121, 329

*Той, хто зняверыўся, – / Іншым не прыклад...* 121

*Той, хто любіць папраўдзе, ён ціха / слова роднае ў сэрцы спяліць, / беражэ ад пагарднага ліха: / калі слову, то й сэрцу баліць* 280

*Той, хто хутка купляецца, хутка і прадаецца* 234

*Той шчаслівы да скону, хто жыў / На зямлі на нашай зялёнай!* 248

*Той шчаслівы і самы багаты, / Хто любімай Радзіме не госць* 248

*Той яснасць вока й думкі зберажэ, / Каму ў жыцці зазнаць прыпала многа* 312

*Толькі асоба, якая да самазабыцця любіць сваю зямлю, якая шырока і глыбока глядзіць на свет і жыццё, можа спадзявацца на сапраўднае прызнанне і на такую вялікую радасць – павагу свайго – і не толькі свайго! – народа* 48

*Толькі багі / Судзяць гонар славянскай жанчыны* 128, 329

*Толькі б вырасці мне сасною / Не крывою, а стрыжнявою!* 180

*Толькі блізкіх зблізжае ростань. / Толькі з блізкімі час у згодзе* 136

*Толькі б / Не паказацца смешным / На сваім апошнім рубяжы* 382

*Толькі Богу, душа, толькі Небу – / Падуладная ты на Зямлі* 329

*Толькі воля не ведае здрады* 161, 234

*Толькі выпакутаванае дабро прыносіць шчасце* 224

*Толькі грэцца ці варта / На былым папялішчы?* 152

*Толькі ліха сну не мае* 335

*Толькі любоў да Радзімы нам зброя* 248

*Толькі нішто не пагасіць ніколі / ў сэрцы гаручага полымя волі* 161

*Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам, бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам* 281

*Толькі раз з дарогі збоч – / Паселіцца ў сэрцы ноч* 224

*Толькі са сваёю, а не з чужою душою чалавек застаецца чалавекам, а без душы – ён ужо ніхто, ён проста раб і ўжо не супраціўляецца ніякаму здзеку, ніякай абразе* 330

*Толькі свет пакідаючы, не бярыце нічога, / Нават ключ ад дзвярэй перадайце суседу* 382

*Толькі страціўшы Радзіму, / Будзеш, як камень, / Сляпы і глухі* 248

*Толькі тады, калі неба згаджаецца ўзяць чалавека, зямля згаджаецца яго адпусціць* 383

*Толькі той душы лекаваць дужы, / Што з душою балючай сам* 330

*Толькі той, хто дае з сябе ўсё, мае права на лепшае заўтра* 180

*Толькі той, хто ўведаў, што такое жыць, / Тужыць, што са смерцю ён не размінецца* 383

*Толькі ў маладосці здаецца, / быццам жыць табе вечна* 383

*Толькі ў мамы / Самы суровы дакор / І пяшчотнейшы самы* 136

*Толькі ўперад і ўперад, / Ні кроку назад!* 358

*То – не рукі, якім працаваць не карціць, / То – не сэрца, што век ні па кім не баліць* 176

*Травінка кволая – / І тая не ўзрастае / Дзеля самой сябе* 74

*Травой траву ніколі не стрымаеш, / І ветрам ветру, мусіць, не спыніць, / І полымя не спаліш у агні...* 86

*Трагічна-сумная няўвязка: / ёсць ласка, ёсць патрэба ў ёй, / але раздзелены часта сцяной / патрэба гэтая і ласка* 121

*Традыцыя не толькі дыялог таго, што ёсць, і таго, што было, але і таго, што будзе* 312, 405

*Трывала тое на паверхні, / Што даспявае ў глыбіні* 300, 394

*Трывацьме на зямлі каменны век, / Пакуль на сэрцы / Камень носіць чалавек* 405

*Трывучы мой народ, / А песняю – параніш* 74

*Трымайце лейцы моцна у далонях / і не мыляйце роднай баразны* 176

*Трэба бараніць усё, што любіш, / Каб па праву заспяваць пасля, / Не спявай пра цёплы кут за грубай, / Пакуль горам поўніцца зямля* 167

*Трэба верыць сабе, / слухаць сэрцам зямлю, / Спасцігаць дабраты таямніцы...* 48

*Трэба вучыцца жыць у дзяцей / І яшчэ – / у выдатных людзей. / А гэтыя людзі – / вялікія дзеці / у звычайным дарослым свеце... / Словам, вучыцца трэба ў дзяцей* 136

*Трэба дбаць пра поўныя засекі, / Не ўсім пра мёртвых думаць ёсць калі* 96

*Трэба заўсёды ўзводзіць масты/ З надзей, / Летуценняў / І песень* 180

*Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш, / Абрабіць яго трэба з цярпеннем. / Як ударыш ты ім, – ён, як звон, зазвініць, / Брызнуць іскры з халодных каменняў* 210

*Трэба йсці, не верачы адбою. / Завалы рушыць і вышыні браць, / І цішыні нідзе не давяраць* 167

*Трэба, каб у наш век канвеера і патоку пад кожным вершам, пад кожным радком, пад кожнай дэталлю і кожным словам можна было паставіць, як таўро майстра: «Зроблена ўручную...»* 210

*Трэба любіць і сваіх адмоўных герояў – злой любоўю* 210

*Трэба – / Пабыць на самым дне бяды, / Каб шчасце мець / Пад родным небам* 121

*Трэба слова ўзважыць, / Перш чым ім каго з размаху спляжыць* 281

*Трэба трымаць думку на пільна насцярожаным курку радка* 210

*Трэба тыя* [помнікі] *шанаваць, / Якія не забылі пра падножжа, / Дзе ім наканавана век стаяць* 152

*Тугу прымаю, як аздобу, / Мадонны ўбраўшую чало* 216

*Ты вобмацкам не шукай – / Дарогу веры* 330, 354

*Ты, жаданне, – аковы і вольнасць, / А мастацтву – не будзе канца* 210

*Ты ж у лёсу не лёкай / І не служка ты ў д'ябла, / Пакуль трапнае вока, / Пакуль вострая шабля* 103

*Ты за ядой – як і на працы, / На малацьбе ці на касьбе!* 176

*Ты згасіш сонца, час, але не згіне / Наш род людскі – каманда карабля, – / Ён мачтавыя сосны не пакіне, / Пакуль ім будзе палубай зямля* 263

*Ты любіш народ свой і край? / Песні яго спявай* 289

*Ты маеш, значыцца, хаўрусы / І ў адной чарцы мочыш вусы* 234

*Ты – маці, жонка; ты – дачка, сястра, / Твая заўсёды гожая пара* 136

*Ты – маці, ты – на ўсё гатова, / Усё – змагчы, усё – аддаць, / Адно б вясёлых ды здаровых / Дзяцей пад сонцам аглядаць* 136

*Тым зайздрошчу, / хто многа шляхоў абышоў / І цяпер – з багажом за плячыма* 354

*Ты, мой брат, каго зваць Беларусам, / Роднай мовы сваёй не цурайся; / Як не зрокся яе пад прымусам, / Так і вольны цяпер не зракайся* 281

*Ты мой шлях круты, / ты мой боль святы, / Беларусь мая, / мой алтар* 257

*Тым, / хто спрабуе / паднавіць мінулае, / У будучым няма чаго рабіць* 180

*Тым, хто ў дарозе, / Далёка відаць* 354

*Ты не клыгай старэцкай ступою, / А думай – мне дваццаць адзін* 180

*Ты не тужы – мінецца восень, / Імжа рассеецца, як дым* 86

*Ты падзякуй таму, / што было і што ёсць, / а то болей нічога не будзе* 152

*Ты сам зямлі часцінка... / Ёй – маці – не змані, / Каб не сысці з гасцінца / Любові, / дабрыні* 345

*Ты сам свой інквізітар* ... 224

*Ты сэрцам там, дзе плачуць дзеці, / Бо дзеці слёз не льюць здарма* 137

*Ты так жа, брат, сееш... а дзе ж тваё жніва* 176

*Тых, хто носіць небасхіл у сэрцы, / Нельга ні уджаліць, ні забіць* 60

*Ты – чалавек. / Калі бяда паўзе, / Прад ёй ніколі не спяшай здавацца. / Адлюстраваны у тваёй слязе, / Павінен свет не плакаць, / а смяяцца* 60
*Ты– човен, браце, без вясла* 49
*Тыя, што варты стакрот кахання, – / Тыя не маюць яго на зямлі* 121
*Тэатр збудоўваецца з тайны слова* 281
**У** *абозе нас не шукай* 49
*У акіяне слова – / ані мяжы, ні донца. / Ёсць там адна аснова: / праца / і праца бясконца!..* 281
*У апошнюю дарогу / не бярэцца анічога – / пралетарскі наш той свет* 383
*У балоце сонца не загразне, / Бо яно жыццёвы акіян* 86
*Убачыць свет не злым / Умеюць толькі мамы* 137
*Убачыш камень – ты яго з дарогі / Прымі, каб іншым ён не замінаў* 345
*У блізкіх мовах блізкасць родных душ, / Адзінай дружбы чыстыя крыніцы, / Калі даводзілася сустракаць бяду / І разам паўставаць супраць чужынцаў* 281
*У болю людскога і вясны / ёсць рыса адна агульная – / раптам загінь абсяг зямны, / запоўніць сэрца чуйнае* 234
*У будучыню дзверы / не ў часе, а ў душы* 180
*У веры ідэі няма. У яе ёсць адны правілы паводзін для душы і цела* 121
*Увесь час варушымся, збіраем, / Канца ж патрэбам тым не маем* 176
*У вечнасць / Усе мы з вамі – мост перакідны* 405
*У вёсцы не любяць гнацца за жураўлём у небе, калі сініца ў руцэ* 313

*У вёсцы так было адвеку: / Калі дасціпнае імя / Прышпіліць нехта чалавеку – / То не здзярэ і смерць сама* 313

*Увосень астры даражэй, / Чым сонечнай вясною ружы* 86

*У выраі далёкім / Аднаго для птахаў не стае – / Тых дубоў, / наднёманскіх, высокіх, / Дзе ім трэба гнёзды віць свае* 257

*У выхвалякі ўсе сны каляровыя* 234

*У вяршыні маленькіх і ніцых дрэў / Маланка ніколі не б'е* 86

*У генія ёсць адна асаблівая здольнасць – знаходзіць творчасць ва ўсім* 210

*У горы таксама ёсць месца для любові* 121 335

*У гэтым свеце аніхто не лішні...* 224

*Удалы чалавек і чорта запражэ ў воз* 49

*У добрай гаспадыні і на лёдзе жыта расце* 176

*У жанчыны дзве святасці: сям'я і дзеці* 128, 137

*Ужо ў цікаўнасці дзіцяці / Гучыць разважнасць сівізны* 145

*У жыта з небыццём няма агулу* 86

*У жыцці прыходзім выпадкова, сыходзім заканамерна* 383

*У жыцці заўсёды ёсць настаўнікі і вучні* 96

*У жыцці – нібы ў прымах мы* 383

*У жыцці няма нічога вечнага, / бо жыццё самое да пары* 383

*У жыцці толькі той пераможа, / хто ў сябе мудрасць старца ўвабраў* 383

*У закаханых – рыцарскае званне* 122

*У злога гаспадара – /заўсёды злы сабака* 234

*У злога царкоўнага старасты і мышы злыя – свечкі ядуць* 224, 234

*Узнагарода – памяць, / Памяць – кат* 152

*Узнёслай працай можна здзейсніць цуд* 176

*Узор рэлятыўнай прыроды часу: з пункту гледжання камення ўсё, што ёсць, ужо было, з пункту гледжання промня ўсё, што ёсць, – будзе, з пункту гледжання чалавека ўсё, што ёсць, – ёсць* 405

*Узросту не мае Гармонія, / Не ведае межаў Краса* 347

*Узяць адною рукою два гарбузы адразу – якая гэта назойлівая мара ўсіх хапуг і гультаёў* 234

*Узяць сябе на павадок* 156

*У імя няўмольнага расстання / Над бяздоннем, / На апошнім дні – / Не карай мяне ўсёдараваннем!* 122

*У істоце той, якою быць не выпала, / Сябе адчуй хоць зрэдку, чалавек!* 49

*У канцы дня стань дворнікам сваіх думак і паводзін. Нешта выграбі на сметнік, каб не замінала заўтра сустрэць узыход сонца. Загарні ў залатую фальгу памяці тое, што дапаможа заўтра жыць* 152, 383

*У квадрата чатыры вуглы. / Хай вялікі ці самы малы, /А ўсё роўна, як ні павярні, – / У квадрата чатыры вуглы* 300

*У кожнага – адзіная дарога / Ад метрыкі да некралога, / А паміж імі, як заўжды, – / Хвіліны радасці і горычы гады...* 383

*У кожнага быць павінна / Свая баравіна* 248

*У кожнага ёсць свая школа / І літары ёсць залатыя* 141

*У кожнага зара сваіх надзей, / радасці свае, свае турботы. / Таму не можа звонкі салавей, / пяюн вясны, свістаць па воўчых нотах* 49

*У кожнага з людзей свае даліны і ўзгоркі, свая хада па іх, а неба, зорнае неба – адно...* 49

*У кожнага з нас ёсць сасуд любві. Калі ён не напоўнены ў дзяцінстве, дык усё жыццё будзеш пакутаваць ад смагі і неспатоленасці* 122

*У кожнага з нас свая* ***мелодыя стылю.*** *Чаму ж ты хіліш, каб я спяваў абавязкова, як ты?* 210

*У кожнага зярняці – пэўны шлях...* 354

*У кожнай дзіцячай слязе – вобраз маці* 137

*У кожнай душы немінуча / Сядзяць – Чалавек і журба* 330

*У кожнай кветцы дух жыве ахвярны* 330

*У кожнай песні доля свая, / Адной – лунаць у нябёсах, / Другая між траў / У смутку чмяля / Шукае мядовага лёсу* 290

*У кожнай песні свае тоны / І свой адбітак глыбіні* 290

*У кожным зерні новы колас / Вясны чакае* 180

*У кожны момант і на кожнай мясцінцы зямлі адбываюцца найцікавейшыя рэчы і складаюцца самыя дзівосныя казкі, падобныя іншы раз да праўды, і нараджаецца праўда, яшчэ болей цікавая часамі, чым сама казка* 300

*У кожным паэце / два доны* [донкіхот і донжуан] */ жывуць адначасна* 210

*У кожным слове ёсць мастацтва, / жыве па прынцыпу адным: / з маленства ўступіш у сваяцтва – / не назавеш павек чужым* 281

*У кожным слове жыве дух усёй мовы* 281

*У кожным цудзе не без чалавека. А ў кожным чалавеку не без цуда* 49

*У кожным чалавеку льга знайсці частачку душы паэта* 49, 211

*Украў свініны кілаграм – / прыгаварылі к тром гадам. / Узяў мільён – не вінават: / далі даведку, што вар'ят* 225

*У крывадушшы мы зайшлі далёка... / О, толькі б дзеці не пайшлі далей!* 225

*Уласнаю нагою не згінай / Галіну тую, што цябе трымае* 86
*У ласых да сну – ўкарачаецца век. / Адольвае іх дрымота і сала, / Жывёлай становіцца чалавек* 49, 225
*У літаратуры, як і ў жыцці, людзі падзяляюцца на тых, хто хоча нешта зрабіць, і на тых, хто абавязкова хоча некім стаць* 211
*У людзей і ў прыроды патрэба адна: / нараджацца, расці, расцвітаць без патолі, / покуль вясна* 86
*У людзей не пазычыш для ўласнае роспачы слёз* 74
*У маладосці душа і думкі не абцяжараны развагаю аб мэтазгоднасці* 145
*У маленстве мы спазнаём свет, каб прыняць яго такім, які ён ёсць, каб ведаць, што ён ёсць* 141
*У малым вялікае ўбачыш толькі розумам, / Створана вялікае з дробных велічынь* 338
*У моцных целам ёсць слабое месца, / і волат думкі мае хісткасць меркаванняў* 338
*У наіўнасць, / Што ўсім спавядацца рада; / У шукальнікаў папараць-кветкі / І праўды; / У мару, / Што вечна жыве чаканнем, – / Не кіну ніколі / Насмешкі каменем, / Бо траплю ў сябе* 345
*У нас добрая спадчына, паболей бы добрых спадчыннікаў* 153
*У небяспечны / І трудны час – наадварот: / Стакроць мацней павінен сведчыць / Свой гарт і вытрымку народ* 167
*У новы дзень дарогі / Няма без адкрыцця* 354
*Упадае ў сэрца, / З сэрца выплывае / Любові / І нянавісці рака...* 235
*У палёце імкліва-зямным / Мы, зямляне, – / Ў адным экіпажы!* 74

*Упаў падбіты ў паднябессі жораў, а на зямлі яго не гасне след* 147

*У паэтаў біблейскі ўзрост / на вякі* 211

*У песні ёсць аснова / Той таямнічасці жыцця, / Перад якой нямее мова / Ад лішку мар і пачуцця* 281, 290

*У працы не маеш права: / На роспач, / на слабасць, / на стому* 176

*У прыродзе і людзей / часцей кусае дробненькая сошка – / камарык, блошка, / клопік, / мушка, / мошка, – / а буйныя драпежнікі радзей* 86

*У птушак заўсёды застаецца / недаспяванае, / У дрэў – / недашумленае, / У чалавека – / недагаворанае* 86

*У радасці свае парадкі, / Свае крыжы, свае вянцы – / Такія светлыя пачаткі / І вельмі сумныя канцы* 349, 394

*У радасці свая вясна, і калі стане вясновай душа – народзіцца радасць* 349

*У радовішчах чалавечай існасці ёсць пласты, дзе думка і пачуццё сустракаюцца, дзе пачуццё – гэта ўжо і думка, дзе думка – гэта і пачуццё. Калі карані верша не дасягаюць да тых пластоў, тады ён узор дэмагогіі, якая пра ўсё можа нешта сказаць, але нічога не можа выказаць* 211

*У сажалцы застойнай / не ачэрпаць / крынічнае / гаючае вады* 358

*У самім слове няма ніводнага атама, няма нічога з таго, што падуладна смерці. Яно, хоць само жывое, не праходзіць звычайных стадый усяго жывога: нараджэнне, сталенне, старэнне, смерць. Бо яно дух, а дух не мае смерці* 282

*У самых мудрых – самы горкі лёс* 104, 300

*У свабоды адзін абаронца – праўда* 161

*У свеце / Перанаселенасць на боль* 235

*Усе ведаюць, што вакол нас – бязмежжа, але ніхто не ведае, што ў нас саміх – яшчэ большае бязмежжа,* 49

*Усе дарогі, апроч тых, што вядуць на пагост, – / Бясконцыя* 354

*Усе знаходзяцца на аднолькавай адлегласці а д Бога, але на рознай д а Бога* 330

*Усе людзі нараджаюцца роўнымі перад жыццём. Гэта час і пасады іх потым падзеляць на вялікіх і малых, на адказных і простых, на тых, хто кіруе, і на тых, хто мусіць падпарадкоўвацца* 74, 394

*Усе мы змалку / Марым аб нябёсах, / Паціху урастаючы ў зямлю* 180

*Усе мы ў хадзьбе / Да небакраю* 358

*Усе мы чакаем друга. Таго, што не здрадзіць, не кіне ў бядзе, зразумее цябе не толькі ў празрыстым шчасці* 110

*Усе мы – як лісце на дрэвах... Пакуль вецер часу не адарве нас ад галінкі, праз якую мы злучаны з дрэвам, мы расцём, зеланеем. Мы жывём!..* 405

*Усе пакуты чалавецтва – ад недахопу інфармацыі* 74

*Усе разумныя дружаць між сабою, усе дурныя – сварацца* 110

*Усе шляхі вядуць дахаты, / Выток шануючы / Спрадвек* 354

*Ўсе шляхі прыводзяць не да Рыма, / А да родных вербаў і бяроз* 354

*Усё было – і ўсе ж, / Што будзе – не было* 180

*Усё ва мне і я ва ўсім – самы неабходны, самы патрэбны творчы прынцып для пісьменніка* 211

*Усё дапушчальна, калі дапускаем...* 300, 394

*Усё ж пазна́еш і па ўдарах сэрца, / Дзе наша, дзе чужая старана* 248

*Усё жывое расце знутры: дрэва з зярняці, квецень з дрэва, плод з квецені, зерне з плода... Кірунак слова, як і зярняці, – знутры* 282
*Усё жыццё – адно імгненне. / Зацвіў... Час прыйдзе адцвісці* 383
*Усё жыццё жывем расстаннем* 384
*Усё жыццё – змаганне з цемраю* 384
*Усё жыццё – з сустрэч і развітанняў* 384
*Усё жыццё – паэзія і кроў, / Усё жыццё – трыванне і спатоля* 384
*Усё з зямлі. / З яе адной* 263
*Усё знікае, праходзіць, як дым, / Светлы ж след будзе вечна жывым* 147
*Усё золата, якое толькі ёсць на свеце, – нікчэмная драбяза і непатрэбшчына перад самім жыццём* 96, 384
*Усё мае сваю мяжу, і толькі цярпенне наша, о Божа, бязмежнае* 313, 330, 394
*Усё мінае –/ Гонар не мінае, / Бо народжаны адным сумленнем* 60
*Усё міне, а праўда застанецца, / І толькі ёй адной заўсёды жыць* 301
*Усё міне, а праўда застанецца, / На ўсё жыццё пакіне росчырк свой* 301
*Усё мяняецца на свеце, / Не толькі дзеці* 137
*Усё найцяжэйшае можа ўспрымацца і перажывацца, як найлягчэйшае, калі ёсць у чалавека тое, чым можна апраўдаць яго* 225, 384
*Усё пакінуць след павінна,/ Бо, як пачаўся белы свет, / Прамень, пясчынка і расінка / Нязменна пакідаюць след* 147

*Усё памерана ў прыродзе. / Аблокі – ўнуку. / Дзеду – яма. / Прыроду не расчуліць лямант* 85, 394

*Усё патрэбнае чалавеку – у ім самім, ён можа змясціць у сабе ўвесь свет, які ніхто не адбярэ,* 49

*Усё пачынаецца ад маці, / Ад мовы роднае зямлі* 137

*Усё створана для любві, усё падапарадкавана яе мудрым законам, і таму нам – і ў жыцці, і ў літаратуры – не трэба парушаць гэтай задуманай гармоніі* 122

*Усё ў жыцці лагічна, / калі ўсё яно – з нягод...* 384

*Усё ў жыцці наперад згадана – / І ў чалавека лёс такі: / Згараюць зоркі, зоркі падаюць – / Не тухнуць, быццам светлякі* 104

*Усё ўспамінам стане* 153

*Усё, што варта нас, / Дарогу заступае, / Бо шлях адзін: не ўскрай, а толькі праз* 355

*Усё, што ёсць, / што будзе, – / Набытак мазаля* 176

*Усё, што ў пару́ сваю, – лепей* 394

*Усім патрэбна сонейка, каб выжыць* 87

*Усім роўна хочацца жыць на свеце і ўзяць ад жыцця і радасць, і гора, і ўсё тое, чым спатыкае яно кожнага* 96

*Усім хопіць месца пад коўдраю славы. Яна ж засцілаецца штораз па-новаму* 169

*Усіх жа вятроў не глынеш, / Вятрам няма мер, няма меж* 87

*Усіх нас прывучылі за паёк / Не там, дзе трэба, бачыць вінаватых* 225

*Усіх пачаткаў я – працяг, / Усіх працягаў я – пачатак,* 50, 395

*Усміхніся ўсяму, / Што варожаю цемраю гнеціць...* 216

*У смуткаў не бывае двайнікоў* 216

*У снежнай наквіцці душы / Ніколі сэрца не прымусіш / Красу і гордасць патушыць* 60, 347

*Успамін і будучыня – / У адным сэрцы. / А ўсё ж будучыня – / Грэе цяплей* 180

*Успаміны сэрцу не апора...* 153

*У старасці па-дзіцячы здзіўляцца, як гэта вечна, правечна цякуць па зямлі розныя па велічыні, па красе ды такія шматлікія рэкі...* 145

*Устойлівасць і напраўду моцная, але настойлівасць... мацнейшая за яе* 395

*Усю Беларусь – неаб'ятну, як мора, убачыць у ясным, як сонца, святле* 257

*Усюды і ва ўсім трэба мець розум і ведаць меру* 395

*Ўся вартасць людскога жыцця – у тварэнні, / Калі застаецца раз'іскраны след!* 384

*Уся зямля – адзін стары курган, / Куды сышліся нашых продкаў продкі* 263

*Усякая разрозненая сіла, сабраная ў адно, звязаная крэпкім абручом і накіраваная ў адзін пункт, робіць цуды* 156

*Усякі, нават геніяльны паўтор – гэта ёсць бяссілле непаўторы* 211

*Усялякая канцэпцыя плённая датуль, пакуль яна здатная рухацца і змяняцца. Зацвярдзелая – яна замінае жывому, становіцца перажыткам* 358

*Ў сямнаццаць кветак ты не бачыш, / Сам – нераспушчаны бутон* 145

*Усяму, перш чым быць, жыць, трэба нарадзіцца. І чалавеку таксама* 384

*У тэатр папасці лёгка, за кулісы трудна* 301

*У халёнага, хамелеоннага,/ Прыстасаванага і не ўлюбёнага / У нашу зямлю – не ўздрыгне душа,* 50, 263

*У цэлым свеце, на планеце, / Ва ўсіх краях, ва ўсіх кутках / З'яднае ўсе людскія сэрцы / Твой* [маці] *вобраз з дзіцем на руках!* 137

*У цэнтры – мы, уладары, / вакол – прырода, як імперыя, / ляжыць, прынёсшы нам дары* 87

*У чалавека ёсць два шляхі абессмяроціць сябе: мастацтва і дабрата. Першы падуладны нямногім, другі – усім* 96, 345, 355

*У час, калі жыццё як падарунак, / Апошнім можа быць / і кожны ўздых, / І кожны пацалунак* 96

*У Чырвоную кнігу занесены рэдкія прадстаўнікі фаўны і флоры. Толькі чалавека там няма,* 50

*У шчэбет і посвіст птушыны / З далёкіх і блізкіх дарог / Высокае імя Жанчыны / Прыводзіць на родны парог* 128

*Уяўленне аб рэчаіснасці і сама рэчаіснасць – розныя рэчы* 301

*Фарба сораму – самы чалавечны колер нашага твару* 345

*Філасофія – гэта кругазварот думак чалавека* 313

*Філосаф пра простых людзей кажа так: яны зведалі ўсё і не спазналі нічога ў гэтым свеце – няшчасныя людзі. Звычайны чалавек адзначыць: яны былі, зведалі гора і нястачу, каханне, радасць і сум – шчаслівыя людзі* 313

*Філосафы любяць пачынаць свае разважанні тэмаю пра пачатак існага, але аб самім існым нічога зразумелага не скажуць* 313

*Хай бед людскіх не развязці рукамі – / Успыхне слова выйсцем пра запас* 282

*Хай Беларусь, мая старонка, /Ускрэсне к лепшаму жыццю!* 257

*Хай будзе лад ў сваёй гаспадзе / Стварацъ народ-уладца сам* 110

*Хай вам, бацькі, не плачацца па дзецях: / нам сцежкі вашы весці ў глыб жыцця* 137

*Хай вочы есць / папрокаў дым / усім іудам маладым!* 235

*Хай душа баліць, / Хай ачысціць боль* 330

*Хай кажа слова чалавечы род!* 282

*Хай лепей ніколі не будзе краіны, / Чым будзе краіна – без волі* 161

*Хай песня будзе, як песня. / Ганаровы у песні удзел: / Яна не напітак прэсны, / А самы моцны хмель* 290

*Хай помніць кожнае ліслівае цяля, / Што можна ссаць, ды можна й абассацца* 235

*Хай раней за дабро памірае гнюсь, / Хай сонца жыве, хай гіне туман... / Бо як без беларусаў мая Беларусь, / Так Арменія без армян* 225

*Хай салодзіць думка, калі плод гарчыць...* 282

*Хай светла збудзецца, што светла сніцца* 180

*Хай свеціцца між зорак у сусвеце / Зямля – / людскі наш інтэрнат* 263

*Хай славіцца наш беларускі род, /душой з вясны і воляю са сталі, / каб з гнёздаў нам не пеўнікі на плот, / а горда арлянята вылятали!* 257

*Хай слова слова апячэ, / І хай шукае месца клічнік /У неадкрытым, / у яшчэ / Чужым і стоеным абліччы* 282

*Хай спеюць няспешна ісціны* 301
*Хай страціш ты многа, / Каб долі сапраўднай не страціць* 104
*Хай схлусіць хітры рот./ Вачамі – не падманіш* 235
*Халаднавата сэрцу ў мове чужой, / Нібыта ў неасвечаным храме, / Што поўніцца неабжытай імжой / І неўсвядомленымі дарамі* 282
*Халодная ўвага / не вартая ўвагі* 60
*Хамы лічаць заўсёды «хамскім» / Матчыну песню і матчыну хату* 225
*Хаос нічога не знішчае, а толькі пераводзіць у іншы стан* 395
*Хата – прыпынак роднае мовы, / веры, што, покуль народ будзе жыць, / мова прыдасца для шчырай размовы* 282
*Хаты не могуць, як дрэвы, расці* 137
*Хацела аднаго ад долі: / Душою з небам гаварыць* 330
*Хацела лёту – і цяпер ты птушка* 181
*Хацела словы слаць прывету, / А выйшла песня незнарок* 290
*Хацела сцежкай крочыць гладкай, / А спатыкнулася аб пень* 104
*Хацеў – пацешнае, выйшла – грэшнае...* 216
*Хвала і слава могуць разлучыць, / А гора і бяда заўсёды збліжаць* 335
*Хвалімся: глядзім у свет далёка, / З выкладкай прадвызначаных вех!.. / А не бачым часта, як пад бокам / Самы блізкі / гіне чалавек* 75
*Хваліўся збан, што носіць воду, / Але забыўся на слупкі* 235
*Хвалюе музыка, паэзія – як музыка, а добрая, з божым знакам проза таксама хвалюе – паэзіяй* 211

*Хваробы лечаць і атрутамі* 301, 313

*Хварэць на пана* 225

*Хіба без песні жыў чумацкі шлях?* 290

*Хіба ж высока ўзняцца вераб'ям / Над вышынёй пустой мякіннай кучы?!* 104, 301

*Хіба, каб адолець дарогу спаўна, канчаткова, дарэшты, трэба спаткнуцца аб кожны камень, зваліцца ў кожную яму, патрапіць у кожны след?!* 355

*Хібам нашым ёсць апраўданне, / подласці апраўдання няма* 235

*Хіба можна бачыць, не гледзячы? / Хіба можна чуць, не слухаючы? / Хіба можна гаварыць, не адкрываючы рота? / А ўсё ж гэта спрабуюць рабіць тыя, хто добраахвотна і лёгка адмовіўся ад роднай мовы* 282

*Хіба яна* [маладзіца] *вінавата, што яе зрабілі такою... пацяробкі культуры* 75

*Хлеба кошт не адзін: / то спаўна, / То над крошкай трасуцца галовы... / Не мяняецца толькі цана / Гэткай дробязі – добрага слова* 183, 283, 395

*Хлеб – гэта ўсмешка зямлі* 183, 263

*Хлеб – ёсць здаўна завядзёнка – / Першы ўзыходзіць на стол* 183

*Хлеб – мой і твой, яго і ўсіхны. / Ні для каго – не дармавы* 183

*Хлеб, напэўна, нікому не горкі, / Толькі горкая праўда зямлі* 263

*Хлеб... Не за свой загар румяны, / А за святло, што ў душы нёс, / У песнях з сонцам ён зраўняны, / Як цар зямлі – з царом нябёс* 183

*Хлеб, соль і вада – / вось маладзецкая яда* 183

*Хлеб!.. Толькі смачны, вечна смачны – / Калі зароблены і свой* 183

*Хлеб – / як любоў! / Яму чысціня / Сэрцаў людскіх патрэбна, / Увага / І дабрыня, / А ўзамен – / скібачка хлеба* 183

*Хлусяць не багі, а людзі, / Крывадушнічаюць не багі* 330

*Хоць бы год, / Каб наш свет – без грымот!* 161

*Хоць век ніхто мне не надточыць, / Другога не хачу жыцця, / Бо нават будні дзень – / святочны, / Ён – / час зямнога адкрыцця* 406

*Хоць горшы, а быць сярод лепшых* 349

*Хоць груба скажа – але трапна, / Хоць рэзкі выраз – але свой* 283

*Хоць з наўпростай дарогі / Смяецца крывая, / Праўда ходзіць / Наўпростай дарогай здаўна* 301

*Хоць і паны вы па выгодах, / але па сутнасці – рабы* 225

*Хоць любоў на зямлі адна, / Паўтарыцца можа яна* 122

*Хоць мова наша не царская, / Ды гаспадарская* 283

*Хоць могілкі адны – / парадкі не адны: / Усё ўлічана ў бетоне – / І тытулы, / і рангі, / і чыны...* 395

*Хоць на словах – / за рэанімацыю, / зброю новую / ціха намацвае* 167

*Хоць* [дрэвы] *невідушчыя, але і не сляпыя, / Мы ж і відушчыя, але падчас нямыя...* 335

*Хоць не забылі б сейбітавы дзеці, / Што сіла ў сіле роднае зямлі* 263

*Хоць, праўда, хлеб ядуць і з вуды, / Але не ўсе і не заўсюды* 183

*Хоць прыйдзе спёка, мароз лютуе – / Зярняты праўды зямля ўзгадуе!* 301

*Хоць раз, ды добра агрызнуўся!* 60, 156

*Хоць сэрца просіцца ў адстаўку, / А я адстаўкі не даю* 176

*Хоць ты і важным пеўнем стаў, / На індыка не надта кукарэкай!* 235

*Хоць часам праўда / прад маной / і гнулася, / Ды не на гэтым белы свет стаіць...* 301

*Хоць чорт, а здавацца прыгожым* 350

*Хоць шляхціц цёмны, як саган, / Затое ж сам сабе ён пан* 235

*Хоць шмат на свеце ёсць маны, / Для праўды ж – не – няма труны: / З вады ўсплыве яна і з мроку* 301

*Хочацца, прызнаюся, на «ты» / Хоць хвіліну з вечнасцю пабыць* 406

*Хочаш жыць у святле і цяпле – / Сам здабывай агонь для сябе* 384

*Хочаш сябе ты пазнаць, – / паглядзі на людзей, на іх справы; / Хочаш людзей зразумець, – / у сэрца сваё зазірні!* 75

*Хто адцураўся маці-Айчыны, – / Мовы яе той нават – баіцца* 248

*Хто волю верна сніць, / Працят лятункам аб вялікім, / Таго не спакусіць / Ні ўладай, ні дабром бязлікім* 161

*Хто ганарлівы, той і зайздросны* 225, 235

*Хто гандлюе святыняй – той маці сваю прадае* 330

*Хто глыбіні спазнаў, / Не прыходзіць назад* 225, 313

*Хто гэта знае: чаму на чужыне / Вецер у вочы дзьме пылам заўсёды* 248

*Хто ж дужэй ад грамады?* 75

*Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, / Хто забыў сваю мову – усё згубіў* 137, 283

*Хто з дапамогай войнаў вырашае праблемы – той вар'ят* 168

*Хто зямлю пакалечыць, згвалтуе – / Рукі пеклам смалы засмалуе* 263

*Хто йдзе – не мінае, бярозу ламае, – / Ніякага жалю нялюбасць не знае* 87

*Хто з песняй ды танцам сябруе, той і грашыць меней* 290

*Хто многа любіў – даруецца многа, / Хто мала любіў – даруецца мала* 124

*Хто мову сваю ганіць – матчын дар, /Не прынясе карысці ён народу, / Бо па жыцці, як люты янычар, / Ён коціцца – ні племя і ні роду* 283

*Хто можа ведаць, што нас стрэне? / Нам прышласць наша не відна* 104

*Хто мужны, хто смелы, хто дужы, / Хто цэлем працят залатым, / Над тым неўладарныя сцюжы, / І лёс неўладарны над тым* 156

*Хто навучан – праспявае фразу звонкай навіны* 141

*Хто навучаны болем: да слёз даравацъ, / Той шчаслівае заўтра для заўтра прарочыць* 122, 181, 226

*Хто навучаны болем – маліцца часцей –/ І маленькаму шчасцю быў радасна рады* 235

*Хто на вяку задужа крыўд зазнае, – / Не зробіць бліжняму ніякае бяды* 75

*Хто намагаецца ўсяму надаць сэнс, той мудрэц* 313

*Хто нараджаецца, той не пытае, што яму рабіць* 301

*Хто не здольны прад здзекам спыніцца – / Панаваць той не будзе ніколі* 61

*Хто не любіць волі, – не нашага роду* 161

*Хто не любіць роднай мовы, / Той любіць толькі сам сябе* 283

*Хто не спытаў хоць раз трывогі, / Жыццю не ведае цаны* 384

*Хто не хвалюецца, тым можна / Усёй душой паспагадаць* 350

*Хто носьбіт ёсць пачатку злога, / Не патурай таму ні-ні* 225

*Хто падказаў дрэву, усяліў яму думку, што яно павінна нарадзіць свой плод, свой працяг?* 87, 181

*Хто перад лёсам віхляе анучай, той і звання не варты «народ»* 104

*Хто плюе на жанчыну – / той, нелюдзь, плюе на Радзіму* 128

*Хто прывучаны ў здрадзе / душою крывіць, / Апраўданню свайму / той шукае прычыны* 235

*Хто разбурае свой дом, таму наканоецца вецер* 168

*Хто раней, / хто пазней, / Толькі ўсе / Зноў і зноў / Мы прыходзім / Да простых, / як хлеб і паветра, / Высноў: / Што жыццё чалавеку – / Любому – / Даецца адно, / І што, / як ні надточвай, / Кароткае вельмі яно, / І што праўда на свеце / Адна – / Без крупінкі маны, / І што шчасця на свеце / Няма / Без сваёй стараны...* 249

*Хто сам не творыць дабраты, / На дабрату не мае права* 345

*Хто склаў песню народу, / Яе рэхам уваскросне* 290

*Хто стане здзіўляцца, што ў хаты ёсць дзверы, у поля – сланечнік, у неба – сонца?.. Здзівяцца, што няма* 302

*Хто страх не зведаў – той і не баіцца, / А той, хто зведаў, – не забудзе страх* 335

*Хто страціў цікавасць да прафесіі, ідзе ў палітыку* 176

*Хто судзіць сябе не ўмее, / Не можа іншага судзіць* 226

*Хто сумленню і праўдзе служыў, / Значыць – век не дарэмна пражыў* 345

*Хтосьці жыў, хтосьці неба капціў, / Кожны мае сваё, па заслугах* 395

*Хто «ўладарыць», той ударыць раптам / Па надзеі, па душы жывой* 226, 330

*Хто ў людскім свеце жыў ад нараджэння, / Без страт няўхільных не пакіне свет* 384

*Хто хаваецца ад сонца далоняй, / у таго і сэрца з лядоўняй* 226

*Хто хлеб дае чужым сабакам – / Свае забрэшуць на таго!* 226

*Хто хоча забіць сабаку – вінаваціць яго ў шалу* 236

*Цаніце чалавека / Заўсёды пры жыцці,* 50

*Цела ўмірае, а дух не памрэ* 331

*Цемра – найбольшае адасабленне: у ёй нічога няма. / Святло – найбольшае ўвасабленне: у ім ёсць усё* 87

*Цені – спадарожнікі святла, / Цёмныя яго далоні* 395

*Цеснаватае ўсё ж для пісьменніка пракрустава ложа крытычных абмежаванняў, бо мастак павінен быць шырэй усіх гэтых берагоў, штучна ўзведзеных вакол яго* 211

*Цёмнымі і даверлівымі лягчэй камандаваць* 75, 226

*Ці гэта час належыць нам, / ці гэта мы яму належныя?* 406

*Ці ёсць апраўданне такому каханню, / Якое катуе, якое нявечыць?* 122

*Ці ж мы, хлопцы, рук не маем? / Ці ж нам сілы бог не даў?* 176

*Ці мала што ў жыцці бывае! / Якіх вузлоў не вяжа лёс! / Няшчасны той, хто ўсё прымае / Да сэрца блізка і ўсур'ёз* 104

*Ці не лепш: што ні маем – усё напаказ, / Каб убачыць, што ганьбіць, / што ўсцешвае нас* 61

*Ці ты музыка з ласкі божай / І для цябе твой дар – твой крыж, / Ці – дзеля сытасці і грошай / Людзей забаўкамі чмурыш?* 212

*Цуд, каб часты быў, не зваўся б цудам* 302

*Цукар – твая мова, / Слодыч скрозь адметна. / Сведчу, адным словам, – / Пішаш дыябетна* 212

*Цэмент і моцны, і выклікае давер, але без слабога і мяккага пяску не абыходзіцца* 302

*Цябе сустрэне Ўсё, / праводзіць Анічога* 385

*Цяжка расці сярод людзей, у якіх няма чаму павучыцца* 75

*Цяжка сваімі рукамі звязваць крылле сваёй душы* 331

*Цяжка стаяць над магілаю свайго жыцця і пазіраць на яго развалiны* 96

*Цяжкасці дазваляюць ісці хутчэй. Кісцяпёрая рыба, выйшаўшы на сушу, «пайшла» хутчэй і «дайшла» да чалавека* 314

*Цяжка такое – пераджыць свае магчымасці. А ці ж усіх сярод нас можна назваць прафесійнымі?* 212

*Цяжка таму, хто не можа смела сказаць аб сваіх думках і хто мусіць насіць іх, як атруту, на сэрцы* 283

*Цяжка ўявіць, / што бачыш / часу свайго распад, / Думаючы пры гэтым / пра нескончоны час* 406

*Цяжка, як без паветра, / людзям жыць без паэта / з ненацягнутым імем – прарок* 212

*Цяжкая цана / Ісціны, што глеба ёсць пад намі, / Хоць часамі зыбкая яна* 302

*Цяпер зайздрошчу я табе, пясняр: / Ты і жывеш і будзеш жыць крылата!* 212

*Цяпер маленькія краіны могуць такое натварыць, што і вялікія не рассёрбаюць* 75

**Ч***акайце, калі ёсць каго чакаць* 350

*Чакаць тады спакойна можна, / Калі няма чаго чакаць!* 226

*Чалавек адно датуль шчаслівы, / Пакуль сам / умее шчасце даць* 122

*Чалавек, аказваецца, як і дрэва, пускае карані, а то і парасткі, дзе б ні апынуўся, на якую б зямлю яго ні пасадзілі* 50

*Чалавека робіць гаспадаром, ачышчае ягоную душу толькі ўласнасць* 96

*Чалавека сляды у стагоддзях не гінуць. / Гэта помні заўжды, / Перш чым след свой пакінуць* 147, 406

*Чалавек без бацькоўскага краю, / Як без песні ў гаі салавей* 50

*Чалавек без вачэй – яшчэ чалавек... Чалавек без слыху – яшчэ чалавек... І без рук ды без ног чалавек – чалавек... Чалавека няма без душы!* 50

*Чалавек – бездань і неба адначасова* 50

*Чалавек – гэта два чалавекі, як дзве / далоні, што лепяць суладна снежку ці / перакідваюць, каб утрымаць, жарыну: / адзін з іх – пачатак, другі – завяршэнне, / адзін з іх – выток, другі – суток, / адзін з іх – прычына, другі з іх – вынік, / адзін з іх – пытанне, другі – адказ, /а паміж імі цякуць, вынікаючы з іх / і ўпадаючы ў іх, сусветы... Калі чалавек сустрэнецца з чалавекам* 50, 395

*Чалавек жа, нават і акамянелы, не бывае без сэрца* 51

*Чалавек жыве дзеля дабра, дзеля служэння праўдзе, каб стварыць нейкія вартасці жыцця і каб быць карысным іншым* 51

*Чалавек жыве, жыве, а потым памірае, як быццам і не падумаўшы, што гэта ж – назаўсёды* 51

*Чалавек жыве ілюзіямі. Незадаволены тым, што мае, ён стварае казку пра лепшае і пачынае жыць у ёй, як за сценамі пабудаванага самім шклянога палаца* 51

*Чалавек жыве ў звязку з усім і толькі таму зусім не памірае* 51

*Чалавек заўжды мае патрэбу ў суцяшэнні* 51

*Чалавек – заўсёды бог. Але тады, калі ён падобны толькі на самога сябе* 51

*Чалавекі як ліхтары – / У кожнага / Свечка душы ўнутры* 51

*Чалавек мае найвялікшую здольнасць – смяяцца з самога сябе* 51

*Чалавек, маўляў, дзеля таго і прыходзіць на свет, каб жыць, а жыць – значыць працай сваёй рабіць добрае* 51

*Чалавек моцнай волі... Чалавек, які можа памерці, калі захоча, і які не памрэ, як бы да гэтага ні прымушалі абставіны* 52

*Чалавек не знікае так, / Бы ў кішэні вякоў пятак* 52

*Чалавек не толькі часовы, але і пазачасавы, і з гэтай пазачасавасцю, як са сваёй жабрацкай перспектывай, сустракаецца не толькі ў канцы свайго шляху, але і ў кожным яго пункце, калі адважваецца паглядзець над сабой, калі ўскрыльвае духам* 52, 406

*Чалавек павінен умець не толькі стрымліваць свае пачуцці. Ён павінен умець і абурацца, пратэставаць, калі гэта трэба* 52

*Чалавек павінен чалавеку / Радасці прыносіць кожны дзень* 75

*Чалавек памірае, калі страчвае здольнасць / Здзіўляцца і захапляцца / Жыццём* 52

*Чалавек, памятлівы на дабро, – самы добры* 345

*Чалавек свабодны толькі на адзіноце* 161

*Чалавек спакайнейшы і шчаслівейшы, калі ён кіруецца характарыстыкамі жыцця, а не яго фактамі* 52

*Чалавек спрабуе сябе / ад пачатку дзён да канца. / Чалавек спрабуе сябе – / і сумненням няма канца!* 52

*Чалавек – сусвету цар* 52

*Чалавек таму і чалавек, / Што Учора ў ім жыве заўсёды* 52

*Чалавек – трэска на вяршыні хвалі, і хваля круціць гэтую трэску так, як захоча* 52

*Чалавеку дадзена не ўсё ведаць, але вельмі шмат памятаць* 53

*Чалавек усё ж павінен / Баяцца нечага ў жыцці* 53

*Чалавеку ўсё ў радасць, а каб ён асэнсаваў цану гэтай радасці, часам засылаецца і гора* 53

*Чалавеку цяжка перарабіцца адразу. Можна думаць і гаварыць іначай, а сам чалавек доўга будзе ранейшым* 53

*Чалавеку юнацтва даюць толькі раз – / Хай жа будзе яно хоць шчаслівым* 53

*Чалавеку, які не зразумее сябе ў цяжкім мінулым, нялёгка будзе і ў светлай будучыні* 53

*Чалавек, што лунае высока, / з вышыні не даказвае гарт* 53

*Чалавецтва, стань жа ўрэшце / Чалавекам* 53

*Чалавечая мова / заўсёды даецца з калыскі. / Але голас асобы / прырода дала салаўю, / І яна не знаходзіла, мабыць, / ніякай карысці, / Каб і птушкі ўсе пелі / аднолькава песню сваю* 283

*Чалавечнасць, як вечнасць, / Твой бязмерны маштаб!* 345

*Чалавечнасць, / яна – ад слова «чалавек»* 345

*Чаму вы, хвалі, хоць імкнеце ўдаль, / Аднак усюды – берагоў палонныя?* 87

*Чаму ж павінна гэта зорка / Свяціць яму? Чаму – не мне?* 87
*Чаму ж тады дарога дамоў / Карацейшая, як з дому, / Аб чым знае нават конь* 355
*Чаму ж тады жыццё зямное / Мне даражэй – з яго маною – / За праўду вечнасці самой?* 385
*Чамусьці ўсе бяздарныя лічаць сябе несмяротнымі. А можа яны і маюць рацыю, бо, як вядома, чалавечае глупства – вечнае* 236
*Чарнобыль сягоння – / Везувій сусветнага болю* 236
*Час Адама ад яблыка / горкі* 406
*Часам глупства можа набыць славу мудрасці, калі яму не пярэчыць* 170, 314
*Часамі да самых простых ісцін мы даходзім запозна* 302
*Часамі ж трэба пабыць аднаму, зусім аднаму, каб не чуць і голасу людскога* 339
*Часамі кара абыходзіць міма / Гібрыдаў шкодніка і падхаліма* 226
*Часамі мана – апраўданне... Бывае і ў праўдзе лухта* 236
*Часамі самае маленькае знаходзіцца ў блізкай і цеснай сувязі з самым вялікім. Трэба толькі ўмець знайсці месца іх стыку* 339
*Часамі самыя простыя рэчы пры пэўных абставінах паказваюцца страшэнна заблытанымі, завязанымі ў такі вузел, што і развязаць нельга* 339
*Часамі скуле і хваробе / Наровяць самі дактары* 226
*Часам сыходзіць у зямлю крыніца, / Дзесь у нетрах таёмна бяжыць, / Але мусіць урэшце на волю прабіцца, / Шмат яшчэ па зямлі будзе ліцца-каціцца / І радзімаму краю служыць* 248
*Час вельмі не любіць, каб без яго перараблялі гісторыю* 406

*Час вялікіх спраў – / не да малых!* 406

*Час загойвае ўсякія раны. Але бывае, што ад тых ран астаюцца рубцы, якіх не можа згладзіць ніякі час* 407

*Час і грошы – дзве рэчы, якіх заўсёды бракуе чалавеку* 407

*Час – / калі адна мэта / слухаецца другую. / Бясчассе – / калі замінае / кожная кожнай* 407

*Час – лекар болю, а яго шпіталь – / Без краю, без пачатку памяшканне* 407

*Час – лекар болю, боль – жывая рана, / Дзіця, не ўтаймаванае нічым: / Ні вечнай калыханкай акіяна, / Ні вечнасці надвор'ем штармавым* 407

*Час – люстэрка, якое дазваляе ўбачыць сябе як некага. Але сябе – мінулага* 407

*Час – найлепшы доктар чалавеку. Ён уціхаміръщь хоць які боль* 407

*Час настаў такі, / Калі – ні ў вучні, ні ў настаўнікі* 407

*Час – непадкупны і справядлівы суддзя! / Даруй старэйшым, / Якія асуджалі мяне за маладосць, / Бо самі да яе / Ўжо не маглі вярнуцца. / Даруй і маладзейшым, / Якія асуджаюць мяне зноў / За старасць, / Забыўшыся, што з ёй / І ім не размінуцца* 145, 407

*Часова – навечна: вечная памяць у форме рэха...* 407

*Часова ўсё, да роспачы часова* 408

*Час праходзіць праз душы людзей, нанізвае іх, як на верацяно. Мы не належым сабе, мы належым часу* 408

*Час просіць першае зрабіць – / Не даць усемагутны розум / Рукою нелюдзяў забіць* 408

*Час робіць вялікім, што некалі здавалася не вартым увагі, але той жа час нярэдка робіць звычайным, будзённым і не-*

*прыкметным тое, што яшчэ зусім нядаўна лічылася вялікім...* 408

*Час смерці, у якім усё згушчаецца, факусіруецца і пераацэньваецца, паказвае чалавеку, кім ён павінен быць у жыцці* 385

*Час узбуйняе мастака. Чым далей ён ад нас, тым значнейшымі здаюцца нам яго творы* 408

*Часу няма калі жыць* 408

*Часцей за ўсё людзі не сэнсу жыцця шукаюць, а, самі таго не падазраючы, шукаюць прычыну смерці* 385

*Часцей сумленне сваё турбуйце, / Не зневажайце яго законаў* 345

*Час, што ніяк не спыніць, – / Ведае ўсё: ён ад Бога найпершы вястун* 408

*Час – як грамацей* 408

*Чорным вокам здрада гляне – / маладосць, як ружа, вяне* 236

*Чуе ў бядзе чалавек чалавека. / Да Чалавека ідзе Чалавек* 75

*Чужое неба сэрцу не дагодзіць, / душы не загадае: «Не балі...»* 249, 331

*Чужое неба шчасця не дае* 249

*Чыжу не быць арлом крылатым!* 87

*Чый лік / я на зямлі памножу – / Гаспадароў або гасцей?* 53

*Чым больш з людзей хто выдатнейшы, / Таго і зоркі блеск яснейшы* 53

*Чым больш пазнаём мы свет, тым меншую цану маюць для нас яго скарбы, тым болей бачым благога. Болей здзеку, крыўд і слёз* 226, 314

*Чым больш пакут, тым болей сіл трываць* 314

*Чым больш свайго сцураўся-зрокся, / Тым больш сучасны, вертапрах!* 249

*Чым большы начальнік, чым вышэй сядзіць, тым цяжэй яго дастаць* 53
*Чым больш я адзіны, тым больш усіхні, чым больш непаўторны, тым больш увабраў у сябе паўтораў, чым больш неўміручы, тым болей адкрыты смерці...* 75
*Чым вышэйшы ўзровень культуры таго ці іншага народа, тым больш таленавітых людзей з гэтага народа ведаюць у свеце* 76
*Чым глыбей чалавек апускаецца ў сваю душу, тым вышэй падымаецца ў сусвет* 331, 396
*Чым далей / Ад зямлі мы збяжым – / Тым бліжэй да бяды* 264
*Чым далей ад паверхні мы зямлі, / То ўсё даступней нам яе глыбіні* 264
*Чым жыць і гінуць век у кайданах, / Лепш вольным пасці* 161
*Чым захапляўся – / тое наракае* 408
*Чым меней праўды, тым гусцейшы морак* 302
*Чым часцей даведваюцца да нас нягоды, тым глыбей пачуванне цаны жыцця, тым ясней яго светлыя моманты* 385
*Чыстая душа не ўгразне ў бродзе, / Ёй свяціць алмазам і на дне!* 331
*Чысціць крыніцы – дужа цяжкая, брудная, смуродная праца. Але ж той, хто хоча піць чыстую ваду, – мусіць гэта рабіць* 177

*Шануй душу сваю, народзе, / І ўласнай памяці не трацць, / Каб у нязведанай дарозе / Ахвярай хуткасці не стаць!* 331
*Шануй здабытую ў змаганнях волю – / Цябе і праз вякі нашчадкі ўспомняць* 162

*Шкадаванне – гэта пераацэнка ці адмаўленне. Калі гэта адмаўленне, то тут можна сумаваць і змірыцца. А калі гэта шкадаванне аб тым, што ёсць?* 96
*Шкада, што казачныя словы / Мы хочам зберагчы на потым* 284
*Шкада, што розуму няма ў аптэках. / Ён выдаецца па рэцэптах Бога / Адзіны раз святы для ўсіх найгрэшных...* 314
*Школа для таго, каб людзі маглі перадаць адзін аднаму сваю багатую душу* 141
*Шлях да Айчыны адусюль кароткі, / Калі твая Айчына не міраж* 249
*Шлях далёк, а дзень высок!* 355
*Шляхі не купляюць за пяць капеек – / Будуюць іх жыццём сваім* 355
*Шляхі твае, о Божа, нязведаныя. / Нам здаецца часам, што мы наблізжаем волю, а на самай справе мы накладаем на сябе новыя вярыгі. / Нам здаецца, што мы ўратоўваем жыццё, а на самай справе спяшаемся туды, дзе нас чакае смерць. / Ратуючыся, мы паміраем. / А можа, і паміраючы, вартыя жыцця, застаюцца жыць вечна? / Бо не толькі жыццё, а і смерць хутчэй за ўсё скарб ёсць. / І падман – таксама* 355
*Шляхі – як тайны, тайны – як грахі, / Ў іх спавядацца рана або позна* 356
*Шлях чалавека шырокі / Канчаецца вузкай разоркай* 356
*Шлях, які мы праходзім, застаецца не па-за намі, а становіцца намі самімі – адкладваецца і акумулюецца ў нас, нібы ў колцах дрэва пражытыя ім гады, і толькі таму ён пройдзены, і толькі таму мы здольныя і вольныя ісці далей* 356, 385
*Шлях, які не пройдзеш двойчы, / Называецца – Жыццё!* 97, 356, 385

*Шмат незарубцаваных ран / На долах і ў сэрцы народа* 335

*Шмат у нашым жыцці ёсць дарог, / А вядуць яны ўсе да магілы* 365 385

*Штандары нязгоды – штандары надзеі* 168

*Што адмерана – / пройдзеш са славай, / ці прасунешся – / як набяжыць. / Ды нікому не дадзена права / Выбраць час, у якім яму жыць* 408

*Што адцвіло – таму сатлець* 386

*Што б зналі пра жанок мужчыны, / Каб іх сябровак не было* 110

*Што выйдзе з ценю – згіне ценем, / Куды б ні мкнуў духоўны шлях* 386

*Што ёсць Суды – багі не вінаваты* 331

*Што ж яшчэ тут / Здольна з мораку выводзіць, / Калі не распрамененыя сэрцы?* 331

*Што згублена – лёс не вяртае* 386

*Што знаходзіцца паміж смеласцю і нахабствам, што раздзяляе гэтыя, такія блізкія, а па сутнасці – такія далёкія паняцці, што не дае ім зліцца, злучыцца, з'яднацца ў адно? Выхаванасць, прыстойнасць, самапавага* 156

*Што значым мы / самі па сабе?.. / Семя знаходзіць сябе / ў сяўбе. / У гэтым полі, / гэтым жыцці / мы павінны / прарасці. / У гэтым полі, / гэтым жыцці / мы павінны / узысці. / У гэтым полі, / гэтым жыцці / мы павінны / сябе знайсці. / А па вясне, / а па сяўбе / мы ўжо / не самі па сабе* 97, 147

*Што значыць сапраўдным другам быць? / – Любіць. / – Што значыць аддана справу рабіць ? / – Любіць. / – Што значыць дарогу ў жыцці не згубіць ? / – Любіць. / – Што значыць зямное шчасце здабыць ? / – Любіць* 111

*Што калі нават попел-прысак / Астыў – нашто капацца ў ім?* 153

*Што мне Вена, Мадрыд, што мне / Лондан туманны, / Больш за ўсё я бацькоўскаму краю / аддaны!* 258

*Што можаш здзейсніць – неадступна здзейсні, / Каб не пякла агнём цябе віна...* 227

*Што ні асоба – свой узор, / Свая пасада і свой двор* 54

*Што ні бывала ў гаспадарцы, / дзе не было гаспадара!..* 76

*Што памерла, таго не спрабуй абудзіць* 386

*Што прайшло, таго не вернеш, / Не скажаш часу: «Пачакай»* 409

*Што прымушае нас незаўважна пераходзіць з гадзіны ў гадзіну, з дня ў дзень, з года ў год і не дазваляе спыніцца?* 358

*Што святое – то й для ўсіх святое!* 331

*Штосьці з намі не так, / калі нават буслы не вярнуліся гэтай вясной* 335

*Што такое ведаць жыццё для пісьменніка? Гэта значыць – проста жыць. Нават адным, толькі сваім жыццём* 212

*Што такое жыццё? Гэта адзінства, узаемаразуменне і садружнасць зямлі, вады, паветра і агню. / І яшчэ – думкі. Але думка можа і не адбыцца, калі няма папярэдняга ўзаемаразумення. / А можа, наадварот, думка якраз і з'яўляецца насуперак такому адзінству і такой садружнасці?* 386

*Што ў душы, тое будзе і ў слове* 284

*Што ў небе ёсць, над галавой, / Свіння не бачыла ніколі* 302

*Што хлеб – гэта хлеб, па-сапраўднаму можна даведацца, толькі адчуўшы голад. Што гераізм – гераізм, а герой – герой, даведацца можна з жыватворчай нізіны скромнасці* 183

*Што чакае за крутой гарой – / Высветліцца толькі на вяршыні* 302

*Шукаем ісціну.../ Яе не знае здавалёны, / яна сасмяглага вядзе* 302

*Шукаем сцежак невядомых, / Чужыя топчам бальшакі. / А песні нас чакаюць дома, / Ля цёплай матчынай шчакі* 249

*Шукае, шукае душа гармоніі / У свеце негарманічным* 331

*Шукаць апраўданне сваім слабасцям – у гэтым сэнс чалавечага існавання* 97

*Шукаю заклінання ад распаду / Надзей на гэты цёплы мудры хлеб: / Ён пасланец жыцця, / Ён радзіць раду / З усімі, хто ў шаленстве не аслеп* 184, 314

*Шчаслівец, хто з мінулым заручон* 122

*Шчаслівым – шчасце кожны дзень. / Шчаслівыя не каюцца* 123

*Шчаслівы той, хто ажаніўся, яшчэ шчаслівейшы той, хто марыць пра шлюб* 123

*Шчаслівы той, хто не зайздросціць поспеху іншага, а дапамагае яму* 123

*Шчасце – гэта гармонія ў тым калектыве, да якога ты належыш* 123

*Шчасце – гэта калі нічога не заўважаеш. Жывеш, як птушка вясной. Сам спяваеш, і ўсё навокал спявае ў поўнай гармоніі* 123

*Шчасце дакрануцца старой, абветранай дарогамі шчакой да шчочкі дзіцячай, далучыцца да несмяротнасці, якая ў вечным абнаўленні пакаленняў* 123

*Шчасце – / Жыць, працаваць з чалавекам сумленным* 123

*Шчасце, калі доўга яго чакаеш і калі яно ў нейкі дзень прыходзіць, здаецца неспадзяваным* 123

*Шчасце колісь, як птах, адляціць, / нат каханне згарыць, як лучына, – / сонцам толькі не згасне ў жыцці / несмяротнае слова – Айчына!* 123

*Шчасце не салавей, ноч у ночку пяяць не будзе* 123

*Шчасце – / не тая варона, / Якую не ўхопіш за хвост* 124

*Шчасце – не тое, што стыне ў граніце, / А тое, што цепліць пачуцці людзей* 124

*Шчасце не ў тым, / Каб шукаць і знайсці ўзнагароду: / Шлях ці знікне ў святле залатым, / Ці застыне пад жвірам халодным* 124

*Шчасце! Нешта не чуў я, / Каб хто яго стрэў на чужыне, / Нават самай прыгожай* 124

*Шчасце складаецца не з таго, чаго ў нас няма, а з таго, што мы ёсць* 124

*Шчасце так не даецца, / І яго не купіць; / Шчасце сеецца, жнецца, / Шчасце ў кузнях куецца, / У мартэнах кіпіць* 124

*Шчасце у кожнай тваёй перамозе, / Шчасце – адолець і вецер і град, / Шчасце – нідзе не спыняцца ў дарозе, / Спынішся – плынню адгоніць назад* 124

*Шчасця большага няма ў зярняці, / Як на ніве роднай красці* 124, 249

*Шчасця / На свеце большага няма, / Чым да людской душы дапасці, / Каб засвяцілася яна* 124

*Шчупак жа, ледзь адчуў свабоду, / Накінуўся на дробную пароду* 87

*Шчырае няўменне ў паэзіі больш паэзія, чым прафесійная імітацыя* 212

*Шчырасць – гэта праз мудрасць дарога* 346

*Шчыруйце ў працы, людзі, – / І ўспомніць вас Зямля* 264

*Шырэй за берагі / Рэчак не бывае* 302, 396

*Энергія думак, калі іх нават мала, не знікае; пасланая думкаю, яна існуе вечна, пераўтвараючы сабою, аказваючы ўплыў на зямное жыццё* 284

*Эфект творчасці: з цягам часу тое, пра што пішаш, становіцца тым, як пішаш, і тое на што глядзіш, становіцца тым, як глядзіш* 212

*Эх, гэта толькі мары-кралі! О, каб яны ды праўдай сталі!* 181

*Эх! Іграй жа той, хто можа: / Плакаць будзе весялей* 336

*Эх, маці-печ! ты – рай нябесны / І найпатрэбнейшая рэч* 238

*Эх ты, жыццё, жыццё людское! / Няма табе, няма спакою: / Ты – суматоха, вір бурлівы, / Ў табе загіне баязлівы* 386

*Эх, шляхі, родныя шляхі! Хто перакажа нам вашы казкі, разгадае думкі?* 356

*Юдольныя, і плацім мыта / За ўсё, што выпадзе ў дарозе...* 356

*Юнацтва – мёд, / і ў гэтым мёдзе / Яшчэ не чутна / гаркаты* 145

*Я адны на свеце рукі знаю, / Што ў мазалях. / І ім я давяраю* 177

*Я баюся таго, што ведаю* 302

*Яблык ад яблыні коціцца / Ў рукі таму, хто народзіцца* 302

*Я б не сказаў, што кожны доктар / Вядзе свой род ад Скарыны* 153

*Я ведаю: / ёсць час скупы і горкі, /Ёсць міг, / калі у подзвігу сваім / Жывыя ўсё ж звяртаюцца да мёртвых / І мёртвыя адказваюць жывым!* 386

*Я вечны ў роднай старане, / Як слова Мама...* 137, 396

*Я ганаруся абавязкам – / Быць чалавекам для людзей* 76

*Яго нікому замяніць не суджана – / Ён быў паэт* 212

*Я думаю, што страшны той прагрэс, / Калі жывём пад ядзернаю пашчай* 168

*Я жанчына, жанчына... / Жанчына са слёз* 128

*Я жорсткасці зазнаў урокі, / Ды больш вучылі дабратой. / І каб, здаецца, не сурочыць, – / Жыў і жыву навукай той* 346

*Я ж у песні – не пан, толькі служка* 213

*Я ж у свеце толькі госць, / Як і госці ў свеце людзі...* 386

*Я – за прагрэс! І ўвесь мой клопат / У тым, што мы, мясцовы люд, / Не беражом, не цэнім вопыт, / Які ў вяках капіўся тут* 314

*Я здабываю надзённы мой хлеб, / Не трэба мне райскага хлеба!* 184

*Я знаў толькі адну зорку – / Пяцікрылую далонь маці* 137

*Я знаю: жыццё – нялёгкі паход* 97

*Я знаю: скончыцца дарога, / Бо ноч нябыту, ноч-аблога / Сачыць наш час ад дня раджэння / Сляпымі зрэнкамі зацьмення, / Як дух закляцця, дух праклёну* 409

*Я імгненне жыву, і пamру на імгненне, / І у думцы і ў слове маім аджыву* 386

*Я й стагоддзем Вам пакланюся: Мова. Матуля. Мінск і Няміга* 258, 284, 409

*Якая Беларусь – такі й народ* 258

*Якая вялікая трагедыя зямлі, калі ёю не можа камандаваць чалавек! І якая вялікая трагедыя чалавека, калі душыць, панствуе над ім зямля* 264

*Якая гэта жахлівая трагедыя для пісьменніка: глядзець і не бачыць, слухаць і не чуць, пісаць і не тварыць* 213

*Якая песня ў лебедзя? / Як лебедзь* 290

*Якая розніца паміж хітрым і разумным? Хітры на адзін раз. Разумны – назаўсёды* 227

*Якая слава можа ўцешыць, / Калі ты сэрцам – на крыжы?* 170

*Якая ты ўсё ж неацэнная, Воля, / Калі за скарынку цябе прадаюць!* 162, 396

*Як бы адмыслова ні складваліся дровы для вогнішча, праз гэта яны не запаляцца. Умельства мае справу з дровамі, творчасць – з агнём* 213

*Як бы там ні было добра, але калі гэтае дабро цэлы век астаецца без усякай змены, то яно лёгка перастае быць дабром* 227

*Як бы ты ні бедаваў, / Не прасі нічога ў Бога – / Ён і так табе ўсё даў* 339

*Як бы я тады глядзеў, каб я твае акуляры надзеў...* 54

*Як выдых: / Хай былое – тлен. / І як удых: / Няхай зародзіць!* 264

*Як выказаць цябе, маё маўчанне?* 284

*Як гэта многа – душа прыроды і душа чалавека* 87, 331

*Як для дрэва корань, так і слова / Сілу, годнасць не дае нам страціць* 284

*Як добра было б жыць на свеце, калі б чалавека не гналі, не крыўдзілі, не пазбаўлялі волі* 162

*Як добра, што ва ўсе вякі, / Жывуць на свеце дзівакі,* 54

*Як дуб за жвір трымаецца карэннем, / Так Беларусь стаіць на курганах* 258

*Як дым, жыццё ты чалавеча: / Дыхнуў віхор – і згінуў след* 387

*Як жа зроблена мала, / каб жыць. / Як жа зроблена многа, / каб нішчыць* 97, 396

*Як жа скараціць / адлегласць тую, / Што між берагамі / Нашых душ?!* 331

*Як жыла і жывеш, будзеш жыць, Беларушчына! / Зразумеў і успомніў цябе твой мільённы народ* 258

*Як жыць – дык жыць для Беларусі, / а без яе – зусім не жыць* 258

*Як злуешся – спрэчкі-звады / не высмечвай з хаты* 303, 314

*Які б глыбокі ні быў акіян – ён усё роўна мае паверхню, якая б ні была плыткая лужына – яна ўсё роўна мае паверхню. Цела – таксама паверхня, «нулявы ўзровень» быцця, адваротнае дно, яно не можа «патануць» у быцці, але ў залежнасці ад таго, што там, за ім, лужына альбо акіян, мяняюцца яго паводзіны, яго аблічча, яго не месца, а сэнсазнаходжанне* 396

*Які б ні быў для рук занятак – / Усё ж палёгка для душы* 332

*Які вялікі цяжар нясе на плячах той, за якога хоча трымацца многа людзей* 76

*Які дагляд – такі й прыплод* 314

*Які ён гога! Які дока! / Як ён сябе нясе высока!* 54

*Які народ – такі й паэт. / Які паэт – такія й людзі* 213

*Які пасеў – такі і высеў* 177, 314

*Які пастух жалезны нас пасе?..* 104

*Які прывет – такі прыём, / Які тавар – такая плата* 396

*Якія нягоды і пакуты могуць спыніць чалавека, калі наперадзе ў яго воля?!* 162

*Якія песні – такі й лад. / Які мінор – такія й гуслі* 290

*Як каноплі ў балоце тапіці – / так жыць: не любіці* 125

*Як лёгка і проста хваліць і ўзвышаць усё чужое, і як цяжка і небяспечна заступацца за сваё, роднае...* 249

*Як можна памагчы сапраўднаму таленту? Па-першае, не пабаяцца сказаць яму, што ён талент. А па-другое, стрымаць тых, хто абавязкова хоча перашкодзіць яму працаваць* 186

*Як мы жывём , так нам жывецца* 97

*Як мы ўсё-ткі аблашчаны сонцам / Пры ўзыходжанні на касцёр* 88

*Як навучыць дарослых, што дзецям трэба даць «даспець» у дзяцінстве?* 141

*Як нам зрабіць, маё тварэнне, / каб ты было – / само гарэнне? / Не адыход / і не адгон, / а сам агонь* 213

*Як не будзе натхнення ў паэта – / Не чакайце і песень яго* 213

*Як немагчыма прынізіць абразаю / Маці-зямелюхну, неба і сонца – / Гэтак і мовы, што служыць украсаю / Роду людскога, не ўнізіць – ні слоўца!* 284

*Як не хапае нам настаўнікаў, / Што знаюць родную зямлю* 141

*Як ні задзіраюцца сані насамі – / Не зрабіцца ніколі коламі палазам* 238

*Як ні імкнулася дрэва / ў неба, / яно ўсё роўна / не дасягае неба* 88

*Як ні мудруй, ні пругайся, / А немагчыма, немагчыма / Адолець прыцяжэнне часу* 315, 409

*Як ні рашай, крытычны кворум, / Прыкметы часу часцяком / Не ў тым відны, што ў поце творым, / А ў тым, што смехам сказанём* 409

*Як ні рыхтуй сябе загодзь – ніхто не можа / Да самоты быць гатовы* 336

*Як ні хітруй, а праўда ў тым, / Што ўсе мы хворыя адным: / Нам едкі дым – чужая слава, / Ну, а свая – салодкі дым* 170

*«Якое жыццё, такая і літаратура» – у сэнсе адлюстравання. Значыцца, жыццё як мага ніжэй апусціць і туды ўжо цягнуць літаратуру?* 213

*Якое ўсё ж такі шчасце быць паэтам, / Навекі закаханым у жыццё* 213

*Якое ўсё ўмоўнае – / І радасць, / І журботлівы настрой...* 217, 350

*Якой бы музыкай гучала наша мова, / Калі б умелі слова шанаваць, / Калі б фальшыўцаў лёс караў сурова, / І за зняважу, і за крыўду слова / Забаранялі вершыкі пісаць!* 284

*Якой бы святой ні была тая троіца, / Да троіцы той хтось чацвёрты прыстроіцца* 303

*Якой жа моваю, скажы мне, / Мы будзем гутарыць з табой. / Я – не валодаю чужымі, / Ты, бог, – не ведаеш маёй* 284

*Якому дурню свет далі зрабіць, / Які мы ўсё жыццё перарабляем!* 227

*Як паглядзіш – божа мілы! / Што з людзямі робіць чын!* 54

*Як парад без салдат – не парад, / Так квадрат без вуглоў – не квадрат. / Як футболу патрэбны галы, / Так квадрату патрэбны вуглы* 303

*Як позна нам становіцца відней, / Што ява з марай у нявечным шлюбе!* 181

*Як поле, у людзей душа адкрыта, / Пасей дабра зярняты ў глебу ты – / Дабра саспее колас залаты* 332

*Як рэдка ў рэках нашага маленства / змываем груз дарожнае тугі* 141

*Я крэўнасцю намёртва звязан / З усім, / што будзе, / ёсць, / было* 387

*Як свет стаіць, то яшчэ не было вядома, каб на нянавісці вырасла шчасце, а радасць на чужой бядзе* 303
*Як страшна ў вялікай дзеі / Не апраўдаць давер грамады, / Сваіх ашукаць надзеі!* 76
*Як той алень шукае крыніцы чыстай, / так шукаю Бога я* 332
*Як траву ні косіш, / А яна расце!* 88
*Як у садзе няма непрыгожых, не вартых увагі дрэў, так у жыцці няма нецікавых людзей* 76
*Якую б даль пазнаць ні давялося, – / А ўсё ж навуку пройдзеце адну: / З драбнюткага зярнятка – ўсё калоссе, / І толькі плуг / узніме цаліну* 339
*Як цеціва, страла і лук, / як з ноты вызвалены гук, / як палімпсеста тайнадрук, / як варажба цыганскіх рук, як аралля і гостры плуг, / як жырандоля і жаўрук, – / Натхненне* 213
*Як цуд чужых вачэй ні цешыў, / Душа шаптала мне сама: / Ёсць край цяплейшы, багацейшы, / Але раднейшага няма* 250
*Як цывілізацыя нішчыць прыроду, так хамы – грамадства* 76, 88, 396
*Як цяжка радзіцца коласам, / А яшчэ цяжэй – васільком* 387
*Як цяжка робіцца ў душы, / Калі ў ёй толькі... / Толькі міражы* 332
*Як цяжка ўсім да простых ісцін / Праз лес хлусні старой дайсці* 303
*Як цяжкі груз на нас зваліўся / Раней не знаны дабрабыт* 238
*Як часта атруту не лічым атрутай / І дзверы адчыненымі пакідаем* 76
*Як часта мы забываемся, што чалавек прыгожы перш за ўсё ўнутраным хараством* 347

*Як часта так здараецца ў жыцці, / Што ўжо калі цябе / зусім надзея кіне, – /Знаходзіш той жаданы скарб адзіны, / Што век шукаў і ўсё не мог знайсці* 97, 350

*Як чорная сава ўскідаецца – / так няслава адгукаецца* 170

*Як шляхі жыццёвыя ні блудзяць, / А да Хлеба існыя ляжаць* 356

*Я меў няшчасце / ў гэтым краі нарадзіцца, / Ды, дзякуй Богу, / маю шчасце тут памерці* 250

*Я – мэта, што тоесна перашкодзе* 396

*Я на панскі капялюш / Брыль свой не змяняю* 61

*Я не адзінокі, / я адпаведны,* 54

*Я не ганю землі чужыя – / Хай іх сонца не абміне. / Толькі дзе за морам ні жыў я, / Беларусь мая снілася мне* 258

*Я не мог спыніцца на прывале, / Бо не для прывалаў я жыву* 387

*Я не хачу нікога павучаць, / Я абуджаю ў сэрцах чалавечнасць: / Калі баліць, давайце не маўчаць, / Калі хто падае, – свае падставім плечы* 346

*Я павінен сумець пераканаць людзей рабіць тое, што мне трэба, але каб ім здавалася, нібыта яны самі таго хочуць, а я толькі разумею іх патрэбы* 76

*Я пастаянна казаў, што меў, / я пастаянна кажу, што маю, / нічога не ўтойваючы, / нічога не пакідаючы на чорны дзень: / мае канчатковыя аргументы тут – у кожнай хвіліне, у кожным дні, ва ўсім маім існаванні* 285

*Я па тым цаню суседа, / Як наклёпана каса* 76

*Я печ на рай не памяняю* 238

*Я – раб паэзіі. І ўсё ж на дзіва / Шчаслівы, што – як вязень ланцугом – / Прыкуты сваёй мовай да Радзімы* 285

*Я сейбітам паэта уяўляю* 213

*Я – сірата / Без маёй Беларусі. / Ад роднай мовы, / Ад роднай нацыі / Не адцураюся, / Не адракуся* 258

*Я спытаў чалавека, / Які прайшоў праз агонь, / І ваду, / І медныя трубы: / – Што самае цяжкое / На гэтым свеце? / І ён адказаў: / – Прайсці праз вернасць* 315

*Я супраць арфаграфіі грашу, / І з літары вялікае пішу: / Радзіма* 250

*Я ў крузе, дзе слова шукае Слова, а чалавек – Чалавека* 285

*Я ўрос у зямлю* 264

*Я ў сілу жорсткасці не веру, / Я веру ў сілу дабраты* 227, 346

*Я – чалавек. Я не ў гасцях. Я – дома. / Пакуль жыву – не ведаю мяжы* 54

*Яшчэ асаблівасць усіх ступеней: / чым вышэй – тым месца меней, / чым вышэй, / тым падымацца цяжэй і цяжэй* 315

*Яшчэ графой: разумны або дурань? / Хацелася б анкету надтачыць...* 54

*Яшчэ ніколі на пустым загоне / Ад славаслоўя збожжа не расло!* 285

*Яшчэ ніколі ніхто не забываў свайго дзяцінства* 141

*Яшчэ ніхто / Свой лёс не перарос* 104

*Яшчэ так не было на свеце, / Каб Іуда кончыў, як чалавек, жыццё* 236

*Яшчэ той брат наш не радзіўся, / Каб на ўзві-вецер жыць багата / І ў дні будныя спраўляць свята* 177

*Яшчэ ў пупышках новае лісцё, / Якому песню сонца пець старую...* 181, 290

*Я яшчэ праверыць мушу / Лязо і ў песні, і ў штыка* 168

# Аўтары афарыстычных выслоўяў

Абуховіч А.
Аколава В.
Аксак В.
Акулін Э.
Александровіч А.
Алексіевіч С.
Арлоў У.
Арочка М.
Арсеннева Н.
Асіпенка А.
Астапенка З.
Астрэйка А.

Багданкевіч С.
Багдановіч І.
Багдановіч М.
Багушэвіч Ф.
Бадак А.
Баравікова Р.
Барадулін Р.
Барскі А.
Бачыла А.
Башлакоў М.
Бічэль-Загнетава Д.
Бондар Т.
Броўка П.
Брыль Я.
Буйло К.
Бураўкін Г.
Быкаў В.
Бялевіч А.

Валасевіч Э.
Валкавыцкі І.
Васілевіч А.
Вечар А.
Вітка В.
Вольскі А.
Вялюгін А.
Вярба В.
Вярцінскі А.

Гайдук У.
Галубовіч Л.
Гальпяровіч Н.
Гардзей В.
Гарун А.
Гаўрусёў С.
Геніюш Л.
Геніюш Ю.
Гілевіч Н.
Гіль М.
Глебка П.
Глобус А.
Грамовіч І.
Грахоўскі С.
Грачанікаў А.

Гурло А.
Гурскі І.

Дайнека Л.
Дашкевіч В.
Дзмітрыеў Г.
Дзюба У.
Дзяргай С.
Дзятлаў А.
Дранько-Майсюк Л.
Дубоўка У.
Дудараў А.
Дудзюк З.
Дуброўскі І.
Дукса М.
Дунін-Марцінкевіч В.

Жамойцін А.
Жарнасек І.
Жуковіч В.
Жыгуноў А.
Жылка У.

Забалоцкая Л.
Загорская Н.
Законнікаў С.
Зарыцкі А.
Звонак А.
Зубрыцкі Э.
Зуёнак В.
Зэкаў А.

Іпатава В.

Каваленка В.
Казарына С.
Камароўскі А.
Камейша К.
Караткевіч У.
Карызна У.
Ківатыцкі У.
Кірэенка К.
Кісялеўскі Ю.
Колас Я.
Корбан У.
Крапіва К.
Крупенька Я.
Кудравец А.
Куляшоў А.
Купала Я.

Ліпскі У.
Лойка А.
Лось Е.
Лужанін М.
Лучына Я.
Лынькоў М.

Маеўская Н.
Мазго У.
Макаёнак А.
Макаль П.
Маляўка М.

Марозаў З.
Марук У.
Марціновіч А.
Марчук Г.
Мацяш Н.
Мележ І.
Мінкін А.
Мурашка Р.
Мятліцкі М.
Мяцеліца Г.

Непачаловіч Я.
Нядзведскі У.
Някляеў У.

Панізнік С.
Панчанка П.
Папковіч У.
Пархута Я.
Паўлаў У.
Паўлікава Л.
Пашкоў Г.
Пісьмянкоў А.
Пруднікаў П.
Пысін А.

Рабкевіч В.
Рагаўцоў В.
Разанаў А.
Ралько І.
Рубанаў У.
Рублеўская Л.
Рудкоўскі М.
Русецкі А.
Руцкая А.
Рылько А.

Салтук А.
Сачанка Б.
Свірка Ю.
Сербантовіч А.
Сівец Т.
Сіпакоў Я.
Скарынкін У.
Скобла М.
Скрыган Я.
Скрыпка А.
Ставер А.
Стральцоў М.
Сыс А.

Танк М.
Тарас Н.
Тарасюк Л.
Тармола-Мірскі Р.
Таўлай В.
Трафімчук М.
Трус П.
Тулупава Н.

Хатэнка А.
Хведаровіч М.

**Ц**вірка К.
Цётка

**Ч**арнышэвіч А.
Чарот М.
Чорны К.

**Ш**абовіч М.
Шамякін І.
Шніп В.
Шруб П.
Шушко А.

**Я**двігін Ш.
Якубовіч Л.
Янішчыц Я.
Янкоўскі Ф.
Яновіч С.
Ярац В.

# Змест

Прадмова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

**«АФАРЫЗМЫ – ГЭТА ТЭРМІНОВЫЯ ТЭЛЕГРАМЫ РОЗУМУ»** . . . . . . . . . . . . . . . 7

**Афарызм як двухпланавая моўная адзінка. Афарыстычнасць выслоўяў. Афарызацыя. Нацыянальная афарыстыка** . . . . . . . . . . . . . 7

*«Кожны чалавек – гэта цэлы свет»* . . . . . . . . . . . . . . 38

Чалавек, яго існасць, вартасць, значнасць; месца на зямлі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38

*«Няпростая, як свет, людская годнасць»* . . . . . . . . . . . 54

Гонар, годнасць чалавека, народа; павага, пашана . . . . 54

*«Між людзей быць не можа старонняга болю»* . . . . . . . . 61

Людзі, народ, нацыя; чалавек і грамадства; чалавек і сусвет; дзяржава і закон; улада; палітыка . . . . . . . . . 61

*«І як не шанаваць прыроды годнасць»* . . . . . . . . . . . 77

Прырода і чалавек; законы прыроды . . . . . . . . . . . 77

*«Жыццё – неаплатны і спадчынны доўг»* . . . . . . . . . . 88

Жыццё чалавека, яго сутнасць, вартасць, незваротнасць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 88

*«Ад лёсу не схаваешся»* . . . . . . . . . . . . . . . . . 97

Доля, лёс чалавека, грамадства; прадвызначанасць жыццёвага шляху; выпадак . . . . . . . . . . . . . . . . 97

*«Альфа і амега сяброўства – спагадлівасць і надзейнасць»* 105
Дружба, сяброўства; давер, згода, лад; сустрэчы і разлукі ........ 105

*«Каханне і веру не трэба ўсім выстаўляць напаказ – душу чуе толькі неба»* ........ 111
Шчасце, каханне, вера, вернасць, любоў ........ 111

*«Жанчына – таямніца з таямніц»* ........ 125
Жанчына – жонка, жанчына – маці, яе роля ў сям'і, у грамадстве ........ 125

*«Сынок і маці – зерне і ралля, сынок і маці – мудрая ікона»* ........ 128
Сям'я; бацькі, дзеці; родная хата; родныя, род; сувязь пакаленняў ........ 128

*«Гадуюцца дзеці ў любові – ратуецца вечнасць»* ........ 138
Дзяцінства; вучоба і выхаванне маладога пакалення; веды і вопыт; асоба настаўніка, выхаваценя ........ 138

*«З учынкаў маладосці і старасць у людзей»* ........ 142
Юнацтва, маладосць, сталасць, старасць ........ 142

*«Усё пакінуць след павінна...»* ........ 146
Набыткі, жыццёвы плён душы і працы ........ 146

*«Амністыі не знае памяць»* ........ 148
Памяць чалавека, памяць пакаленняў; мінулае; спадчыннасць і спадчына ........ 148

*«Век жыві – і век спялі адвагу»* ........ 153
Смеласць, адвага, мужнасць; сіла і спрыт; мэтанакіраванасць і настойлівасць; дысцыпліна ........ 153

*«Воля сонейку раўня»* .................... 157
Воля, свабода, незалежнасць, роўнасць;
дэмакратыя; няволя .................... 157

*«А хто вецер пасее, – той буру пажне»* .................... 162
Мір, спакой; вайна, змаганне, перамога; ахвяры .... 162

*«Ад славы галава не баліць»* .................... 168
Слава і няслава .................... 168

*«І няма на свеце лепшай долі – несці жытні колас праз вякі»* .................... 170
Працавітасць, дбайнасць, стваральная праца
і яе плён .................... 170

*«У кожным зерні новы колас вясны чакае»* .................... 177
Будучыня, праца для яе; жаданні, мары, імкненні,
спадзяванні .................... 177

*«Будзе хлеб – будзе радасць у хаце»* .................... 181
Хлеб – пражытак, сродак існавання чалавека ...... 181

*«Талент павінен быць непадкупны»* .................... 184
Дар, здольнасць, таленавітасць .................... 184

*«Пясняр – слуга слугі усякай, пясняр і цар усіх цароў»* .. 186
Паэт і паэзія; творца і майстэрства творчасці;
натхненне, прызванне; ацэнка твора .................... 186

*« Настрой – як салавей світальнаю парой...»* .................... 214
Настрой чалавека, яго стан; весялосць; журба,
сум, смутак, самота, туга; адзіноцтва, адчай ........ 214

*«Свет чалавечы прагне людскасці»* .................... 217
Справядлівасць і несправядлівасць; дабро і зло; крыўда; веліч; ганьба; віна і пакаранне; хітрасць, прытворства; заганы, недахопы .................... 217

*«Не мае граніц людская злосць»* .................... 227
Адступніцтва, здрада, вераломства, подласць; злосць, гнеў, крыўда; жорсткасць, нянавісць; глупства, невуцтва; хлусня; ганарлівасць, зазнайства, зайздрасць, хвальба, падхалімства, угодніцтва; абыякавасць .................... 227

*«Сагравацъ усё ж умеюць рэчы »* .................... 236
Матэрыяльнае ў чалавечым жыцці; здабыткі і страты .................... 236

*«Нам край належыць, пакуль ззяюць зоры»* .................... 238
Радзіма, родны край, Бацькаўшчына; патрыятызм 238

*«Беларусь пад малітвамі Бога»* .................... 250
Радзіма; нацыянальныя сімвалы і рэаліі .................... 250

*«Зямля ніколі смутак не раджала і за дабро плаціла нам дабром»* .................... 258
Зямля , яе месца ў жыцці чалавека; зямля – родны дом зямлян .................... 258

*«І наша мова – з-пад крыла душы»* .................... 264
Думка, мова, слова .................... 264

*«Без песень свайго народа нямее нават прырода»* .................... 285
У песні – душа і жыццё чалавека, яго мары і надзеі 285

*«Ад ісціны – да ісціны: хады – навек жыцця»* .......... 291
Ісціна, праўда, праўдзівасць .......................... 291

*«Да мудрасці нялёгкая дарога»* .......................... 303
Роздум, разважлівасць; розум; мудрасць; пазнанне, вопыт; звычаі, традыцыі, народныя прыметы ...... 303

*«Духоўнасць – святая жывымі»* .......................... 315
Дух, душа, духоўнасць; Бог, вера, святасць .......... 315

*«Радасць нават мільёнаў не зменшыць гора аднаго чалавека»* .......................... 332
Бяда, гора, ліха, няшчасце; пакуты; адчай, страх .... 332

*«Малое зерне месціць цэлы свет»* .......................... 336
Вялікае і малое, значнае і дробнае ў чалавечым жыцці .......................... 336

*«Без чалавечнасці не будзе вечнасці»* .......................... 339
Дабрата, чалавечнасць, чуласць, сумленнасць, шчырасць .......................... 339

*«Не ведае межаў краса»* .......................... 346
Прыгажосць, харáство, краса, гармонія прыроды і чалавека .......................... 346

*«А радасць не залучыш пра запас»* .......................... 348
Радасць, хваляванне; надзеі, мары, летуценні ....... 348

*«Дарогі – найвыдатнейшыя помнікі чалавецтва»* ..... 350
Дарога – шлях, накірунак у жыцці .......................... 350

*«Спынішся – плынню адгоніць назад»* .......................... 357
Рух, дзейснасць, актыўнасць як неабходныя ўмовы жыццядзейнасці, існавання .......................... 357

*«Міг і вечнасць – святога зарубкі»* . . . . . . . . . . . . . . . . 358
Філасофія жыцця і смерці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 358

*«Але ўсяму свая ёсць мера»* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 387
Пачатак і канец; пара́; мяжа; паралелі; цана . . . . . . . 387

*«Час – найлепшы доктар чалавеку»* . . . . . . . . . . . . . . . . 397
Вечнасць, бясконцасць, няспыннасць, хуткаплыннасць, заканамернасць і непрадказальнасць часу; часовае і пазачасавае; час і бясчассе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 397

Алфавітны паказальнік афарыстычных выслоўяў . . . . . . . 410

Аўтары афарыстычных выслоўяў . . . . . . . . . . . . . . . . . . 627

Навукова-папулярнае выданне

**Гаўрош** Ніна Васільеўна
**Нямковіч** Ніна Мікалаеўна

**АФАРЫСТЫЧНЫЯ ВЫСЛОЎІ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ**

Рэдактар *Ю.А. Місюль*
Мастацкі рэдактар *В.А. Ярашэвіч*
Тэхнічны рэдактар *Н.А. Лебядзевіч*
Карэктар *В.І. Аверкіна*
Камп'ютарная вёрстка *А.Н. Бабянковай*

Падпісана ў друк 19.10.2011. Фармат 60×90/32. Папера для афсетнага друку. Гарнітура «Garamond Premier Pro». Афсетны друк. Ум. друк. арк. 20. Ул.-выд. арк. 24,2. Тыраж 1000 экз. Заказ 2961.

Рэспубліканскае ўнітарное прадпрыемства «Выдавецтва "Вышэйшая школа"». ЛИ № 02330/0494062 ад 03.02.2009. Пр. Пераможцаў, 11, 220048, Мінск. e-mail: info@vshph.by http://vshph.by

Філіял № 1 адкрытага акцыянернага таварыства «Чырвоная зорка». ЛП № 02330/0494160 ад 03.04.2009. Вул. Савецкая, 80, 225409, Баранавічы.

**Гаўрош, Н. В.**

Г24 Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў / Н. В. Гаўрош, Н. М. Нямковіч. – Мінск : Выш. шк., 2012. – 638 с.

ISBN 978-985-06-1956-3.

У кнізе каля 3600 афарыстычных выслоўяў, выбраных з мастацкіх і публіцыстычных твораў беларускіх пісьменнікаў. Афарызмы спарадкаваны ў 45 тэматычных груп.

Прызначаецца студэнтам-філолагам, настаўнікам-славеснікам, навукоўцам, усім тым, хто цікавіцца нацыянальнай афарыстыкай.

**УДК 811.161.3'373.4**

**ББК 81.2Бел-3**

*Мне сняцца сны аб Беларусі!*

Янка Купала

*Як жыць – дык жыць для Беларусі,*
*а без яе – зусім не жыць.*

Ларыса Геніюш

*А хопіць і куточка Беларусі,*
*Каб цэлы век свой да яе ісці.*

Ніна Мацяш

*Добра быць у дарозе, якую ты сам сабе выбіраеш.*

Якуб Колас

*Без чалавечнасці не будзе [illegible]насці.*

Пімен Панчанка

*Куды б цябе ні завяла дарога,*
*Не забывай бацькоўскага парог[illegible]*

Пятрусь [illegible]оўка

ISBN 978-985-06-1956-3

9 789850 619563

«ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА»

Н.В. Гаўрош
Н.М. Нямковіч

# Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў